Генадзь Кісялёў

Кніга першая...

Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года

...кніга апошняя

Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі

Генадзь Кісялёў

Сейбіты вечнага:

артыкулы
пра беларускіх пісьменнікаў
і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года

Скарынаўская сімволіка:

вытокі, традыцыі,
інтэрпрэтацыі

Мінск
«Медысонт»
2009

УДК 821.161.3.09
ББК 83.3(4Беи)
К44

Навуковы рэдактар *кандыдат філалагічных навук В. А. Чамярыцкі*

Рэцэнзенты: *доктар філалагічных навук М. А. Тычына*
кандыдат філалагічных навук С. Л. Гаранін

Шчырая падзяка за дапамогу ў выданні кнігі Надзеі Кудасавай-Запруднік і Янку Запрудніку

Кісялёў, Г.
К44 Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года ; Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі / Генадзь Кісялёў ; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. — Мінск : Медысонт, 2009. — 544 с.

ISBN 978-985-6887-47-8.

У выданне ўключаны дзве працы вядомага беларускага літаратуразнаўцы і гісторыка Генадзя Васільевіча Кісялёва (1931–2008): першая з ягоных кніг — «Сейбіты вечнага», што пабачыла свет у 1963 г., але дасюль шмат у чым не страціла сваёй актуальнасці, і даследаванне, над якім ён працаваў да апошніх дзён свайго жыцця, — «Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі».

Кніга адрасуецца гісторыкам, даследчыкам літаратуры, а таксама шырокаму колу чытачоў, якія цікавяцца мінуўшчынай Беларусі.

УДК 821.161.3.09
ББК 83.3(4Беи)

ISBN 978-985-6887-47-8

© Кісялёў Г., 2009
© Афармленне. СТАА «Медысонт», 2009

Кніга першая — кніга апошняя

У сям'і незабыўнага Генадзя Кісялёва з'явілася арыгінальная задума: да гадавіны смерці ўшанаваць яго светлую памяць выданнем, дзе спалучыліся б кніга першая — «Сейбіты вечнага», якая пабачыла свет у 1963 годзе, і кніга апошняя, над якой ён працаваў у поўным сэнсе да апошніх дзён свайго быцця. Калі за ім прыбыла неадкладная дапамога, ён яшчэ ўзіраўся ў палескі арнамент, шукаючы адказ на пытанне, якую ж сімволіку выкарыстоўваў Францыск Скарына ў сваіх выданнях кніг Бібліі, перакладзеных ім жа на мову, зразумелую для «люду посполитого». Бо сімволіка на яго аўтапартрэце, шматлікіх графічных малюнках была цесна звязана з тэкстам, поўным загадак жыццём і тытанічнай дзейнасцю беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара. Тут таіліся і тоящца адгадкі многіх таямніц.

На першы погляд абедзве часткі гэтага выдання — першага, якога Генадзь Кісялёў ужо не ўбачыць і крытычным позіркам не ацэніць, не падобныя адна да адной. «Сейбіты вечнага» — гэта зборнік з чатырох артыкулаў-эсэ, прысвечаных пачынальнікам беларускага Адраджэння Кастусю Каліноўскаму, Францішку Багушэвічу, Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу і Антону Трусаву. Яны не толькі сучаснікі, звязаныя аднымі і тымі ж падзеямі, але і аднадумцы, ворагі царскага самаўладства. Другая ж частка — гэта манаграфія «Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі», дзе гаворка вядзецца толькі пра адзін аспект «богоугодного дела» вялікага палачаніна, але аспект кардынальны.

Бо праз яго можна высветліць усю задуму Скарыны, вытлумачыць шляхі яе вырашэння. Гэта сімволіка, генеалагічна-геральдычная, касмаганічная.

І што мяне ў добрым сэнсе здзіўляе, што імпануе мне, дык гэта падобнасць ці, можа быць, метадалагічная і нават стылёвая ідэнтычнасць, цэласнасць даследчыцкай работы ў кнізе першай і кнізе апошняй, хаця іх раздзяляе амаль паўстагоддзя. Супастаўляючы іх, не дужа прасочыш і дакажаш рост пісьменніцка-літаратуразнаўча-гістарыяграфічнага майстэрства аўтара. Калі чытаў другую частку, мне часам здавалася, што па вобразнасці мовы яна нават саступае частцы першай. Зрэшты, гэта зусім зразумела: працуючы над скарыназнаўчым даследаваннем, Генадзь Кісялёў найперш спяшаўся, нібы прадчуваючы нядобрае, выкласці думкі, змест, пакідаючы шліфоўку стылю на пасля.

«Сейбіты вечнага» сведчаць, што іх аўтар уступаў у літаратуразнаўства не навічком, а даследчыкам сталым, з выпрацаванай метадалогіяй, якая ў цэлым ужо не патрабавала, не прадугледжвала скідкі на ўзрост ці дэбютанцтва, нейкай бачнай эвалюцыі. Памятаецца, мая рэцэнзія на першую кнігу Генадзя Кісялёва, з якім я быў ужо знаёмы па сустрэчах у калідоры Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, што месціўся на кароценькай вільнюскай вуліцы Гяросёс Вільцес (Добрая Рада), называлася «“Рэстаўратарскае” майстэрства даследчыка» (Маладосць, 1963, № 11). І слова «майстэрства», памятаецца, ні ў каго не выклікала сумнення. Тую ж самую назву, толькі без перастраховачнага двукосся ля першага слова, можна было б даць і ягонай кнізе апошняй. Бо методыка засталася тая ж самая, надзейная і даўгавечная. Даследчык браў з нашай спадчыны якую-небудзь глыбу (блок

літаратурна-гістарычных з'яў), прыглядаўся да яе, акрэсліваў, высвятляў, што з гэтай глыбай рабілі ці спрабавалі зрабіць папярэднікі, і прыступаў да скрупулёзнага, ювелірнага рэстаўратарства, ачысткі ад напластаванняў забыцця, свядомых і несвядомых скажэнняў, а то і вульгарызацыі.

Так было з першымі кніжкамі Генадзя Кісялёва «Сейбіты вечнага» і «З думай пра Беларусь», дзе ўвага засяроджвалася на рэвалюцыйна-дэмакратычным крыле беларускага нацыянальнага руху XIX стагоддзя. Затым з'явілася другая глыба — ананімныя паэмы. У выніку яе шматгадовага «ачэсвання» выступілі на паверхню выразныя выявы іх аўтараў: Вікенція Равінскага і Канстанціна Вераніцына. А з дабротных «асколкаў», якія з'явіліся ў працэсе рэстаўрацыі мінулага, узнік зборнік дакументаў і матэрыялаў «Пачынальнікі», які стаў падручнай кнігай многіх маладых паслядоўнікаў незабранзавелага мэтра і жывой легенды (прыгадайце радкі з паэмы, спачатку таксама ананімнай: «Ні крот Сцяпан Александровіч, ні кротус Генус Кісялёў... »). Потым літаратурным глыбокакапальнікам было заўважана недастатковае дакументальнае забеспячэнне дзвюх найпершых, класічных постацей, але ўжо XX стагоддзя. Так з'явіліся зборнікі «Пуцявінамі Янкі Купалы» і «З жыццяпісу Якуба Коласа». Але ў цэлым гісторык-літаратуразнавец (ці літаратуразнавец-гісторык) заставаўся верным свайму XIX стагоддзю, што адных злавала («ну колькі ж можна!», «там жа нічога не было!»), іншых, у тым ліку і мяне, калі я быў загадчыкам інстытуцкага аддзела, у якім працаваў Генадзь, радавала, бо сапраўдных поспехаў у навуцы можна дасягнуць, толькі прысвяціўшы сябе адной тэматыцы. Непахіснай цэльнасці Кісялёва я зайздросціў, таму што часам паддаваўся на тэматычныя адступленні і нават

правакацыі (аповесць «Восень пасярод вясны», інспіраваная Уладзімірам Караткевічам, ці нарыс «Астравеччына, край дарагі...», да якіх Генадзь ставіўся ўвогуле паблажліва: можна, але навошта? — жыццё ж бяжыць хутка).

Вось коратка, у адным абзацы, пра тое, што ў загалоўку гэтага артыкула месціцца ў працяжніку — паміж кнігай першай і кнігай апошняй. У часавым вымярэнні гэта чатыры з лішкам дзесяцігоддзі напружанай, мэтанакіраванай і ўважлівай (да спасылак, да карэктуры) працы ў Гістарычным архіве Літвы і Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Працы, што самае важнае, **сістэмнай**. Нездарма гаварылі пра архівы (вільнюскія, маскоўскія, мінскія): «У тым фондзе, у якім пахадзіў Кісялёў, іншым няма чаго рабіць».

Тая ж сістэмнасць, комплексны падыход да матэрыялаў, а яшчэ імкненне да аб'ектыўнасці і павага да яго вялікасці Факта выразна відаць ужо ў кнізе першай. Да «Сейбітаў вечнага» аўтар неаднарозова вяртаўся пасля іх выхаду ў свет, рабіў праўкі на палях кнігі, якія ўнесены ў гэтае выданне. Захоўваць аб'ектыўнасць у асэнсаванні гістарычных падзей у часы, калі выйшлі «Сейбіты вечнага», было ой як нялёгка. Але адначасова і адказна, і ганарова. Таму што здарылася гэта якраз у 1963 годзе, калі адзначалася стагоддзе з часоў паўстання пад кіраўніцтвам (на беларуска-літоўскіх землях) Кастуся Каліноўскага.

Памятаецца, што на пачатку 1963 года ў Мінску прайшлі сціплыя юбілейныя сходы і навуковыя пасяджэнні. Атмасфера на іх была напружаная: каб, не дай бог, нехта не сказаў лішняга. А што магло быць лішняе, крамольнае? Характарыстыка паўстання не як сацыяльна-мужыцкага, а як нацыянальна-

вызваленчага («Гэта там, у Польшчы, бунтавала шляхта, а беларуская ж нацыя заставалася сялянскай»). Не тая цытата з «Мужыцкай праўды». Ці, урэшце, адно слова «маскаль», якім Каліноўскі называў салдат царскай арміі... Праўда, ужо чуліся галасы і «аб'ектывістаў»: дык якое ж тое паўстанне сялянскае, калі мужыкі выдавалі «інсургентаў» царскім уладам, асабліва на Ігуменшчыне?! Іншадумцаў абрывалі на паўслове, здымалі іх артыкулы з газетных і часопісных палос.

І раптам па Мінску пайшла пагалоска, што ў Дзяржаўным выдавецтве БССР Уладзімір Дамашэвіч рэдагуе, рыхтуючы да друку, «зусім іншую, праўдзівую кнігу» пра паўстанне 1863 года. На аўтара ціснуць, каб выкінуў з рукапісу «нацыяналістычныя» мясціны. А рэдактар яго абараняе: які нацыяналізм? Аўтар — рускі па пашпарце, нарадзіўся ў Каломне, вучыўся ў Маскве, пасля чаго яго паслалі працаваць у Вільнюс, каб навёў парадак у літоўскай гістарыяграфіі. А яго бацька працаваў у органах бяспекі... З такімі, часам наўмысна гіпербалізаванымі, аргументамі спрачацца было цяжка, і недзе пад канец вясны выйшла сціплая, але аб'емістая (пад 300 старонак) кніжка ў зеленаватай вокладцы. Тыраж у 3500 экзэмпляраў разышоўся імгненна.

Чым жа прываблівалі «Сейбіты вечнага»? Найперш свежым, непрадузятым поглядам на паўстанне 1863–1864 гадоў. Праяўляючы сапраўднае майстэрства ў рэстаўрацыі мінулага, абапіраючыся на працы сваіх аднадумцаў (беларус С. Александровіч, літовец С. Лазутка, масквічы А. Смірноў і М. Міско, варшавянін В. Кардовіч), Генадзь Кісялёў аргументавана даказаў, што паўстанцы найперш ставілі перад сабой нацыянальна-вызваленчыя мэты, пакідаючы сацыяльныя на пасля, што падзел ішоў не столькі па нацыянальнай

прыналежнасці, колькі па поглядах. «Чырвоныя», да якіх, безумоўна, належалі Кастусь Каліноўскі (аўтар тут трапна выкарыстаў цытаты з «Мужыцкай праўды») і Францішак Багушэвіч (таксама ўдзельнік паўстання), супрацьстаялі «белым», прыхільнікам класавай згоды (асабліва ў час паўстання). Што ж датычыцца асцярожнага Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, то ён унутры заставаўся «чырвоным» (прынамсі, такое меркаванне ўва мне ўзмацнілася пасля прачытання «Сейбітаў вечнага»), але, прымушаны да мімікрыі жыццёвымі абставінамі, вонкава імкнуўся выглядаць «белым» або і недатычным да паўстання.

«Сейбітамі вечнага» Генадзь Кісялёў фактычна аспрэчыў думку тагачасных артадаксальных гісторыкаў, якія безагаворачна абвяшчалі паўстанне «сялянскай вайной». Наадварот, шматлікія факты сведчылі, што пасля рэформы 1861 года, праведзенай прадбачліва, узрасла вера ўчарашніх прыгонных у «добранькага цара», іх лёгка было пераканаць, што паўстанцы жадаюць вярнуць не «пальшчызну», а «паншчыну», а таму іх трэба выдаваць царскім уладам, што і рабілася ў Цэнтральнай і Усходняй Беларусі. Аднак на Віленшчыне, Гродзеншчыне, Беласточчыне і Ковеншчыне паўстанне сапраўды мела больш сацыяльны характар, бо «беламу жонду» тут супрацьстаялі такія перакананыя дэмакраты, як Каліноўскі, Серакоўскі, Урублеўскі, Мацкявічус. Першы з іх нават заклікаў да знішчэння шляхты. Якой? «Шарачковай», блізкай да разначынства? Зразумела, не. Тых землеўласнікаў, што, баючыся за свае абшары, ішлі на супрацоўніцтва з царскім чыноўніцтвам. Генадзь Кісялёў, бадай, упершыню так пераканаўча і нават вобразна паказаў, дзе праходзілі сацыяльныя лініі падзелу ў тагачасным грамадстве.

Адначасова аўтар «Сейбітаў вечнага» не прыхарошваў сваіх асноўных дзейных асоб, не замоўчваў, а тлумачыў іх сапраўдныя ці ўяўныя супярэчнасці. Па-першае — ідэалізацыю мінулага, выкліканую ўплывам польскага, ды і свайго нацыянальна-вызваленчага руху. Яго ўдзельнікі ставілі перад сабой канкрэтную мэту: перамога над царскай уладай патрэбна, каб спярша адрадзіць былую, тады падзеленую Рэч Паспалітую разам з яе Вялікім Княствам Літоўскім, а потым ужо заняцца этнічнымі размежаваннямі. Па-другое, гэта прыхарошванне міжэтнічных і міжкласавых адносін. Зрэшты, не было часу і патрэбы абвастраць сваркі, калі трэба было аб'яднаць для паўстання ўсе магчымыя сілы.

Ну а Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, класік новай беларускай літаратуры, 200-годдзе з дня нараджэння якога мы толькі што адзначалі пад эгідай ЮНЕСКА? Як ён суседнічаў у «Сейбітах вечнага» з рэвалюцыянерам Кастусём Каліноўскім? Памятаецца, калі ў 1959 годзе я паступіў у аспірантуру акадэмічнага Інстытута літаратуры, аўтар «Гапона» ўсё яшчэ лічыўся нечым сярэднім паміж шляхецкім лібералам і шляхецкім рэакцыянерам («шляхецкі» ўспрымалася нават горш, чым «дваранскі» — нягледзячы на беднасць, «шарачковасць» шляхты, бо дваранства было ўсё ж рускае, з яго выйшлі дзекабрысты, а шляхта, хаця і «тутэйшая», атаясамлівалася з «польскасцю», таму і трэба яе, маўляў, разглядаць толькі як класавага ворага). Бо як жа так: Гапон, чалавек з народа, які выбіўся ў афіцэры, замест таго, каб адпомсціць аканому, свайму ранейшаму крыўдзіцелю, высакародна даруе яму правіны…

Генадзь Кісялёў, па-мойму, першы (ці, больш дакладна, удваіх са Сцяпанам Александровічам) даказаў ужо сваёй

першай кніжкай, што Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча мы таксама маем права аднесці да тых змагароў, якія, гаворачы словамі Мікалая Някрасава, сеялі разумнае, добрае, вечнае. У «Сейбітах вечнага» пераканаўча паказана, што першы беларускі прафесійны пісьменнік блізка стаяў да аўтара і выдаўца палымянай «Мужыцкай праўды». Хоць, у адрозненне ад сваіх дачок, пасля паражэння паўстання Дунін-Марцінкевіч выратаваўся ад ссылкі, але паліцэйскі нагляд за ім у Люцінцы арганізавалі пільны.

Дуніну-Марцінкевічу, як і Каліноўскаму, як і Багушэвічу, Генадзь Кісялёў заставаўся верным усё сваё навукова-творчае быццё. Першаму з іх прысвечана кніга «Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча» (1988), многія старонкі ў манаграфіі «Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст.» (1993) і г. д.

У апошнія гады жыцця даследчык таксама працаваў у інстытуце над планавым зборнікам дакументаў і матэрыялаў пра аўтара «Гапона». Але ў тыя ж гады ён нечакана для мяне і іншых калег «здрадзіў» і Дуніну-Марцінкевічу, і ўсяму любімаму XIX стагоддзю і, адступіўшы на тры з лішкам стагоддзі назад, узяўся за Францыска Скарыну, яго геральдычныя знакі. Пачаў сваю апошнюю кніжку, якая тут прэзентуецца чытачу.

Пераход з адной эпохі, прытым добра абжытай, у іншую, аддаленую ў часе і мала знаёмую, мне здаецца навуковым подзвігам. Чым ён у дадзеным выпадку тлумачыцца? Мабыць, гаспадарлівасцю Генадзя Кісялёва як літаратуразнаўца, гісторыка і патрыёта. Прысутнічаючы на пасяджэннях аддзела старой беларускай літаратуры, слухаючы абмеркаванні прац па скарыназнаўстве, ён, як кажуць, нутром адчуваў

непарадак у асэнсаванні спадчыны нашага першадрукара. Калі набліжаўся скарынаўскі юбілейны год, усе нібыта дружна накінуліся на звязаную з ім праблематыку, а потым гэтак жа дружна, за выключэннем Вячаслава Чамярыцкага і Георгія Галенчанкі, адмовіліся ад яе.

І цяпер мы маем тое, што маем. Калі гаворка заходзіць нават пра асноўныя факты жыццяпісу нашага першадрукара, то мы дакладна ведаем толькі яго прозвішча, імя, прынятае пасля другога, каталіцкага, хрышчэння, імя па бацьку, імя брата ды яшчэ месца нараджэння. Нам невядома ні дакладная дата яго нараджэння (наўрад ці гэта мог быць 1490 год), ні дата і месца смерці, месца пахавання. Каб закрыць такія істотныя лакуны, розныя даследчыкі звярталіся і звяртаюцца да сімвалаў, у тым ліку геральдычных, інтэрпрэтуюць іх з сумніцельных пазіцый астралогіі. І ў выніку ў аўтарытэтных выданнях (не называю іх, бо прадмова — не месца для дыскусій з трэцімі асобамі) з'яўляюцца звесткі, што імя Скарыны — не Францыск, а (наперакор яго ж волі) Георгій (у яго сапраўды першапачаткова павінна было быць праваслаўнае імя, але якое — мы не ведаем), што быў ён не каталікам і не праваслаўным, а пратэстантам, што нарадзіўся ён дакладна 3 красавіка 1476 года, а памёр (таксама дакладна) 21 чэрвеня 1551 года і чамусьці не ў Чэхіі, а ў Падуі. І доказы таму даваліся не дакументальныя, а ірацыянальныя, заснаваныя на астралагічным тлумачэнні тых жа знакаў-сімвалаў.

Не, скрупулёзны і рэалістычны Генадзь Кісялёў з такім самавольствам не мог мірыцца. Ён павінен быў усё нанава сабраць, узважыць, каб прыйсці да аб'ектыўных абагульненняў. Вось чаму ён сваю апошнюю працу «Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі» распачаў з

гістарыяграфічнага раздзела «Сімволіку Скарыны чытаюць даследчыкі», дзе аналіз знакаў на партрэце вялікага гуманіста распачаў з выказвання ад'юнкта Пецярбургскай Акадэміі навук Іаана Готгільфа Штрытэра (1783) і закончыў сцвярджэннямі нашых сучаснікаў: беларусаў Уладзіміра Агіевіча і Георгія Галенчанкі, англічаніна Гая Пікарды, рускага Яўгена Неміроўскага. А паміж імі — дзесяткі пунктаў гледжання, добрая сотня дыскутантаў. Сярод іх — самыя розныя асобы: вучоныя і настаўнікі, пісьменнікі і скульптар. Спатрэбілася тытанічная праца, каб сабраць усё гэта, сістэматызаваць, аддзяліць зерне ад мякіны. Акцэнтаваць увагу на тым, што мае перспектывы, прыдатнае для абагульненняў.

А далей даследчык засяроджвае ўвагу на найбольш істотных сімвалічных знаках, якія акаляюць на партрэце асобу Скарыны. Найперш гэта сонца і паўмесяц («сонца маладзіковае» паводле паэтычнага вызначэння Алега Лойкі), затым — «трохкутнік» і «чатырохкутнік» з рознымі варыяцыямі. Безумоўна, яны былі вядомыя, знаёмыя чытачам Бібліі, бо інакш, як слушна заўважае аўтар, навошта было б іх змяшчаць. Відаць, гэта генеалагічныя «ўказальнікі», пазнавальныя элементы гербаў? Толькі чыіх? Найперш, мусіць, фундатараў, якія ўкладвалі ў выданне сродкі, прытым немалыя.

Найбольш важным па аналогіях, доказах і высновах здаецца мне трэці раздзел «кнігі апошняй» — «Сацыяльная апора дзейнасці Скарыны, яго паплечнікі». Бо сапраўды: каму было патрэбна друкаванае (значыць, адносна таннае) і зразумелае, у нейкай ступені энцыклапедычнае, з тлумачэннямі «на боцех», выданне Бібліі? Каралю Польшчы і вялікаму князю літоўскаму Жыгімонту I Старому ці яго сыну Жыгімонту II Аўгусту? Наўрад ці: яны, хоць і выхадцы з дынастыі

Ягелонаў, а, значыць, і нашчадкі Соф'і (Сонькі) Гальшанскай, ужо аддаліліся ад Русі, яе патрэб і яе мовы. Адукаванай жонцы першага з іх Боне з італьянскага роду Сфорцаў? Яе задавальняў «святы» лацінскі тэкст Бібліі. Праваслаўнаму духавенству? Яно прызвычаілася да царкоўнаславянскага перакладу Кірылы і Мяфодзія. Сялянству? Асноўная яго маса заставалася непісьменнай. Выходзіць, толькі тагачаснаму «сярэдняму», «трэцяму класу», у які ўваходзілі купцы, гараджане, да якога прымыкала найбольш адукаваная шляхта, што ў еўрапейскіх універсітэтах пазнавала ідэі Рэнесансу.

Жыхары Вільні Багдан Онкаў і Якуб Бабіч, брат Францішка Іван, таямнічы Федка Калантаеў, які жыў на Навагрудчыне і таксама меў дачыненне да кананічных тэкстаў, якраз выйшлі вось з гэтага трэцяга саслоўя. Людзі дынамічныя, яны разумелі, што слова Божае, слова друкаванае патрэбна для развіцця грамадства, і таму ж, напэўна, укладалі сродкі ў пражскія выданні Скарыны. Не выпадкова, што ў іх, у адрозненне ад пазнейшых віленскіх, канфесійныя рознагалоссі паміж каталіцтвам і праваслаўем не завастраліся, не падкрэсліваліся, а наадварот, згладжваліся (гэтае пытанне патрабуе спецыяльнага даследавання). Бо, вынікае з «кнігі апошняй», пражскія выданні, ажыццёўленыя з дапамогай, як сёння мы сказалі б, спонсараў, адрасаваліся **ўсім хрысціянам**. А нешматлікія віленскія выданні, якія заказваліся, відаць, праваслаўным духавенствам, ужо арыентаваны найперш на ўсходняе веравызнанне, на праваслаўны «люд посполиты».

Асобна хачу спыніцца на падраздзеле «Каралеўскі дваранін Федка Калантаеў». Некаторым чытачам ён можа паказацца сумным, перагружаным другараднымі фактамі. Але гэтыя факты былі патрэбны аўтару, каб упершыню ад-

казаць на пытанне, чаму віленскі мысліцель Іаахім Лялевель (а ён ведаў многае з недаступнага сённяшнім даследчыкам) звязаў Скарыну з Калантаевым, разглядаючы адзін з генеалагічных знакаў. Для гэтага Генадзю Кісялёву спярша спатрэбілася высветліць, што Калантаеў усё ж меў дачыненне да літургічнага пісьменства, бо сам каля 1519 года перапісаў Мінею, што гэты род гняздзіўся ў Паланой на Навагрудчыне і быў дастаткова заможным, таму што ўзбройваў у выпадку ваеннай патрэбы семярых вершнікаў. Выяўленыя факты сведчаць пакуль што толькі пра магчымасць кантактаў «неардынарнай» асобы Федкі Калантаева з яшчэ больш неардынарным беларускім першадрукаром.

Аднак галоўныя адкрыцці і абагульненні аўтар бачыў наперадзе. Нездарма ён прасіў у кіраўніцтва акадэмічнай літаратуразнаўчай структуры, якая яўна не разумела самога Генадзя Кісялёва і важнасці яго тэмы, яшчэ тры гады тэрміну, каб завяршыць распачатую фундаментальную работу. Зрэшты, аўтар і сам піша пра гэта ў кароценькім справаздачным «Заключэнні»: «Такім чынам, намі пройдзена ўжо значная частка намечанай дарогі ў абраным кірунку па даследаванні сімволікі Скарыны». І далей: «Назапашаны, сістэматызаваны і прааналізаваны немалы матэрыял, які толькі часткова ўвайшоў у напісаныя раздзелы і параграфы».

Затым Генадзь Кісялёў коратка сфармуляваў тое, што яму ўжо ўдалося зрабіць. А ўдалося багата: па-першае, пераканаць сябе і чытача ў геральдычным характары скарынаўскай сімволікі, па-другое, «умацавацца ў думцы», што Скарына ў такой, сімвалічнай, форме выказваў падзяку сваім «паплечнікам», якія фінансава дапамагалі яму выдаваць у Празе пераклад Бібліі. Па-трэцяе, паказаць, што гэтымі

«партнёрамі» выступілі прадстаўнікі «трэцяга саслоўя»: пад «трохкутнікам» меліся на ўвазе брат Іван, Бабіч і, магчыма, Фёдар Калантаеў, пад «трапецыяй» — Богдан Онкаў.

Завяршэнне «кнігі апошняй» аптымістычнае: «З цягам часу наша папярэдняе размеркаванне "роляў" дзейных асоб у атачэнні Скарыны будзе ўдакладняцца як у выніку выяўлення новых геральдычных і біяграфічных крыніц, так і ў выніку больш глыбокага прачытання і асэнсавання ўжо вядомых матэрыялаў». На жаль, на «больш глыбокае прачытанне і асэнсаванне» часу ўжо не засталося. А яно абавязкова было б. Не бачачы ўперадзе рэальнага выніку, Генадзь Кісялёў слоў на вецер не кідаў.

Атрыманы вынік я б назваў «Уводзінамі ў скарынаўскую геральдыку». А яшчэ — навуковым дэтэктывам.

Такім чынам, чытачу прапануецца песня вясновая, жаўруковая, і песня асенняя, жураўліная, нястомнага даследчыка-пісьменніка. А паміж імі стаяла гарачае і працавітае лета.

Адам Мальдзіс,
доктар філалагічных навук, прафесар,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі



Г. В. Кісялёў. 1960-я гады

Сейбіты вечнага:

артыкулы
пра беларускіх пісьменнікаў
і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года

Ад аўтара

Гэта кніга пра мужных сыноў Беларусі — удзельнікаў гераічнага паўстання 1863 года, накіраванага супраць засілля царызму і прыгонніцтва.

Падзеі 1863 года заўсёды будуць вабіць нас глыбокім інтэрнацыяналізмам. Лозунг «За нашу і вашу свабоду!» быў баявым клічам паўстанцаў. У агні баёў гартаваўся рэвалюцыйны саюз беларускага, рускага, польскага і літоўскага народаў. Менавіта ў гэтыя гады ўзнік беларускі рэвалюцыйны друк, прагучаў мужны голас «Мужыцкай праўды», нарадзілася беларуская сялянская дэмакратыя, якая адыграла ў паўстанні выдатную ролю.

У цэнтры кнігі фігуры трох беларускіх рэвалюцыянераў-шасцідзесятнікаў — Кастуся Каліноўскага, Антона Трусава, Францішка Багушэвіча. Па-рознаму склаўся іх лёс, але ўсе яны аднолькава самааддана — зброяй і словам — змагаліся за народнае шчасце, усе яны да апошняга дыхання, гаворачы словамі М. Някрасава, сеялі разумнае, добрае, вечнае.

Ёсць у кнізе артыкул пра Вінцука Дуніна-Марцінкевіча. Да гэтага мы прывыклі на падставе творчасці лічыць беларускага паэта слабым і саладжавым, які баяўся сказаць гнеўнае слова супраць паноў, абыходзіў галоўныя пытанні эпохі.

Але ёсць і другі Дунін-Марцінкевіч — моцны духам змагар за беларускую нацыянальную культуру, дэмакрат, які патрабаваў павагі да селяніна і ўзнімаўся да ўзроўню перадавых людзей свайго часу. Такі Дунін-Марцінкевіч і сам належыць да вечнага.

У заключэнне не магу не выказаць сардэчнай падзякі Р. В. Шкрабе, С. Х. Александровічу (Мінск), У. Б. Бікулічу і Г. К. Орду (Вільнюс) за шчырую дапамогу ў рабоце над гэтай кнігай.

ВЯЛІКІ СЫН БЕЛАРУСКАГА НАРОДА КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ

— Каго любіш?
— Люблю Беларусь.
— Так узаемна!
Пароль віленскай рэвалюцыйнай
арганізацыі 1863 года

Праца гісторыка нагадвае руплівае майстэрства мастака-рэстаўратара: знімі асцярожна напластаванні пазнейшага часу, збяры разам кавалкі гістарычнай тканіны, улавіўшы істотнае, дамалюй страчаныя дэталі — і вобраз мінулага заззяе свежымі фарбамі, набудзе новае жыццё.

Справядліва гэта і ў дачыненні да гісторыкаў, якія займаюцца вывучэннем жыцця і дзейнасці вялікага беларуса, выдатнага рэвалюцыянера і асветніка, гарачага прыхільніка сяброўства беларускага, рускага, літоўскага і польскага народаў Кастуся Каліноўскага.

Калі змоўклі стрэлы і разбітыя паўстанцы 1863 года пакінулі поле бітвы, разгарэлася не менш упартая барацьба вакол духоўнай спадчыны, вакол ідэй, што натхнялі паўстанцаў. Асабліва многа коп'яў было паламана вакол імя Кастуся Каліноўскага.

Разгарніце кнігі, і вы пачуеце мноства галасоў. Адны з іх поўныя адкрытай варожасці і нянавісці, другія аддаюць штучным пафасам і салодкім ялеем, за якімі — страх і тая ж нянавісць. У гэтай спрэчцы, ці нават бітве за Каліноўскага, амаль не чуваць было галасоў яго блізкіх сяброў: яны, як і іхні

правадыр, належалі да тых людзей, што толькі з перамогай пакідаюць поле бойкі.

Знішчыўшы Каліноўскага фізічна, царскія каты не раз спрабавалі канчаткова дабіць яго справу і ідэю на старонках афіцыйнага друку. Але, выгнаны з афіцыйнай гістарыяграфіі, сапраўдны Каліноўскі, абаронца прыгнечаных, бясстрашны і няўлоўны Кастусь з народных паданняў, знайшоў прытулак у сэрцах простых людзей. І народ данёс гэты светлы вобраз да нашых дзён.

Сёння зноў і зноў ажываюць дарагія нам рысы пад разцом скульптара, на мастацкіх палотнах, у паэтычных радках і ў музычных творах. Зноў і зноў углядаюцца ў скупыя радкі крыніц гісторыкі, думаюць, спрачаюцца.

На шляху біёграфаў Каліноўскага ляжаць дзве вялікія перашкоды. Па-першае, звесткі і матэрыялы пра Кастуся Каліноўскага, якія дайшлі да нас, надзвычай бедныя і раскіданыя, па-другое, вельмі складанай была эпоха і абстаноўка, у якой давялося яму дзейнічаць і весці сваю самаахвярную барацьбу.

Нягледзячы на гэта, за апошнія гады з друку выйшла некалькі значных даследаванняў пра Каліноўскага. Ужо накоплены і вывучаны даволі вялікі матэрыял. Многа новых фактаў і назіранняў увялі ў навуковы ўжытак такія даследчыкі, як І. Лушчыцкі[1], А. Смірноў[2]. Працы аб Каліноўскім напісалі

---

[1] Лушчыцкі І. Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX в. Мінск, 1958.

[2] Смірноў А. П. Кастусь Каліноўскі ў паўстанні 1863 г. Мінск, 1959; Смирнов А. Кастусь Калиновский. М., 1959; Смирнов А. Ф. «Мужицкая правда» // Восстание 1863 г. и русско-польские революционные связи 60-х годов. М., 1960.

гісторыкі народнай Польшчы В. Кардовіч[3], К. Канкалеўскі[4], А. Баршчэўскі[5]. Праўда, яшчэ рана гаварыць, што задача стварэння па-сапраўднаму навуковай біяграфіі Каліноўскага вырашана, але ёсць ужо нямала добрых эскізаў, і з кожнаю новаю працай мы набліжаемся да мэты. Воблік вялікага змагара і асветніка, які яшчэ гадоў пятнаццаць назад успрымаўся нібы прывабны, абкружаны легендамі сілуэт з няяснымі абрысамі, напоўніўся ўжо ёмкім жыццёвым зместам.

І рэчаіснасць, як заўсёды бывае, аказалася багацейшай за ўсякія легенды.

1

Ішоў 1864 год, другі год гераічнага паўстання ў Польшчы, Літве і Беларусі супраць царскага самаўладства і прыгонніцтва. Гарэлі вёскі, падпаленыя царскімі катамі, па этапных дарогах у Сібір цягнуліся партыі асуджаных, лепшыя сыны народа гінулі на шыбеніцах і пад кулямі царскіх салдат, але тыя, што ўцалелі, працягвалі няроўную барацьбу...

Вечарам 28 студзеня ў генерал-губернатарскім палацы ў Вільні была атрымана шыфраваная тэлеграма. Яна не вельмі адрознівалася ад іншых, бо ўсе шыфраваныя тэлеграмы па-

---

[3] Kordowicz W. Konstanty Kalinowski. Rewolucyjna demokracja polska w powstaniu styczniowym na Litwie i Białorusi. Warszawa, 1955.

[4] Kąkolewski K. Konstanty Kalinowski i jego pisma w latach 1862–1864 // Z dziejów współpracy rewolucyjnej polaków i rosjan w drugiej połowie XIX w. Wrocław, 1956.

[5] Баршчэўскі А. Агляд публіцыстычна-літаратурнай спадчыны Кастуся Каліноўскага // Навукова-літаратурны зборнік і беларускі каляндар 1961 года. Беласток, 1960.

добны адна на другую. Яны нудныя, таму што нічога не гавораць. Тэлеграфіст абыякава запісваў калонкі лічбаў.

Але пад рукой дэшыфроўшчыка гэтыя лічбы набылі такую магічную сілу, што прывялі ў рух увесь палац і ўстрывожылі нават усемагутнага галоўнага начальніка шасці паўночна-заходніх губерняў генерала Мураўёва.

Вось што было ў тэлеграме:

«№ 28 на свентоянской улице в свентоянских мурах живет преступник калиновски воевода под именем виторженец в доминиканском доме живет госпожа баневич к ней обращаются агенты из других городов для указания места жительства калиновскаго и других она все знает...

полковник Лосев»[6].

Рэдкія пешаходы, што прабіраліся з ліхтарамі па сонных і вузкіх віленскіх вулачках, са здзіўленнем убачылі салдат, якія паспешліва ачаплялі так званыя Святаянскія муры — комплекс былых універсітэцкіх будынкаў па суседстве з рэзідэнцыяй Мураўёва.

Пачаўся вобыск.

На адной з лесвічных пляцовак паліцэйскіх сустрэў са свечкай у руках малады чалавек сярэдняга росту з буйнымі выразнымі рысамі твару і кароткімі зачасанымі назад валасамі. На пытанне, як яго імя, ён спакойна адказаў: «Вітажэнец» — і ў той жа момант быў арыштаваны.

---

[6] Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў (у далейшым — ЦДГА) Літ. ССР (цяпер Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы, у далейшым — ДГА Літвы. — *Рэд.*). Фонд 419. Вопіс 2. Спр. 190. Арк. 62. Юзэфа Баневіч, жонка дробнага чыноўніка, паходзіла з Ашмянскага павета і была гаспадыняй адной з канспіратыўных кватэр у Вільні. Якраз тут ужываўся пароль: «Каго любіш?»

Яго даставілі ў прыстасаваны пад турму будынак былога Дамініканскага кляштара, дзе засядала Асобая следчая камісія па палітычных справах. Вечарам наступнага дня арыштаваны, пераканаўшыся, што камісіі вядома яго сапраўднае імя, пацвердзіў, што ён сапраўды Кастусь Каліноўскі, правадыр паўстання ў Літве і Беларусі. Гэты дзень быў днём трыумфу для Мураўёва і яго памагатых.

Ідэйны праціўнік Каліноўскага па рэвалюцыйнай арганізацыі Якуб Гейштар, які сядзеў у той жа турме, успамінае, што пад камеры тут былі адведзены маленькія даволі чыстыя келлі манахаў. У гэтых адносінах у былым кляштары пачувалася значна лепш, чым, напрыклад, у змрочным будынку № 14 віленскай цытадэлі. І ўсё-такі «Дамініканы» былі самым нясцерпным месцам зняволення, бо тут мела сваю пастаянную рэзідэнцыю следчая камісія. У любы час дня і ночы ў камеру мог зайсці следчы і, прытворна пацікавіўшыся: «Не перашкаджаю?», сесці на крэсла ці на ложак. Некалькі з'едлівых, нахабных пытанняў, а праз чвэртку гадзіны пасля яго адыходу можна было чакаць новага «субяседніка»[7].

У камеры Каліноўскага бывалі не толькі члены следчай камісіі. Глянуць на «славутага злачынцу» хацеў кожны, хто мог атрымаць туды доступ. Быў у яго А. Н. Масолаў — чыноўнік канцылярыі Мураўёва, «малады чалавек бліскучых здольнасцей, які цудоўна валодае пяром і памяці вельмі добрай»[8], як характарызаваў яго калега па службе. Даверымся памяці Масолава: «Я бачыў яго ў турме за некалькі дзён да пакарання. Яму далі пяро і паперу і дазволілі свабодна вы-

---

[7] Gieysztor J. Pamiętniki z lat 1857–1865. Wilno, 1913. T. 2. S. 133, 156.

[8] Черевин П. А. Воспоминания: 1863–1865. Кострома, 1920. С. 3.

кладаць свае думкі. Ён напісаў выдатнай рускай мовай даволі цікавае разважанне пра адносіны рускай улады да польскага насельніцтва Заходняга краю, у якім між іншым выказаў думку пра негрунтоўнасць цяперашніх урадавых дзеянняў... »[9]

Прыгаданае Масолавым «разважанне» ёсць у следчай справе Каліноўскага. Гэта датаваная 28 лютым 1864 года запіска без загалоўка на чатырох аркушах паперы звычайнага канцылярскага фармату, спісаных на абодва бакі. Хоць у запісцы маецца шмат каштоўных фактаў і заўваг, яна не малюе поўнасцю сапраўднай палітычнай фізіяноміі Каліноўскага. Адчуваецца, што гэтая запіска носіць дапаможны характар і што Каліноўскі ўжо выказаў свае ідэйныя перакананні ў нейкім іншым дакуменце. Запіска пачынаецца наступнымі словамі: «У адным з папярэдніх тлумачэнняў я выказаў сваё перакананне наконт вырашэння польскага пытання, якое ўсведамляў **раней, чым паступіў у члены народнай арганізацыі** (вылучана мною. — *Г. К.*) у якасці ваеннага камісара Гродзенскай губерні. Гэта маё асабістае меркаванне»[10]. Такім чынам, яшчэ перад запіскай ад 28 лютага Каліноўскі напісаў (ці зрабіў у вуснай форме) некалькі «папярэдніх тлумачэнняў», але ў следчай справе іх няма. Больш за тое, у следчай справе наогул адсутнічаюць матэрыялы пра палітычныя погляды і рэвалюцыйную дзейнасць Каліноўскага за найбольш важны перыяд — да сакавіка

---

[9] Мосолов А. Н. Виленские очерки 1863–1865 гг.: (Из воспоминаний очевидца) // Русская старина. 1883. Т. 40. С. 608.

[10] Дело Временного полевого аудиториата о дворянине Гродненской губернии и уезда Викентии Калиновском. Начато 2 марта 1864 г. На 59 листах (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 280. Арк. 4).

1863 года, калі ўладу ў Вільні захапілі «белыя» і Каліноўскі накіраваўся ў якасці рэвалюцыйнага камісара ў Гродзенскую губерню. «Папярэднія тлумачэнні» Каліноўскага зніклі... Але ці бясследна?

Жыў у гэты час у Вільні адзін чалавек, перад якім расчыняліся дзверы турэмных адзіночак і сейфы следчых камісій. Гэта быў афіцыйны гістарыёграф Мураўёва, былы выкладчык Міхайлаўскага артылерыйскага вучылішча генерал В. Ф. Ратч, які складаў па даручэнні свайго патрона гісторыю мяцежных падзей у Літве і ў Беларусі. Гэты абмежаваны царскі служака выдаў у 1867–1868 гадах два тамы «Звестак пра польскі мяцеж 1863 г. у Паўночна-Заходняй Расіі». Паводле слоў Ратча, ён паклаў у аснову сваіх «Звестак» афіцыйную і захопленую ў паўстанцаў перапіску, следчыя справы, канфіскаваныя паперы, а таксама «вусныя паведамленні»[11]. Ён не абмяжоўваўся тым, што шырока выкарыстоўваў матэрыялы следчых камісій, а ў патрэбных выпадках непасрэдна звяртаўся да зняволеных, абяцаючы, відаць, пэўную далікатнасць у выкарыстанні атрыманых звестак. Гейштар, напрыклад, напісаў спецыяльна для яго аўтабіяграфічныя нататкі.

Натуральна, што Ратч не мог абысці такую выдатную асобу, як Кастусь Каліноўскі. Найбольш яркія старонкі «Звестак» прысвечаны якраз таму перыяду дзейнасці Каліноўскага, які не знайшоў адлюстравання ў архіўных дакументах. У «Звестках» перадаюцца выказванні Каліноўскага, часцей за ўсё, праўда, перайначаныя Ратчам. Відавочна,

---

[11] Ратч В. Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России. Вильна, 1867. Т. 1. С. II.

Ратч меў пад рукой нейкую невядомую нам крыніцу. Гэтай крыніцай былі, трэба думаць, «папярэднія тлумачэнні» Каліноўскага.

Цікавы лёс саміх «Звестак» Ратча. Мураўёў вельмі клапаціўся аб гэтай працы, спадзеючыся, што ў кнізе, якую рыхтаваў Ратч, сучаснікі і нашчадкі ўбачаць апраўданне яго жорсткасці. Нават пакінуўшы Вільню, ён яшчэ працягваў даваць Ратчу свае ўказанні і непасрэдна кіраваў яго работай. У пісьме Мураўёва Ратчу ад 28 чэрвеня 1865 года, напрыклад, чытаем: «Атрымаўшы пісьмо Вашага правасхадзіцельства ад 23 гэтага чэрвеня, вельмі шкадую, што пастаянныя раз'езды аддалілі на некаторы час заканчэнне пачатай Вамі працы; але разам з тым з асаблівым задавальненнем буду чакаць Вас да сябе ў палове будучага ліпеня месяца з магчыма поўнаю работаю аб ходзе апошняга мяцяжу»[12]. У 1866 годзе Мураўёў памёр, так і не ўбачыўшы «Звестак» у апублікаваным выглядзе. Выдаўшы два тамы, Ратч працаваў над трэцім, але вымушаны быў спыніць сваю работу з прычыны хваробы. У 1870 годзе ён памёр.

Ды і наогул Ратч не здолеў выканаць задачу, якую паставілі перад ім яго гаспадары. Гістарычная праўда была на баку рэвалюцыянераў, і Ратч не здолеў, нягледзячы на ўсе намаганні, проціпаставіць іх ідэям сваю праўду і пераканаць чытача. «Камяком бруду, які так цудоўна не трапіў у цэль»[13], называў працу Ратча А. І. Герцэн. Аднак «Звесткі» Ратча данеслі да нас, хоць і ў няпоўным, а часам і ў скажоным выглядзе, некаторыя думкі Каліноўскага, якія сведчаць аб спеласці

---

[12] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 439. Вопіс 1. Спр. 16. Арк. 1.

[13] Герцен А. И. Соч. М., 1960. Т. 19. С. 180.

яго рэвалюцыйна-дэмакратычных перакананняў і дазваляюць паставіць яго ў адзін шэраг з выдатнымі рэвалюцыйнымі дэмакратамі сярэдзіны XIX ст.

Яшчэ горшы лёс чакаў другога «літаратара» з памагатых Мураўёва-вешальніка па задушэнні паўстання — члена Асобай следчай камісіі М. В. Гогеля. Па іроніі лёсу, ён, як і Ратч, быў артылерыстам, толькі меў меншы чын. Зняволеныя віленскіх «Дамінікан» добра ведалі гэтую злавесную фігуру ў мундзіры армейскага паручніка. У ацэнцы яго сыходзяцца і рускія, і польскія мемуарысты. «Кожны раз, калі ўспамінаецца чаму-небудзь яго прозвішча, я адчуваю гаркату няздзейсненай помсты»[14], — піша член рускай рэвалюцыйнай арганізацыі 60-х гадоў «Зямля і воля» Л. Ф. Панцялееў, які пабываў у руках Віленскай следчай камісіі. Як і Ратч, Гогель акрамя сваёй вышукной дзейнасці займаўся яшчэ «літаратурай» і неўзабаве пасля паўстання выпусціў у Вільні кніжку «Іасафат Агрызка і Пецярбургскі рэвалюцыйны жонд у справе апошняга мяцяжу», у якой паклёпнічаў на слаўных барацьбітоў за волю, у тым ліку на Кастуся Каліноўскага і яго старэйшага брата Віктара. Пра вульгарны характар яго кніжкі досыць красамоўна сведчыць эпіграф да яе: «Як воўка ні кармі, усё ў лес глядзіць» (меўся на ўвазе польскі народ). Але матэрыял, выкарыстаны Гогелем, ніяк не ўкладваўся ў рамкі яго канцэпцыі. Царскія ўлады слушна палічылі, што Гогель робіць ім мядзведжую паслугу, і па загадзе генерал-губернатара амаль увесь тыраж другога выдання кніжкі Гогеля, якое выйшла ў 1867 годзе, быў знішчаны[15].

---

[14] Пантелеев Л. Ф. Воспоминания. М., 1958. С. 373.

[15] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1889 г. Спр. 10. Арк. 15–16.

Для нас кнігі Ратча і Гогеля маюць цікавасць таму, што аўтары іх карысталіся матэрыяламі, якіх мы, магчыма, ніколі не ўбачым. Так ці інакш, гэтыя кнігі, побач з мемуарамі Гейштара, з'яўляюцца такімі крыніцамі для біяграфіі Каліноўскага, якія нельга абысці. Само сабою зразумела, што трэба вельмі крытычна і асцярожна карыстацца імі.

У пачатку нарыса мы сказалі, што ў спрэчцы вакол асобы Кастуся Каліноўскага амаль не было чутна галасоў яго сяброў. Агаворку трэба зрабіць, бадай, толькі для Фелікса Ражанскага, паплечніка Каліноўскага па выданні «Мужыцкай праўды». На жаль, апублікаваныя ім мемуарныя нататкі[16] вельмі кароткія. Ражанскі пісаў іх у 1903 годзе, праз сорак гадоў пасля таго, як ён меў шчасце супрацоўнічаць з Каліноўскім, і, пэўна, многае ўжо сцерлася ў яго з памяці. Ды, відаць, ён быў значна слабейшы за свайго вялікага сябра і толькі на кароткі час пад яго непасрэдным магутным уплывам здолеў узняцца да тых вышынь рэвалюцыйна-дэмакратычнай думкі, якія знайшлі адлюстраванне ў нумарах «Мужыцкай праўды».

Да рэвалюцыі, калі гісторыкі не мелі доступу да запаветных папак царскіх устаноў, яны спадзяваліся, што аб дзейнасці Каліноўскага «маглі б хіба толькі тое-сёе расказаць тайныя следчыя архівы»[17]. Цяпер дзверы архіваў расчынены для нас. У Вільнюсе, Мінску, Гродне, Ленінградзе, Маскве знойдзена нямала дакументаў пра Каліноўскага. Яны, і ў першую чаргу следчая і студэнцкая справа Каліноўскага, шэраг іншых следчых спраў паўстанцаў 1863 года, а таксама матэ-

---

[16] Rożański F. Z województwa Grodzieńskiego // W czterdziestą rocznicę powstania styczniowego. Lwów, 1903.

[17] Licz [Abramowicz L.]. Konstanty Kalinowski // Gazeta Wileńska. 1906. 7 (20) сак. (№ 17).

рыялы асабістага архіва Ратча, маюць вялікае значэнне для біёграфаў выдатнага змагара. Аднак пошукі пакуль што трохі расчароўваюць, бо многія пытанні, і перш за ўсё сацыяльна-палітычныя погляды Каліноўскага, адлюстраваны ў вядомых архіўных матэрыялах недастаткова. Будзем спадзявацца на новыя адкрыцці.

Зразумела, найбольшую каштоўнасць маюць творы самога Каліноўскага, але аўтограф аднаго з галоўных яго твораў — «Пісьмы з-пад шыбеніцы» — невядомы[18], тэкст яго дайшоў да нас у скажонай публікацыі Агатона Гілера[19].

Палымяныя думкі Каліноўскага затушоўваліся і другім спосабам. Побач з сапраўднай «Мужыцкай праўдай» распаўсюджвалася «Пісьмо Яські-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай», якое ўжо даўно здавалася гісторыкам «загадкавым». Паводле амаль што аднадушнага заключэння даследчыкаў, гэты дакумент з'яўляецца падробкай дзеячаў гілерскага кірунку[20].

Нам здаецца, слушна даводзіць гэту думку А. Смірноў. «...Каліноўскі, — піша ён, — змацоўваў свае адозвы пячаткамі. Так, на загадзе аб уступленні яго на пасаду гродзенскага рэвалюцыйнага камісара стаіць пячатка з надпісам: „Урадавы камісар Гродзенскага ваяводства". Аднак „Пісьмо Яські-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай", якое

---

[18] Аўтограф трэцяй часткі «Пісьмаў з-пад шыбеніцы» быў пазней выяўлены У. Казберуком. Гл.: Кісялёў Г. Кастусь Каліноўскі, яго час і спадчына // Каліноўскі К. За нашую вольнасць: Творы, дакументы / Уклад., прадм., пасляcл. і камент. Г. Кісялёва. Мінск, 1999. С. 276. — *Рэд.*

[19] Do ludu białoruskiego: Pismo z pod szubienicy Konstantego Kalinowskiego // Giller A. Historja powstania narodu polskiego w 1861–1864 r. Paryż, 1867. T. 1.

[20] Kąkolewski K. Konstanty Kalinowski... S. 195.

выйшла ў той перыяд, калі Каліноўскі быў на Гродзеншчыне, мае пячатку не гродзенскага камісара, а пячатку друкарні Жонда нарадовага. Гэтую адозву змацаваў сваім імем Жонд, а не Каліноўскі»[21]. Сапраўды, біёграфу Каліноўскага трэба быць заўсёды напагатове, каб, узброіўшыся павелічальным шклом, адстаяць яго спадчыну. Толькі карыстаючыся ўсімі наяўнымі матэрыяламі, можна намаляваць праўдзівую карціну жыцця і дзейнасці вялікага беларускага рэвалюцыянера.

2

Кастусь (Канстанцін Вікенцій Сымонавіч) Каліноўскі нарадзіўся 21 студзеня (2 лютага па н. ст.) 1838 года ў маёнтку Мастаўляны[22], у цэнтры Гродзенскай губерні, на паўдарозе паміж Ваўкавыскам і Беластокам. Дзяцінства яго праходзіла ў фальварку Якушоўка, у дзесяці вярстах ад мястэчка Свіслач.

Мясцовасць гэтая, якая знаходзіцца на ўскраіне Белавежскай пушчы, калісьці называлася Чорнай Руссю. У часы, пра якія мы гаворым, яе, як і многія іншыя вобласці, што ўваходзілі ў мінулым у Вялікае княства Літоўскае, называлі часцей Літвой. Аднак, у сувязі з абуджэннем нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, усё больш упэўнена прабівалася з-пад тоўшчы сярэдневяковых умоўных назваў сапраўднае імя гэтай зямлі — Беларусь.

---

[21] Смирнов А. Ф. «Мужицкая правда». С. 22.

[22] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд Ваўкавыскага дэканата. Спр. 58. Арк. 10 адв. Вёска Мастаўляны знаходзіцца ў цяперашні час на тэрыторыі Польшчы, на самай граніцы з Беларуссю.

Дробная шляхта, да якой належалі бацькі Каліноўскага, была своеасаблівым, незнаёмым у рускіх губернях з'явішчам, народжаным грамадскім ладам «дваранскай рэспублікі» Рэчы Паспалітай. У Беларусі, Літве і на Украіне шляхты налічвалася дзесяткі і нават сотні тысяч. Усе, хто мог давесці сваё шляхецкае паходжанне, карысталіся ў Расіі дваранскімі правамі. Аднак па эканамічным становішчы, па жыццёвым побыце шляхта часта нічым не адрознівалася ад простых сялян. Былі нават такія прэтэндэнты на шляхецкае званне, якія не мелі чым заплаціць за гербавую паперу, каб давесці сваё дваранскае паходжанне. Інтэлігенцыя, якая выходзіла з дробнай шляхты, вельмі нагадвала рускую разначынную інтэлігенцыю. Карацей, слова «шляхціц» яшчэ нічога не гаворыць: шляхціц можа быць і лёкаем у багатага купца, і рамеснікам, і нават парабкам у заможнага селяніна.

Адносна маёмаснага становішча бацькоў Каліноўскага ў літаратуры да апошняга часу існавалі розныя думкі. Некаторыя сучаснікі называюць яго «сынам ткача», і гэта здавалася верагодным, бо, паступаючы ва універсітэт, ён падаў пасведчанне аб беднасці, а на пытанне следчай камісіі пра маёмасны стан адказаў: «Нерухомай маёмасці не маю»[23]. Другія гісторыкі лічылі, што бацька Каліноўскага быў дробным чыноўнікам, а потым прыказчыкам у ткацкай майстэрні[24].

Матэрыялы следства па справе бацькі Кастуся Каліноўскага (Сымон Сцяпанавіч быў арыштаваны 9 красавіка 1864 года, пасля пакарання сына, але праз некалькі месяцаў вызвалены і аддадзены пад строгі нагляд паліцыі) і іншыя да-

---

[23] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 280. Арк. 20.

[24] Перцаў В. Кастусь Каліноўскі // Полымя. 1945. № 9. С. 141.

кументы, апублікаваныя І. Лушчыцкім, дазваляюць аднавіць карціну маёмаснага становішча сям'і Каліноўскіх[25].

У 1835 годзе, незадоўга да нараджэння Кастуся, беззямельны шляхціц Сымон Каліноўскі з дапамогай астралэнцкага фабрыканта Ігнацыя Бонды заснаваў у Мастаўлянах, маёнтку памешчыка Радавіцкага, невялікую фабрыку льняных вырабаў на 12 варштатаў. Справа была новая і рызыкоўная. У Гродзенскай губерні тады развівалася пераважна суконная прамысловасць. Але спроба аказалася ўдалай, фабрыка давала добрую прадукцыю, і ў канцы 1840 года Бонда змог выдаць Сымону Сцяпанавічу пасведчанне аб тым, што яго вырабы «ні ў чым не саступаюць па сваёй якасці замежным».

Каля 1850 года Сымон Сцяпанавіч сумесна з другой жонкай, мачыхай Кастуся, купіў паблізу мястэчка Свіслач невялікі фальварак Якушоўка, у якім налічвалася 220 дзесяцін зямлі. Сюды неўзабаве была перавезена фабрыка з Мастаўлянаў. Здавалася б, матэрыяльны дабрабыт Каліноўскіх стаў на трывалую глебу, але сям'я была вялікая (ад двух шлюбаў Сымон Сцяпанавіч меў семнаццаць дзяцей), і яго сынам Кастусю і Віктару давялося ўласнымі сіламі прабіваць сабе дарогу.

На падставе знойдзеных дакументаў вырашаецца і яшчэ адно пытанне, звязанае з паходжаннем Кастуся Каліноўскага. Гаворка ідзе аб яго нацыянальнай прыналежнасці. У новых працах савецкіх і польскіх гісторыкаў пераканаўча даказваецца, што Каліноўскі быў беларус.

Аб гэтым красамоўна сведчыць мова яго асноўных твораў, сведчыць неаднаразова з вялікай сілай выказанае ім пачуццё

[25] Лушчыцкі І. Н. Нарысы па гісторыі... С. 171–176; яго ж. Сацыяльна-палітычныя погляды Кастуся Каліноўскага // Полымя. 1949. № 8. С. 124.

непарыўнай роднасці з народам Францішка Скарыны («мой народ» — так фармуляваў Каліноўскі свае адносіны да беларусаў); гэта даказвае ўся сутнасць яго барацьбы, якая вялася перш за ўсё ў інтарэсах беларускага народа, беларускіх сялян; урэшце, аб гэтым гаворыць і месца, якое займае Кастусь Каліноўскі ў гісторыі Беларусі.

Дакументы, уведзеныя ў навуковы ўжытак А. Смірновым[26], даводзяць, што генеалогія Каліноўскіх як мясцовай шляхты прасочваецца з 1679 года, калі іх продак Амброзій Самойлаў Каліноўскі набыў у Бельскай зямлі[27] маёнтак і ўчыніў купчую ў Бранскім судзе. З гэтай пары Каліноўскія тут і жылі, жаніліся, вялі судовыя спрэчкі з суседзямі, аб чым сведчаць запісы ў кнігах Бранскага суда, аж пакуль Бранск не ператварыўся ў заштатны горад Бельскага павета Гродзенскай губерні. Але яшчэ напярэдадні гэтага, у 1769 годзе, прадзед Кастуся Мацей быў вымушаны прадаць маёнтак, і Каліноўскія сталі беззямельнай шляхтай.

Разам з тым маюць рацыю і польскія гісторыкі, калі гавораць, што продкі Каліноўскага паходзілі з Польшчы. Справа ў тым, што ў дэкрэце «аб шляхецкай радавітасці фаміліі высакародных Каліноўскіх»[28] Амброзій Каліноўскі названы «мечнікам Візскай зямлі», г. зн., калі верыць гэтаму дакумен-

---

[26] Смірноў А. Кастусь Каліноўскі і яго сябры // Беларусь. 1956. № 4. С. 26.

[27] Цяпер Бельшчына ўваходзіць у склад Польшчы, але тут некалі ўладарылі рускія князі, і ў XVII–XIX стст. яна лічыла сябе Літвой (г. зн. Беларуссю), а не Польшчай.

[28] Дело Совета императорского Московского университета о принятии в студенты Виктора Калиновского (Дзяржаўны гістарычны архіў Маскоўскай вобласці (у далейшым — ДГАМВ (цяпер Цэнтральны гістарычны архіў Масквы, у далейшым — ЦГАМ. — *Рэд.*)). Фонд 418. Вопіс 21 (1852 г.). Спр. 303. Арк. 5.

ту, паходзіў з паўночна-ўсходняй часткі Мазовіі. Аднак трэба адзначыць, што Візская (Візенская) зямля была пагранічнай з Беларуссю і Літвой і адзін час нават уваходзіла ў склад рускіх княстваў. Гэта адбілася на складзе яе насельніцтва. Напрыклад, па люстрацыі 1660 года ў ваколіцах Візны меліся вёскі Рус і Літва[29]. Як бы там ні было, але за паўтараста гадоў жыцця на Гродзеншчыне Каліноўскія поўнасцю зліліся з навакольнай беларускай шляхтай і, трэба думаць, нічым не адрозніваліся ад яе.

Аднак самае скрупулёзнае даследаванне шляхецкіх радаслоўных і самыя цікавыя экскурсы ў глыб шляхецкай генеалогіі яшчэ не даюць адказу на пастаўленае намі пытанне. Дробныя факты яшчэ больш мізарнеюць перад адным вялікім фактам. Вядома, што да пачатку XIX ст. беларуская шляхта была, калі не поўнасцю, дык у значнай ступені, паланізавана. Відавочна, пытанне аб нацыянальнасці Каліноўскага нельга вырашаць без уліку гэтага факта.

І мае рацыю В. Кардовіч, калі звязвае гэтае пытанне з праблемай фарміравання беларускай нацыі. У XIX ст. у сувязі з развіццём капіталізму і ростам нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа адбываўся працэс беларусізацыі паланізаванай і нават польскай шляхты. Невыпадковай з'яўляецца тая акалічнасць, што якраз шляхта вылучыла першых буйных прадстаўнікоў беларускай культуры (В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч і інш.). «Пад такі працэс беларусізацыі польскіх элементаў у Беларусі ў палове XIX ст., — піша В. Кардовіч, — падпала, бясспрэчна, сям'я

[29] Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów sławiańskich. Warszawa, 1893. T. 13. S. 685–687.

Каліноўскага, а асабліва Канстанцін. З бескампраміснага, паслядоўнага польскага рэвалюцыйнага дэмакрата, які на землях Літвы і Беларусі абвяшчаў, згодна з праграмай гэтага палітычнага руху, сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускіх сялян, стаў Каліноўскі... беларусам»[30]. Для нас важна адно: у вялікім нацыянальным размежаванні, надзвычай характэрным для XIX ст., Каліноўскі зусім ясна выявіў свой нацыянальны твар, грунтоўна і канчаткова стаўшы на бок беларусаў. Больш за тое, Каліноўскі ўвабраў, увасобіў у сабе лепшыя рысы нацыянальнага характару беларускага народа і, побач з іншымі выдатнымі дзеячамі, стаў яго сімвалам, яго сцягам. У такім жа прыблізна плане вырашае пытанне і К. Канкалеўскі: «Сапраўдным выразнікам вызваленчых імкненняў і абуджанай нацыянальнай свядомасці беларусаў, якія ў працэсе пераходу ад феадалізму да капіталізму станавіліся нацыяй, быў перш за ўсё Канстанцін Каліноўскі»[31].

Нам хацелася б зрабіць толькі адну невялікую і, бадай, непрынцыповую папраўку да слоў Кардовіча: безумоўна, Каліноўскі адчуў сябе сынам прыгнечанага народа, шчырая мова якога спадарожнічала яму з першых жа дзён жыцця, значна раней — яшчэ да таго, як ён стаў рэвалюцыйным дэмакратам, інакш былі б незразумелымі шляхі, якія прывялі яго да рэвалюцыйнага дэмакратызму.

У сям'і Каліноўскіх, як і ва многіх іншых больш-менш культурных шляхецкіх сем'ях Беларусі, размаўлялі на трох мовах: па-польску — з панам і ксяндзом, па-беларуску — з

---

[30] Kordowicz W. Konstanty Kalinowski... S. 286.
[31] Kąkolewski K. Konstanty Kalinowski... S. 188.

селянінам і засцянковым шляхціцам, па-руску — з салдатам ці з чыноўнікам з «унутраных (як тады гаварылі) губерняў». А то бывала, што прывандруе на лясныя промыслы цэлая арцель сялян-адыходнікаў аднекуль з-пад Калугі ці завітае маскоўскі тарговы чалавек з «красным таварам» (непадалёк быў славуты Зэльвенскі кірмаш).

Духоўнае развіццё Каліноўскага праходзіла ў атмасферы сутыкнення некалькіх культур. Тут, на беларускай зямлі, аднолькава любілі і Міцкевіча, і Пушкіна. Іх кнігі стаялі на паліцы побач. І тут жа можна было сустрэць сшытак з перапісаным ад рукі «Тарасам на Парнасе». Невядомы аўтар яго глядзеў на свет вачыма селяніна. Паэма была безназоўнай, як быў безназоўным і безгалосым увесь той народ, што расчысціў зямлю пад раллю, правёў дарогі, пракапаў каналы, пабудаваў прыгожыя палацы. На мове ўрадавых папер гэта былі прыгонныя, унесеныя ў «рэвізскія казкі», і імі цікавіліся толькі тады, калі трэба было спагнаць нядоімкі.

Тысячу гадоў араў гэтую скупую зямлю беларускі селянін, тысячу разоў кідаў у яе зерне — і нічога, здавалася б, не мянялася: тая ж курная хата, тая ж саха, тая ж «кабылка буланая», як пры Уладзіміры Краснае Сонейка. Дзесяць стагоддзяў прастаяў над селянінам панскі цівун з бізуном, нават не змяніўшы свайго наймення. Гэты парадак ахоўваўся па чарзе «Рускай праўдай», літоўскімі статутамі, «Зводам законаў Расійскай імперыі».

І ўсё ж такі жыццё мянялася. У першай палове мінулага стагоддзя ў эканоміцы Беларусі, як і ўсёй Расіі, выразна вызначыліся з'явы, якія ў сукупнасці мы называем цяпер «крызісам прыгонніцкай гаспадаркі». Ледзь чутнае пастукванне апаратаў Морзе, гудкі першых цягнікоў і параходаў праспявалі ўжо

адыходную песню феадалізму. Спроба памешчыкаў выйсці з крызісу цаной небывалай эксплуатацыі і разарэння асноўнай масы сялян прыводзіла да адваротнага выніку. З выгляду ціхія вёскі капілі пад саламянымі стрэхамі нянавісць, гатовую перакінуцца на панскія сядзібы полымем новай сялянскай вайны.

Такою была глеба, што нараджала вялікія рэвалюцыйныя тэмпераменты. Такімі былі дзіцячыя і юнацкія ўражанні Каліноўскага, якія падрыхтавалі яго да ўспрымання вялікіх вызваленчых ідэй, выпрацаваных рускай рэвалюцыйнай дэмакратыяй і лепшымі прадстаўнікамі польскага рэвалюцыйнага руху.

Гэта адбылося ўжо ў наступны перыяд жыцця Каліноўскага, калі ён, скончыўшы ў 1855 годзе Свіслацкае дваранскае вучылішча, пасля папярэдняй падрыхтоўкі паступіў у Пецярбургскі універсітэт на юрыдычны факультэт, «па разрадзе камеральных навук»[32].

Вучылішча ён скончыў у цяжкія часы.

У справаздачы аб стане навучальных устаноў за 1855 год дырэктар вучылішч Гродзенскай губерні запісаў: «Асобыя здарэнні. Іх уласна па вучэбным ведамстве не здарылася; але да грамадскіх трэба аднесці значную смяротнасць ад халеры і тыфознай гарачкі, якія лютавалі летась, таксама празмерную дарагоўлю і адчувальнае незадавальненне харчовых патрэб ад неўраджаяў у Гродзенскай губерні, што былі некалькі гадоў запар. Усё гэта выклікала змяншэнне ліку навучэнцаў»[33]. У Свіслацкім вучылішчы засталося трыццаць-сорак вучняў. А тут жа калісьці была славутая на ўсю Беларусь і Літву

---

[32] Разрад меў на мэце «падрыхтоўку людзей, здольных да службы гаспадарчай ці адміністрацыйнай».

[33] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 567. Вопіс 3. Спр. 293. Арк. 93.

гімназія. Нават шляхта на сеймікаx з горыччу ўспамінала, «што ў час існавання ў Свіслачы гімназіі знаходзілася ў ім (у вучылішчы. — *Г. К.*) па некалькі сот вучняў, хаця былі гімназіі і ў Гродне і Беластоку», і ламала галаву над тым, як вярнуць «гэтаму месцу ранейшы яго бліскучы стан»[34]. Але гэта былі толькі размовы.

3

Ніколі яшчэ Пецярбург не жыў такім напружаным грамадскім жыццём. У вышэйшых урадавых сферах, напалоханых ростам сялянскага руху, ішла падрыхтоўка да сялянскай рэформы. З другога боку, у абставінах бурнага грамадскага руху, выкліканага паражэннем царскай Расіі ў Крымскай вайне, выспявалі ідэі рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі, якая паклала ў аснову сваёй праграмы патрабаванне ліквідаваць памешчыцкае землеўладанне і прызнаць права народаў на самавызначэнне і стала найвышэйшым дасягненнем перадавой грамадскай думкі дамарксавага перыяду.

У сціплым доме на Ліцейным праспекце, дзе размяшчалася рэдакцыя «Современника», сыходзіліся ніці, якія звязвалі перадавых людзей тагачаснай Расіі. Кніжкі «Современника», побач з гнеўнымі лістамі герцэнаўскага «Колокола», мелі велізарны ўплыў на грамадскую думку Расіі. На гэтых старонках, якія дыхалі полымем класавай барацьбы, Каліноўскі шукаў і знаходзіў адказы на ўсе пытанні, што яго хвалявалі, тут вырашаліся яго балючыя сумненні і роздум пра лёс роднага краю. Нездарма ў далейшым ідэйныя праціўнікі Каліноўскага

---

[34] Тамсама. Спр. 401. Арк. 1.

будуць бачыць вытокі яго «крайніх», «пачварных» поглядаў у творах «рускіх пісьменнікаў»[35].

Правадыры рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі, якія абвясцілі лозунг прызнання незалежнасці Польшчы, з вялікай увагай ставіліся да нацыянальнага руху ўкраінскага і беларускага народаў.

У гэты час М. А. Дабралюбаў напісаў артыкул «Рысы для характарыстыкі рускага простанароддзя», які быў надрукаваны ў 9-й кніжцы «Современника» за 1860 год. Здзекуючыся з шавіністычных выдумак некаторых пісак, якія заяўлялі аб «суцэльнай забітасці» і нібыта няздольнасці беларускага селяніна да барацьбы за волю, Дабралюбаў пісаў: «Цэлы край так вось узялі ды і забілі, — як бы не так! Гэта так жа, як італьянцаў забілі, расслабілі, пазбавілі любові да радзімы і волі!.. Паглядзім, што яшчэ скажуць самі беларусы»[36]. «Маем звестку, — зласліва пісаў у сувязі з гэтым царскі чыноўнік, — што рэдакцыя «Современника», **філія**, калі можна так сказаць, рэдакцыі «Колокола», вельмі ўзрадавалася... магчымасці стварыць яшчэ асобую **беларускую нацыянальнасць**... »[37]

Ёсць усе падставы меркаваць, што пазіцыя, якую заняў «Современник» у беларускім пытанні, з'яўлялася вынікам асабістага знаёмства М. Г. Чарнышэўскага і М. А. Дабралюбава з прадстаўнікамі маладой беларускай інтэлігенцыі, у асяроддзі якой знаходзіліся Кастусь Каліноўскі і яго старэйшы брат Віктар.

У практычнай рэвалюцыйнай дзейнасці браты Каліноўскія, як і большасць іх землякоў, прымыкалі да польскіх

---

[35] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 2. S. 48.

[36] Добролюбов Н. А. Избр. соч. М.; Л., 1947. С. 245–246.

[37] Ратч В. Сведения о польском мятеже... С. 162.

падпольных гурткоў, якія ў сваю чаргу былі цесна звязаны з рускай рэвалюцыйнай дэмакратыяй. Польскі вызваленчы рух са сваімі найбагацейшымі традыцыямі цэлага каскаду гераічных паўстанняў не мог не захапляць Каліноўскага, які вырас пад большым ці меншым уплывам польскай культуры. Т. Касцюшка, А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, І. Лялевель, С. Ворцаль, Э. Дамбоўскі, П. Сцягенны, Ш. Канарскі — гэтыя імёны не былі пустым гукам для Каліноўскага. Ён гаварыў пра «вялікія **філасафічныя сучасныя ідэі** польскай эміграцыі, якія ўхваляюцца і ў Расіі» (Ратч, с. 108).

Перад яго вачыма стаяла постаць яго папярэдніка, выдатнага рэвалюцыянера і беларускага паэта Францішка Савіча, які дзейнічаў поплеч з палякам Шыманам Канарскім і рускім рэвалюцыянерам А. Кузьміным-Караваевым. Такімі ўжо былі запаветы бацькоў.

У пакутлівых, гераічных пошуках шляхоў нацыянальнага адраджэння Польшча ў асобе сваіх лепшых сыноў непазбежна прыходзіла да вываду, які ўжо даўно і больш поўна быў абгрунтаваны рускімі дэмакратамі, — да вываду аб неабходнасці сялянскай рэвалюцыі і адмаўлення ад дамаганняў на Беларусь, Украіну і Літву. Гэта стварыла грунт для супрацоўніцтва Каліноўскага як выказніка спадзяванняў беларускіх сялян з польскімі рэвалюцыянерамі. Польскі рух вабіў Каліноўскага таксама сваёй сілаю ў арганізацыйных адносінах, сваім уменнем мабілізоўваць, згуртоўваць масы.

У 1856 годзе ў Пецярбург (адначасова з прыездам туды Каліноўскага) вярнуўся са ссылкі выдатны дзеяч польскага рэвалюцыйнага руху Зыгмунт Серакоўскі. Паводле ўспамінаў сучасніка, гэта «быў рэвалюцыянер з ног да галавы (шыракаплечы, белы бландзін, сярэдняга росту, з зыркімі

блакітнымі вачыма)... Ён быў ад прыроды арганізатарам рэвалюцыі...»[38] Даўняе сяброўства звязвала яго з вялікім украінскім кабзаром Тарасам Шаўчэнкам. Дзякуючы ранейшай рэвалюцыйнай дзейнасці, імя Серакоўскага было абкружана гераічным арэолам. Неўзабаве пасля прыезду ў Пецярбург ён становіцца супрацоўнікам «Современника», блізкім сябрам М. Г. Чарнышэўскага.

У сталіцы Серакоўскі вучыўся ў Акадэміі Генеральнага штаба, а пасля служыў у самім штабе. Яму ўдалося стварыць вялікі нелегальны гурток з афіцэраў пецярбургскіх ваенных навучальных устаноў, які стаў вядомы пазней пад назвай «Літаратурных вечароў». У гурток уваходзілі многія будучыя актыўныя ўдзельнікі рэвалюцыйнага руху і паўстання 1863 года: Яраслаў Дамброўскі, Людвіг Звяждоўскі, браты Ігнацый і Станіслаў Ляскоўскія і іншыя. Меў дачыненне да гуртка і выхаванец Лясного інстытута Валерый Урублеўскі. З афіцэрскага гуртка цягнуліся сувязі ва універсітэт. У складзе студэнцкага «цэнтра» крыніцы называюць Кастуся і Віктара Каліноўскіх[39].

Віктар Каліноўскі, які памёр ад сухотаў у кастрычніку 1862 года, напярэдадні паўстання, быў старэйшы за Кастуся на пяць гадоў[40]. Ён адыграў вялікую ролю ў фарміраванні светапогляду Кастуся. Незвычайна хуткае ідэйнае развіццё

---

[38] З успамінаў таварыша Серакоўскага па акадэміі М. Дз. Навіцкага, надрукаваных у кн.: Чернышевский Н. Г. Неизданные тексты, материалы и статьи. Саратов, 1928.

[39] Гогель Н. В. Иосафат Огрызко и петербургский революционный ржонд в деле последнего польского мятежа. 2-е изд. Вильна, 1867. С. 65.

[40] Гл. мой артыкул: Полымя. 1959. № 7. С. 145–146. Яшчэ не так даўно хто-ніхто памылкова сцвярджаў, што Віктар Каліноўскі — гэта той жа Кастусь Каліноўскі... Гл.: Полымя. 1924. № 2. С. 4.

вялікага беларускага рэвалюцыянера і асветніка ў пэўнай меры тлумачыцца тым, што з першых жа яго крокаў з ім побач быў старэйшы брат. У Пецярбургу Віктар займаўся гістарычнымі даследаваннямі ў Публічнай бібліятэцы, якая, паводле слоў У. В. Стасава, на працягу пяцідзесятых гадоў «зрабілася адным з самых папулярных, самых агульнавядомых месцаў рускай публікі, якая хацела і мела патрэбу займацца справай. Можна сказаць, Публічная бібліятэка зрабілася нават чымсьці модным». Сюды прыходзілі людзі рознага маёмаснага і грамадскага стану, але часцей за ўсё «вучнёўскае юнацтва і малазабяспечаныя людзі»[41].

«Абавязкам Віктара Каліноўскага, — піша Гогель, — было раіць новазавербаванаму ўсе значныя навейшыя творы, і ён быў майстар сваёй справы; тыя, хто яго выбраў, не памыліліся. Падрыхтаваўшы як след навабранца, Віктар Каліноўскі перадаваў яго ў гурток Дамброўскага» (с. 59).

Пасля бурных размоў і спрэчак на нелегальных сходах Віктар вяртаўся ў ціхія залы бібліятэкі і схіляўся над старажытнымі рукапісамі. Урачыстай латынню гаварылі стагоддзі і добра адшліфаванай прыгожай польскай мовай. Але самыя старыя манускрыпты былі напісаны той мовай, на якой Віктар любіў размаўляць з Кастусём. Шырокая, разнастайная, трапяткая, няўлоўная, яна з цяжкасцю лезла ў граматыкі і слоўнікі. Яна не кожнаму была па плячу і, як каштоўнейшая руда, чакала вялікага майстра. І Віктар (сваю работу ён праводзіў па заданні Віленскай археаграфічнай камісіі) піша лісты Кіркору, у якіх даводзіць, што апісанне граніц паміж Каронай (Польшчай) і Літвой зроблена не

[41] Стасов В. В. Румянцевский музей: История его перевода из Петербурга в Москву в 1860–1861 гг. // Русская старина. 1883. Т. 37. С. 88, 95.

па-польску, як лічылася, а «крывіцкай (беларускай — падкрэслівае малады даследчык) гаворкай». Пісьмы гэтыя можна бачыць у Вільнюскім гістарычным архіве[42].

Віктар і ў навуцы заставаўся рэвалюцыянерам. Вядомы рускі гісторык і ўкраінскі пісьменнік М. І. Кастамараў, які пазнаёміўся з Віктарам у 1858 годзе, адзначаў: «Будучы знаёмы з гісторыяй сваёй бацькаўшчыны значна глыбей за тых верхаглядных патрыётаў, якія, не вывучаючы грунтоўна мінулага, складалі сабе аб ім летуценныя вобразы, Каліноўскі ў асяроддзі сваіх суайчыннікаў выклікаў нават незадавальненне за тое, што смела гаварыў такія рэчы, якія тадышнім польскім патрыётам былі не даспадобы»[43]. Для нас вельмі важна сведчанне спецыяліста пра пошукі Віктара ў галіне гісторыі. Няцяжка здагадацца, што ў прыватнасці на гэтыя пошукі абапіраўся Кастусь Каліноўскі ў нястомнай барацьбе супраць польскіх шляхецкіх нацыяналістаў, якія глядзелі на Беларусь і Літву як на сваю вотчыну. Радкі з «Аўтабіяграфіі» Кастамарава пра прыяцельскія адносіны з Віктарам цікавыя і з другога боку. Кастамараў у гэты час нярэдка сустракаўся з Т. Шаўчэнкам, які толькі што вярнуўся ў Пецярбург са ссылкі. Праз Кастамарава з ім маглі пазнаёміцца і браты Каліноўскія. (Гэта знаёмства магло адбыцца і праз Серакоўскага, які падтрымліваў блізкія сувязі і з Каліноўскімі, і з Шаўчэнкам.)

Невядома, ці прымаў Кастусь Каліноўскі непасрэдны ўдзел у навуковай рабоце свайго брата, але гэта вельмі верагодна. У кожным выпадку, уся атмасфера гэтай працы была, несумненна, блізкай яму. Невыпадкова пасля арышту

---

[42] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1135. Вопіс 11. Спр. 4. Арк. 113–117.

[43] Костомаров Н. И. Литературное наследие. СПб., 1890. С. 111.

Каліноўскі, калі выдаваў сябе яшчэ за Ігнацыя Вітажэнца, на пытанні следчай камісіі пра род заняткаў адказваў: «Займаўся распрацоўкаю матэрыялаў гістарычных характараў славянскіх народнасцей»[44].

«Славянскія народнасці...» Гэта рускія, што акружалі Каліноўскага ў Пецярбургу. Гэта яго землякі-беларусы і палякі. Гэта чэхі, што ў векавой барацьбе адстаялі сваю культуру ад іншаземных «культуртрэгераў». Ёсць рэчы, якія не трэба даводзіць. Ёсць шляхі, якія нельга абмінуць. Каліноўскі ў думах пра лёс сваёй бацькаўшчыны, сваёй Беларусі не мог абмінуць блізкай усім славянам Златай Прагі. Але, можа, ён зрабіў і канкрэтныя спробы завязаць кантакты з чэшскімі дзеячамі?

У Ленінградскай публічнай бібліятэцы мне давялося бачыць кнігу ў ружовай вокладцы, якая выйшла ў Празе сто гадоў таму. На яе тытульным аркушы пазначана: Іосэф Ранк, «Палякі і рускія». У ёй прыгадваецца, што ў 1858 годзе вядомы чэшскі грамадскі дзеяч Вацлаў Ганка атрымаў з Пецярбурга пісьмо, у якім польская літаратура параўноўвалася з чэшскай. У кнізе прыводзяцца наступныя радкі з гэтага ліста: «...чэшская літаратура, хаця і ўступае польскай у адносінах багацця і літаратурнай каштоўнасці сваіх здабыткаў, мае, аднак, бясспрэчную перавагу адносна кірунку. Вы пішаце для народа, для ўсёй нацыі, і вы можаце смела сказаць сваім песням:

Jděte k chyzkám, jděte k hradům,
poslechne vás kmet i dítě.
(Ідзіце да хацін, ідзіце ў гарады,
вас пачуюць стары і дзіця. — Г. К.)

---

[44] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 280. Арк. 18.

Сапраўдныя дзеці нацыі, вы пішаце для народа, і народ вас чытае, і народ гаворыць вам: Бог помач! Вы шчаслівейшыя за нас! У нас увесь народ цалкам чытаць не ўмее; толькі шляхта піша для шляхты, і літаратура, за невялікімі выключэннямі, замест інтарэсаў народа падтрымлівае інтарэс касты, якая адна толькі хоча называцца нацыяй...»[45] З канспіратыўных меркаванняў І. Ранк прыводзіць імя пецярбургскага карэспандэнта Ганкі ў скарочаным выглядзе: «Віканцій К...скі». Далейшыя пошукі ў чэшскіх архівах, магчыма, дазволяць вызначыць поўнае прозвішча аўтара пісьма, а пакуль што мы маем усе падставы лічыць, што гэтым аўтарам быў Кастусь Каліноўскі[46]. Вялікі беларускі рэвалюцыянер меў, як вядома, другое імя — Вікенцій, якім карыстаўся якраз у афіцыяльнай перапісцы. Мы не ведаем ні сярод палякаў (пісьмо напісана па-польску), ні сярод прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей ніякага другога Вікенція К-скага, які жыў бы ў гэты час у Пецярбургу і мог бы праявіць такую глыбокую цікавасць да славянскіх літаратур. Па-другое, думкі аб адрыве польскай літаратуры ад народа больш за ўсё маглі быць навеяны ўмовамі Беларусі, дзе гэты адрыў сказваўся ў найбольшай меры, дзе адчуваўся сапраўдны голад у кнігах, зразумелых для народа. Нарэшце, самі думкі, выказаныя ў пісьме, вельмі сугучны светапогляду Каліноўскага, а выраз «каста» ў дачыненні да шляхты нам вядомы і па іншых выказваннях

---

[45] Rank J. Poláci a Rusové. Uvahy slovanské. Praga, 1863. S. 36–37. У кнізе прыводзіцца таксама ўрывак з пісьма да Ганкі А. Кіркора («вучоны А... К...» з Вільні).

[46] Пазней было выяўлена, што аўтар ліста — Вінцэсь Каратынскі. Гл.: Кісялёў Г. В. Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. 2-е выд. Мінск, 2003. С. 105–106. — *Рэд.*

беларускага рэвалюцыянера. Так што магчыма, што гэтыя некалькі радкоў у малавядомай чэшскай кнізе адкрыюць перад каліноўсказнаўствам новы нязведаны прастор.

...Паступіўшы на юрыдычны факультэт універсітэта, Кастусь Каліноўскі, магчыма, і не збіраўся стаць юрыстам. У выбары факультэта выявіўся перш за ўсё глыбокі інтарэс Каліноўскага да грамадскіх навук, яго гарачае жаданне зразумець, асэнсаваць не тыя законы, якія былі сабраны ў шматтомныя зводы і перад якімі схіляліся царскія чыноўнікі, а перадусім няпісаныя законы развіцця чалавечага грамадства. Ды і веданне царскіх законаў не шкодзіла ў той вялікай барацьбе, да якой рыхтаваў сябе Каліноўскі.

Васемнаццацігадовы юнак, які прыехаў у Пецярбург ад магутных дубоў Белавежскай пушчы, ад ціхай, нікому невядомай рэчкі Свіслачы, з рускай гаворкі якога спачатку дабрадушна пасмейваліся таварышы, неўзабаве са здзіўленнем убачыў, што ён зусім не апошні сярод новых сяброў, што да яго слоў і меркаванняў з павагай ставяцца таварышы.

Ён увайшоў у студэнцкі «Огул» — зямляцтва, якое аб'ядноўвала студэнтаў з Беларусі, Літвы, Украіны і Польшчы, і стаў адным з папулярнейшых яго дзеячаў. Паслухаем аднаго з членаў універсітэцкага «Огула» — Вітальда Гажыча, які прымаў удзел у паўстанні 1863 года ў Беларусі. Пасля арышту ён даваў паказанні ў следчай камісіі.

«Таварыства складалася больш чым з 500 чалавек, прымаліся ў яго члены толькі тыя са студэнтаў, якія маглі быць рэкамендаваны прынамсі пяццю таварышамі, прычым маглі б таксама ахвяраваць грошы, колькі хто мог і жадаў. Грошы гэтыя штомесячна дзяліліся паміж беднымі студэнтамі пароўну. Таварыства мела сваю бібліятэку, і хто са студэнтаў хацеў

браць з яе кнігі, той абавязаны быў плаціць дадаткова па сорак капеек у месяц. Бібліятэка і грашовая каса змяшчаліся ў прыватнай кватэры. На пасаду бібліятэкара і касіра выбіраліся студэнты на адзін год... Хто быў касірам, не памятаю, бібліятэкарамі ж у розныя часы былі студэнты Каліноўскі, Трайдасевіч і Памяноўскі[47]. Бібліятэкар карыстаўся асобай павагай таварыства і лічыўся як бы старэйшай асобай, а на сходах меў права канчаткова вырашаць справы...

Таварыства дзялілася на тры партыі, якія мелі назвы: белых, памяркоўных і чырвоных. Да першай належалі тыя, мэта якіх было вучыцца да заканчэння курса, у палітычных жа адносінах ніколі не адыгрываць ролі. Пасля партыя гэтая прыняла назву матрыкулістаў, таму што яна ўзяла ўстаноўленыя ўрадам матрыкулы[48]. За гэта матрыкулістаў вельмі неўзлюбілі таварышы, якія не падзялялі іх поглядаў, даходзіла аж да таго, што некаторыя павінны былі пакінуць універсітэт і вярнуцца на радзіму... Да партыі памяркоўных належалі студэнты, якія таксама намагаліся вучыцца, але засвоілі думку, што універсітэт апроч навук павінен падрыхтоўваць маладых людзей і да палітычнага жыцця. Нарэшце, партыя чыр-

---

[47] З дакументаў Пецярбургскага універсітэта даведваемся, што Ян Трайдасевіч — з мяшчан, скончыў Варшаўскую гімназію і вучыўся ва універсітэце ў 1855–1858 гадах; сын чыноўніка Уладзіслаў Памяноўскі быў аднакурснікам Каліноўскага і скончыў гімназію ў Любліне. Дзяржаўны гістарычны архіў Ленінградскай вобласці (у далейшым — ДГАЛВ (цяпер Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Санкт-Пецярбурга, у далейшым — ЦДГА СПб. — *Рэд.*)). Фонд 14. Вопіс 5. Спр. 104, 277.

[48] Матрыкулы — заліковыя кніжкі, устаноўленыя ўрадам у 1861 годзе пры ўвядзенні новых універсітэцкіх правіл, якія значна пагоршылі становішча студэнтаў. Большасць студэнтаў адмовілася іх узяць, у сувязі з чым восенню 1861 года ва універсітэтах адбыліся моцныя студэнцкія хваляванні.

воных, якія называлі сябе ліберaламі і рэвалюцыянерамі, вызначалася тым, што члены яе хадзілі ў падраных сурдутах і ботах, а замест гальштукаў насілі на шыі рушнікі. Гэтая партыя складала большасць таварыства, і да яе належалі студэнты Стацкевіч, Чарноцкі[49] і многія іншыя, асабліва ж рэзка вылучаўся Каліноўскі.

Партыя белых складалася з людзей вышэйшага саслоўя, якія атрымалі добрую хатнюю адукацыю; памяркоўныя былі большай часткай з Царства Польскага, а чырвоныя — з заходніх і паўднёва-заходніх губерняў, большай часткай не атрымалі хатняй адукацыі і належалі да ніжэйшага пласту людзей. На сходах яны ніколі не разважалі пра справы палітычныя, у сямейных жа, таварыскіх колах вельмі часта гаманілі пра палітыку. Адносна польскага пытання погляды гэтых трох партый вызначыць можна наступным чынам: партыя белых сцвярджала, што карысным бацькаўшчыне можна быць толькі праз спецыяльную адукацыю ў навуках, неабходных у грамадскім жыцці, як матэматыка, эканомія і юрысдыкцыя. Партыя памяркоўных не адмаўляла рэвалюцыі, аднак жа глядзела на яе як на сродак крайні, які патрабуе многіх ахвяр і знясільвае народ, і сродак, ад выкарыстання якога трэба ўхіляцца ўсімі сіламі і ўжываць яго ў крайніх выпадках; вось чаму яны сачылі за еўрапейскай

---

[49] Відавочна, маюцца на ўвазе Севярын Стацкевіч (у 1857 годзе прыняты ва універсітэт па камеральным разрадзе. З наступнага года — вольны слухач. — ДГАЛВ [ЦДГА СПб]. Фонд 14. Вопіс 5. Спр. 641) і вядомы дзеяч паўстання ў Літве і Беларусі Яўстафій Чарноўскі (нар. у 1839 годзе ў Вільні, сын доктара філасофіі, у 1858 годзе паступіў ва універсітэт па юрыдычным разрадзе, потым перайшоў на разрад прыродазнаўчых навук, у 1861 годзе звольніўся, не прыняўшы матрыкул. — Тамсама. Спр. 1043). Брат Я. Чарноўскага Юліян таксама прымаў актыўны ўдзел у паўстанні. Гл. нарыс пра гімназічныя і студэнцкія гады Ф. Багушэвіча.

палітыкай і падпільноўвалі момант, калі можна ўзняць пытанне аб самастойнасці Польшчы... Партыя чырвоных верыла толькі ў рэвалюцыю, не ў сэнсе значэння гэтага слова, але ў рэвалюцыю кулачную, злучаную з сацыяльным пераваротам; у гэтых адносінах яны былі згодныя з лібераламі рускага грамадства, якім наогул вельмі сімпатызавалі. Пасля многія з гэтай партыі паступілі на пасады сельскіх пісараў для таго, каб, грунтуючы свае надзеі на сацыяльным перавароце, мець непасрэдны ўплыў на сялян, схіляючы іх да рэвалюцыі не ў імя нацыянальнасці, а для паляпшэння іх быту»[50].

У паказаннях Гажыча вельмі прыкметныя неакрэсленасць, невыпрацаванасць паняццяў і тэрмінаў, што было вельмі характэрна для пераломнай эпохі канца пяцідзесятых гадоў, калі капіталізм і шырокі вызваленчы рух яшчэ толькі нараджаліся і не хапала слоў, каб вызначыць усе новыя, яшчэ нябачаныя з'явы. Дакументы таго перыяду, напрыклад, «фабрыкантамі» іншы раз называюць фабрычных рабочых, а не гаспадароў фабрык. Таму не трэба здзіўляцца, калі «рэвалюцыя» для Гажыча толькі палітычны пераварот, барацьба за незалежнасць, і ён вымушаны ўдакладніць, што Каліноўскі і яго сябры ўкладалі ў гэтае паняцце іншы, класавы, сацыяльны змест. Для нас дзіўна, калі ён мяшае ў адну кучу і «лібералаў», і «рэвалюцыянераў», але ў той час «лібераламі», грунтуючыся на першапачатковым значэнні гэтага слова, часам называлі менавіта барацьбітоў за свабоду, а не тых лекараў старога ладу, якіх мы ўяўляем пры гэтым слове цяпер. Характарызуючы партыі ў студэнцкім таварыстве, Гажыч таксама робіць гэ-

---

[50] Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў у Маскве (у далейшым — ЦДГАМ (цяпер Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, у далейшым — ДА РФ. — *Рэд.*)). Фонд III аддз. 1 эксп. 1863. Спр. 23. Ч. 313. Арк. 2–7.

та вельмі невыразна. Яго «памяркоўных» трэба залічыць да «белых», а некаторую частку з іх, быць можа, да правага крыла «чырвоных». Але як бы там ні было, паказанні Гажыча (упершыню іх увяла ў навуковы ўжытак І. М. Бяляўская[51]) — цікавая крыніца, якая яскрава сведчыць, што Каліноўскі ўжо ў студэнцкія гады быў сапраўдным правадыром найбольш радыкальнай часткі студэнтаў і што яго погляды фарміраваліся пад моцным уплывам рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі.

Зусім нядаўна знойдзена і другое сведчанне той шырокай вядомасці, якой карысталіся браты Каліноўскія ўжо ў канцы 50-х гадоў. Нават да віленскіх салонаў дакаціліся весці, што ёсць нейкі ў Пецярбургу Каліноўскі, які бярэ пад сваю няпрошаную пратэкцыю маладых студэнтаў, уцягвае іх у сваё таварыства і хоча ўтварыць з іх род прамяністых ці філарэтаў, а сам стаіць на чале іх, нібы другі Томаш Зан. Перапалоханыя бацькі закідалі сваіх сыноў, што навучаліся ў сталіцы, лістамі, у якіх заклікалі асцерагацца Каліноўскага, «як агню, як маравой заразы. Інакш мы ніколі не будзем спакойныя»[52]. Толькі сыны не вельмі слухалі бацькоў.

Якраз у гэты час адбыўся важны зрух у дзейнасці «Огула». Раней польскія студэнты трымаліся замкнёна, адасоблена ад рускіх студэнтаў, хаця руская моладзь яшчэ ў саракавых гадах імкнулася да збліжэння[53]. Вырашальную ролю ў гэтым збліжэнні адыграла неаднаразовая падтрымка патрабавання незалежнасці Польшчы з боку правадыроў рускай

---

[51] Белявская И. М. А. И. Герцен и польское национально-освободительное движение 60-х годов XIX в. М., 1954. С. 60.

[52] З пісьма А. Здановіча сыну Ігнацыю ад 6 жніўня 1858 г. ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1135. Вопіс 20. Спр. 293. Арк. 339.

[53] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 1. S. 21.

рэвалюцыйнай дэмакратыі. Паводле слоў Ратча, збліжэнне польскіх студэнтаў з рускімі адбылося «церазмост, перакінуты ім Герцэнам» (с. 150). Немалое значэнне для ўстанаўлення кантактаў меў Каліноўскі, які «быў рэкамендаваны гуртком рускай моладзі як добры выкладчык урокаў»[54].

Трыумфам сяброўства рускіх і польскіх студэнтаў былі сумесныя дэманстрацыі ў пачатку 1861 года (ужо пасля заканчэння Каліноўскім універсітэта) супраць крывавых злачынстваў царызму, які ўжыў у Варшаве зброю супраць мірнай патрыятычнай маніфестацыі. Калі царскія ўлады паспрабавалі рэпрэсаваць студэнтаў-палякаў, трыста рускіх студэнтаў падпісаліся пад заявай: «Мы, ніжэйпадпісаныя, былі 1 сакавіка на рэквіеме ў памяць забітых у Варшаве, удзельнічалі ў спяванні нацыянальнага польскага гімна і таму просім лічыць нас аднолькава адказнымі разам са студэнтамі з палякаў».

Каліноўскі вынес з універсітэта вернасць вялікім ідэям рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі, веру ў неабходнасць рэвалюцыйнага саюзу ўсіх народаў.

У 1859–1860 гадах, калі ў Расіі склалася рэвалюцыйная сітуацыя, рэвалюцыйныя дэмакраты актывізавалі сваю дзейнасць па падрыхтоўцы сялянскай рэвалюцыі, якая павінна была ўшчэнт разбурыць ненавісны прыгонніцкі лад. У сакавіку 1860 года ў «Колоколе» з'явіўся «Ліст з правінцыі» за подпісам «Русский человек». Псеўданім гэты да цяперашняга часу не расшыфраваны, але наўрад ці можна сумнявацца, што гэты найярчэйшы дакумент эпохі шасцідзесятых гадоў выйшаў з колаў, блізкіх да Чарнышэўскага: «Наша становішча жахлівае, невыноснае, і толькі сякера можа нас

---

[54] Гогель Н. В. Иосафат Огрызко... С. 66.

выратаваць, і нішто, апроч сякеры, не дапаможа!.. Да сякеры клічце Русь!»

Каліноўскі быў цалкам на баку сялянскай рэвалюцыі. «Сякера не павінна спыніцца нават над калыскаю панскага дзецка»[55], — у гэтай фразе, якая дайшла да нас у перадачы царскага чыноўніка і, магчыма, крыху гіпербалізавана[56], увесь Каліноўскі, паслядоўны паплечнік Чарнышэўскага, які спаліў за сабой усе масты, вуснамі якога гаварылі шматмільённыя масы беларускага сялянства.

4

Каліноўскі скончыў Пецярбургскі універсітэт у 1860 годзе, на год пазней за тургенеўскага Базарава. Раман «Бацькі і дзеці» тады яшчэ не выйшаў з друку, але будучыя яго героі ўжо хадзілі па зямлі, і Каліноўскі быў адным з характэрных для таго часу «нігілістаў», з каго І. С. Тургенеў пісаў свайго бунтара.

Калі са званнем кандыдата правоў Каліноўскі вярнуўся на радзіму, мясцовае панства, вымушанае, сцяўшы зубы, цярпець яго ў сваім асяроддзі і аддаваць даніну яго здольнасцям (нават палітычныя праціўнікі гаварылі аб ім «як аб вельмі светлай і здольнай галаве»[57]), завочна называла яго

---

[55] Ратч В. Сведения о польском мятеже... С. 65.

[56] Лютая нянавісць Каліноўскага да паноў мела пад сабой рэальную аснову: бадай, нідзе не было такога рэзкага кантрасту паміж галечай сялянскіх хат і пышнасцю панскіх палацаў, як у Беларусі. Тым не менш яго словы нельга разумець у літаральным сэнсе.

[57] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 468. Ч. 2. Арк. 68.

«хлопам» і «хамам»[58]. Памешчыкі спрабавалі хоць гэтым адпомсціць Каліноўскаму за недастаткова высакароднае, з іх пункту погляду, паходжанне, за сувязь з сялянамі і абарону сялянскіх інтарэсаў, за незалежнасць, адкрытасць і рэзкасць поглядаў. А ён ганарыўся гэтымі мянушкамі і, як бы пацвельваючы памешчыкаў, адну з іх — «Хамовіч» — выбраў сабе псеўданімам. Гэтае прозвішча вельмі шакіравала вытанчаны панскі слых, але беларускі рэвалюцыянер меў ужо ў гэтых адносінах папярэдніка ў асобе М. А. Дабралюбава, пад вершамі якога стаялі словы «Якаў Хам».

Псеўданім «Хамовіч» мае глыбокі сацыяльны змест. Хамовіч — сын Хама, сын сялян, якіх прыгняталі і якімі пагарджалі паны. Гэтае імя бліснула перад памешчыкамі, як аголены меч класавай адплаты. А можа, Каліноўскі хацеў перадаць гэтым і сыноўнюю павагу да рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі, адзін з правадыроў якой карыстаўся такім жа бунтарскім псеўданімам?

Тарас Шаўчэнка сказаў пра сябе: «Маё жыццё з'яўляецца часткай гісторыі маёй радзімы». Тое ж самае мог бы сказаць адносна сябе і Каліноўскі. Яго біяграфія непарыўна з гісторыяй яго радзімы — Беларусі. Мы не можам уявіць сабе шасцідзесятыя гады на Беларусі без гэтага чалавека з адкрытым, поўным годнасці і высакароднасці тварам, спакойным і смелым позіркам, з цёмным кароткім і нядбайна завязаным па тагачаснай модзе гальштукам, як малююць Каліноўскага фатаграфіі, што дайшлі да нас. Вонкавы выгляд Каліноўскага цудоўна гарманіруе з яго перадавым светапоглядам. І цікава — сваім выглядам ён нагадвае, бадай, не

[58] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 1. S. 220; t. 2. S. 48.

рэвалюцыянера-шасцідзесятніка, а хутчэй за ўсё барацьбіта пазнейшых пакаленняў. Маладую Беларусь, якая ўзнімалася да новага жыцця, увасабляў гэты гарманічны, па-мужчынску прыгожы чалавек.

Якім запомніўся Каліноўскі сучаснікам? Масолаў наведаў Каліноўскага ў турме. Ён убачыў чалавека «гадоў дваццаці шасці, моцнага складу і з тварам жорсткім і выразным, кароткія русыя валасы былі зачэсаны назад» (с. 608). Паводле паказанняў членаў паўстанцкай арганізацыі, Каліноўскі — «росту сярэдняга, бландзін», у яго «вялікі твар і даволі буйныя рысы». Аднак, мяркуючы па фатаграфіях, валасы ў яго былі цёмна-русыя. З гэтага пункту гледжання больш правільна абмалёўвае Каліноўскага ўдзельніца падзей 1863 года С. Фальская, якая ведала яго пад імем Макарэвіча: «росту сярэдняга, гадоў каля трыццаці, валасы цёмна-русыя, галава і твар вялікія, рысы твару буйныя, колер твару цёмны»[59]. Ежы Ігнацый Кучэўскі-Порай, аўтар успамінаў, фрагменты з якіх апублікаваны нядаўна ў Польшчы, падае беларускага рэвалюцыянера крыху гратэскава: «росту сярэдняга, зусім круглая галава, надзвычай шырокі рот»[60]. У кастрычніку 1862 года Каліноўскі быў заўважаны ўладамі ў момант распаўсюджвання «Мужыцкай праўды» на тракце ў Слонімскім павеце. Ён застаўся тады ў памяці як чалавек «росту сярэдняга, брунет, вусы чорныя, гадоў каля 36»[61]. Гэта быў ужо пераапрану-

---

[59] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 439. Вопіс 91. Спр. 1. Ч. 1. Арк. 84, 202.

[60] Demokracja polska w powstaniu styczniowym. Wybór źródeł, pod red. E. Halicza. Wrocław, 1961. S. 108. З Польшчы атрымана фотакопія поўнага тэксту гэтых успамінаў, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

[61] Цыт. па: Смірноў А. П. Кастусь Каліноўскі... С. 82.

ты Каліноўскі, які змяніў сваё аблічча. Увогуле ж улады слаба ўяўлялі сабе воблік няўлоўнага рэвалюцыянера — член Віленскай асобай следчай камісіі М. В. Юган пісаў, напрыклад, Ратчу, што афіцыйнае апісанне выгляду Каліноўскага «не можа служыць дапаможнікам, таму што апісанне гэтае каля года было прыклеена на рагу ледзь не кожнай віленскай вуліцы, а Каліноўскі працягваў жыць у Вільні, і па апісаннях гэтых ніхто яго не пазнаваў»[62].

Лепш за ўсё аб характары, асобе Каліноўскага гавораць яго жыццё, яго барацьба. Але асобныя дадатковыя рысы, каб больш поўна ўявіць сабе Каліноўскага як чалавека, можна знайсці ў Я. Гейштара і ў іншых крыніцах. Паводле слоў Гейштара, «схільны да захаплення, імклівы», ён «не любіў пярэчанняў» (т. 1, с. 236). У другім месцы Гейштар гаворыць аб «рэзкай шчырасці Каліноўскага, якая калі абражала, дык разам з тым была адзнакай моцнага і праўдзівага характару» (т. 2, с. 66).

Е. Кучэўскі-Порай у згаданых ужо ўспамінах адзначае, што Каліноўскі не быў шматслоўным («trudność wielka w wysłowieniu się»[63]), і гэта добра ўзгадняецца са знаёмым нам воблікам Каліноўскага. У тыя часы хапала прамоўцаў. З ліку шляхецкіх рэвалюцыянераў Каліноўскага вылучала якраз дзелавітасць, пагарда да пустой балбатні. Беларускі рэвалюцыянер, які меў усе падставы звысоку ставіцца да многіх навакольных, «умеў і падпарадкоўвацца, калі яму загадана ў імя абавязку»[64].

---

[62] Аддзел рукапісаў Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі ў Ленінградзе (у далейшым — АР ДПБ (цяпер Расійская нацыянальная бібліятэка, у далейшым — АР РНБ. — *Рэд.*)). Фонд 629. Спр. 398. Арк. 1–2.

[63] Demokracja polska... S. 108.

[64] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 1. S. 237.

Ці варта гаварыць аб тым, што Каліноўскага характарызавалі самыя ўважлівыя, братэрскія адносіны да сяброў па барацьбе? Яго мужнае сэрца змагара магло, калі патрэбна, быць пяшчотным і напаўняцца болем за лёс таварышаў. Калі знайшоўся добраахвотнік на вельмі небяспечную справу — выкананне смяротнага прысуду паўстанцкай арганізацыі над рэнегатам А. Дамейкам, Каліноўскі адхіліў гэтую кандыдатуру, бо выканаўца, які прапанаваў свае паслугі, меў жонку і дзяцей (т. 2, с. 76).

Гейштар адзначае і слабасці Каліноўскага. Яму «не хапала ведання людзей», «лісліўцы найгоршага гатунку мелі да яго доступ», ён часта памыляўся ў выбары людзей: «...сумленны сам, ён занадта верыў іншым» (т. 1, с. 236, 237), што прыводзіла, паводле слоў Гейштара, да засмечвання арганізацыі нягоднымі людзьмі. Зразумела, мы не маем права ва ўсім верыць Гейштару: за вонкавай бесстароннасцю яго апавядання схавана намаганне выгарадзіць сябе і ўсю партыю «белых».

Нядаўна ў бібліятэцы імя Асалінскіх у Вроцлаве адшукалі сшытак з нататкамі Людвігі Радзевіч-Ямант. Кватэра Ямантаў у Вільні была ў часы паўстання адной з галоўных канспіратыўных кватэр рэвалюцыйнай арганізацыі. Тут часта бываў Каліноўскі, і Людвіга — тады маладая жанчына — мела магчымасць добра ведаць яго. У нататках яна ўспамінае «гэту выключную, хоць і не вытанчаную натуру», прыгадвае сёе-тое з яго жыцця — «жыцця, дарагога для Вільні», «жыцця, якое было прысвечана не славе, не ўладзе, а сапраўднай карысці краю, якое заслугоўвае сардэчнага ў нас успаміну». Свае нататкі Радзевіч пісала ўжо пасля выхаду мемуараў Гейштара, у іх нямала рэзкіх крытычных заўваг у адрас мемуарыста.

«Дзіўнымі здаюцца мне, — адзначае Радзевіч, — гэтыя хаатычныя супярэчнасці ў акрэсленні характару Канстанціна Каліноўскага; многа ў гэтым ёсць рыс яго сапраўдных, многа недарэчных, хапае ўвогуле і фальшывых. Адной з гэтых апошніх, напрыклад, з'яўляецца тое, што «Каліноўскі быў вельмі нешчаслівы ў выбары асоб».

Якуб Гейштар быў вельмі асцярожны, спрактыкаваны, стрыманы чалавек, больш чым на дзесяць гадоў старэйшы за Каліноўскага. Ён меў не надта вялікі маёнтак на Ковеншчыне. Здольнасці ў яго былі таксама даволі пасрэдныя, але яго ўменне трымацца, значная воля, імкненне адыгрываць ролю, ганарыстасць, якую ён старанна хаваў, вылучылі яго з натоўпу памешчыкаў і паставілі на чале партыі «белых» у Літве і Беларусі.

Калі праз некалькі дзесяцігоддзяў пасля паўстання Гейштар пісаў свае мемуары, імя Каліноўскага было яшчэ занадта памятным і папулярным на беларускіх, літоўскіх і польскіх землях. Мемуарыст не мог цалкам адарвацца ад рэчаіснасці. Ён дзейнічае больш тонка. Ён займае адносна Каліноўскага позу больш вопытнага, старэйшага сябра, які ўвогуле з прыхільнай усмешкай сочыць за кіпеннем маладога жыцця, паблажліва ставіцца да яго: так, «крайнія погляды», але гэта ўсё ад маладосці, але затое якое «старапольскае сэрца»! На самай справе Каліноўскі і Гейштар былі ворагі, якіх толькі надзвычай складаныя палітычныя абставіны звялі на кароткі час разам, у адну арганізацыю. З пункту гледжання ліберала Гейштара, Каліноўскаму «не хапала больш шырокага погляду і палітычнага чуцця» (т. 2, с. 49). Тут мемуарыст застаецца яшчэ сумленным: ліберал і рэвалюцыянер па-рознаму разумеюць «шырокі погляд» на жыццё. Але ясна і другое: у сваіх

мемуарах Гейштар асцярожна зніжае вобраз Каліноўскага балбатнёй пра яго нейкае «старапольскае сэрца», завастрае ўвагу чытача на яго хібах, звальваючы тым самым віну за правалы паўстанцкай арганізацыі на Каліноўскага. Каліноўскі быў сапраўды малады, і чытачу лёгка было паверыць у тое, што ён слаба ведаў людзей. Магчыма, у нейкай меры гэта было праўдай, бо ёсць рэчы, якія прыходзяць толькі з гадамі. Толькі аднаго не растлумачыў Гейштар: як мог Каліноўскі са сваёй наіўнасцю стварыць трывалую арганізацыю і, прынамсі, яшчэ паўгода пасля арышту аўтара мемуараў пазбягаць учэпістых кіпцюроў царскіх прыслужнікаў?

Але ліха з ім, з Гейштарам! Вернемся лепш да Каліноўскага, жыццё якога пасля заканчэння універсітэта ўступіла ў вырашальны этап.

Як цяпер устаноўлена, свой кандыдацкі дыплом Каліноўскі атрымаў 17 лютага 1861 года[65]. (Некалькі месяцаў пасля заканчэння універсітэта пайшло на напісанне кандыдацкай дысертацыі. На жаль, гэтая навуковая праца рэвалюцыянера дагэтуль не знойдзена, невядома нават яе назва.) Праз два дні быў падпісаны маніфест аб скасаванні прыгоннага права. Гэта сімвалічна. Новыя шляхі адкрываліся перад краінай. Мільёны сялян чакалі рады, што рабіць. У гэты момант Каліноўскі пакінуў універсітэцкія аўдыторыі і адправіўся на радзіму. Ён скончыў вучыцца і быў гатовы вучыць. Беларусь у пару выгадавала свайго вялікага сына, свайго правадыра.

Да вясны 1861 года Каліноўскі знаходзіўся ўжо ў Беларусі і 2 сакавіка падаў прашэнне на імя віленскага генерал-губер-

---

[65] ДГАЛВ [ЦДГА]. Фонд 14. Вопіс 1. Спр. 6028. Арк. 549–552.

натара Назімава аб залічэнні на службу. Гэта першы адзначаны ў дакументах крок Каліноўскага на зямлі бацькоў.

На прашэнні рукой Назімава напісана: «Аб'явіць аб адсутнасці вакансіі»[66]. Не звязаны казённай службай, Каліноўскі стаў рэвалюцыянерам-прафесіяналам. Пераапрануўшыся ў сялянскую вопратку і ўзяўшы торбу, ён адправіўся вандраваць па роднай зямлі, па вёсках і корчмах, даведваючыся пра сялянскія турботы і настроі, наладжваючы сувязі з народам, рыхтуючы кадры рэвалюцыйнай арганізацыі.

Узбуджаная царскім маніфестам 19 лютага, вёска прагна лавіла кожнае слова пра зямлю і волю.

5

Складзены хітрэйшымі кручкатворамі імперыі, маніфест да глыбіні душы абразіў і абурыў сялян сваёй непрыкрытай насмешкай над іх запаветнымі спадзяваннямі. Абвясціўшы зямлю ўласнасцю «высакароднага дваранства», маніфест «велікадушна» прапанаваў сялянам пакутлівую, расцягнутую на дзесяцігоддзі аперацыю па выкупе мізэрных, абрэзаных надзелаў.

Не дзіва, што абураныя сяляне не прынялі гэтай рабаўнічай рэформы. Нябачаная з часоў пугачоўскай вайны хваля сялянскага руху ахапіла ўсю краіну. Беларускія і літоўскія сяляне разам з рускім сялянствам рашуча заявілі: «Гэта вольнасць

---

[66] Дело по записке кандидата С.-Петербургского университета Викентия Калиновского об определении его на службу в канцелярию виленского военного губернатора. Началось 8 марта 1861 г. Кончено 21 марта 1861 г. На двух листах (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Агульн. аддз. 1861 г. Спр. 30. Арк. 1.

па маніфесце, а мы хочам сапраўднай»[67]. Па дарогах краіны ва ўсіх напрамках ішлі воінскія каманды, каб кулямі, штыкамі і розгамі навязаць народу «дараваную» царом «свабоду».

Аднак палітычная сітуацыя ў Беларусі і Літве ў той перыяд характарызавалася не толькі рэзкім абвастрэннем барацьбы сялян супраць памешчыкаў. Амаль адначасова тут пачынаюцца бурныя выступленні ў падтрымку вызваленчага руху ў Польшчы, які набыў шырокі размах.

Нацыянальна-вызваленчы рух у Польшчы, які разгарнуўся ў пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя, у цэлым меў прагрэсіўнае значэнне. Але разам з тым пры ацэнцы польскага нацыянальна-вызваленчага руху мы павінны заўсёды мець на ўвазе яго неаднароднасць у класавых, ідэалагічных адносінах. Шматлікія групоўкі і «партыі», што існавалі ў рэчышчы гэтага руху, можна звесці да трох асноўных плыняў: памешчыцка-апазіцыйная (партыя «белых»), шляхецка-рэвалюцыйная (правая большасць партыі «чырвоных») і рэвалюцыйна-дэмакратычная (левая меншасць партыі «чырвоных»).

Кіраўнікамі і ідэолагамі «белых» у Беларусі і Літве былі гродзенскі прадвадзіцель дваранства граф Віктар Стажэнскі і Якуб Гейштар. У гэтую партыю ўваходзілі амаль выключна памешчыкі. Выказваючы нязгоду з палітыкай царскага ўрада ў польскім пытанні, «белыя» спадзяваліся мірным шляхам дамагчыся ўступак ад цара. Яны патрабавалі далучэння Беларусі і Літвы да Царства Польскага. У аграрным пытанні іх, як і рускіх памешчыкаў, у асноўным задавальняла рабаўнічая рэформа 1861 года, падрыхтаваная царскім урадам з іх удзелам.

---

[67] Отмена крепостного права: Докл. министров внутренних дел о проведении крестьян. реформы, 1861–1862 гг. М.; Л., 1950. С. 9.

Паўстання яны баяліся як агню і калі і прынялі пазней удзел у ім, дык толькі для таго, каб перашкодзіць рэвалюцыйным дэмакратам ператварыць яго ў сялянскую, антыпамешчыцкую вайну.

Шляхецкія рэвалюцыянеры (правая большасць партыі «чырвоных»), наадварот, усю сваю энергію накіравалі на падрыхтоўку паўстання, галоўнай мэтай якога было дасягненне незалежнай Польшчы. Адным з найбольш відных польскіх шляхецкіх рэвалюцыянераў у Беларусі напярэдадні паўстання быў Браніслаў Шварцэ[68], які абраў цэнтрам сваёй дзейнасці Беласток. У склад арганізацыі «чырвоных» уваходзілі прадстаўнікі сярэдніх пластоў грамадства (дробнамаёнткавая і безмаёнткавая шляхта, чыноўнікі, афіцэры, навучэнцы, рамеснікі). З гэтай «партыі» ў будучым выйшла большасць кіраўнікоў паўстанцкіх атрадаў. Шляхецкія рэвалюцыянеры ставілі і сацыяльныя пытанні, але вельмі нясмела і непаслядоўна. Іх аграрная праграма, якая грунтавалася на няправільнай тэорыі «нацыянальнага адзінства», імкнучыся прымірыць непрымірымыя грамадскія супярэчнасці, не магла задаволіць ні сялян, ні паноў. Тым не менш гэтая праграма (сяляне атрымліваюць ва ўласнасць надзелы, што былі ў іх карыстанні; памешчыкі валодаюць астатнімі землямі і атрымліваюць кампенсацыю за кошт дзяржавы; беззямельныя сяляне, якія ўступілі ў паўстанцкае войска, надзяляюцца невялікімі ўчасткамі з казённых маёнткаў) была абвешчана ў маніфесце і дэкрэтах Варшаўскага цэнтральнага нацыянальнага камітэта

[68] У маі 1862 года перабраўся ў Варшаву, дзе ўвайшоў у склад Цэнтральнага камітэта, у снежні таго ж года арыштаваны; хутка эвалюцыянаваў у бок рэвалюцыйнага дэмакратызму, але да самага канца сваёй дзейнасці памыляўся ў нацыянальным пытанні і змагаўся з «сепаратызмам» Каліноўскага.

ад 10 (22) студзеня 1863 года і лягла ў аснову ўсёй наступнай дзейнасці паўстанцаў па аграрным пытанні. У нацыянальным пытанні шляхецкія рэвалюцыянеры вагаліся паміж прызнаннем права Беларусі, Літвы і Украіны на самавызначэнне і патрабаваннем узнавіць Польшчу ў межах 1772 года (да першага падзелу Рэчы Паспалітай). Шляхецкія рэвалюцыянеры ў Беларусі і Літве яшчэ да паўстання імкнуліся да таго, каб прыцягнуць у сваю арганізацыю беларускіх і літоўскіх сялян. У арганізацыйных адносінах яны ўяўлялі сабою вялікую сілу.

Аднак сапраўднымі выразнікамі сялянскіх інтарэсаў былі не шляхецкія рэвалюцыянеры, а рэвалюцыйныя дэмакраты. Іх яднала са шляхецкімі рэвалюцыянерамі перш за ўсё тое, што яны гатовы былі са зброяй у руках змагацца за ажыццяўленне сваіх прынцыпаў. Але на першы план сялянскія дэмакраты заўсёды высоўвалі высакародную задачу вызвалення працоўных ад уціску эксплуататараў. Самым яркім прадстаўніком польскай рэвалюцыйнай дэмакратыі ў Беларусі быў Валерый Урублеўскі, які пасля стаў генералам Парыжскай камуны. Следам за рускімі рэвалюцыянерамі-дэмакратамі М. Г. Чарнышэўскім і М. А. Дабралюбавым сялянскія дэмакраты непахісна адстойвалі права ўсіх народаў на самавызначэнне, выступалі за поўную ліквідацыю памешчыцкага землеўладання. Але паслядоўных рэвалюцыйных дэмакратаў у Польшчы, Беларусі і Літве ў той час было вельмі мала, яны не мелі ўласнай рэвалюцыйнай арганізацыі і вымушаны былі дзейнічаць у рамках агульнай арганізацыі шляхецкіх рэвалюцыянераў — «чырвоных», складаючы ў ёй левую меншасць. Не маючы магчымасці ў тых умовах выступаць са сваёй уласнай практычнай праграмай, яны не склалі зброі, а няспынна змагаліся за дэмакратызацыю арганізацыі «чырво-

ных» і ўсяго руху, за ператварэнне нацыянальна-вызваленчага паўстання ў сялянскую вайну супраць памешчыкаў.

Вялікай заслугай беларускіх рэвалюцыянераў з'яўляецца тое, што яны здолелі зразумець велізарнае значэнне вызваленчага руху братняга польскага народа і рашуча падтрымалі яго.

Гістарычныя ўмовы паставілі перад імі вельмі складаную і адказную задачу. Трэба было перашкодзіць царскім уладам накіраваць супраць польскіх паўстанцаў рэвалюцыйную энергію беларускіх сялян. А такая пагроза была вельмі рэальная, калі ўлічваць царысцкія настроі сялян і іх нянавісць да польскіх паноў.

Усведамленне сваёй праўды беларускія рэвалюцыянеры чэрпалі з твораў рускіх рэвалюцыянераў. Самым справядлівым компасам для іх былі, у прыватнасці, канкрэтныя парады, якія даў М. Г. Чарнышэўскі ў артыкуле «Нацыянальная бястактнасць», надрукаваным у сёмай кніжцы «Современника» за 1861 год[69]. Артыкул быў падцэнзурны, і Чарнышэўскі скарыстаў у ім свой улюбёны прыём — іншасказальнасць. Царскім цэнзарам здавалася, што ў гэтым артыкуле гаворка ідзе пра далёкую аўстрыйскую Галіцыю, і яны, магчыма, былі нават рады нападкам аўтара на аўстрыйскі ўрад. Але ўсім астатнім чытачам часопіса было зразумела, што Чарнышэўскі мае на ўвазе перш за ўсё Украіну, Беларусь і Літву, дзе склалася зусім аналагічная сітуацыя. Улічваючы, што на адносіны ўкраінцаў, беларусаў і літоўцаў да польскага руху можа зрабіць рашучы ўплыў іх нянавісць да спрадвечных прыгнятальнікаў — польскіх паноў, што гэта нянавісць можа кінуць іх у абдымкі

[69] Чернышевский Н. Г. Полн. собр. соч.: В 16 т. М., 1939–1953. Т. 7. 1950.

царскага ўрада, Чарнышэўскі завуалявана, але вельмі празрыста пісаў: «Праз успаміны пра старажытнасць пранікаюцца яны адданасцю да цяперашняга агульнага непрыяцеля іх і спрадвечных іх непрыяцеляў, якія не могуць быць шкоднымі для іх цяпер, якія шукаюць саюзу з імі для агульнай карысці». Наўрад ці ў каго з чытачоў «Современника» было сумненне, што «цяперашні агульны непрыяцель» — гэта царызм, які ператварыў Расію ў турму народаў. «Спрадвечным непрыяцелем» была польская шляхта, лепшыя прадстаўнікі якой разам з усім польскім народам шукалі ў 1861 годзе саюзнікаў у барацьбе з царызмам. Маючы на ўвазе польскую партыю «чырвоных», Чарнышэўскі адзначаў, «што па саслоўным пытанні гэтая партыя схільна цяпер да вельмі вялікіх уступак у карысць сялян як польскага, так і русінскага племя. Вось пра гэта і не шкодзіла б падумаць львоўскаму «Слову» (трэба было чытаць: украінцам, беларусам, літоўцам. — *Г. К.*). Мажліва, уступкі, на якія шчыра гатовы людзі, што здаюцца яму ворагамі, — мажліва, гэтыя ўступкі такія вялікія, што поўнасцю задаволілі б русінскіх пасялян, а ва ўсякім выпадку несумненна тое, што ўступкі гэтыя значна большыя і значна больш пэўныя, чым усё тое, што могуць атрымаць русінскія пасяляне ад аўстрыйцаў (трэба было чытаць: ад царскага ўрада. — *Г. К.*)».

Вярнуўшыся на радзіму пасля заканчэння універсітэта, малады, поўны сіл Каліноўскі хутка разабраўся ў складаным палітычным становішчы і заняў правільную пазіцыю па ўсіх галоўных пытаннях.

У чарнавых матэрыялах Ратча, якія захоўваюцца ў Аддзеле рукапісаў Публічнай бібліятэкі ў Ленінградзе (цяпер АР РНБ. — *Рэд.*), там, дзе некалі працаваў Віктар, ёсць запіс, што К. Каліноўскі ўжо ва універсітэце быў «пад асобым апе-

каваннем (покровительством)», г. зн. сябры-рэвалюцыянеры ўскладалі на яго асаблівыя надзеі, бераглі яго для вялікіх спраў. «Канстанцін быў пасланы (на радзіму. — *Г. К.*) для той жа ролі, як Э. Дамбоўскі ў Галіцыю перад 1846 годам»[70], — адзначыў у нататках Ратч, відаць, пасля чытання нейкай крыніцы, што не дайшла да нас, ці пасля размовы з адным з арыштаваных рэвалюцыянераў.

Параўнанне гэтае вельмі характэрнае. Эдвард Дамбоўскі (1822–1846) — гордасць польскага народа, выдатны рэвалюцыйны дэмакрат і філосаф[71], герой Кракаўскага паўстання 1846 года, правадыр і ідэолаг партыі, якая лічыла «аграрную рэвалюцыю ўмовай нацыянальнага вызвалення»[72]. У польскага і беларускага рэвалюцыянераў сапраўды шмат агульнага: і гераічная смерць у барацьбе за свабоду амаль у юнацкім узросце, і незвычайны талент арганізатара, канспіратара, агітатара, і тое надзвычай моцнае ўражанне, якое абодва рабілі на сучаснікаў. Галоўнае ж, што вельмі збліжае іх, — гэта агульнасць светапогляду. У гісторыі грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі (і Літве) Каліноўскі адыграў, бадай, тую ж ролю, што і Дамбоўскі ў Польшчы.

Пашырана думка, што «Каліноўскі ў сваёй дзейнасці быў больш барацьбітом, чым тэарэтыкам, больш практычным дзеячам рэвалюцыі, чым яе ідэолагам»[73]. У рэцэнзіі на кнігу М. Цікоцкага «З гісторыі беларускай журналістыкі

---

[70] АР ДПБ. Фонд 629. Спр. 26. Арк. 11 адв.

[71] Гл.: Нарский Н. С. Мировоззрение Э. Дембовского: Из истории пол. философии XIX в. М., 1954.

[72] Маркс К., Энгельс Ф. Маніфест Камуністычнай партыі: Пер. з руск. Мінск, 1933.

[73] Перцаў У. М. Прадмова // Смірноў А. П. Кастусь Каліноўскі ў паўстанні 1863 г. С. 6.

XIX стагоддзя»[74] мы ўжо адзначалі неапраўданасць такога сцвярджэння.

Гісторыкі, якія высоўваюць думку аб аднабаковасці Каліноўскага, зыходзяць, відавочна, з уяўлення, што тэарэтыкам і ідэолагам можна назваць толькі такога дзеяча, з-пад пяра якога выйшлі шматтомныя акадэмічныя трактаты. Каліноўскі быў прызнаным правадыром сялянскай дэмакратыі ў Беларусі і Літве. Яму верылі, за ім ішлі дзесяткі беларускіх, польскіх і літоўскіх рэвалюцыянераў. Ён не мог не быць тэарэтыкам, таму што менавіта яму давялося вырашаць найсур'ёзнейшыя пытанні дапасавання ідэй рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі да спецыфічных умоў Беларусі і Літвы. Скажам, рускія рэвалюцыянеры-дэмакраты былі прыхільнікамі абшчыннага сацыялізму, а як жа быць з Беларуссю і Літвой, у большасці раёнаў якіх не было абшчыннага землеўладання? Каліноўскі павінен быў вырашыць гэта пытанне, перш чым прыступіць да практычнай дзейнасці па падрыхтоўцы сялянскай рэвалюцыі. Іншая справа, што мы можам толькі меркаваць аб тым, як ён вырашаў гэта пытанне. Але мы ведаем затое многія яго выказванні па іншых пытаннях тэорыі рэвалюцыі, раскіданыя ў мемуарах яго сучаснікаў, што здзіўляюць сваёй глыбінёй і смеласцю. І, магчыма, нават не будзе вялікім перабольшаннем, калі скажам, што Каліноўскі-тэарэтык, Каліноўскі-ідэолаг — ярчэйшы і цікавейшы за Каліноўскага-практыка, бо многае са сваіх задум яму не ўдалося ператварыць у жыццё.

«Перш за ўсё нам трэба знішчыць гэтую гнілую і разбэшчаную касту, якую называюць дваранствам»[75], —

---

[74] Гл.: ЛіМ. 1960. 1 лістап. (№ 88 (1517)).

[75] Дзяржаўны Гістарычны музей у Маскве (у далейшым — ДГМ). Фонд 282. Спр. 538; фонд 381. Спр. 13.

гэтыя словы належаць Каліноўскаму. Такое не вычытаеш з кніг. Гэта павінна было прайсці праз сэрца і мозг. Гэта плён асабістых жыццёвых уражанняў і роздумаў. У аснове гэтых слоў ляжыць вялікая любоў да прыгнечанага народа, але не толькі любоў — яшчэ і вялікая вера ў сілы і розум народа: знішчыць дваранства можна было толькі рукамі народа, шляхам сялянскай рэвалюцыі, і будаваць новы лад, новае грамадства трэба было без дваран — рукамі і розумам народа.

Такі быў Каліноўскі. Шляхціц па паходжанні, ён заклікаў да знішчэння шляхты. Выхадзец з тых слаёў насельніцтва Беларусі, прадстаўнікі якіх вельмі часта ў той час лічылі сябе палякамі, ён лічыў сябе і быў шчырым беларусам. І не таму, што не любіў польскага народа (больш за многіх іншых ён любіў гераічны народ Польшчы, з якім яго шмат што звязвала), але яму ў вышэйшай ступені было ўласціва пачуццё справядлівасці: Беларусь і без таго аддала Польшчы занадта многа сваіх сыноў.

Думка аб сялянскай рэвалюцыі як адзіным сродку выйсця з цяжкага грамадскага крызісу пакладзена ў аснову ўсёй сістэмы грамадска-палітычных поглядаў Каліноўскага. Той, хто добра ўяўляе сацыяльна-палітычныя абставіны ў Беларусі і Літве таго часу, зразумее, якую мужнасць трэба было мець, каб узняцца да такіх думак. Мы не ведаем у той час ніводнага рэвалюцыянера на беларускіх, літоўскіх і польскіх землях, які б так пэўна і проста, як Каліноўскі, сказаў пра неабходнасць знішчэння дваранства. Шляхецкія традыцыі былі значна больш моцныя ў Польшчы, Беларусі і Літве, чым у Расіі, хоць бы таму, што шляхта Рэчы Паспалітай была больш шматлікай за рускае дваранства. Аж да паўстання 1863 года пануючай ідэалогіяй у Польшчы, Беларусі і Літве быў шляхецкі света-

погляд, які, нібы на двух кітах, грунтаваўся на дзвюх звязаных паміж сабою догмах: «Няма шляхты без народа, таксама як няма народа без шляхты» і «Няма Польшчы без Літвы і Беларусі, як няма Літвы і Беларусі без Польшчы». Каліноўскі быў адным з першых паслядоўных дэмакратаў, якія з усёй рашучасцю выступілі супраць гэтых догмаў. Скідаючы з гістарычнай сцэны дваранства, ён каменя на камені не пакідаў ад першай догмы і ствараў умовы для развязвання агромністых рэвалюцыйных, творчых сіл народа. Адначасова павінна была абрушыцца і другая догма, якая ў тых умовах мела толькі адзін сэнс: аднолькавае права польскіх паноў на эксплуатацыю польскіх, беларускіх і літоўскіх сялян. Каліноўскі не быў супраць сяброўства беларускага народа з братнім польскім народам. Ён быў за брацтва рэвалюцыйнай, вызваленай ад паноў Беларусі і Літвы з дэмакратычнай Польшчай і народнай Расіяй.

Палажэнне аб сувязі сялянскага паўстання ў Беларусі і Літве з рэвалюцыяй у Расіі і Польшчы з'яўляецца другім важнейшым здабыткам рэвалюцыйнай тэорыі Каліноўскага. Паводле слоў Ратча, Каліноўскі разлічваў «з чаканым увесну 1863 года мяцяжом у Польшчы пачаць свой мяцеж у Паўночна-Заходняй Расіі па ўзоры праектаванага Герцэнам для велікарускіх губерняў» (с. 144).

У літаратуры там-сям можна сустрэць нараканні, што Каліноўскі пераацэньваў дэмакратычныя сілы польскага руху, атоесамляў паўстанне ў Польшчы з паўстаннем у Беларусі. Гэта проста непаразуменне. Тое, што было сілай Каліноўскага, расцэньваецца як яго слабасць. Гістарычны подзвіг Каліноўскага якраз у тым і заключаецца, што, нягледзячы на сваю смяротную нянавісць да польскіх паноў, ён здолеў зразумець

«гіганцкае, першаступеннае значэнне» вызваленчага руху польскага народа «з пункту гледжання дэмакратыі не толькі ўсерасійскай, не толькі ўсеславянскай, але і ўсееўрапейскай» і паспрабаваў звязаць з ім антыпрыгонніцкі рух беларускіх і літоўскіх сялян. Каліноўскі добра разумеў, што без сувязі з польскім нацыянальна-вызваленчым рухам, які ўжо разгарнуўся на польскіх, беларускіх і літоўскіх землях, не магло быць у той час у Беларусі ніякага шырокага, арганізаванага, прагрэсіўнага выступлення. Лягчэй за ўсё было стаць на чале любой ахопленай сялянскім хваляваннем воласці і павесці сялян супраць памешчыкаў. Але ён ведаў, чым гэта скончыцца: некалькі спаленых панскіх сядзіб, некалькі павешаных памешчыкаў, і потым — немінучы разгром. Ён вымяраў іншымі маштабамі, ён марыў аб сумесным найшырэйшым націску беларускага, рускага, польскага і іншых народаў Расійскай імперыі на царызм і прыгонніцтва. Толькі такое выступленне магло закончыцца перамогай.

З першых жа крокаў Каліноўскага на роднай зямлі мы бачым яго ў кантакце з польскімі дзеячамі — і не толькі з рэвалюцыйнымі дэмакратамі, якіх наогул было мала, але і з шляхецкімі рэвалюцыянерамі. Нам здаецца, што ў спрэчцы паміж А. Смірновым і В. Кардовічам[76] больш рацыі мае апошні, які лічыць, што рэвалюцыйныя дэмакраты на чале з Каліноўскім вымушаны былі пайсці на кампраміс, на саюз са шляхецкімі рэвалюцыянерамі, якія высоўвалі больш памяркоўную праграму. Іншая справа, што Каліноўскі і яго аднадумцы вялі няспынную барацьбу за свае погляды, намагаючыся прыцяг-

[76] Смірноў А. Гісторыкі народнай Польшчы пра Кастуся Каліноўскага // Полымя. 1958. № 1.

нуць на свой бок лепшых шляхецкіх рэвалюцыянераў і дэмакратызаваць усю арганізацыю «чырвоных» і ўвесь рух.

У якім жа напрамку вялася гэтая барацьба?

Паводле слоў Ратча, Каліноўскі бачыў «адзін толькі сродак уцягнуць народ — менавіта раздаць усю зямельную ўласнасць сялянам і **з асяроддзя земляробаў скласці арганізацыю.** Ён заяўляў, што пакажа на здольныя асобы з дробнай шляхты і з сялян, якія змогуць паноў узяць у рукі; Каліноўскі заяўляў, што пры падобных прызначэннях мяцеж стане справай насельніцтва, што яно тады ўбачыць, што абяцаны дар зямлі — не адны толькі простыя абяцанні. Ён хацеў прыцягнуць да сябе народ, далёка выйшаўшы з межаў надзелаў, аддаць усю зямлю сялянам і з асяроддзя сялян выбраць асоб для выканання свайго плана»[77]. Тут усё дадумана да канца. Мэта: ліквідаваць памешчыцкае землеўладанне. Сродак: сялянская рэвалюцыя. Абавязковая ўмова: арганізацыя земляробаў. Які глыбокі, смелы, паслядоўна рэвалюцыйны план, якое здзіўляльнае адзінства мэты і сродкаў! Ён гаварыў: дайце мне арганізацыю земляробаў, і я перавярну свет. (І пасля гэтага даводзіцца чуць, што Каліноўскі не быў тэарэтыкам!) Цікава, што, з пункту гледжання сацыяльнага матэрыялу для пабудовы новага свету, дробную шляхту, шляхціцаў-земляробаў, якія ўласнымі рукамі апрацоўвалі зямлю, Каліноўскі прыраўноўваў да сялян. І гэта было слушна: той, хто ішоў за сахой, незалежна ад назвы, павінен быў пайсці за ім на паноў.

Такі быў Каліноўскі-тэарэтык, такі быў яго план у чыстым выглядзе. Але жыццё ўносіла ў гэты план свае карэктывы. Яно не адкідвала, але ўскладняла яго. Як бы там ні было,

---

[77] Ратч В. Сведения о польском мятеже... С. 182–183.

у Беларусі і ў Літве стваралася шляхецкая рэвалюцыйная арганізацыя. У Каліноўскага быў толькі адзіны выхад: павесці за сабой найбольш левых дзеячаў гэтай арганізацыі, паспрабаваць ператварыць яе ў інструмент падрыхтоўкі сялянскай рэвалюцыі. Ужо ў тым, што «чырвоныя» адмежаваліся ад «белых», — заслуга такіх людзей, як Каліноўскі. Трэба было пашырыць гэтую прорву. Кожны новы разначынец і земляроб, уцягнуты ў арганізацыю «чырвоных», істотна змяняў яе. Каліноўскага-практыка чакала штодзённая барацьба за кожнага асобнага чалавека гэтай арганізацыі. Паводле паказанняў дробнага чыноўніка Э. Заблоцкага (удзельніка гродзенскай арганізацыі), Каліноўскі прапанаваў яму «пасаду ў арганізацыі таму, каб у ёй было больш людзей аднаго з ім становішча, г. зн. што не належалі да класа памешчыкаў, інакш апошнія забяруць усю ўладу ў свае рукі»[78].

Каліноўскі выступаў з адкрытым забралам і выказваў свае погляды нават перад людзьмі, якія не маглі іх падзяляць. Я. Гейштар расказвае, якое вялікае ўражанне зрабіла на яго першая сустрэча з Каліноўскім, што адбылася адразу пасля выбуху паўстання: «Пры першым знаёмстве ён (Каліноўскі. — *Г. К.*) даказваў мне, што ўдзел шляхты і памешчыкаў у паўстанні з'яўляецца не толькі непатрэбным, але і шкодным. Народ сам заваюе сабе незалежнасць і запатрабуе ўласнасць у памешчыкаў. Як ласку, ён дазваляў шляхце ўступаць у паўстанцкія шэрагі, але не ў сваіх паветах, а там, дзе іх не ведалі!.. Калі б яна і загінула, сустрэла б яе толькі заслужаная кара, і краіна нікольки б ад гэтага не страціла» (т. 1,

[78] ЦДГА БССР у Гродне (цяпер — Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь у Гродне, у далейшым — ЦДГА РБ у Гродне. — *Рэд.*). Фонд 3. Спр. 41. Арк. 47.

с. 222). Каліноўскі, зразумела, не думаў прыцягнуць у шэрагі сваіх прыхільнікаў такога стаўпа партыі «белых», як Гейштар. Яго словы — свядомы выклік, высакароднае «іду на вы».

Вельмі важнай часткай у агульную рэвалюцыйную тэорыю Каліноўскага ўваходзіла яго разуменне патрыятызму. Насуперак тым, што прыкрывалі абмежаванасць сваіх сацыяльных патрабаванняў высокімі словамі аб любові да радзімы, аб неабходнасці «адзінства нацыі», Каліноўскі «памяркоўнасць у поглядах наконт саслоўяў і ўнутраных адносін прымаў за недахоп патрыятызму» (Гейштар, т. 1, с. 236).

6

Перад вачыма даследчыка, які паставіў сабе задачу высветліць «геаграфію» дзейнасці Каліноўскага напярэдадні паўстання, яго постаць нібы раздвойваецца. Адна крыніца вядзе нас у Гродню. Мы бачым яго з падарожнай торбай недзе на абшарах Гродзеншчыны ў адной са сваіх шматлікіх вандровак. Другая пераносіць нас у Вільню. Дзе ж праўда? А яна і там, і тут. У Каліноўскага энергіі хапала і на Гродню, і на Вільню.

Ён мае толькі адзін сталы адрас — Якушоўка, які і быў названы ім у прашэнні на імя Назімава аб прызначэнні на службу. Але там ён не жыве, толькі зрэдку наведваецца. Ён заўсёды ў раз'ездах. Яго ўлюбёны раён — Гродня і Гродзенская губерня, дзе ён нарадзіўся і вырас і дзе меў шмат сувязей. Але ён разумеў, што вырашальнае значэнне ў падрыхтоўцы да паўстання мае Вільня як палітычны і культурны цэнтр Літвы і Беларусі.

І яшчэ адзін пункт вельмі цікавіць Каліноўскага (і разам з тым сённяшніх даследчыкаў яго біяграфіі). Гэта Пецярбург,

дзе ў Каліноўскага засталося шмат сяброў сярод рускіх і польскіх рэвалюцыянераў.

Часам здараецца так, што нават невялікая архіўная знаходка здольная азарыць яркім святлом усю біяграфію чалавека. У дадзеным выпадку гэта даведка пецярбургскага адраснага стала (першы, здаецца, на яе звярнуў увагу І. Лушчыцкі): «Былы студэнт Каліноўскі — жыў [у] Пецярбургскай часці, 4 кварт [але], дом № 16 па Вялікай Пасадскай вуліцы, і 8 студзеня 1863 г. выбыў у Гродзенскую губерню»[79]. Гэта побач з вядомымі ўжо данымі аб тым, што Каліноўскі ў снежні 1862 года прыслаў у Якушоўку пісьмо з Пецярбурга, лепшае сведчанне таго, што вялікі беларускі рэвалюцыянер увесь час напярэдадні паўстання падтрымліваў цесную сувязь з Пецярбургам (нават не выпісваўся адтуль), з пецярбургскімі сябрамі, у ліку якіх былі і члены «Зямлі і волі».

Гродзенская губерня — нібы апорны пункт Каліноўскага, адкуль ён накіроўваецца для «заваявання» новых раёнаў, яго школа рэвалюцыйнай практыкі і адначасова — велізарнае поле для выпрацоўкі і выпрабавання палітычных поглядаў, метадаў агітацыйнай работы сярод сялян, для пастаноўкі сацыяльных доследаў. Тут дзейнічае яго сябра па Пецярбургу Валерый Урублеўскі, які пасля заканчэння ў 1857 годзе Лясного інстытута апынуўся на вельмі спрыяльнай для рэвалюцыйнай дзейнасці пасадзе інспектара Егерскага вучылішча ў Саколцы. Сяброўства з Урублеўскім складае вельмі яскравую старонку біяграфіі Каліноўскага.

Урублеўскі быў на два гады старэйшы за Каліноўскага. Гэта быў выдатны стралок, сапраўдны салдат рэвалюцыі. За вонка-

---

[79] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 1835. Арк. 53 адв.

вай грубаватасцю ён хаваў шчырае сэрца. Яго жыцця хапіла не толькі на тое, каб стаць вядомым палкоўнікам паўстання 1863 года, але і на тое, каб праславіць сваё імя ў якасці генерала Парыжскай камуны. Ён быў палякам, але нарадзіўся і вырас у Беларусі і поўнасцю падтрымліваў Каліноўскага ў абароне сацыяльных і нацыянальных правоў беларускага народа. Сяброўства Каліноўскага і Урублеўскага — гэта цудоўны, неўміручы сімвал беларуска-польскіх рэвалюцыйных сувязей шасцідзесятых гадоў. Тым больш гэта дарагі ўспамін для беларускага народа, што будучы генерал Парыжскай камуны, побач з Каліноўскім, стаяў ля калыскі беларускай дэмакратычнай прэсы, вольнага слова беларусаў — ён прымаў удзел у выданні славутай «Мужыцкай праўды».

«Мінула ўжо тое, калі здавалася ўсім, што мужыцкая рука здасца толькі да сахі, цяпер настаў такі час, што мы самі можам пісаці і то пісаці такую праўду справядлівую... О, загрыміць наша праўда і як маланка пераляціць па свеце! Няхай пазнаюць, што мы можам не толькі карміць сваім хлебам, но яшчэ і вучыць сваёй мужыцкай праўдзе». Гэтыя поўныя велічы і веры словы, якімі пачынаецца першы нумар «Мужыцкай праўды», адкрываюць новую слаўную старонку ў гісторыі беларускага народа і яго літаратуры. Цяжка пераацаніць значэнне гэтых слоў. Яны азначаюць нараджэнне сялянскай дэмакратыі на Беларусі. Гэта ўрачыстая заява народа аб сваіх сацыяльных і нацыянальных правах, народа, які ўсвядоміў сваю моц і абудзіўся да актыўнага грамадскага жыцця. Узняцца з балот, выйсці з лясоў, каб заняць належнае месца сярод іншых народаў, — гэты матыў на дзесяцігоддзі вызначыць змест маладой беларускай літаратуры і напоўніць

яе высокім грамадзянскім гучаннем. Тыя ж пачуцці, якія жывуць у пракламацыях Каліноўскага, лягуць пасля ў аснову верша-гімна Янкі Купалы «А хто там ідзе?».

Каліноўскі з'яўляецца адным са стваральнікаў беларускай дэмакратычнай публіцыстыкі новага часу. Вялікі знаўца народных гаворак, які тонка адчуваў слова, Каліноўскі ўнёс буйны ўклад у справу стварэння беларускай літаратурнай мовы. Непарушнымі сувязямі змацаваўшы сваё жыццё з жыццём і барацьбой народа, ён здолеў знайсці для сваіх рэвалюцыйных думак даходлівую форму разумнай вольнай размовы з сялянамі — «дзецюкамі», як ён любоўна называў іх. Гэта была размова роўнага з роўнымі — нездарма свае творы ён падпісваў блізкім народу псеўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні» («гаспадар» — селянін, які меў сваю гаспадарку).

«Лятучыя лісткі» «Мужыцкай праўды» (так называў яе нумары А. І. Герцэн), якія распаўсюджваліся па дарогах і вёсках Беларусі, будзілі класавую і нацыянальную самасвядомасць беларускіх сялян. Тое, што газета нападала на царскі ўрад, чыноўніцтва і рэкрутчыну, яшчэ не дзіва — вострую крытыку царызму можна сустрэць і ў іншых беларускіх выданнях таго часу, якія выходзілі са шляхецка-рэвалюцыйнага лагера. Як і ў гэтых выданнях, у «Мужыцкай праўдзе» гаварылася аб адзінстве інтарэсаў беларускага і польскага народаў, але пад польскім народам Каліноўскі разумеў заўсёды працоўную яго частку і прыводзіў у сваёй газеце прыклады барацьбы менавіта гэтай часткі — польскіх сялян: «Паказваюць, што мужыкі каля Варшавы збунтаваліся і не далі рэкрута. Тады цар паняволі мусіў дараваці» (№ 5). І што самае галоўнае — побач з гэтымі прыкладамі ў газеце прыводзіліся ўзоры змагання рускіх сялян з прыгонніцтвам:

«Два рокі ўжо таму, калі яшчэ ніякіх маніфестаў аб вольнасці не аб'яўлялі, народ у Пецярбургу, Маскве і па цэлай Расеі пачаў вельмі крычаці, што калі ронд не дасць яму вольнасці, то ён цэлаю грамадою... збунтуецца...» (№ 3).

Вольнае беларускае слова (менавіта так можна назваць «Мужыцкую праўду») спрыяла пашырэнню кругагляду беларускіх сялян, адкрывала ім вочы на ўвесь шырокі свет і ў папулярнай форме прапагандавала ўлюбёную ідэю Каліноўскага — ідэю беларуска-руска-польскага рэвалюцыйнага саюзу.

Як мы ўжо гаварылі, Каліноўскі напярэдадні паўстання, г. зн. і ў перыяд выдання «Мужыцкай праўды», дзейнічаў у саюзе са шляхецкімі рэвалюцыянерамі. Але і ў гэтых умовах ён умеў прапагандаваць свае рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі. Зразумела, было б перабольшаннем сказаць, як гэта робіць А. Смірноў, што «асноўным патрабаваннем „Мужыцкай праўды" з'яўляецца заклік да знішчэння памешчыцкага землеўладання»[80]. Непасрэднага закліку ў газеце няма, але бясспрэчна, што ад выказаных у газеце думак лёгка перайсці да такога закліку. Калі перачытваеш нумары «Мужыцкай праўды», адчуваеш, што Каліноўскі, пільна сочачы за разгортваннем падзей, трымаў гэты заклік напагатове. А пакуль ён спакваля, асцярожна рыхтаваў сялян да будучай рэвалюцыі, спадзеючыся на іх магутную рэвалюцыйную самадзейнасць: «А для таго, дзецюкі, каб ніхто вас не мог ашукаці, цяпер ужо талкуйце паміж сабою, якой вам вольнасці патрэба і якім адно спосабам мужык яе дастаць можа» (№ 3). «Якой **вам** вольнасці патрэба», — вось на што націскае беларускі

[80] Смирнов А. Кастусь Калиновский. С. 42.

рэвалюцыянер. Гэта былі вельмі небяспечныя радкі для памешчыкаў, бо сам Каліноўскі даўно ўжо падслухаў запаветныя думкі селяніна аб тым, «што ўся зямля ёсць яго набытак, які аспрэчваецца толькі памешчыкам»[81]. А маючы на ўвазе «адзіны спосаб», якім сяляне здолеюць здабыць зямлю і волю, Каліноўскі ўсяляў у сялян веру ва ўласныя велізарныя сілы: «Возьмемся, дзецюкі, за рукі і дзержымся разам... Мужык, пакуль здужае трымаці касу і сякеру, бараніць свайго патрапіць і ў нікога ласкі прасіць не будзе...» (№ 1). Ці яшчэ: «...Няма чаго ждаць ад нікога, бо той толькі жне, хто пасее. Так сейце ж, дзецюкі, як прыдзе пара, поўнаю рукою, не шкадуйце працы — каб і мужык быў чалавекам вольным, як е на цалюськім свеце» (№ 3).

Крытыка грабежніцкай рэформы 1861 года трапляла часам і на старонкі шляхецка-рэвалюцыйных выданняў для народа, але там гэтая крытыка была аднабаковай, накіроўвалася толькі супраць царызму ці нават «маскоўскага панавання». Толькі «Мужыцкая праўда» здолела выкрыць непарыўную сувязь паміж царызмам і памешчыкамі («Ронд маскоўскі як той ліхі пан...» — № 4) і паказаць, што рабаўнічая рэформа — справа рук не толькі ўрада, але і памешчыкаў. Асобныя радкі газеты дыхаюць сапраўднай сялянскай нянавісцю да памешчыкаў.

«Шэсць лет ужо мінула, як пачалі гаварыць а свабодзе мужыцкай. Гаварылі, талкавалі і пісалі многа, а нічога не зрабілі. А гэты маніфест, што цар з сенатам і з панамі для нас напісаў, то... ніякай у нём няма праўды, няма з яго для

---

[81] Тлумачальная запіска Каліноўскага ад 28 лютага 1864 года (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 280. Арк. 5).

нас ніякай карысці» (№ 1). І зноў ад гэтых слоў Каліноўскі вяртаўся да запаветнай думкі аб той свабодзе, якую ўяўляюць сабе самі сяляне: «Но прыходзіць яму (цару. — *Г. К.*) ужо канец, бо мужык пачуў вольнасць, а мужыцкая вольнасць гэта ўсё роўна што шыбеніца для ўсіх здзерцаў і глуміцеляў народа! Для таго-то цар спыняе вольнасць мужыцкую і спыняці будзе, для таго-то, калі ў паноў сто раз пытаў, якую яны хочуць даці вольнасць мужыкам, у мужыкоў і разу не спытаў, якой яны хочуць вольнасці» (№ 4).

Зразумела, многія радкі «Мужыцкай праўды» павінны былі выклікаць страх і незадавальненне памешчыцкага лагера і нават шляхецкіх рэвалюцыянераў.

Менавіта такія адносіны да газеты ў Кучэўскага-Порая, вытрымкі з мемуараў якога прыводзіліся намі вышэй: «У гэту пару з'явілася тайнае рэвалюцыйнае перыядычнае выданнейка, якое мела намер праз пажар і кроў падбухторыць сялян супраць... чыноўнікаў і ранейшых паноў. Сяляне заклікаліся да таго, каб яны самі сабе адмералі справядлівасць — з дапамогай разні. Гэтае выданнейка, якое рэдагаваў на беларускай мове пад назвай „Мужыцкая праўда" Янка „з-пад Вільні", раскідвалася ў тысячах экзэмпляраў»[82].

Каліноўскі добра ведаў, на што ішоў. У першым жа нумары газеты, папярэджваючы сялян аб пачатку барацьбы, ён дае такую расстаноўку класавых сіл: «Маскалі (прадстаўнікі царскай улады. — *Г. К.*), чыноўнікі і многа паноў будуць перапыняць пісьмо наша да вас, но найдуцца людзі і з мужыкоў разумнейшыя, і з панскага роду, і з местачковых, што хочуць вашай свабоды, вашага шчасця, яны-то вам самі гэта пісьмо

[82] Demokracja polska... S. 108.

даваці будуць, каб вы зналі, хто ваш прыяцель, а хто ваш вораг».

Як гэтыя радкі сугучны і па тоне, і па змесце са славутай пракламацыяй М. Г. Чарнышэўскага «Барскім сялянам ад іх добразычліўцаў паклон»! Цалкам маюць рацыю тыя даследчыкі (І. Лушчыцкі, А. Смірноў), якія адзначаюць, што многія месцы беларускай рэвалюцыйнай газеты навеяны лепшымі ўзорамі рускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай агітацыйнай літаратуры. Зразумела, справа тут не так у прамых запазычаннях (Каліноўскі, відавочна, не чытаў пракламацыі Чарнышэўскага, бо яна не была выдадзена), як ва ўнутранай роднасці, у братэрстве па духу.

«Мужыцкая праўда» выклікала вялікую літаратуру. І ў наш час у газеты многа рэцэнзентаў — прыхільных і добразычлівых. Але пры ацэнцы яе часам забываюць, што газета была плёнам надзвычай складанай эпохі, вельмі цікавай палітычнай сітуацыі. Нагадаем яшчэ раз, што ў час яе выдання Каліноўскі знаходзіўся ў саюзе са шляхецкімі рэвалюцыянерамі. У сувязі з гэтым даводзіцца здзіўляцца не таму, што ў газеце ёсць асобныя хібы, а таму, што нават у гэтых умовах Каліноўскі здолеў данесці да сялян многае (хоць, зразумела, не ўсё) са сваіх запаветных думак. Забываюць таксама, што «Мужыцкая праўда» была спецыфічным агітацыйным выданнем, разлічаным на кругагляд сярэдняга селяніна; па газеце трэба меркаваць перш за ўсё аб надзвычайнай здольнасці Каліноўскага знайсці найкарацейшы шлях да сялянскіх сэрцаў (час не чакаў!), аб яго агітацыйным майстэрстве, аб яго ўменні весці паспяховую рэвалюцыйную агітацыю ў небывала цяжкіх умовах. Забываюць, нарэшце, што «Мужыцкая праўда» не толькі палітычны да-

кумент, але і літаратурны твор, што «Яська-гаспадар з-пад Вільні» — не толькі псеўданім Каліноўскага, але і створаны Каліноўскім і яго сябрамі літаратурны вобраз перадавога беларускага селяніна свайго часу, які ўжо можа «вучыць сваёй мужыцкай праўдзе», аднак не пазбавіўся яшчэ некаторых сялянскіх ілюзій. Недаацэнка гэтых акалічнасцяў прыводзіць часам да смешных рэчаў. Аднойчы, напрыклад, Яська сказаў: «Чалавек-то такую мае натуру, што альбо нічога не ведае і нічога меці не хоча, альбо калі даведаецца, то схоча зразумеці добра і дастаці ўсенка, што яму належыць. Гэта вялікая праўда» (№ 3). І нам здаецца, што разумна сказаў Яська. Але, відаць, не сказаў бы ён гэтага, калі б ведаў, што праз шматшмат гадоў будуць вучоныя людзі на падставе гэтых слоў рабіць вывад, што Каліноўскі, «...не бачачы матэрыяльнай асновы грамадскай ідэалогіі... апеліраваў да асаблівасцей чалавечага характару і чалавечай прыроды»[83].

У цяперашні час поўнасцю пакончана з блытанінай адносна складу выдаўцоў «Мужыцкай праўды» — і гэта вялікая заслуга даследаванняў апошніх гадоў. У выданні газеты прымалі ўдзел тры чалавекі. Трэцім (апроч Каліноўскага і Урублеўскага) быў Фелікс Ражанскі, беларускі паэт, землямер («геаметра») з маёнтка Вялікія Берастовіцы. Аб ім мы, на жаль, ведаем менш. Захаваліся паўстанцкія песні на беларускай мове, напісаныя Ражанскім[84], але яны пазбаўлены глыбокага сацыяльнага зместу, як і яго ўспаміны.

Ёсць падставы меркаваць, што Ражанскі значна саступаў Каліноўскаму і Урублеўскаму па глыбіні сацыяльна-

---

[83] Смірноў А. П. Кастусь Каліноўскі... С. 6.

[84] Aramowicz I. Marzenia: Pamiętnik o ruchu partyzanskim w województwie Grodzieńskim w 1863 r. Bendlikon, 1865. S. 22.

палітычных поглядаў. Можна таксама, у якасці гіпотэзы, дапусціць, што менавіта Ражанскі быў аўтарам «Пісьма ад Яські-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай»[85]. У «Пісьме», як і ў песнях Ражанскага, праводзілася думка, што Беларусь з'яўляецца неад'емнай часткай Польшчы.

Каліноўскі ж, які заклікаў беларускі народ падтрымаць гераічную барацьбу брацкага польскага народа, усё ж такі ніколі не вырашаў за беларусаў пытанне аб іх радзіме. Наадварот, ён няўхільна змагаўся з пасяганнямі на Беларусь часткі польскіх дзеячаў, а аднойчы (у хвіліну гневу) нават заявіў, што «такой дурной мазгаўні, як Варшава, нельга даручаць будучы лёс Літвы (г. зн. Літвы і Беларусі. — *Г. К.*)»[86].

Выдаўцы «Мужыцкай праўды» складалі ядро рэвалюцыйнай арганізацыі Гродзенскай губерні, якую стварыў Каліноўскі яшчэ ў 1861 годзе. Вось чаму найбольш верагодна, што газета недзе тут, у Гродзенскай губерні, і друкавалася, а не ў Вільні, як мяркуюць некаторыя даследчыкі. Наўрад ці друкарня «Мужыцкай праўды» знаходзілася і ў Беластоку, дзе дзейнічаў Браніслаў Шварцэ, які падпарадкоўваўся непасрэдна Варшаве і варожа ставіўся да Каліноўскага. У кожным разе Ф. Ражанскі ў сваіх успамінах супрацьстаўляе выданне «Мужыцкай праўды» беластоцкім выданням Шварцэ: Ражанскі «разам з Каліноўскім друкаваў народнае перыядычнае выданне (pismo ludowe) пад назвай „Мужыцкая праўда" з подпісам „Яська-гаспадар з-пад Вільні", і пару песенек і „гутарак" на той жа мове выдаў Браніслаў Шварцэ ў Беластоку»[87].

---

[85] Больш падрабязна пра гэта гл.: Кісялёў Г. Здарэнне з Яськам-гаспадаром // Полымя. 1994. № 6. С. 142–155. — *Рэд.*

[86] Ратч В. Сведения о польском мятеже... С. 181.

[87] Rożański F. Z województwa Grodzieńskiego. S. 396.

Нам уяўляецца цалкам верагодным меркаванне А. Смірнова, што «Мужыцкая праўда» друкавалася «ў падпольнай друкарні, схаванай у пушчы, паблізу гарадка Саколка, дзе пражываў сябра К. Каліноўскага Валерый Урублеўскі»[88].

Але ў той жа самы час, калі з-пад прэса тайнай рэвалюцыйнай друкарні, схаванай ад вачэй паліцыі, як і вачэй сённяшніх даследчыкаў, выходзілі лісткі «Мужыцкай праўды», Каліноўскі вёў напружаную работу па аб'яднанні ўсіх рэвалюцыйных груп Беларусі і Літвы ў адзіную арганізацыю. Для гэтага яму ўсё часцей і часцей даводзілася выязджаць у Вільню.

7

У пачатку 60-х гадоў XIX ст. у Вільні налічвалася каля 60 тысяч жыхароў. Гэта быў горад магнатаў і рамеснікаў, чыноўнікаў і вайсковых, гандляроў і манахаў, літаратараў і навучэнцаў. У прыгожым палацы, пабудаваным у стылі ампір, змяшчалася канцылярыя генерал-губернатара, які кіраваў у той час Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернямі. Ён жа лічыўся камандуючым войскамі Віленскай ваеннай акругі. Акруга была пагранічнай, і войскаў тут было размешчана нямала.

У неспакойныя часы давялося кіраваць беларускімі і літоўскімі губернямі генерал-губернатару Назімаву. У першай палове 1861 года яшчэ працягвалася следства над удзельнікамі віленскага рэвалюцыйнага гуртка Вікенція

---

[88] Смірноў А. П. Кастусь Каліноўскі... С. 77. Магчыма, што некаторыя нумары газеты (асабліва з ліку апошніх) надрукаваны ў Вільні.

Віткоўскага, выкрытага ўладамі восенню 1860 года. Але ўлады тады не маглі нават падазраваць, што ў гэты ж самы час у Вільні пачаў дзейнічаць значна больш небяспечны т. зв. «Камітэт руху», які, аб'яднаўшы ўсе самыя актыўныя элементы, незадаволеныя царскім рэжымам, сямімільнымі крокамі ішоў да адкрытага паўстання. «Камітэт руху» (праз год ён атрымаў назву Літоўскага правінцыяльнага камітэта) быў цэнтрам арганізацыі «чырвоных» у Беларусі і Літве. Яго «душой», «бясспрэчна, самай выдатнай фігурай»[89] з'яўляўся Кастусь Каліноўскі.

Але імкненне да хуткага паўстання было, бадай, самае галоўнае, што звязвала гэтых дзеячаў. Зразумела, усе яны былі настроены больш ці менш дэмакратычна, аднак большасць з іх былі шляхецкімі дэмакратамі. У звычайных умовах яны не ўзняліся б вышэй за ліберальныя размовы, і толькі любоў да пакрыўджанай радзімы зрабіла з іх барацьбітоў-змоўшчыкаў.

Найбольш блізкім паводле светапогляду да Каліноўскага быў капітан генеральнага штаба Людвіг Звяждоўскі, накіраваны ў Вільню для рэвалюцыйнай работы Пецярбургскім гуртком Серакоўскага. Яго прыгожую фігуру ў мундзіры з аксельбантам бачылі на віленскіх вуліцах і ў свецкіх салонах. Але ніхто не мог падумаць, што пад гэтым мундзірам б'ецца сэрца рэвалюцыянера, чалавека, які ў 1863 годзе аддасць загад павесіць найбольш лютых памешчыкаў.

Звяждоўскі займаў пасаду старшага ад'ютанта ў акруговым штабе. Ён карыстаўся вялікім даверам з боку генерал-губернатара Назімава і бываў у яго доме. Улетку Звяждоўскі

---

[89] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 1. S. 222.

нават жыў на генерал-губернатарскай дачы. Гэта дало віленскім рэвалюцыянерам падставу жартаваць, што «бяспеку іх камітэта ахоўвае рускі каравул»[90]. Пасля арышту Дамброўскага ў жніўні 1862 года Звяждоўскі быў скампраметаваны па ўзніклай тады справе аб «Літаратурных вечарах» і ў кастрычніку гэтага ж года пераведзены ў Маскву.

Цікавай фігурай у камітэце быў Баляслаў Длускі. Чалавек таго ж пакалення, што і Серакоўскі, ён яшчэ ў юнацкім узросце быў сасланы на Каўказ, дзе ўдзельнічаў у баях з горцамі. Даслужыўшыся да афіцэрскага чыну, выйшаў у адстаўку, закончыў Маскоўскі універсітэт і стаў урачом. У часы студэнцтва, паводле ўспамінаў сучасніка, «апрануты быў у беларускую світку шэрага простага сукна, валасы з сівізной, пышныя вусы, увогуле меў выгляд воіна»[91]. У 1863 годзе пад псеўданімам Ябланоўскага ён узначаліў паўстанцкі атрад на Ковеншчыне і храбра, з поспехам біўся з царскімі войскамі, але, як адзначаюць крыніцы, пасля першых жа няўдач стаў «грэбаваць косамі» (г. зн. сялянамі) і абапіраўся галоўным чынам на шляхецкую моладзь. Гэта паказвае, якім нетрывалым, павярхоўным быў яго дэмакратызм.

У нас няма даных, каб аднесці да паслядоўных дэмакратаў і іншых членаў камітэта, у склад якога побач з Каліноўскім, Звяждоўскім і Длускім уваходзілі маладыя памешчыкі Зыгмунт Чаховіч (праз шмат-шмат гадоў з ім у маёнтку Бясяды пазнаёміцца сын земляроба Іван Луцэвіч, будучы Янка Купала) і Антон Залескі (чалавек са здольнасцямі мастака), ваенны інжынер Ян Козел, які ў 1863 годзе

---

[90] Ратч В. Сведения о польском мятеже... С. 186.

[91] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 1. S. 359.

праславіўся ў Польшчы пад імем палкоўніка Скалы, студэнт Пецярбургскага універсітэта Эдмунд Вярыга, спявак і настаўнік спеваў, сябра кампазітара С. Манюшкі Ахілес Банольдзі. Амаль усе яны цікавыя людзі, але па сваім рэвалюцыйным светапоглядзе Каліноўскі быў, можа, на цэлую галаву вышэй за большасць сваіх камітэцкіх таварышаў.

Каліноўскі не быў адзінокі, але яго сяброў-аднадумцаў можна пералічыць па пальцах. Яго трагедыя — гэта трагедыя чалавека, які на шмат гадоў апярэдзіў сваіх сучаснікаў. Не, яго шлях не быў упрыгожаны ружамі, на кожным кроку яго сустракала неразуменне навакольных, чакала барацьба за свае погляды. Гісторыкі, якія не заўважаюць гэтага, мімаволі зніжаюць драматызм падзей, удзельнікам якіх быў Каліноўскі.

Сутнасць ідэйных разыходжанняў у Літоўскім камітэце перадае ў сваіх мемуарах шляхецкі рэвалюцыянер Е. Кучэўскі-Порай: «Каліноўскі як хлопаман быў толькі з народам. Я ж разумеў справу так, што належыць... заклікаць да паўстання ўсю нацыю... Я хацеў выклікаць і выкарыстаць сілы шляхам прапаганды ў нацыянальным духу, ён жа збіраўся скарыстаць любы сацыяльны стымул для таго, каб выклікаць хваляванні... Каліноўскі, маючы за плячыма досвед зносін з народам, шукаў у пакутах паднявольнага рабства тую сілу, якую ён як рыцар, што змагаўся ў імя затаптаных чалавечых правоў, мог бы ўзняць на паўстанне. Ён адчуваў біццё гэтага пульсу ў сялянах усёй Польшчы (г. зн. Беларусі, Літвы, Польшчы. — *Г. К.*). Ён збіраўся дзейнічаць у гэтым напрамку, і менавіта на гэты зыходны пункт ён і ўказваў...» Вядома, былі разыходжанні і паміж іншымі членамі арганізацыі «чырвоных» — шляхецкімі рэвалюцыянерамі, але, сутыкаючыся з Каліноўскім, кожны разумеў, што тут нешта іншае,

больш прынцыповае. Расказваючы пра першае пасяджэнне Літоўскага правінцыяльнага камітэта, Кучэўскі адзначае вельмі цікавую дэталь: «Каліноўскі пярэчыў супраць усяго, нікому не даючы гаварыць, таму мы яго папрасілі, каб ён дазволіў нам спачатку дамовіцца паміж сабой, а потым ужо з ім разам, ён згадзіўся і пайшоў з пасяджэння»[92]. І гэта зусім зразумела, бо Каліноўскі прадстаўляў сялян на гэтым сходзе шляхецкай дэмакратыі. Але паступова ўплыў Каліноўскага на кіраўнікоў партыі «чырвоных» у Беларусі і Літве ўзрастаў. Шэрагі яго аднадумцаў множыліся. Крыніцы адзначаюць, у прыватнасці, вялікае ідэйнае ўздзеянне беларускага рэвалюцыянера на Звяждоўскага.

Тое, да чаго прыйшоў даволі стракаты камітэт, своеасаблівы раўнадзейны «вектар сіл», прадстаўленых у камітэце, знаходзіць адлюстраванне ў органе камітэта — газеце «Сцяг свабоды», першы нумар якой выйшаў якраз напярэдадні паўстання — 1 студзеня 1863 года. Пад уплывам Каліноўскага ў газеце падкрэслівалася розніца паміж царскім урадам і рускім народам, выказвалася запаветная думка вялікага беларускага рэвалюцыянера, што ў рускім народзе трэба бачыць не ворага, а саюзніка ў барацьбе супраць царызму і прыгонніцтва: «Народ маскоўскі ўздрыгвае пры думцы аб нашай спрадвечнай крыўдзе, ён свабодным братам нашым, а не прыгнятальнікам быць жадае і адказнасць за нашу жалезную няволю ўскладае рашуча на царызм, асуджаны на пагібель»[93]. Але адначасова газета высоўвала «прынцып раўнапраўя ўсіх саслоўяў... без страты чыёй бы то ні было ўласнасці...»,

---

[92] Biblioteka Narodowa. II, 6521.

[93] Chorągiew swobody. 1863. 1 студз. (№ 1).

г. зн. без страты і памешчыцкай уласнасці. Як бачым, у гэтым важнейшым пытанні верх пакуль што ўзялі шляхецкія рэвалюцыянеры, а сялянскі дэмакрат Каліноўскі (хоць і быў у гэты час старшынёю камітэта) застаўся ў апазіцыі.

Затое Каліноўскаму ўдалося павесці за сабою большасць членаў камітэта ў пытанні аб узаемаадносінах Літоўскага правінцыяльнага камітэта з Цэнтральным нацыянальным камітэтам у Варшаве, які ўзнік у 1862 годзе. Гэтае пытанне з'яўлялася неад'емнай часткай больш агульнага пытання аб узаемаадносінах Беларусі і Літвы з Польшчай. З дапамогай рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі і лепшых прадстаўнікоў рэвалюцыйнай Польшчы Каліноўскі вёў упартую барацьбу з нацыяналістычнымі імкненнямі часткі шляхецкіх рэвалюцыянераў, якія разглядалі Беларусь і Літву як састаўныя часткі непадзельнай Польшчы. З неапублікаваных фрагментаў ратчаўскіх «Звестак», якія захоўваюцца ў Ленінградскай публічнай бібліятэцы [РНБ], мы даведваемся, што Каліноўскі першы ўзняў у Літоўскім камітэце нацыянальнае пытанне. І адразу ж высветлілася, што не ўсе вырашаюць гэтае важнейшае пытанне аднолькава. Адны лічылі, што Беларусь і Літва павінны ўвайсці ў склад Польшчы ў выглядзе шэрагу ваяводстваў на такіх жа правах, як Люблінскае, Кракаўскае і інш. Другія ўяўлялі сабе будучую федэратыўную дзяржаву, усе часткі якой (Польшча, Літва, Беларусь і Украіна) будуць мець сваіх прадстаўнікоў у агульнадзяржаўным органе. Каліноўскі не згаджаўся ні з тымі, ні з другімі. У «Звестках» чытаем, што ён «зусім не быў схільным працаваць для Польшчы і ў выпадку агульнага вызвалення... калі ў Польшчы ўваскрэсне старажытнае магнацтва з усімі шляхецкімі традыцыямі, з нацяжкай прыстасаванымі да XIX стагоддзя, бачыць Літву

(г. зн. Літву і Беларусь. — *Г. К.*) уцягнутай у той жа вір. Больш за ўсё баяўся ён уварвання белай партыі эміграцыі, указваючы, што яна, таксама як французская эміграцыя 1815 года, стане дамагацца ранейшых правоў і прывілеяў; Каліноўскі баяўся таго зліцця з Польшчай, пры якім потым ад яе нельга было б і адвязацца. Ён хацеў [бачыць] Літву не з адноўленымі на новы лад старымі шляхецкімі традыцыямі, але Літву, якую ён мог бы ператварыць з усеагульным ураўнаваннем правоў і станаў на новых асновах камуністычнай бязглуздзіцы, якую прапаведуе Герцэн і К°, знаходзячы нават, што галіцыйскай разні[94] будзе замала, каб вызваліць народ ад усякага ўплыву шляхецтва, якога і наступнае пакаленне можа ўваскрасіць з часам дамаганні цяперашнія»[95].

Калі адкінуць лаянку ў адносінах камуністаў (генерал не мог без яе абысціся — «прывід камунізму» ўжо тады блукаў па Еўропе) і іншае ўнесенае Ратчам шалупінне, перад намі новае, не баюся сказаць, яскравае сведчанне паслядоўна рэвалюцыйных пазіцый Каліноўскага. Зноў звяртае на сябе ўвагу такая канкрэтнасць, дэтальнасць характарыстыкі (напрыклад, параўнанне белай польскай эміграцыі з прагнымі натоўпамі эмігрантаў-арыстакратаў, якія рынулі ў Францыю ў час рэстаўрацыі Бурбонаў у 1814 і 1815 гадах), якая не магла быць прыдумана Ратчам, а была, несумненна, пазычана з першакрыніцы, што не дайшла да нас.

Прывядзём другі ўрывак: «Каліноўскі стаяў пільным вартаўніком інтарэсаў Літвы і адстойваў, каб сродкі і сілы Літвы зусім не ішлі б на справу Царства Польскага. Літва,

---

[94] Сімвал бязлітаснай расправы сялян з памешчыкамі (ад антыфеадальнага паўстання 1846 года ў Галіцыі).

[95] АР ДПБ [АР РНБ]. Фонд 629. Спр. 13. Арк. 2–6.

гаварыў ён сваім інтымным сябрам, павінна скарыстаць разлад паміж Расіяй і Польшчай і зрабіцца самастойнай. Энергічна абараняў ён захаванне рэвалюцыйным камітэтам назвы Літоўскага камітэта супраць жадання Варшавы надаць яму назву Літоўскага выканаўчага аддзела. Каб у вачах мас паказаць сваё першынство, Варшаўскі камітэт пастаянна дадаваў Літоўскаму назву „правінцыяльнага". Каліноўскі ўвесь час патрабаваў, каб выдаткі па Літве вяліся б асобна ад Царства» (арк. 6). Як бачым, і гэтыя радкі малююць Каліноўскага верным сынам свайго народа, хаця, зразумела, Ратч утрырує некаторыя пытанні, у прыватнасці пытанне аб самастойнасці Беларусі і Літвы. Уся сукупнасць крыніц гаворыць аб тым, што Каліноўскі ў аснову ставіў дабро беларускага і літоўскага народаў, таксама як народаў рускага і польскага. Ён быў супраць захопніцкіх намераў рускіх цароў і польскіх памешчыкаў. Ён наогул быў супраць цароў і памешчыкаў, на якой бы мове яны ні размаўлялі. Беларусь ляжала паміж Расіяй і Польшчай, ён хацеў, каб не яблыкам разладу, а мостам сяброўства была яго бацькаўшчына. Ён хацеў бачыць побач са шчаслівай Беларуссю шчаслівую Расію і шчаслівую Польшчу. А формы гэтага суседства былі для яго нават не другой, а дзесятай справай.

Адстойваючы вялікі прынцып самавызначэння народаў, Каліноўскі змагаўся за тое, каб пытанне аб будучым лёсе беларускага і літоўскага народаў вырашалася не ў Варшаве, а ў хатах беларускіх і літоўскіх сялян. А пакуль што ён лічыў, што адносіны паміж Віленскім і Варшаўскім рэвалюцыйнымі камітэтамі павінны будавацца на аснове роўнасці.

Неабходнасць такой лініі была тым больш відавочнай, што рэвалюцыйную Польшчу (з мандатам камісара Варшаўскага

цэнтральнага нацыянальнага камітэта) прадстаўляў у Вільні Нестар Дзюлеран. Гэта была дзіўная асоба. Ні ў архіўных дакументах, ні ва ўспамінах сучаснікаў не засталося звестак (ды, напэўна, ніхто толкам і не ведаў), адкуль ён з'явіўся і куды пасля знік. Вядома толькі, што ён служыў ва ўпраўленні чыгункі ў Вільні і быў прыхільнікам польскага «рэвалюцыянера» Людвіга Мераслаўскага, які па сваіх дыктатарскіх замашках, па сваёй схільнасці да інтрыг, пустаслоўя і пазёрства вельмі нагадвае рускага рэвалюцыянера Бакуніна. Розніца была хіба ў тым, што Мераслаўскі быў да таго ж заўзятым нацыяналістам[96]. Дзюлеран, што нагадваў маленькі злепак са свайго куміра, лічыў сябе поўным гаспадаром у віленскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Каліноўскі, які ніколі не ўмеў хаваць сваіх сімпатый і антыпатый, называў яго ў вочы «беспрынцыповым балбатуном»[97]. Можна здагадвацца, як дрэнна і тэндэнцыйна інфармаваўся аб становішчы спраў у Вільні Варшаўскі камітэт, рэвалюцыйнае ядро якога да таго ж было значна аслаблена пасля арышту Яраслава Дамброўскага. Адносіны паміж абодвума камітэтамі ўвесь час заставаліся напружанымі. Выбух наступіў пасля таго, як беластоцкая арганізацыя была афіцыйна падпарадкавана Варшаве і варшаўскія агенты пачалі збор рэвалюцыйнага «падатку» ў Беларусі. Паводле слоў Ратча, «раззлаваны Каліноўскі выштурхаў Дзюлерана з пасяджэння» (с. 186).

---

[96] Мы не гаворым пра тое, што Бакунін пакінуў непараўнальна большы след у гісторыі рэвалюцыйнага руху.

Цікава, што Альгерд Абуховіч, які пазнаёміўся з генералам Мераслаўскім у Парыжы каля 1860 года, слушна сказаў наконт яго: «Не гэткага крою павінны быць стаўпы народаў, уваскрасіцелі Бацькаўшчыны!» (Беларускія пісьменнікі другой паловы XIX ст.: Зб. тэкстаў. Мінск, 1956. С. 269).

[97] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 2. S. 63.

У лістападзе 1862 года ў Варшаву выехаў Э. Вярыга, які вёз з сабой катэгарычныя патрабаванні Каліноўскага: выдаліць Дзюлерана, прызнаць поўную роўнасць абодвух камітэтаў, перадаць беластоцкую арганізацыю Вільні. Паводле патрабавання Каліноўскага, Цэнтральны камітэт пазбаўляўся права пасылаць у Беларусь і Літву якіх-небудзь агентаў, апроч пастаяннага прадстаўніка — камісара ў Вільні. Такі ж камісар павінен быў прадстаўляць Беларусь і Літву ў Варшаве. Адно з патрабаванняў было асабліва важным: тэрмін паўстання мог быць вызначаны толькі са згоды абодвух камітэтаў[98]. Аднак шляхецкаму рэвалюцыянеру Аскару Авейдэ (Каліноўскі добра ведаў яго: яны былі таварышамі па універсітэце), які вёў перагаворы ад імя Цэнтральнага камітэта, удалося схіліць Вярыгу да шэрагу ўступак. Нязломны Каліноўскі паслаў у Варшаву Длускага, які, паводле слоў Авейдэ, «быў упарты, цвёрды аж да закаснеласці»[99]. Перагаворы засталіся без выніку.

Яшчэ Ратч, апісваючы барацьбу Каліноўскага з нацыяналістычнымі дзеячамі Цэнтральнага камітэта, звязвае гэтыя падзеі з выступленнямі «Колокола» па польскім пытанні ў канцы 1862 года. Праўда, ён, згодна са сваёй «ме-

---

[98] Berg M. W. Zapiski o powstaniu polskim 1863 i 1864 r. i poprzedzającej powstanie epoce demonstracyj od 1856 r. Kraków, 1898. T. 2. S. 251. «Запіскі» М. В. Берга складаліся па даручэнні намесніка ў Царстве Польскім Ф. Ф. Берга. Напісаныя больш аб'ектыўна, чым працы Ратча і Гогеля, яны з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі паўстання 1863 года ў Польшчы. Рускае выданне «Запісак» было знішчана царскімі ўладамі.

[99] Показания и записки о польском восстании 1863 г. Оскара Авейде. М., 1961. С. 489. Свае «Запіскі» Авейдэ напісаў у турме па заданні царскіх улад. У 1866 годзе яны былі выдадзены ў Варшаве тыражом у некалькі дзесяткаў экзэмпляраў для службовага карыстання. У 1961 г. гэтая вельмі змястоўная крыніца перавыдадзена да стогадовага юбілею паўстання.

тодай», надае выступленням «Колокола» адваротны сэнс (с. 186), але, наогул кажучы, нюх не ашукаў на гэты раз бравага генерала. Сапраўды, адначасовасць і аднолькавая рашучасць выступленняў Герцэна і Каліноўскага ў абарону нацыянальных правоў беларускага, літоўскага і ўкраінскага народаў не могуць не здацца дзіўнымі. Сувязь ёсць бясспрэчная, прынамсі з аднаго боку: Каліноўскі чэрпаў з выказванняў Герцэна па пытанні аб лёсе былых правінцый Рэчы Паспалітай новыя сілы для сваёй барацьбы. «Зямля сялянам, самастойнасць абласцям — на гэтай падставе, і **толькі на ёй**, можа скласціся дзейсны саюз ваш з польскімі братамі», — падкрэсліваў Герцэн у лісце да рускіх рэвалюцыйных афіцэраў у Польшчы ад 10 кастрычніка 1862 года. І калі Каліноўскі чытаў у «Колоколе» імя сваёй бацькаўшчыны, яго ахоплівала пачуццё шчырай удзячнасці да вялікага рускага выгнанніка, які думаў і пра яго Беларусь: «**...быць Літве, Беларусі і Украіне, з кім яны быць хочуць ці ні з кім, толькі б волю іх ведаць — не падробленую, а сапраўдную**»[100].

Сувязь паміж выступленнямі «Колокола» і Каліноўскага дае падставу думаць, што, мабыць, і да далёкага Лондана данесліся весці пра цяжкую, гераічную барацьбу Каліноўскага за рэвалюцыйна-дэмакратычную праграму. Інакш адкуль у Герцэна такая трывога, якую ён выказаў падчас перагавораў з прадстаўнікамі Цэнтральнага нацыянальнага камітэта ў канцы верасня 1862 года: «Мне ўсё здаецца, што ім да сялянскай зямлі, па сутнасці, мала справы, а да правінцый занадта многа». І, заключаючы ад імя перадавой Расіі саюз з рэвалюцый-

[100] Герцен А. И. Русским офицерам в Польше // Собр. соч.: В 30 т. М., 1954–1966. Т. 16. 1959. С. 253–254.

най Польшчай, ён заявіў яе прадстаўнікам: «Калі ў Расіі на вашым сцягу не ўбачаць **надзел зямлі і волю правінцыям**, дык наша спачуванне вам **не прынясе ніякай карысці**, а нас загубіць...»[101]

8

У ноч на 11 (23) студзеня 1863 года, калі падрыхтоўка паўстання ў Беларусі і Літве толькі яшчэ разгортвалася, снег над Віслай і Бугам афарбаваўся крывёю першых паўстанцаў. «Шчаслівая, ахопленая адраджэннем» Польшча зноў паўстала супраць занявольнікаў, напісаўшы на сваіх сцягах лозунгі незалежнасці і надзялення зямлёй сялян. І хаця маніфест і дэкрэты Варшаўскага часовага нацыянальнага ўрада (як стаў называць сябе Цэнтральны камітэт) ад 10 (22) студзеня не ставілі пытання аб суцэльнай ліквідацыі памешчыцкага землеўладання, паўстанне было з энтузіязмам сустрэта ўсімі перадавымі людзьмі ў Еўропе і Расіі. «Што ты скажаш наконт польскай гісторыі? — усхвалявана пісаў Маркс у адным са сваіх лістоў да Энгельса. — Ясна адно: у Еўропе зноў больш ці менш шырока адкрылася эра рэвалюцый»[102].

У Вільні вестка аб паўстанні зрабіла ўражанне нечаканага выбуху бомбы. Пасля зрыву перагавораў з Варшавай Каліноўскі мог бы палічыць сябе не звязаным ніякімі абавязацельствамі перад дзеячамі Царства Польскага. Не спадабаўся яму і варшаўскі маніфест: занадта старанна абыходзілі яго

---

[101] Герцен А. И. Былое и думы // Собр. соч.: В 30 т. М., 1954–1966. Т. 11. 1957. С. 370–371.

[102] Ліст ад 13 лютага 1863 г. (Маркс К., Энгельс Ф. Соч.: В 50 т. 2-е изд. М., 1954–1981. Т. 23. 1960. С. 133–134).

аўтары пытанне пра будучы лёс Беларусі, Літвы і Украіны, народы якіх заклікаліся да бою; занадта рупліва таргаваліся яны за кожны морг зямлі, які павінен быў атрымаць паўстанец, што пральe сваю кроў за радзіму; занадта паспешліва абяцалі поўную кампенсацыю памешчыкам. Але вялікі беларускі рэвалюцыянер ведаў, што аўтары маніфеста, як і тыя, хто сарваў перагаворы з братняй Беларуссю і Літвой, або памыляліся, або не былі сапраўднымі выказнікамі інтарэсаў польскага народа. Ён ведаў, што лёс паўстання будзе вырашацца не ў кабінетах кіраўнікоў, хоць ад іх залежала многае, а на палях Польшчы, Беларусі, Расіі — Расіі, дзе, паводле агульнага меркавання, вясной 1863 года павінна была пачацца сялянская вайна супраць памешчыкаў. Час не чакаў, трэба было закасваць рукавы.

Перш за ўсё Літоўскі камітэт аб'явіў сябе Часовым урадам Літвы і Беларусі і пазнаёміў беларускі і літоўскі народы з маніфестам Варшаўскага ўрада. За Гродзеншчыну Каліноўскі быў спакойны — там дзейнічаў Урублеўскі. На Ковеншчыну быў пасланы Длускі, на Віленшчыну — Залескі. У заснежаных лясах Беларусі і Літвы з'явіліся першыя паўстанцкія атрады — Фелікса Віславуха, Людвіга Нарбута, Клеція Карэвы. З Падляшша на Гродзеншчыну прабіўся са сваім атрадам Раман Рагінскі.

У Вільнюскім гістарычным архіве знойдзена кароткая друкаваная аб'ява, выпушчаная, відаць, адразу пасля таго, як у Вільні даведаліся пра паўстанне ў Польшчы. У ёй гаварылася: «Браты! Каралеўства паўстала!.. Кроў, што льецца за Нёманам, кліча нас да зброі. Барацьба з захопнікамі за наша святое права, за нашу свабоду набліжаецца і ў нас»[103].

---

[103] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 1519. Арк. 40.

Крыху пазней, відаць, выйшла «Інструкцыя для ваенных начальнікаў, ваяводскіх і павятовых». Рукапісны экзэмпляр яе з пячаткай Літоўскага правінцыяльнага камітэта захоўваецца сярод папер Ратча[104]. «Каб не дазволіць захопнікам звярнуць усе свае сілы на Кангрэсоўку (г. зн. Польшчу. — *Г. К.*), у якой паўстанне разгарнулася ўдала, усе паветы Літвы і Беларусі павінны выступіць і пачаць барацьбу», — сказана ў пачатку дакумента. У інструкцыі намечана канкрэтная праграма дзеянняў паўстанцаў, ад нападу на слабыя гарнізоны і атрады царскіх войск да «захопу павятовых гарадоў і поўнага ачышчэння паветаў ад непрыяцеля». Каліноўскі добра разумеў галоўныя ўмовы поспеху партызанскай вайны — наступальная тактыка, рухомасць пакуль яшчэ слабых паўстанцкіх сіл. Стаўка робіцца на масавае народнае паўстанне, на ўцягненне ў паўстанцкія рады сялян. Пункт 10-ы інструкцыі патрабаваў: «Паўстанцкую прапаганду ўзняць на самы высокі ўзровень, накіроўваючы яе асабліва на вясковых жыхароў і сялян, аднак ні ў якім выпадку не адштурхоўваць іх і не раздражняць гвалтам і дрэнным абыходжаннем». Наступны пункт указваў на неабходнасць правядзення на рэвалюцыйнай аснове аграрнай рэформы. Гэта адна з галоўных задач паўстання: «Надзяленне ж сялян зямлёй ва ўласнасць праводзіць у афіцыйнае выкананне ў кожнай воласці, дзе будзе толькі сіла для падтрымкі распараджэнняў». Цікава, што, нягледзячы на складаныя ўзаемаадносіны з Варшавай, Каліноўскі прызнаваў неабходнасць агульнага кіраўніцтва паўстаннем і глядзеў на паўстанне ў Беларусі і Літве толькі як на адзін з участкаў шырокага фронту барацьбы з царызмам. Аб гэтым недвухсэн-

[104] АР ДПБ [АР РНБ]. Фонд 629. Спр. 123. Арк. 1–2.

сава сведчыць 15-ы пункт інструкцыі: «Паколькі неўзабаве ЦНК (Цэнтральны нацыянальны камітэт у Варшаве. — *Г. К.*) прызначыць для паўстання аднаго правадыра, які возьме на сябе агульнае кіраўніцтва і ўпарадкуе папярэдні рух, да гэтага часу камандзіры атрадаў, што ўжо існуюць, таксама і начальнікі сіл, якія маюць сфарміравацца, абавязаны ўсімі сродкамі старацца трымацца як мага даўжэй і ўзмацняцца як мага больш людзьмі, зброяй і ўсялякімі запасамі».

Але найбольшую вартасць для разумення поглядаў Каліноўскага на паўстанне, на далейшы ход барацьбы мае «Паўстанцкая інструкцыя», што захоўваецца ў архіве Ратча[105]. Яна таксама адносіцца да пачатку паўстання, напісана ад рукі і змацавана пячаткай Правінцыяльнага камітэта. Гэты дакумент — інструкцыя камандзірам паўстанцкіх атрадаў — уваскрашае перад намі гераічныя часы 1863 года. Трэба было моцна верыць у справядлівасць сваёй справы, каб напісаць, напрыклад, такія мужныя, на першы погляд нават жорсткія радкі: «Кожны камандзір асобнага паўстанцкага атрада, пакуль не звяжацца з ваенным начальнікам ваяводства, з'яўляецца неабмежаваным валадарам ваколіцы, якую ён займае, панам жыцця і смерці ўсіх сваіх падначаленых». Зноў і зноў нагадвае інструкцыя аб асаблівасцях тактыкі партызанскай барацьбы. Унікаючы сутыкненняў з буйнымі сіламі царскіх войск, камандзір атрада павінен «аднак пастаянна гартаваць сваіх падначаленых бесперапыннымі нападамі на меншыя непрыяцельскія атрады, рассыпаныя па краі, і абязбройваць іх». Аднак не гэтым перш за ўсё звяртае на сябе ўвагу «Паўстанцкая інструкцыя». У ёй, як ні ў якім іншым

[105] АР ДПБ [АР РНБ]. Фонд 629. Спр. 125.

афіцыйным паўстанцкім дакуменце, праявіліся рэвалюцыйна-дэмакратычныя тэндэнцыі паўстання — тэндэнцыі, найбольш яскравым выразнікам якіх быў Каліноўскі. Восем абавязкаў ускладае інструкцыя на камандзіра паўстанцаў. І адзін з іх: «У месцах, што заняты ці зноў займаюцца паўстанцамі, абнародаваць і неадкладна прывесці ў выкананне дэкрэт Часовага ўрада аб надзяленні сялян зямлёй ва ўласнасць». Як бачым, патрабаванне аграрнай рэформы гучыць тут яшчэ больш рашуча, чым у папярэдняй інструкцыі. А вось апошні па парадку, але далёка не апошні па сацыяльнай важнасці абавязак: «**Найбольш злосных прыгнятальнікаў сялян для прыкладу, у прысутнасці сабраных валасцей, учыніўшы ваенны суд, караць смерцю, не дапускаючы самавольнай экзекуцыі**». Падкрэслім, што, паводле інструкцыі, такія акты класавай адплаты прыгнятальнікам — не права, а абавязак паўстанцкіх камандзіраў. Так уяўляў сабе паўстанне Каліноўскі: рэвалюцыйны ўсенародны суд над памешчыкамі, на шыбеніцу найбольш жорсткіх прыгнятальнікаў народа! Вось аб такім паўстанні марылі і сяляне. Калі б паўстанцы пайшлі па гэтым шляху, у іх рады ўліліся б тысячы сялян, упэўненых, што справа паўстання — гэта іх справа.

«Паўстанцкая інструкцыя» — каштоўнейшы дакумент па гісторыі паўстання 1863 года. Як не хапала гэтага дакумента гісторыкам у іх працы па асэнсаванні тых складаных падзей! Гэта сапраўдная «зніклая грамата», якая нарэшце — праз 100 гадоў — знойдзена і, спадзяёмся, зойме сваё належнае месца ў хрэстаматыях па гісторыі Беларусі і Літвы. Цікава, што цяпер вядомы ўжо не адзін экзэмпляр «Паўстанцкай інструкцыі». Сярод папер Ратча захоўваюцца два экзэмпляры гэтага дакумента, адначасова ў Вільнюскім

гістарычным архіве супрацоўнік гэтага архіва У. Б. Бікуліч знайшоў яшчэ тры экзэмпляры інструкцыі. Вядомы таксама блізкі па змесце загад Л. Звяждоўскага — кіраўніка паўстання на Магілёўшчыне. Відаць, дакумент меў значнае распаўсюджанне.

У архіве Ратча акрамя рукапісных экзэмпляраў «Паўстанцкай інструкцыі» захоўваецца яшчэ друкаваны яе экзэмпляр з пячаткай начальніка Ковенскага ваяводства. Вельмі характэрна, што апошні пункт — пра расправу над памешчыкамі — у гэтым экзэмпляры адсутнічае. Гэта сведчыць аб напружанай барацьбе, якая ішла вакол 8-га пункта нават унутры арганізацыі «чырвоных». І не дзіўна: пытанне ж было аб шляхах, аб напрамку развіцця паўстання, аб яго характары, а ў арганізацыі «чырвоных» далёка не ўсе падзялялі «крайнія» погляды Каліноўскага. Але асабліва непакоіў 8-ы пункт інструкцыі, як і ўся дзейнасць Каліноўскага, памешчыкаў з «белай» партыі. У іх ліку былі ж і «злосныя прыгнятальнікі сялян», якіх зусім не вабіла перспектыва загайдацца на шыбеніцы на вачах у сваіх былых прыгонных нявольнікаў. Барацьба «белых» з Каліноўскім — гэта класавая барацьба. Яны ўвайшлі ў змову з Дзюлеранам і не шкадавалі сіл і сродкаў, каб ачарніць Каліноўскага перад варшаўскімі «чырвонымі», сярод якіх у той момант было мала такіх, хто б адважыўся паставіць свой подпіс пад інструкцыяй аб расправе над памешчыкамі.

З Варшавы прыйшоў загад — распусціць Літоўскі камітэт і перадаць усю ўладу зноў створанаму «Аддзелу кіраўніцтва правінцыямі Літвы» пад старшынствам Гейштара. Рэвалюцыйную ўладу — у рукі памешчыкаў! Замест «Урада Літвы і Беларусі» — сціплы, непераборлівы, гатовы да паслуг

«Аддзел» Варшаўскага нацыянальнага ўрада! Камітэту было аб'яўлена, што, у выпадку непакорнасці, імёны яго членаў будуць абвешчаны ў друку, г. зн. выдадзены царскім уладам.

Гэта былі, бадай, самыя цяжкія дні ў жыцці Каліноўскага. Было нясцерпнае жаданне — кінуць усё, уцякаць куды вочы глядзяць ад гэтых «рэвалюцыянераў» з іх езуіцкімі замашкамі, ад дзябёлых памешчыкаў, якія яшчэ ўчора давалі аплявухі сваім дваровым, а сёння гаспадараць у рэвалюцыйнай арганізацыі. Але цвярозы розум падказваў, што гэтае жаданне прадыктавана пакрыўджаным самалюбствам, што гэта — адыход ад барацьбы. Быў намер — не падпарадкоўвацца загаду, не прызнаваць «Аддзел». Але ці хопіць сіл, каб адначасова весці барацьбу і з царскімі ўладамі, і з даволі магутнай арганізацыяй «белых», якая да таго ж у курсе многіх спраў Каліноўскага? Ды і ці пойдзе за ім уся арганізацыя «чырвоных»? Невялікая розніца, якая існавала перад паўстаннем паміж левымі «белымі» і правымі «чырвонымі», цяпер, пасля далучэння «белых» да паўстання, знікла. Многія з яго ворагаў жадалі б, каб ён пайшоў па адным з гэтых двух шляхоў. Але ён пойдзе па трэцім: ён будзе працаваць у агульнай, цяпер ужо «чырвона-белай», арганізацыі, але працаваць, зразумела, не для памешчыкаў, а для народа. Саюз з правымі «чырвонымі» быў непазбежны, значыць, непазбежны быў хоць часовы, хоць вонкавы, гатовы ў кожную хвіліну выліцца ў яшчэ больш вострую барацьбу, кампраміс з «белымі», калі яны далучыліся да паўстання.

Пратэст, які Каліноўскі напісаў у адрас Нацыянальнага ўрада, азначаў ужо заканчэнне цяжкага крызісу: «Правінцыяльны камітэт уступае і падпарадкоўваецца галаве паўстання таму, па-першае, што не жадае пачынаць згубных

для рэвалюцыі разладаў і нязгод, і, па-другое, таму, што не адчувае сябе дастаткова моцным, каб вырваць кіраўніцтва справамі з рук сваіх працаўнікаў. Аднак жа члены камітэта лічаць абавязкам сваім аб'явіць разам з тым, што яны лічаць **пагібеллю і здрадай** рэвалюцыі перадачу кіраўніцтва ў рукі контррэвалюцыянераў — заўсёдашніх ворагаў і рэвалюцыйнага руху наогул, і асноў маніфеста ад 22 студзеня ў асаблівасці, што яны пратэстуюць супраць такога рашэння Цэнтральнага камітэта, здымаюць з сябе ўсякую адказнасць перад будучыняй за ўсе памылкі і за ўсе страты і няшчасці, якія прынясе процілеглае духу і тэндэнцыям паўстання кіраўніцтва літоўскай справай»[106]. Як бачым, суровыя абставіны прымусілі Каліноўскага пацiснуць руку Гейштару. Выпешчаныя пальцы памешчыка схаваліся ў шырокай далоні мужыцкага змагара. Але ў гэтым поціску не было цеплыні. Апошні раз узнялася, прыкрываючыся дэмакратычнымі лозунгамі, памешчыцкая Польшча. Апошні раз ішла нейкі час побач з ёю сялянская Беларусь.

Некаторы час Каліноўскі працаваў у Вільні, але яго душа рвалася на прасторы роднай зямлі, дзе пачыналася вясна, дзе ўступалі ў бой яго «дзецюкі». У сакавіку 1863 года з мандатам рэвалюцыйнага камісара Гродзенскага ваяводства Каліноўскі накіраваўся ў знаёмыя з дзяцінства месцы. На вакзале і ў гродзенскім цягніку шнырылі жандары. Але Каліноўскі, хоць яго ўжо даўно шукала паліцыя, быў спакойны: бездакорна падроблены пашпарт на імя Чарноцкага надзейна ахоўваў яго. Прыжмурыўшы вочы, ён думаў пра толькі

[106] Партархіў ЦК КПБ (цяпер у складзе Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, у далейшым — НА РБ. — *Рэд.*). Фонд 4384. Вопіс 1. Спр. 7. Арк. 29 адв.

што перажытае. Тут, магчыма, і прыйшлі да яго гэтыя радкі: «Дзецюкі! Доўга маўчаў я, не казаў вам нічога, бо хацеў разглядзецца добра ды разабраць, што гэта дзеецца на свеце, штоб ужо спавясціць вас па справядлівасці ды сказаць, як наказуе Бог ды сумленне, што нам цяпер трэба рабіці...» Так нарадзіўся сёмы, апошні, нумар «Мужыцкай праўды».

У той год была ранняя вясна. Зрабіліся шырэйшымі далягляды над Дзвіной і Прыпяццю, успыхнулі ліловымі факеламі бярозы ў прынёманскіх гаях, зноў замітусіліся ля сваіх гнёздаў даўганогія буслы, заспявалі ў радасным небе жаваранкі: «Ары — барануй! Ары — барануй!» Але не ўсе палі дачакаліся ў той год сваіх аратых. Прымацаваўшы косы да коссяў, перакаваўшы лемяхі на наканечнікі пік, літоўскія і беларускія сяляне і шляхціцы-земляробы падаваліся ў паўстанцкія атрады. У шэрагі паўстанцаў станавіліся студэнты і гарадскія рамеснікі, перадавыя афіцэры і майстравыя першых фабрык.

Серакоўскі, які прыбыў з Пецярбурга, згуртаваў пад сваімі сцягамі звыш дзвюх тысяч паўстанцаў. Поплеч з ім змагаўся выдатны літоўскі рэвалюцыянер Антанас Мацкявічус. Л. Звяждоўскі, пакінуўшы службу ў Маскве, арганізаваў паўстанне на Магілёўшчыне і смелым налётам захапіў павятовы горад Горы-Горкі на самай мяжы Смаленскай губерні. У Мінскай губерні ўзначаліў паўстанцкі атрад Антон Трусаў, у далейшым выдатны дзеяч Рускай секцыі І Інтэрнацыянала. Узяліся за зброю будучыя беларускія пісьменнікі Францішак Багушэвіч і Альгерд Абуховіч. У паўстанцкіх атрадах разам з палякамі, беларусамі і літоўцамі біліся перадавыя рускія людзі, для якіх паўстанне было кроўнай справай. Польская зямля прыняла ў свае нетры землявольца Андрэя Пацебню, які загінуў у баі з царскімі войскамі. Можна назваць мно-

ства выпадкаў пераходу на бок паўстанцаў рускіх салдат. У палітычным аддзяленні канцылярыі віленскага генерал-губернатара захоўваліся адзін час «паперы забітага ў шайцы салдата і ордэны: Георгіеўскі крыж пад № 10842-м, медалі: „За ўціхаміранне Венгрыі і Трансільваніі ў 1849 годзе", „За абарону Севастопаля ў 1855 годзе" і бронзавая ў памяць вайны 1853–1856 гадоў». Ад душыцеля рэвалюцыйнага руху, праз горыч і доблесць Севастопаля ў шэрагі паўстанцаў 1863 года — які гэта доўгі, пакутны і ў той жа час знамянальны шлях для невядомага рускага салдата, можа быць, брата ці сына сялян, забітых у Бездне!

Дзякуючы таму што ў паўстанні ўдзельнічалі рэвалюцыйныя дэмакраты, у Літве і Заходняй Беларусі яно набыло характар шырокай народнай вайны супраць царызму і прыгонніцтва. Але гэта не было сялянскае паўстанне супраць памешчыкаў, як намагаюцца даказаць некаторыя гісторыкі. Нельга закрываць вочы на цяжкасці, якія стаялі перад Каліноўскім і яго аднадумцамі, і лічыць, што ў ходзе паўстання ім удалося ў поўнай меры здзейсніць сваю праграму, якая патрабавала поўнага скасавання памешчыцкага землеўладання. Слушным здаецца меркаванне С. Лазуткі, што «сялянскае крыло ў паўстанні 1863–1864 гадоў у Літве ў сваіх патрабаваннях па аграрнаму пытанню прыняло праграму студзеньскага варшаўскага маніфеста „чырвоных"»[107]. Разам з тым, рэвалюцыйныя дэмакраты і іхні правадыр Каліноўскі не адмовіліся ад барацьбы за больш радыкальнае вырашэнне зямельнага пытання.

---

[107] Лазутка С. Национально-освободительное движение в Литве // Коммунист. 1957. № 12.

Калі Каліноўскі ад'язджаў у Гродзенскую губерню, старшыня «Аддзела» строга наказаў яму, «каб нідзе ні ў якім выпадку не быў выкліканы антаганізм паміж саслоўямі»[108]. Аднак той жа Гейштар вымушаны прызнаць, што «Каліноўскі да канца застаўся крайнім і, нягледзячы на ўсю сілу свайго патрыятызму (якраз дзякуючы свайму вялікаму патрыятызму — скажам мы. — *Г. К.*), не здолеў узняцца да беспартыйнасці» (т. 1, с. 236). Яго абавязкам як палітычнага камісара было назіранне за дзейнасцю рэвалюцыйнай арганізацыі і дзеяннямі паўстанцкіх атрадаў. Але ён пераступіў рамкі сваіх абавязкаў. Па сутнасці, рэвалюцыйная арганізацыя ў губерні была створана ім нанава, і крыніцы ў адзін голас сведчаць, што тут яна была найбольш моцнай. Адным з кіраўнікоў паўстанцкага руху ў Гродзенскай губерні стаў В. Урублеўскі. Разам з Урублеўскім Каліноўскі разгарнуў шырокую агітацыйную работу сярод беларускіх сялян. Клопат аб сялянскіх інтарэсах і разам з тым аб пашырэнні сацыяльнай базы паўстання чырвонай ніццю праходзіць праз усе дакументы, якія выйшлі з-пад пяра Каліноўскага ў гэты перыяд. Вось яго інструкцыя для павятовых камісараў, апублікаваная ўпершыню В. Кардовічам:

«...17) павятовы камісар павінен самым строгім чынам сачыць, каб пры праходзе атрада праз кожную воласць абвешчаны быў дэкрэт Нацыянальнага ўрада аб надзяленні зямлёй сялян;

18) гэты дэкрэт павінен быць абвешчаны і акт надзялення напісаны ў трох раўназначных экзэмплярах, адзін з якіх застаецца ва ўладанні сялян, другі — для начальніка паве-

---

[108] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 2. S. 50.

та і трэці мае быць адасланым ваяводскаму камісару (г. зн. Каліноўскаму. — *Г. К.*).

...3) звяртаць пільную ўвагу, каб вёскі, надзеленыя ўжо зямлёй, пасля адыходу атрада не вярталіся да сістэмы ўрада захопнікаў;

...11) старацца паставіць на пасады арганізацыі сялян...»[109]

У красавіку ўся Гродзеншчына была ахоплена полымем народнага паўстання. І ў цэнтры гэтага паўстання мы бачым постаць вялікага беларускага рэвалюцыянера. Штодзённа рызыкуючы трапіць у рукі карнікаў, ён смела, амаль пад носам лятучых атрадаў царскіх войск, якія шнырылі навокал, раз'язджаў па губерні, наведваў паўстанцкія атрады, наладжваў забеспячэнне іх зброяй і харчаваннем, віншаваў смелых, падбадзёрваў слабых, ён быў жаданым госцем ля паўстанцкіх вогнішчаў у нетрах пушчы.

Захавалася некалькі апісанняў, як Каліноўскі наведваў паўстанцкія атрады. Але ўсе яны кароткія, глухія. Нам удалося натрапіць на цудоўнае па сваёй падрабязнасці і маляўнічасці апісанне прыезду Каліноўскага ў лагер паўстанцаў. Мы маем на ўвазе ўспаміны Аляксандра Юліяна Ягміна, знойдзеныя ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве[110]. Аўтар мемуараў быў сакратаром пры штабе атрада Брэсцкага павета, які пад камандай Стасюкевіча фарміраваўся за Бугам. Зразумела,

---

[109] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 917б. Арк. 117–118.

[110] Успаміны гэтыя былі ў свой час надрукаваны (Ягмин А. Воспоминания польского повстанца 1863 г. // Исторический вестник. 1892. Т. 49–50), але ў апублікаваным варыянце апісанне прыезду Каліноўскага ў паўстанцкі атрад адсутнічае.

што яму добра быў вядомы асабовы склад атрада. У сувязі з гэтым мае цікавасць яго паведамленне аб тым, што доктарам у атрадзе быў стрыечны брат Кастуся Каліноўскага[111]. У другім месцы ўспамінаў чытаем: «Два браты яго былі ў нас у партыі: адзін, старэйшы, доктарам, а другі — унтэрафіцэрам»[112]. Аднак хутка Ю. Ягміну давялося пазнаёміцца і з самім Каліноўскім. Гэта было прыкладна ў маі, калі атрад Стасюкевіча размясціўся лагерам у Ракітнянскіх лясах, паблізу м. Янава ў Падляшшы. Але дамо слова аўтару ўспамінаў: «Размясціўшыся каля дома ляснічага, Стасюкевіч атрымаў паперу ад брэсцкага павятовага рыхтаваць сваю партыю да агляду нейкай важнай у жондзе асобы, якая павінна прыехаць днямі да нас. Адразу ж у нас пачалася беганіна, мітусня, чыстка і рамонт амуніцыі, прыналяглі на фрунтавое абучэнне, нават мне было загадана навесці лад у сваіх паперах. Нарэшце чаканы наведвальнік прыехаў. Да прызначанага часу яго прыезду ўся партыя была выстраена разгорнутым фронтам: на правым флангу кавалерыя, потым стралкі і на левым — касінеры. За сярэдзінаю атрада быў выстраены абоз партыі. Акурат у прызначаны час пад'ехала брычка, і ў ёй нейкі пан у чорнай круглай барашкавай шапцы і партыкуляр-

---

[111] ДГМ. Фонд 282. Спр. 536. Арк. 56. Напэўна, гэта Іван Юр'евіч Каліноўскі, які скончыў Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію і вясной 1863 года атрымаў прызначэнне на пасаду палкавога лекара ў 19-ы конны полк Кубанскага казацкага войска. 9 мая ён выехаў з Пецярбурга, але не ў Стаўрапаль, як трэба было, а ў Вільню. Гл.: Дело о разыскиваемом Медицинским департаментом лекаре Калиновском (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1863. Спр. 943). У бацькі Кастуся Каліноўскага быў брат Юрый. Мяркуючы па справе, І. Каліноўскі быў звязаны з Брэсцкім паветам. Адшукаць яго ўладам не ўдалося.

[112] ДГМ. Фонд 282. Спр. 536. Арк. 64.

ным[113] паліто; пад'ехаўшы да фронту, невядомая асоба зняла з сябе паліто і з'явілася ў шэрай чамарцы[114], шытай чорнымі шнурамі, у вялікіх ботах, з рэвальверам і кінжалам за поясам. Ён быў росту вышэй за сярэдні, шыракаплечы, сутулаваты, буйныя мясістыя рысы твару з акладзістай маленькай рэдкай бародкай мелі штосьці... дзёрзкае. Калі невядомы пачаў падыходзіць да правага фланга, Стасюкевіч скамандаваў: „Прэзентуй бронь!"[115] — і, аддаючы чэсць невядомаму, памчаўся яму рапартаваць. Невядомы важна выслухаў рапарт, паздароўкаўся з партыяй, крыкнуўшы ёй: „Шануе абронцаў айчызны!" Уся партыя гаркнула: „Нех жые Польска!" Затым невядомы абышоў няспешна па фронце ўвесь атрад, спыняючыся перад кожным афіцэрам і пытаючыся ў яго прозвішча і якога павета, потым прапусціў усіх паўз сябе цырыманіяльным маршам. Кожную часць, што праходзіла каля яго, падбадзёрваў выгукамі накшталт: „Добжэ, косінежэ!!" або „Дзенькуе, стшэльцы!!" Прапускаючы паўз сябе наш абоз, невядомы зрабіў заўвагу, што ён крыху вялікі для нашай малой партыі. Потым, загадаўшы распусціць людзей... сам са Стасюкевічам накіраваўся ў хату лесніка, якога звычайна ў час нашага прыходу не было дома». Цікава, што ніхто ў атрадзе, апроч яго братоў, не ведаў сапраўднага імя Каліноўскага. Найстражэйшая канспірацыя, характэрная для яго, дазволіла яму на працягу трох гадоў, з моманту вяртання з Пецярбурга на радзіму, весці напружаную нелегальную работу (у тым ліку цэлы год ва ўмовах паўстання). «Гэта таямнічая асоба, — працягвае Ягмін, — дужа зацікавіла мяне, і я стараўся выведаць

---

[113] Цывільным.

[114] Чамарка — верхняя вопратка.

[115] «На каравул!»

яго прозвішча ад Каліноўскіх, з якімі ён доўга і фамільярна сам-насам гутарыў. Хоць яны мне і назвалі нейкае прозвішча накшталт Хамовіча, але я чамусьці ім не паверыў, і так на той час гэты пан, да якога Стасюкевіч адносіўся з асаблівай пашанай, застаўся для мяне загадкай. Пасля ўдалага агляду і ад'езду невядомага саноўніка „Жонда нарадовага" Стасюкевіч паведаміў мне, што гэта быў гродзенскі камісар, які аб'язджаў партыі Гродзенскага ваяводства; ён між іншым паведаміў Стасюкевічу, што дні тры таму на Брэсцка-Бабруйскай шашы аб'яднаныя партыі паўстанцаў разбілі рускі атрад каля паселішча Мілавіды. Нарэшце значна пазней я даведаўся, што гэты незнаёмы быў Кастусь Вікенцій Каліноўскі, які стаў пазней дыктатарам Літвы і Белай Русі»[116].

Слава Каліноўскага грымела далёка за межамі Гродзеншчыны. «Чырвоныя» ставілі яго ў прыклад, ім ганарыліся, яго імя старанна ахоўвалі ад ворагаў. У лісце без подпісу з Вільні да камандзіра аднаго з паўстанцкіх атрадаў на Віленшчыне Фелікса Віславуха (гэты каштоўны дакумент, ад якога літаральна павявае гераізмам тых славутых і вельмі складаных падзей, знайшоў старшы навуковы супрацоўнік ЦДГА Літоўскай ССР У. Б. Бікуліч) чытаем, напрыклад: «... адзін з нашых (Хамут[117] — пакінь гэта для сябе), камісар таго ваяводства, цудоўна арганізаваўшы цывільную адміністрацыю, забяспечыў атрадам лепшую сувязь і дастаўку харчавання»[118].

Царскі ўрад кінуў на задушэнне паўстання ў Беларусі і Літве некалькі дывізій, у тым ліку адборныя гвардзейскія часці.

---

[116] ДГМ. Фонд 282. Спр. 536. Арк. 64.

[117] Такі псеўданім Каліноўскага мы сустракаем упершыню, але гэта, відавочна, адна з версій яго звычайнага псеўданіма «Хамовіч».

[118] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1228. Вопіс 1. Спр. 241. Арк. 23.

У маі 1863 года ў Вільню з надзвычайнымі паўнамоцтвамі прыбыў заўзяты прыгоннік генерал Мураўёў, які «вызначыўся» ўжо пры задушэнні паўстання 1831 года і яшчэ тады быў празваны Мураўёвым-вешальнікам. Раніцаю жыхароў Вільні будзіў барабан, склікаючы іх на чарговае пакаранне смерцю. Такое відовішча было не для слабых нерваў ліберальных памешчыкаў з партыі «белых». Зразумеўшы, што заблыталіся, яны замітусіліся і сталі паспешліва пакідаць пасады ў паўстанцкай арганізацыі. Шэраг членаў «белага» «Аддзела, кіруючага правінцыямі Літвы» (да гэтага часу ён быў ператвораны ў «Выканаўчы аддзел на Літве», яшчэ больш залежны ад Варшавы) быў арыштаваны. Агонію арганізацыі «белых» улады прынялі за агонію ўсёй рэвалюцыйнай арганізацыі. «Паводле майго меркавання, у Вільні галоўных распарадчыкаў ужо няма, яны ўсе са страху разбегліся»[119], — з выхваляннем паведамляў у Пецярбург віленскі губернскі жандарскі штаб-афіцэр палкоўнік Лосеў 14 жніўня 1863 года. Тады ён яшчэ не ведаў, што ўжо два месяцы таму ў Вільню прыбыў Каліноўскі і з уласцівай яму энергіяй, ва ўмовах агульнага разброду, узяўся за стварэнне новага цэнтра па кіраўніцтве паўстаннем у Беларусі і Літве.

9

Прыезд Каліноўскага ў Вільню азначаў новы паварот у літоўска-беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Адважны рэвалюцыянер знайшоў новых людзей, якія не палохаліся рэпрэсій царскіх улад. Яго паплечнікамі ў гэты прыезд сталі

[119] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1863 г. Спр. 23. Ч. 13. Арк. 145.

выдатныя рэвалюцыянеры: інжынер шляхоў зносін Уладзіслаў Малахоўскі, кандыдат Пецярбургскага універсітэта Ігнат Здановіч, маскоўскі студэнт Цітус Далеўскі.

З гэтымі людзьмі мы сустрэнемся ў нарысе пра гімназічныя і студэнцкія гады Ф. Багушэвіча. Каліноўскі, паводле ўласных паказанняў, ведаў Малахоўскага яшчэ па Пецярбургу[120]. Яны былі амаль землякамі — Малахоўскі паходзіў з суседняга Кобрынскага павета і нават вучыўся ў той жа Свіслачы, што і Каліноўскі, але значна раней: ён быў гадоў на восем старэйшы за свайго сябра. Пасля заканчэння Інстытута інжынераў шляхоў зносін у Пецярбургу Малахоўскі атрымаў прызначэнне ў Вільню на будаўніцтва Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі[121]. Гэта быў чалавек незвычайнай адвагі. Расказваюць, што аднойчы ён выцягнуў рэвальвер у жандара, які стаяў на варце. Некаторыя даследчыкі звязваюць яго імя з т. зв. «лясными людзьмі» — агітатарамі, якія з'явіліся ў лясах Заходняй Беларусі ў час сялянскіх хваляванняў пасля 19 лютага 1861 года. Вось такія рэвалюцыянеры, як Малахоўскі, і дапамаглі Каліноўскаму ў цяжкі для паўстання час. Паводле слоў Ратча, «ён выбраў у члены (новага кіраўніцтва паўстаннем. — Г. К.) сваіх крэатур, якія былі ад яго ў поўнай духоўнай залежнасці» (с. 230).

Зразумела, і цяпер нельга было гаварыць пра перамогу сялянскай дэмакратыі, але справу паўстання ўзначалілі лепшыя з рэвалюцыянераў, якія мелі ўжо за плячыма вопыт папярэдняй барацьбы. На іх вачах «белыя» выявілі сваю контр-

---

[120] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 280. Арк. 20 адв.

[121] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 1. S. 356.

рэвалюцыйную сутнасць, паказалі на практыцы, што яны з'яўляюцца толькі тормазам у барацьбе.

Тое, што з самага пачатку было ясна для сялянскага дэмакрата Каліноўскага, зразумелі цяпер і многія шляхецкія рэвалюцыянеры.

Адлюстраваннем гэтага перавароту ў свядомасці і з'яўляецца пісьмо ад 16 (28) чэрвеня ў атрад Віславуха, аб якім мы згадвалі вышэй. Мяркуючы па ўсім, яго аўтарам быў У. Малахоўскі. «У нас, у Літве, — чытаем у лісце, — толькі цяпер справа даходзіць да цывільнай арганізацыі, бо дагэтуль адміністрацыя ў правінцыях амаль не дзейнічала з прычыны подласці і баязлівасці дваранства, якое рвецца да пасад без адчування патрэбы працаваць, без разумення сваіх сіл і абавязкаў. Цяпер малады элемент бярэ дваранства ў ціскі, праз два-тры тыдні адразу ж адчуеце гэтую розніцу, адчуеце, што за вамі стаіць народ, які любіць вас, як сваіх дзяцей, народ, які матчынай рукой ахоўвае вас... Мы ўступаем на той шлях, на які з даўніх часоў паказвалі дваранству: на шлях шалёнай энергіі, на шлях такога тэрарызму, які не толькі ў корані знішчае подласць, але і без хістанняў і жалю забівае пасіўнасць, чвартуе слабасць і непаваротлівасць.

Дваранства ўнікае працы ў вёсцы, уцякае ад вас, бо баіцца мураўёўскіх шыбеніц і яго секвестраў, дык паставім жа яго так, каб яму прыйшлося выбіраць паміж нашай пятлёй і пучком смалістай лучыны — і царскай карай. Калі тысячы галодных, аслабелых і раздзетых льюць высакароднейшую кроў у бітвах, ты, жывы дваранін, як ты можаш заставацца абыякавым гледачом гэтых шалёных сутычак, толькі для таго, каб выратаваць пасля маёнтак, нажыты працай сялян?! Калі мы вешаем сялян за тое, што яны... несвядомыя, бо даносяць і шпіёняць

на ўласную пагібель, не разумеючы свайго становішча і мэты барацьбы, дык якія пакуты і кары павінны мы рыхтаваць для віноўнікаў сялянскай горкай долі, віноўнікаў столькіх ахвяр, нашых паражэнняў і пакут — для дваранства, якое следам за вамі шле ганцоў да Масквы, зачыняецца ў гарадах, прадаючы спачатку свае запасы са свірнаў і г. д.?! Вам, якія валодаюць сілай, стаяць сярод народа, што шчыра вам спачувае, нельга — пад страхам не зразумець важнасці цяперашняга моманту і ўплыву на народныя паняцці — скардзіцца на подласць дваранства. Няхай хоць адзін ці двое нягодных паноў заматляюцца гладкімі цельцамі на сухіх галінах, няхай хаця б адзін прыгнятальнік сялян захрыпіць на шыбеніцы перад ранейшымі сваімі неграмі за данос, за невыкананне загаду ці абавязку, за незабыўныя і непапраўныя крыўды, прычыненыя народу ці вам, а таму і агульнай справе — і народ вас зразумее, народ не назаве вас «панічамі», бачачы ў вас натхнёны трыбунал свабоды, аб якой ён марыў з калыскі, абаронцаў агульнай волі, ён абкружыць вас даверам і верай... У сваёй краіне вы не павінны атрымоўваць адказу — «не даюць». Ад вашага поспеху залежыць лёс краіны — як можаце вы цярпець нягоды і нястачы, баючыся абразіць нервы дваранкі грубым голасам загаду ці парушыць спакой дваранна, які смярдзіць у паскудным гультайстве, нібы слімак»[122].

Першы дакумент, які выдаў Каліноўскі пасля прыезду ў Вільню, гэта, відавочна, вядомы «Прыказ ад Ронда польскага над цэлым краем літоўскім і беларускім да народа зямлі літоўскай і беларускай», напісаны на беларускай мове.

---

[122] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1228. Вопіс 1. Спр. 241. Арк. 25.

Дакумент датаваны днём Св. Варфаламея. Даследчыкі мелі на ўвазе каталіцкі каляндар і датавалі «Прыказ» 24 жніўня 1863 года. У рэцэнзіі на кнігі А. Смірнова пра Каліноўскага[123] нам удалося даказаць, што дакумент распаўсюджваўся ўжо ў ліпені і павінен, відавочна, датавацца па праваслаўных святцах — 11 чэрвеня 1863 года. У гэты перыяд галоўным кіраўніком арганізацыі ў Вільні быў яшчэ, хоць, можа, і намінальна, Гейштар (ён арыштаваны, праўдзівей, сам аддаў сябе ў рукі ўлады 31 ліпеня). Гэта адбілася ў пэўнай меры на змесце «Прыказа», хоць увогуле ён вельмі пераклікаецца са зместам цытаванага вышэй ліста да Віславуха. У энергічных словах «Прыказ» выкрываў сацыяльную дэмагогію царскіх улад, якія намагаліся пераканаць сялян, што паўстанне — гэта справа панскіх рук: «Дурыць вас маскаль, талкуючы вам, што гэта паны падняліся, каб павярнуць назад паншчыну, — ён хоча воду скаламуціць, каб у вадзе мутнай рыбу лавіць. Но дзела наша — не дзела панскае, а справядлівай вольнасці, якой вашыя дзеды ды бацькі здаўна ждалі...

Но мінула ўжо паншчына, мінула ваша крыўда... Цяперто настаў час, што кожнаму будзе адмерана так, як ён сам сабе намерыць. Пан будзе ліхі — пана павесім, як сабаку! Мужык будзе кепскі — то і мужыка павесім, а дворы (панскія сядзібы. — *Г. К.*) іх і сёлы з дымам пойдуць, і будзе справядлівая вольнасць...

Гэты Прыказ мае быць чытаны ў кожнай царкве ды ў кожным касцёле, па ўсіх сёлах і дворах для ведама ўсяго народа. А хто гэтаму Прыказу спрэчан будзе, таго — ці ён поп,

---

[123] ЛіМ. 1959. 18 лістап. (№ 91 (1417)). У рэцэнзіі друкарская памылка: замест «11 чэрвеня» надрукавана «11 ліпеня».

ці ксёндз, ці мужык, ці пан — усякага данасіць да Ронда польскага, каб можна было пазней павесіць, або, сазваўшы грамаду і зрабіўшы справядлівы суд, без адгаворкі весці на шыбеніцу! Бо хто хоча крыўды людской — той няхай лепш сам марна прападае!»

У той час, калі друкаваўся гэты «Прыказ» і пісаўся ліст у атрад Віславуха, адзін з гравёраў па заданні Каліноўскага ўжо выразаў новую пячатку віленскай рэвалюцыйнай арганізацыі з адным толькі літоўска-беларускім гербам (на ранейшых пячатках гэты герб змяшчаўся побач з польскім арлом) і подпісам, які падкрэсліваў поўную самастойнасць арганізацыі: «Камітэт, кіруючы Літвой». Адбітак гэтай пячаткі Малахоўскі неўзабаве шпурнуў на стол перад Гейштарам. Гейштар падаў у адстаўку. Дзюлеран быў з ганьбаю выгнаны з Вільні[124].

У архіве Ратча поруч з іншымі цікавымі рэчамі захоўваецца невялікі сшытачак, спісаны дробным бісерным почыркам. Гэта своеасаблівая «споведзь» аднаго з членаў «Выканаўчага аддзела на Літве» Юзафа Каліноўскага, цёзкі па прозвішчы беларускага рэвалюцыянера[125]. Ваенны інжынер рускай службы, чалавек далёкі ад справы рэвалюцыі (ён скончыў жыццё манахам кармеліцкага кляштара), Юзаф Каліноўскі ў чэрвені 1863 года быў прысланы з Варшавы, каб заняць пасаду загадчыка ваеннага аддзялення ў Віленскім паўстанцкім «Аддзеле». Карысці з яго было мала, але для нас гэты чалавек цікавы тым, што ён на працягу больш як паўгода знаходзіўся побач з Кастусём Каліноўскім. Паводле слоў Ю. Каліноўскага,

---

[124] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 2. S. 63–64.
[125] АР ДПБ [АР РНБ]. Фонд 629. Спр. 281.

«Канстанцін Каліноўскі з тадышнім начальнікам горада Уладзіславам Малахоўскім зрабілі сапраўднае coup-d'état (дзяржаўны пераварот. — *Г. К.*) і адважыліся стварыць уласнае ўпраўленне» (арк. 8–9). Пасля перавароту, піша ён у другім месцы, Каліноўскі атрымаў «правы сапраўднага дыктатара Літвы. Тады назва Wydział («Выканаўчы аддзел на Літве». — *Г. К.*), хаця ўтрымалася, не адпавядала першапачатковай праграме і была анахранізмам» (арк. 3).

Цікавую характарыстыку Ю. Каліноўскі дае становішчу, якое склалася ў той час у Літве і Беларусі: «...я пераканаўся яшчэ ў тым, што апрача бяссілля ў краі існуе яшчэ нязгода і разлад у асяроддзі тых асоб, якія стаялі на чале руху. Два мясцовыя элементы: кансерватыўны і рэвалюцыйны — і трэці — варшаўскі псеўдаўрадавы — не маглі існаваць адзін побач з другім». «Партыя кансервацыі, — чытаем у сшытку, — гатова была тушыць пажар». «Элемент рэвалюцыйны, увасабленнем якога можна лічыць Канстанціна Каліноўскага... усё яшчэ думаў раздзімаць паўстанне і ўсё яшчэ не траціў надзеі на поспех сваёй літаратурнай прапаганды сярод сялянскага насельніцтва... Усе довады тых асоб, якія ведалі сродкі краіны, не маглі пераканаць тых людзей, што, як Канстанцін Каліноўскі, у грамадскім перавароце шукалі вырашэння сваёй задачы» (арк. 7). Як бачым, Ю. Каліноўскі, які пазнаёміўся са сваім славутым цёзкам у сярэдзіне 1863 года, характарызуе яго рэвалюцыйны напрамак амаль у тых жа словах, што і Е. Кучэўскі-Порай, якому давялося сутыкнуцца з беларускім рэвалюцыянерам напярэдадні паўстання. Змянілася шмат чаго: грымелі баі, кіраўніцтва паўстаннем захапілі «белыя» і зноў вымушаны былі аддаць уладу «чырвоным». Змяніўся і сам Каліноўскі: ён вырас у сталага правадыра. Засталіся

нязменнымі толькі яго светапогляд, яго арганічная патрэба глядзець на ўсе з'явы з пункту гледжання класавых інтарэсаў сялянства.

Гэты чалавек здзіўляў і прыцягваў увагу навакольных. Арыштаваны хутка пасля пакарання смерцю беларускага рэвалюцыянера, Ю. Каліноўскі ўсё яшчэ не можа вызваліцца ад абаяння яго магутнай асобы, спрабуе разабрацца ў ім, хаця агульным паміж імі было хіба толькі прозвішча. Таму сялянскі рэвалюцыянер, выдаўца «Мужыцкай праўды» паўставаў перад Ю. Каліноўскім у нейкім таямнічым арэоле: «... друкаванае слова было заўсёды яго слабасцю, ён прыпісваў яму нейкае асаблівае значэнне. Я ведаў яго адно настолькі, колькі ён адлюстраваўся ў вонкавай сваёй дзейнасці — велізарныя здольнасці пры велізарных слабасцях, унутраныя яго перакананні засталіся для мяне таямніцаю» (арк. 14). У сшытку робіцца спроба і больш разгорнутай характарыстыкі: «... цяжкасць і небяспека зносін з ім, жорсткасць (жесткость) яго характару не дазваляла мне скласці правільнае і пэўнае аб ім уяўленне: я бачыў у ім чалавека рашучага і энергічнага, які сваёй дзейнасцю і самаахвяраваннем справе як бы дакараў іншых у баязлівай асцярожнасці і слабасці. Сама небяспека яго становішча, надаючы яму як бы характар гераічнасці (богатырства), магла прыцягваць да яго іншых. Не вярніся ён у жніўні месяцы (павінна быць — у чэрвені. — *Г. К.*) у Вільню, тады ўсё было б скончана ў Літве. (Не вярніся Напалеон з Эльбы, не было б Ватэрлоо! — дадае Ю. Каліноўскі ў дужках.) Сваёй энергічнасцю і самаахвярнасцю ён узбуджаў іншых; гаворачы шчыра, я сам захапляўся гэтым бокам яго дзейнасці да таго часу, пакуль лічыў самаахвярнасць самай высокай доблесцю» (арк. 12 адв.).

Пасля перавароту Каліноўскі сканцэнтраваў у сваіх руках кіраўніцтва паўстаннем. Гейштар з незадавальненнем пісаў, што новы кіраўнік «абкружыў усе ваяводствы людзьмі сваімі, людзьмі чырвонымі» (т. 2, с. 126). У прыватнасці, Каліноўскі прызначыў кіраўніком паўстанцкіх сіл у Ковенскай губерні рэвалюцыйнага дэмакрата А. Мацкявічуса. На месцах адразу адчулі цвёрдую руку Каліноўскага. У ваяводствы была паслана новая інструкцыя для рэвалюцыйных камісараў, «цалкам процілеглая ранейшай інструкцыі»[126]. Камісары атрымалі ўказанне, «наколькі магчыма, імкнуцца падтрымліваць арганізацыю і замяшчаць арыштаваных членаў новымі»[127]. І, зразумела, перш за ўсё беларускі рэвалюцыянер патрабуе «меркавання ваяводскага ўпраўлення наконт сродкаў, якімі можна было б прыцягнуць сялян да мяцяжу»[128]. Адначасова Каліноўскі арганізаваў рэвалюцыйную «жандармерыю» і рэвалюцыйныя суды, якія каралі здраднікаў. Рэвалюцыйны трыбунал павінен быў стаць магутнай сілай у руках паўстанцаў. Было вырашана «падпарадкаваць яго прыгаворам і землеўласнікаў»[129]. Адзін з першых прыгавораў быў вынесены віленскаму губернскаму прадвадзіцелю дваранства Дамейку — ініцыятару падачы вернападданніцкіх адрасоў цару. У гэты ж час Каліноўскі зрабіў новую спробу звязацца з рускімі рэвалюцыянерамі праз У. Малахоўскага, які пасля

---

[126] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 439. Вопіс 91. Спр. 1. Ч. 1. Арк. 99 адв.

[127] Дело Виленской Особой следственной комиссии о лицах, прикосновенных к делу казненного преступника Константина Калиновского. Начато 29 января 1864 г. Кончено 16 апреля 1864 г. На 271 листе. (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 594. Арк. 20 адв.

[128] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 554. Арк. 14 адв.

[129] Ратч В. Сведения о польском мятеже... С. 233.

замаху на Дамейку быў вымушаны перабрацца ў Пецярбург. У адрас «Зямлі і волі» з Вільні быў пасланы нават друкарскі станок.

Але кола рэвалюцыянераў звужалася. Рэпрэсіі царскіх улад вырывалі аднаго паплечніка Каліноўскага за другім. У снежні ад рук катаў загінулі Цітус Далеўскі і Ігнат Здановіч. Імя Каліноўскага ўжо даўно было названа на допытах у следчых камісіях. Яго шукалі. Слабыя ўгаворвалі яго, «што пара, нарэшце, безумоўна пакарыцца ўраду і пакінуць дзейнасць, якую прадпісаў жонд (рэвалюцыйны ўрад. — *Г. К.*), і каб ён з месца свайго вызваліў ад пасад усіх асоб, якія знаходзяцца ў арганізацыі»[130]. Аднак Каліноўскі працягваў барацьбу і, умела хаваючыся пад чужымі прозвішчамі, жыў па суседстве з генерал-губернатарскім палацам. Паводле слоў Гейштара, ён прыходзіў нават на кожнае пакаранне смерцю да брамы Дамініканскага кляштара, каб правесці сваіх таварышаў у апошні шлях[131]. Ды Людвіга Радзевіч у сваіх мемуарных нататках аспрэчвае гэта, справядліва адзначаючы, што такая легкадумная гульня з небяспекай ішла ў разлад з поглядамі Каліноўскага.

Цікава, што крыніцазнаўчая база біяграфіі Каліноўскага мае не толькі свае здабыткі, але і страты. Беларускі гісторык А. Станкевіч трымаў у трыццатых гадах у сваіх руках копію ліста Каліноўскага да Б. Длускага, былога свайго паплечніка па Літоўскім камітэце. Арыгінал, паводле слоў Станкевіча, знаходзіўся ў вядомай польскай бібліятэцы імя Асалінскіх.

---

[130] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 594. Арк. 26 адв.

[131] Gieysztor J. Pamiętniki… T. 1. S. 237; t. 2. S. 120, 132.

Цяпер гэты каштоўны дакумент пакуль што невядомы[132], і нам застаецца прывесці тую вытрымку з яго, якую змясціў у сваёй кнізе Станкевіч: «Не турбуюся ні аб чым, — пісаў Каліноўскі, — то праз акно на дах, то іншымі спосабамі з іхніх рук (царскіх улад. — *Г. К.*) выслізгваю. Пакуль Бог ахоўвае, а калі прыйдзецца павіснуць, дык хай будзе на пацеху ўсім літоўскім панам і прасветлай Маскве»[133].

«...Праз акно на дах...» Якраз гэты выпадак — і вельмі маляўніча — апісвае ў сваіх нататках Людвіга Радзевіч. Аднойчы Каліноўскі начаваў на канспіратыўнай кватэры пані Догель. Кватэра знаходзілася на другім паверсе двухпавярховага дома на Зарэччы. У гэты час тут была схавана друкарня. «Адбывалася гэта позняй восенню, калі ўжо надышлі моцныя замаразкі. Ноч ясная, месячная. Каліноўскі пасля дарогі салодка заснуў. Раптам гаспадыня, што яшчэ не спала, чуе незвычайны рух і злавесны шум. Абуджаны Каліноўскі ўсхапіўся і бачыць сярод святла як днём: дом шчыльна абкружаны войскам. Не разважаючы, бліскавічным рухам адчыняе акно і, як быў у бялізне, выбіраецца насілу на дах, пакрыты густой шэранню. Там, прыціснуўшыся грудзьмі да чарапіц, якія складалі яго апору, ён мае перспектыву кожную хвіліну ўпасці на галовы салдат». У такім становішчы ён знаходзіўся ўвесь час, пакуль ішоў вобыск. Паліцыя нічога не знайшла. (Радзевіч сцвярджае, што віленскі паліцмайстар Саранчоў, які рабіў вобыск, спачуваў паўстанцам.) Калі Каліноўскі атрымаў магчымасць вярнуцца ў пакой, «яго рукі ўжо закасцянелі, і,

---

[132] Пазней копія ліста была выяўлена сярод папер А. Станкевіча ў ЦНБ НАН. Гл.: Каліноўскі К. За нашую вольнасць. С. 86–87. — *Рэд.*

[133] Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. Вільня, 1935. С. 26.

змарожаны, ён траціў здольнасць рухацца. Толькі такая маральная і фізічная сіла, як у яго, — усклікае Радзевіч, — здолела вытрымаць гэтае страшэннае выпрабаванне».

Нават Гейштар, апісваючы апошні перыяд дзейнасці Каліноўскага, здаецца, шчыра любуецца ім: «ён мог уцячы з Вільні, але ніколі не думаў аб гэтым, бо лічыў сваім абавязкам, як быў першым загаворшчыкам у Літве, так стаць апошняй ахвярай тэрарызму Мураўёва» (т. 2, с. 51). А вось другая інтэрпрэтацыя подзвігу Каліноўскага: «Адмовіўшыся аднойчы ад грамадства, ён не разумеў яго патрэб, і як утапіст ён усё ж хацеў праводзіць свае ідэі ў грамадстве. Адным з яго жаданняў было выдаваць які-небудзь часопіс... »[134] Паведамленне аб тым, што Каліноўскі перад арыштам меў намер выдаваць часопіс для прапаганды сваіх поглядаў, — безумоўна цікавае, але, як бачым, абодва сведкі малююць Каліноўскага якімсьці адарваным ад жыцця, падобным да Дон Кіхота рыцарам ці нават фанатыкам-утапістам. Наўрад ці можна пагадзіцца з гэтым. Справа была прасцейшая. Каліноўскі не мог пакінуць свой адказны пост, пакуль у лясах, скаваных марозамі, яшчэ заставаліся паўстанцы. Так, паўстанне цярпела паражэнне, падаў снег, хаваючы сляды вялікай драмы, але трэба было ў парадку адступіць, трэба было захаваць паўстанцкія кадры, каб пачаць новае паўстанне ў больш спрыяльны момант (паўстанцы адпускаліся дамоў да вясны 1864 года). Настаў такі час, калі звычайныя пашпарты, «віды на жыхарства», і цёплыя кажухі сталі больш патрэбныя за зброю. І Каліноўскі нястомна працаваў, імкнучыся выратаваць тое, што можна было яшчэ выратаваць.

---

[134] З паказанняў Ю. Каліноўскага (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 594. Арк. 38).

Яго напружаная дзейнасць была абарвана арыштам. Месцазнаходжанне і апошні псеўданім рэвалюцыянера былі выдадзены здраднікам, арыштаваным у Мінску. На следстве і ў судзе Каліноўскі трымаў сябе мужна і проста заявіў следчай камісіі: «...калі грамадзянская адкрытасць складае дабрачыннасць, дык шпіёнства апаганьвае чалавека». З пагардай сказаў ён следчым, што «грамадства, якое грунтуецца на іншых асновах, не вартае гэтай назвы». І зноў паўтарыў сваю ўлюбёную думку аб адсутнасці ў яго якой-небудзь варожасці да рускага народа: «Я не праціўнік шчасця народнага, не праціўнік і Расіі, калі яна нам дабра жадае, але праціўнік тых бедстваў, якія спасцігаюць край наш няшчасны»[135].

У Вільнюсе, у Старым Горадзе, на рагу вуліц Гараліса і Гедрыса яшчэ і цяпер узвышаюцца магутныя муры высокага касцёла з жоўтымі, пакрытымі пачарнелай чарапіцай трохпавярховымі будынкамі, якія да яго прымыкаюць. Гэта тое, што засталося ад былога кляштара дамініканаў. Тут, у камеры № 3, правёў свае апошнія дні Каліноўскі[136]. Тут напісаў ён свае славутыя «Пісьмы з-пад шыбеніцы». Ён знайшоў спосаб, каб перадаць сваё апошняе прывітанне роднаму народу з-за тоўстых муроў: «Браты мае, родныя мужыкі! З-пад маскоўскай шыбеніцы прыходзіцца мне вам пісаць і, можа, апошні раз. Горка пакінуць родную зямельку і цябе, дарагі мой народзе. Застогнуць грудзі, забаліць сэрца, але не шкада загінуць за тваю праўду». У гэтых пісьмах, напісаных на роднай беларускай мове, ён развітваецца з хатамі беларускіх сялян, з усім мілым яго сэрцу «мужыцкім народам». Гэта палітычнае завяшчанне палоннага байца, які спазнаў горыч

---

[135] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 280. Арк. 34, 7.

[136] На доме ў памяць гэтай падзеі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

паражэння, але не зламаўся духам і шкадуе толькі аб адным, што не зможа ўжо працягваць барацьбу за свабоду свайго народа. Радкі пісьмаў прасякнуты вялікай верай у народныя сілы, яны клічуць да працы, «шчырай і простай, як тое сэрца, што б'ецца пад сярмягай, як той мужыцкі розум, што не перабірае, калі трэба рабіць». Гэтую веру ва ўласныя сілы Каліноўскі з-за кратаў астрога жадае ўліць у сялянскія сэрцы. Не трэба чакаць дапамогі аднекуль: «Доўга палякі чакалі дапамогі з-за граніцы, народы чужаземныя крычалі многа, а дагэтуль нічога для нас не зрабілі...»; «Ты, аднак, народзе, не чакай і з чым можаш ідзі ваяваць за свайго Бога, за сваё права, за сваю славу, за сваю бацькаўшчыну».

Натхнёныя словы пісьмаў арганічна перарасталі ў вершаваныя радкі. Гэтак жа арганічна перапляліся ў перадсмяротным вершы Каліноўскага пачуццё кахання да дзяўчыны з пачуццём любові да ўсяго роднага краю, да ўсяго прыгнечанага народа. Гэты верш па сваім палітычным гучанні і нават па сваім стаўленні да Бога вельмі нагадвае «Запавет» Шаўчэнкі:

Марыська[137]*, чарнаброва галубка мая,*
Гдзе ж ся падзела шчасце і ясна доля твая;
Усё прайшло-прайшло, як бы не бывала,
Адна страшэнна горыч у грудзях застала.

Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці
Ды й у прадвечнага саду вялеў прападаці,
То мы прападзём марна, но праўды не кінем.
Хутчэй небо і шчасце, як праўду, абмінем.

---

[137] Некаторыя даследчыкі лічаць, што Марыська — гэта алегарычны вобраз Беларусі, беларускага народа. Думаецца, што ніякіх падстаў для такога меркавання няма.

... Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе,
І часам спамяні пра Яську твайго,
Што загінуў за праўду для дабра твайго.

А калі слова пяройдзе ў дзела,
Тагды за праўду станавіся смела,
Бо адно з праўдай у грамадзе згодна
Дажджэш, народзе, старасці свабодна[138].

... «Была ясная халодная раніца. Каліноўскі ішоў на кару смела. Прыйшоўшы на плошчу, ён стаў проста тварам да шыбеніцы і толькі часамі кідаў позірк у далёкі натоўп. Калі яму чыталі канфірмацыю, ён пачаў быў рабіць заўвагі. Так, напрыклад, калі назвалі яго імя: „Дваранін Вікенцій Каліноўскі", ён усклікнуў: „У нас няма дваран, усе роўныя!" Паліцмайстар паківаў яму галавой і прасіў змоўкнуць. Не стану апісваць падрабязнасцей гэтага сумнага відовішча, падобных якому не дай бог калі-небудзь яшчэ ўбачыць»[139], — вось апісанне пакарання Каліноўскага, зробленае ліберальным чыноўнікам Масолавым. Яно стала «класічным», бо вытрымкі з яго прыводзяцца ва ўсіх біяграфіях беларускага рэвалюцыянера. Для Масолава пакаранне — толькі цікавае, хоць, можа, і «сумнае» відовішча, а апошнія словы змагара — пікантная дэталь, якой можна заінтрыгаваць слухачоў. Але нават з гэтага апісання відаць, што Каліноўскі да апошняй хвіліны жыцця застаўся верны сабе і свой эшафот ператварыў у трыбуну для выказвання рэвалюцыйных поглядаў. Калі і быў яму патрэб-

---

[138] Giller A. Historija powstania... T. 1. S. 332–334.
[139] Мосолов А. Н. Виленские очерки... С. 608–609.

ны дваранскі тытул, то толькі для таго, каб у гэтую апошнюю часіну жыцця мець магчымасць сказаць свае бессмяротныя словы.

Пакаранне Каліноўскага адбылося 10 (22) сакавіка 1864 года на Лукішскай плошчы ў Вільні, аб 11-й гадзіне раніцы, «при огромном стечении народа», як адзначаў «Виленский вестник». Аб пакаранні данеслі цару. (Роўна праз 17 гадоў, у сакавіку 1881-га, цара пакараў другі беларус — Ігнат Грынявіцкі.)

Смерць вялікага беларускага рэвалюцыянера цяжкім смуткам адгукнулася не толькі ў Беларусі і Літве, але і далёка за іх межамі. Разам з беларускім народам глыбока перажылі гэтую падзею і перадавыя людзі Расіі. Цікавыя дакументы ў гэтых адносінах знайшоў А. Смірноў. Вядомы земляволец Юлій Бензенгер, які служыў салдатам у Ніжнім Ноўгарадзе (ён пайшоў у шэрагі арміі спецыяльна для рэвалюцыйнай прапаганды), не маючы іншых сродкаў, каб адпомсціць за смерць Каліноўскага, накіраваў свайму начальству пратэст, у якім пісаў: «Калі я быў у бальніцы, дык узнаў з газет, к вялікаму жалю, што Каліноўскі пакараны Мураўёвым у Вільні... З той мінуты, як не стала майго старэйшага брата, я вырашыў ісці тым жа шляхам, які ён мне паказаў сваёй пакутніцкай смерцю, і жадаў бы ў магчыма хуткім часе прынесці сябе ў ахвяру за вызваленне бацькаўшчыны»[140].

Паўстанне 1863 года пацярпела паражэнне, але кроў паўстанцаў пралілася не дарма. Царскія ўлады былі вымушаны пайсці на некаторыя ўступкі беларускім, літоўскім і польскім сялянам. Сялянская рэформа ў Беларусі, Літве і Польшчы

---

[140] Смірноў А. К. Каліноўскі і Ю. Бензенгер // ЛіМ. 1959. 4 ліп.

была праведзена на больш выгадных для сялян умовах, чым у Расіі. Каліноўскі ў цэлым аптымістычна ацэньваў вынікі паўстання і не шкадаваў, што прыняў у ім удзел. Паводле слоў Гейштара, беларускі рэвалюцыянер на апошніх допытах у следчай камісіі заявіў, «што памрэ спакойна, таму што ў значнай частцы дасягнуў сваёй мэты: „Народ мае зямлю, а шляхты зменшылася напалову"» (т. 2, с. 51).

* * *

Прайшло шмат гадоў з дня смерці Кастуся Каліноўскага. Шмат навальніц пранеслася над беларускай зямлёй з таго часу, калі ён, стоячы на эшафоце, сказаў свае апошнія словы. Час строга і бязлітасна правярае значэнне ідэй, гістарычных дзеячаў і падзей у гісторыі таго ці іншага народа. Імя Кастуся Каліноўскага свята шануе беларускі народ, і гэта — лепшае сведчанне той вялікай ролі, якую адыграў непахісны барацьбіт у яго гісторыі.

Але слава яго выходзіць далёка за межы рэспублікі. Вялікага беларускага рэвалюцыянера ведае кожны школьнік у нашай неабсяжнай краіне. Асабліва папулярнае гэтае імя ў брацкай Літве. «Наш Костас Калінаўскас», — гавораць літоўцы, успамінаючы слаўныя падзеі сумеснай з беларускім народам барацьбы за свабоду і шчасце працоўных.

Да сённяшніх дзён удзячны Кастусю Каліноўскаму і польскі народ. Не можам не прывесці ў сувязі з гэтым цёплыя, прачулыя словы польскага гісторыка Кшыштафа Канкалеўскага, сказаныя ім у адрас беларускага рэвалюцыянера: «Вялікі герой і правадыр беларускага народа, ён падтрымліваў адначасова польскае паўстанне, змагаўся ў ім

і загінуў, выяўляючы гэтым адзінства інтарэсаў польскага і беларускага народа, смерцю сваёй змацоўваючы сваю глыбокую веру ў будучыню вялікага рэвалюцыйнага саюзу рускага, польскага і беларускага народаў» (с. 207–208).

Героем трох народаў называюць вялікага беларуса. І гэта слушна: сімвалам сяброўства народаў стала сёння яго імя. З глыбіні стагоддзяў даходзіць да нас натхнёны голас Каліноўскага. Ён гучыць над цудоўным Мінскам, над старажытным Вільнюсам, над Варшавай, якая ўзнялася з руін.

ВІНЦЭНТ ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ І ПАЎСТАННЕ 1863 ГОДА

1

Паўстанне 1863 года адыграла вялікую ролю ў гісторыі беларускага народа і ў лёсе многіх выдатных яго сыноў.

Для гісторыі Беларусі 1863 год, побач з 1861 годам, азначае больш ці менш рэзкую мяжу між дзвюма сацыяльна-эканамічнымі фармацыямі. Віхура, што пранеслася над беларускай зямлёй, разбурыла многія апоры прыгонніцтва і расчысціла глебу для новых, больш прагрэсіўных вытворчых адносін.

І, можа, ніколі раней так не адчувалася сувязь паміж эканомікай і ідэалогіяй, як у гэтыя гады. Рэвалюцыя ў гаспадарчых адносінах выклікала не менш значную рэвалюцыю ў свядомасці. І хоць няправільна называць гэтае паўстанне сялянскім, нельга не адзначыць, што 1863 год тым ці іншым шляхам прывёў у рух мільённыя народныя масы. Няхай сабе сярод сялянства не было адзінства (частка сялян змагалася ў паўстанцкіх атрадах, а частка выступала супраць паўстанцаў), але народ трымаў у руках зброю, народ апынуўся перад неабходнасцю выбару і меў магчымасць выбіраць. У перыяд рэвалюцыйнай сітуацыі і паўстання (1859–1864 гг.) сялянскія галовы напружана думалі над паняццямі «зямля» і «воля», «цар» і «паны», «сябры» і «ворагі». Да сялян з палымяным словам на роднай мове звярталіся рэвалюцыянеры. У выніку не магла не вырасці саслоўна-класавая і нацыянальная самасвядомасць беларускіх сялян. І, нягледзячы на тое што

беларускі народ у час паўстання страціў нямала сваіх лепшых сыноў, праз два-тры дзесяцігоддзі ён быў значна лепш, чым да паўстання, падрыхтаваны да ўспрыняцця тых рэвалюцыйна-дэмакратычных і нацыянальных ідэй, галоўным вестуном якіх стаў у гэты час Францішак Багушэвіч.

У агні паўстання 1863 года згарэлі датла многія ілюзіі, былі развенчаны многія паняцці, якія здаваліся да таго часу слушнымі. З ідэалагічнага пункту гледжання, 1863 год азначаў канец дваранскай, шляхецкай рэвалюцыйнасці.

Шляхецкія рэвалюцыянеры, побач з рэвалюцыйнымі дэмакратамі, былі галоўнай сілай, што падрыхтавала паўстанне 1863 года і кіравала ім. У Расіі перыяд дваранскай рэвалюцыйнасці скончыўся ў 1861 годзе. У Польшчы, Беларусі і Літве яшчэ была глеба, што жывіла шляхецкую рэвалюцыйнасць. Гэтай глебай з'яўляліся ідэі нацыянальна-вызваленчага руху.

Наяўнасць у складзе польскага руху рэвалюцыйных, па-сапраўднаму дэмакратычных сіл, якія прызнавалі права народаў, што калісьці ўваходзілі ў Рэч Паспалітую, на самавызначэнне, стварала аснову для супрацоўніцтва беларускіх і польскіх рэвалюцыянераў. Важна было ўмацаваць дэмакратычныя сілы польскага руху, важна было не дапусціць, каб царскія ўлады выкарысталі нянавісць беларускіх сялян да польскіх памешчыкаў і абрушылі вялізную энергію народа супраць польскага руху.

Лепшыя сыны беларускага народа свята выканалі свой абавязак перад польскім народам. Гісторыя ніколі не забудзе подзвігу Кастуся Каліноўскага, які ў тых надзвычай складаных умовах стаў прызнаным правадыром беларускіх, польскіх і літоўскіх рэвалюцыйных дэмакратаў і ўзна-

чаліў паўстанне 1863 года ў Беларусі і Літве. Да левага, рэвалюцыйна-дэмакратычнага, крыла арганізацыі «чырвоных» прымыкалі таксама слаўныя сыны беларускага народа Францішак Багушэвіч і Антон Трусаў.

Унёс сваю долю ў вызваленчы рух польскага народа і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Аднак кожнаму, хто знаёмы з яго творчасцю, зразумела, што яму былі больш даспадобы шляхецкія рэвалюцыянеры, чым рэвалюцыянеры-дэмакраты.

Рэвалюцыйныя дэмакраты былі чужыя пісьменніку сваёй, як яму здавалася, нецярпімасцю і аднабаковасцю. Затое шляхецкія рэвалюцыянеры імпанавалі Дуніну-Марцінкевічу сваёй пропаведдзю класавай гармоніі, сваімі спробамі задаволіць і сялян, і паноў адначасова.

Ведаючы некалькі панскіх маёнткаў, уладальнікі якіх больш-менш гуманна абыходзіліся з сялянамі і тыя жылі лепш у параўнанні з сялянамі з іншых маёнткаў, пісьменнік лічыў, што гэтак магло б быць усюды, трэба толькі нагадаць панам пра іх абавязкі перад абяздоленым народам.

Было толькі адно пытанне, дзе пазіцыя шляхецкага дэмакрата Дуніна-Марцінкевіча супадала з пазіцыяй сялянскага дэмакрата К. Каліноўскага. Гэта было пытанне аб беларускай культуры. Як і Каліноўскі, Дунін-Марцінкевіч гатовы быў змагацца за самастойнасць беларускай культуры. Нездарма аднаго называлі сярод пэўнай часткі нацыяналістычна настроеных польскіх дзеячаў «сепаратыстам», а другога — «правінцыялістам».

Абараняючы права беларускага народа на сваю нацыянальную літаратуру, Дунін-Марцінкевіч пісаў у вядомым лісце да Ю. Крашэўскага: «Гэтая мая ідэя і імкненне былі зра-

зуметы і ацэнены ў Каралеўстве[141] і засталіся незразуметымі ў Літве[142]; на літаратурным сходзе ў пана К... я чуў наступнае: „Пішучы на беларускай гаворцы, я насаджваю, моў, сярод вясковага люду правінцыялізм..."»[143]

Цікава адзначыць, што гэты ліст з'явіўся ў «Газеце польскай» 20 красавіка 1861 года, г. зн. якраз у самым пачатку ўздыму польскага нацыянальна-вызваленчага руху 60-х гадоў. Падтрымліваючы польскі рух, пісьменнік як бы высоўваў у гэтым лісце сустрэчныя патрабаванні ад імя беларускага народа.

Дарэчы сказаць, наколькі нам вядома, літаратуразнаўцы яшчэ не рабілі спроб высветліць, хто ж хаваецца пад літарай «К...» у гэтым пісьме.

А між тым наўрад ці можна сумнявацца, што Дунін-Марцінкевіч мае тут на ўвазе традыцыйныя літаратурныя вечары, якія адбываліся па суботах у кватэры вядомага ў той

---

[141] Каралеўства — Царства Польскае.

[142] Пад Літвой у шырокім сэнсе слова ў гэты час разумеліся і ўласна Літва, і Беларусь, асабліва Заходняя і Цэнтральная. У той час гаварылі: «Брэст Літоўскі» і нават «Мінск Літоўскі». Беларуссю ў тыя гады называлі галоўным чынам Віцебскую і Магілёўскую губерні. Якраз у такім умоўным значэнні ўжываюцца словы «Беларусь» і «беларусіны» ў творах В. Дуніна-Марцінкевіча, хоць ён добра ведаў пра этнаграфічнае адзінства народа, які жыў «над Віллёй і Нёманам, над Свіслаччу, Беразіной, Дзвіной, Дняпром». Сябе, жыхара Мінскай губерні, ён таксама ўмоўна называў «літвінам». Зрабіўшы паездку з Мінскай губерні ў Магілёўскую, ён гаворыць аб «падарожжы на Беларусь». І пасля паездкі пісаў у вершы «Да пачцівых беларусаў»:

Вас, браты, я помніць буду,
Я не сніў такога цуду,
Каб, вырасшы між літвінаў,
Палюбіў беларусінаў.

[143] Дунін-Марцінкевіч В. Зб. тв. Мінск, 1958. С. 416.

час віленскага літаратара, рэдактара газеты «Кур'ер Віленьскі» Адама Кіркора. Успамінаючы пазней гэтыя вечары[144], Кіркор пералічыў многіх іх удзельнікаў. У прасторнай кватэры Кіркора ў Святаянскіх мурах (будынак Віленскага універсітэта) збіраліся супрацоўнікі рэдакцыі «Кур'ера Віленьскага», літаратары, вучоныя, дзеячы мастацтва, мецэнаты з магнатаў.

Адным словам, сходы былі даволі стракатыя. Бывалі тут выдатны паэт Л. Кандратовіч-Сыракомля, настаўнік В. Пшыбыльскі, пазней актыўны ўдзельнік паўстання 1863 года, пісьменнікі А. Адынец (сябар Адама Міцкевіча) і І. Ходзька, адзін з самых багатых магнатаў у Літве і Беларусі граф Р. Тызенгаўз, археолаг-памешчык граф Е. Тышкевіч, сляпы гісторык М. Маліноўскі, вучань Сыракомлі паэт В. Каратынскі (паходзіў з беларускіх сялян), малады літаратар з літоўскіх сялян М. Акялевіч-Акялайціс. Да свайго ад'езду ў 1858 годзе ў Варшаву наведваў гэтыя вечары і кампазітар С. Манюшка.

Пералічаныя тут асобы прытрымліваліся не аднолькавых поглядаў, некаторыя лічылі сялянскую рэформу 1861 года занадта радыкальнай (Р. Тызенгаўз, І. Ходзька), многія былі нават правей за «белых» і зусім не прымалі ўдзелу ў вызваленчым руху.

А. Кіркор мае даволі значныя заслугі ў галіне беларускага і літоўскага краязнаўства і этнаграфіі. Але, мяркуючы па ўсім, ён належаў да той часткі беларускай інтэлігенцыі, якая свядома выступала за супрацоўніцтва з царызмам. (Сярод літоўскай інтэлігенцыі падобную пазіцыю ў той час займаў, напрыклад,

---

[144] Kirkor A. H. Ze wspomnień wileńskich // Kraj. 1884. № 3. S. 2–10.

жэмайцкі каталіцкі епіскап М. Валанчэўскі-Валанчус, які пакінуў некаторы след у гісторыі літоўскай літаратуры.) У кожным разе, як сведчыць апублікаваная сакрэтная запіска Кіркора за 1846 год[145], ён ужо тады выконваў тайныя даручэнні ўлад па разведванні настрояў сярод насельніцтва краю. У 1858 годзе Кіркор, Каратынскі, Адынец, Ходзька, Тышкевіч заслужылі мянушкі «адступнікаў» тым, што апублікавалі альбом вернападданніцкага зместу ў гонар прыезду ў Вільню цара Аляксандра II (Каратынскі надрукаваў у ім верш на беларускай мове[146]). У свой час быў знойдзены ліст да Кіркора невядомага «Рускага» з рэзкай крытыкай удыгання Кіркора перад царызмам. У 1863 годзе Кіркор у нейкай меры быў паплечнікам Мураўёва-вешальніка ў падаўленні паўстання[147].

З многімі ўдзельнікамі літаратурных вечароў Кіркора Дуніну-Марцінкевічу было не па дарозе, нягледзячы на тое што пісьменнік сам быў далёка не рэвалюцыянерам.

Ва ўсякім выпадку, нельга згадзіцца з Р. Зямкевічам, які не пашкадаваў самых яркіх фарбаў, каб ідэалізаваць гэты гурток і яго завадатара: «Першыя ластаўкі беларускай кніжкі Марцінкевіча радасна вітае тагачасны невялікі беларускі гурток у Вільні. Рэдакцыя газеты «Kurjer Wileński», Сыракомля,

---

[145] Fainhauzas D. Slaptas caro valdžios dokumentas apie 1846 m. Lietuvoje i Baltarusijoje (Adamo Kirkoro «Kelionės dienoraštis») // Vilniaus valst. V. Kapsuko v. universiteto mokslo darbai. Istorijos-filologijos mokslų serija. Vilnius, 1958. P. 201–209.

[146] Верш выйшаў таксама асобным выданнем: Найяснейшаму яго міласці гаспадару імператару Аляксандру Мікалаевічу песня з паклонам ад літоўска-мужыцкай грамады. Спісаў Вінцусь Каратынскі. Вільня, 1858.

[147] Праўда, гэта супрацоўніцтва не было ціхамірным. Мураўёў гаварыў, напрыклад, Ратчу: «Я трымаю Кіркора, бо ён ведае, што я дваццаць разоў магу яго павесіць» (АР ДПБ [АР РНБ]. Фонд 629. Спр. 6. Арк. 1).

Манюшка, Вінцук Каратынскі і Кіркор — гэта сонцы, каля каторых і гуртуюцца ўсе зоркі беларускага адраджэння»[148].

Дунін-Марцінкевіч быў асабліва блізкі да двух членаў гэтага гуртка — Манюшкі і Сыракомлі. Як і Дунін-Марцінкевіч, Сыракомля ў час падрыхтоўкі паўстання 1863 года схіляўся да шляхецкіх рэвалюцыянераў-«чырвоных» і, паводле аднадушнага сведчання многіх сучаснікаў, прыняў бы ўдзел у паўстанні, калі б заўчасная смерць не спыніла яго жыцця (ён памёр у верасні 1862 года). Яго верш на беларускай мове «Добрыя весці» з'яўляецца добрым прыкладам для характарыстыкі шляхецкай рэвалюцыйнасці[149]:

Заходзіць сонца пагоднага лета,
Веіць вецер з заходніх нябёс;
Здароў будзь, вецер! З далёкага света
Добрыя ж весці да нас ты прынёс?
Здаровыя ж будзьце! Эй, добрыя ж весці:
Там на заходзе праліваюць кроў,
Б'юцца для славы, свабоды і чэсці
І робяць вольных людзей з мужыкоў.
Гудзяць вясёла і песні і танцы
У добрым жніве на шчаслівы год;
Годзе ж вам, годзе, царыкі-паганцы,
Таптаць з балотам хрышчоны народ!
Годзе ж вам, годзе ў яснай карэце,
Годзе, чыноўнікі, ездзіць у двор;
Годзе ж вам, годзе мужыцкія дзеці

---

[148] Зямкевіч Р. Адам-Ганоры Кіркор: Біягр.-бібліяграф. нарыс у 25-летнюю гадаўшчыну смерці. Вільня, 1911. С. 6.

[149] Аб тым, што гэты верш належыць Сыракомлю, сведчаць Ю. Крашэўскі (Карский Е. Ф. Белорусы. Пг., 1922. Т. 3. Вып. 3. С. 64) і В. Каратынскі (Korotyński W. Po dwudziestu pięciu latach // Tygodnik ilustrowany. 1887. T. 10).

З хаткі астаткі браць на пабор.
І панская дзецка і хамская юха
З аднэй кватэркі папіяюць мёд,
І прысягнулі навек да абуха
Быць сабе вольны і роўны народ.
Мужык і шляхціц засядзе на лаве,
Каб весці раду а сваёй зямлі,
Як трэба думаць а грамадскай справе.
На адно месца, як браты, прыйшлі.
А як урадзім вайну на грамадзе
Бараніць дзеткі, і зямлю, і дом,
Мужык і шляхціц на каня ўсядзе
Касіць касою, рубаць тапаром!
... Ручыць рукою худоба ў хаце,
Паны мужыцкіх слёз не забяруць —
Мужык з панамі стаіць за пан-браце,
Рука за руку, грудзь за грудзь!
Пяром на карце, сахой на ніве
Адзін другому роўнасць засцярог;
Эй, у свабодзе зажывём шчасліва,
Мы будзем дзеткі, а нам бацькам — Бог[150].

Асноўны тэзіс гэтага верша — аб адзінстве інтарэсаў пана і селяніна перад тварам агульнага ворага (царызму), аб магчымасці пабудаваць гарманічнае грамадства так, каб не былі радыкальна зачэплены інтарэсы паноў, — вельмі характэрны для светапогляду шляхецкага рэвалюцыянера.

Шмат агульнага было ў Дуніна-Марцінкевіча з другім удзельнікам літаратурных вечароў Кіркора — літоўскім

[150] Верш публікуецца ў скарочаным выглядзе паводле «парыжскага» выдання брашуры «Гутарка старога дзеда» (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 438. Вопіс 1. Спр. 290. Арк. 18).

паэтам М. Акялайцісам. Іх блізкасць вызначалася тым, што беларускі і літоўскі народы былі ў гэты час прыкладна ў аднолькавым становішчы. Адыходзіла ў мінулае глухая пара прыгонніцтва, беларускі і літоўскі народы распроставалі плечы, каб скінуць з сябе ўціск ненавісных паноў і царызму. Ішоў працэс фарміравання нацый, узыходзілі першыя пралескі беларускай і літоўскай нацыянальнай літаратуры новага часу. У гэтых умовах у Марцінкевіча і Акялайціса быў адзін вялікі клопат: сеяць асвету сярод сваіх народаў. Акялайціс высунуў вялікі план выдання народных бібліятэчак для Літвы, Беларусі і іншых правінцый былой Рэчы Паспалітай. У лісце да Ю. Крашэўскага ад 17 лютага 1859 года ён прапанаваў: «Заснаваліся б народныя бібліятэчкі для Літвы, Кароны (Царства Польскага. — *Г. К.*), Галіцыі, Познані і нават для Беларусі... Каратынскі і Дунін-Марцінкевіч узяліся б за справу з боку Русі, а я пісаў бы для Літвы...»[151] Як і Дунін-Марцінкевіч, Акялайціс разумеў неабходнасць падтрымкі польскага нацыянальна-вызваленчага руху і прымыкаў да шляхецкіх рэвалюцыянераў-«чырвоных». У 1863 годзе ён прыняў актыўны ўдзел у паўстанні ў якасці памочніка рэвалюцыйнага камісара Аўгустоўскай губерні. Пасля паўстання ён быў вымушаны ўцякаць за мяжу.

Думаецца, што на сувязі В. Дуніна-Марцінкевіча з рэвалюцыянерамі можа кінуць нейкае святло кароткае прысвячэнне, зробленае пісьменнікам у 1858 годзе на сшытку са сваімі творамі: «Вяльможнаму Тадэвушу Чудоўскаму — у знак глыбокай павагі гэтыя творы прысвячае аўтар»[152]. У нас

[151] Bartoszewicz K. «Prowincjonalista» litewski z przed pół wieku // Kurjer warszawski. 1912. 9 stycznia.

[152] Майхровіч С. Нарысы беларускай літаратуры XIX ст. Мінск, 1957. С. 106.

ёсць усе падставы меркаваць, што гэта той самы Чудоўскі, які быў універсітэцкім сябрам выдатнага польскага рэвалюцыянера З. Серакоўскага, а ў 1863 годзе быў адным з галоўных арганізатараў паўстання ў Магілёўскай губерні[153].

2

Цікава, што прозвішча В. Дуніна-Марцінкевіча як удзельніка рэвалюцыйнага руху было названа ўпершыню не ў мінскіх ці віленскіх паліцэйскіх і жандарскіх установах, а ў Пецярбургу — у III аддзяленні царскай канцылярыі. Гэта адбылося ў 1861 годзе ў сувязі з наступнымі акалічнасцямі.

31 сакавіка гэтага памятнага ў гісторыі Расіі года, хутка пасля таго як царскія ўлады расстралялі бяззбройную патрыятычную дэманстрацыю ў Варшаве і цару быў пададзены складзены прадстаўнікамі польскіх памешчыкаў і буржуазіі адрас аб дараванні палітычных уступак Царству Польскаму,

---

[153] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 2. S. 284; В. Очерки мятежного движения в Могилевской губернии в 1863 году. Вильна, 1865. С. 85, 92. «То Тадэвуш — лепшы сябра — аж з-пад Магілёва», — магчыма, гэта пра Чудоўскага гаворыць пісьменнік, апісваючы ў «Літаратарскіх клопатах» з'езд гасцей на свята дажынак у гасцінны Шчароў.

Паўстанне не абмінула і гэты куток Беларусі. Са Шчарова 22 красавіка 1863 года пайшоў у паўстанцкі атрад Жултка валасны пісар Іосіф Пранеўскі. 7 мая непадалёк ад Шчарова былі разбіты паўстанцы некалькіх атрадаў. Расследаваўшы становішча ў 4-м стане Сенненскага павета Магілёўскай губерні, дзе знаходзіўся Шчароў, Аршанская следчая камісія выказала меркаванне, «што ў гэтай мясцовасці была агульная змова да ўдзелу ў паўстанні». Да следства прыцягнулі і ўладальніка Шчарова Юлія Рашкоўскага («пан Юлій» ці «Юлі Р...» у творах пісьменніка), але яго віна не была даведзена (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 978).

віленскі губернскі прадвадзіцель дваранства, або, як часцей тады гаварылі, маршалак, А. Дамейка атрымаў пісьмо з Бабруйска ў невялікім канверце з чырвонай сургучнай пячаткай. Гэта была «Адозва сына Айчыны да братоў-літвінаў», напісаная ад рукі вершам на польскай мове. Яе аўтар — «літвін», г. зн. жыхар Літвы ва ўмоўным сэнсе гэтага слова, заклікаў сваіх «суайчыннікаў» (мелася на ўвазе перш за ўсё дваранства) падтрымаць нацыянальна-вызваленчы рух, што разгарнуўся за Бугам і Нёманам — у Польшчы (у «Каралеўстве»).

Gdy Królewstwo już powstało
I do życia hasło dało,
Czego śpicie wy, Litwini?! —

такімі радкамі пачыналася гэтая адозва. Лепшым сродкам, каб разбудзіць Беларусь і Літву, лічыў аўтар, быў бы адрас на імя цара і французскага імператара Напалеона III, накшталт таго, што быў пададзены дваранствам Царства Польскага:

Tylko idzie o podanie
I przez wszystkich podpisanie
Adresu:
Słowo w słowo takiego,
Jak z Królewstwa Polskiego,
Aleksandrowi drugiemu
I Napoleonowi trzeciemu!

Верш заклікаў адмовіцца ад спрэчак і ставіў у прыклад венграў, «якія пабілі ворага без зброі і войска, усяго толькі адзінствам». Пад адозвай была прыпіска, у якой Дамейку, пад пагрозай суда грамадскасці, прапанавалася паслаць гэты дакумент усім павятовым прадвадзіцелям дваранства. «Больш

прыстойна будзе, — гаварылася ў прыпісцы, — звярнуцца з прапановай да суайчыннікаў у час з'езду для выбараў міравых пасрэднікаў. Хоць Вы мяне не ведаеце, але ў такой важнай справе дастаткова Вам будзе ведаць маё імя. Пісьмо гэтае атрымаеце з Бабруйска, дзе яно было апушчана ў скрынку, калі я там быў праездам. *E. Gabryel*».

Адозва цікавая тым, што яна з'яўляецца адной з першых праяў нацыянальна-вызваленчага руху ў той час на тэрыторыі Беларусі і Літвы. З ідэалагічнага пункту гледжання, дакумент мае на сабе відавочныя сляды шляхецкай абмежаванасці (тэорыя класавага міру ў імя барацьбы за нацыянальныя правы, надзея на дапамогу з боку Напалеона III і г. д.).

Подпіс «Э. Габрыэль» быў, зразумела, выдуманы. А. Дамейка быў вядомы сярод патрыятычна настроенай шляхты сваімі скептычнымі адносінамі да нацыянальна-вызваленчага руху. У 1863 годзе справа дайшла нават да таго, што «Выканаўчы аддзел на Літве» (орган кіраўніцтва паўстаннем у Беларусі і Літве) вынес яму смяротны прысуд за супрацоўніцтва з царскімі ўладамі і на яго быў зроблены замах, праўда, няўдалы. Як бачым, зусім не выпадкова аўтар адозвы пагражаў яму грамадскім судом.

Дамейка застаўся верны сабе і гэтым разам. Ён перадаў ліст віленскаму генерал-губернатару Назімаву, і ўжо 3 красавіка з генерал-губернатарскай канцылярыі адозва была неадкладна адпраўлена ў III аддзяленне.

У Пецярбургу вельмі зацікавіліся паведамленнем Назімава і пра «Адозву сына Айчыны» неадкладна перадалі цару. На данясенні Назімава ёсць паметка: «Высачайша дазволена зрабіць аб магчымым адшуканні крыніц гэтай адозвы патрэбныя з кім належыць зносіны. 9 красавіка». І далей

прыпіска алоўкам: «Даручана агенту, які накіроўваецца ў Вільню, ужыць старанні, каб адшукаць асоб, што займаюцца распаўсюджваннем згаданай пракламацыі. 13 крас.».

Гэтым агентам быў завербаваны III аддзяленнем студэнт Пецярбургскага універсітэта Юзаф Бярнацкі. Некалькі месяцаў шнырыў царскі шпік па гарадах і вёсках Беларусі і Літвы, пакуль, нарэшце, не паведаміў, што аўтарам адозвы быў В. Дунін-Марцінкевіч. Вось тады і была пачата ў III аддзяленні справа «Аб памешчыку Марцінкевічу, які рассылаў у заходнія губерні бунтоўныя адозвы да літоўцаў»[154].

У сваім лісце з Ашмян Бярнацкі паведамляў 10 жніўня: «Я нядаўна вярнуўся з Мінскай губерні, дзе мне Вы далі даручэнне даведацца, хто напісаў пісьмо Дамейку, пасланае з Бабруйска Габрыэлем. Спачатку ішла гэта справа мне вельмі цяжка, таму што ніхто не гаварыў пра яго, але мне ўдалося даведацца напэўна, што гэтае пісьмо напісаў Марцінкевіч, памешчык Мінскай губерні. За ім трэба было б старанна сачыць, бо гэта небяспечная асоба, ён мае, як мне вядома, надзвычайны ўплыў на сялян і як польскі патрыёт імкнецца ўсімі сіламі ўзбудзіць іх супраць гасудара, растлумачвае ім волю (г. зн. сялянскую рэформу. — *Г. К.*) такім чынам: што, кажа, вас звольнілі для таго, каб вы дрэнна жылі са сваімі памешчыкамі, каб вас пасля перахрысціць на рускую веру (г. зн. у праваслаўе. — *Г. К.*), чаго нашы сяляне страшэнна баяцца. Нядаўна гэты самы Марцінкевіч напісаў твор на народнай мове пад загалоўкам «Гутарка старога дзеда», дзе паказвае лёс Літвы ў вершах ад 1792 года да цяперашняга часу, выказваючы ўсе прыцясненні, якія толькі маглі быць на сялян,

---

[154] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 106.

і прыпісваючы ўсе гэтыя прыцясненні ўраду. Гэты твор ужо даволі распаўсюджаны і так пераканальна дзейнічае на сялян, што дзе толькі ён паявіўся, то сяляне пакінулі быць прывязанымі да гасудара, якога раней бласлаўлялі, і пачалі шукаць заступніцтва памешчыкаў. Цяпер яшчэ Марцінкевіч пераклаў на народную мову гімн „Божа, што Польшчы ...”»[155]

Бярнацкі не здолеў убачыць (або зрабіў гэта знарок) у Дуніне-Марцінкевічу буйнога дзеяча беларускай літаратуры, але, як нам здаецца, здольны царскі агент даволі правільна ўлавіў істотныя моманты ў палітычнай агітацыйнай дзейнасці Дуніна-Марцінкевіча сярод сялян. Якраз на такім супрацьпастаўленні «добрых памешчыкаў» і «злога цара», добрага, быццам, жыцця сялян у панскай Рэчы Паспалітай і цяжкага жыцця пад ярмом царскай Расіі і будавалася ўся агітацыйная дзейнасць шляхецкіх рэвалюцыянераў, да якіх прымыкаў Дунін-Марцінкевіч. Узмоцнена выкарыстоўваліся і рэлігійныя сюжэты, на якія даволі чула рэагавалі ў той час сяляне. Агітацыі шляхецкіх рэвалюцыянераў спрыяла тая акалічнасць, што якраз у першай палове XIX стагоддзя (г. зн. пасля далучэння Беларусі і Літвы да Расіі) у Расіі ў шмат разоў узмацнілася эксплуатацыя сялян. «Можна ўстанавіць адзін несумненны факт, — піша вядомы савецкі гісторык Н. М. Дружынін, — з канца XVIII стагоддзя, пад уплывам росту таварна-грашовых адносін, паншчына заходніх сялян стала няспынна і прагрэсіўна павялічвацца»[156]. Але польскія,

---

[155] Ліст гэты захоўваецца не ў справе пра Марцінкевіча, а ў другой справе (ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 293. Арк. 1–2), таму што Бярнацкі паведамляе ў ім і пра многіх іншых асоб.

[156] Дружинин Н. М. Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселева. М.; Л., 1946. Т. 1. С. 47.

беларускія і літоўскія шляхецкія рэвалюцыянеры вытлумачвалі гэтую акалічнасць, зразумела, не ростам таварна-грашовых адносін, не паглыбленнем крызісу прыгонніцкай гаспадаркі, а «маскоўскай» тыраніяй, уціскам цара.

Што ўяўляе сабою «Гутарка старога дзеда», аўтарам якой Бярнацкі лічыць Дуніна-Марцінкевіча?

Нам вядомы два выданні «Гутаркі». Адно з іх надрукавана выразным буйным шрыфтам і мае наступныя выхадныя даныя: «Выданне А. Курнатоўскага з Імберава пад Аборнікамі, шрыфтам М. Каменскага і К° ў Пазнані, 1861 г.»[157]. Другое ўяўляе сабою брашурку маленькага фармату з 12 лісткоў. Да «Гутаркі» гэтага выдання прыкладзены прыведзены вышэй верш У. Сыракомлі «Добрыя весці». У канцы брашуркі ёсць паметка: «Парыж, 1862 г., лютага 15 (27) дня»[158]. Аднак вядома, што ўсе гэтыя даныя былі толькі для таго, каб ашукаць царскую паліцыю. І царскія чыноўнікі разумелі гэта. «Па паперы і шрыфце, — пісаў адзін з чыноўнікаў, — можна заключыць, што верш гэты надрукаваны ў Варшаве, Вільні або якім-небудзь іншым горадзе Заходняй Расіі»[159].

Сапраўды, «Гутарка старога дзеда» друкавалася ў Беластоку польскім рэвалюцыянерам Браніславам Шварцэ, буйным прадстаўніком партыі «чырвоных». Расказваючы ў сваіх успамінах аб стварэнні ў 1861 годзе ў Варшаве першага рэвалюцыйнага камітэта, які ператварыўся потым у Цэнтральны нацыянальны камітэт, Б. Шварцэ піша: «Па даручэнні першапачатковага камітэта і прывезеным

---

[157] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 322. Арк. 78–83.
[158] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 438. Вопіс 1. Спр. 290. Арк. 18.
[159] Тамсама. Арк. 14.

Дэнелем[160] у Беласток шрыфтам я друкаваў у доме прыходскага ксяндза з Грынявіцкім па-беларуску лацінскімі літарамі рэвалюцыйную народную „Гутарку старога дзеда", якая павінна была пераканаць літоўскі (г. зн. беларускі. — *Г. К.*) народ, што толькі ад польскай Рэчы Паспалітай ён атрымае зямлю і волю»[161].

«Гутарка» атрымала ў 1861–1863 гадах даволі шырокае распаўсюджанне ў Беларусі і нават Літве. Яе чыталі і перапісвалі ад рукі. Царскія ўлады знаходзілі пракламацыю ў розных кутках краю і жорстка каралі тых, хто яе распаўсюджваў. У 1864 годзе за распаўсюджванне «Гутаркі» быў высланы на катаргу селянін Трокскага павета Хама Буткевіч[162]. Полацка-віцебскі архіепіскап даносіў 15 мая 1862 года, што «Гутарка» была вядома скрозь у Лепельскім павеце[163]. 24 мая 1862 года сяляне знайшлі некалькі экзэмпляраў «Гутаркі» на гандлёвай дарозе ў Мазырскім павеце. Трапіла яна нават у Себежскі павет. Паводле паказанняў прыказчыка маёнтка Прыпеш Себежскага павета Паўла Герасімава, «быў прыйшоў у маёнтак Прыпеш невядомы мне яўрэй з корабам, у якім былі розныя кнігі і іншыя дробязныя тавары, які прапанаваў мне невялікую ў некалькі аркушаў кніжачку

---

[160] Баляслаў Дэнель — член Варшаўскага рэвалюцыйнага камітэта.

[161] Szwarce B. Założenie Komitetu Centralnego w r. 1862 // W czterdziestą rocznicę powstania styczniowego. Lwów, 1903. S. 444. У другім месцы Шварцэ сведчыць, што апроч яго і Грынявіцкага ў друкаванні «Гутаркі» прымаў удзел А. С. Белакоз (Wydawnictwo materyałów do historyi powstania 1863–1864. Lwów, 1894. T. 4. S. 178).

[162] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 592. Арк. 223.

[163] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 303. Ч. 6. Арк. 120.

на польскай мове пад загалоўкам „Старога дзеда", за якую заплаціў дзесяць капеек»[164]. Аб пэўнай папулярнасці гэтага твора ў беларускім народзе сведчыць тое, што польскі лінгвіст Э. Кліх запісаў урывак з «Гутаркі» ў 1901 годзе ад маладога селяніна Навагрудскага павета[165].

Пры перапісванні «Гутарка» змяняла свой выгляд. Адзін з яе рукапісных варыянтаў носіць, напрыклад, цікавую назву «Гутарка старога дзеда 1861 року з Кобрыня»[166], другі называецца «Гутарка старога дзеда на Беларусі». Бытаваў таксама цікавы дакумент пад назвай «Ад старога дзеда». Гэта нібыта своеасаблівы уступ да «Гутаркі», напісаны добрай, лірычнай прозай:

«Хадзіў бай па сцяне...

Чы баіў, чы не?..

Вот так зачыналі нашы дзяды свае гутаркі, такая вот была прыказка. Цяпер дзяды нашы ўжо спяць сабе ў магілах тай маўчаць і не кажуць нам казак, не спяваюць песенак. Замаўчалі татулькі нашы... Замаўчалі яны, ляглі ў магілы і спяць сабе крэпка і ціха, а песенкі і гутаркі іх ходзяць па свету, шукаюць добрых людзей ды і зюкаюць з німі аб тым, што бывала некалі на свеце, і аб тым, што рабіць патрэба...»[167]

---

[164] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 214. Арк. 17.

[165] Klich E. Teksty białoruskie z powiatu Nowogródzkiego // Materyały i prace komisyi językowej Akademii umiejętności w Krakowie. Kraków, 1907. T. 2. S. 65–66.

[166] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1864. Спр. 106. Арк. 12–13.

[167] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 22. Арк. 10. Надрукавана літоўскім гісторыкам А. Янулайцісам у зб.: Karo archyvas. Kaunas, 1925. T. 1. P. 216. Тамсама змешчаны і тэкст «Гутаркі старога дзеда» (с. 216–219).

Якое вялікае значэнне надавалі «Гутарцы» шляхецкія рэвалюцыянеры, можна бачыць з таго, што М. Акялайціс пераклаў яе (з нязначнымі зменамі) на літоўскую мову. Палітоўску яна называлася «Pasaka senelio» («Гутарка старога»). У маі 1861 года была зроблена спроба надрукаваць літоўскі варыянт «Гутаркі» ў Мемелі вялікім тыражом (10 тыс. экз.). Аднак пруская паліцыя перахапіла пракламацыю і перадала яе ў рукі царскіх улад[168].

У літаратуры выказвалася меркаванне, што «Гутарка старога дзеда» належыць пяру В. Каратынскага. Гэтага пункту гледжання трымаўся, у прыватнасці, Я. Ф. Карскі[169]. Аднак вучоны нічога не сказаў, на чым ён грунтаваўся. А. П. Смірноў, кажучы аб аўтарстве В. Каратынскага, спасылаецца на ўспаміны Б. Шварцэ[170], але ў мемуарах польскага рэвалюцыянера, на жаль, нічога не гаворыцца аб тым, хто быў аўтарам «Гутаркі».

Наколькі можна меркаваць па беларускіх вершах В. Каратынскага, што дайшлі да нас, ён пісаў больш лёгкім, рытмічным вершам, чым той, якім напісана «Гутарка». Акрамя таго, нам невядомы факты, якія б засведчылі ўдзел В. Каратынскага ў нацыянальна-вызваленчым руху.

Вось чаму трэба з належнай увагай паставіцца да паведамлення Бярнацкага аб тым, што «Гутарка старога дзеда» напісана В. Дуніным-Марцінкевічам. З пункту гледжання фармальнай паэтыкі, «Гутарка» вельмі нагадвае творчую манеру аўтара «Гапона» (непаслядоўна вытрыманы рытм верша, вялікая колькасць парных жаночых рыфмаў).

---

[168] ЦДГАМ [ДГА Літвы]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 165.

[169] Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Вып. 3. С. 72, 86–87.

[170] Смирнов А. Ф. «Мужицкая правда». С. 17.

Жанр гутаркі (павучальнае апавяданне вопытнага чалавека, які шмат пабачыў) ужываўся пісьменнікам і раней (гл. «Гутарку Навума» ў «Быліцах, расказах Навума»). Цікава, што першыя радкі «Гутаркі старога дзеда» амаль даслоўна паўтараюць вядомыя радкі з оперы «Сялянка» («Гэй, скажыце, добры людзі! Што гэта на свеце будзе?»). Разам з тым пытанне аб аўтарстве «Гутаркі» нельга лічыць канчаткова вырашаным. Не выключана таксама, што яна была вынікам калектыўнай творчасці.

«Гутарка старога дзеда» напісана ў папулярнай у той час форме агітацыйнай літаратуры для сялян. Адначасова з гэтай «Гутаркай» бытавалі «Гутарка двух суседаў», «Гутарка Данілы са Сцяпанам» і інш.

Апавяданне ў «Гутарцы старога дзеда» вядзецца ад імя ўбеленага сівізною, умудронага жыццём старога чалавека, да слоў якога мімаволі павінна была прыслухоўвацца сялянская моладзь. (Карціну глыбокай павагі да старых у вёсцы В. Дунін-Марцінкевіч намаляваў у «Вечарніцах».)

Здаровай асновай «Гутаркі» з'яўляецца рэзкая крытыка царскіх улад і заведзеных імі парадкаў. Аўтар пракламацыі абрушваецца на запасныя сельскія магазіны, рэкрутчыну, рэлігійныя прыцясненні з боку ўлад, на разбойнікаў-чыноўнікаў:

Вялеў сыпаць магазыны,
Нібы для гэтай прычыны,
Каб, як здарыцца патрэба,
Мужык мог там дастаць хлеба.
А як сам стаў ваяваць,
Вялеў магазын забраць,
У абоз вязці ўсё збожжа,
А народ хоць гінь, нябожа!

А як возьмець усё з хаты,
Яшчэ сам ідзі ў салдаты,
Кідай жонку, дзеткі ў дому,
Едзь ў калодцэ да прыёму.
Як войска ўжо не трэба,
То салдат сам шукай хлеба:
Шлець усіх дамоў — не пытае,
Ці каторы дом свой мае.
Толькі вяліць не шатацца,
На прыказ той час яўляцца:
Насі боты ды галіся,
Хоць зямлю грызі — жывіся…

Аўтар «Гутаркі» здолеў знайсці правільныя, патрэбныя словы для таго, каб намаляваць яркую карціну ўціску народа царскімі ўладамі.

У «Гутарцы» яскрава выказаны сімпатыі да польскага і французскага народаў. Ганебны трэці падзел Польшчы «Гутарка» правільна асвятляе як змову паміж царскім і прускім урадамі ў той момант, калі польскі народ знайшоў у сабе сілы для дэмакратычных пераўтварэнняў.

Разам з тым аўтар «Гутаркі» дапускаў ідэалізацыю цяжкага мінулага беларускага народа пад уціскам панскай Польшчы.

Аўтар «Гутаркі» не дазваляе сабе ніводнага дрэннага слова пра паноў, старанна засцерагае іх ад справядлівых народных нараканняў. У прыватнасці, ён імкнецца давесці, што рабаўнічая сялянская рэформа 1861 года — справа рук аднаго цара, а паны да яе не маюць ніякага дачынення.

Вайну 1812 года і Крымскую вайну аўтар няправільна называе вайной «пранцуза» за тое, каб аднавіць незалежную

Польшчу і даць свабоду народу. Гэтым самым падтрымлівалася ілюзія, якая існавала сярод часткі сялян, аб тым, што «французы» могуць прымусіць цара даць «свабоду». «Цікава, аднак, — пісаў П. А. Крапоткін, — да якой ступені моцная традыцыя вялікай рэвалюцыі: сярод сялян ішла чутка, што Напалеон III пры заключэнні міру пасля Севастопальскай вайны запатрабаваў ад Аляксандра II даць волю. Я часта чуў гэта. Нават напярэдадні вызвалення сяляне сумняваліся, каб волю далі без націску збоку»[171]. Акрамя таго, трэба мець на ўвазе, што самі шляхецкія рэвалюцыянеры вельмі разлічвалі на актыўную дапамогу французскага ўрада ў справе аднаўлення незалежнай Польшчы.

Увесь сэнс «Гутаркі» зводзіўся да таго, каб сяляне падтрымлівалі вызваленчую вайну польскага народа.

Як бы там ні было, але «Гутарка» рабіла ва ўмовах 1861–1863 гадоў пэўную карысную справу. Яна рассейвала царысцкія ілюзіі сялян і заклікала падтрымліваць прагрэсіўны польскі вызваленчы рух. Аднак у яе былі два вялікія недахопы: 1) яна не заўсёды гаварыла народу праўду і, рассейваючы адны, спрыяла ўзнікненню ў народзе іншых шкодных ілюзій; 2) «Гутарка» не насцярожвала народ, а раззбройвала сялян перад панамі. У гэтым карэннае адрозненне паміж «Гутаркай» і «Мужыцкай праўдай». Гэтае адрозненне вызначалася розніцай у светапоглядзе такіх людзей, як К. Каліноўскі і В. Дунін-Марцінкевіч, калі дапусціць, што «Гутарку» напісаў В. Дунін-Марцінкевіч.

Гімн «Boże coś Polskę», аб перакладзе якога на беларускую мову пісаў у сваім даносе Бярнацкі, быў у пачатку 60-х

---

[171] Кропоткин П. А. Записки революционера. М.; Л., 1933. С. 83.

гадоў вельмі папулярны. Гэта былі своеасаблівыя пазыўныя, па якіх пазнавалі адзін аднаго прыхільнікі польскага вызваленчага руху. Ніводная патрыятычная дэманстрацыя ў 1861 годзе ў Польшчы, Беларусі і Літве не абыходзілася без таго, каб не спяваўся гэты гімн. Яго называлі нават «Марсельезай 1863 года». У той жа час гімн з'яўляецца паказальнікам пэўнай долі містыцызму, які быў уласцівы польскаму руху. Усе варыянты гімна цяжка пералічыць. Былі польскія тэксты, прыстасаваныя для ўмоў Беларусі, Літвы і нават Расіі («Boże coś Rosję...»), былі пераклады на літоўскую і беларускую мовы.

Аб перакладзе гімна на «гаворку, якой карыстаюцца прасталюдзіны ў Мінскай губерні і Беларусі», паведамляў штаб-афіцэр па Мінскай губерні палкоўнік Рэйхарт у рапарце ў III аддзяленне ад 5 лістапада 1861 года. Вось пачатак гэтага тэксту:

Божа, што Польшчы праз доўгія векі
Даваў чэсць, славу, сцярог ад няволі
І, не жалеўшы айцоўскай апекі,
Даваў пацеху ў няшчаснай долі,
Перад алтары малітву прыносім:
Айчызну, вольнасць вараці нам —
просім[172].

Змест гімна арганічна зліваецца са зместам «Гутаркі старога дзеда» і «Добрых весцяў» Сыракомлі. Гэта вынік аднаго і таго ж светапогляду. Нам вядомы і другі варыянт перакладу гімна на беларускую мову, зроблены, відаць, А. Вярыгам-Дарэўскім і пашыраны ва Усходняй Беларусі. Адно з адрозненняў гэтага варыянту было ў тым, што ў ім

[172] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 449. Арк. 2.

упаміналася папулярная ў той час ва Усходняй Беларусі Бялыніцкая Божая маці (у мінскім варыянце фігуравала Вастрабрамская Божая маці). Віцебскі варыянт быў надрукаваны ў нелегальнай брашурцы пад назвай «Песні набожныя» (8 маленькіх старонак, а ў канцы заўвага, якая павінна была збіць з панталыку царскіх чыноўнікаў: «Дазваляецца друкаваць. Варшава 17 (29) лістапада 1861 г. Старшы цэнзар А. Функенштэйн»)[173]. Аднак звестак аб папулярнасці гімна сярод беларускіх сялян у нас няма. Патрыятычныя маніфестацыі, у час якіх спяваўся гімн, шляхецкім рэвалюцыянерам так і не ўдалося перанесці з горада ў вёску, акрамя, можа, некалькіх выпадкаў у Літве.

Падагульняючы сказанае, прыходзім да высновы, што, калі верыць сведчанню Бярнацкага, В. Дунін-Марцінкевіч з уласцівай яму вялікай энергіяй выступаў напярэдадні паўстання ў падтрымку польскага вызваленчага руху. Аднак гэта дзейнасць праходзіла ў рэчышчы шляхецка-рэвалюцыйнай, а не рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні.

Як жа рэагавалі царскія ўлады на гэтую дзейнасць?

11 кастрычніка 1861 года пераказ даносу Бярнацкага быў пасланы III аддзяленнем віленскаму генерал-губернатару Назімаву «на разгляд»[174]. Назімаў, які праводзіў у гэты час палітыку паддобрывання да мясцовага дваранства, не надаў гэтаму паведамленню асаблівага значэння. Мінская губерня, дзе меў сталае пражыванне Марцінкевіч, не ўваходзіла тады ў склад Віленскага генерал-губернатарства, і Назімаў не вельмі хваляваўся. Аднак цар, заслухаўшы справаздачу

[173] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 303. Ч. 6. Арк. 87–92.

[174] Тамсама. Спр. 106. Арк. 5–6.

III аддзялення за 1861 год, зноў зацікавіўся гэтым фактам і «изволил высочайше повелеть: о последующем донести» (арк. 9). У сакавіку 1862 года галоўнаўпраўляючы аддзяленнем князь Далгарукаў паслаў Назімаву напамінак, на які генерал-губернатар адказаў у лісце ад 30 сакавіка: «Ніякага асаблівага распараджэння мною зроблена не было, апроч агульнага — аб назіранні за нераспаўсюджваннем падобных адозваў у даверaным мне краі» (арк. 8). 15 жніўня 1862 года пра адказ Назімава сказалі цару, і той, відаць, палічыў яго здавальняльным. Такім чынам, пагроза, што была навісла над В. Дуніным-Марцінкевічам, гэтым разам абмінула яго, і пісьменнік, можа, нават і не здагадваўся, якая небяспека яму пагражала.

Але, відаць, усё-такі правільна кажуць, што бяда ніколі не ходзіць адна. У той самы час, калі ў генерал-губернатарскай канцылярыі ў Вільні распячатвалі сакрэтны пакет з III аддзялення пра данос Бярнацкага, у Мінску губернатарам была атрымана папера без подпісу. Гэта быў новы — ананімны — данос на Марцінкевіча, які толькі што вярнуўся з Варшавы. Даноса нам адшукаць не ўдалося, але вось як аб гэтым здарэнні было запісана праз чатыры гады ў следчай справе пісьменніка: «... у кастрычніку 1861 года на памешчыка Марцінкевіча было невядома кім узведзена абвінавачанне, што ён, вярнуўшыся з Варшавы ў Вільню, пераслаў адсюль жонцы сваёй пакет з недазволенымі рэчамі і паперамі праз яўрэя Шэвеля Лейнара, але пры вобыску ў фальварку Люцынкі ў самы дзень прыбыцця туды яўрэя Лейнара нічога падазронага не знойдзена, акрамя аднаго друкаванага і двух літаграфаваных рэвалюцыйных гімнаў; жонка ж і сам Марцінкевіч паказалі, што ў пакеце былі каснікі, хусцінкі і г. д., купленыя Марцінкевічам у Варшаве

для дочак»[175]. І гэтая справа была таксама пакінута пакуль што без выніку, хаця і генерал-губернатар, і губернатар добра запомнілі, як мы ўбачым ніжэй, імя неспакойнага ўладальніка хутара Люцынка. За тое, што пісьменнік знаходзіўся яшчэ на свабодзе, ён павінен быў дзякаваць непаваротлівай царскай бюракратычнай машыне: ні генерал-губернатар, ні III аддзяленне не знайшлі часу паведаміць пра данос Бярнацкага мінскаму губернатару; апошні ў сваю чаргу, відаць, палічыў нявартым асаблівай увагі ананімны данос.

Аднак збіралася новая хмара — гэтым разам зусім з іншага боку: царскія ўлады звярнулі ўвагу на дзейнасць дачкі Дуніна-Марцінкевіча.

3

Дачка В. Дуніна-Марцінкевіча, Каміла, была добра вядома сярод інтэлігенцыі Мінска ў канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў. З самага пачатку ўзнікнення тут рэвалюцыйнай арганізацыі яна прымала ў яе рабоце актыўны ўдзел. Аб гэтым у адзін голас гавораць і мемуарысты, і архіўныя дакументы. Адзначаючы асаблівую ролю члена Літоўска-Беларускага рэвалюцыйнага камітэта Яна Козела, які потым праславіўся ў Польшчы пад імем палкоўніка Скалы, у стварэнні мінскай арганізацыі, польскі гісторык (і сучаснік тых падзей) Б. Лімановскі побач з яго імем называе імя Камілы Марцінкевіч: «Ян Козел згуртаваў патрыётаў Мінска ў адзін дзейсны гурток, у якім з найбольшай энергіяй браліся за рабо-

[175] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 689. Арк. 11.

ту маладыя ўрачы. Збіраліся яны галоўным чынам у невялікім гасцінным салоне Камілы Марцінкевіч, дачкі вядомага беларускага пісьменніка. І там народная (ludowa) думка мела гарачых апосталаў»[176]. Яшчэ больш цёплыя радкі прысвячае ёй В. Валодзька (Кошчыц), удзельнік мінскай арганізацыі: «У Мінску найбольш выдатную ролю сярод жанчын, што займаліся грамадскай справай, адыгрывала панна Каміла Марцінкевіч, дачка аўтара „Гапона" і іншых больш дробных паэтычных беларускіх твораў. Гурток беднай, з нічым не прыкметным знешнім выглядам настаўніцы музыкі згуртаваў усё, што было самага патрыятычнага. Прапаведуючы, аж да экзальтацыі, самыя прагрэсіўныя прынцыпы, уладаючы самым лепшым сэрцам і высокай маральнасцю, яна была непараўнальнай сяброўкай і прытым, маючы мужчынскую адвагу, з'яднала тую сілу і энтузіязм, сляды якіх хаваліся ў традыцыях мясцовых пачуццяў. Найбольшай заслугай было тое, што ў яе ўпершыню пачалі збірацца людзі, якія належалі да самых розных пластоў, не выключаючы нават бедных рамеснікаў»[177].

Не менш ярка малююць Камілу Марцінкевіч і архіўныя дакументы.

Патрыятычныя дэманстрацыі пачаліся ў Мінску ў сярэдзіне чэрвеня 1861 года — праз месяц пасля таго, калі былі праспяваны першыя рэвалюцыйныя гімны ў Вільні. 22 чэрвеня палкоўнік Рэйхарт перадаў у III аддзяленне «спіс асоб, якія бралі ўдзел у спяванні гімна» ў Мінску. Першым у гэтым спісе стаяла прозвішча дачкі Дуніна-Марцінкевіча:

---

[176] Limanowski B. Historya powstania narodu polskiego 1863 i 1864 r. 2 wyd. Lwów, 1909. S. 171–172.

[177] Koszczyc W. Wspomnienia z powstania województwa Mińskiego w r. 1863 // Polska w walce. Kraków, 1875. S. 195.

«1. Дзяўчына Марцінкевіч, дачка былога настаўніка (?), яна займаецца выкладаннем урокаў музыкі і першая пачала спяваць гімн 11 чысла ў кафедральным касцёле»[178]. А 1 ліпеня ў III аддзяленні была заведзена ўжо спецыяльная справа «Аб дзяўчыне Марцінкевіч у Мінску, якая звыш меры выказвае польскі патрыятызм»[179].

«Мы даўно вас чакалі...» — такімі словамі сустрэла Каміла мінскага паліцмайстара, які прыйшоў яе арыштоўваць.

Царскія ўлады ўжылі ў дачыненні да дзяўчыны агідныя, езуіцкія меры — яны абвясцілі яе вар'яткай. Нельга без хвалявання чытаць данясенне ад 23 чэрвеня 1861 года жандарскага палкоўніка Рэйхарта, бясстраснае пяро якога захавала для нас карціну допыту Камілы ў кабінеце мінскага губернатара графа Келера. Дзяўчына смела прызналася, што прымала ўдзел у спяванні гімна і насіла жалобу па забітых у Варшаве. «Пасля гэтага граф заўважыў дзяўчыне Марцінкевіч, што асаблівая страсць яе да спявання, якая даходзіць аж да таго, што яна дазваляе сабе спяваць у касцёле песні, не ўстаноўленыя царкоўнымі правіламі і без дазволу духавенства, і асабліва неадольная агіда да светлых колераў прымушае яго сумнявацца ў стане яе здароўя, затым запрасіў доктара багадзельні праверыць пульс дзяўчыны Марцінкевіч; калі ж урач абвясціў, што пульс звычайны, то губернатар сказаў, што гэта пераконвае яго ў тым, што хвароба дзяўчыны Марцінкевіч нейкага асаблівага характару, даўшы пры гэтым зразумець, што лічыць яе не ў цвярозым розуме» (арк. 3–4).

---

[178] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 323. Арк. 7.
[179] Тамсама. Спр. 322.

Адпраўка Камілы ў бальніцу для вар'ятаў выклікала ў Мінску цэлую дэманстрацыю. Вось як аб гэтым паведамляе Рэйхарт у рапарце ад 29 чэрвеня: «Калі паводле распараджэння губернатара дзяўчына Марцінкевіч была змешчана ў бальніцу багадзельні, то ў той жа час з'явіліся да яе наведвальнікі, што пасля, аднак, было забаронена; затым увечары сабраўся да варот багадзельні натоўп лікам больш за 100 чалавек; у натоўпе гэтым між іншымі прыкметны былі жанчыны, апранутыя ў жалобу, і некалькі студэнтаў, што былі тут у водпуску... Дзяўчына Марцінкевіч прагульвалася па дарожках і размаўляла з публікаю цераз плот, а публіка ў доказ спачування кідала ёй букеты. На другі дзень гэта паўтарылася, а ўвечары сабраўся яшчэ большы натоўп; некаторыя з мужчын пералезлі цераз плот, вынялі некалькі планак, так што многія зайшлі на двор. З вялікімі цяжкасцямі ўдалося наглядчыку багадзельні ўгаварыць публіку пайсці» (арк. 6–8).

Пераканаўшыся ў тым, што яго бесчалавечны ўчынак прыводзіць да непажаданых вынікаў і зусім не спрыяе супакаенню жыхароў Мінска, «Келер згадзіўся вызваліць дзяўчыну Марцінкевіч з бальніцы з тым, каб яна дала пісьмовае тлумачэнне ў тым, што ўчынкі яе зроблены былі ёю ў прыпадку хваробы, і каб хто-небудзь узяў яе на парукі за горад і яна не прыязджала б без дазволу»[180].

---

[180] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 322. Арк. 8–9. Каміла своеасабліва адпомсціла губернатару за ўсе яго здзекі: з акна яе кватэры на галаву графа Келера былі выліты нечыстоты (Цэнтральны дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў СССР, у далейшым — ЦДВГА (цяпер Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў у Маскве, у далейшым — РДВГА. — *Рэд.*). Фонд ВУА. Спр. 1310. Арк. 191).

Актыўныя выступленні Камілы Марцінкевіч у падтрымку нацыянальна-вызваленчага руху польскага народа, а таксама рэпрэсіі, на якія яе асудзілі царскія ўлады, прынеслі ёй шырокую папулярнасць. Ва ўспамінах старшыні мінскай следчай камісіі Меера мы знаходзім згадку аб тым, што польскія рэвалюцыянеры прыслалі ёй з Варшавы памятны падарунак[181].

Неўзабаве адчуў незадаволенасць царскіх улад і сам В. Дунін-Марцінкевіч. У пачатку 1862 года на стале перад генерал-губернатарам Назімавым апынулася наступнае пісьмо часовага ваеннага губернатара Мінскай губерні генерала Кушалёва ад 26 снежня 1861 года: «Памешчык Мінскай губерні Вікенцій Іванаў Марцінкевіч, тлумачачы, што ён мае патрэбу адлучыцца ў Ковенскую губерню па справе верніцы яго, графіні Грабоўскай... і ў гарады Віцебск і Вілейку... і падаючы даручэнні, дадзеныя яму на хадайніцтва па адзначаных справах, просіць аб выдачы яму на накіраванне ў згаданыя месцы віда на гадавы тэрмін.

Дочкі памешчыка Марцінкевіча ўдзельнічалі ў спяванні тут забароненых гімнаў, а наконт самога Марцінкевіча атрымана было ў мінулым кастрычніку месяцы указанне аб перасылцы ім з г. Вільні ў Мінскую губерню недазволеных вестак, якія датычылі беспарадкаў, што адбываліся ў той час у тутэйшым краі, хаця між іншым па гэтым апошнім прынятымі мерамі нічога станоўчага не выяўлена.

Зрабіўшы распараджэнне аб выдачы памешчыку Марцінкевічу віда на накіраванне ў Віленскую і Ковенскую губерні

---

[181] Мейер П. М. Записки. Подготовка к польскому мятежу в Минской губернии. Минск, 1908. С. 14.

на гадавы тэрмін, маю гонар пра вышэйпададзенае, з засцярогі, паведаміць Вашаму высокаправасхадзіцельству»[182].

Прачытаўшы гэта, Назімаў быў раззлаваны. Па-першае, ён яшчэ не паспеў забыць імя Марцінкевіча, і тое, што паведаміў пра яго Кушалёў, толькі пацвярджала, што гэта небяспечны чалавек. Па-другое, і ў «даверaных» яму губернях ужо без таго хапала небяспечных людзей, і ён не ведаў, што з імі рабіць. І нарэшце, Назімаў лічыў, што Кушалёў, перш чым выдаваць пашпарт такому небяспечнаму чалавеку, павінен быў папрасіць яго, Назімава, дазволу.

Але які ж быў гнеў гэтага саноўніка, калі літаральна праз некалькі дзён яму прынеслі новы ліст з Мінска — ад 12 студзеня. Гэты раз пісаў мінскі віцэ-губернатар Лучынскі. Ён забяспечыў «гэтага чысла за № 11 гадавым пашпартам дваранку Камілію Вікенцеўну Марцінкевіч на накіраванне ў г. Вільню і Віленскую губерню, дзе яна мае намер заняцца выкладаннем урокаў музыкі».

Зразумела, генерал-губернатар мог бы проста ўстанавіць паліцэйскі нагляд над Марцінкевічамі, але раззлаваны Назімаў не спыніўся нават перад канфліктам з мінскімі ўладамі. 20 студзеня з генерал-губернатарскай канцылярыі паляцеў суровы загад віленскаму і ковенскаму губернатарам: «...прызнаючы знаходжанне іх у даверaным мне краі шкодным... аб'явіць, што ўезд... ім забаронены, а потым распарадзіцца аб неадкладнай высылцы іх назад у г. Мінск, абавязаўшы ў тым падпіскамі».

---

[182] Дело по отношению минского временного военного губернатора о получивших дозволение на въезд в этот край коллежском секретаре Чепелинском, дворянах: Викентии и Камилле Марцинкевичах (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1861. Спр. 78. Арк. 3–4.

Толькі тады і паведаміў Назімаў Кушалёву пра весткі адносна Марцінкевіча, атрыманыя з III аддзялення. Апраўдваючы свой загад, ён пісаў у лісце ад 20 студзеня 1862 года, што падзеі вызваленчага руху ў Ковенскай, Віленскай і Гродзенскай губернях ставяць яго самога «ў неабходнасць выдаляць з краю людзей нядобранамераных у месцы іх пастаяннага знаходжання або радзімы з забаронай адлучак, каб прадухіліць распаўсюджванне шкодных падбухторванняў», і прасіў аб забароне ў цяперашні час падобным людзям уезду ў даверанныя яму губерні.

Між тым з атрыманым пашпартам Дунін-Марцінкевіч спакойна накіроўваецца ў Ковенскую губерню і тут, ад паліцыі, даведваецца аб назімаўскім загадзе. Высланы адтуль, ён накіроўвае скаргу ў Міністэрства ўнутраных спраў, у якой хадайнічае аб адмене гэтага распараджэння. 9 сакавіка 1862 года скарга пісьменніка была пераслана таму ж Назімаву. У сваім адказе міністру ўнутраных спраў ад 30 сакавіка Назімаў падрабязна апісаў «шкодную дзейнасць» Дуніна-Марцінкевіча. «Хадайніцтва Марцінкевіча пра адмену гэтага распараджэння не падлягае з майго боку задавальненню», — гаварылася ў заключных радках гэтага дакумента. Такім чынам, апошні шлях быў адрэзаны. Кола замкнулася. Цкаванне пачалося.

А падзеі разгортваліся далей. Застаўшыся ў Мінску, Каміла Марцінкевіч і не думала спыняць сваёй рэвалюцыйнай дзейнасці. Хутка яе імя зноў з'явілася на старонках жандарскіх данясенняў.

Узмацніліся рэпрэсіі да ўдзельнікаў вызваленчага руху ў Польшчы, і праз Мінск пацягнуліся першыя партыі асуджаных варшавян. Мінчане горача спачувалі гэтым закава-

ным у кайданы ахвярам царызму. Адна такая партыя з 10 чалавек (у асноўным — студэнтаў) прыбыла ў Мінск 9 лютага 1862 года і была размешчана на днёўку за горадам у двары батальёна ўнутранай варты. Туды да камандзіра батальёна з'явілася Каміла Марцінкевіч і, як пісаў Рэйхарт у данясенні ад 17 лютага 1862 года, «пераканальна прасіла пусціць яе да арыштаваных... але ўсё гэта ёй не памагло, а выпрасіла толькі дазволу пачаставаць маладых людзей, і на гэту справу была ёй адведзена зусім асобна ад дома, дзе змяшчаліся арыштаваныя, кухня. Дзяўчына Марцінкевіч прывезла кухарку і правізію, варыла, пякла са здзіўляльнай стараннасцю, але пад каравулам, прынесла і пірожнае з цукровым надпісам: „Чэсць вам", аднак строгі палкоўнік гэта знішчыў... Пасля, калі ішла другая партыя, дзяўчына Марцінкевіч зноў прыязджала да батальённага камандзіра і прасіла перадаць віно, цыгарэты і інш. Праз некалькі дзён праходзіла зноў партыя з 5 чалавек і была сустрэта натоўпам да 100 чалавек, але, каб унікнуць усялякіх сутычак, на другі дзень рана адпраўлена далей»[183].

[183] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 322. Арк. 11–12. Паводле ўспамінаў, К. Марцінкевіч уваходзіла ў Камітэт дапамогі выгнаннікам з Царства Польскага, які быў створаны ў Мінску (Kowalewska Z. Obrazki mińskie: 1850–1863. Wilno, 1912. S. 90). У гэтых жа ўспамінах апісваецца цікавы выпадак, калі група жанчын, што вечарам выйшла з Мінска па Койданаўскім тракце для сустрэчы ссыльных, раптам была акружана войскам. Афіцэр адмовіўся даваць якія-небудзь тлумачэнні. «Спусцілася халодная асенняя ноч, і ўстрывожаныя жанчыны, тулячыся адна да адной, расселіся на траве, з непакоем чакаючы далейшага працягу гэтай нямой сцэны. Дзве актыўнейшыя тагачасныя мінскія дзяячкі, панны Марцінкевіч і Аколава, поўныя энергіі і бадзёрасці, падтрымлівалі адвагу іншых. Так прабавілі ўсю ноч. Калі пачало развідняцца, кардон салдат, што акружаў іх, таксама моўчкі расступіўся, даючы свабодны праход у горад». Рэпрэсіі царскіх улад у дачыненні да мінчан, што аддавалі даніну павагі польскім патрыётам, апісаны таксама ў карэспандэнцыі: Генерал-губернатор Кушелев-Минский и победы его // Колокол. 1862. № 141.

Вельмі важныя для нас радкі данясення Рэйхарта, у якіх царскі жандар вытлумачвае рэвалюцыйны настрой Камілы ўплывам яе бацькі — В. Дуніна-Марцінкевіча: «Шкодная гэтая дзяўчына Марцінкевіч, і варта было б яе выдаліць, а між тым вышэйшае мясцовае начальства дазволіла ёй займацца навучаннем дзяцей маладога ўзросту, і можна сабе ўявіць, што яна ім прапаведуе. Ад нараджэння ёй 26 гадоў[184], характару дзёрзкага і рашучага, а ідэі пераняла ад бацькі. Гэты дробнамаёнткавы памешчык Мінскага павета піша і распаўсюджвае патрыятычныя творы, нядаўна ездзіў у Варшаву, а вярнуўшыся, адправіўся з дазволу часовага ваеннага губернатара Мінскай губерні ў губерні Ковенскую, Віленскую, Віцебскую; мэта гэтай паездкі, як трэба меркаваць, — распаўсюдзіць рэвалюцыйныя ідэі, асабліва ў губерні Віцебскай. Сярод выдадзеных ім твораў адзін на мясцовай гаворцы пад загалоўкам „Сялянка", вельмі падобны па стылі да... літаграфаваных вершаў, што з'явіліся тут (прыкладзена «Гутарка старога дзеда». — *Г. К.*) і, напэўна, належаць яму ж, дзёрзка супраць урада і з мэтай падбухторвання сялян напісаны ўласна для простага народа іх мовай, якой Марцінкевіч добра валодае»[185].

Такім шляхам у III аддзяленне зноў трапілі факты пра дзейнасць Дуніна-Марцінкевіча супраць царызму, і зноў яго імя звязвалася з «Гутаркай старога дзеда». Гэты раз упраўляючы аддзяленнем Патапаў у лісце да Рэйхарта ад 1 сакавіка 1862 года распарадзіўся: «Звесткі пра дзяўчыну Марцінкевіч і пра бацьку яе прапаную вам па даручэнні п. генерал-ад'ютанта

---

[184] У паказаннях ад 12 жніўня 1863 года К. Марцінкевіч адзначыла, што ёй 22 гады (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 191).

[185] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1861. Спр. 322. Арк. 12–13.

кн. Далгарукава прадаставіць світы яго вялікасці генерал-маёру Кушалёву з тым, ці не знойдзе ён неабходным прыняць якія-небудзь меры супраць дзеянняў гэтых асоб» (арк. 23).

Між тым становішча ў Мінску абвастралася. На лістапад 1862 года былі прызначаны дваранскія выбары. Па прыкладзе дваран Падольскай губерні мінскае дваранства збіралася падаць цару адрас аб далучэнні Мінскай губерні да Царства Польскага. Дваране, якія яшчэ загадзя прыбылі ў горад, пачалі рабіць нарады «па кватэрах».

Афіцыйны сход адкрыўся 17 лістапада. Першым пунктам на парадку дня было пытанне аб адрасе. Губернскі прадвадзіцель дваранства зачытаў перасцерагальны ліст губернатара Кажэўнікава. Тады дваране разам са сваімі прадвадзіцелямі падпісалі пратакол, у якім адзначалася, што яны адмаўляюцца ад свайго намеру толькі пад націскам сілы. Гэты пратакол нарабіў не менш шуму, чым адрас. Выбары былі адменены.

У гэтых падзеях выявіліся рэакцыйныя бакі польскага шляхецкага руху ў Беларусі. Польскія памешчыкі і дваране патрабавалі далучэння беларускіх зямель да Польшчы, не пытаючы думкі народа. Цікава, што сярод мінскіх рэвалюцыянераў знайшліся людзі, якія адразу ж далі належную ацэнку гэтым падзеям. Якраз у тыя дні, калі дваране падпісвалі свой пратакол, у Мінску з'явілася песня. Тэкст яе, перапісаны ад рукі ва многіх экзэмплярах, можна было бачыць на сценах дамоў. Гэта была славутая польская рэвалюцыйная песня «О, чэсць вам, панове магнаці...». Словы песні напісаў яшчэ ў сярэдзіне 30-х гадоў Густаў Эрэнберг[186].

---

[186] Між іншым, ёсць даныя, што паэт у 1860-х гадах жыў у Беларусі і ў 1862 годзе арыштаваны ў Брэсце (Zbiór poetów polskich XIX w. Warszawa, 1961. Ks. 2. S. 849).

Прасякнутая нянавісцю да паноў і прэлатаў, усіх здраднікаў бацькаўшчыны, яна гучала вялікай верай у народныя сілы. Рашучае, апошняе слова заўсёды скажа народ — вось асноўны яе сэнс. У свой час, у ссылцы, яе пачуў М. Г. Чарнышэўскі. А ў часы Айчыннай вайны яна стала афіцыйным гімнам польскай Арміі Людовай. Трэба сказаць, што гэтая песня як нельга лепш падыходзіла да мінскіх падзей восені 1862 года. Цяпер яна называлася «Да паноў пратакалістаў», г. зн. была непасрэдна накіравана супраць мінскіх дваран, што спрабавалі навязаць народу сваю волю:

Gdy naród na pole wystąpił z orężem,
Panowie na sejmach prawili,
Kiedy lud wołał: umrzem lub zwyciężym! —
Panowie o czynszach radzili.

O, cześć wam, panowie magnaci,
Za naszą niedolę, kajdany!
O, cześć wam, hrabiowie, książęta, prałaci,
Za kraj nasz krwią bratnią zbryzgany! і г. д.

Каб яшчэ лепш прыстасаваць песню да ўмоў Беларусі, звычайныя словы «Gdy lud polski» ў трэцім радку першага куплета зменены ў гэтым варыянце на «Kiedy lud», хоць гэта парушае рытм. Адпаведна замест «zza Bugu» ў апошнім радку другога куплета з'явілася «znad Bugu». Такі адказ атрымала мінскае панства з боку сапраўдных рэвалюцыянераў.

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР [ДГА Літвы] захоўваецца даволі вялікая справа «Аб мінскіх дваранскіх выбарах». У ёй, сярод іншых дакументаў, змяшчаюцца спісы ўсіх 224 дваран, якія падпісалі

пратакол. Прозвішча В. Дуніна-Марцінкевіча сярод іх няма. І калі імя пісьменніка прыгадваецца ў гэтай справе, дык зусім у іншай сувязі. Пісьменнік і яго дачка фігуруюць у спісах ненадзейных асоб, «якія наогул выяўляюць крайняе імкненне да варожых дзеянняў супраць урада». Мы не даведаемся з гэтых спісаў нічога новага пра дзейнасць Марцінкевіча («Дзейнічае скрытна, каб выклікаць неспакой, стараючыся распаўсюджваць паміж ніжэйшым слоем народа ўсялякія абуральныя адозвы, якія ён тайна выдае на простанароднай гаворцы»[187]), затое ёсць некаторыя падрабязнасці наконт Камілы (у спісе яна чамусьці названа Марыяй): «...была галоўнаю кіраўніцаю спеваў і па распараджэнні былога губернатара графа Келера часова ўтрымлівалася для ўціхамірання ў гарадской бальніцы; потым была абавязана не адлучацца з маёнтка, але ў далейшым графам Келерам дазволена ёй знаходжанне ў Мінску; адкрывала па святах на сваёй кватэры дамашнюю школу для навучання гімнам» (арк. 51).

У пісьме да Назімава (Мінская губерня была падпарадкавана яму за тры месяцы перад гэтым) ад 22 лістапада 1862 года Кажэўнікаў, пералічыўшы неабходныя, з яго пункту гледжання, меры супраць удзельнікаў дваранскіх выбараў, дадае: «... было б карысна выслаць з губерні і астатніх, якія значацца ў прыкладзеным спісе і асабліва заўважаны сваёй зласлівасцю і заганным напрамкам выклікаць беспарадкі... З іх... Марцінкевіча з дачкою абавязаць падпіскамі не выязджаць са сваіх маёнткаў, пакінуўшы пад строгім паліцэйскім наглядам. Мера гэтая паслужыць надзейным сродкам уздзе-

[187] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1862. Спр. 113. Арк. 85 адв.

яння на розум легкадумных і ўстанаўлення ў будучым жаданага спакою»[188].

Аднак галоўныя рэпрэсіі чакалі В. Дуніна-Марцінкевіча і яго дачку ў 1863 годзе, пасля таго як у Польшчы, Беларусі і Літве ўспыхнула паўстанне супраць царызму і прыгонніцтва.

4

Паўстанне застала Камілу Марцінкевічу мястэчку Гарадок Мінскага павета, дзе яна арганізавала школу для сялянскіх дзяцей і для гэтага выбрала дом у адстаўнога салдата. У лютым 1863 года яна звярнулася да салдата раскватараванай там роты Інгерманляндскага палка з просьбаю прадаць ёй зброю. Салдат паведаміў пра гэта свайму фельдфебелю. У Мінску неадкладна забілі трывогу. У Гарадок быў камандзіраваны следчы прыстаў мінскай гарадской паліцыі «з прызначэннем у яго распараджэнне 50 ніжніх чыноў той жа роты з добранадзейным афіцэрам». У выніку следства, як пісаў губернатар Кажэўнікаў генерал-губернатару ў данясенні ад 7 лютага 1863 года, царскія чыноўнікі прыйшлі да высновы, што Каміла Марцінкевіч «адкрыццё вучылішча прыняла толькі за прычыну, каб было зручней зблізіцца з сялянамі, маючы прыстойны адвод і магчымасць хаваць свае шкодныя і непрыстойныя сувязі з сялянамі; гэта даводзіцца тым, што ў школе гэтай усяго было пяцёра вучняў, а настаўнікаў з'яўлялася па чатыры»[189].

---

[188] Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края // Виленский временник. Вильна, 1913. Кн. 6. Ч. 1. С. 438.

[189] Виленский временник. Кн. 6. Ч. 1. С. 257.

Хадайнічаючы аб пакаранні Камілы, губернатар зноў ставіць знак роўнасці паміж яе дзейнасцю і дзейнасцю В. Дуніна-Марцінкевіча: «Пераконваючыся ўсё больш і больш у немагчымасці пакідаць яе тут далей, я лічу абавязкам паўтарыць маю пакорнейшую просьбу, выказаную ў прадстаўленні ад 22 лістапада за № 913 (гл. вышэй. — *Г. К.*), дзе прызнаваў неабходным выслаць яе з месца жыхарства разам з яе бацькам, які ў дадатак да ўсіх заган, уласцівых яго дачцы, валодае даволі бойкім пяром і езуіцкім настроем, якім дасціпна дзейнічае на народ, распускаючы сярод яго свае шкодныя творы, якім з'яўляецца „Гутарка" і яшчэ брашура, што зноў з'явілася і пры гэтым прыкладаецца, па агульным меркаванні яму прыпісваецца»[190]. Назімаў адказаў на гэтае данясенне грознай дэпешай: «У Мінск. Грамадзянскаму губернатару. Арыштаваць бацьку Марцінкевічавай да асобага распараджэння».

Аднак царскай паліцыі не ўдалося тады арыштаваць пісьменніка.

«У выніку зробленых пошукаў,— чытаем у данясенні Кажэўнікава ад 22 лютага 1863 года,— аказалася, што памешчык Мінскага павета Марцінкевіч выбыў для хадайніцтваў па даручэннях у Віцебскую губерню, і таму я паведаміў начальніку Віцебскай губерні аб адшуканні і ўтрымліванні Марцінкевіча пад строгім арыштам аж да распараджэння Вашага высокаправасхадзіцельства»[191].

---

[190] Виленский временник. Кн. 6. Ч. 1. С. 256–257. Якая брашура прыкладзена да данясення, невядома, але, мяркуючы па далейшай перапісцы, гэта — «Перадсмяротны разгавор пустэльніка Пятра».

[191] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1861. Спр. 78. Арк. 20.

Далей перапіска аб Марцінкевічу надоўга абрываецца. Відаць, паўстанне, што ўспыхнула вясной 1863 года ў Мінскай губерні, адцягнула ўвагу ўлад ад В. Дуніна-Марцінкевіча. У жніўні пытанне аб ім зноў усплывае ў сувязі з высылкай Камілы. У студзені 1864 года паліцыя атрымала новыя звесткі аб яго дзейнасці супраць царызму. Пачаліся новыя пошукі па ўсіх беларускіх і літоўскіх губернях. Вось што пісаў у сваім цыркуляры ваенным начальнікам ад 29 студзеня 1864 года гродзенскі губернатар Скварцоў: «Начальнік Мінскай губерні водгукам ад 21 студзеня за № 170 паведаміў мне, што падлеглы на падставе распараджэння былога галоўнага начальніка краю (маецца на ўвазе Назімаў, якога ў маі 1863 года змяніў Мураўёў. — *Г. К.*) арышту дваранін Мінскай губерні Вікенцій Марцінкевіч, які выдаў у пачатку ўзнікнення ў тутэйшым краі палітычнага руху на простай мове некалькі падбухторвальных адозваў да прасталюдзінаў: „Гутарка" і іншыя, цяпер, пераапранаючыся ў сялянскую вопратку і карыстаючыся асаблівым веданнем простанароднай мінскай гаворкі, з'яўляецца сярод сялян і стараецца сеяць між імі падбухторвальныя думкі, узбуджаючы да злачынных дзеянняў супраць урада.

З гэтай прычыны прапаную ваенным начальнікам у выпадку з'яўлення Марцінкевіча ў Гродзенскай губерні неадкладна, арыштаваўшы яго з усімі знойдзенымі пры ім паперамі, накіраваць пад строгай вартай да мінскага начальніка губерні, а мне пра гэта далажыць».

Да цыркуляра прыкладалася апісанне прыкмет Дуніна-Марцінкевіча: «Гадоў 53; росту сярэдняга; вочы блакітныя; валасы светла-русыя, сівыя; нос, рот, падбародак сярэднія;

твар круглы. Асаблівыя прыкметы: невялікі горб і правае плячо вышэй за левае»[192].

Марцінкевіч быў арыштаваны толькі ў кастрычніку 1864 года, а пакуль паліцыя, збіваючыся з ног, шукае яго па ўсёй Беларусі і Літве, мы раскажам пра далейшы лёс яго дачкі Камілы.

Пасля арышту ў Гарадку Камілу пасадзілі ў мінскі астрог, ці, як яго называлі афіцыйна, «Мінскі турэмны замак». Беглі дні, але следства над ёй не вялося. Маці, якая прыехала з Люцынкі, раіла ёй напісаць прашэнне генерал-губернатару, аднак гордая дзяўчына катэгарычна адмовілася. Тады прашэнне напісала сама маці. Прывядзём урыўкі з гэтага цікавага дакумента, які хутчэй нагадвае пратэст, чым «пакорную» просьбу:

«Ваша высокаправасхадзіцельства!

Дачка мая, Каміла Марцінкевіч, за тое, за што не толькі ад асвечанай Еўропы, але нават ад дзікіх гуронаў атрымала б падзяку, а менавіта, што час, вольны ад працы, якая прыносіць ёй карысць, скарыстоўвала, каб вучыць чытанню і катэхізісу дзяцей рамеснікаў і сялян... людзей бедных, якія, не маючы ніякіх сродкаў, вымушаны пакідаць дзяцей сваіх... у грубым невуцтве... за гэта менавіта пасаджана ў Мінскі астрог і ўжо шосты тыдзень пакутуе пад ключом у пакоі, які сырасцю наносіць шкоду яе здароўю, бо ўжо, як я чула, плюе крывёю.

Апроч аднаго жадання рабіць добрыя справы, ёй ніякай зусім віны не даказана; поўная высакароднай гордасці, адчуваючы сваю невінаватасць, [яна] гатова ахвяраваць жыццём,

---

[192] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 439. Вопіс 42. Спр. 34. Арк. 18–19.

толькі б не прасіць памілавання там, дзе дабіцца правасуддзя так цяжка...

Марыя Марцінкевічава.
8 сакавіка 1863 года.
Люцынка»[193].

Натуральна, на такое дзёрзкае «прашэнне» мог быць толькі адзін адказ царскіх улад. «Пакінуць без выніку», — напісаў на дакуменце Назімаў.

Следам за Камілай 13 лютага ў т. зв. Бернардынскі, ці Пабернардынскі, будынак у Мінску быў дастаўлены блізкі сябра дзяўчыны, адзін з галоўных дзеячаў мінскай рэвалюцыйнай арганізацыі Карл Станкевіч. У момант арышту яму было 29 гадоў, у 1855 годзе ён скончыў Горы-Горацкі земляробчы інстытут і служыў справаводам у Мінскай палаце дзяржаўных маёмасцяў. Па спосабе жыцця гэта быў сапраўдны разначынец. Адзін з яго сяброў (валасны пісар Вікенцій Клімовіч, з сялян) пісаў яму: успамінаю «ўсю сціплую маёмасць тваёй хаткі, якая дзіўна дапасоўваецца да гэтай шчырасці твайго сэрца»[194]. Яму былі блізкія інтарэсы народа. Захаваўся яго цікавы ліст да былога таварыша па службе Я. Янушкевіча ў Гародню, напісаны ў пачатку 1860 года, калі ў Мінску, як і па ўсёй Расіі, у дваранскіх камітэтах абмяркоўвалася сялянская рэформа, якая мелася адбыцца: «Здагадваешся, дарагі Яне, што павінна было заняць найбольш месца ў маім лісце, — гэта сялянская справа і яе стан у Мінску, аб якім, колькі мне дазваляў вольны час, я даведваўся. І вось скажу табе, што ў

[193] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1861. Спр. 78. Арк. 21.

[194] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 939-а. Арк. 48.

Мінску, хоць на яго ў маральных адносінах звысоку паглядаюць у Гародні, больш падаюць надзеі на добрае вырашэнне гэтай справы, вялікай для чалавецтва, вялікай для нацыі. У коле дэпутатаў, як аказалася з унесеных праектаў і з саміх абмеркаванняў, аб якіх я даведаўся ад прысутных на іх, ёсць людзі з сэрцам, што з запалам стаяць у абароне праў беднага народа, які так доўга чакаў лепшага, больш ніштаватага заўтра. Гэта партыя, якая выказвае думку аб перадачы сялянам ва ўласнасць і палеткаў у тым памеры, у якім яны сёння імі ўладаюць»[195]. З гэтага ліста бачым, што Станкевіч быў дэмакратам, бачым таксама, што ён быў шляхецкім дэмакратам, які спадзяваўся на «добрае сэрца» памешчыкаў, што вырашалі сялянскае пытанне ў дваранскім камітэце.

Следчая камісія пад старшынствам палкоўніка Рэйхарта мела нямногія даныя адносна рэвалюцыйнай дзейнасці Станкевіча, ды і тыя не даваліся ёй у рукі ў выніку ўмелай, лагічнай абароны зняволенага. Дзесяткі старонак следчай справы запоўнены пратаколамі допытаў, нуднымі спробамі царскіх следчых зламаць волю рэвалюцыянера. Але вось на аркушы 109 з'явілася нешта новае:

«1863 года 7 сакавіка, наглядчык за арыштантамі ў Пабернардынскім будынку жандарскі унтэр-афіцэр Скараходаў падаў у камісію белую насавую хустачку, прынесеную з абедам да арыштаванага Станкевіча. На хустачцы гэтай было напісана алоўкам выяўленне нязменнай любові да яго Каміліі Марцінкевіч, якая ўтрымліваецца ў астрозе, вядома сваім дзёрзкім характарам і адкрыта выказвала свае рэвалюцый-

[195] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 939-а. Арк. 53 адв. — 54.

ныя ідэі. Пастанавілі: як дадзены надпіс не змяшчае ў сабе нічога асаблівага і для падтрымлівання далейшай перапіскі гэтай, якая можа выкрыць некаторыя акалічнасці, — загадаць Скараходаву перадаць хустачку Станкевічу». Затаіўшы дыханне, царскія следчыя чакалі працягу. І працяг быў: «Думаю пра цябе, дарагая Камілія! Клапачуся і непакоюся, што там з табой робіцца, гавару з табой, нібыта ты была тут, са мною...» (арк. 312).

Скончыўся сакавік, пачаўся красавік. Сплывалі звонкімі кроплямі ледзяшы па турэмных кратах. Можа, і былі паміж тых слоў, што пісаліся ўпотай на хустачках і маленечкіх кавалках паперы, і «ўмоўныя словы», як думалі следчыя. Наогул жа гэта было ўсё тое, што спрадвеку гавораць адно аднаму закаханыя. Дзяліліся яны і скупымі весткамі з волі. У красавіку да зняволеных данеслася радасная чутка аб пачатку агульнага паўстання ў Беларусі, але сэрца мае свае законы.

Вось што піша Каміла 23 красавіка: «Без хітрыкаў табе скажу, мой пане, што твой апошні ліст зусім мне не спадабаўся — холадам Сібіры павявае ад яго. Я гэта вельмі добра разумею, што наша становішча не дазваляе нам неашчадна траціць словы, але там, дзе пішацца дзесятак-другі слоў з галавы, можна заўсёды змясціць некалькі ад сэрца... Гарызонт майго неба... суцэльна праясніўся, ужо не баюся, каб з хмар, што на ім нагрувашчаны, стрэліў пярун у тое, што для мяне даражэй за ўсё ў жыцці. Я зусім спакойная, добры настрой вярнуўся, толькі злую трохі на цябе. У нас у Мінску самае цудоўнае надвор'е, цёплае паветра, сонца свеціць. Амаль уся наша моладзь выйшла на пагулянку (у паўстанцы. — *Г. К.*); праўда, [чалавек] з сорак назад даставілі (захоплены царскімі ўладамі. — *Г. К.*), але там, дзе выйшла тысяча, што можа значыць

некалькі дзесяткаў. Калі будзеш пісаць, злітуйся, паведамі мне пра сваё здароўе (бо я чула, што ты хворы), таксама, што парабляеш, які ў цябе настрой. Прашу цябе таксама некалькі слоў пяшчоты, без яе мне было б цяжка ў жыцці. Халодных лістоў такіх, якім быў апошні, не пішы мне ніколі, яны робяць на мяне страшэнна непрыемнае ўражанне... Прашу цябе, не падай духам. Люблю цябе вельмі» (арк. 359). Гэты ліст цудоўна малюе вобраз Камілы Марцінкевіч — адной з першых жанчын — грамадскіх дзяячак у Беларусі.

Турбуючыся аб лёсе Камілы, Станкевіч яшчэ ў сакавіку спрабаваў перадаць на волю чарнавік пісьма, якое павінен быў напісаць адзін з яго знаёмых да чыноўніка генерал-губернатарскай канцылярыі Нікоціна. У ім мы знаходзім шэраг цікавых дэталяў, што датычаць грамадскай дзейнасці Камілы: «Дачка памешчыка Мінскага павета дзяўчына Камілія Марцінкевіч па распараджэнні п. начальніка Мінскай губерні ў першых чыслах мінулага лютага месяца пасаджана ў астрог — у тутэйшым турэмным замку, колькі мне вядома, за прыняцце ёю асабіста ўдзелу ў асвеце сялянскіх дзяцей у адным з паселішчаў у ваколіцах Мінска... У мінулым годзе Melle Марцінкевіч навучала дзяцей бедных жыхароў горада на сваёй кватэры, даведаўшыся аб чым былы мінскі ваенны губернатар п. генерал-маёр Кушалёў даручыў гэтае дамашняе вучылішча нагляду гарадской паліцыі і абавязаў дзяўчыну Марцінкевіч, каб лік дзяцей, што навучаліся ў яе, не перавышаў дзесяці. Следам за гэтым гарадская паліцыя на падставе распараджэння вышэйшага начальства афіцыйна патрабавала ад дзяўчыны Марцінкевіч дастаўлення па асаблівай форме звестак аб вучылішчы, што знаходзілася ў яе распараджэнні. Маючы такім чынам калі не станоўчую ўхвалу, дык прынамсі

цярпімасць з боку ўрада да сваіх педагагічных заняткаў, дзяўчына Марцінкевіч не магла меркаваць, што яе ўдзел у асвеце вясковых дзяцей будзе палічаны злачынствам». Зразумела, Станкевіч наўмысля «забывае» пра вядомыя нават уладам факты рэвалюцыйнай дзейнасці дачкі беларускага пісьменніка, але гэтая спроба выратаваць Камілу не мела поспеху: ліст быў перахоплены ўладамі і далучаны да следчай справы (арк. 333–334).

Мінула ўжо амаль паўгода, як Каміла знаходзілася ў турме. Паўстанцы цярпелі паражэнні, і разам з гэтымі паражэннямі знікалі апошнія надзеі і ў зняволеных. Нарэшце дзяўчына рашыла ўсё ж такі напісаць прашэнне генерал-губернатару, але як не падобны гэты дакумент, поўны пачуцця ўласнай годнасці, да звычайных папер, якія пісаліся ў такіх выпадках. Не літасці, а толькі якога-небудзь канца, якога-небудзь рашэння патрабуе яна. Нават клічнік следам за загалоўкам падкрэслівае патрабавальны тон усяго дакумента:

«Прашэнне!

У сувязі з беспарадкамі, што былі ў тутэйшым краі, 3 лютага гэтага года я пасаджана ў гэты замак, у якім і да цяперашняга часу знаходжуся пад вартаю. Ужо канчаецца шэсць месяцаў, але справа, што вядзецца аба мне, дагэтуль не скончана. Я мяркую, што ўсё гэта робіцца для аднаго толькі марнавання часу, на працягу якога я знясілілася пад арыштам. Сапраўды, гэты арышт на працягу такога доўгага часу забраў у мяне ўсе сродкі да існавання, праз яго я згубіла здароўе, нарэшце, я засталася без фізічных сіл, але на гэтым справа не скончана. Закон не такі строгі, каб патрабаваў мардаваць людзей дарэмным арыштам... Калі злачынства маё заслугоўвае кары... дык у кожным разе маруднасць вядзення справы ні-

колькі не аблягчае маёй долі... Асмельваюся турбаваць Ваша высокаправасхадзіцельства загадаць справу маю скончыць і, пастанавіўшы па ёй канчатковае рашэнне, спыніць дарэмнае мардаванне мяне арыштам у турме, таму што лепш стрываць і самы строгі прысуд, чым доўга пакутаваць пад вартаю.

Аб зробленым па гэтым прашэнні распараджэнні, Ваша высокаправасхадзіцельства, загадайце аб'явіць мне рэзалюцыю.

Каміла Марцінкевічаўна.
Ліпеня 30 дня 1863 года»[196].

17 жніўня Навумаў, які выконваў абавязкі мінскага губернскага пракурора, накіраваў гэтае прашэнне галоўнаму начальніку края, і неўзабаве на яго рапарце з'явіўся надпіс, зроблены нервовым почыркам Мураўёва: «Спытаць пра бацьку, а Марцінкевіч — у Перм»[197].

У лісце Кажэўнікаву ад 24 жніўня 1863 года Мураўёў пісаў: «...Каміла Марцінкевіч... прымала самы дзейны ўдзел у пашырэнні ў краі рэвалюцыйнага руху... Прымаючы пад увагу яе палітычныя перакананні і нахабны характар, нельга цярпець, каб яна пражывала ў тутэйшым краі без яўнай шкоды грамадству, таму пакорна прашу В[аша] п[равасхадзіцельства] выслаць Камілу Марцінкевіч як жанчыну шкодную і зусім нядобранадзейную ў палітычных адносінах на пражыванне пад строгі паліцэйскі нагляд у Пермскую губ[ерню], паведаміўшы тамашняму губернатару пра прычыны высылкі яе з краю, і аб выкананні гэтага распараджэння данесці.

---

[196] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1861. Спр. 78. Арк. 24.

[197] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1861. Спр. 78. Арк. 23.

Разам з гэтым пакорна прашу Вас паведаміць мне, якія былі вынікі пошукаў памешчыка Мінскага павета Вікенція Марцінкевіча, бацькі Камілы Марцінкевіч, аб якім маюцца весткі, што распаўсюджаныя паміж простым народам брашуркі падбухторвальнага зместу пад назвай „Гутарка старога дзеда" і „Перадсмяротны разгавор пустэльніка Пятра"[198] ім напісаны, а таксама далучыць іншыя весткі аб дзеяннях Марцінкевіча, роўна і аб тым, дзе ён знаходзіцца цяпер, якая ў яго маёмасць і ці не прымаў ён удзелу ў мяцяжы»[199].

28 жніўня Кажэўнікаў паведаміў Мураўёву, «што дваранка Мінскага павета Каміла Марцінкевіч разам з гэтым выслана ў суправаджэнні двух жандараў у г. Вільню да тамашняга каменданта для адпраўлення па прызначэнні ўстаноўленым парадкам. Бацька ж яе, Вікенцій Марцінкевіч, дагэтуль не адшуканы. У Віцебскай губерні, як відаць з паведамлення яе начальніка ад 20 лютага гэтага года за № 53, яго не аказалася. Сваякі яго запэўніваюць, што ён у красавіку месяцы гэтага года выехаў у г. Вілейку, але ці знаходзіцца там, ваенны

---

[198] «Перадсмяротны разгавор пустэльніка Пятра, каторы жыў у пушчы дзевяцьдзесят лет, а памёр, маючы сто сорак» у выглядзе невялікай (15 старонак) друкаванай брашуры меў некаторае пашырэнне ў Беларусі напярэдадні паўстання (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 19. Арк. 7). На тытульным аркушы выдання — паметка (якая, відаць, не адпавядае сапраўднасці): «Пячатана ў Кіеве». У канцы брашуры — адзін з варыянтаў гімна «Божа, што Польшчы» (упамінаецца Тураўская Божая маці). «Разгавор» напісаны нядрэннай беларускай празаічнай мовай. У ім выказваюцца ў асноўным тыя ж ідэі, што і ў «Гутарцы старога дзеда», але ў больш грубай форме. Калі аўтар «Гутаркі» заўсёды адчувае розніцу паміж беларусамі і палякамі, дык тут гаворка ідзе аб «сынах цэлай зямлі Польскай». Вось чаму нам здаецца, што аўтарам «Разгавора» наўрад ці мог быць Дунін-Марцінкевіч.

[199] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1861. Спр. 78. Арк. 25 адв.

начальнік Вілейскага павета, якому я паведаміў 15 мінулага ліпеня за № 2057 арыштаваць Марцінкевіча і даставіць да мяне, нічога не адказвае. Ці прымаў Марцінкевіч яўны ўдзел у мяцяжы, станоўчых даных няма, але распаўсюджаныя паміж простым народам брашуры яго падбухторвальнага зместу пад загалоўкам „Гутарка старога дзеда" і „Перадсмяротны разгавор пустэльніка Пятра" ясна даказваюць, што Марцінкевіч надзвычай шкодны для тутэйшага грамадства і можна меркаваць, што ён першы і самы энергічны агітатар цяперашніх беспарадкаў, але ўмее па-майстэрску ўтойваць свае дзеянні. Прычым лічу неабходным дадаць, што Марцінкевіч мае ў Мінскім павеце невялікі маёнтак Люцынкі, якая ж колькасць зямлі ў гэтым маёнтку і колькі прыносіць ён гадавога даходу, мною збіраюцца звесткі» (арк. 27).

Перад высылкай Каміла Марцінкевіч паспела зрабіць яшчэ адзін смелы, высакародны ўчынак, аб якім у горадзе хадзіла нямала чутак. Раніцай 5 жніўня 1863 года з астрога вялі на пакаранне паўстанца з атрада Трусава Івана Жмачынскага, былога радавога лейб-драгунскага Маскоўскага палка. З акна сваёй камеры Каміла кінула яму пад ногі букет кветак. На следстве яна заявіла: «Сапраўды я кінула злачынцу, які ішоў на смерць, некалькі кветак... Зрабіла гэта я, як зрабіла б для кожнага, хто ідзе на смерць». На пытанне, адкуль у яе кветкі, адказала: «Аб пакаранні гэтым мы меркавалі таму, што калі вялі на пакаранне Цюндзявіцкага[200], дык былі прыняты тыя ж меры, г. зн. усе былі замкнуты. Два ці тры дні перад гэтым пакараннем я была на споведзі ў кватэры п. наглядчыка, ку-

[200] Прапаршчык Міхаіл Цюндзявіцкі арыштаваны ў лютым 1863 года за рэвалюцыйную агітацыю сярод сялян і распаўсюджванне «Мужыцкай праўды» ў Барысаўскім павеце. Пакараны ў Мінску 21 мая 1863 года.

ды прыйшоў ксёндз, і там са стала, на якім стаялі букеты, вырвала некалькі кветак, якія стаялі ў мяне ў пакоі ў шклянцы. Узяла кветкі без усякага намеру, не ведаючы тады яшчэ пра пакаранне»[201].

Так развітвалася з Мінскам дачка Дуніна-Марцінкевіча. Захавалася адна з апошніх яе запісак з астрога да сяброўкі Марыі Станевіч, таксама ўдзельніцы рэвалюцыйнага руху: «Мая Марынька! Пішу табе, можа, ужо апошні раз. Учорашняй ноччу развіталіся з Барташэвічам, якога гэтыя нягоднікі... вывезлі. Сёння ці заўтра ў 12 гадзін ночы вывезуць нас ці Гадзіеўскага. Таму развітваюся з табой, мая Марынька! Пацалуй за мяне ручкі тваёй маткі. Развітайся за мяне з усімі маімі знаёмымі і зрабі яшчэ адну ласку — схадзі з Анетай, маёй служанкай, да гадзіннікавага майстра Кагана, заплаці там за мяне тры рублі і аддай гадзіннік Анеце, няхай прынясе мне. Гэтыя грошы мая маці з падзякай верне табе. Таксама сабяры што-небудзь па знаёмых дамах для Гадзіеўскага: ён бедны, не мае ні цукру, ні гарбаты, ні грошай. Будзь здарова, мая дарагая. Абдымаю цябе і цалую. *Каміла.*

Сумна нават падумаць, што прыдзецца пакінуць Літву і вас...»[202] І нават у такія цяжкія дні Каміла магла, як бачым, непакоіцца пра іншых.

Яе пасялілі ў г. Салікамску. Там у 1865 годзе Каміла выйшла замуж за павятовага ўрача Казіміра Асіповіча, прычым паліцэйскі нагляд быў пакінуты за ёю і пасля ўступлення ў

---

[201] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 191.

[202] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 492. Арк. 160.

шлюб[203]. У 1880 годзе яна вярнулася на радзіму, дзе хутка памерла[204].

5

На вокладцы тоненькай архіўнай справы напісана: «Следчая справа Часовага палявога аўдытарыята Віленскай ваеннай акругі аб калежскім рэгістратары Вікенціі Марцінкевічы. Пачата 8 кастрычніка 1865 г., скончана 12 сакавіка 1870 г. На дваццаці васьмі аркушах»[205]. Не адразу здагадаешся па гэтым загалоўку, што гаворка ідзе пра вядомага беларускага пісьменніка. Справа абгорнута ў шэрую непрыглядную папяровую вокладку. Ды гэта і зразумела: у тыя гады праз Палявы аўдытарыят праходзілі тысячы спраў пра паўстанцаў, і ў канцылярыстаў не было часу, каб як след іх аформіць.

Першапачатковых следчых матэрыялаў (пратаколаў допытаў і г. д.) у справе няма. Асноўны дакумент тут — гэта падрабязная выпіска са следчай справы, якая была прадстаўлена ў Палявы аўдытарыят мінскім губернатарам. Гэты дакумент захаваў для нас нямала новых цікавых момантаў пра ход следства над Дуніным-Марцінкевічам і пра тыя пакуты, якія давялося яму выцерпець.

Нарэшце Дунін-Марцінкевіч «у канцы кастрычніка 1864 года быў арыштаваны ў Свянцянскім павеце ў м. Свіры,

---

[203] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1863. Спр. 23. Ч. 628 («О дворянке Камилле Марцинкевич (по мужу Осипович)»).

[204] Kowalewska Z. Ze wspomnień wygnańca z r. 1863. Wilno, 1911. S. 73 (у кнізе ёсць фота Камілы Вікенцеўны з мужам).

[205] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 689.

прычым агледжаны былі рэчы і паперы яго, але ў іх нічога забароненага не аказалася» (арк. 4).

Пісьменніка пад канвоем прывезлі ў Мінск і пасадзілі ў турму. На прад'яўленае яму ў мінскай следчай камісіі абвінавачанне ён адказаў, што «зусім ніякага ўдзелу ў мяцяжы не прымаў і, каб адкінуць узведзеныя на яго абвінавачанні, прапануе разгледзець усе яго творы, у іх ён стараўся развіваць думкі аб з'яднанні славян пад скіпетрам рускага імператара, у аповесці для сялян выдання 1855 г. „Гапон" пераконваў сялян не ўхіляцца ад ваеннай службы і паказваў, што кожны, хто сумленна і старанна выконвае абавязак службы, можа дасягнуць харошай будучыні, затым славіў урад за клопаты аб выхаванні ўсіх без выключэння падданых, у творы „Кізралі" ён ухваляў сербскіх герояў, што абаранялі праваслаўную царкву і славянскую зямлю ад турак і г. д. Дзейнічаючы такім чынам у духу ўрада 20 гадоў, ён не мог перамяніць свае перакананні ў апошні час. Затым брашуры пад загалоўкам „Гутарка старога дзеда" ён не пісаў і нават ні ад каго пра яе не чуў, іншых якіх-небудзь твораў у антыўрадавым духу таксама не пісаў, сярод сялян не хаваўся і шкодных думак не распаўсюджваў. Што ж датычыць частых адлучак яго з маёнтка, то, атрымліваючы ад сваёй гаспадаркі нязначныя прыбыткі пры вялікай сям'і, ён займаецца хадайніцтвам па прыватных справах, па законных даверанасцях і з гэтай прычыны неадночы выязджаў з 1860 па 1862 г. па гадавых пашпартах ад губернатара: у Ковенскую губерню па справах памешчыц графіні Грабоўскай, палкоўніцы Буйвід і сваякоў іх Пржаленцкіх, а таксама віцебскага памешчыка Слауты. Па справах гэтых яму даводзілася бываць у Ковенскай губерні, Вільні, Вілейцы, Дзісенскім павеце і С.-Пецярбургу. Апроч таго, у 1861 г. ён ездзіў два разы на кароткі час у Варшаву, першы раз з мэтай

наведаць сына свайго Міраслава, які навучаўся ў музычным інстытуце, і абавязаць яго клятвай не ўдзельнічаць у мяцяжы, і хутка затым для сустрэчы і суправаджэння графіні Грабоўскай, якая вярталася з-за мяжы, а ў першых днях красавіка 1863 г. ён узяў у арэнду Свянцянскага павета маёнтак Дубраўляны (пані Бучынскай), але пазней маёнтак гэты быў секвестраваны, і ён 22 студзеня 1864 г. пераехаў на жыхарства ў суседняе м. Свір, дзе і знаходзіўся безадлучна да свайго арышту і ніякага ўдзелу ў мяцяжы не прымаў, у доказ чаго мае пасведчанне ад мясцовага начальства (пасведчанне гэтае прыкладзена да справы). Вяртацца ж у маёнтак свой Люцынкі ён баяўся, таму што асобы, што сустракаліся на дарогах з ваеннымі атрадамі, арыштоўваліся» (арк. 4–6).

Такім чынам, Дунін-Марцінкевіч адмаўляў на следстве якую-небудзь прыналежнасць да нацыянальна-вызваленчага руху і паўстання 1863 года. Больш за тое, ён спрабаваў нават паказаць сябе верным слугой царскага ўрада. Але хіба можна лічыць аб'ектыўнымі яго паказанні, якія былі абумоўлены зразумелым жаданнем вырвацца з рук царскіх улад? Калі нават дапусціць, што В. Дунін-Марцінкевіч сапраўды не пісаў «Гутаркі старога дзеда», дык ці можна паверыць, што «нават ні ад каго пра яе не чуў» пісьменнік, які так жыва цікавіўся беларускім словам? Цікавая ацэнка, якую пісьменнік дае свайму «Гапону». Зразумела, ён вельмі перабольшвае тыя бакі гэтага твора, якія можна вытлумачыць у станоўчым для царызму сэнсе, але ўжо магчымасць такой трактоўкі яшчэ раз гаворыць аб тым, які непаслядоўны быў дэмакратызм у творах Дуніна-Марцінкевіча.

Наогул жа царысцкія тэндэнцыі, насуперак сцверджанням пісьменніка ў следчай камісіі, зусім не ўласцівы творчасці

Дуніна-Марцінкевіча напярэдадні паўстання. Асноўны яго твор на тэму аб адносінах паміж царом і народам — «Халімон на каранацыі», напісаны ў 1857 годзе, у завуаляванай форме праводзіць ідэю аб адарванасці цара ад народа і мае ў зародку тыя думкі, якія ў больш поўнай форме выказаны ў «Гутарцы старога дзеда». Селянін Халімон Забалотны, прыехаўшы ў Маскву на каранацыю, так і не пабачыў цара, каб расказаць яму пра сваю мару:

Штоб над мужыкамі шчыру меў апеку,
Вялеў справіць розум цёмну чалавеку,
Штоб дзетачак нашых чытаць навучылі,
Штоб Бога па ксёнжцы за цара малілі.

Паны даўно паклапаціліся б пра асвету народа, гаворыць аўтар, ды ўся справа за царом:

І панкі б хацелі разумных мець людзі,
Ды чакаюць, яка царска воля будзе.
Згаварыцца б рады з суседамі ўсполкі
Для мужыцкіх дзетак стаўляць малы школкі,
Ды боязка самім пачаць таку справу,
Царскую паруку хочуць мець ласкаву[206].

А ў перыяд пасля паўстання 1863 года пісьменнік рэзка крытыкаваў чыноўніцтва ў камедыі «Пінская шляхта»[207].

Даследчыкаў творчасці Дуніна-Марцінкевіча, безумоўна, зацікавіць тая мясціна ў паказаннях пісьменніка, дзе ён гаво-

---

[206] Дунін-Марцінкевіч В. Зб. тв. С. 331.

[207] Гл. нашу заметку пра ацэнку «Пінскай шляхты» царскімі ўладамі (ЛіМ. 1960. 27 крас.).

рыць пра славянафільскія матывы ў сваіх творах. Гэтыя матывы сапраўды вельмі прыкметныя ў творчасці пісьменніка (гл. яго паэму «Славяне ў XIX стагоддзі», якую ў сваіх паказаннях ён называе «Кізралі», а таксама «Верш Навума Прыгаворкі»), на што, дарэчы сказаць, яшчэ не звярнулі належнай увагі літаратуразнаўцы.

Што датычыць частых паездак пісьменніка па Беларусі і Літве, то яны сапраўды часткова былі абумоўлены патрэбамі здабываць дадатковыя сродкі на ўтрыманне вялікай сям'і. У следчай справе ёсць даведка аб тым, што фальварак Люцынка сапраўды быў невялікі: «Маёнтак гэты складаецца з 11 валок зямлі (г. зн. каля 200 дзесяцін. — *Г. К.*), але палова яго належыць дзецям Марцінкевіча па праве спадчыны ад маці, першай жонкі Марцінкевіча» (арк. 4). Памешчык адстаўны паручнік Мікалай Пржаленцкі пацвердзіў, што пісьменнік быў хадатаем па справах яго сястры графіні Грабоўскай з 1851 па 1863 год «і таму неаднаразова наведваў іх на кароткі час у маёнтку Нарова Ковенскага павета» (арк. 10–11). Аднак трэба думаць, што свае дзелавыя паездкі Дунін-Марцінкевіч адначасова скарыстоўваў для ўстанаўлення сувязі з рэвалюцыянерамі, для агітацыйнай дзейнасці сярод сялян. Асаблівай увагі заслугоўваюць паездкі пісьменніка ў Варшаву ў 1861 годзе. Паводле паведамлення варшаўскага обер-паліцмайстара, Дунін-Марцінкевіч прыязджаў у Варшаву ў 1861 годзе ў канцы студзеня і ў маі (арк. 11).

Ёсць даныя, што сваю апошнюю паездку пісьменнік зрабіў разам з Сыракомлем. Польскі паэт ехаў з чужым пашпартам і па дарозе, у Коўне, Сувалках, Ломжы, выступаў з палымянымі прамовамі. На жаль, невядома, які ўдзел прымаў у гэтых дэманстрацыях Дунін-Марцінкевіч, але для

Сыракомлі гэтае своеасаблівае агітацыйнае турнэ скончылася арыштам[208].

Якраз у час гэтых паездак Дунін-Марцінкевіч мог перадаць «Гутарку старога дзеда» Б. Шварцэ для надрукавання ў тайнай друкарні ў Беластоку. З гэтымі ж паездкамі трэба звязваць з'яўленне ў красавіку 1861 года ў «Газеце польскай» пісьма Ю. Крашэўскаму.

Пра тое, што паездкі Дуніна-Марцінкевіча ў Варшаву мелі не зусім звычайны характар, сведчыць яшчэ адна акалічнасць — пра яе царскія чыноўнікі ўспомнілі ў час следства. Гэта ананімны данос на пісьменніка ў кастрычніку 1861 года, аб якім мы гаварылі вышэй.

Аналізуючы паказанні пісьменніка, трэба звярнуць таксама ўвагу на той факт, што В. Дунін-Марцінкевіч пакінуў Люцынку, як ён сам сказаў, у красавіку 1863 года, г. зн. пасля загаду аб яго арышце і ў той момант, калі многія ў Беларусі і Літве пакідалі свае дамы, каб уступіць у паўстанцкія атрады.

Аб дачыненнях пісьменніка да нацыянальна-вызваленчага руху можна меркаваць па паказаннях сведак. Так, «мясцовы стараста Станіслаў Клімовіч і 7 іншых сялян рымска-каталіцкага веравызнання пад прысягаю растлумачылі, што ў 1862 г. у фальварку Люцынка ў памешчыка Марцінкевіча часта бывалі зборышчы і спявалі забароненыя гімны, а перад Вялікаднем 1863 г. у яго быў вялікі сход і ў тым ліку: валасны фельчар [Уладзіслаў] Трасцянка, дваране Андрэй і Яўхім Цымерманы і мясцовага касцёла ксёндз Камянецкі, якія про-

---

[208] Гл. прадмову Уладзіслава Каратынскага да кн.: Kondratowicz L. (Syrokomla W.) Podróż swojaka po swojszczyźnie. Warszawa, 1914. S. XX. Упершыню на гэтую акалічнасць звярнуў увагу А. Мальдзіс (ЛіМ. 1962. 18 верас.).

ста ад яго адправіліся ў шайку мяцежнікаў, а на другі дзень сам Марцінкевіч невядома куды скрыўся і ўжо да арышту ў Свянцянскім павеце дадому не вяртаўся; між іншым, апошняга яны ні ў чым больш нядобрым не заўважалі» (арк. 7). Гэта агаворка сведчыць, як глыбока паважалі сяляне В. Дуніна-Марцінкевіча: у тыя гады на допытах у следчых камісіях звычайна сяляне імкнуліся адпомсціць панам за ўсе крыўды, і такія агаворкі былі нячастыя.

Паказанні сялян дапоўніў сусед В. Дуніна-Марцінкевіча адстаўны унтэр-афіцэр Фёдар Іваноў, які «паказаў, што ў фальварку Люцынках даволі часта збіраліся дваране Уладзіслаў Слаута, [Васіль і Антон] Доўнары і валасны пісар (фельчар. — *Г. К.*) Трасцянка (быў у шайцы і вызвалены на парукі), якія разам з дочкамі Марцінкевіча спявалі забароненыя гімны. Адна з дачок Марцінкевіча — Цэзарыя — падстрыгла сабе косы і насіла канфедэратку, бываючы ў ёй неаднаразова ў касцёле ў вёсцы Першаях. Апроч таго, яны рабілі корпію для раненых мяцежнікаў і завозілі ў лес. У сакавіку ці красавіку 1863 г. у Люцынкі прыязджалі ксёндз мясцовага касцёла Камянецкі, пісар Трасцянка і дваране Жаброўскі і Грудзінскі, якія потым проста з маёнтка накіраваліся ў лес, куды іх праводзілі жонка Марцінкевіча і дачка Цэзарыя, прыехаўшы з імі з Тупальшчыны» (арк. 6–7).

Гэтыя паказанні пацвярджаюцца ўспамінамі аднаго з удзельнікаў паўстання 1863 года на Міншчыне — Апалінарыя Свентажэцкага. Вясною 1863 года Свентажэцкі быў прызначаны рэвалюцыйным начальнікам Ракаўскай акругі Мінскага павета. У маі, калі пачалося агульнае паўстанне ў Мінскай губерні, Свентажэцкі прыбыў з Мінска ў Ракаў. Адтуль ён накіраваўся ў Люцынку Марцінкевічаў, дзе яму «была

аказана пэўная дапамога»[209], — як адзначана ў яго мемуарах. З Люцынкі была паслана давераная асоба для вярбоўкі людзей у Першаях. Зборны пункт Свентажэцкі прызначыў у Міхайлаве. Аднак замест ста чалавек, як чакалі, тут сабралася толькі дваццаць. Да таго ж прыйшла вестка, што Вілейскі атрад В. Козела, да якога павінен быў далучыцца Свентажэцкі, 16 мая быў разбіты пад Уладыкамі. Са жменькай паўстанцаў Свентажэцкі накіраваўся на з'яднанне з атрадам П. Дыбоўскага, да якога і далучыўся ў засценку Баравая паміж Цэпленем і Уздой. Пазіцыю сялян у дачыненні да паўстання вельмі добра характарызуюць іх словы, сказаныя паўстанцам Свентажэцкага (у польскіх мемуарах гэтыя словы прыведзены па-беларуску): «Няхай Бог таму памагае, хто для нас будзе добры» (с. 15).

Аднак Дунін-Марцінкевіч працягваў па-ранейшаму поўнасцю адмаўляць якую-небудзь віну сваю і сваёй сям'і: «Калі запыталі другі раз па выкладзеных абвінавачаннях, памешчык Марцінкевіч паказаў, што сходаў з палітычнай мэтай у яго ніколі не было і забароненых гімнаў ніхто не спяваў. З суседзяў яго наведвалі даволі часта міравы пасрэднік палкоўнік Шышко, доктар Сушчынскі, дваране Комар з сынам, Слаута і двое маладых людзей, якія прыязджалі бавіць час разам з дзяўчатамі, дочкамі яго. З названых сялянамі асоб: фельчар Трасцянка быў у яго некалькі разоў для лячэння рожы на на-

[209] Kowalewska Z. Ze wspomnień... S. 13. Цікава, што, трапіўшы ў рукі царскіх улад, Свентажэцкі не сказаў ні слова пра дапамогу, якую атрымаў у Люцынцы (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 723). Захавалася таксама справа «Аб селяніне Уладзіславе Трасцянку» (Тамсама. Спр. 408). Ён быў фельчарам Пяршайскай воласці і ўступіў у атрад Свентажэцкага 25 мая 1863 года. Паводле яго слоў, у атрадзе былі таксама браты Цымерманы.

зе; Цымерманы толькі адзін раз былі ў яго, гэтаксама і пісар Бяляўскі, які прыязджаў у 1862 г. на паляванне. Адносна ж ксяндза Камянецкага Марцінкевіч сказаў, што бачыўся з ім толькі ў касцёле і, нарэшце, што ў той час, калі было вялікае зборышча, з якога некаторыя асобы нібыта накіраваліся проста ў шайку, што зусім невераемна, ён, Марцінкевіч, быў у Свянцянскім павеце» (арк. 7–8).

Вельмі дапамаглі Дуніну-Марцінкевічу спрыяльныя паказанні чацвярых дваровых з Люцынкі, а асабліва сведчанне ваеннага начальніка 4-га ўчастка Свянцянскага павета паручніка Харламава ад 22 чэрвеня 1864 года, у якім гаварылася, «што Марцінкевіч у час прабывання свайго ў вёсцы Дубраўляны і м. Свіры з красавіка 1863 г. паводзіў сябе ціха і не толькі не ўдзельнічаў у мяцяжы, але, наадварот, заўважаны быў у спачуванні да законнага ўрада» (арк. 8). На карысць пісьменніка далі паказанні таксама сяляне маёнткаў Дубраўляны і Свір.

Як бачым, матэрыялы, якія мы маем, даволі супярэчлівыя, і вельмі можа быць, што Дунін-Марцінкевіч, убачыўшы неспачувальныя ў шэрагу месцаў адносіны сялян да паўстання, расчараваўся ў ім і адышоў ад рэвалюцыйнага руху. Якраз у красавіку 1863 года, калі пісьменнік пакінуў Люцынку, выявілася, што варожа настроены ў дачыненні да паўстання сяляне Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У гэты ж час быў забіты салдатамі і сялянамі Тадэвуш Чудоўскі, якому Дунін-Марцінкевіч прысвяціў некалькі сваіх твораў. У такім выпадку можна ў пэўнай ступені верыць сведчанню паручніка Харламава.

У віну Дуніну-Марцінкевічу была пастаўлена дзейнасць яго дочак і жонкі. У выпісцы гаворыцца: «Аб замешаных у

справе дочках памешчыка Марцінкевіча — Каміле, 24 гады, і Цэзарыне, 18 гадоў, а таксама жонцы яго Марыі, 56 гадоў, якія прымалі, паводле сведчання мінскага губернатара, дзейны ўдзел у былых дэманстрацыях і спяванні забароненага гімна, рабіліся ў снежні 1864 г. і красавіку гэтага года асаблівыя расследаванні, і па іх, як сведчыць той жа мінскі губернатар, дзяўчына Каміла Марцінкевіч выслана з краю, а сястра яе Цэзарына аштрафавана на 25 руб. срэбрам» (арк. 12).

Расследаванне па абвінавачанні ў антыўрадавай дзейнасці жонкі пісьменніка рабілася ў віленскай следчай камісіі. Адносна гэтага ў выпісцы чытаем: «Па справе гэтай Марцінкевічава абвінавачвалася ў спяванні рэвалюцыйных гімнаў у м. Валожын, але доказаў, каб выкрыць яе ў гэтым, не было адкрыта, а таму Марцінкевічавай, пры вырашэнні справы ў аўдытарыяце аб другіх асобах, не было прызначана ніякага пакарання» (арк. 13).

13 ліпеня 1865 года расследаванне справы пра В. Дуніна-Марцінкевіча ў мінскай следчай камісіі было закончана, і ўсе матэрыялы былі прадстаўлены губернатару. Губернатар, перасылаючы справу віленскаму генерал-губернатару, пісаў у рапарце ад 24 ліпеня: «Марцінкевіч у абвінавачаннях гэтых не прызнаўся, і зробленым расследаваннем не выяўлена юрыдычных доказаў, каб выкрыць яго ў гэтых злачынствах, але, прымаючы пад увагу, што ў маёнтку Марцінкевіча Люцынцы пры вобыску (яшчэ ў 1861 годзе. — *Г. К.*) знойдзена адна друкаваная і дзве літаграфаваныя малітвы за айчыну, выдадзеныя без цэнзуры, што з сям'і Марцінкевіча жонка яго Марыя і дочкі Каміла і Цэзарына прымалі дзейны ўдзел у былых дэманстрацыях... я прыходжу да перакананняў, што памешчык Марцінкевіч сям'ю сваю выхаваў далёка не ў духу, адданым

ураду, і таму сам у палітычных адносінах не можа лічыцца добранадзейным.

Хоць памешчык Вікенцій Марцінкевіч па абвінавачанні сам павінен быць бы высланы з краю, але, зважаючы на яго пажылыя гады (у справе чамусьці сказана, што Дуніну-Марцінкевічу 60 гадоў, у сапраўднасці ж яму было толькі 58. — *Г. К.*), я лічыў бы: яго, Марцінкевіча, пакінуць на месцы жыхарства з аддачаю на парукі і з устанаўленнем за ім паліцэйскага нагляду, а з маёнтка, які яму належыць, спагнаць дзесяціпрацэнтны збор» (арк. 2–3).

Пісьменнік заставаўся ў турме. Цягнуліся дні ў чаканні рашэння Палявога аўдытарыята. Але аўдытарыят і без таго быў загружаны следчымі справамі паўстанцаў з усіх сямі беларускіх і літоўскіх губерняў. Толькі 7 кастрычніка 1865 года на рапарце мінскага губернатара з'явілася рэзалюцыя: «Разгледзець неадкладна» (арк. 2).

30 кастрычніка справа была разгледжана аўдытарыятам[210]. Апошні згадзіўся з меркаваннем губернатара, але вырашыў патроіць грашовы штраф. Улічаны былі нават непацверджаныя абвінавачанні.

«Маючы на ўвазе першапачатковыя важныя абвінавачанні, узніклыя на Марцінкевіча, — пісалася ў заключэнні, — Палявы аўдытарыят знаходзіць, што памешчыка гэтага як нядобранадзейнага ў палітычных адносінах трэба было б выслаць з краю, але, прымаючы пад увагу меркаванне мінскага губернатара, які прызнаў магчымым пакінуць Марцінкевіча ў краі, зважаючы на яго немаладыя гады, Палявы аўдытарыят

[210] Гл. журнал аўдытарыята (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 596. Арк. 879).

лічыць: памешчыка Марцінкевіча, на падставе IV катэгорыі і 8 пункта высачайша зацверджаных 11 мая 1863 г. правіл аб парадку накладання спагнанняў на мяцежнікаў і іх супольнікаў, не высылаючы з краю, падвергнуць грашоваму штрафу, спагнаўшы з маёнтка яго як за яго самога, так і за яго жонку, якая ўдзельнічала ў дэманстрацыях, пры вызваленні маёнтка ад секвестра ўзмоцнены трыццаціпрацэнтны збор і, усяліўшы затым на месца жыхарства, аддаць на ўстаноўленае цалкам добранадзейнае паручыцельства і пад строгі нагляд паліцыі» (арк. 17–18). 4 снежня 1865 года заключэнне аўдытарыята было зацверджана памочнікам камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі генералам Манюкіным (арк. 15).

* * *

Вярнуўшыся ў Люцынку, пісьменнік некалькі дзён хадзіў па доме глыбока задуменны. Іншы раз ён браў у рукі якую-небудзь рэч са старой камоды, але позірк яго блукаў недзе далёка. Потым папрасіў запаліць печку, узяў гусінае пяро і вывеў буйным упэўненым почыркам на белым аркушы паперы: «Пінская шляхта. Фарс-вадэвіль у адной дзеі».

БЕЛАРУСКІ РЭВАЛЮЦЫЯНЕР АНТОН ТРУСАЎ

Прыкладна за год да Парыжскай камуны Карл Маркс, які жыў тады ў Лондане, атрымаў пісьмо са Швейцарыі, напісанае незнаёмым почыркам. Яно змяшчала надзвычай важную вестку:

«Жэнева, 12 сакавіка 1870 г.

Грамадзяніну Марксу

А. Трусаў, рэдакцыя «Народного дела»

Дарагі і высокашаноўны грамадзянін!

Ад імя групы рускіх мы звяртаемся да Вас з просьбай зрабіць нам гонар быць нашым прадстаўніком у Генеральным Савеце Міжнароднага Таварыства ў Лондане. Гэтая група рускіх толькі што ўтварыла секцыю Інтэрнацыянала, таму што вялікая ідэя гэтага міжнароднага руху пралетарыяту пранікае таксама і ў Расію.

...Выхаваныя ў духу ідэй нашага настаўніка Чарнышэўскага, асуджанага за свае творы на катаргу ў Сібір у 1864 годзе, — мы з радасцю прывіталі Ваша выкладанне сацыялістычных прынцыпаў... Руская дэмакратычная моладзь атрымала сёння магчымасць вуснамі сваіх выгнаных братоў выказаць Вам сваю глыбокую ўдзячнасць за тую дапамогу, якую Вы аказалі нашай справе Вашай тэарэтычнай і практычнай прапагандай...»[211]

---

[211] Переписка К. Маркса и Ф. Энгельса с русскими политическими деятелями. 2-е изд. М., 1951. С. 36–38.

Пад лістом стаялі тры подпісы: М. Уцін, В. Нетаў, А. Трусаў.

Можна было б расказаць аб тым, якім забаўным здаўся Марксу ў гэтым лісце зварот «vénérable» (беларускае «высокашаноўны» толькі прыблізна перадае яго сэнс). Гэты зварот стасаваўся звычайна да вельмі старых людзей, а Маркс адчуваў сябе маладым. Але не аб гэтым цяпер гаворка...

Ліст не быў для Маркса нечаканасцю. У апошнія гады яго позірк усё больш часта і пільна зварочваўся да Расіі. Ён вывучыў рускую мову, каб мець магчымасць па першакрыніцах азнаёміцца з сацыяльна-эканамічным станам Расіі. І ён бачыў: стрэлы чыгунак, якія рынуліся ў бязмежныя прасторы гэтай вялікай краіны, натоўпы мужыкоў-лапатнікаў, што пацягнуліся ў гарады, каб прадаць там сваю адзіную ўласнасць — рабочыя рукі, — усё гэта гаварыла пра тое, што Расія пасля рэформы 1861 года хутка ішла па шляху капіталістычнага развіцця. Менавіта гэта вызначала глыбокую цікавасць рэвалюцыянераў Расіі да марксізму, да міжнароднага рабочага руху.

Ужо шосты год існаваў пралетарскі Інтэрнацыянал — Міжнароднае Таварыства Рабочых — улюбёнае дзецішча Маркса і Энгельса. У рабочым руху не было нічога паказнога, ніякай крыклівасці. Ён быў як тая песня — партыйны гімн, створаны крыху пазней французскімі рабочымі Э. Пацье і П. Дагейтэрам. Праўдзівей, песня была як гэты рух. Якім велічным спакоем, якой глыбокай верай у гістарычную немінучасць надыходу светлага заўтра павявае ад гукаў «Інтэрнацыянала». Вось так жа спакойна рабілі сваю справу дзеячы рабочага руху. У кароткі тэрмін секцыі Інтэрнацыянала ахапілі Англію, Францыю, Германію, Швейцарыю і іншыя еўрапейскія краіны. Рух перакінуўся за акіян — у Амерыку.

Чарга была за Расіяй. Ліст з Жэневы сведчыў, што гэтая чарга наступае.

24 сакавіка 1870 года з Лондана было адпраўлена пісьмо, адрасаванае «членам камітэта Рускай секцыі ў Жэневе»:

«Грамадзяне!

На сваім пасяджэнні 22 сакавіка Галоўны Савет... паспяшыў прыняць вашу галіну ў склад Інтэрнацыянала. Я з задавальненнем прымаю ганаровы абавязак, які вы мне прапануеце, быць вашым прадстаўніком у Галоўным Савеце...

Прывітанне і братэрства.

Карл Маркс»[212].

Такім чынам, сям'я брацкіх секцый Інтэрнацыянала папоўнілася Рускай секцыяй.

Хто ж тыя людзі, якія ўпершыню звязалі слова «Інтэрнацыянал» са словам «Расія»?

Да вывучэння гісторыі секцыі даследчыкі прыступілі толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, і з першых жа крокаў ім давялося сутыкнуцца з недахопам матэрыялаў. У 1925 годзе з'явілася невялікая кніжка В. А. Гарохава «Русская секция I Интернационала», але яна грунтавалася толькі на аналізе друкаванага органа секцыі — часопіса «Народное дело» — і не змяшчала амаль ніякіх вестак аб яе дзеячах. Вялікі матэрыял сабраны ў выдадзенай нядаўна манаграфіі Б. П. Казьміна[213]. Але і гэтая кніга дае толькі сціслыя звесткі аб удзельніках групы. Іх біяграфіі яшчэ чакаюць свайго даследчыка.

У выніку пошукаў у кніжных і архіўных сховішчах Масквы, Вільнюса і іншых гарадоў нам удалося выявіць шэ-

---

[212] Переписка К. Маркса и Ф. Энгельса... С. 38–39.

[213] Козьмин Б. П. Русская секция Первого Интернационала. М., 1957.

раг новых матэрыялаў аб адным з дзеячаў секцыі — Антоне Трусаве, якія дазваляюць узнавіць многія невядомыя дагэтуль моманты яго жыцця і дзейнасці і даюць падставу гаварыць аб ім як аб беларускім рэвалюцыянеры. З беларускім народам Трусаў быў кроўна звязаны, на палях Беларусі выступіў са зброяй у руках супраць царызму і прыгонніцтва, яе вобраз хаваў у сэрцы доўгія гады бадзянняў...

Згадка ў некаторых крыніцах аб тым, што Трусаў быў студэнтам Маскоўскага універсітэта, прывяла нас у Дзяржаўны гістарычны архіў Маскоўскай вобласці, дзе захоўваюцца дакументы універсітэта за гэты перыяд. І вось перад намі выцвілае ад часу «Справа Савета імператарскага Маскоўскага універсітэта аб прыняцці ў студэнты Антона Трусава»[214]. Дакументы, што змяшчаюцца тут (фармулярны спіс аб службе бацькі, метрычны выпіс, пасведчанне аб адукацыі), прыадкрываюць заслону над раннім перыядам яго жыцця. Яны пераносяць нас перш за ўсё ў невялікі беларускі горад на рацэ з простай славянскай назвай.

1

Удзень і ўначы б'юць хвалі Бярэзіны ў пясчаны бераг. Вецер надзімае залатаныя ветразі байдакоў, нагружаных збожжам, лёнам, славутым беларускім лесам. На поўнач, у Рыгу, ідуць судны і на поўдзень — да цёплага сіняга мора. Зімою Барысаў завальвае снегам, і ён робіцца падобны да соцень іншых павятовых гарадоў мікалаеўскай Расіі. Сувязь з навакольным светам амаль зусім спыняецца. Толькі чарго-

[214] ДГАМВ [ЦГАМ]. Фонд 418. Вопіс 23 (1854). Спр. 251.

вы паштовы дыліжанс пакіне некалькі нумароў «Русского инвалида» або «Минских губернских ведомостей» ды яшчэ некалькі лістоў гараднічаму і мясцовым купцам. Раніцай разнясе іх адрасатам паштальён мясцовай канторы Даніла Трусаў...

Даніла Іванавіч быў выхадзец з мяшчан-каталікаў беларускага паходжання. У 1827 годзе ён пачаў служыць наглядчыкам Юхноўскай паштовай станцыі. «Што такое станцыйны наглядчык? Сапраўдны пакутнік чатырнаццатага класа, застрахаваны сваім чынам толькі ад пабояў, і то не заўсёды», — гэтыя вядомыя пушкінскія радкі, напісаныя якраз у той час, пра які ідзе гаворка, маюць непасрэднае дачыненне і да юхноўскага наглядчыка. Праўда, Данілу Іванавіча нават чын не засцерагаў ад пабояў, таму што першы чын — калежскага рэгістратара — ён атрымаў толькі ў 1852 годзе, пасля дваццаціпяцігадовай цяжкай бесперапыннай службы. Магчыма, ратуючыся ад «крыку і кухталёў» вяльможных пасажыраў, у 1832 годзе ён папрасіў перавесці яго на пасаду паштальёна Барысаўскай паштовай канторы. Потым служыў паштальёнам у Мінску, быў наглядчыкам у многіх мястэчках Мінскай губерні, а ў 1847 годзе кола яго службовай кар'еры замкнулася ў тым жа Юхнове, на той жа не зайздроснай пасадзе станцыйнага наглядчыка.

У вечных клопатах аб хлебе надзённым, у службовай мітусні Даніла Іванавіч так і не заўважыў, як праляцелі гады, як вырасла сям'я: першынцам быў Баляслаў, потым 15 мая 1835 года ў Барысаве нарадзіўся другі сын — Антон, потым пайшлі і дзяўчаткі — Юлія і Эмілія.

У тым, што сям'я Трусавых часта пераязджала, было і станоўчае: Антон з самага маленства добра пазнаў Беларусь і

палюбіў яе мужны, працавіты, таленавіты і сціплы народ. Гэта быў час, калі прыгонніцтва дажывала свой век. Памешчыкі, нібы прадчуваючы гэта, вынаходзілі ўсё новыя, больш цяжкія формы эксплуатацыі. Даведзеныя да адчаю, сяляне стыхійна бунтавалі супраць памешчыкаў. Задыхаючыся ў душнай атмасферы мікалаеўскага царавання, краіна нецярпліва чакала асвяжальнай навальніцы. Яркія малюнкі народнага гора і нянавісці, што з маленства запалі ў памяць, Антон Трусаў пранёс праз усё сваё жыццё. А яшчэ запомніліся яму беларускія паштовыя тракты, ля якіх прайшло яго дзяцінства. Чыгунак тады не было. Абсаджаныя бярозамі гасцінцы вялі ў шырокі незнаёмы свет — у блізкія Мінск і Вільню, у далёкія Маскву, Кіеў, Варшаву.

Нягледзячы на нястачы ў сям'і (у фармулярным спісе гаворыцца: «Атрымлівае ў год срэбрам жалавання 42 руб. 45 кап. Амунічных — 7 руб. 14 кап. Разам — 49 руб. 59 кап.»), Даніла Іванавіч цвёрда наважыўся даць адукацыю сваім дзецям. Дзесяцігадовы сын станцыйнага наглядчыка апранае цёмна-зялёны сурдуцік гімназіста.

Калі-небудзь будзе напісана гісторыя Мінскай гімназіі. У яе сценах атрымалі выхаванне многія выдатныя дзеячы беларускай, рускай і польскай культуры — кампазітар Станіслаў Манюшка, вядомы вучоны-прыродазнаўца Бенядзікт Дыбоўскі, юрыст і літаратуразнаўца Уладзімір Спасовіч, паэт-рэвалюцыянер Іван Гольц-Мілер, крытык Браніслаў Белаблоцкі, акадэмік Я. Ф. Карскі, пісьменнікі Ядвігін Ш. і Янка Лучына. У верасні 1845 года ў першы клас гэтай гімназіі паступіў «з хатняга выхавання» Антон Трусаў.

Гімназічныя гады былі нялёгкія для Трусава. Сыну станцыйнага наглядчыка трэба было трымаць вуха востра, каб

даць варты адпор кпінам з боку сынкоў яснавяльможных бацькоў. Магчыма, таму яму рана давялося блізка пазнаёміцца з гімназічным карцэрам — цёмнай каморкай пад лесвіцай з закратаваным акенцам на дзвярах.

Нягледзячы на шматлікія перашкоды, жыццё пранікала праз гімназічныя сцены. Мінск у той час быў адным з цэнтраў беларускай нацыянальнай культуры. Ужо гучаў голас В. Дуніна-Марцінкевіча. У Люцынцы ўпарта гарэў, нягледзячы на непагадзь, агеньчык беларускай паэзіі. Акурат у гімназічныя гады Трусава з мінскай сцэны прагучалі народныя мелодыі і беларуская мова — гурток аматараў-энтузіястаў паставіў оперу «Сялянка», напісаную С. Манюшкам і В. Дуніным-Марцінкевічам. Ды і ў гімназіі беларуская моўная стыхія моцна адчувалася. Большасць вучняў, зразумела, ведалі беларускую мову. Праз некалькі дзесяткаў гадоў вядомы польскі гісторык Тадэвуш Корзан (ён таксама вучыўся ў гэты час у Мінскай гімназіі) з усмешкай прыгадае ў сваіх успамінах беларускую прымаўку, якая абавязкова гаварылася тады вучню, што правініўся: «За такія збродні спушчай васпан сподні»[215].

У маленькім свеце гімназіі, як у люстры, адбіваліся супярэчнасці навакольнага жыцця. Сярод гімназістаў хадзілі па руках пракламацыі. Змест іх быў далёка не аднолькавы. Частка гімназістаў, сыны польскіх памешчыкаў, прапаведвалі нянавісць да ўсяго рускага. Але ў гімназіі існаваў і другі гурток (сярод яго кіраўнікоў быў Уладзіслаў Барзабагаты, у далейшым актыўны ўдзельнік паўстання 1863 года ў Беларусі), які абвясціў сваім дэвізам сяброўства і братэрства з рускім

[215] Korzon T. Mój pamiętnik przedhistoryczny. Kraków, 1912. S. 22.

народам[216]. Юнаму Трусаву трэба было разабрацца ва ўсім гэтым. Ёсць усе падставы думаць, што ўжо ў той час яго сімпатыі былі поўнасцю на баку гуртка Барзабагатага.

Асабліва ўзмацніліся рэвалюцыйныя настроі ў гімназіі ў сувязі з падзеямі «вясны народаў» — рэвалюцыі 1848 года. Царскім уладам удалося знайсці тут рэвалюцыйныя пракламацыі. Пасля следства два вучні былі сасланы, а больш за шэсцьдзесят чалавек пакараны розгамі. Экзекуцыю праводзілі перад строем вучняў у прысутнасці губернатара і ўсіх губернскіх і гімназічных улад. Поўную порцыю «бярозавай кашы» (100 розгаў) атрымаў У. Барзабагаты[217]. Але дарэмна начальства цешыла сябе надзеяй, што гэты раз яно з карэннем вырвала крамолу ў гімназіі. У час Крымскай вайны на «супольнай кватэры» (у вялікіх казармах для бедных вучняў) былі зноў выяўлены «падрыхтаванні да паўстання»[218]. Але Трусаў да гэтага часу пакінуў гімназію: у чэрвені 1853 года ён скончыў гімназічны курс і пачаў рыхтавацца да паступлення ва універсітэт.

2

Выбар універсітэта для Трусава прадвызначаўся тым, што яго старэйшы брат Баляслаў атрымаў да гэтага часу месца выкладчыка ў адной з маскоўскіх гімназій. Але яшчэ больш Масква прыцягвала Антона сваімі рэвалюцыйнымі і культур-

---

[216] Dybowski B. Pamięci Józefata Ohryzki // Biblioteka warszawska. 1907. T. 2 (266). S. 225.

[217] Kowalewska Z. Obrazki mińskie... S. 20–21; Чапко В. 1848 год у Беларусі // Беларусь. 1958. № 1. С. 31.

[218] Korzon T. Mój pamiętnik... S. 49.

нымі традыцыямі. Яна была асяродкам магутных духоўных сіл рускага народа.

10 ліпеня 1854 года Трусаў падаў прашэнне аб прыняцці яго ва універсітэт, паспяхова здаў уступныя экзамены і быў залічаны на першы курс медыцынскага факультэта. Але хутка, у сувязі з нейкімі невядомымі нам абставінамі, навучанне ва універсітэце ён спыніў. Знойдзенае намі пасведчанне універсітэта ад 10 верасня 1856 года гаворыць, што Трусаў «у жніўні месяцы 1854 года прыняты быў, па экзамене, у лік студэнтаў медыцынскага факультэта, на якім на працягу 1854/55 і 1855/56 акадэмічных гадоў слухаў прафесарскія лекцыі, але экзаменаў для пераходу на вышэйшы курс не здаваў, паводзін быў вельмі добрых, а цяпер паводле яго прашэння з ведамства універсітэта звольнены»[219]. Навучанне ён змог аднавіць толькі праз чатыры гады. У прашэнні ад 21 ліпеня 1860 года Трусаў пісаў: «Хатнія абставіны вымусілі мяне пакінуць універсітэт. Цяпер, калі яны змяніліся, асмельваюся самым пакорным чынам прасіць ваша правасхадзіцельства прыняць мяне без экзаменаў у лік студэнтаў Маскоўскага універсітэта». Да прашэння было прыкладзена «пасведчанне аб беднасці», якое давала права на вызваленне ад платы за навучанне. У журнале універсітэцкага савета ад 6 кастрычніка 1860 года ёсць адзнака аб залічэнні Трусава ў спісы студэнтаў. Ці працяглае было яго навучанне на гэты раз, цяжка сказаць. Ва ўсякім выпадку, яго прозвішча называецца ў спісе студэнтаў універсітэта, якія паходзяць «з Заходняга краю», складзеным у верасні 1861 года[220].

---

[219] ДГАМВ [ЦГАМ]. Фонд 418. Вопіс 29 (1860). Спр. 670. Арк. 2, 1, 26.

[220] ДГАМВ [ЦГАМ]. Фонд 418. Вопіс 30 (1861). Спр. 710. Арк. 14.

Навучанне Трусава ва універсітэце супала з уздымам грамадскага руху ў Расіі, які з'явіўся адным з асноўных элементаў рэвалюцыйнай сітуацыі канца 50-х — пачатку 60-х гадоў. Чарнышэўскі і Герцэн, «Современник» і «Колокол» былі ідэйнымі правадырамі і настаўнікамі для перадавой дэмакратычнай моладзі ўсіх нацыянальнасцей. Кожны народ рабіў свой уклад у справу вызвалення і сваім шляхам прыходзіў да думкі аб неабходнасці рэвалюцыі. У гарачых спрэчках, у змаганні за агульныя мэты нішчыліся адвечныя нацыянальныя перагародкі, гартаваліся сплавы цудоўнай чысціні і трываласці, выкрышталізоўваўся ўзор паслядоўнага рэвалюцыянера-дэмакрата. Сцяг рэвалюцыйнага дэмакратызму, на якім было напісана патрабаванне скасаваць памешчыцкае землеўладанне і даць народам права на самавызначэнне, збіраў вакол сябе ўсё больш і больш прыхільнікаў.

На жаль, у нас няма пакуль што звестак аб удзеле Трусава ў студэнцкім руху, але ўся сукупнасць фактаў дазваляе амаль беспамылкова вызначыць яго месца ў шэрагах маскоўскага рэвалюцыйнага студэнцтва.

Студэнты з польскіх зямель і заходніх губерняў з даўняга часу ўваходзілі ў Маскоўскім універсітэце ў адно нелегальнае «Таварыства» («Ogół»), якое падзялялася на Каронную, Русінскую, Жмудскую, Мінскую, Віленскую і іншыя гміны (зямляцтвы) паводле тэрытарыяльнай прыкметы[221]. Ужо ў гэтым падзеле быў элемент сацыяльнай дыферэнцыяцыі. Паводле ўспамінаў Тадэвуша Корзана, які навучаўся ў Маскоўскім універсітэце ў другой палове 50-х гадоў,

[221] Паказанні Браніслава Люгайлы ад 20 верасня 1863 г. (ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1863. Спр. 23. Ч. 313. Арк. 9–10).

нешматлікія выхадцы з польскіх зямель, Валыні і Падоліі, якія складалі Каронную і Русінскую гміны, былі з багатых сем'яў і ўвасаблялі арыстакратычныя вяршкі сярод студэнцтва. Зусім іншае асяроддзе прадстаўлялі навучэнцы з Беларусі і Літвы, якія ў «Таварыстве» складалі большасць. Са старонак успамінаў яны паўстаюць перад намі «ў пацёртых мундзірах, пакамечаных капелюшах, са шпагамі, якімі памешвалі галавешкі ў печы, і ўсялякімі прыкметамі дэмакратычнай нядбайнасці ... »[222]

У тых жа ўспамінах мы знаходзім звесткі аб тым, што ў асяроддзі польскага (больш дакладна: польска-літоўска-беларускага) студэнцкага «Таварыства» ўзнікалі палітычныя групоўкі, тэрытарыяльныя гурткі-зямляцтвы паступова ператвараліся ў арыстакратычныя і дэмакратычныя, манархічныя і рэспубліканскія, каталіцкія і атэістычныя. Як і вялікі беларускі рэвалюцыянер Каліноўскі ў Пецярбургу, Трусаў у Маскве прымыкаў да левага, рэвалюцыйна-дэмакратычнага, крыла студэнцкага «Таварыства».

Вялікі ўплыў на фарміраванне светапогляду Трусава зрабілі рускія рэвалюцыйныя студэнцкія гурткі. Асабліва важнае значэнне меў гурток П. Р. Заічнеўскага і П. Э. Аргіропула, які выступіў у маі 1862 года з сацыялістычнай праграмай, сфармуляванай у пракламацыі «Маладая Расія». У складанні пракламацыі прымаў удзел зямляк Трусава — рэвалюцыйны паэт, мінчанін І. І. Гольц-Мілер. Яшчэ больш плённая была дзейнасць гуртка, які ўзнік у канцы 50-х гадоў і быў вядомы пад назвай «Бібліятэка казанскіх студэнтаў». На аснове гэтага гуртка, які ўзначальвалі вучні М. Г. Чарнышэўскага —

[222] Korzon T. Mój pamiętnik ... S. 25.

Юрый Масалоў і Мікалай Шацілаў, вырасла ў жніўні 1862 года Маскоўскае аддзяленне першай усерасійскай рэвалюцыйнай арганізацыі «Зямля і воля»[223].

Важным дасягненнем грамадскага руху 60-х гадоў было ўмацаванне ідэі руска-польскага рэвалюцыйнага саюзу, традыцыі якога бяруць пачатак яшчэ з часоў дзекабрыстаў і Лістападаўскага паўстання 1831 года. Можна назваць нямала яркіх прыкладаў супольных выступленняў рускіх і польскіх студэнтаў у Маскве. У сакавіку 1861 года студэнты-палякі наладзілі ў Маскве дэманстрацыю пратэсту супраць расстрэлу царскімі катамі мірнай маніфестацыі ў Варшаве. На сходзе з палымянай прамовай выступіў Пётр Заічнеўскі: «Мы павінны на пахаванні падаць адны другім руку, ісці да адной мэты. Вораг у нас адзін...» Сваё выступленне ён закончыў заклікам: «Няхай жыве сацыяльная Польшча!» Польскія студэнты адказалі на гэтую прамову «Адозвай да рускіх»[224].

Ідэя аб'яднання рускіх і польскіх рэвалюцыйных сіл у барацьбе супраць царызму знайшла сваё арганізацыйнае ўвасабленне ў перагаворах паміж варшаўскім рэвалюцыйным Цэнтральным нацыянальным камітэтам, рэдакцыяй «Колокола» і Цэнтральным камітэтам «Зямлі і волі» ў канцы 1862 года. Беларускія і літоўскія рэвалюцыянеры далучыліся да гэтага вялікага саюзу.

Вось якія шляхі прывялі Антона Трусава ў рады паўстанцаў 1863 года.

---

[223] Больш падрабязна гл.: Ткаченко П. С. Московское студенчество в общественно-политической жизни России второй половины XIX в. М., 1958. С. 24–54.

[224] Лемке М. Политические процессы в России 1860-х гг. М.; Пг., 1923. С. 7, 22–23.

Да апошняга часу ў нашым распараджэнні не было матэрыялаў, якія сведчылі б аб рэвалюцыйнай дзейнасці Трусава напярэдадні паўстання. Знойдзеныя нядаўна паказанні паўстанцаў з атрада Трусава даюць магчымасць у нейкай меры папоўніць гэты недахоп. Асабліва цікавымі з гэтага пункту гледжання з'яўляюцца паказанні Вітальда Гейштара, маладога канцылярыста-разначынца. З іх высвятляецца, што Трусаў яшчэ ў 1861 годзе вёў рэвалюцыйную агітацыю ў Мінску. «...З самага пачатку дэманстрацый у г. Мінску (г. зн., як відаць, улетку 1861 г. — *Г. К.*), — паведамляе Гейштар, — я пазнаёміўся са студэнтам Маскоўскага універсітэта Антоніем Трусавым. У вольны час, што заставаўся ад службы і сямейных клопатаў, я наведваў яго. Размовы ў большасці былі аб неабходнасці абуджэння ўсеагульнага духу ў народзе, і лічылі, што спяваны гімн гэтаму шмат служыць...»[225] Следчая камісія, якая праяўляла павышаную цікавасць да Трусава як да «аднаго з галоўных дзеячаў паўстання» задала Гейштару дадатковае пытанне: «Дзе Вы пазнаёміліся з Трусавым?» Адказ паўстанца дае ў рукі гісторыка прынцыпова важную характарыстыку Трусава як рэвалюцыянера-дэмакрата: «З часу з'яўлення Трусава ў г. Мінску, як вядома, у простанародным адзенні, ён мяне зацікавіў, і я стараўся ўсяляк з ім пазнаёміцца, тым больш што пра яго гаварылі як пра чалавека, які прыняў на сябе **не толькі вонкавую форму селяніна, але што і яго**

[225] Дело Штаба Виленского военного округа по судному отделению о канцелярских чиновниках Александре Држневиче, Доминике Кржижановском, Иосифе Пекарском, Доминике Жуковском, Витольде Гейшторе и Леоне Хруцком, временноотпускном рядовом Иване Жмачинском и кантонисте Каспере Криштофе. Начато 5 июля 1863 г. Кончено 7 июня 1884 г. На 209 листах (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 59 адв.).

мэта і прапаганда імкнецца да дасягнення роўнасці ў класах народа (вылучана намі. — *Г. К.*). Нарэшце не памятаю, з якім студэнтам мы зайшлі да яго дадому, і з таго часу пачалося наша знаёмства»[226]. Гэтае сведчанне кідае яркае святло на светапогляд Трусава, яно ясна паказвае, у імя якіх ідэй узяў у рукі зброю ў 1863 годзе слаўны беларускі рэвалюцыянер. Даследчык не пройдзе таксама міма сведчанняў аб яго дэмакратычным акружэнні. «Назавіце тых асоб, якіх Вы бачылі часцей за іншых у Трусава», — зноў запытала камісія. «У мінулым годзе, калі я пазнаёміўся з Трусавым, улетку бачыў у большасці студэнтаў універсітэта, мне незнаёмых...» (арк. 68), — паведаміў Гейштар. Паводле слоў другога паўстанца-трусаўца, Васіля Канапацкага, Трусаў тады «пастаянна жыў у г. Мінску пры бацьку сваім... Чым ён займаўся, я станоўча не ведаю, а здаецца — ці не выкладаннем урокаў па розных дама́х»[227].

У паказаннях Гейштара ёсць таксама звесткі аб распаўсюджванні Трусавым у Мінску нелегальнай літаратуры. «Некаторыя з газет, — паведамляў паўстанец, як напрыклад «Рух» (орган рэвалюцыйнага Цэнтральнага камітэта ў Варшаве. — *Г. К.*), мне два ці тры нумары трапілі ад Трусава, але якім шляхам прыходзілі да яго, мне невядома»[228].

Мяркуючы па ўсім, Трусаў напярэдадні паўстання знаходзіўся ў цэнтры дзейнасці мінскай рэвалюцыйнай арганіза-

---

[226] Тамсама. Арк. 62.

[227] Дело военно-судное политическое Штаба ВВО по судной части о не утвержденном герольдиею в дворянстве писце Минской палаты гражданского суда Василии Конопацком, сужденном за бытность в шайке мятежников. Началось 17 марта 1867 г. Кончено 30 ноября 1867 г. (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 674. Арк. 19).

[228] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 68.

цыі. Трэба сказаць, што склад і дзейнасць мінскай арганізацыі 1861–1862 гадоў яшчэ зусім не вывучаныя, і тут гісторыку пакуль даводзіцца ісці нібы ўпоцемку — навобмацак. Але, бясспрэчна, у склад яе ўваходзіла дачка В. Дуніна-Марцінкевіча Каміла. Буйную ролю адыгрываў у арганізацыі і служачы Мінскай палаты дзяржаўных маёмасцяў Карл Станкевіч.

Відаць, па заданні і з дапамогай гэтай арганізацыі Трусаў, каб мець непасрэдны ўплыў на сялян, у канцы 1862 года ўладкаваўся на пасаду пісара ў Латыголіцкае валасное праўленне Барысаўскага павета. У кожным разе сусед Трусава па Латыголічах былы чыноўнік міністэрства дзяржаўных маёмасцяў К. Свяжынскі ў сваіх паказаннях звязвае яго імя менавіта з К. Станкевічам: «З Трусавым я пазнаёміўся ў першы раз на кватэры ў п. Станкевіча, перад самым яго ад'ездам на пісарскую пасаду. П. Станкевіч прасіў мяне, каб я яго ўзяў з сабой, таму што ён не мае за што праехаць. Я яго ўзяў з сабой, і раз былі калядныя святы, дык па чалавекалюбстве затрымаў яго на працягу святочных дзён». Гэта быў «чалавек даволі прыемны на людзях і вясёлы»[229], — дадае Свяжынскі.

Мела дачыненне да дзейнасці мінскай рэвалюцыйнай арганізацыі і васемнаццацігадовая сястра Трусава — Эмілія. Ужо ў канцы 1863 года ў рукі царскіх следчых трапіў ліст з Казані ад красавіка 1863 года, у якім адзін з сасланых удзельнікаў рэвалюцыйнага руху пісаў, «што ён ведае аб мяцяжу, які мае быць увесну, што перапіска вялася пад адрасам новай сястры Эміліі Тр...»[230]. Гэтае скарачэнне і было прычынай з'яўлення ў студзені 1864 года паліцыі на кватэры сартаваль-

[229] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 939. Арк. 299 адв. — 300.

[230] Тамсама. Спр. 492. Арк. 96–97.

ніка мінскага паштамта Данілы Трусава па Юр'еўскай вуліцы ў доме Шульцавай. У выніку вобыску былі знойдзены «дзве жаночыя з простага шэрага сукна світкі». Падобная сялянская вопратка была ў той неспакойны для царскіх улад час забаронена для гараджан, і маладой дзяўчыне прыйшлося задумацца над пытаннем следчай камісіі: «Каму належаць знойдзеныя ў Вас пры вобыску... світкі, што азначае гэты касцюм і для якой мэты зроблены?» «Світкі гэтыя, — адказала Эмілія, — належаць мне і сястры маёй Юліі, пашылі іх два гады таму, калі ўсім падобны касцюм дазвалялася насіць, без усякай асаблівай мэты, а выключна для ашчаднасці, каб не зношваць лепшага адзення, зрэшты публічна ў гэтых світках нікуды мы не выходзілі, а насілі іх дома». Гэта тлумачэнне царскія следчыя, зразумела, не ўзялі пад увагу. Паводле канфірмацыі памочніка галоўнага начальніка краю генерала Патапава ад 7 верасня 1864 года, было вырашана «дзяўчыну Эмілію Трусаву за зносіны з палітычнымі злачынцамі і нашэнне забароненай адзежы падвергнуць грашоваму штрафу... у колькасці трохсот руб. срэбрам і аддаць пад апеку і адказнае паручыцельства яе бацькоў ці бліжэйшай радні, з устанаўленнем апроч таго за ёю строгага паліцэйскага нагляду». Такой вялікай сумы грошай сям'я напаўжабрачага сартавальніка не магла знайсці пры ўсім жаданні. 21 кастрычніка быў складзены акт аб неплацёжаздольнасці.

Улады «велікадушна» замянілі штраф турэмным зняволеннем.

Мы падрабязна спыніліся на гэтым эпізодзе, бо ён яскрава характарызуе абставіны жыцця беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата, якія не маглі не ўплываць на яго адносіны да навакольнага свету.

3

Полымя паўстання, якое выбухнула ў Польшчы, Літве і Беларусі, азарыла сваім святлом усю Расію і Еўропу...

Мінская губерня павінна была выступіць 19 красавіка (ст. ст.). Падрыхтоўкай паўстання ў ваенных адносінах тут кіраваў паручнік Пецярбургскай артылерыйскай акадэміі Станіслаў Ляскоўскі, член ваеннага гуртка Зігмунта Серакоўскага, цесна звязанага з «Зямлёй і Воляй». Паводле сведчання сучасніка, «малады Ляскоўскі адыграў у Мінску тую ж ролю, што Серакоўскі ў Жэмайціі»[231]. Бліжэйшым паплечнікам Ляскоўскага быў Антон Трусаў. Калі складалі план партызанскай вайны, вельмі прыдалося добрае веданне Трусавым Мінскай губерні. Вырашана было дзейнічаць уздоўж чатырох паштовых трактаў: Віленскага, Барысаўскага, Бабруйскага і Нясвіжска-Слуцкага.

...Уначы з 18 на 19 красавіка ў многіх дамах Мінска не спалі. Напярэдадні члены гарадской рэвалюцыйнай арганізацыі атрымалі загад выйсці па адным з горада і з'явіцца на загадзя намечаныя зборныя пункты. Найбольш сабралася паўстанцаў паблізу Халяўшчыны, Кургана, ці Арэхаўкі, на ўсход ад Мінска — пад камандай Трусава. Некаторыя крыніцы называюць нават лічбу ў 300 паўстанцаў, але, здаецца, у сапраўднасці іх было значна менш. Тут былі студэнты, маладыя канцылярысты, рамеснікі, гімназісты. Не хапала зброі, апрача гэтага — толькі нямногія паўстанцы ўмелі абыходзіцца з ёю. Няма нічога дзіўнага, што ў першым жа баі — 28 красавіка ля вёскі Пятровічы або Пятроўшчына

[231] Koszczyc W. Wspomnienia z powstania... S. 207.

(паводле некаторых крыніц, пад Бараўлянамі) — паўстанцы былі разбіты рэгулярнымі царскімі войскамі.

Вось што чытаем пра гэты бой у афіцыйным «Журнале ваенных дзеянняў»:

«Камандзіраваны 25 красавіка з Ігумена з атрадам у 160 чалавек пяхоты[232] для праследавання шайкі, што з'явілася ў вёсцы Нізавое (Няжэўка), капітан Багаеўскі накіраваўся... на вёску Чарнавая, адкуль мяцежнікі гадзіны за тры да яго надыходу ўкрыліся ў балоцістыя лясы. Потым, даведаўшыся, што яны начавалі ў лясах каля вёскі Шабуня, Багаеўскі 27-га, досвіткам, кінуўся за імі ў пагоню... 28 чысла шайка гэтая была напаткана каля вёскі Пятровічы (у 27 вярстах ад Мінска). Паводле данясення Багаеўскага, мяцежнікаў забіта да 30 чалавек, трое ўзята ў палон, трое паранена; раненыя адпраўлены ў Мінск, па дарозе з іх памерлі двое (трэці ранены — адстаўны юнкер 1 артылерыйскай брыгады Стэфан Пянькевіч); з нашага боку паранены адзін радавы і, ужо пасля справы, на прывале, батальённы лекар Данілаў — з лесу.

Разбітая капітанам Багаеўскім шайка, каля 70 чалавек, склалася з дзвюх: адна, пад начальствам чыноўніка Мінскай грамадзянскай палаты Канапацкага, выйшла 19 красавіка з Мінска па Барысаўскім тракце; другая, пад начальствам студэнта Трусава, — таксама з Мінска па Ігуменскай дарозе. Пасля злучэння гэтых дзвюх шаек каля вёскі Няжэўкі да іх далучылася яшчэ трэцяя — мінскага землямера Красоўскага; усе яны паступілі пад начальства Трусава, які называў сябе Цітус»[233].

---

[232] Рота, мяркуючы па ўсім, Сеўскага пяхотнага палка.

[233] Дело Штаба ВВО, отделения строевого, о военных действиях в Минской губернии. Начато 24 февраля 1863 г. Кончено 30 декабря 1863 г. (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 761. Арк. 40).

Адзначым, што гэты псеўданім Трусава сустракаецца і ў іншых крыніцах. Запіс у журнале грунтаваўся на данясенні Багаеўскага. Зразумела, лічба забітых паўстанцаў тут, як звычайна ў рапартах карнікаў, завышана. Можна нават сумнявацца — ці былі яны наогул. У кожным разе ў сваім першым данясенні непасрэднаму начальніку — камандзіру 4-га батальёна Сеўскага палка — Багаеўскі зусім не ўпамінаў пра забітых і адзначаў толькі, што ўзята ў палон трое раненых і захоплены трафеі — 5 стрэльбаў, 2 пісталеты, 10 фунтаў пораху, 5 коней, павозка, 100 куль, 20 парахаўніцаў і розная збруя. Як бачым, трафеі былі невялікія (падлічылі нават колькасць куль!) — гэта пераканаўча сведчыць і аб невялікіх памерах паражэння. Вывад Багаеўскага — «шайка сапраўды знішчана» — быў прынамсі заўчасным.

Цяпер мы ведаем, што Трусаву ўдалося сабраць вакол сябе рэшткі разбітага атрада. Неўзабаве адбылася новая сутычка Трусава з царскімі войскамі. Гэта было 30 красавіка ля вёскі Сініло. Войскамі камандаваў тут камандзір 7-й роты Велікалуцкага пяхотнага палка штабс-капітан Іляквіч. З яго рапарта мы даведваемся пра акалічнасці гэтай сутычкі. Рота, якой камандаваў Іляквіч, толькі што закончыла адпачынак у вёсцы Сініло і ў 2 гадзіны ночы збіралася ісці далей па маршруце. У гэты час у вёску з боку Смілавіч уляцелі 15 «інсургентаў» на трох параконных падводах. Салдаты кінуліся да падвод. Адтуль грымнулі стрэлы. 8 паўстанцаў было захоплена, астатнім удалося ўцячы. Неадкладна на пошукі ў розныя бакі былі накіраваны салдацкія каманды. Праходзячы ланцугом у дзвюх вярстах ад вёскі, салдаты ўбачылі паўстанцаў, якія беглі з лесу да

рэчкі. Пастраляўшы, паўстанцы кінуліся ўплаў, і толькі іх і бачылі[234].

Рапарт Іляквіча цікава параўнаць з запісам у «Журнале ваенных дзеянняў»: «У гэты ж дзень атрыманы весткі аб намеры мінскіх паўстанцаў зрабіць беспарадкі ў самім горадзе. Хаця цяжка меркаваць, каб яны рашыліся на нешта сур'ёзнае ў горадзе, які мае батарэю артылерыі і 10 рот пяхоты; тым не менш нельга было цалкам адмаўляць магчымасць якога-небудзь неразумнага з іх боку замаху: рашыліся ж 30 красавіка 15 чалавек распачынаць справу з цэлай ротай у Сініло. Таму ў горадзе прыняты самыя строгія меры засцярогі»[235]. У Мінск, магчыма, і вёў Трусаў сваіх байцоў. Сустрэча з войскамі пад Сініло была, бадай, зусім нечаканай для паўстанцаў. Адносна камандзіра захопленыя тут паўстанцы памоўчвалі ці гаварылі нешта не зусім зразумелае пра нейкага «студэнта Грышку». І толькі некаторыя прызналіся, што «ў ліку 7 чалавек, што ўцяклі ў час затрымання, быў начальнік нейкі Трусаў»[236]. Патаемнымі лясными сцежкамі павёў ён уцалелых байцоў у Ігуменскую пушчу, каб далучыцца да атрада Ляскоўскага.

Матэрыялы следчых камісій, паказанні захопленых у палон паўстанцаў малююць Трусава як адважнага рэвалюцыянера і кіраўніка атрада. Падзеі 1863 года ў Беларусі былі вельмі складаныя. Побач з сацыяльнымі матывамі важнейшай рухальнай сілаю для паўстанцаў былі ідэі нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Асобныя паўстанцы пераносілі нянавісць да царскага ўрада на ўсё рускае. Выказвалася таксама ідэя аб далучэнні Беларусі да Польшчы. У гэтых умо-

---

[234] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 7.
[235] Тамсама. Спр. 761. Арк. 43.
[236] Тамсама. Спр. 121. Арк. 38.

вах вялікае значэнне мела растлумачальная работа Трусава сярод паўстанцаў. Паводле паказанняў паўстанцаў, захопленых пад Сініло, Трусаў няспынна прапагандаваў думку аб сяброўстве з рускім народам, тлумачыў байцам, што «**ворагам сваім яны павінны лічыць не рускі народ, а рускі ўрад**»[237].

У дакументах знаходзіць адлюстраванне напружаная, самаахвярная дзейнасць Трусава ў Мінску ў апошнія дні перад узброеным выступленнем. Бадай, толькі ў гэты час рэвалюцыйная арганізацыя выкрышталізавалася і прыняла канчатковы выгляд. Вось паказанні В. Гейштара: «... У далейшым, калі пачалі арганізацыю, і гэта перад самым Вялікаднем, я, вярнуўшыся з водпуску, даведаўся, што прыехаў Трусаў у горад, таму што яго ў горадзе доўга не было (ён знаходзіўся ў Латыголічах. — *Г. К.*), пайшоў да яго, і ён прапанаваў мне быць у яго дзесятку, а таму мяркую, што арганізацыя наладжвалася такім жа чынам, як у Царстве Польскім, але нас навучалі трымаць у самай глыбокай таямніцы, што належу да арганізацыі і да каго менавіта...»[238] Нават члены аднаго і таго ж дзесятка, паводле слоў Гейштара, часцяком не ведалі, што ў іх агульны дзесятнік. У сувязі з найстражэйшай канспірацыяй, што была пакладзена ў аснову арганізацыі, Гейштар, які даволі блізка ведаў Трусава, мог толькі меркаваць аб яго сапраўдным становішчы ў колах рэвалюцыянераў: «Я яго проста лічыў дзесятнікам сваім, а ведаў, што, ма-

---

[237] ЦДВГА [РДВГА]. Фонд ВУА. Спр. 1310. Арк. 191; ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 21 адв. (паказанне Іосіфа Пякарскага). На судзе Пякарскі пацвердзіў: гэтыя словы чуў ад Трусава «ў час знаходжання майго ў шайцы» (Тамсама. Арк. 106 адв.).

[238] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Воп. 1. Спр. 121. Арк. 60.

быць, ёсць і сотнікі, але хто ён быў у сапраўднасці, дык пераканаўся, калі прыйшоў на пункт (збору паўстанцаў. — *Г. К.*) і ён стаў называцца начальнікам, дык у той час мяркуючы, што начальнікі, мабыць, прызначаюцца з сотнікаў, цяпер магу вывесці, што ён быў сотнікам» (арк. 67–68).

Трусаў быў выдатным арганізатарам і прапагандыстам. У следчых справах зафіксавана нямала прыкладаў яго моцнага ўздзеяння на навакольных, умелага падыходу да людзей самага рознага сацыяльнага становішча. Вось у кандытарскай на Зборавай вуліцы ён падыходзіць да беспрацоўнага перапісчыка Дамініка Кржыжаноўскага, садзіцца поруч, просіць у яго газету, знаёміцца з ім... Цяжка сказаць, наколькі правільна перадае Кржыжаноўскі характар сваіх сустрэч з Трусавым, аднак, як відаць, рэвалюцыянер-агітатар прывабіў свайго суразмоўцу расказам пра шырокія дэмакратычныя пераўтварэнні, што адбудуцца ў вызваленай ад цара і памешчыкаў Беларусі. Слова «канстытуцыя» неаднаразова фігуруе ў паказаннях Кржыжаноўскага, і кожны раз у сувязі з імем Трусава: «...Трусаў, прыцягваючы мяне да сябе, пастаянна гаварыў, што, як я сам ведаю пэўна, у Царстве Польскім ужо даўно вайна і б'юцца за зварот канстытуцыі, так цяпер і на Літве таксама патрабуюць той жа канстытуцыі і што кожны сумленны чалавек павінны ісці на вайну...» (арк. 56–57).

У Мінску было нямала людзей, гатовых і без усялякай агітацыі стаць на барацьбу з самаўладствам. Такі, напрыклад, 24-гадовы Аляксандр Држневіч, былы студэнт Маскоўскага універсітэта, які ведаў Трусава яшчэ па гімназіі. Држневіч служыў памочнікам сталаначальніка ў Мінскай палаце грамадзянскага суда і яшчэ ў 1861 годзе быў арыштаваны царскімі

ўладамі за ўдзел у спяванні рэвалюцыйна-патрыятычнага гімна. «18 мінулага красавіка, раніцаю, — расказаў Држневіч у следчай камісіі, —запытаны я быў на вуліцы адным з жыхароў г. Мінска Антонам Трусавым, ці прымаю я ўдзел у паўстанні. Я адказаў: «Так». — «Дык будзь гатовы ва ўсякі час, — сказаў ён, — магчыма, і заўтра давядзецца нам пакінуць Мінск». — «Я гатовы, — сказаў яму, — адзенне, бялізну, боты маю». — «Пры вышэйадзначанай размове з Трусавым, — працягваў паўстанец, — я заўважыў, што не маю ніякай зброі». — «Не турбуйся, — сказаў ён, — ружжо будзе, а толькі выходзь» (арк. 25–26).

Тое ж самае паведаміў і канцылярыст Дамінік Жукоўскі: «Трусаў сустрэў мяне на вуліцы, спытаў, ці пайду я, і калі я яму адказаў, што, магчыма, і пайду, дык сказаў мне, каб я ішоў з ім і што пра час выхаду мне скажа і ўсё патрэбнае, як: зброю, порах і кулі — сам дастане. На тое я згадзіўся». У сваіх паказаннях ён падкрэсліваў: «... Далучыўся ж да мяцяжу ўласна па загадзе сэрца, што дзе гінуць тысячы, там і мне не трэба ўхіляцца ...» (арк. 46–47, 50).

Адказны абавязак Трусаў усклаў на свайго даўняга знаёмага Васіля Канапацкага. Канапацкі добра запомніў гэты дзень, нягледзячы на тое што свае паказанні ён даваў праз тры з паловай гады: «... 19 красавіка 1863 года былы студэнт універсітэта Трусаў спытаўся ў мяне, ці пайду я ў лес, і, атрымаўшы згоду, загадаў прыйсці на кватэру афіцэра Ляскоўскага, а ў сувязі з тым, што я, не ведаю чаму, да Ляскоўскага прыйсці не мог, дык Трусаў прынёс мне загад з пячаткай Нарадовага жонда — на званне правадніка (далей у паказаннях гэты дакумент называўся «загадам Ляскоўскага». — *Г. К.*) і, уручыўшы 130 рублёў грошай, сказаў за Камароўкаю ў лесе прыняць

шайку мяцежнікаў і весці ў лес да вёскі Клінікі Ігуменскага павета...»[239]

Рваліся ў бой гімназісты. Вучань VII класа Павел Захараў (21 год, праваслаўны, «маю адну толькі сястру, рухомай і нерухомай маёмасці не маю») пайшоў у атрад проста з экзамену. «Я адправіўся ў мяцеж у красавіку 19 дня апоўдні разам з вучнем Мінскай гімназіі Віктарам Пранеўскім, які мяне выклікаў з класа»[240], — заявіў ён следчай камісіі ў студзені 1864 года, калі быў схоплены. Вучань Станіслаў Барташэвіч быў у атрадзе дзесятнікам[241]. Вось паказанні другога вучня, роля якога была таксама выдатнай. Ціт Красоўскі (20 гадоў, вучань землямерна-таксатарскіх класаў пры Мінскай гімназіі): «Да выхаду партый з Мінска 19 красавіка... знаёмы мне Вяржбіцкі, які арганізоўваў для мяцежніцкіх партый інсургентаў, запрасіўшы мяне ўдзельнічаць, даручыў сабраную ім партыю з 50 чалавек прыняць у маё распараджэнне, вывесці яе ў Валмянскія лясы і далучыць там да Трусава. 19 чысла па распараджэнні Вяржбіцкага ўсім паведамілі з'явіцца за тры мілі ад горада ў лес на месца, якое называецца Курганам, куды

---

[239] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 674. Арк. 6 адв. Канапацкі выканаў загад. Выйшаўшы праз Камароўку з горада, ён прыкладна 21 красавіка далучыўся да атрада Трусава паблізу вёскі Пуцічола. У момант злучэння ў Трусава было больш за 60 чалавек, у Канапацкага — 16 (Тамсама. Арк. 7, 15, 20).

[240] Дело Временного полевого аудиториата при штабе войск ВВО о дворянине Минской губернии Павле Захарове, сужденном за бытность в шайке мятежников (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 674. Арк. 56).

[241] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 2 (О писце Вилейского уездного суда Генрихе Новаковском, дворянине Минской губернии Карле Мелешкевиче, Михаиле Ивановском и др.). Арк. 61–62, 193 адв.

перад вечарам усе сабраліся. Зброя большай часткай была вывезена на падводах, а многія выйшлі ўзброенымі...»[242] І далей: «Мы былі ў Валмянскіх лясах, дзе і далучыліся да партыі, у якой быў Трусаў, які гаварыў, што чакае ваеннага начальніка, каго дакладна — не знаю, ён жа далей павёў, і былі каля Белай Лужы і Клёнікаў, нарэшце... у Пятровічах, дзе нагналі нас войскі 28 красавіка»[243]. Паранены пад Пятровічамі мінчанін Стэфан Пянькевіч (23 гады, былы артылерыйскі феерверкер, рыхтаваўся да паступлення ва універсітэт) быццам бы працягвае паказанні Ц. Красоўскага: «Такім чынам мы дайшлі да вёскі Пятровічы, а адтуль — цераз балота ў бліжэйшы лес. Там мы прастаялі ад суботы вечара да нядзелі, перад поўднем даведаліся праз пікету, што рускае войска прыйшло ў вёску Пятровічы... большасцю галасоў вырашылі выступіць на пазіцыю, г. зн. на поле перад лесам, туды ўжо праз некалькі мінут прыйшлі і войскі, і тут пачалася перастрэлка, але яна доўга не працягвалася... Атрымаўшы некалькі ўдараў штыкамі, я страціў прытомнасць і прыйшоў да памяці ўжо ў шпіталі»[244]. Спрактыкаванае вока былога салдата перш за ўсё ацаніла ўзбраенне і арганізацыю атрада: «Я ў партыі ўсіх застаў ужо ўзброенымі, і калі я прыбыў туды, дык Трусаў запытаўся ў мяне, ці маю я якое-небудзь узбраенне. Я адказаў, што не, дык ён і загадаў даць мне стрэльбу чалавеку, у якога была яшчэ акрамя стрэльбы нейкая піка. Партыя ж большай

---

[242] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 138 (О дворянине, бывшем ученике межевого института при Минской гимназии Тите Красовском). Арк. 16.

[243] Тамсама. Арк. 23.

[244] Дело Временного полевого аудиториата ВВО о дворянине Минской губернии Стефане Пенькевиче (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 92. Арк. 9).

часткай была ўзброена стрэльбамі, паўшаблямі, пісталетамі і пікамі... Партыя была падзелена на некалькі дзесяткаў, дык я быў змешчаны ў дзесятак Вяржбіцкага...» (арк. 11).

Хто такі Вяржбіцкі, чыё імя даволі часта сустракаецца ў паказаннях паўстанцаў з атрада Трусава?

Гэта мінскі шавец, які побач з Трусавым адыгрываў вельмі прыкметную ролю ў падрыхтоўцы ўзброенага выступлення ў Мінску. Паводле аднаго з паказанняў, «перад святам светлай нядзелі святой Вяржбіцкі ад праследавання ўрада тайна знік з Мінска, паспяваў скрытна з'яўляцца ў Мінск і паўтараў нагаворы»[245]. Непісьменны фурман акцызнага чыноўніка Сямён Змачынскі (30 гадоў, з вольных земляробаў) расказваў, што вёў агітацыйную работу «па падгаворы Вяржбіцкага і Трусава, якія пры кожнай сустрэчы з ім прасілі яго нагаворваць іншых да мяцяжу, таму што ён пастаянна раз'язджае па дварах, мястэчках і вёсках».

У далейшым Вяржбіцкі стаў дзесятнікам у атрадзе Трусава і памёр ад раны, атрыманай пад Пятровічамі.

Другі прадстаўнік гарадскіх «нізоў» — дваццацігадовы непісьменны вучань збраёвага майстра Міхаіл Іваноўскі — прывёў у атрад нямала рамесніцкай моладзі. Ён сагітаваў вучняў сталяра Рыгора Карловіча і Адама Казлоўскага, вучняў каваля Эдуарда Клемята, Антона Дарашэвіча, Рыгора Ухава (15 гадоў, праваслаўны, пісьменны). У атрадзе Трусава быў таксама васемнаццацігадовы вучань шаўца Каспер Крыштаф, з кантаністаў, праваслаўны[246].

---

[245] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 2. Арк. 70.

[246] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 2. Арк. 67; фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 41.

Наогул, паводле паказанняў, «у шайцы была большая частка з людзей ніжэйшага класа»[247]. Рамеснікі і іншыя прадстаўнікі гарадской беднаты ігралі ў атрадзе важную ролю, выконваючы функцыі сувязных і праваднікоў, даверaных людзей Трусава. Д. Кржыжаноўскі расказваў: «Красавіка 18-га (відавочна, 19-га. — *Г. К.*) апоўдні з Жукоўскім і Гейштарам (і яшчэ нейкі рамеснік за намі ззаду следаваў) выйшаў я з горада, накіраваліся ў Арэхаўку, дзе знайшлі некалькі чалавек. Адзін з іх, як відаць, з ніжэйшага саслоўя сказаў, што Трусаў яму загадаў нас завесці ў лес Арэхаўку. Мы і паследавалі за ім, дзе і сапраўды знайшлі Трусава з шайкаю» (арк. 54). Гэтую ж акалічнасць пацвярджае і Гейштар, які, прыйшоўшы на прызначанае месца, «пачуў умоўлены са свістулькі свіст. Падаспеўшы бліжэй, заўважыў, што гэта, напэўна, свае. Я наблізіўся, але з некалькіх асоб, як мяркую, рамеснікаў, не знайшоў ніводнага знаёмага. На запытанне, куды вам належыць цяпер адправіцца, сказалі, што ў лес, які завецца Шафарняю. Я ведаў аб гэтым месцы, як пункце, дзе мы павінны атрымаць зброю і амуніцыю, прапанаваў цяпер адправіцца туды, але сказалі, што трэба пачакаць, ці не далучыцца хто-небудзь болей, і, пачакаўшы, як здаецца, да 3 ці 4 гадзіны, адправіліся на пункт, дзе знайшлі ўжо і Трусава і шмат людзей узброеных»[248].

Држневіч у сваім паказанні прыводзіць цікавую дэталь, якая датычыць ужо таго часу, калі атрад Трусава выступіў у паход: «Каля Трасцянца знайшлі мы яшчэ чалавек да дзесяці з лішнім, відаць, з рамеснікаў, мяркуючы па простанароднай

[247] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 63 адв.

[248] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 61.

іхняй гаворцы (беларуская мова. — *Г. К.*). У ліку іх быў у кажушку і белым простанародным капелюшы здаровы малады чалавек з загарэлым тварам, які, перагаварыўшы з Трусавым, аб'явіў, што будзе нашым праваднікам і давядзе нас да «вялікай партыі» (Држневіч узяў у двукоссе беларускія словы. — *Г. К.*), і з гэтага часу мы ішлі за ім» (арк. 27). Прыведзеныя факты сведчаць, што Трусаў меў, відаць, надзейных прыхільнікаў у народзе. У яго атрадзе гучала беларуская гаворка.

Разам з тым дзеля гістарычнай праўды неабходна адзначыць, што сяляне на Міншчыне ставіліся да паўстання месцамі насцярожана і нават варожа, і не заўсёды паўстанцы мелі праваднікоў.

Маленькі красамоўны штрышок у паказаннях Ц. Красоўскага добра малюе суровыя абставіны барацьбы, цяжкае становішча жменькі паўстанцаў у глухіх лясах: «Дзе невядома была дарога, там ужывалася магнітная стрэлка з дапамогаю карты, якою дзейнічаў начальнік»[249].

З паказанняў вынікае таксама адна падрабязнасць, якая абумовіла многія цяжкасці баявога шляху Трусава. Прычына ў тым, што Трусаў не быў знаёмы з вайсковай справаю. Мяркуючы па ўсім, ён павінен быў іграць у атрадзе ролю палітычнага камісара. У паўстанцкай арганізацыі існаваў выразны падзел грамадзянскіх і ваенных улад. На пасты ваенных начальнікаў звычайна вылучаліся афіцэры рускай арміі, што перайшлі на бок паўстанцаў, або асобы, якія прайшлі замежную ваенную школу. Гейштар «у далейшым пераканаўся, што ён (Трусаў. — *Г. К.*) быў начальнікам цывільным». Відавочна, Трусаў павінен быў толькі сфарміраваць атрад і перадаць яго

[249] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 138. Арк. 21.

пад каманду вопытнага ваеннага начальніка. Аднак здарылася так, што ваенны начальнік (прозвішча яго нам невядома) не з'явіўся ў паўстанцкі лагер ці не здолеў да яго дабрацца.

Трусаў трапіў у вельмі цяжкае становішча. Паказанні Гейштара, напрыклад, даюць магчымасць зірнуць на падзеі з пункту погляду радавога паўстанца: «...Пасля гэтага адправіліся лесам сам не ведаю куды, а толькі чуў, што на пункт, дзе павінны знайсці ваеннага начальніка... Хопіць таго, што дарога, па якой мы ішлі, для мяне была зусім незнаёмая і ўсё хадзілі прасёлачнымі дарогамі, рэдка калі выходзілі на бальшак і то хутка яго пакідалі, адзін раз гаварылі, што мы ў Ігуменскім павеце, другі раз, што ў Барысаўскім, і ў такіх пастаянных паходах удзень і ўначы хадзілі амаль тыдзень, кожным разам абяцаючы прывесці нас на нейкі пункт, дзе будзе начальнік, але гэтыя паходы нас хутка знясілілі, пачаліся нараканні...»[250] У гэтых умовах Трусаву давялося ўзяць каманду на сябе. Толькі невялікую частку байцоў яму ўдалося давесці да больш буйнога атрада С. Ляскоўскага, які дзейнічаў на Ігуменшчыне.

Далейшы баявы шлях Трусава непарыўна звязаны з лёсам паўстанцаў Ляскоўскага. Аб'яднаны атрад Ляскоўскага і Трусава карыстаўся заслужанай славай у насельніцтва і рабіў нямала клопату царскім уладам.

У кабінеце Мураўёва ў Вільні быў велізарны шчыт з картай Літвы і Беларусі. Позірк Вешальніка ўсё часцей спыняўся на двух кружках у цэнтры шчыта — Мінск і Ігумен. Калі паўстанне гэта полымя, дык тут яго языкі больш за ўсё выбіваліся на ўсход. І гэта вельмі непакоіла Мураўёва.

---

[250] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 63.

30 мая 1863 года ён пісаў у Пецярбург міністру дзяржаўных маёмасцяў А. Зялёнаму: «...Ёсць значныя шайкі ў паветах Ігуменскім і Бабруйскім... іх праследуе войска»[251].

Атрад Ляскоўскага базіраваўся на Багушэўскую і суседнія пушчы, перакідваючыся часамі за Бярэзіну аж да азёраў Святое і Судобла ў Барысаўскім павеце. Удзельнік падзей 1863 года на Міншчыне ўспамінаў: «Даходзілі ўжо да нас весці, што Ляскоўскі слаўна ўмацаваўся ў Багушэўскай пушчы, нетры якой цудоўна падыходзілі да гэтага. Даследуючы... «puszcz litewskich przepastne krainy», паўстанцы знайшлі ў іх натуральныя ўмацаванні з велізарных калодаў і вывернутых дрэў, якія былі бязладна навалены адно на адно і стваралі абаронныя валы. Пры невялікай дапамозе чалавечай рукі ўзнікла крэпасць, аперазаная з трох рагоў лясными «засекамі» і «заваламі». Па сукаватых і разложыстых пнях і галінах густа вілася розная расліннасць, якая чэрпала жыццё сярод трупаў, што рассыпаліся. Гэтыя барыкады, што высока грувасціліся ў маляўнічым бязладдзі, нагадвалі старажытныя ўмацаванні славянскіх народаў і нялёгка даставаліся ворагу. Лясныя багны стваралі натуральны роў, які ўсё ж такі стрымліваў смеласць варожых пераходаў»[252].

Гэта быў цяжкі арэшак для царскіх улад, але летам 1863 года яны сур'ёзна наважылі яго раскусіць. «У Мінскай губерні спадзяюся таксама, што хутка ўстановіцца парадак; князь Яшвіль і Забалоцкі адправіліся ўжо, каб ачысціць ад мяцежных зборышчаў Ігуменскі і Барысаўскі паветы»[253], — паведаміў

---

[251] Муравьев М. Н. Письма к А. А. Зеленому: 1863–1864 // Голос минувшего. 1913. № 9. С. 259.

[252] Kowalewska Z. Ze wspomnień... S. 36–38.

[253] Муравьев М. Н. Письма к А. А. Зеленому... С. 262.

Мураўёў Зялёнаму 12 чэрвеня. Супраць атрада кінулі амаль усе войскі, што былі ў Мінскай губерні. Варожае кола вакол паўстанцаў замкнулася ў Багушэўскай пушчы. Вырвацца з акружэння паўстанцам удалося дзякуючы дапамозе беларускага селяніна, якога царскія войскі, магчыма, пад прымусам, узялі ў якасці праваднікa[254]. Падзяліўшыся на некалькі дробных партый, адна з якіх вытрымала 13 чэрвеня жорсткі бой пад Лочынам, паўстанцы ўдала выйшлі з-пад удару карнікаў. А праз некаторы час (23 ліпеня) паблізу Ігумена паўстанцы захапілі ў палон царскага генерала Грунта, начальніка 3-й рэзервовай пяхотнай дывізіі[255].

Аднак у бесперапынных баях сілы паўстанцаў паступова раставалі. Паводле паказанняў паўстанца штабс-капітана Мельхіёра Чыжыка, які пакінуў атрад Ляскоўскага і Трусава ў канцы кастрычніка 1863 года, у ім заставалася ўсяго каля 75 байцоў. Ён бачыў у атрадзе і Трусава[256]. 12 лістапада магілёўскі губернатар Бяклемішаў заклапочана пісаў Мураўёву, «што існаванне гэтай шайкі... тым небяспечнейшае, што пры пэўных акалічнасцях яна можа паслужыць ядром для больш значнай банды і выклікаць новыя беспарадкі на мяжы Магілёўскай губерні, чаму спрыяе і мясцовасць, пакрытая лясамі і балотамі»[257]. Па загадзе Мураўёва на паўстанцаў былі зноў накіраваны войскі з боку Мінска і Магілёва.

---

[254] Koszczyc W. Wspomnienia z powstania... S. 214–215.

[255] Rok 1863 na Mińszczyźnie. Mińsk, 1927. S. 42.

[256] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 265. Арк. 14, 12, 21.

[257] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1863. Спр. 1703 (О шайке мятежников под начальством Лясковского). Арк. 5.

Да зімы гэты апошні паўстанцкі атрад Беларусі быў распушчаны. Асобныя паўстанцы трымаліся ў мінскіх лясах да вясны 1864 года і нават пазней. Напрыклад, паўстанец-трусавец Васіль Канапацкі здаўся ўладам аж у кастрычніку 1866 года!

4

60-я гады выклікалі вялікі паток палітычных эмігрантаў з Расіі. Царскаму ўраду ўдалося адбіць націск рэвалюцыйнага лагера, і за мяжой шукалі ратунку ўцалелыя ўдзельнікі паўстання 1863 года, члены разгромленых рускіх рэвалюцыйных арганізацый. Руская і польская, беларуская і літоўская мовы загучалі на вуліцах гарадоў Еўропы. Сын беларускай зямлі Антон Трусаў, выратаваўшыся ад царскіх рэпрэсій, знайшоў прытулак у Францыі[258]. «Пасля ўцёкаў з Расіі, — чытаем у кнізе Б. П. Казьміна «Руская секцыя Першага Інтэрнацыянала», — Трусаў пасяліўся ў Парыжы, дзе зблізіўся з рэвалюцыйна настроенай моладдзю, з радоў якой выходзілі кіраўнікі французскіх секцый Інтэрнацыянала, а пазней удзельнікі Парыжскай камуны. Сярод гэтай моладзі

[258] Улады працяглы час шукалі Трусава. Яшчэ ў кастрычніку 1866 года царскі следчы, па даручэнні губернатара, задаў В. Канапацкаму пытанне: «Ці не вядома Вам у цяперашні час месца пражывання Антона Трусава, калі нават невядома, дык ці не мелі Вы пра гэтае якіх-небудзь чутак?» (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 674. Арк. 19). Якім шляхам уцёк Трусаў — невядома. Аднак цікава, што яго паплечнік С. Ляскоўскі ўцёк за граніцу праз Пецярбург з дапамогай рускай рэвалюцыйнай арганізацыі «Зямля і воля» (ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд Ш аддз. 1 эксп. 1863. Спр. 23. Ч. 640. Арк. 32, 3; Ч. 428. Арк. 13; Пантелеев Л. Ф. Воспоминания. М., 1958. С. 323).

Трусаў быў вядомы пад імем Антуана. Працаваў ён, як відаць, у якасці наборшчыка»[259].

Нялёгкія гэта былі часы ў жыцці рэвалюцыянера. Сябры выгнаннікаў — парыжскія рабочыя — мала чым маглі ім дапамагчы. Эмігранты ўладжваліся хто як мог. Пасечаны казацкімі шаблямі і цудам уцалелы палкоўнік паўстання Валерый Урублеўскі ў гэты ж час працаваў у Парыжы ліхтаршчыкам: чысціў газавыя лямпы на вуліцах, па вечарах запальваў, раніцай гасіў. У Трусава былі і свае асабістыя падставы для смутку. У турме пакутавала яго сястра. Неўзабаве ў турме апынуўся і яго старэйшы брат Баляслаў, асуджаны па т. зв. «каракозаўскай справе». Шырокае следства, наладжанае ўладамі ў сувязі з замахам Дз. Каракозава на цара ў 1866 г. (кіраваў следствам, між іншым, ужо выпрабаваны ў Літве і Беларусі Мураўёў), выкрыла ў Маскве шмат удзельнікаў рускай (пад кіраўніцтвам М. Ішуціна) і польскай (на чале з П. Маеўскім) рэвалюцыйных арганізацый. Гэтыя арганізацыі былі цесна звязаны паміж сабой. Яшчэ раней рускім і польскім рэвалюцыянерам у Маскве ўдалося арганізаваць уцёкі выдатнага польскага рэвалюцыянера Я. Дамброўскага. У апошні час сумесна абмяркоўвалася пытанне аб арганізацыі ўцёкаў з Сібіры М. Г. Чарнышэўскага[260]. У ліку асуджаных па «каракозаўскай справе» быў і настаўнік 3-й Маскоўскай гімназіі Баляслаў Трусаў, якога пасадзілі ў крэпасць на 8 месяцаў…

Дрэнныя весці прыходзілі з дому, не соладка было няхай у гасцінным, але чужым краі. Аднак Антон Трусаў знайшоў у

---

[259] Козьмин Б. П. Русская секция… С. 105.

[260] Федосова Т. Ф. Павел Маевский и первые попытки перевода романа Чернышевского «Что делать?» // Восстание 1863 г. и русско-польские революционные связи 60-х годов. М., 1960.

сабе сілы працягваць барацьбу. Пасябраваўшы з французскімі рэвалюцыянерамі, ён не парываў сувязей і з эмігрантамі — удзельнікамі паўстання 1863 года.

У 62-і том «Литературного наследства», дзе апублікаваны каштоўныя дакументы з так званай «Пражскай калекцыі» (захоўваецца цяпер у Цэнтральным дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва СССР (ДА РФ. — *Рэд.*)), закралася адна невялікая, але істотная для нас памылка. Пры публікацыі пісем польскага рэвалюцыянера Юзафа Такажэвіча да А. І. Герцэна няправільна прачытаны подпіс пад лістом ад 5 мая 1866 года[261]. Ён прыпісваецца нейкаму «польскаму эмігранту А. Трусу». На самай справе подпіс зроблены рукою Антона Трусава. Гэтым самым даводзіцца цесная сувязь Трусава з групай эмігрантаў, якія выдавалі «Гміну» — важны польскі рэвалюцыйна-дэмакратычны часопіс таго часу.

Самым галоўным у палітычнай праграме «Гміны» была ідэя руска-польскага рэвалюцыйнага саюзу, якую не магла пахіснуць няўдача паўстання 1863 года. Першы нумар часопіса, выдадзены ў верасні 1866 года, адкрываўся пісьмом да выдаўцоў «Колокола». Рэдакцыя і супрацоўнікі «Гміны» з павагай адносіліся да шматгадовай высакароднай дзейнасці А. І. Герцэна і М. П. Агарова і выказвалі салідарнасць з іх тэорыяй абшчыннага сацыялізму. «Гміна» бачыла асноўную прычыну няўдачы паўстання 1863 года ў непаслядоўнасці шляхецкага кіраўніцтва паўстаннем, якое не асмелілася высунуць лозунг ліквідацыі памешчыцкага землеўладання. Насуперак шляхецка-буржуазным нацыяналістам, на ста-

[261] Литературное наследство. М., 1955. Т. 62. С. 579.

ронках «Гміны» абвяшчалася права ўкраінцаў, беларусаў і літоўцаў на нацыянальцую незалежнасць[262].

Прыкладна ў гэты ж час Трусаў стаў членам «Інтэрнацыянальнага братэрства», арганізаванага Бакуніным. Гэта была тыповая анархісцкая арганізацыя, якая, як казаў яе заснавальнік, ставіла за мэту «вызваленне працы і працоўных шляхам разбурэння ўсіх палітычных дзяржаў» і адкідала палітычную барацьбу як буржуазную, якая нібыта «супярэчыць інтарэсам народных мас»[263]. Аднак вельмі хутка Трусаў разгледзеў за напышлівымі фразамі рэакцыйную сутнасць анархізму. Перш за ўсё звяртала на сябе ўвагу дзіўная беспрынцыповасць Бакуніна. Гаворачы пра адмаўленне ад палітычнай барацьбы, Бакунін увайшоў у адкрыта буржуазную Лігу міру і свабоды, якая, грунтуючыся на ліберальных пазіцыях, абвяшчала ідэі палітычнай свабоды і пацыфізму. Толькі пазней стаў вядомы патаемны сэнс паводзін Бакуніна. Шляхам аб'яднання Лігі з Міжнародным Таварыствам Рабочых ён разлічваў ператварыць гэту буржуазную арганізацыю ў ідэйны штаб Інтэрнацыянала. Калі на Бернскім кангрэсе Лігі ў верасні 1868 года яго план праваліўся, Бакунін разам са сваімі аднадумцамі выйшаў з Лігі, заявіўшы «калектыўны пратэст». Трусаў толькі пазней далучыў свой подпіс да гэтага пратэсту, што сведчыць аб пачатку яго сур'ёзных разыходжанняў з Бакуніным. Пакінуўшы кангрэс, вынаходлівы на розныя канспіратыўныя выдумкі Бакунін рашуча перамяніў арыентацыю, высунуўшы новы план авалодання Інтэрнацыяналам.

---

[262] Белявская М. Уступны артыкул да публікацыі пісем Ю. Такажэвіча // Литературное наследство. Т. 62. С. 575; История Польши. М., 1955. Т. 2. С. 245.

[263] Стеклов Ю. М. А. Бакунин. М.; Л., 1927. Т. 2. С. 441–442.

На нарадзе ў Берне была заснавана новая анархісцкая арганізацыя «Альянс сацыялістычнай дэмакратыі», пры дапамозе якой Бакунін марыў узначаліць рабочы рух ва ўсім свеце. Трусаў у гэту новую арганізацыю не ўступіў.

На Бернскім кангрэсе Лігі міру і свабоды адбылася падзея, якая крута павярнула далейшы лёс Трусава. Апошні сустрэўся там з Мікалаем Ісаакавічам Уціным. Ёсць падставы думаць, што Трусаў і Уцін былі знаёмы раней — яшчэ па Парыжу[264], але якраз гэтая сустрэча надоўга з'яднала іх шляхі.

У іх лёсе было шмат агульнага. М. І. Уцін — адзін з бліжэйшых вучняў М. Г. Чарнышэўскага, член Цэнтральнага камітэта «Зямлі і волі». Асуджаны царскім урадам на пакаранне смерцю, ён вымушаны быў уцячы за мяжу. У 1868 годзе Уцін разам з Бакуніным заснаваў у Жэневе часопіс «Народное дело», першы нумар якога выйшаў напярэдадні Бернскага кангрэса Лігі, 1 верасня 1868 года. Старонкі нумара былі запоўнены бакунінскімі анархічнымі заклікамі аб «канчатковым разбурэнні дзяржавы».

Вучань Чарнышэўскага, Уцін не мог падзяляць гэтых тэорый. Як і Трусаў, ён прыйшоў да думкі аб неабходнасці разрыву з Бакуніным. Рознагалоссі, што пачаліся ў рэдакцыі часопіса, дасягнулі свайго апагею якраз у час Бернскага кангрэса. Бакунін са сваімі аднадумцамі вымушаны быў пакінуць рэдакцыю. Уцін пачаў шукаць сабе новых супрацоўнікаў. Вернага паплечніка знайшоў ён у асобе Трусава. На загаловачным аркушы наступнага выпуску «Народного дела» (№ 2–3), які выйшаў у другой палове кастрычніка 1868 года, мы ба-

---

[264] Nettlau M. Élisée Reclus. Anarchist und Gelehrter. Berlin, 1928. S. 123.

чым ужо прозвішча Трусава, які быў сакратаром рэдакцыі. Акрамя Уціна і Трусава ў рэдакцыю ўвайшлі В. С. Левашова, В. І. Барценеў (псеўданім — В. Нетаў), Л. Л. Таманоўская (пазней удзельніца Парыжскай камуны, вядомая пад імем Лізаветы Дзмітрыевай) і інш. Склад рэдакцыі не абвяшчаўся. Шырокай грамадскасці было вядома толькі імя, а таксама адрас сакратара рэдакцыі Трусава, які быў нібы «паўпрэдам» усёй гэтай групы рэвалюцыянераў. «Канцлерам» рэдакцыі «Народного дела» называў яго А. І. Герцэн[265].

Пасля разрыву Уціна з Бакуніным рэдакцыя была вымушана арганізаваць новую друкарню. Клопаты на сябе ўзяў знаёмы з друкарскай справай Трусаў. «Дзякуючы энергіі Ант. Трусава, — піша Б. П. Казьмін, — гэтую перашкоду ўдалося пераадолець»[266]. Трэці выпуск «Народного дела» (№ 4–6) выйшаў у маі 1869 года, пасля працяглага перапынку, выкліканага абсталёўваннем новай друкарні. У верасні з'явіўся яшчэ адзін выпуск часопіса (№ 7–10).

У гэты ж час ставіцца пытанне аб аб'яднанні друкарні «Народного дела» з друкарняй герцэнаўскага «Колокола». Славуты часопіс, як вядома, з 1865 года выдаваўся ў Жэневе, а ў 1867 годзе яго выданне было спынена. Адносіны Герцэна з дзеячамі «Народного дела», як і наогул з прадстаўнікамі «маладой эміграцыі», былі складанымі, але ў нейкай меры «Народное дело» магло лічыць сябе спадчыннікам «Колокола». На гонар дзеячаў «Народного дела» трэба сказаць, што яны добра разумелі гістарычнае значэнне

---

[265] Герцен А. И. Полн. собр. соч. и писем / Под ред. М. К. Лемке. М., 1923. Т. 21. С. 535.

[266] Козьмин Б. П. Из истории революционной мысли в России. М., 1961. С. 550–551.

дзейнасці вялікага рускага рэвалюцыянера. У лісце Уціна да Трусава (канец мая — пачатак чэрвеня 1869 года) знаходзім характэрныя радкі, што датычаць Герцэна: «...Мы цэнім яго семнаццацігадовую працу, мы цэнім тую вытрымку, якой хапіла ў яго і якой не хапае ў іншых; мы можам ісці цяпер больш рэзкім шляхам, ён сам усведамляе гэта, і ён надзвычай сумленна і шчыра ўступае нам вядзенне прапаганды і выказвае спачуванне нашай справе, — такія адносіны нямногія ўмелі захаваць да справы, і звычайна старыя дзеячы ставіліся азлоблена і насмешліва да маладых, — гэтае азлабленне мы сустрэлі нават у Бакуніна, нягледзячы на яго fausse bonhomie (прытворную дабрадушнасць. — *Г. К.*); але мы не сустрэлі такога азлаблення ў Герцэна, і гэтая акалічнасць павінна яшчэ больш умацоўваць нашае рашэнне ставіцца да яго з той павагай, якую заслугоўвае семнаццацігадовая праца на карысць справы і свабоды, хаця б гэтая справа, ці, праўдзівей, практычны шлях да здзяйснення гэтай справы разумеўся ім інакш, чым намі, згодна з ходам часу і абнаўленнем пакаленняў»[267]. Копію гэтага пісьма, у якім высоўваліся ўмовы аб'яднання друкарняў, Трусаў пераслаў Герцэну. У ліпеньскім лісце да Уціна, напісаным у адказ, Герцэн раіў, што, «можа, было б добра, калі б Трусаў яшчэ пагаварыў з Чарнецкім»[268], які загадваў друкарняй «Колокола». На жаль, смерць Герцэна ў студзені 1870 года абарвала гэтыя перагаворы, і пагадненне не адбылося, хаця Герцэн, які менавіта ў гэты час — за год перад смерцю — парваў з Бакуніным, ішоў па тым жа шляху, што і дзеячы «Народного дела», — да Інтэрнацыянала.

---

[267] Литературное наследство. Т. 62. С. 688.

[268] Герцен А. И. Полн. собр. соч. и писем. Т. 21. С. 414.

Між тым супрацоўніцтва Трусава ў «апальным» «Народном деле» прывяло да канчатковага пагаршэння яго адносін з Бакуніным. Трусаў прымае дзейсны ўдзел у апазіцыі да Бакуніна, якая ўзнікла сярод членаў «Інтэрнацыянальнага братэрства».

Асабліва рэзка акрэсліліся рознагалоссі на нарадзе «братоў» у Жэневе ў пачатку 1869 года. 26 студзеня ўдзельнікі апазіцыі, у тым ліку і Трусаў, сабраліся на нараду ў Шапанэры. Разгневаны Бакунін паслаў следам за імі пісьмо, у якім заявіў аб выхадзе з цэнтральнага кіраўніцтва «Братэрства». Трусаў і яго аднадумцы паслалі адказ. Яны прымалі адстаўку Бакуніна, абвінавачвалі яго ў імкненні да асабістай дыктатуры і патрабавалі змены статута арганізацыі. Як сведчаць іншыя матэрыялы, члены «Братэрства» выказвалі незадаволенасць бакунінскай пропаведдзю палітычнага ўстрымання. Вясною 1869 года Бакунін быў вымушаны разаслаць членам «Братэрства» пісьмо аб роспуску гэтай арганізацыі[269].

Скончыўшы з бакунінскім «Братэрствам», Трусаў атрымаў магчымасць поўнасцю прысвяціць сябе «Народному делу».

5

У чытальнай зале Інстытута марксізму-ленінізму мы гартаем нумары «Народного дела». Амаль усе матэрыялы часопіса не падпісваліся. Таму цяжка вылучыць сярод іх напісанае Трусавым. Разам з тым няцяжка заўважыць, што гэтыя матэрыялы характарызуюцца адзінствам светапогляду,

[269] Стеклов Ю. М. А. Бакунин. Т. 2. С. 433–442.

адзінствам поглядаў на грамадскае развіццё. Як справядліва адзначае Б. П. Казьмін, у артыкулах часопіса выказваліся погляды «ўсёй групы», якая яго выдавала[270].

Важнай рысай светапогляду гэтай невялікай, але згуртаванай групы рэвалюцыянераў была вернасць лепшым традыцыям 60-х гадоў. На старонках часопіса з вялікай пашанай называецца імя М. Г. Чарнышэўскага, высока ацэньваецца дзейнасць «Зямлі і волі», нагадваецца «прамы і ясны» голас «Молодой России», які прагучаў у студэнцкія гады Трусава.

Супрацоўнікі часопіса называлі свае погляды сацыялістычнымі. Кожны радок на яго старонках прасякнуты верай у хуткую поўную перамогу сацыялізму. Аднак гэтыя перакананні грунтаваліся на ідэалістычнай аснове. Сацыялізм няўхільна пераможа, лічыла рэдакцыя, у выніку ўзняцця свядомасці народных мас. Удзельнікі групы не змаглі ўзняцца да разумення важнай высновы марксізму аб тым, што сацыялізм з'яўляецца натуральным, заканамерным вынікам развіцця прадукцыйных сіл і вытворчых адносін.

Гэтак жа ідэалістычна (хоць і вельмі высока) ацэньваецца на старонках часопіса дзейнасць Інтэрнацыянала. З узнікненнем Міжнароднага Таварыства Рабочых, на думку рэдакцыі, з'явілася «новая сіла ў развіцці чалавецтва, з якой воляй-няволяй даводзіцца лічыцца, таму што гэта — велізарная сіла, бо яна ўсвядоміла сама сябе і **накрэсліла сама сабе** (вылучана намі. — *Г. К.*) свой паслядоўны ход. Вось што абавязвае нас назваць ролю Інтэрнацыянальнай Асацыяцыі ў поўнай меры гістарычнай» (№ 7–10).

---

[270] Козьмин Б. П. Русская секция... С. 114.

Гэты ідэалістычны падыход да вырашэння асноўных пытанняў грамадскага развіцця не дазволіў рэдакцыі пераадолець народніцкі пункт гледжання на перспектывы перамогі сацыялізму ў Расіі і на Захадзе. Расія, лічыла рэдакцыя, займае ў гэтых адносінах больш выгаднае становішча. Яе перавагі ў наяўнасці сялянскай абшчыны, якая з'яўляецца нібыта зародкам сацыялістычнага грамадства. Удзельнікі групы не ўзняліся да разумення сусветна-гістарычнай ролі пралетарыяту, не бачылі адрознення паміж пралетарыятам і сялянствам. Некаторыя аналогіі на старонках часопіса выглядалі даволі наіўна. Так, роля заходнееўрапейскіх прафсаюзаў, на думку рэдакцыі, зусім такая ж, як і роля органаў сялянскага самакіравання ў Расіі.

Такім чынам, ідэалогія групы рэвалюцыянераў, што аб'ядналіся вакол «Народного дела», была народніцкая. Але, у адрозненне ад іншых разнавіднасцей народніцтва, у прыватнасці бакунізму, яе характарызуюць многія станоўчыя рысы. Асобныя палажэнні, выказаныя на старонках «Народного дела», здзіўляюць сваей глыбінёй. Гэта тлумачыцца перш за ўсё несумненным і плённым уплывам на светапогляд дзеячаў «Народного дела» ідэй Міжнароднага Таварыства Рабочых, якім кіраваў К. Маркс[271].

Адной са станоўчых рыс у дзейнасці часопіса было ў вышэйшай ступені сур'ёзнае стаўленне да рэвалюцыі. Для супрацоўнікаў часопіса рэвалюцыя — «вялікая, святая справа». Займаючы пазіцыю глыбокай народнай рэвалюцыі, «Народное дело» папярэджвала ад легкадумнага «ўспыш-

[271] Гл. уступны артыкул М. К. Каратаева да зб.: Экономическая платформа Русской секции I Интернационала. М., 1959.

капускальніцтва», ад гульні ў рэвалюцыю, як гэта рабіў Бакунін. «Мы заклікаем рэвалюцыю, а не мясцовую ўспышку, якая лёгка падаўляецца і памагае ворагам цаной нашых вялікіх ахвяр» (№ 7–10).

Калі Бакунін не надаваў ніякага значэння прапагандзе і арганізацыі, лічачы, што «нічога не каштуе ўзняць любую вёску» і дастаткова толькі закліку, каб у Расіі ўспыхнула суцэльнае паўстанне, то «Народное дело» прытрымлівалася якраз адваротнага погляду. Свае аргументы супрацоўнікі часопіса чэрпалі з далёкага і блізкага мінулага Расіі, са свайго багатага рэвалюцыйнага вопыту. Тую акалічнасць, што царскаму ўраду ўдалося ажыццявіць рабаўнічую рэформу 1861 года, «Народное дело» тлумачыць недастатковай згуртаванасцю перадавых сіл Расіі ў той час. «Калі б арганізацыя склалася за некалькі гадоў да 19 лютага і вяла самааддана і мэтазгодна прапаганду, то, зразумела, было б **інакшае** 19 лютага — не фальшывае, імператарска-памешчыцкае, а сапраўднае, народнае» (№ 4–6).

Няўдачу гэтак памятнага Трусаву паўстання 1863 года «Народное дело» таксама тлумачыла тым, што не было папярэдняй дастаткова энергічнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай прапаганды, «якая б, зразумела, надала польскай рэвалюцыі зусім іншы характар — не саслоўны, шляхецкі, а сацыялістычны, народны» (№ 4–6).

На старонках часопіса выказвалася вельмі важная і плённая думка аб тым, што задачай рэвалюцыйнай арганізацыі з'яўляецца не толькі падрыхтоўка і ажыццяўленне ўзброенага паўстання, але і арганізацыя намаганняў, накіраваных на пабудову новага грамадства. Прывядзём у крыху скарочаным выглядзе гэтыя словы: «Задача рэвалюцыйнай арганізацыі яшчэ

не канчаецца першым днём бітвы і паўстання. Наадварот, на ёй **менавіта тады** ляжыць больш, чым калі-небудзь, велізарная адказнасць... Арганізацыя вялікай партыі Народнага Вызвалення была б здрадніцай і прадажніцай народнай справы, калі б палічыла сваю справу скончанай у дзень узброенай бітвы і калі б уявіла, што далей ужо разрозненыя дагэтуль элементы, якія так доўга цярпелі шкоду ад... насільнага невуцтва, раптам самі па сабе, па нейкай міфічнай, нечакана народжанай, унутранай мудрасці прыйдуць зараз жа да новага, жаданага, доўгачаканага быту» (№ 7–10).

Вялікай заслугай групы «Народного дела» было пераадоленне шкоднай народніцкай (і перш за ўсё бакунінскай) тэорыі неўмяшання ў палітычную барацьбу (№ 7–10). На жаль, гэтая, здавалася б, простая і бясспрэчная, думка была не так хутка ўспрынята рускімі рэвалюцыянерамі-народнікамі. Нават пачаўшы ў другой палове 70-х гадоў схватку з царызмам, народнікі, нібы аслеплыя, працягвалі ў тэорыі прапаведаваць неўмяшанне ў палітычную барацьбу.

Такім чынам, трымаючыся запаветаў Чарнышэўскага, члены групы «Народного дела» зрабілі крок наперад у параўнанні з іншымі плынямі народніцтва 70-х гадоў.

Увесну 1870 года дзеячы «Народного дела» стварылі Рускую секцыю Інтэрнацыянала. Сваім прадстаўніком у Генеральным Савеце Міжнароднага Таварыства Рабочых арганізатары секцыі выбралі Карла Маркса. Аб гэтым яму паведамілі ў спецыяльным пісьме. Беларускі народ з поўным правам можа ганарыцца, што сярод трох подпісаў пад гэтым гістарычным дакументам ёсць подпіс і яго слаўнага сына Антона Трусава.

6

«Жэнева — для ціхага жыцця цудоўны горад: чысты, прыгожы, танны, вольны, сумленны горад. Прыгажуня Рона, востраў Русо... цудоўнае возера з часамі бачным удалечыні Манбланам...»[272]

Але і ў Жэневе не ўсё было «ціха». Буржуазныя ўлады, як неўзабаве высветлілася, часамі маглі цудоўна супрацоўнічаць з «усходняй тыраніяй». Напрыклад, у 1869 годзе ў Швейцарыю прыехаў царскі генерал князь Абаленскі, каб «па павяленні аўгусцейшага манарха» адабраць дзяцей ад жонкі, якая знаходзілася ў блізкіх сувязях з рэвалюцыянерамі. Старэйшая дачка пры гэтым уцякла. Гэта дало падставу швейцарскай паліцыі зрабіць арышты і вобыскі сярод рускіх эмігрантаў. Абураны Герцэн пісаў сыну 24 жніўня 1869 года: «...Потым генерал-ад'ютант адправіўся ў Жэневу, уварваўся ў друкарню Трусава. Яго і Бангара жандары трымалі, і сяржант сказаў, што першаму, хто зрушыцца, ён усадзіць кулю ў лоб. Потым рускі генерал усё абшарыў у друкарні **па падазрэнні!** што яго дачка схавана там... Што скажаце?.. Бач якая рэспубліка?»[273] Такіх прыкладаў можна было б прывесці і значна больш. У свой час Трусаву прыйшлося нават выступіць з выкрывальнай брашурай супраць швейцарскага ўрада[274].

---

[272] Тихомиров Л. Воспоминания. М.; Л., 1927. С. 148.

[273] Герцен А. И. Полн. собр. соч. и писем. Т. 21. С. 428.

[274] Голицин Н. Н. История социально-революционного движения в России: 1861–1881. Спб., 1887. С. 151. Кніга Галіцына выпушчана ў друкарні Міністэрства ўнутраных спраў тыражом 50 экз. Гэта збор данясенняў царскіх замежных агентаў і жандарскіх матэрыялаў. Пад пільным вокам агентаў знаходзіўся пастаянна і Трусаў.

Як бачым, буржуазная дэмакратыя слаба бараніла выгнаннікаў ад кіпцюроў самадзяржаўя. Ды і не «для ціхага жыцця» пакінулі радзіму і знайшлі тут прытулак рускія рэвалюцыянеры.

Пасля ўтварэння Рускай секцыі Інтэрнацыянала для членаў секцыі і яе сакратара Трусава надышлі дні асабліва напружанай працы.

У пісьме ад 23 сакавіка 1870 года ў жэнеўскую газету «Эгалітэ» Трусаў паведаміў чытачам аб узнікненні секцыі і пазнаёміў з яе задачамі. Вялікі ўдзел ён прыняў у распрацоўцы праграмы і статута секцыі.

У праграме гаварылася, што задачай секцыі з'яўляецца прапаганда ідэй Інтэрнацыянала і садзейнічанне ўстанаўленню «трывалай салідарнай сувязі» паміж працоўнымі Расіі і Заходняй Еўропы для «больш паспяховага дасягнення іх агульнай мэты вызвалення». Вялікае месца ў праграме было адведзена нацыянальнаму пытанню. У ёй падкрэслівалася, што інтэрнацыяналізм не адмаўляе нацыянальнага пачатку, а наадварот — спрыяе яго паспяховаму развіццю. Арганізатары секцыі звярталіся «да ўсіх груп розных нацыянальнасцей, якія былі пад імператарскім уціскам», з заклікам падтрымаць справу, распачатую аўтарамі праграмы. Асобны зварот быў адрасаваны славянскім народам.

У нумарах «Народного дела», што выйшлі на працягу 1870 года, увага рускіх рэвалюцыянераў накіроўвалася на стварэнне «трывала ўстаноўленай тайнай арганізацыі, якая імкнецца згуртаваць у адно агульнае, свядомае, пэўнае імкненне ўсе элементы рускай краіны, па сваім стане і па сваім развіцці незадаволеныя сучасным становішчам Расіі і гатовыя шукаць з яго выйсця шляхам энергічнай актыўнай

барацьбы» (№ 1). Арганізацыя гэтая называлася на старонках часопіса па-рознаму: «Партыяй народнага вызвалення», «народнай» і нават «рабочай» партыяй.

Характэрна, што члены секцыі не бачылі адрознення паміж гэтай арганізацыяй і заходнееўрапейскай сацыял-дэмакратыяй. На часопіс «Народное дело» дзеячы секцыі глядзелі як на трыбуну і орган гэтай будучай арганізацыі.

Секцыя рабіла вялікія намаганні, каб звязацца з рэвалюцыйнымі гурткамі ў Расіі, пашырыць ідэі Інтэрнацыянала сярод інтэлігенцыі і рабочых сваёй краіны. Нават праз некалькі гадоў пасля спынення дзейнасці секцыі ў розных месцах Расіі жандары знаходзілі яе дакументы. Так, у 1874 годзе ў слесара Гаўрылы Пярчанкіна ў вядомым сяле Паўлава Ніжагародскай губерні (цэнтры кустарнай металаапрацоўчай прамысловасці) быў знойдзены рукапіс «Міжнароднае Таварыства Рабочых». У склад рукапісу ўваходзіць, між іншым, паведамленне «Руская галіна Міжнароднага Таварыства». Яно мае характэрную прыпіску: «Мы заклікаем усіх і кожнага на барацьбу за цэласнае вызваленне сусветнага пралетарыяту. У імя поспеху гэтай барацьбы будзем дружна і энергічна імкнуцца да таго, каб інтэрнацыянальная арганізацыя хутка пранікала ў рускі рабочы свет і ахоплівала сабой усе рамесныя, фабрычныя і земляробскія слаі народа». «На падставе 3 параграфа агульнага статута сакратаром-карэспандэнтам рускай галіны пры Галоўным Лонданскім Савеце з'яўляецца член Галоўнага Савета К. Маркс. Сакратар камітэта Рускай секцыі ў Жэневе Антон Трусаў», — такімі словамі заканчваецца паведамленне. У Маскве і Казані ў рукі паліцыі трапілі экзэмпляры статута секцыі, у Екацярынбургу і Вятцы — нумары часопіса

«Народное дело». Ёсць звесткі аб распаўсюджванні часопіса ў Пецярбургу і на Неўянскім заводзе на Урале[275].

Такім чынам, Трусаў і яго таварышы, бясспрэчна, садзейнічалі пашырэнню ідэй І Інтэрнацыянала ў Расіі. Але прыходзіцца, бадай, згадзіцца з Б. П. Казьміным, што сувязі секцыі з Расіяй былі эпізадычнымі. Пастаянных, шырокіх сувязей з радзімай Трусаву і яго сябрам наладзіць, як відаць, усё ж не ўдалося.

Асаблівую надзею ў сваёй рэвалюцыйнай праграме члены секцыі ўскладалі на стачкі. Якое значэнне маюць стачкі, дзеячы секцыі маглі пераканацца на прыкладзе заходнееўрапейскага стачачнага руху і перш за ўсё на вопыце жэнеўскіх стачак, у якіх яны непасрэдна прымалі актыўны ўдзел. Хутка пасля ўтварэння Рускай секцыі ў Жэневе ўспыхнула стачка рабочых-будаўнікоў, якая захапіла і сялян-рамеснікаў, што ўдзельнічалі ў будаўнічых работах. Яшчэ перад пачаткам стачкі, 24 красавіка 1870 года, Трусаў накіраваў старшыні стачачнай камісіі — ветэрану рабочага руху І. Ф. Бекеру — пісьмо, у якім выказваў думку аб важнасці ўзгодненых дзеянняў рабочых і сялян: «Паколькі можна прадбачыць, што братам-бляхарам давядзецца баставаць, і паколькі мы лічым поспех гэтай забастоўкі вельмі важным для развіцця і поспеху Інтэрнацыянальнай асацыяцыі ў вёсках, без якіх гарадскія рабочыя ніколі не здолеюць скінуць з сябе ярмо эксплуататараў,— камітэт Рускай секцыі даручае мне прапанаваць секцыі бляхароў, у выпадку, калі камісія палічыць

[275] Соколов О. Д. Новые материалы о распространении идей I Интернационала в России // Вопросы истории. 1959. № 1. С. 202; Козьмин Б. П. Русская секция... С. 222–234; рэцэнзія П. А. Заянчкоўскага на кнігу Казьміна, гл.: Вопросы истории. 1958. № 8. С. 178.

забастоўку неабходнай і своечасовай, суму ў 80 франкаў у выглядзе пазыкі і яшчэ 20 франкаў у выглядзе дару для добраахвотнай падпіскі»[276].

А праз некаторы час, калі парыжскі пралетарыят узняў сцяг гераічнай Камуны, дзеячам секцыі давялося стаць сведкамі вышэйшай формы барацьбы пралетарыяту — рашучай бітвы з буржуазіяй за ўладу. І хоць члены секцыі, не будучы марксістамі, бадай, не здолелі зразумець да канца значэння парыжскіх падзей як першага прыкладу дыктатуры пралетарыяту, слаўная барацьба французскага рабочага класа знайшла гарачы водгук у іх сэрцах. Некаторыя члены секцыі (Л. Л. Таманоўская, Г. В. Корвін-Крукоўская[277]) прынялі непасрэдны ўдзел у парыжскіх падзеях і падзялілі лёс і славу камунараў.

Трусаў як сакратар секцыі не мог пакінуць Жэневу. Але мы бачым яго подпіс пад зваротам да парыжскіх камунараў, які прынялі 15 красавіка ўдзельнікі рабочага сходу ў Жэневе. Неўзабаве гэты яскравы дакумент быў надрукаваны ў абложаным Парыжы. «Няхай жыве рэвалюцыя пралетарыяў!» — чыталі байцы Камуны ў перапынках паміж баямі. «Рэспублікай пралетарыяў» была для Трусава Камуна, «пачаткам эры сацыяльнай рэарганізацыі» — рэвалюцыя 18 сакавіка. «Што б ні здарылася, браты і сёстры Парыжа, — пісалі жэнеўцы, — ваша справа не загіне, таму што гэта справа міжнароднага вызвалення рабочых, і мы выканаем свой абавязак, заўжды і скрозь дабіваючыся тых жа мэтаў, працягваючы заўжды і скрозь тую ж барацьбу, якую ўзначальваеце

---

[276] Козьмин Б. П. Русская секция... С. 312.

[277] Ганна Васільеўна Корвін-Крукоўская — сястра славутага матэматыка Соф'і Кавалеўскай. Дзяцінства і юнацтва сясцёр звязаны з Віцебскай губерняй.

вы...»[278] І гэта не былі для Трусава пустыя словы. Разам з Уціным ён увайшоў у жэнеўскі тайны камітэт для аказання дапамогі парыжскім камунарам. Камітэт атрымаў паўнамоцтвы Камуны і ставіў сваёй мэтай узняць усю Францыю на дапамогу Парыжу. «Мы вялі ажыўленую перапіску з рознымі рэвалюцыйнымі групамі ў Францыі... — расказвае адзін з членаў жэнеўскага камітэта. — Наш цыркуляр і афіша распаўсюджваліся ў вялікай колькасці ў розных гарадах. Мы ставілі сваёй задачай памагчы стварэнню камітэтаў дзеяння ўсюды, дзе былі рашучыя людзі. Мы не шкадавалі ні часу, ні грошай на тое, каб чаго-небудзь дабіцца. Нашы пасяджэнні часта цягнуліся да позняй ночы. Усё давала падставу меркаваць, што будзе магчыма ўзняць галоўныя гарады правінцыі»[279]. «Ішла гаворка пра тое, каб узняць паўстанне на поўдні Францыі; і дзеля гэтага намі было зроблена, прынесена ў ахвяру і пастаўлена на карту ўсё, што было ў чалавечых сілах»[280], — пісаў І. Ф. Бекер — таксама член гэтага камітэта. Пасля падзення Камуны жэнеўскі камітэт пачаў арганізоўваць дапамогу камунарам, якія ратаваліся ад праследавання буржуазіі.

Руская секцыя была нібыта высунутым далёка на Захад фарпостам рускага рэвалюцыйнага руху. Дзеячы секцыі разумелі сваю адказнасць і высокі гонар быць прадстаўнікамі рэвалюцыйнай Расіі. Гісторыкі міжнароднага рэвалюцыйнага руху знойдуць у іх дзейнасці нямала яркіх прыкладаў класавай салідарнасці. Да гісторыі секцыі яшчэ не раз будуць звяртацца славяназнаўцы. Устанаўленне цесных сувязей з

---

[278] Парижская коммуна 1871 г. М., 1961. Т. 2. С. 394.

[279] Первый Интернационал в дни Парижской коммуны: Документы и материалы. М., 1941. С. 221.

[280] Тамсама. С. 218.

рэвалюцыянерамі іншых славянскіх краін з'яўляецца немалаважнай заслугай секцыі. Карэспандэнтамі «Народного дела» былі такія вядомыя палітычныя дзеячы, як серб Светазар Марковіч, балгарын Любен Каравелаў. Не выпадкова Рускую секцыю называлі часам Славянскай.

Аднак несумненна, што самым большым укладам Рускай секцыі ў міжнародны рабочы рух была дапамога К. Марксу і Ф. Энгельсу ў барацьбе супраць раскольніцкай дзейнасці Бакуніна. За адданасць Інтэрнацыяналу і яго правадырам ворагі называлі Трусава і Уціна «чыноўнікамі асобых даручэнняў пры рабочых справах»[281]. Што ж, такімі тытуламі можна ганарыцца!

Выкрываючы Бакуніна, паказваючы яго сапраўднае аблічча, Уцін, Барценеў і Трусаў пісалі Марксу 24 ліпеня 1870 года: «Стары Бакунін са сваім пустым самалюбствам гатовы ісці на розныя камбінацыі, каб толькі адыгрываць відную ролю дыктатара, і, такім чынам, ён заўсёды будзе інтрыгаваць і наладжваць змовы... Яму дарагія толькі яго славалюбныя мэты, ён патрабуе, каб усё прыносілася ў ахвяру яго славалюбнасці, і тут для яго ўсе сродкі прыдатныя... Было б подласцю з нашага боку, каб мы не здолелі ўберагчы Рускую секцыю ад умяшання гэтых прахадзімцаў»[282].

Дакументы і матэрыялы, прысланыя Уціным, Трусавым і іх таварышамі, былі шырока выкарыстаны Марксам пры напісанні работ, накіраваных супраць Бакуніна і бакунізму: «Уяўныя расколы ў Інтэрнацыянале», «Альянс сацыялістычнай дэмакратыі і Міжнароднае Таварыства Рабочых».

---

[281] Голицын Н. Н. История социально-революционного движения... С. 5.

[282] Переписка К. Маркса и Ф. Энгельса... С. 41–42.

Выкрыты пры дапамозе гэтых матэрыялаў, Бакунін быў выключаны з Інтэрнацыянала на Гаагскім кангрэсе ў 1872 годзе. Калі ўлетку 1873 года некаторыя дзеячы Інтэрнацыянала, што былі пад уплывам Бакуніна, выступілі з брашурай, каб рэабілітаваць Бакуніна, Трусаў дапамог выкрыць яе аўтараў. У лісце 9 верасня 1873 года Маркс пісаў Энгельсу: «Лухта, што з'явілася за подпісам Перэ, Дзюваля і г. д., напісана, паводле паведамлення Трусава, **Клюзерэ**. Я табе адразу сказаў, што гэта не магло быць напісана гэтымі невукамі, бо ў ёй заўважаецца affectation of a small sort of literary style (некаторая вытанчанасць літаратурнага стылю. — *Г. К.*)»[283].

Да гэтага часу Міжнароднае Таварыства Рабочых ужо выканала сваю гістарычную ролю. Гаагскі кангрэс прыняў рашэнне аб пераводзе Генеральнага савета ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Хутка Інтэрнацыянал быў распушчаны. Рабочы рух часова перамяніў сваю тактыку. З гэтага часу галоўная ўвага звярталася на стварэнне самастойных нацыянальных рабочых палітычных партый.

Крыху раней, у 1872 годзе, спыніла сваё існаванне Руская секцыя. Выданне «Народного дела» спынілася яшчэ раней. Апошні нумар часопіса выйшаў у верасні 1870 года. Гэта было выклікана тым, што дзеячам секцыі, нягледзячы на ўсе ўпартыя спробы, не ўдалося наладзіць цесных сувязей з Расіяй. Праграму секцыі не зразумелі належным чынам у рускіх народніцкіх колах, а рабочы рух у Расіі яшчэ толькі пачынаўся. Акрамя таго, асноўныя сілы секцыі былі аддадзены заходнееўрапейскаму рабочаму руху і барацьбе з Бакуніным.

---

[283] Маркс К., Энгельс Ф. Соч.: В 50 т. 2-е изд. М., 1954–1981. Т. 33. 1964. С. 80.

7

Да 1873 года з усіх членаў Рускай секцыі ў Жэневе застаўся адзін Трусаў. У яго руках была друкарня былога «Народного дела». Аднак рускай паліцыі давялося хутка пераканацца ў тым, што і пасля спынення дзейнасці секцыі Трусаў робіць спробы аднавіць выданне рэвалюцыйнага часопіса і наладзіць канспіратыўныя сувязі з Расіяй. Студэнт У. І. Лебедзеў, які вярнуўся з-за мяжы пасля наведання ўлетку 1872 года Жэневы і знаёмства з Трусавым, паведамляў у сваіх паказаннях: «Трусаў прасіў мяне ехаць у Расію і збіраць тут грошы, каб заснаваць за мяжой рускі часопіс, які служыў бы органам эміграцыі»[284].

Царскі ўрад у маі 1874 года праз газеты прапанаваў Трусаву і шэрагу іншых выдатных эмігрантаў вярнуцца на радзіму, пагражаючы ў адваротным выпадку абысціся з імі «па ўсёй строгасці законаў»[285]. Слаўны рэвалюцыянер пакінуў без увагі гэта патрабаванне.

Аднак, наколькі нам вядома, спробы Трусава завязаць сувязі з рэвалюцыянерамі ў Расіі не мелі поспеху.

Вырваны са звычайных для яго абставін, выключаны з кіпучай рэвалюцыйнай дзейнасці, Трусаў апынуўся ў цяжкім становішчы. Яркую карціну жыцця Трусава ў гэты час малюе Уцін у пісьме да П. Л. Лаўрова ад 19 лютага 1873 года (у гэты час адбываліся беспаспяховыя перагаворы аб перадачы

---

[284] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 3 эксп. 1872. Спр. 175. Арк. 22 адв.

[285] Государственные преступления в России в XIX в.: Сб. извлеченных из официальных изданий правительственных сообщений / Под ред. Б. Базилевского (В. Богучарского). Спб., 1906. Т. 1. С. 253–254; Голицин Н. Н. История социально-революционного движения... С. 68.

Лаўрову друкарні «Народного дела»): «Дазвольце і адносна Трусава дадаць яшчэ два словы. Вы ж разумееце, што для яго з уладкаваннем гэтай друкарні звязаны кавалак хлеба, таму што без працы ён — жабрак; ён прывык жыць сваёй працай, і тую здзелку, пра якую Вы гаворыце, — г. зн. што ён мог бы жыць некаторы час на грошы, выручаныя за друкарню, — ён не прыняў бы, бо гэта азначала б для яго род міласціны, а ён шукае не яе, а працы. Ён перабіваецца сяк-так, чакаючы, што вось-вось будзе праца, і пакуль што працуе ў «Imprimerie Cooperative» (у «кааператыўнай друкарні». — *Г. К.*), будучы ўсё ж адзіным рабочым з рускіх эмігрантаў...»[286]

Аб адсутнасці сродкаў, якія давалі б магчымасць працягваць рэвалюцыйную дзейнасць, сведчыць знойдзенае намі ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве ў Маскве [ДА РФ] пісьмо Трусава Лаўрову ад 9 жніўня 1876 года: «Ці не палічыце Вы карысным надрукаваць у выглядзе дадатку да «Вперёд» або асобна «Спіс рускіх генералаў», лікам 700, з азначэннем іх прозвішчаў, жалавання, якое яны атрымліваюць, і што яны робяць. Выяўляецца ў выніку, што на абібоцтва дзяржава выдаткуе 4,5 мільёна рублёў срэбрам. Запэўніваюць мяне, што публікацыя такога спіса зробіць страшэнны скандал у грамадстве. Да гэтага спіса будзе і маленькае тлумачэнне. Лічу патрэбным дадаць, што ў мяне няма ніякіх сродкаў на яго надрукаванне»[287].

Часамі Трусаву даводзілася жыць у вялікай нястачы. «Я цяпер не маю ні працы, ні хоць аднаго су», — пісаў ён І. Ф. Бекеру ў кастрычніку 1880 года[288].

---

[286] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд 1762. Вопіс 4. Спр. 448. Арк. 3 адв.
[287] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд 1762. Вопіс 4. Спр. 444. Арк. 1.
[288] Козьмин Б. П. Русская секция... С. 368.

Цікава параўнаць гэтыя словы з радкамі паліцэйскай «Хронікі сацыялістычнага руху ў Расіі» за 1882 год: «Друкарня Трусава... працягвала пашыраць на рускай мове рэвалюцыйныя пасквілі»[289].

Праз усе выпрабаванні Трусаў пранёс вернасць рэвалюцыйным ідэалам, глыбокую прынцыповасць, светлыя ўспаміны пра Рускую секцыю Інтэрнацыянала, якой ён прысвяціў лепшыя гады свайго жыцця. Яркім сведчаннем гэтага з'яўляецца яго ўсхваляванае пісьмо ад 19 сакавіка 1882 года да рэдактара часопіса «Агульная справа» А. Х. Хрыстафорава, які меркаваў апублікаваць у сваім часопісе некралог бакуніста В. А. Зайцава, напоўнены нападкамі на Маркса і Уціна. «Звярніце Вашу ўвагу, — пісаў Трусаў, — на тую мясціну, дзе гаворыцца пра дзейнасць Маркса, — ці правільны выказаны погляд? Прачытайце Камуністычны Маніфест, Статут Інтэрнацыянала, Маніфест з нагоды Франка-прускай вайны, Маніфест з нагоды Камуны, і Вам дастаткова будзе, каб пераканацца ў процілеглым поглядзе. Фактычная няправільнасць заключаецца ў наступным: што заўзяты сацыяліст Уцін ніколі не быў агентам Маркса (ды і Маркс не мог як член Цэнтральнага Камітэта прызначаць агентаў), а быў рэдактарам «Egalité» — пытаюся ў Вас, быў гэта рэвалюцыянер ці не?» Нагадваючы далей пра непрыстойныя паводзіны Зайцава на адным са сходаў (факт гэты быў зусім няправільна перададзены ў Хрыстафорава), Трусаў пісаў: «З гэтага бачыце, што не трэба паглыбляцца ў дэталі і пырскаць атрутай зняваг у Маркса і Уціна. Пакінем убаку, што нас падзяляе, што

---

[289] Хроника социалистического движения в России: 1878–1887: Офиц. отчет. М., 1906. С. 226–227.

нас зневажае. Прыведзены мною факт прашу прыняць як фактычную даведку і не думаць, што мною кіравала якое-небудзь непрыемнае пачуццё, бо я сам асабіста паважаю Зайцава, хоць ніколі не падзяляў анархічных перакананняў»[290].

У пачатку 80-х гадоў, калі царызму ўдалося адбіць другі штурм з боку рэвалюцыйнага лагера, у Жэневу пачалі прыбываць удзельнікі разгромленых народніцкіх арганізацый. Але як Герцэн у свой час не мог знайсці поўнага ўзаемаразумення з «маладой эміграцыяй» 60-х гг., так і Трусаву не ўдалося ўстанавіць цесны кантакт з членамі «Народнай волі» і «Чорнага перадзелу», якія знайшлі прытулак у Жэневе. Да гэтага часу падрабязнасці з гісторыі Рускай секцыі Інтэрнацыянала былі грунтоўна забыты, і Трусаў для маладых дзеячаў быў усяго толькі «старым эмігрантам»[291]. У 1884 годзе Трусаў прыехаў у Расію.

Цікава, што друкарня Трусава трапіла ў рукі марксісцкай групы «Вызваленне працы», якая ўтварылася ў Жэневе ў 1883 годзе з былых народнікаў-чорнаперадзельцаў. Удзельнікі гэтай групы ў новых умовах на больш высокай аснове закончылі справу, пачатую Уціным, Трусавым і іх таварышамі. Тым жа шрыфтам, якім набіралася праграма Рускай секцыі Інтэрнацыянала, былі надрукаваны першыя марксісцкія працы Г. В. Пляханава.

Гісторыя трусаўскай друкарні цікавая і сваімі міжнароднымі сувязямі. Вясной 1879 года друкарня набыла польскія

---

[290] ДГМ. Фонд 282. Спр. 469-б. Арк. 53–54.

[291] Дейч Л. Г. Первые шаги группы «Освобождение труда» (конец 1883 — начало 1884 гг.) // Группа «Освобождение труда». М., 1923. Сб. 1. С. 14.

шрыфты і атрымала магчымасць друкаваць выданні на польскай мове. Менавіта тут быў набраны ў кастрычніку 1879 года першы нумар першага польскага сацыялістычнага часопіса «Руўнасць» («Równość»)[292]. Маюцца таксама весткі, што ў друкарні Трусава набіралася адна з брашур літоўскага пісьменніка Іонаса Шлюпаса, які ў той час быў звязаны з народнікамі.

8

Да апошняга часу пра Трусава пасля яго звароту ў Расію нічога не было вядома. Мы паставілі перад сабою задачу знайсці хоць бы некаторыя звесткі пра апошні перыяд яго жыцця. Задачу паставіць лёгка, але як яе ажыццявіць, калі падзеі адбываліся больш за 70 гадоў таму назад? З якога горада пачаць пошукі, калі невядома, куды прыехаў Трусаў пасля вяртання з эміграцыі?

Натуральна меркаваць, што прыезд такога важнага «дзяржаўнага злачынцы» не мог застацца незаўважаным у вышэйшых паліцэйскіх органах Расіі. За кожным яго крокам на роднай зямлі павінны былі сачыць жандары. А што, калі пацікавіцца дакументамі дэпартамента паліцыі, якія захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве ў Маскве [ДА РФ]? З самага пачатку нам і пашанцавала і не пашанцавала. Сапраўды, у вопісе спраў 5-га справаводства дэпартамента паліцыі за 1884 год называецца справа № 4698 «Аб былым студэнце Антоне Данілаве Трусаве»[293]. Але побач штэмпельная адзнака: «Знішчана». Можна здагадвацца, што справа была знішчана паліцэйскімі чыноўнікамі ў архіве

[292] Limanowski B. Pamiętniki: (1870–1907). Warszawa, 1958. S. 234–236.
[293] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд 102. Вопіс 127. Ч. 2.

дэпартамента каля 1910 года. Ніць зноў абрывалася, і на гэты раз, здавалася, далей шукаць безнадзейна. Але ў гісторыка-архівіста ёсць яшчэ адзін, апошні шлях. Калі знішчаны самі дакументы, то, магчыма, захаваліся адзнакі аб іх змесце ў журналах рэгістрацыі карэспандэнцыі. Мы папрасілі супрацоўнікаў архіва прынесці журналы дэпартамента за 1884 год. Гартаем старонку за старонкай. І вось вынікі: на адной з іх напаткалі запіс аб тым, што 9 студзеня паступіла «прашэнне б[ылога] студэнта Антона Трусава аб вяртанні на радзіму»[294].

У журнале адпраўленых папер[295] 12 студзеня зроблены запіс аб тым, што паслана папера «ў канцыл[ярыю] віленскага генер[ал]-губ[ернатара] аб прысылцы звестак пра ступень удзелу Антона Трусава ў мяцяжы і часе знікнення за мяжу».

20 лютага зноў запіс аб тым, што паслана папера «ў дэпартамент унутраных зносін Міністэрства замежных спраў для аб'яўлення Антону Трусаву, што пытанне аб прадастаўленні яму права выбару месцажыхарства ў межах імперыі будзе разгледжана Міністэрствам пасля яго вяртання ў Расію».

24 кастрычніка новы запіс: пасланы адпаведны дакумент «мінскаму губернат[ару] для аб'яўлення Антону Трусаву, што з хадайніцтвам аб дазволе яму выезду ў Чарнігаўскую губерн[ю] яму належыць звярнуцца да кіеўскага генерал-губерн[атара]».

Такім чынам, нам стала вядома галоўнае: Трусаў вярнуўся з эміграцыі ў свой родны Мінск! І вось мы ў Мінску, у Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці. Пераглядаем справы канцылярыі губернатара, паліцмайстара, губернскага жандарскага ўпраўлення. Але дакументаў гэтых устаноў заха-

---

[294] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд 102. Вопіс 196. 1884. Спр. 913.

[295] Тамсама. Вопіс 199. 1884. Спр. 399–400.

валася мала, і звестак пра Трусава ў іх няма. Толькі некалькі кароткіх запісаў мы знайшлі ў адзінай канцылярскай кнізе мінскага губернатара за 1884 год[296].

Вось гэтыя запісы: 25 мая накіравана папера «мінск [аму] паліцмайстару аб падначаленні эмігранта Антона Трусава нагляду паліцыі на два гады». У той жа дзень: «Начальніку Мінскага губ[ернскага] жанд[арскага] ўпраўлення аб тым жа». Зноў запіс у той жа дзень: «У Дэпартамент паліцыі па справе аб эмігранце Трусаве з прашэннем яго аб адлучцы з гор. Мінска на ст. Сноўск Ліб[ава]-Ром[енскай] чыгункі да сястры Эміліі Рагозы...»

І толькі значна пазней у віленскім архіве, сярод папераў штаба Віленскай ваеннай акругі, нам удалося знайсці перапіску, звязаную з вяртаннем Трусава з-за мяжы. Яна далучана да справы аб васьмі паўстанцах-трусаўцах, захопленых пад Сініло[297]. У ліку гэтых дакументаў ёсць і запытанне Дэпартамента паліцыі ад 12 студзеня 1884 года, якое прыгадвалася вышэй: «Эмігрант, з ураджэнцаў Мінскай губерні, Антон Трусаў, што жыве ў Жэневе, звярнуўся з прашэннем, у якім, тлумачачы, што ён прымаў удзел у апошнім польскім мяцяжы, хадайнічае пра дазвол яму праз гэта вярнуцца на радзіму, на падставе 11 пункта XIV артыкула ўселаскавейшага маніфеста 15 мая 1883 года.

...Дэпартамент паліцыі мае гонар пакорна прасіць Канцылярыю віленскага генерал-губернатара не адмовіць у паведамленні магчыма падрабязных вестак аб ступені ўдзелу Трусава ў мяцяжы і часе выдалення яго за мяжу».

---

[296] Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (дакументы да 1917 г. у 1964 г. перададзены ў Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР (цяпер Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). — *Рэд.*). Фонд 295. Вопіс 1. Спр. 3920.

[297] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 121. Арк. 203–207.

Вось і адказ ад 24 студзеня: «...Канцылярыя генерал-губернатара мае гонар паведаміць Дэпартаменту, што з паказання васьмі мяцежнікаў, узятых у палон са зброяй у руках 30 красавіка 1863 года ў вёсцы Сініло Мінскай губерні і павета, відаць, што прадвадзіцелем іхняй шайкі, колькасць якой дасягала 20 чалавек, быў Антон Трусаў, які пасля разбіцця войскамі шайкі паспеў скрыцца і, можна меркаваць, тады ж эміграваў за мяжу. На ўчыненне шайкаю забойстваў, катаванняў, рабункаў і падпалаў у справе ўказанняў няма, а таксама і на тое, каб аб Трусаве адбылося тады завочнае рашэнне».

Трусаву пашанцавала: чыноўнікі канцылярыі паставіліся да запыту дэпартамента паліцыі фармальна. Яны ўзялі толькі першую справу аб паўстанцах Трусава. Калі б яны зазірнулі ў іншыя справы, дык убачылі б, што Трусаў яшчэ прынамсі паўгода пасля Сініло змагаўся з царскімі войскамі. Ды з гэтай справы відаць і тое, што першапачаткова атрад Трусава быў у некалькі разоў большы.

Такая ж, слова ў слова, характарыстыка была дадзена Трусаву генерал-губернатарам у адказ на запытанне мінскага губернатара ад 25 мая 1884 года. У запытанні губернатар пісаў: «Дэпартамент унутраных зносін Міністэрства замежных спраў прасіў Расійскую імператарскую місію ў Берне водзывам ад 27 лютага 1884 года, за № 1507, па даручэнні Дэпартамента паліцыі, аб'явіць эмігранту па апошнім польскім мяцяжы Антону Трусаву, які жыве ў Жэневе, што хадайніцтва яго адносна дачы яму права выбару, па яго меркаванні, месца пражывання ў межах імперыі будзе разгледжана Міністэрствам унутраных спраў пасля вяртання яго ў Расію на падставе ўселаскавейшага маніфеста 15 мая 1883 года. Праз гэта Антон Трусаў і прыбыў з-за мяжы ў г. Мінск 19 мая

гэтага года, просіць з прычыны сапсаванага здароўя дазволіць яму выехаць да сястры сваёй Эміліі Рагозы, што жыве на станцыі Сноўск Лібава-Роменскай чыгункі Чарнігаўскай губерні.

Не маючы пра Трусава ніякіх вестак, апроч пададзенай ім жа самім копіі з прыгаданай адносіны Дэпартамента ўнутраных зносін Міністэрства замежных спраў за № 1507, а таксама бачачы з алфавітнага спісу ўдзельнікаў здзейсненага польскага мяцяжу, які складзены ў 1864 годзе, што аб ступені вінаватасці Трусава канфірмацыі не было з прычыны ўцёкаў яго за мяжу і што ўдзел яго ў здзейсненым мяцяжу выкрыты па Віленскай губерні (губернатар памыляецца. — *Г. К.*), дзе і вялася аб ім справа, я... маю гонар пакорна прасіць паведаміць мне, ці не абвінавачваўся Трусаў у забойстве, катаваннях, рабунку і падпалах і ці можа быць да яго дастасаваны II артыкул уселаскавейшага маніфеста... прычым лічу абавязкам дадаць, што Трусаў у г. Мінску падпарадкаваны паліцэйскаму нагляду».

Перапіска аб Трусаве за 1884 год, між іншым, дазваляе ўдакладніць адзін істотны момант яго біяграфіі. Да апошняга часу гісторыкі лічылі, што за ўдзел у паўстанні 1863 года Трусаў быў завочна прысуджаны царскімі ўладамі да пакарання смерцю. Пры гэтым спасылаюцца на пісьмо М. Уціна да П. Лаўрова ад 29 чэрвеня 1874 года[298]. Аднак з паведамлення Канцылярыі віленскага генерал-губернатара ды і з усіх іншых вядомых нам матэрыялаў аб паўстанні 1863 года відаць, што хутчэй за ўсё царскі суд не прымаў рашэння аб Трусаве, які ўцёк за мяжу. Уцін у сваім пісьме меў, відавочна, на ўвазе, што ў выпадку злаўлення Трусава ён наўрад ці пазбег бы шыбеніцы або кулі, як і многія іншыя камандзіры паўстанцкіх атрадаў.

---

[298] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд 1762. Вопіс 4. Спр. 448. Арк. 15 адв.

Такім чынам, апошняе, што мы ведаем пра Трусава з дакументаў, — гэта яго думка наведаць сваю сястру ў Сноўску. Але найбольш верагодна, што яму не ўдалося выканаць свой намер.

У Варшаве выдаваўся даўно напісаны другі том успамінаў вядомага польскага гісторыка і грамадскага дзеяча Баляслава Ліманоўскага. Ліманоўскі быў знаёмы з Трусавым яшчэ па універсітэце, а пазней адначасова з ім жыў у Жэневе. У сваіх успамінах ён расказвае пра абставіны вяртання Трусава на радзіму. Аказваецца, Трусаў у выніку ўсіх нястач у эміграцыі захварэў на цяжкую хваробу горла. «Да Трусава прыехала яго сястра Юлія, відаць, напалоханая яго журботнымі лістамі, з намерам угаварыць яго, каб ён скарыстаў амністыю і вярнуўся на радзіму. Гэта была старая непрыгожая панна, але дабрата, аб якой сведчыў яе твар і ўсе яе паводзіны, рабіла яе сімпатычнай і выклікала добрыя адносіны да яе. Яна любіла свайго брата і адразу абкружыла яго клапатлівай апекай. Не без унутранай барацьбы згадзіўся ён вярнуцца... Ад'язджаючы з Жэневы, ён падарыў мне значны збор сацыялістычных часопісаў і газет на французскай мове. Гэта быў вельмі важны для мяне падарунак. Я скарыстаў іх у сваёй „Historyi ruchu społecznego w XIX st."... Мы перапісваліся з ім. Я памагаў ва ўладкаванні яго спраў у Жэневе. Ён ад'язджаў з хваробай горла, якая ў Мінску набыла цяжкую форму і жорстка мучыла яго... Нядоўга пасля звароту ў Мінск жыў Трусаў. Здаецца, ён памёр на другі год»[299]. Такім чынам, можна меркаваць, што Антон Трусаў памёр хутка пасля вяртання на радзіму, відаць, у 1886 годзе.

---

[299] Limanowski B. Pamiętniki... S. 300–301.

ГІМНАЗІЧНЫЯ І СТУДЭНЦКІЯ ГАДЫ ФРАНЦІШКА БАТУШЭВІЧА

1

У жніўні 1861 года па яшчэ не закончанай чыгунцы (да Свянцян дабіраліся падводаю) ехаў з Вільні ў Пецярбург малады чалавек гадоў дваццаці. Яго задумлівыя, крыху журботныя вочы глядзелі праз вокны вагона, за якімі хвалявалася пераспелае жыта, праплывалі пералескі ды часам мільгалі, насунуўшы саламяныя шапкі, пахільныя хаціны прыдарожных вёсак. Разпораз юнак кідаў позірк на свой скарб — куфэрак з бялізнаю і кнігамі. Цікаўным пасажырам ён сказаў, што завуць яго Францішкам, сынам Казіміра з Кушлян, ён толькі што закончыў курс навук у гімназіі і едзе паступаць у сталічны універсітэт.

У вагоне размаўлялі пра сялянскія хваляванні, пра апошнія маніфестацыі ў Вільні. Хтосьці пошапкам расказваў суседзям, што ў час абмеркавання сялянскай рэформы ў Дзяржаўным савеце з конніка на літоўска-беларускім гербе, які вісеў сярод іншых гербаў у зале, звалілася карона. У гэтым бачылі таямнічы намёк.

Юнак думаў пра сваіх сяброў, з якімі развітаўся, пра новае жыццё, што чакае наперадзе, у невядомым Пецярбургу. Два тыдні таму ён паслаў ва універсітэт заяву, атэстат, выдадзены Віленскай губернскай гімназіяй, і такія, здавалася б, несумяшчальныя дакументы, як пасведчанне аб «высакародным» дваранскім паходжанні і даведку... аб беднасці.

На самай жа справе нічога дзіўнага ў гэтым не было. Францішак Багушэвіч нарадзіўся 9 сакавіка 1840 года ў сям'і беднага двараніна на Віленшчыне. Ці мала было ў гэтым маляўнічым краі іншых шляхецкіх сем'яў, якія апраналіся ў сярмягі з хатняга сукна і паводле ладу жыцця і інтарэсаў былі больш блізкія да навакольных сялян, чым, скажам, да польскіх магнатаў, якія ўладалі дзесяткамі тысяч дзесяцін зямлі і тысячамі прыгонных нявольнікаў.

Чыншавая шляхта, якая арандавала ў памешчыка шматкі зямлі, не ў меншай меры, чым сяляне, цярпела ад панскага самавольства. Горкімі кпінамі гучала прымаўка: «Шляхціц на загродзе (г. зн. на невялічкім кавалку зямлі) роўны ваяводзе».

Некаторы час лічылася, што Ф. Багушэвіч нарадзіўся ў Кушлянах былога Ашмянскага павета. Цікавыя друкаваныя крыніцы, уведзеныя ў навуковы ўжытак С. Александровічам[300], вымусілі ўзяць пад сумненне справядлівасць гэтага сцверджання. Нарэшце, у матэрыялах Цэнтральнага гістарычнага архіва Літоўскай ССР [ДГА Літвы] сярод «Выпісаў хрэсных метрык Рукойнскага прыходскага касцёла за 1840 год» мы знайшлі запіс аб нараджэнні Ф. Багушэвіча[301], што дакументальна пацвярджае цікавае адкрыццё, зробленае С. Александровічам. Такім чынам, можна лічыць канчаткова вызначаным, што выдатны беларускі паэт нарадзіўся ў фальварку Свіраны Віленскага павета.

Некалькі слоў пра Свіраны. Скупая даведка за 1890 год з «Геаграфічнага слоўніка Царства Польскага і іншых

[300] Александровіч С. Новае пра Ф. Багушэвіча // Полымя. 1960. № 6; яго ж. Старонкі братняй дружбы. Мінск, 1960.

[301] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 454 (Віленскі павятовы суд). Вопіс 12. Спр. 55. Арк. 147 адв.

славянскіх краёў»: «...фальварак і казённы маёнтак над безыменнай ракой... 1 дом, 6 жыхароў, млын. Сядзіба над ракой сярод алешніку; магілы французаў часоў 1812 года. Калісьці ўласнасць віленскіх базыльянаў, цяпер — урада»[302]. У 1905 годзе ў Рукойнскай воласці Віленскага павета лічыўся фальварак Свіраны на 37 дзесяцін, які належаў праваслаўнай Рукойнскай царкве[303].

Цяпер Свіраны ўваходзяць у склад Жэмайцельскай апілінкі Вільнюскага раёна Літвы. Мы пабывалі там. На 25-м кіламетры ад Вільнюса, па Мінскай шашы, управа збягае ўніз да невялікай рэчкі, атуленай хмызнякамі, палявая дарога. Абапал яе ляжаць валуны. Перад рэчкай пад старымі высокімі ліпамі стаяць тры хаты. Пад старым мостам з круглякоў — рэшткі плаціны (магчыма, некалі быў млын). Вакол, па схілах узгоркаў, цягнуцца палі. Гэта і ёсць радзіма Багушэвіча — Свіраны. Мясцовыя жыхары пасяліліся ў Свіранах яшчэ да рэвалюцыі, але ўжо не памятаюць сядзібы фальварка, хоць і ўспамінаюць, што арандавалі зямлю ў «бацюшкі». У іх мове гучаць беларускія, польскія і рускія словы. Цікава, што за некалькі кіламетраў ад Свіран размешчана вёска Барэйкяй (Барэйкаўшчына), дзе ў 50-х гадах XIX ст. жыў вядомы паэт Л. Кандратовіч (У. Сыракомля), які пісаў таксама і па-беларуску. Багушэвіч, відаць, не раз сустракаў «сельскага лірніка», калі ездзіў на канікулы з Вільні ў Кушляны.

Якое дачыненне мелі да Свіран бацькі Багушэвіча — пакуль што невядома. Хутчэй за ўсё яны арандавалі фальварак.

---

[302] Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów sławiańskich. Warszawa, 1890. T. 11. S. 714.

[303] Виленская губерния: Полн. список насел. мест со стат. сведениями о каждом поселении / Сост. И. И. Гошкевич. Вильна, 1905. С. 68.

Жылі яны там працяглы час. Імёны Казіміра і Канстанцыі Багушэвічаў даволі часта сустракаюцца на старонках метрычных кніг Рукойнскага касцёла. У 1836 годзе ў іх нарадзіліся блізняты-сыны Анастасій і Нарцыс[304], якія, відаць, хутка памерлі. Праз два гады ў Свіранах святкавалі нараджэнне дачкі Ганны Казіміры Юліяны (1838 год). Потым суседзі віншавалі Багушэвічаў з нараджэннем Францішка Бенядзікта. Пасля з'явіўся на свет яшчэ адзін сын — Валерыян Юзафат (1841 год). Малодшы брат Францішка — Апалінарый — нарадзіўся ў 1846 годзе[305]. Вось у гэтае пяцігоддзе, паміж нараджэннем Валерыяна і Апалінарыя (1841–1846 гады), сям'я Багушэвічаў і перабралася са Свіран у суседні Ашмянскі павет, дзе бацька паэта набыў невялікі фальварак Кушляны, недалёка ад м. Жупраны: Апалінарый нарадзіўся ўжо ў Кушлянах. Тут прайшло і маленства Францішка.

Біёграфы пакуль што не маюць дакладных звестак аб маёмасным стане сям'і Багушэвічаў. І не вельмі проста адказаць цяпер на гэта пытанне, што ўяўлялі сабою багушэвічаўскія Кушляны ў 40-х — 50-х гадах XIX ст. «Геаграфічны слоўнік Царства Польскага і іншых славянскіх краёў» аб'ядноўвае пад назвай «Кушляны» цэлую групу паселішчаў, размешчаных за 21 вярсту ад Ашмян: дзве вёскі, два шляхецкія фальваркі, шляхецкую ваколіцу і шляхецкі хутар (даныя за 1866 год)[306]. Паводле больш дакладных, хоць і больш позніх звестак,

---

[304] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 454 (Віленскі павятовы суд). Вопіс 12. Спр. 23. Арк. 113.

[305] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд Ашмянскага дэканата. Спр. 142. Арк. 318. Акрамя гэтага, у Францішка быў старэйшы брат Уладзіслаў, які нарадзіўся, відаць, у першай палове 1830-х гадоў.

[306] Słownik geograficzny... Warszawa, 1883. T. 4. S. 952.

прыведзеных у «Поўным спісе населеных мясцін Віленскай губерні» за 1905 год, у Сольскай воласці Ашмянскага павета значыліся пад гэтай назвай два маёнткі (Сулістроўскага і Тымоўскага), два фальваркі (Багушэвіча і Ясевіча), два засценкі (адзін з іх Маркоўскага) і дзве вёскі (Кушляны 1-я і Кушляны 2-я). Пра фальварак Багушэвіча сказана коратка: «Жыхароў 27 (12 мужчын і 15 жанчын), дзесяцін 172, павятовы горад — за 18 вёрст, валасное праўленне — за 8, станавая кватэра — за 6, да чыгуначнай станцыі Солы — 15 вёрст»[307].

Сучаснік Багушэвіча Чэслаў Янкоўскі пісаў свой «Ашмянскі павет» у апошніх дзесяцігоддзях XIX ст. Яго чатырохтомны твор мае падзагаловак «Матэрыялы да гісторыі зямлі і людзей», але дарэмна мы сталі б шукаць у гэтай кнізе ўказання, скажам, на тое, што з Ашмянскага павета выйшаў вядомы пісьменнік Францішак Багушэвіч. Для Янкоўскага «людзі» — гэта памешчыкі, перш за ўсё буйныя, і вось апісанню гісторыі родавых памешчыцкіх гнёздаў галоўным чынам і прысвечаны яго твор. Трэба аддаць яму справядлівасць — свой прадмет ён ведае дасканала, выкладае з замілаваннем, і яго апісанне Кушлян не пазбаўлена некаторай цікавасці і для нас: «На ўсход ад Жупран ляжыць вялікі абшар зямлі, які здаўных-даўна носіць назву Кушляны.

Быў ён калісьці і застаўся раздробленым на пэўную колькасць самастойных памешчыцкіх уладанняў, дакладнае размежаванне якіх празмерна абцяжарана агульнай назвай Кушляны. Дастаткова сказаць, што яшчэ сёння на прыгаданым кавалку зямлі маем размешчаныя побач: Кушляны, што

---

[307] Виленская губерния. Полн. список... С. 249–250.

знаходзяцца цяпер ва ўладанні Казіміра Шафнагля і яго жонкі Марыі з Сулістроўскіх; Кушляны — Даргішкі ці Веркеляны, уласнасць Грынеўскага; Кушляны Ясевіча, Кушляны Багушэвіча... А што ж было раней!.. Бясконцая колькасць суседскіх межавых звадаў, гандаль прыгоннымі, перадача з рук у рукі дакументаў, страта іх, карыстанне з кожным разам усё новымі, прыдуманымі на хаду назвамі сёлаў, урочышчаў, ніваў, лугоў, лясоў, атрыманых у спадчыну маёмасцей, палеткаў, — усё гэта ўтварае блытаніну, акурат сказаць, узорную»[308].

Гісторыя памешчыцкіх Кушлян, як і іншых панскіх маёнткаў, напоўнена брудам і дзікасцю, крывёю і слязьмі. Мы ўжо не гаворым пра адносіны памешчыкаў да сваіх прыгонных нявольнікаў, «белых неграў». Нават адзін з адным уладальнікі маёнткаў, што выхваляліся сваёй радавітасцю і адукаванасцю, грызліся як сабакі. У канцы XVII ст., напрыклад, адзін з кушлянскіх землеўладальнікаў чашнік Ян Кіркар намысліў выжыць з родных гнёздаў сваіх суседзяў — лоўчага Францішка Пятэльчыца і скарбніка Якуба Княноўскага. Янкоўскі падрабязна апісвае ўсе «фіглі», якія ўжыў Кіркар для здзяйснення свайго намеру: «... Дзеўку, што звалі Зоськай, якая шукала гусей і качак, пераняўшы па дарозе, адвёў у сваю сядзібу, чалядніка Пятэльчыца ў мястэчку Солах, напаўшы, збіў, на яе міласць пані Княноўскую наслаў свайго служачага Лапу, які, сустрэўшы яе ў полі, непрыстойнымі словамі абылгаў дый, бізуном махаючы перад носам і страляючы з пісталета, страшэнна напалохаў. Згаданую дзеўку Зоську, што была вырвалася з Кушлян, дагнаў у Жупранах, збіў, змардаваў і як хацеў з яе здзекаваўся;

[308] Jankowski Cz. Powiat Oszmiański: Materjały do dziejów ziemi i ludzi. Petersburg, 1896. Cz. 1. S. 142–143.

самога Пятэльчыца, што ехаў з гасцямі ў Солы, дагнаў, цэлую мілю праследаваў, страляючы з мушкета і жадаючы забіць» (стар. 145–146). Адным словам, паны дзяруцца, а ў хлопаў чубы трашчаць. Але, як бачым, часамі даставалася і панам — беднаму Пятэльчыцу, які, відаць, не меў ваяўнічасці свайго суседа, прыйшлося прадаць свой маёнтак і падацца ў іншыя бакі. Нямала такіх гісторый, мабыць, чуў Багушэвіч яшчэ ў дзяцінстве. Яшчэ больш прыйшлося пабачыць уласнымі вачыма. Не з пальца ж ён высмактаў гэтае параўнанне пана з бандытам:

Ой, не першы то бандыта
І пан не астатні, —
Што дабро ўсё здабыта
Толькі крыўдай братняй.
(«Панская ласка»)

Найбольш багатымі землеўладальнікамі былі ў Кушлянах памешчыкі Сулістроўскія. Мы мелі магчымасць пазнаёміцца з інвентарным апісаннем кушлянскага маёнтка Канстанціна Сулістроўскага, складзеным напярэдадні скасавання прыгоннага права, у 1858 годзе[309]. Гэта было даволі вялікае ўладанне, у склад якога ўваходзілі і суседнія вёскі: Пацэвічы, Шопаны, Рачканы, Сікуні, Рудзішкі. Сулістроўскаму належала 2296 дзесяцін зямлі і 288 прыгонных сялян, мужчын і жанчын. Большая частка зямлі была пад панскім ворывам, лугамі і лясамі, а пад сялянскае карыстанне было адведзена толькі 1077 дзесяцін. Сяляне адбывалі цяжкую паншчыну: 3 мужчынскія і 3 жаночыя дні на тыдзень з кожнага двара. Зімою, па саннай дарозе, сяляне вазілі прадаваць збожжа ў Вільню і іншыя гарады. «Галоўнейшы занятак сялян у хлебароб-

[309] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 391. Вопіс 1. Спр. 2002. Арк. 32–34.

стве, — гаворыцца ў інвентары. — Здабыткі зямлі прадаюцца ў губернскім горадзе Вільні, павятовым Ашмянах і гандлёвым мястэчку Смаргонях». Мураваны з высокім аздобленым калонамі ганкам панскі дом Сулістроўскага, абкружаны іншымі гаспадарчымі пабудовамі, панаваў над усёй ваколіцай.

Сулістроўскія звысоку глядзелі на дробнага шляхціца, які пасяліўся з вялікай сям'ёй у суседнім фальварку. Мяркуючы па тым, што ў 1864 годзе ў фальварку Багушэвіча праводзіліся праверачныя работы, звязаныя з сялянскай рэформай 1861 года, бацька паэта ўладаў некалькімі сялянскімі дварамі[310]. Належала Багушэвічам таксама некаторая колькасць лесу. Але падрасталі дзеці, іх трэба было пасылаць у горад вучыцца. Вось чаму тых некалькіх дзесяткаў дзесяцін, якімі ўладалі Багушэвічы, не хапала нават на тое, каб сцягваць канцы з канцамі. Таму даводзілася старому Казіміру выпрошваць у прадвадзіцеля дваранства для сваіх дзяцей даведкі аб беднасці, якія давалі права на вызваленне ад платы за навучанне. У «Ведамасці аб вучнях Віленскай гімназіі, якія па беднасці не ў стане ўносіць устаноўленай платы за навучанне» ад 31 кастрычніка 1860 года адносна малодшага брата Апалінарыя запісана: «Сын беднага двараніна, абцяжаранага сям'ёю... выхоўваюцца на ўтрыманні бацькі тры сыны і адна дачка»[311].

Багушэвічы належалі да таго шматлікага ў Беларусі і Літве ніжэйшага пласта дваранства, на якое заўсёды падазрона глядзеў царскі ўрад, — дваранства, якому раз-пораз даводзілася даставаць старыя дакументы, каб даказаць сваё «высакароднае» паходжанне. Такія шляхціцы па сваім са-

[310] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 391. Вопіс 1. Спр. 2001. Арк. 9.
[311] ЦДГА Літ. СССР [ДГА Літвы]. Фонд 367. Вопіс 3. Спр. 866.

цыяльным стане былі быццам пасярэдзіне паміж сялянамі і панамі. З іх выходзілі і драпежныя аканомы ў панскіх маёнтках, і барацьбіты за народную справу.

Маленства Францішка Багушэвіча прайшло ў асяроддзі сялянскіх дзяцей. Былі супольныя паляванні на птушыныя гнёзды, былі начлегі ў полі ці на лузе з вогнішчамі і казкамі, і была, зразумела, выразаная з дрэва сялянская дудка, якую народ назваў паэтычным словам «жалейка».

Аднак больш шчыльныя сувязі, чым проста ўспаміны пра гульні з сялянскімі дзецьмі, звязвалі Багушэвіча з заняволеным народам. Думкі (спачатку гэта былі не зусім пэўныя мары) пра народнае шчасце ўзнікалі ў яго вельмі рана. Ва ўсякім выпадку, мы маем аўтабіяграфічнае сведчанне, якое належыць прыкладна да 1891 года. Паэт звяртаецца да сваёй дудкі:

Га! Чаму ж не граеш?
Хіба ты не знаеш,
Не ведаеш хіба,
Што, як тая рыба
Ды на лёдзе б'ецца,
Так і я, здаецца,
***Сорак** гадоў б'юся,*
Ніяк не звярнуся,
Ніяк не натраплю
Вадзіцы хоць каплю,
Ды такой вадзіцы,
Ды з такой крыніцы,
Што як хто нап'ецца,
Дык вольным стаецца.
(«Мая дудка»)

Простая арыфметыка: 1891 мінус 40, і перад намі паўстае 1851 год. Гэта яшчэ пара прыгонніцтва, яшчэ дагімназічны перыяд у біяграфіі Багушэвіча, гэта яшчэ бацькоўскія Кушляны.

Панскі бізун, які гуляў па спіне прыгоннага «хлопа», пакідаў незагойныя пісягі на чулай і спагадлівай душы хлопчыка. І пазней, успамінаючы гэтыя чорныя часіны, Багушэвіч мог з поўным правам гаварыць ад імя сялян. Рыфма «цівун» — «бізун» прыходзіла сама сабой:

Там быў аканом, камісар і цівун,
Намеснік, ляснічы, хмістрыня, паны,
І кожны меў права узяць за бізун,
І кожны меў права да нашай спіны.
(«Быў у чысцы»)

Яшчэ ў юнацтве Багушэвіч адчуў і другое гора беларускіх сялян. Акрамя жорсткай эксплуатацыі, беларускія сяляне цярпелі нацыянальнае прыгнечанне і праследаванне па рэлігійных матывах. Некалі, у далёкім мінулым, ім была гвалтоўна навязана царкоўная унія. Мінулі стагоддзі, народ прывык да новай веры і пачаў лічыць яе сваёй, але ў 1839 годзе царскі ўрад навязаў уніятам праваслаўе.

Усведамленне сваёй нацыянальнай годнасці яшчэ толькі нараджалася ў сялян, і яны няпэўна і асцярожна называлі сябе «тутэйшымі», нібы спадзеючыся, што хтосьці прыйдзе і скажа ім іх сапраўднае імя.

На працягу першых дзесяцігоддзяў XIX ст. у розных мясцінах Беларусі, як іскры, успыхвалі спробы стварэння літаратуры на роднай мове. Яны хутка ніклі, але іх было шмат, і гэта сведчыла аб тым, што справа беларускай літаратуры ў будучым вырасце ў моцнае роўнае непагаснае полымя.

Не выключана, што ў гімназічныя гады Багушэвічу давялося чытаць кнігі В. Дуніна-Марцінкевіча, выдадзеныя ў Мінску і Вільні. Яны пакідалі дваістае ўражанне. Было надзвычай радасна бачыць беларускае слова надрукаваным. Тыя ж лацінскія літары, што і ў польскіх кнігах, але, калі літары складваліся ў словы, ад іх веяла раптам нечым такім родным і блізкім, што самі сабою паўставалі малюнкі ўбачанага і перажытага. Дунін-Марцінкевіч рабіў вялікую справу. Ён яшчэ раз паказаў, што мова, на якой размаўляюць мільёны беларускіх сялян, мае ўсе падставы, каб стаць паўнапраўнай літаратурнай мовай. Ён пераклаў на беларускую мову «Пана Тадэвуша». Але Марцінкевіч глядзеў на прыгонніцтва праз акуляры ліберала.

Усё гэтае і многае іншае давялося перадумаць вучню Віленскай губернскай гімназіі Францішку Багушэвічу.

2

Пра гімназічныя гады Багушэвіча да гэтага часу нічога не было вядома. Мы перагледзелі мноства дакументаў у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР [ДГА Літвы], каб адшукаць хоць бы некаторыя крупінкі. Намі вывучана справаводства Віленскай гімназіі (фонд 574), Віленскай дырэкцыі вучылішчаў (фонд 991), якой падпарадкавалася гімназія, нарэшце, канцылярыі папячыцеля Віленскай навучальнай акругі (фонд 567). Пашанцавала знайсці толькі нямногае.

Багушэвіч паступіў у гімназію, мабыць, у 1852 годзе. Аб гэтым можна меркаваць па тым, што ў канцы 1856 года ён вучыўся ў чацвёртым класе[312], а ў паперах дырэкцыі вучылі-

[312] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 567. Вопіс 3. Спр. 338.

шчаў ёсць адзнака, што 11 лістапада 1852 года «па беднасці» быў вызвалены ад платы за навучанне[313]. Яго імя мы бачым таксама ў спісе вучняў, «прызнаных беднымі і няздольнымі ўносіць вызначаную за навучанне плату», які прыкладзены да ліста дырэктара вучылішчаў папячыцелю навучальнай акругі ад 25 кастрычніка 1852 года. Побач у спісе — імя яго брата Валерыяна, які быў маладзейшы за яго на год, але, відаць, пайшоў вучыцца адначасова з ім. Так звычайна рабілі ў вялікіх незабяспечаных сем'ях.

Вучыўся Францішак спачатку не ў самой гімназіі, а ў яе чатырохкласным аддзяленні. Гэта ўстанова, заснаваная ў 1839 годзе[314], была быццам бы паралельнымі класамі гімназіі, але карысталася пэўнай самастойнасцю. Гімназія і яе аддзяленне размяшчаліся ў так званых Святаянскіх мурах, якія дасталіся ім у спадчыну ад зачыненага пасля паўстання 1831 года Віленскага універсітэта. У якасці наглядных дапаможнікаў у гімназіі скарыстоўваліся багатыя калекцыі, сабраныя універсітэтам.

А наогул гэта быў вельмі цяжкі для навучання час. У пачатку 50-х гадоў імгла мікалаеўскага царавання згусцілася надзвычайна. «Нямецкі цар» наклаў сваю лапу літаральна на ўсе галіны грамадскага жыцця. Скрозь панавала бяздушная субардынацыя, кожная дробязь павінна была прадугледжвацца ўрадам. У вальнадумстве падазравалася нават Евангелле. Гімназіі былі ператвораны ў вузкасаслоўныя ўстановы. Якраз у той год, калі Багушэвіч прыехаў у Вільню паступаць вучыц-

[313] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 991. Вопіс 1. Спр. 83. Арк. 46.

[314] Серебряков М. В. Исторический очерк столетнего существования Виленской 1-й гимназии: 1803–1903. Вильна, 1903. Ч. 1: (1803–1862). С. 115.

ца, у гімназіі Беларусі, Літвы, Украіны было забаронена прымаць каго б там ні было, акрамя дзяцей дваран і купцоў 1-й і 2-й гільдый[315]. Справа даходзіла да казусаў. У 1855 годзе з хадайніцтвам аб прыёме сына ў Віленскую гімназію звярнуўся віленскі гарадскі галава Страус. Яму адмовілі, таму што ён быў купцом 3-й гільдыі. У растлумачэнні Міністэрства асветы ад 15 верасня 1855 года з гэтай нагоды гаварылася: «У высачайшым павяленні, растлумачаным ва ўказе Кіраўнічага сената ад 14 лютага 1852 г., аб прыёме на будучы час у гімназіі заходніх губерняў адных дзяцей купцоў 1-й і 2-й гільдый не зроблена ў гэтым выпадку ніякага выключэння для купцоў 3-й гільдыі, не пастаноўлена ніякага выключэння адносна тых купцоў гэтай гільдыі, якія будуць займаць пасаду паводле гарадскіх выбараў»[316]. Што ж казаць пра сялянскіх дзяцей, калі нават сын гарадскога галавы амаль сталічнай Вільні не мог вучыцца ў гімназіі?!

Нялёгка было трапіць у гімназію і дзецям бедных дваран. Іх бацькі не заўсёды маглі выканаць усе тыя патрабаванні, якія ставіліся для паступлення. Дырэктар вучылішчаў Віленскай губерні прапанаваў наглядчыку чатырохкласнага аддзялення Віленскай гімназіі ў прадпісанні ад 31 ліпеня 1853 года: «...3) Каб Вы не раней прымалі вучняў у даверaную Вам установу, як пасля прад'яўлення імі ўсёй патрэбнай вопраткі і абутку: шыняля, мундзіра, сурдута, шапкі, па дзве пары суконных і летніх штаноў і па дзве пары чобат; шынель, мун-

[315] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 991. Вопіс 1. Спр. 74. Арк. 1. Гэты ўказ быў скасаваны толькі ў 1857 годзе, але і паводле новых правіл у гімназіі не прымаліся дзеці прыгонных сялян і салдацкія дзеці (Тамсама. Спр. 81).

[316] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 567. Вопіс 3. Спр. 236.

дзір, сурдут, штаны і шапка павінны быць пашыты з сукна вызначанага колеру і па дадзеных узорах; 4) Каб кожны вучань пры прыёме ж прадставіў усе патрэбныя вучэбныя дапаможнікі, прычым, каб унікнуць падману, на загалоўным аркушы павінен быць зроблены Вамі подпіс або прыкладзена казённая пячатка»[317]. У пачатку гэтага дакумента стаяла патрабаванне: «1) Каб вучні вызваляліся ад платы за навучанне не інакш як па надзвычайнай беднасці, прычым Вы не павінны абмяжоўвацца пасведчаннямі, якія яны прад'явяць, але даведвацца аб тым і ўпэўнівацца самім або праз паноў настаўнікаў у сапраўднай іх беднасці; 2) Каб за выключэннем тых, што вызваляюцца ад платы за навучанне па беднасці, і тых, якія жывуць пры бацьках, усе астатнія размяшчаліся ў агульных вучнёўскіх кватэрах»[318].

За пражыванне на «агульных кватэрах» бралася высокая плата — ад 65 да 150 рублёў у год у залежнасці ад разраду кватэр. Гімназічнае начальства імкнулася размясціць тут усіх іншагародніх вучняў, таму што, як тлумачыў дырэктар вучылішчаў у лісце папячыцелю навучальнай акругі ад 11 мая 1855 года, «нагляд за вучнямі, рассеянымі па ўсім горадзе, зусім нялёгкі… няма ніякай магчымасці строга сачыць за іх маральнасцю і ўхіліць уплыў на лад іх думак асоб пабочных…»[319] Калі ўлетку 1855 года вучні раз'язджаліся на канікулы, ім аб'явілі аб забароне ў далейшым жыць на прыватных кватэрах у каго б там ні было, акрамя бацькоў, нягледзячы ні на якія прычыны. Гэта было вялікім цяжарам для бедных бацькоў.

---

[317] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 574. Вопіс 1. Спр. 323. Арк. 23–24.

[318] Тамсама.

[319] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 567. Вопіс 3. Спр. 246. Арк. 1–4.

Навучанне ў гімназіі было накіравана на тое, каб знішчыць у вучняў усялякую жывую думку і выхаваць з іх верных і бяздумных служак самаўладства. Гімназічная бібліятэка запаўнялася хлуслівымі кніжкамі, накшталт «Праваслаўе, самадзяржаўе і народнасць — тры непарушныя асновы рускага царства» (твор Лялікава), «Сціслы агляд царавання благаславёнага дому Раманавых». З перыядычных выданняў для вучняў настойліва раіліся «Лучи» і «Звездочка», адарваныя ад жыцця часопісы ў духу афіцыйнай ідэалогіі, аб рэдакцыі якіх М. А. Дабралюбаў пісаў, што яна «вельмі мала думае пра сучасны рух ідэй і застаецца па-ранейшаму вельмі адданай вышэйшым адцягненасцям і ідэальным імкненням, якія не маюць практычнага сэнсу»[320]. Больш рэзка ён не мог сказаць па цэнзурных меркаваннях.

Час ад часу, хоць і не было прычыны для хвалявання, па ўсёй сістэме Міністэрства народнай асветы (ад міністра — папячыцелю акругі, ад папячыцеля — дырэктару вучылішчаў, ад апошняга — навучальным установам) рассылаліся грозныя цыркуляры аб тым, «каб не карыстацца, замест ухваленых Міністэрствам і выдадзеных ужо вучэбных па кожным прадмеце кніг, ніякімі іншымі пад строгаю ў тым з боку начальства ўстаноў адказнасцю»[321].

Сярод настаўнікаў было нямала самадураў, здольных скалечыць дзіцячыя душы. Гэта не адмаўлялася нават гімназічным начальствам. Возьмем, напрыклад, «Звесткі аб асабістых вартасцях і заганах чыноўнікаў Аддзялення Віленскай гімназіі» ад 16 лютага 1857 года. Заўважым, што гэты дакумент на-

---

[320] Русская периодическая печать: (1702–1894): Справ. М., 1959. С. 302.

[321] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 574. Вопіс 1. Спр. 323. Арк. 7.

зывае настаўнікаў «чыноўнікамі», ды яны і сапраўды, выключаючы адзінкі, былі бяздушнымі чыноўнікамі аднаго з ведамстваў царскай бюракратычнай машыны. Перад чытачом «Звестак» праходзіць своеасаблівая галерэя тыпаў настаўнікаў. Настаўнік Салаўёў «у мінулым годзе крутым абыходжаннем сваім з дзецьмі і неадпаведнасцю сваёю з закладзенымі ў іх пачаткамі маральнасці выклікаў агульнае нараканне паміж вучнямі і абурэнне многіх бацькоў». Настаўнік Баршчэўскі «выклікаў абурэнне вучняў нецярплівасцю сваёю ў час урокаў, ужываў лаянку, а некаторых цягаў за вушы і біў па руцэ ўказкай...» Гэтыя характарыстыкі зрабіў выконваючы пасаду наглядчыка чатырохкласнага аддзялення Гедымін. Самога Гедыміна, а таксама ўсе абставіны ўгодніцтва, ханжаства і ўбоства выхавацеляў, тыповыя для аддзялення і самой гімназіі, добра характарызуе наступная вытрымка са справаздачы аб стане аддзялення за 1856 год:

«Глава III.

Асаблівыя здарэнні.

Важная падзея адбылася ў 1852 г. у Аддзяленні Гімназіі, гэтай ціхай і сціплай святыні навук. Міністр, гэты галоўны ў імперыі ахоўнік народнай асветы, не адхіліў міласцівага свайго погляду на пачынанні і па гэтай установе ў справе адукацыі юнага пакалення, якое толькі нараджаецца. Ён ледзь уступіў праз парог у гэтую святыню, як ужо дзеці ахопленыя былі сардэчнай слодыччу, бачачы, як ён з расчуленасцю і ласкамі да іх набліжаецца, нібы бацька родны, і палюбілі яго гарачым сваім сэрцам назаўсёды; настаўнікі ж іх, знаходзячы ў ім саноўніка, надзеленага высокім даверам найяснейшага нашага манарха і прытым настолькі паблажлівага і ў простым з імі абыходжанні, шмат ад яго павучыліся, як павінна жыць

у згодзе адна сям'я ў адной найвялізнейшай будыніне, што і прынялі свяшчэнным абавязкам пераліваць у сэрцы даручаных іх апецы выхаванцаў.

20 дзень кастрычніка 1856 г., дзень наведвання сп. міністра народнай асветы правадзейнага тайнага саветніка Аўраама Сяргеевіча Норава, застанецца незабыўным у памяці як тых, хто вучыць, так і навучэнцаў у Аддзяленні Віленскай гімназіі»[322].

Калі б пад гэтымі халуйскімі радкамі не стаяў афіцыйны подпіс, можна было б падумаць, што гэта таленавіты памфлет на тагачасную школу.

Як бачым, умовы, што панавалі ў гімназіі і яе аддзяленні, маглі ва ўдумлівага і паэтычна адоранага юнака, якім быў Багушэвіч, адбіць ахвоту вучыцца. Каб даведацца аб поспехах Багушэвіча ў вучобе, нам давялося перагледзець класныя журналы, што захоўваюцца ў фондзе Віленскай гімназіі. Вучыўся ён вельмі няроўна. У пятым класе затрымаўся на два гады: 1857/58 і 1858/59. Магчыма, справа тлумачылася тым, што, скончыўшы ў 1857 годзе чатырохкласнае аддзяленне, ён не меў дастатковай падрыхтоўкі, каб вучыцца ў пятым класе гімназіі. Асаблівую цікавасць Багушэвіч праяўляў у гімназіі да славянскіх моў — рускай і польскай. У «Кнізе поспехаў вучняў V, VI і VII класаў Віленскай губернскай гімназіі за 1858/59 навучальны год» супраць прозвішча вучня пятага класа Франца Багушэвіча (№ 39) пастаўлены наступныя адзнакі: па рускай славеснасці — 4, па польскай мове — 4[323]. У класным журнале па польскай мове за 1857/58 год адзначана, што пяцікласнік

---

[322] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 574. Вопіс 1. Спр. 375.

[323] Сістэма балаў у той час была крыху іншая, чым цяпер: 5 — выдатна, 4 — добра, 3 — дастаткова, 2 — пасрэдна, 1 — слаба.

Багушэвіч (№ 7) на працягу года выявіў такія веды: 4+, 4+, 4, 4, 5[324]. Затое старажытныя мовы яго мала цікавілі. Па латыні ў яго гадавая «адзінка». У апошнія гады навучання ў гімназіі, як аб гэтым сведчаць класныя журналы, Багушэвіч узмоцнена займаўся матэматыкай, мабыць, ужо вырашыўшы паступіць ва універсітэт «па матэматычным разрадзе».

У апошнім (сёмым) класе Багушэвічу споўніўся 21 год, ён памужнеў і ўжо зусім не быў падобны да таго летуценніка-юнака, што застаўся на другі год у пятым класе. Адклаўшы на пэўны час убок творы Дуніна-Марцінкевіча, Сыракомлі, Някрасава і Шаўчэнкі, ён засеў за падручнікі і, можа, зусім неспадзявана для сяброў апынуўся сярод чатырох лепшых вучняў, якія пры заканчэнні гімназіі ў 1861 годзе атрымалі атэстаты з правам на чын XIV класа. «За „преуспеяние" ў навуках, чыстую, бездакорную маральнасць і за выдатныя поспехі ў рускім заканазнаўстве», — так фармуляваў 17 чэрвеня 1861 года сваё рашэнне адносна Багушэвіча педагагічны савет. Гэтае рашэнне падмацоўвалася адзнакамі ў «Ведамасці аб вучнях Віленскай гімназіі, удастоеных узнагарод пры выпуску пасля заканчэння курса ў 1860/61 навучальным годзе»: руская граматыка і славянская мова — 5, руская славеснасць — 4, нямецкая і французская мовы — 4, польская мова — 5, гісторыя і геаграфія — 4, заканазнаўства — 5, матэматыка і фізіка — 4. Толькі з заалогіяй і батанікай яму не пашанцавала. Ён атрымаў па гэтых прадметах «тры», хаця гэта, здавалася б, і дзіўна для вясковага хлапчука[325].

---

[324] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 574. Вопіс 1. Спр. 392.

[325] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 567. Вопіс 3. Спр. 906 (Об учениках, кончивших курс учения в гимназиях и выпущенных с правом на чин XIV класса). Арк. 34 адв. — 35.

«...Пагулянкі як заўсёды, так і летась рабіліся для адхлання пасля сядні над кнігамі; там гулялі ці ў мячык, ці біліся на шышкі, а часамі, з пачатку вясны, хадзілі ляпіць бабу з снегу, а часамі ў загарадныя месцы гуляць у крэнглі (кеглі. — *Г. К.*), часцей жа за ўсё гулялі па садзе за кафедраю. Размовы вяліся звычайна вучнёўскія: хто чым зоймецца, скончыўшы курс гімназіі, калі ў вышэйшую навучальную ўстанову, ці трэба будзе трымаць экзамен і з чаго, хто ў гэтым вінаваты, і так завязвалася спрэчка аб настаўніках, якая нярэдка канчалася сваркай, тады выступаў суддзя. Часамі ж, бо з леташнімі вучнямі VII класа здараліся розныя гісторыі, дык абмяркоўвалі, каму ісці да п. дырэктара і ці ісці»[326], — расказваў аднакласнік Багушэвіча Адольф Якавіцкі ў верасні 1860 года. Але гэта не звычайны расказ, а паказанні ў следчай камісіі. Таму намаляваная ім карціна вучнёўскага жыцця выйшла аднабаковай. Не такія гэта былі часы, каб вучні-старшакласнікі маглі задавольвацца гульнёю ў шышкі.

Класныя журналы могуць расказаць не толькі пра поспехі Багушэвіча ў вучобе, але і пра іншыя важныя справы: пра яго сяброў, пра тых, хто быў побач з ім у гэтыя адказныя ў сэнсе фарміравання яго светапогляду гады. І тут даследчыка чакае цікавае адкрыццё: аказваецца, сярод тых, з кім сустракаўся або сябраваў Багушэвіч, з кім сядзеў, можа быць, за адной партай, было нямала вядомых пазней дзеячаў рэвалюцыйнага руху 60-х гадоў у Беларусі і Літве. Разгорнем наўздагад адзін з класных журналаў Віленскай гімназіі за 1857/58 навучальны год і паглядзім спісы вучняў старэйшых класаў:

---

[326] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1860. Спр. 33. Ч. 1. Арк. 61.

V клас
6. Багушэвіч Франц.
17. Далеўскі Ціт.
45. Міладоўскі Аляксандр.
74. Чарноўскі Юліян.

VI клас
4. Віткоўскі Вікенцій.
11. Далеўскі Канстанцін.
31. Мінейка Сігізмунд.

VII клас
8. Здановіч Ігнат.
12. Курневіч Ігнат.

Імя аднакласніка Францішка Багушэвіча — Ціта Далеўскага — непарыўна звязана з імем вялікага сына беларускага народа Кастуся Каліноўскага. Далеўскі паходзіў з вельмі папулярнай у Вільні беднай інтэлігентнай сям'і з багатымі рэвалюцыйнымі традыцыямі. Яго старэйшыя браты толькі ў 1860 годзе вярнуліся з Акатуйскай катаргі, куды былі высланы пасля 1849 года за ўдзел у рэвалюцыйным руху. Сястра была замужам за Зыгмунтам Серакоўскім, выдатным рэвалюцыянерам, сябрам М. Г. Чарнышэўскага і Т. Р. Шаўчэнкі. Ціт Далеўскі ў 1859 годзе пакінуў гімназію і разам са сваім братам Канстанцінам накіраваўся ў Маскоўскі універсітэт. У 1863 годзе Ціт Далеўскі быў блізкім паплечнікам Каліноўскага па кіраўніцтве паўстаннем. Царскія каты схапілі смелага рэвалюцыянера і, пераканаўшыся, што ніякімі пагрозамі нельга прымусіць

яго сказаць, дзе хаваецца яго вялікі сябра, расстралялі ў снежні 1863 года. Канстанцін Далеўскі змагаўся ў 1863 годзе пад сцягам Серакоўскага, потым уцёк за мяжу і загінуў у час Парыжскай камуны[327].

Гордасцю Віленскай гімназіі быў Ігнат Здановіч, які закончыў гімназічны курс у 1858 годзе з залатым медалём. Яго таксама чакаў слаўны і трагічны лёс. Вельмі здольны чалавек, ён ужо ў 1862 годзе быў кандыдатам матэматычных навук Пецярбургскага універсітэта і накіраваўся для завяршэння адукацыі за мяжу. Аднак Здановіч вярнуўся ў Вільню, як толькі да яго дайшла вестка аб паўстанні. Ён стаў правай рукой Каліноўскага ў літоўска-беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Як і Ціта Далеўскага, царскія ўлады схапілі Здановіча і павесілі ў Вільні ў снежні 1863 года. Нават следчая камісія вымушана была прызнаць, што Здановіч «трымаўся з рэдкай упартасцю», што «ніякія пераконванні не выклікалі яго на адкрытую размову»[328].

Юліян Чарноўскі, які вучыўся ў 1857/58 годзе ў адным класе з Багушэвічам, нарадзіўся ў Вільні ў 1840 годзе. Пазней яго імя часта згадваецца ў сувязі з маёнткам Данюшава, на мяжы Ашмянскага і Свянцянскага паветаў, які, відаць, належаў Чарноўскім. Пасля Віленскай гімназіі ён быў вольным слухачом Маскоўскага універсітэта, затым паступіў у Пецярбургскі універсітэт, які кінуў у 1861 годзе, не прыняўшы матрыкул[329].

---

[327] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 1. S. 308, 388.

[328] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Вопіс 219. Спр. 1411. Арк. 86.

[329] ДГАЛВ [ЦДГА СПб.]. Фонд 14. Вопіс 5. Спр. 2243.

У 1863 годзе, займаючы пасаду рэвалюцыйнага камісара Ашмянскага павета, Чарноўскі вызначыўся энергіяй і рашучымі мерамі супраць памешчыкаў, якія не хацелі падтрымліваць паўстанне. У адной следчай справе чытаем, што ён «даў дазвол шайцы абрабаваць памешчыка Нарковіча ў Мігулях», у якога начальнік паўстанцкага атрада Густаў Чаховіч («Астоя») адабраў для рэвалюцыйных мэт 900 рублёў[330]. Імя Юліяна Чарноўскага пазней не раз называлася ў сувязі са следствам аб удзеле сям'і Багушэвічаў у паўстанні.

Аб Сігізмундзе Мінейку, які ў 1863 годзе быў рэвалюцыйным ваенным начальнікам Ашмянскага павета, гаворка пойдзе пасля.

Фігуры В. Віткоўскага, І. Курневіча, А. Міладоўскага, імёны якіх у спісах гімназістаў стаяць побач з імем Ф. Багушэвіча, таксама вельмі цікавыя. Сын віленскага мешчаніна — саф'яннага майстра — Вікенцій Віткоўскі скончыў гімназію на год раней за Багушэвіча, у 1860 годзе. Гэта быў, як пісалі пра яго царскія ўлады, «дзевятнаццацігадовы малады чалавек, поўны ідэй рэспубліканскіх». Ён арганізаваў сярод вучнёўскай моладзі Вільні рэвалюцыйны гурток, які наладзіў сувязь з рамеснікамі і спрабаваў пашырыць сваю дзейнасць на сялян. У дзейнасці гуртка прымалі ўдзел студэнты Пецярбургскага універсітэта, сябры Каліноўскага: Ігнат Курневіч (скончыў Віленскую гімназію ў 1858 годзе), Эдмунд Вярыга (пазней — член Літоўска-беларускага правінцыяльнага камітэта, які ўзначальваў Каліноўскі),

---

[330] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 438. Вопіс 1. Спр. 326. Арк. 8 адв.; фонд 378. Паліт. аддз. 1863. Спр. 796. Арк. 47.

Эмануіл Юндзіл. Калі ў 1860 годзе гурток быў раскрыты, у рукі царскіх улад трапіў верш, які дае ўяўленне пра склад гуртка і настроі, што панавалі ў Віленскай гімназіі. Прывядзём яго ў перакладзе з польскай мовы, зробленым царскімі чыноўнікамі:

Тосты по поводу маевки 23 апреля 60 г.
Вильно. Импровизация.

Нальем чарки! Подадим друг другу руки!
Пусть соединит нас единодушие и согласие!
Да окончим уже время неволи!
Да увенчает чело наше лавр свободы!
Пусть звенят чарки! Пусть шумит мед!
Да здравствует ***Викентий****! Честь тебе, честь!*
Любовь к отечеству — предмет твоих чувств,
Наша к нему любовь — плод твоих посевов.
Да здравствует наш ***Адольф****! Как его чело*
Пылает! Как взор его горит мужеством!
Имеет ловкость тела и сильную руку.
Пусть узнает ее скоро враг!
Наш ***Александр*** *— также молодец,*
Да здравствует! В нем живет Красинских[331] *дух!*
Когда наступит время воевать,
Мы будем сражаться, ты — нас воспевать.
Ура! Да благоприятствует нам счастливая судьба!
Честь вам, господа! Честь, всем честь,
Которые за край готовы жизнь нести.

---

[331] Зігмунт Красінскі — выдатны польскі паэт.

Не дадим себе дуть под нос.
Ура! Гей, ура! В последний раз
Единодушие и согласие! Подадим друг другу руки!
Пусть цепь бесчестия свалится с нас!
Пусть лавр свободы увенчает нам чело![332]

Хто ж яны — гэты малады правадыр Вікенцій, мужны Адольф, вершатворац Аляксандр, пра якіх гаворыцца ў гэтым вершы? Аказваецца, усе яны — гімназічныя таварышы Багушэвіча, якія вучыліся з ім у адным або ў сумежных класах. Як паказаў вучань гімназіі Капылоў, у гэтым вершы выведзены Вікенцій Віткоўскі, Адольф Якавіцкі і Аляксандр Міладоўскі[333]. Аб магчымай блізкасці Багушэвіча да Віткоўскага і Міладоўскага мы ўжо гаварылі. Каб давесці сувязь Багушэвіча з Якавіцкім і Капыловым, дастаткова прывесці невялікую вытрымку з класнага журнала па заканазнаўстве за 1860/61 год. У спісе вучняў сёмага класа, якія вывучалі заканазнаўства, усяго 6 чалавек, і сярод іх:

4. Капылоў Аляксандр.
5. Якавіцкі Адольф.
6. Багушэвіч Франц.

Такім чынам, блізкасць Багушэвіча да людзей, якія ўваходзілі ў 1860 годзе ў гурток віленскай рэвалюцыйнай моладзі, можна лічыць несумненнай. І калі ён нават не прымаў непасрэднага ўдзелу ў дзейнасці гэтага гуртка, то не мог не ведаць аб яго існаванні. Няхай не заўсёды ісціна была на баку

[332] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1860. Спр. 229, Арк. 65. Арыгінал верша — ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1860. Спр. 33. Ч. 1. Арк. 33.

[333] ЦДГАМ [ДА РФ]. Фонд III аддз. 1 эксп. 1860. Спр. 229. Арк. 34.

гэтых юнакоў, няхай нясталыя былі часамі іх меркаванні[334], але многаму ў іх можна было павучыцца і перш за ўсё — сыноўняй, адданай любові да радзімы. Багушэвічу запалі ў памяць словы з твора, які хадзіў у той час па руках: «Дарога жыцця народаў, іх гістарычнае поле дзейнасці таксама азначаны крывавымі слядамі. Шчодрыя кроплі крывавага поту падаюць і насычаюць іх родную зямлю. І хіба не будзе гэта адной з вялікіх сіл, што ўмацоўвае любоў да айчыны?!»[335] І ён назаўсёды запомніў Вікенція Віткоўскага, аддадзенага царскімі ўладамі ў аранбургскія лінейныя батальёны.

У той год, калі Багушэвіч заканчваў гімназію, яму давялося на сабе адчуць несправядлівасць саслоўнага ладу. У ліку чатырох лепшых выпускнікоў гімназіі ён быў удастоены атэстата з правам на чын XIV класа. Але, каб атрымаць такі атэстат, мала было паказаць добрыя веды на выпускных экзаменах. Трэба было давесці сваё дваранскае паходжанне. Пасведчанне, дадзенае ашмянскім павятовым прадвадзіцелем дваранства, не задаволіла царскіх чыноўнікаў. Рашэнне педагагічнага савета было прынята 17 чэрвеня 1861 года. 21 чэрвеня пратакол з усімі неабходнымі паперамі быў накіраваны папячыцелю навучальнай акругі на зацверджанне. 4 ліпеня дырэктар вучылішчаў атрымаў паведамленне аб згодзе вышэйшага начальства, але з адной папраўкай. «Што ж датычыць вучня Франца Багушэвіча, удастоенага атэстата

---

[334] Некаторыя даследчыкі схільны перабольшваць рэвалюцыйную спеласць дзеячаў гуртка Віткоўскага, гл. нашу рэцэнзію на кнігі А. Смірнова пра К. Каліноўскага: ЛіМ. 1959. 18 лістап. (№ 91 (1417)) і агляд: Новые труды историков Литвы по истории крестьян XIX в. // История СССР. 1960. № 1.

[335] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1860. Спр. 33. Ч. 1. Арк. 33.

з правам на чын XIV класа, — гаварылася ў паведамленні, — то выдача гэткага не раней можа быць дазволена, як пасля падачы фармальнай копіі з пастановы дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні Багушэвіча, таму што пададзенае пасведчанне ашмянскага павятовага прадвадзіцеля дваранства, згодна з 20 арт. III т. Зв[оду] Зак[онаў] (выд. 1857 г.), не можа быць прынята пад увагу»[336]. Некалькі тыдняў давялося Багушэвічу абіваць парогі канцылярыі Губернскага дваранскага дэпутацкага сходу, каб атрымаць патрэбны форменны дакумент. Атрымаўшы атэстат, ён у той жа дзень (26 ліпеня 1861 года) паслаў заяву ў Пецярбургскі універсітэт.

3

У неспакойны час пакідаў Багушэвіч родныя мясціны. Абвешчаная маніфестам 19 лютага «воля» была падманная.

...Ой, штосьці кепска выходзе,
Цяпер ці не болей настала паноў?
Не надта свабодна у гэтай свабодзе... —

так выказаў Багушэвіч адносіны сялян да рэформы ў вершы «Быў у чысцы». Зняважаныя ў сваіх спадзяваннях, сяляне адмаўляліся прымаць такую «волю». У красавіку 1861 года вялікія натоўпы сялян сабраліся ў м. Іўе Ашмянскага павета (адтуль рукой падаць да Кушлян Багушэвіча), патрабуючы сапраўднай волі. Адбылася сутычка сялян з войскамі, у выніку якой адзін селянін загінуў, многія былі паранены. «Іўеўскі мяцеж... — пісаў адзін напалоханы памешчык, — паказаў дастаткова выразна, што нам пагражала» (пер.

[336] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 567. Вопіс 3. Спр. 908. Арк. 68.

з франц.)[337]. Хваляваліся сяляне і ў кушлянскім маёнтку Сулістроўскага[338].

Узбунтаванае сялянскае мора бушавала, падкочвалася да гарадскіх сцен, а з гарадоў ішла сустрэчная хваля вызваленчага руху. Вясною 1861 года, у адказ на зверскі расстрэл царскімі войскамі мірных маніфестацый у Варшаве, адбыліся мітынгі і дэманстрацыі ў Пецярбургу, Маскве, гарадах Беларусі і Літвы.

У бурных падзеях, што адбываліся ў Вільні, самы дзейсны ўдзел прымалі вучні гімназіі. Нават выгляд гімназістаў перамяніўся. Гэта сведчыла аб узрушанасці і ваяўнічым настроі, што панаваў у гімназіі. Характэрная аб'ява была надрукавана 17 жніўня 1861 года ў «Віленскім весніку»: «Віленская дырэкцыя вучылішчаў, маючы звесткі, што некаторыя з вучняў падначаленых ёй вучылішчаў, таксама як і прыезджыя з іншых навучальных устаноў, ходзяць па вуліцах у няформеннай вопратцы, расхрыстаныя, у белых шапках, з хлысцікамі і палкамі ў руках, знаходзіць патрэбным нагадаць усім вучням, што нашэнне няформеннай вопраткі і хаджэнне з палкамі строга забараняецца правіламі вучылішча»[339]. За ўдзел у дэманстрацыях і спяванне рэвалюцыйных гімнаў два выпускнікі гімназіі былі пазбаўлены медалёў, некалькі гімназістаў арыштаваны. Але рэпрэсіі не маглі запалохаць віленцаў. 6 жніўня пяцітысячная дэманстрацыя рамеснікаў, дробных чыноўнікаў і гімназістаў накіравалася да магілы вядомага польскага рэвалюцыянера Шымана Канарскага, які быў расстраляны тут у

---

[337] ДГМ. Фонд 381. Спр. 13. Арк. 186.

[338] Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права: (1861–1862 гг.): Док. и материалы. Минск, 1959. С. 72.

[339] Серебряков М. В. Исторический очерк... С. 139.

1839 годзе. Ля заставы шлях дэманстрантам заступілі войскі. У ход пайшлі камяні з бруку і калы. З вялікімі цяжкасцямі казакі разагналі дэманстрацыю. Багушэвіч пакінуў Вільню, калі расклееныя па горадзе аб'явы генерал-губернатара забаранялі пасля дзевяці гадзін вечара выходзіць на вуліцу. На ўсіх заставах і выездах стаялі ваенныя каравулы.

Аднак яшчэ больш уражальныя падзеі чакалі яго ў Пецярбургу. Залічаны на першы курс універсітэта, ён так і не пачынаў вучыцца, бо ва універсітэце ў гэтым годзе заняткаў фактычна не было — студэнты хваляваліся. Гэта быў трывожны і шчаслівы час. Няхай сабе не чыталіся «казённыя» лекцыі ва універсітэце. Затое працаваў другі універсітэт — рэвалюцыйнай навукі, класавага выхавання, у якім прафесараў замянілі свае ж таварышы-рэвалюцыянеры, а замест падручнікаў тут чыталі падшыўкі «Современника» і «Колокола».

Пачалося з таго, што студэнтаў наважылі запалохаць. У маі 1861 года былі прыняты новыя правілы для універсітэтаў. Катэгарычна забаранялася праводзіць сходы, звяртацца да начальства праз дэпутатаў, выказваць нездаволенасць на лекцыях. Фактычна было скасавана вызваленне незабяспечаных студэнтаў ад платы за слуханне лекцый.

Вярнуўшыся з летніх канікул, студэнты ўсіх нацыянальнасцей абвясцілі байкот новым правілам і адмовіліся прыняць матрыкулы (іх трэба было паказваць кожны раз пры ўваходзе), дзе гэтыя правілы былі надрукаваны. У ліку іншых адмовіўся прыняць матрыкул і студэнт першага курса «па матэматычным разрадзе» Францішак Багушэвіч, хоць і ведаў, што за гэта пагражае выключэнне з універсітэта. Ён з галавой акунуўся ў новае жыццё. Мы без намаганняў можам уявіць яго ў актавай зале універсітэта ў тысячным натоўпе студэнтаў, якія прагна

слухаюць пракламацыю «Да маладога пакалення», напісаную М. В. Шалгуновым, паплечнікам М. Г. Чарнышэўскага: «Калі для ажыццяўлення нашых імкненняў, для падзелу зямлі паміж сялянамі давялося б выразаць сто тысяч памешчыкаў, мы не спалохаліся б гэтага»[340]. Можам уявіць юнака з Кушлян у калоне маладых людзей з блакітнымі каўнярамі і такімі ж аколышкамі на шапках, якая ідзе праз увесь горад на Калакольную вуліцу, дзе жыў папячыцель навучальнай акругі, каб сказаць аб сваіх патрабаваннях. А можа, і яго кроў была на пецярбургскім бруку 12 кастрычніка, калі студэнтаў білі паліцыя і войскі ля ўваходу ва універсітэт?

Ясна адно: студэнцкія хваляванні 1861 года, вялікія ідэі рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі, якая трывала стаяла на пазіцыях сялянскай рэвалюцыі і патрабавала права на самавызначэнне для народаў Расіі, дапамаглі сфарміраваць светапогляд юнаку з Кушлян. «Беларусь, па плямённай умове, згуртуецца ў сваю вобласць, таксама як Літва ў сваю»[341], — чытаў ён у «Колоколе». І калі разам з многімі іншымі студэнтамі Багушэвіч апынуўся за дзвярыма універсітэта, ён ведаў, што яму рабіць: «**У народ! да народа!** — вось ваша месца, выгнаннікі навукі!»[342] — падказваў Герцэн. І Багушэвіч вярнуўся да свайго народа[343].

---

[340] Лемке М. Политические процессы в России 1860-х годов. 2-е изд. М.; Пг., 1923. С. 70.

[341] Огарев Н. П. На новый год 1861: Избр. соц.-полит. и филос. произведения. М., 1952. Т. 1. С. 383; Колокол. 1861. 1 янв.

[342] Герцен А. И. Исполин просыпается! // Собр. сочинений. М., 1958. Т. 15. С. 175; Колокол. 1861. 1 нояб.

[343] Акалічнасці звальнення Багушэвіча з універсітэта і іншыя матэрыялы яго студэнцкай справы гл. у кн.: Майхровіч С. Нарысы беларускай літаратуры XIX ст. Мінск, 1957. С. 159–166.

Нядаўні студэнт Пецярбургскага універсітэта стаў настаўнікам у невялікай школе ў маёнтку Доцішкі Лідскага павета. Ён не толькі вучыў сялянскіх дзяцей чытаць, пісаць і рашаць задачы па арыфметыцы. Ён быў народным настаўнікам у самым высокім значэнні гэтага слова. Ён раскрываў перад сялянамі акно ў шырокі свет, расказваў ім, хто іх сябры, а хто ворагі, і спакваля рыхтаваў да паўстання. А калі сяляне прыносілі яму чытаць «Мужыцкую праўду», якую выдаваў К. Каліноўскі, Багушэвіч думаў аб тым, што вялікі беларускі рэвалюцыянер нібы падслухаў яго думкі.

Не парываў ён цесных сувязей і з родным Ашмянскім паветам, дзе ў 1861–1862 гадах актыўна дзейнічала рэвалюцыйнае таварыства «Піянтковічаў». Як сведчаць крыніцы, яно атрымала сваю назву ад таго, што яго члены збіраліся на свае пасяджэнні па пятніцах (piątek). Арганізаваў яго былы студэнт Пецярбургскага універсітэта, паплечнік К. Каліноўскага Яўстафій Чарноўскі (брат Юліяна). Аддзяленні таварыства былі ў Вільні, Ашмянах, Свянцянах. Таварыства ставіла перад сабою вельмі важную і цяжкую задачу — аб'яднаць польскі рэвалюцыйны рух з сялянскім антыпанскім рухам. Зразумела, сярод членаў таварыства маглі аказацца і польскія нацыяналісты, якія імкнуліся скарыстаць рэвалюцыйную энергію беларускіх і літоўскіх сялян у сваіх карыслівых мэтах. Гэтага ў тых складаных умовах нельга было ўнікнуць. Аднак несумненна, што левае крыло таварыства складалі сапраўдныя рэвалюцыянеры.

Да левага крыла таварыства «Піянтковічаў» належаў, відаць, і Ф. Багушэвіч. Прозвішча яго ў сувязі з гэтым таварыствам згадваецца ў паведамленні галоўнага ўпраўляючага III аддзяленнем царскай канцылярыі князя Далгарукава

віленскаму генерал-губернатару ад 20 студзеня 1862 года. Вось як гучыць гэты дакумент, у якім падаюцца «прыватныя» (г. зн. агентурныя) звесткі, здабытыя III аддзяленнем: «З'езд членаў таварыства „Піянтковічаў", які меркаваўся на 6 студзеня, не адбыўся, кажуць, таму, што за імі пачалі ў апошні час вельмі пільна назіраць, так што, баючыся быць выкрытымі, яны не збіраліся нават малым лікам. Аб гэтым было абвешчана Чарноўскім на невялікім сходзе, што адбыўся перад новым годам у г. Ашмянах у канцылярыста Гаўрылкевіча, на якім былі: Чарноўскія, Маркоўскія, **Багушэвіч** (вылучана мною. — *Г. К.*), Валовічы, Каласоўскія і Осіп, студэнт з Варшаўскай медыцынскай акадэміі. Чарноўскі, дадаўшы, што са зняццем ваеннага становішча ў Вільні члены названага таварыства будуць значна вальнейшыя на сваіх сходах, прасіў прысутных сабрацца 10 дня студзеня ў Ашмянах на агульны сход моладзі...»[344] Улічваючы блізкае знаёмства Ф. Багушэвіча з братам арганізатара таварыства, мы маем усе падставы меркаваць, што гаворка ў гэтым дакуменце ідзе якраз пра Францішка Багушэвіча[345].

Калі ў студзені 1863 года ўспыхнула паўстанне ў Польшчы і Каліноўскі заклікаў беларускі і літоўскі народы падтрымаць польскіх братоў, Багушэвіч без ваганняў узяўся за зброю.

---

[344] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1861. Спр. 145. Арк. 3. Агентам, які паведаміў уладам пра «Піянтковічаў», быў той жа Юзаф Бярнацкі, што данёс і на Дуніна-Марцінкевіча.

[345] У канцы 1863 года ўлады пачалі расследаванне дзейнасці «Піянтковічаў». У сувязі з гэтым Багушэвіча шукалі з Віленскай следчай камісіі (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 2. Спр. 1519. Арк. 419). 13 лютага 1864 года Я. Чарноўскі адказаў на адпаведнае пытанне камісіі: «Багушэвіча не ведаю» (Тамсама. Арк. 398).

Захавалася паданне аб камені на жупранскім рынку. Стоячы на гэтым камені, Багушэвіч сказаў прамову перад адыходам да паўстанцаў. Гэта магло быць у сакавіку 1863 года, калі пад Смаргонню, Валожынам і ў іншых мясцінах Ашмянскага павета з'явіліся першыя паўстанцкія атрады. Але, магчыма, гэта плён народнай фантазіі: народ, як вядома, нярэдка па-свойму і вельмі яскрава малюе постаці любімых герояў. Тая шчаслівая акалічнасць, што Багушэвіч не быў злоўлены царскімі ўладамі, што яго імя не назвалі таварышы на допытах у следчых камісіях, ускладняе становішча біёграфа. Нам невядома нават, у якім паўстанцкім атрадзе змагаўся Багушэвіч супраць царызму і прыгонніцтва. Сам паэт успамінаў пазней пра 1863 год толькі сярод самых блізкіх сяброў.

Праз шэсць гадоў пасля смерці Багушэвіча Напалеон Роўба, які блізка ведаў беларускага паэта, апублікаваў у віленскай газеце «Кур'ер літоўскі» некалькі радкоў пра яго ўдзел у паўстанні. Вось гэтыя радкі: «...Гістарычная навальніца надзвычай цяжкай глыбай навісла над Літвой і Беларуссю. Прыйшоў 1863 год, а крыху пазней з'явіўся Мураўёў. Ф. Б[агушэвіч] уступіў у паўстанцкія рады і прайшоў шлях да самай Сувалкскай (у той час Аўгустоўскай) губерні. Паранены ў нагу, ён знайшоў там гасціннасць і клапатлівыя адносіны ў доме пп. Крушэўскіх, якія пасля дапамаглі яму вярнуцца ў Вільню»[346]. Сведчанне вельмі каштоўнае, але і яно, на жаль, не асвятляе пачатку баявога шляху Багушэвіча.

Калі ён уступіў у паўстанцкі атрад у Ашмянскім павеце, то ваяваў, відаць, спачатку ў атрадзе Зыгмунта Мінейкі. Гэта быў

---

[346] Rouba N. Poeta Białej Rusi // Kurjer Litewski. 1906. 15 (28) kwietnia (№ 84).

яго зямляк, равеснік і таварыш па Віленскай гімназіі. Пазней Мінейка вучыўся ў Пецярбургскім ваенна-інжынерным вучылішчы, прымаў удзел у рэвалюцыйнай арганізацыі і ў 1861 годзе быў вымушаны ўцячы за мяжу, дзе пэўны час вучыўся ў польскай рэвалюцыйнай ваеннай школе ў Кунеа ў Італіі. Матэрыялы следства дазваляюць зрабіць вывад, што Мінейка меў цесныя сувязі з І. Курневічам і Э. Вярыгам. Калі пачалося паўстанне, ён быў прызначаны паўстанцкім ваенным начальнікам Ашмянскага павета і паступова аб'яднаў пад сваім камандаваннем усе невялікія атрады, якія ўзніклі ў павеце. Зборны пункт быў у лесе, па дарозе паміж Міхайлоўшчынай і Краснай Горкай. Харчаванне паўстанцам давалі сяляне вёскі Лавіна, а таксама чыншавая шляхта, што арандавала зямлю ў графа Храптовіча ў Вішнеўскай пушчы. У пачатку чэрвеня 1863 года дрэнна ўзброены атрад Мінейкі, заспеты царскімі войскамі ў Бакштанскіх лясах, пацярпеў паражэнне, а хворы на тыфус кіраўнік атрада быў узяты ў палон[347]. Камандаванне ўцалелымі байцамі ўзяў на сябе студэнт Маскоўскага універсітэта Карл Ясевіч, які паходзіў з безмаёнткавай шляхты Ашмянскага павета. Неўзабаве ашмянскія паўстанцы далучыліся да атрада Густава Чаховіча («Астоя»), які дзейнічаў у Свянцянскім, Віленскім і Ашмянскім паветах[348]. Чаховіч паходзіў з маёнтка Паўлінава суседняга Свянцянскага павета. Паводле паказанняў А. Снадскага, у яго атрадзе налічвалася 200 паўстанцаў. Іншыя паўстанцы ў

---

[347] Gieysztor J. Pamiętniki... T. 2. S. 269; судова-следчая справа пра Мінейку. ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. С. 116.

[348] Справа К. Ясевіча (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1863. Спр. 993); справа А. Снадскага (дробны чыноўнік Ашмянскага казначэйства, паўстанец Мінейкі, потым Чаховіча) (Тамсама. Спр. 796).

сваіх паказаннях малююць яго хударлявым бландзінам гадоў 28, з вялікай барадой, бакенбардамі і вусамі. Калі Чаховіч часова пакідаў атрад, то надзяваў акуляры, каб не пазналі царскія шпікі.

У радах ашмянскіх паўстанцаў, якія змагаліся паслядоўна пад кіраўніцтвам С. Мінейкі, К. Ясевіча і Г. Чаховіча, быў прынамсі адзін з сыноў Казіміра Багушэвіча з Кушлян. З матэрыялаў следчай справы К. Ясевіча (у верасні 1863 года ён добраахвотна здаўся ўладам і даў падрабязныя паказанні) вынікае, што паўстанец Багушэвіч нават выконваў у атрадзе абавязкі малодшага камандзіра. Вось вытрымка з паказання Ясевіча ад 4 кастрычніка 1863 года: «Калі мы прыйшлі да начальніка Мінейкі ў Вішнеўскім лесе (у маі 1863 года. — *Г. К.*), дык шайка наша дасягала 70 чалавек. Шайка была падзелена Мінейкам на 4 часткі (секцыі); у кожнай частцы было прызначана па 2 унтэр-афіцэры. Унтэр-афіцэрамі былі: Завадскі Карл, Лакуціеўскі, Заблоцкі, **Багушэвіч** (вылучана намі. — *Г. К.*), Мацкевіч і я — астатніх не памятаю». І яшчэ: «Для загадвання харчаваннем не было нікога; харчы ж утрымліваліся ў Багушэвіча»[349].

Зразумела, нельга з поўнай упэўненасцю сказаць, што гаворка тут ідзе менавіта аб Францішку Багушэвічу. Магчыма, што Ясевіч мае на ўвазе яго брата Валерыяна, якога яшчэ ў снежні 1864 года шукала паліцыя за ўдзел у паўстанні. Аднак наўрад ці можна сумнявацца, што перад намі вельмі каштоўнае сведчанне аб паўстанцкай дзейнасці аднаго з сыноў К. Багушэвіча. У гэтым нас пераконвае тая акалічнасць, што

[349] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1863. Спр. 993. Арк. 35.

паказанне Ясевіча цалкам дапасоўваецца да матэрыялаў следчай справы аб удзеле сям'і Багушэвічаў у паўстанні[350]. На жаль, у следчай справе Багушэвічаў змяшчаецца толькі рапарт следчай камісіі (першасных дакументаў —пратаколаў допытаў і г. д. — у справе няма), але і з тых матэрыялаў, якія захаваліся, відаць, што Багушэвічы былі звязаны з паўстанцамі з атрада Мінейкі — Ясевіча — Чаховіча. Улетку 1863 года атрад Чаховіча дзейнічаў недалёка ад Кушлян. Напрыклад, адзін з яго паўстанцаў — А. Снадскі — быў захоплены ў палон пад Соламі (15 вёрст ад Кушлян) і ў жніўні 1863 года расстраляны ў Ашмянах. На падставе паказанняў некаторых з паўстанцаў Чаховіча і былі ў кастрычніку 1863 года арыштаваны бацька пісьменніка, яго сястра Ганна і малодшы брат Апалінарый. Паводле следчай справы, «Казімір Багушэвіч улетку прымаў сына, што знаходзіцца ў мяцяжы, з якім у яго лес прыходзілі мяцежнікі, і для іх ён нарыхтаваў правізію. Другі сын яго і да гэтага часу (дакумент датаваны 22 лютага 1864 года. — *Г. К.*) знаходзіцца ў мяцяжы. Трэці сын, згаданы Апалінарый, паводле паказанняў мяцежнікаў, прыносіў да іх у лес харчы, у чым выкрыты і на вочнай стаўцы. Такім чынам, тры сыны Багушэвіча, дачка і ён сам прымалі ўдзел у

[350] Дакументы аб удзеле сям'і Ф. Багушэвіча ў паўстанні 1863 года // Полымя. 1960. № 10. С. 173–176. Упершыню архіўныя дакументы пра ўдзел Багушэвічаў у паўстанні апублікаваны А. Семяновічам (ЛіМ. 1958. 19 сак.). Ён увёў у навуковы ўжытак справу генерал-губернатарскай канцылярыі: О наложении секвестра на имения помещиков Ошмянского уезда Бронислава Бениславского и Казимира Богушевича за принятие ими участия в мятеже. Началось 5 января 1864 г. Кончено 8 ноября 1864 г. На 24 листах (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1864. Спр. 239). Намі знойдзены і апублікаваны ў «Полымі» блізкая па змесце справа Віленскай следчай камісіі (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 438. Вопіс 1. Спр. 870) і некаторыя іншыя дакументы.

мяцяжы», — рабіла выснову следчая камісія. На рапарце — выразная заўвага: «Але дзе знаходзяцца іншыя сыны (г. зн. апроч арыштаванага Апалінарыя. — *Г. К.*) — невядома». Відаць, гэтае пытанне вельмі непакоіла следчых. Хаця імя Францішка Багушэвіча проста нідзе не названа, але мы ясна адчуваем, якая небяспека яго падпільноўвала, як блізка былі ад яго жандарскія кіпцюры.

Шмат месяцаў паўстанцы Ашмяншчыны змагаліся з непараўнальна большымі сіламі рэгулярных да зубоў узброеных царскіх войск. Рэпрэсіі супраць паўстанцаў усё ўзмацняліся. Палонных каралі смерцю. Шыбеніцы стаялі ў Ашмянах, Смаргоні, Гальшанах.

Надышла позняя восень. Пасуравелі, пачарнелі лясы. Толькі зрэдку пырсне ружаватае празрыстае золата абпаленых першымі замаразкамі дубоў на цёмныя яліны. Патаемнымі сцяжынкамі прабраўся ў паўстанчы лагер кур'ер з Вільні. Ён прынёс ад Кастуся Каліноўскага загад № 116 ад 1 кастрычніка 1863 года, «...каб Ашмянскі аддзел войска выйшаў з Ашмянскага павета ў Вількамірскі або Лідскі або нават у Гродзенскую губерню і, калі трэба, дык падзяліўся б на дробныя атрады, але ніяк каб не думаў складваць зброі, а наадварот, каб ён заўсёды быў гатовы з'яднаць гэтыя атрады для працягу дзеянняў»[351].

Загад быў даведзены да ведама ўсіх паўстанцаў. Відавочна, з гэтым загадам трэба звязваць і адзначанае ў следчай справе з'яўленне сястры Багушэвіча Ганны ў адной з паўстанцкіх груп: «У кастрычніку месяцы ў лес, які належыць Казіміру Багушэвічу, да мяцежнікаў прыходзіла дач-

[351] ЦДВГА [РДВГА]. Фонд ВУА. Спр. 1310. Арк. 156–157.

ка яго Ганна, якой дадзена была запіска да Беніслаўскага (паўстанцкі цывільны начальнік Ашмянскага павета. — *Г. К.*) аб аказанні ім дапамогі. Пабачыўшыся ў Сольскім касцёле з Беніслаўскім і атрымаўшы ад яго 58 рублёў грошай, Ганна Багушэвіч і Ганна Баброўская на другі дзень прыйшлі да мяцежнікаў і, аддаючы ім грошы, растлумачылі, што Беніслаўскі прыслаў іх на дарогу і загадаў, выбраўшы Ляшчынскага або Гулецкага ў начальнікі, ісці ў Царства Польскае на з'яднанне з іншымі шайкамі, карты ж або маршруту на праход туды даць Беніслаўскі не можа, таму што сам мае адзін толькі экзэмпляр карты Ашмянскага павета»[352].

Магчыма, у гэты час і пайшоў Багушэвіч разам з ашмянскімі паўстанцамі за Нёман — у Сувалкію. Але з аднолькавым поспехам можна меркаваць, што Багушэвіч уступіў у паўстанцкі атрад у Лідскім павеце, дзе ён наладзіў цесныя сувязі з рэвалюцыянерамі ў час свайго настаўнічання. Сярод шматлікіх паўстанцкіх атрадаў, якія дзейнічалі ў Беларусі і ў Літве, быў адзін атрад, баявы шлях якога ляжаў праз Доцішкі, дзе Багушэвіч працаваў настаўнікам, у Сувалкію. Мы маем на ўвазе атрад «Астрогі» (Парадоўскага). 12 чэрвеня 1863 года ў сутычцы пры фальварку Доцішкі царскі палкоўнік Уласаў адбіў у паўстанцаў Астрогі перапіску, карты і «найбольш каштоўную рэч — парадную шапку» прадвадзіцеля[353].

Калі пасля ўдалай карнай экспедыцыі Уласаў вяртаўся ў Вільню, ён вёз з сабой уладальніка Доцішак Аляксандра Звяровіча і параненага студэнта Уладзіслава Пілецкага, які

---

[352] Дакументы аб удзеле сям'і Ф. Багушэвіча ў паўстанні 1863 года гл.: Полымя. 1960. № 10. С. 174.

[353] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 438. Вопіс 1. Спр. 192. Арк. 29 (рапарт Уласава).

знаходзіўся ў маёнтку[354]. Звяровічу было тады 45 гадоў. Яму прад'яўлялася абвінавачанне, «што ён праз Пілецкага дастаўляў у лес усё неабходнае для мяцежнікаў са сваёй мызы, між тым пры запытанні аб'явіў палкоўніку Уласаву, што мяцежнікі сапраўды рана раніцай праходзілі каля мызы, але не ўказаў, што мяцежнікі і цяпер у яго ў лесе ля мызы, аб чым не можа быць каб ён не ведаў, тым больш, што ад яго яны атрымоўвалі ўсю правізію». Мураўёў загадаў «на маёнтак гэтага памешчыка неадкладна накласці секвестр і прадпісаць ваенна-павятоваму начальніку ўсю рухомую маёмасць гэтага памешчыка прадаць, а хлеб звярнуць войскам на харчаванне»[355], хаця Віленская следчая камісія, куды праз некаторы час паступіла справа, была схільна з прычыны адсутнасці доказаў апраўдаць Звяровіча[356]. Пашкодзілі яму паказанні паўстанцкага камісара Лідскага павета Вітальда Гажыча, які паведаміў, што аднойчы Звяровіч паказаў яму дарогу ў атрад Астрогі[357]. Адначасова ў камісіі разглядалася і другая справа пра Звяровіча, па якой ён разам з вядомым гісторыкам Тэадорам Нарбутам (уладальнікам маёнтка Шаўры) абвінавачваўся ў тым, што згодна з паўстанцкім маніфестам ад 10 (22) студзеня 1863 года адмовіўся ад

---

[354] Пілецкі скончыў Віленскую гімназію і вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, які пакінуў адначасова з Багушэвічам. Напярэдадні паўстання быў хатнім настаўнікам у Нарбутаў (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 233). У справе Пілецкага шмат цікавых звестак пра паўстанне ў Лідскім павеце.

[355] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 482. Арк. 1 адв., 3.

[356] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 438. Вопіс 1. Спр. 495.

[357] Справа В. Гажыча. ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 382а. Арк. 76.

спагнання з сялян паншчыны і чыншу. Сапраўды, паводле паказанняў доцішскіх сялян, «у лютым месяцы памешчык Аляксандр Звяровіч паклікаў старасту вёскі Доцішкі Міхаіла Мілюкевіча і загадаў, каб не прымушаць сялян да адбывання паншчыны, і прытым гаварыў, што будзе падорана зямля без выплаты чыншу». «З таго часу, — расказвалі сяляне, — паншчыны не адбывалі, якую ён, Звяровіч, не патрабаваў»[358]. Як бачым, гэта быў ліберальны памешчык, які спачуваў паўстанню. Таму і мог Багушэвіч працаваць у яго школе[359].

Начальнікам паўстанцкіх узброеных сіл у Лідскім павеце быў Людвік Нарбут, сын гісторыка.

У яго былі даўнія рахункі з царызмам. Яшчэ ў 1850 годзе яго, васемнаццацігадовага вучня Віленскай гімназіі, пакаралі розгамі і аддалі навечна ў салдаты. (Тады за канспірацыйную дзейнасць было арыштавана шмат вучняў у Вільні і Мінску.) Невялікага росту, шчуплы, ён аднак праявіў незвычайную храбрасць у час ваенных дзеянняў на Каўказе, атрымаў афіцэрскі чын і выйшаў у адстаўку. У 1863 годзе Нарбут адзін з першых у Беларусі і Літве ўзняў сцяг паўстан-

---

[358] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 438. Вопіс 1. Спр. 266. Арк. 11 адв.; фонд 378. Паліт. аддз. 1863. Спр. 631.

[359] У лістападзе 1863 года Звяровіч быў высланы ў Арэнбургскую губерню. Маёнтак яго Доцішкі (450 дзесяцін) у 1863 годзе прададзены з публічных таргоў падпалкоўніку Апалону Шпееру. У 1867 годзе Звяровіч перасяліўся з Уфы ў Варшаву. З 1874 года яму дазволілі жыць у Вільні. Ён хадайнічаў аб выкупе маёнтка, але яму адмовілі (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1863. Спр. 834; фонд 421. Вопіс 1. Спр. 1553). 10 (22) верасня 1891 года Ф. Багушэвіч тэлеграфаваў Я. Карловічу аб смерці Звяровіча (ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1135. Вопіс 10. Спр. 92). Трэба думаць, што размова ішла якраз пра былога ўладальніка Доцішак.

ня. Ён арганізаваў паўстанцкі атрад яшчэ ў пачатку лютага і амаль тры месяцы вёў адважную партызанскую вайну супраць царскіх войск. У яго атрадзе быў вядомы віленскі мастак Эльвіра Андрыёлі. 22 красавіка Нарбут загінуў у баі пад м. Дубічы. Тады ж атрымаў рану Уладзіслаў Пілецкі, адзін з самых храбрых байцоў атрада. Гібель свайго камандзіра Андрыёлі ў далейшым перадаў у вядомай карціне «Смерць Нарбута». Камандаванне над паўстанцамі прыняў малодшы брат Людвіка Баляслаў, а праз некаторы час яго змяніў больш вопытны Астрога[360].

Паходжанне Аляксандра Парадоўскага — Астрогі дакладна невядома. Паводле слоў аднаго з палонных, ён паходзіў з Валыні. Іншыя крыніцы запэўніваюць, што прыбыў з аўстрыйскай Галіцыі. У час паўстання яму было каля 35 гадоў. Спадзеючыся схапіць Астрогу, царскія ўлады старанна збіралі яго прыкметы. Было вядома, што ў яго рыжыя валасы, што ён насіў бараду і бакенбарды.

Атрад Астрогі меў базу ў раёне паміж Шчучынам і Эйшышкамі. У цяжкія часіны паўстанцы ішлі ў Гродзенскую пушчу, дзе атрымлівалі харчы ў сялян вёскі Кракшлі. У канцы чэрвеня Астрога з'яднаўся з атрадам гродзенскіх паўстанцаў, якімі кіраваў Лянкевіч (Ландэр). Агульнае камандаванне ўзяў на сябе Лянкевіч.

20 ліпеня гродзенска-лідскія паўстанцы пераправіліся цераз Нёман у Аўгустоўскую (Сувалкскую) губерню[361].

---

[360] Kowalewska Z. Dzieje powstania lidzkiego: Wspomnienie o Ludwiku Narbucie. Wilno, 1934; гл. таксама цікавыя паказанні выхаванца Мінскай гімназіі А. Янкоўскага, які быў у атрадзе Нарбута — Астрогі: ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 1248. Вопіс 1. Спр. 206.

[361] Aramowicz I. Marzenia: Pamiętnik o ruchu… S. 63–65.

На чале лідскіх паўстанцаў Астрога біўся з царскімі войскамі 9 жніўня пад Мазурышкамі (Алькенішкамі) у Марыямпальскім павеце, 7 верасня пад Длугай Вессю і 28 верасня пад Шлавантамі — у Сейненскім[362]. Потым, лічачы далейшую барацьбу безнадзейнай, распусціў атрад і ўцёк за мяжу.

Гераічнае паўстанне 1863 года было задушана. Праўда, цаною крыві паўстанцаў сяляне Беларусі і Літвы атрымалі сякія-такія ўступкі, але яны не мянялі прыгонніцкай сутнасці рэформы. Душыцель паўстання Мураўёў-вешальнік і яго паслядоўнікі ўзялі курс на хуткую русіфікацыю беларускіх і літоўскіх губерняў. Нават тое нямногае, што мог рабіць Дунін-Марцінкевіч да паўстання, цяпер зрабілася немагчымым. Найбольш значныя яго творы, напісаныя пасля паўстання, убачылі свет толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Край нібы вымер. Лепшыя сыны Беларусі або загінулі ў няроўнай барацьбе, або пакутавалі ў рудніках Сібіры, або разбрыліся па свеце. Бацька Багушэвіча, брат паэта Апалінарый і сястра Ганна сядзелі ў Віленскай турме. Яны выйшлі на волю толькі праз год — у канцы 1864 года. Старому Казіміру, які быў прызнаны «вінаватым ва ўдзеле ў мяцяжы і ва ўтойванні злачынных дзеянняў сваіх дзяцей», прыйшлося заплаціць яшчэ штраф у памеры 100 руб. За Ганнай пакінулі строгі паліцэйскі нагляд. Тады ж быў зняты секвестр з багушэвічаўскага фальварка, але не цалкам. Царскія ўлады

---

[362] Zeliński S. Bitwy i potyczki 1863–1864. Rapperswil, 1913. S. 268, 272–273; Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края // Виленский временник. Вильна, 1915. Кн. 6. Ч. 2. С. XXII, XLIX, 299, 332.

ўзмоцнена шукалі другога брата Францішка Багушэвіча — Валерыяна, які быў «без вестак адсутны». Таму секвестр на яго долю ў Кушлянах быў захаваны[363].

Пад рэпрэсіі царскіх улад падпалі многія суседзі Багушэвічаў па Кушлянах. Яшчэ ў лютым 1863 года за ўдзел у вызваленчым руху быў аддадзены ў салдаты малады ашмянскі канцылярыст Іван Маркоўскі, родам з Кушлян. Ён, як і яго брат Юрый, належаў да т. зв. «Бібліятэкі ашмянскай моладзі», якая была своеасаблівай мясцовай ячэйкай таварыства «Піянтковічаў»[364]. Горкі хлеб салдата-штрафніка ў Туркестанскіх лінейных батальёнах давялося пакаштаваць і другому суседу Багушэвічаў — 19-гадоваму вучню Віленскай гімназіі Антону Ясевічу. Ён знаходзіўся ў паўстанцкім атрадзе В. Козела і ў маі 1863 года быў «са зброяй у руках» захоплены карнікамі ў баі пад Владыкамі, у Вілейскім павеце[365]. Напярэдадні паўстання Ясевіч распаўсюджваў «Мужыцкую праўду» ў Кушлянах. Пра гэта мы даведваемся з «Справа аб двараніне Іосіфе Клімашэўскім, які чытаў сялянам „Мужыцкую праўду" з мэтай настроіць іх супраць урада»[366]. Клімашэўскі, пра якога ідзе гаворка ў гэтай справе, — вельмі цікавая фігура, і варта расказаць аб ім больш падрабязна.

---

[363] Дакументы аб удзеле сям'і Ф. Багушэвіча ў паўстанні 1863 года гл.: Полымя. 1960. № 10. С. 175–176.

[364] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1864. Спр. 1495 (Об обществе Пионтковичей или Ошмянская библиотека). Арк. 12, 14, 50, 125.

[365] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 494. Вопіс 1. Спр. 153. Арк. 15, 68, 86.

[366] ЦДГА Літ. ССР [ДГА Літвы]. Фонд 378. Паліт. аддз. 1864. Спр. 1555.

Гэта быў вандроўны хатні настаўнік — «дарэктар» тых часоў. Паходзіў ён з Вільні. У 1854 годзе з'явіўся ў Кушлянах і стаў навучаць дзяцей Казіміра Багушэвіча і іншых дробных кушлянскіх уладальнікаў — Станіслава Ясевіча, Антона Маркоўскага і г. д. Праз пяць гадоў, калі, відаць, кушлянскія хлапчукі падраслі, Клімашэўскі перабраўся ў Жупраны, дзе таксама настаўнічаў. Апошні час ён жыў у млынара і карчмара Гофмана, за рубель у месяц і кватэру навучаючы двух яго сыноў. «Забеспячэнне вельмі мізэрнае, я знаходжуся ў вельмі цяжкім становішчы, часамі няма чаго есці», — скардзіўся стары настаўнік (арк. 24).

У канцы 1863 года ў Жупранах невядома хто наклеіў славуты «Прыказ... да народа зямлі літоўскай і беларускай» К. Каліноўскага, а таксама рукапісны «пасквіль» супраць царскіх улад на беларускай мове. У сувязі з гэтым паліцыя зрабіла вобыск у «карчме пад ліпай», дзе жыў Клімашэўскі, і знайшла там пяты нумар «Мужыцкай праўды», стрэльбу, порах, кулі і такі нечаканы прадмет, як драцяная маска. Хворага 75-гадовага настаўніка сцягнулі з ложка і адвезлі ў Ашмяны, у турму.

На следстве высветлілася, што «Мужыцкую праўду» Клімашэўскі атрымаў у снежні 1862 года ў Кушлянах ад гімназіста Антона Ясевіча, які прывёз яе з Вільні. «Ён патрабаваў ад мяне, — прызнаўся Клімашэўскі, — каб я чытаў дадзены мне экзэмпляр сялянам, я так і рабіў...» (арк. 24). Такім чынам, справа Клімашэўскага з'яўляецца дакументальным доказам таго, што першую беларускую газету чыталі і ведалі ў Кушлянах. Знойдзеная ў Клімашэўскага стрэльба, як адкрылася на следстве, да верасня 1862 года захоўвалася ў сына Казіміра Багушэвіча Апалінарыя. Тады ж Клімашэўскі

бачыў у Багушэвічаў і другую стрэльбу (арк. 26). Да Клімашэўскага часта прыходзіў з Кушлян яго сябра Казімір Людвікевіч, таксама стары настаўнік, якога прытулілі ў сябе Багушэвічы. Старыя запіраліся ў пакоі і «гаманілі сакрэтна» на антыўрадавыя тэмы (арк. 29).

Клімашэўскі памёр у турме ў студзені 1864 года. Перад смерцю ён паклікаў да сябе ваеннага начальніка Ашмянскага павета палкоўніка Каладзеева і заявіў яму ў твар, што доўгія гады вучыў дзяцей ненавідзець царскі ўрад і вёў прапаганду сярод сялян. Драцяную маску надзяваў, калі хадзіў у лес да паўстанцаў (арк. 40).

Хутчэй за ўсё Францішак Багушэвіч не вучыўся ў Клімашэўскага, таму што быў ужо гімназістам, калі той з'явіўся ў Кушлянах. Але ён, безумоўна, добра ведаў настаўніка свайго брата Апалінарыя, і ўся гісторыя з Клімашэўскім павінна была зрабіць на яго моцнае ўражанне.

Ад брацкіх магіл, ад родных папялішчаў падаўся ў чужыя краі і Францішак Багушэвіч. Паўстанцу 1863 года нельга было быць навідавоку ў мясцовых улад. Мусіць, яшчэ ад тых часоў ідуць гэтыя багушэвічаўскія радкі, своеасаблівы рэквіем, плач па растаптаных надзеях, па таварышах, якія загінулі:

Ну, дык грай жа, грай жа,
Усё успамінай жа...
Штодзень і штоночы
Плач, як мае вочы,
Над народу доляй,
І плач штораз болей.
Плач так да астатка,
Галасі, як матка,
Хаваючы дзеці, —

Дзень, другі і трэці
Іграй слёзным тонам
Над народу сконам.
(«Мая дудка»)

Так закончылася юнацтва.

Толькі праз дваццаць гадоў вернецца Францішак Багушэвіч у родную Беларусь, вернецца сталым чалавекам, які шмат чаго перажыў і пабачыў. На яго традыцыйных беларускіх вусах ужо сям-там блісне срэбрам першая сівізна.

Дваццаць гадоў ён будзе сумаваць па роднай зямлі, дваццаць гадоў будзе цярпліва чакаць яго Беларусь, і яна дачакаецца свайго першага народнага песняра.

Г. В. Кісялёў. 2006 год

Скарынаўская сімволіка:

вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі

Колькі ўступных слоў

А тако единый каждый человек имать некоторую речь пред собою, в ней же ся наболей кохает и о ней мыслит.

Ф. Скарына

Калі перакласці высокія скарынаўскія словы на мову сённяшняй «паспалітай» прозы, атрымаецца прыблізна так: «У кожнага ёсць штосьці, што найбольш займае яго думкі, куды імкнецца яго душа». Сёння такі прадмет («рэч») асаблівай нашай увагі і рупнасці — партрэт першадрукара, яго сімволіка.

Гэтую унікальную выяву вывучалі, аналізавалі, ацэньвалі дзесяткі і сотні даследчыкаў, вопытных эрудытаў, людзей, захопленых сваёй справай, — гісторыкі літаратуры і кнігадрукавання, мастацтвазнаўцы, спецыялісты па сярэднявечнай геральдыцы, любамудры-філосафы, прызнаныя вучоныя і проста энтузіясты-аматары. Вывучалі, даследавалі, падступаліся з самых розных бакоў. Тым часам застаецца яшчэ шмат загадкавага, нявысветленага.

У цэнтры партрэта тры сімвалічныя (магчыма, гербавыя) знакі. Добра знаёмае па тысячах разнастайных рэпрадукцый-узнаўленняў і кожны раз нібы ўбачанае ўпершыню, адухоўленае, ачалавечанае сонца з месяцам-маладзіком на пюпітры, і абапал галавы Скарыны два львы (зрэшты, не вельмі характэрныя, зусім не велічныя) трымаюць геральдычныя шчыты з адметнымі таямнічымі знакамі: злева нібыта літара Т у трохкутніку, справа трапецыя з крыжыкам зверху і нейкімі

сіметрычнымі касымі рыскамі-«вусікамі» па баках. Дарэчы, «справа-злева» — гэта яшчэ як глядзець. Калі паставіць сябе на месца Скарыны, а менавіта гэтага патрабуюць асвячоныя шматвяковымі традыцыямі правілы геральдыкі, то «трапецыя» апынецца ў яго над плячом злева, «трохкутнік» справа, і толькі сонца з маладзіком у любым выпадку будзе займаць прыярытэтнае, цэнтральнае становішча.

Наконт сонца з месяцам (або Маладзіковага Сонца, паводле А. Лойкі, а паводле У. Калесніка — кан'юнкцыі[1]) у прынцыпе даўно вырашана — гэта асабісты знак-сігнет нашага першадрукара, або, гаворачы па-сучаснаму, яго ўласны кодавы знак. І па вялікім рахунку, калі абстрагавацца ад прыватнасцяў, вырашана, відаць, правільна. Разыходжанні ў меркаваннях даследчыкаў датычаць пераважна генезісу і семантыкі сігнета, а таксама спецыфікі яго прызначэння і функцыянавання (асабісты герб? выдавецкая марка? манаграма Скарыны як мастака?)[2]. Хочацца працытаваць празрысты і глыбакадумны верш В. Зуёнка, у якім хораша перададзены сэнс сігнета і нават адгалоскі спрэчак вакол гэтага сімвала:

Не трапіў у гербоўнік гэты знак
І на шчытах не карбаваўся слынных,
І роду ён не знатнага —
аднак
Стаўляў яго першадрукар Скарына.

---

[1] Conjunctio (лац.) — злучэнне, аб'яднанне, сувязь.

[2] Агляд розных інтэрпрэтацый: Дышиневич В. Сигнет Франциска Скорины // Неман. 1979. № 11; яе ж. Сігнет // Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. Мінск, 1988; Немировский Е. Л. Издательский знак // Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя. Минск, 1990. С. 270–273; Шматаў В. Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI–XVIII стст. Мінск, 2000. С. 24–25.

Гравюру тонкую выводзіла рука —
Глядзі, люд паспаліты, і кумекай:
У промнях сонца — рог маладзіка:
Як фас і профіль твару чалавека.

Адны казалі: «Гэта ночь і дзень,
Святло і цемра... »
Іншыя: «Францыску
Карцела перадаць зацьмення цень
У год, калі сустрэўся ён з калыскай... »

Мабыць, і так... Але хутчэй за ўсё
Быў маладзік хвіліны думнай знакам,
Што па начах бяссонна мы нясём
Пад спаконвечным кругам Задыяка.

А сонца — сімвал светлы пачуцця
І прамяністы поўдзень летуценняў.
Аблічча двухадзінае жыцця —
Развагі холад і агонь натхнення... [3]

У паэта і літаратуразнаўцы М. Арочкі, аўтара праніклівай, гожай драматычнай паэмы «Судны дзень Скарыны», з'явілася патрэба крыху дапоўніць апошнія прыведзеныя радкі Зуёнкавага верша, паразважаць над імі: «Магчыма, паэтычным вокам і так можа прачытвацца шматзначнае сімвалічнае ўвасабленне — як мудрая жыццёвая еднасць дзвюх супярэчлівых стыхій. Хоць, зрэшты, у дзівосным тварэнні Скарынавага знака, як і саміх гравюр, усё ж не ад-

[3] Зуёнак В. Такі быў знак // Полымя. 1985. № 7. С. 3.

чуваецца холаду Месяца. Глыбокая светаносная натхнёнасць думкі — так! Але не холад развагі. Развага неад'емна злілася з палкасцю сонца. Дзве стыхіі ўзаемарастварыліся ў высокім імгненні ўдумнага светасузірання». Як бачым, ёсць свая праўда-рацыя і ў Арочкавых каментарах.

Кожны інтэрпрэтатар дадае ў разуменне Скарынавага сігнета нейкія свае рыскі, уносіць элементы свайго бачання, свайго асабістага досведу. «Знак першадрукара сімвалізуе перамогу святла над цемраю, ведаў над невуцтвам, жыцця над смерцю»[4], — мяркуе, напрыклад, знаны пісьменнік гістарычнай тэмы У. Арлоў, зрэшты, не надта ў дадзеным выпадку арыгінальны. Разам з тым пісьменнік выдатна бачыць семантычнае багацце скарынаўскага сімвала, яго неадназначнасць. «Гэты сонечна-месяцавы знак мае шматслойны сэнс. У ім — сутыкненне дня і ночы, пераход ад ранейшых рэлігій да хрысціянства, ад сярэднявечча да Рэнесансу. У ім — зліццё мужчынскай апладняльнай сілы Сонца з улоннем самога Сусвету, у выніку чаго пасля зацьмення прадаўжаецца жыццё, а ў спрыяльных умовах можа нарадзіцца і дасканалая матэрыя — філасофскі камень...»[5] — спрабуе акрэсліць-спасцігнуць глыбіню сімвала Арлоў. «Што датычыцца сігнету — выявы прамяністага сонца з прытуленым да яго справа маладзіком (сонца з тварам анфас, маладзік — з тварам у профіль), то многія вучоныя лічаць, што ён сімвалізуе сонечнае зацьменне і... гэтым Ф. Скарына нібы паказваў год свайго нараджэння — 1486, які быў якраз годам поўнага сонечнага зацьмення. Ды скарынаўскае сонца магло быць і проста сімвалам асветы, святла, цяпла,

---

[4] Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мінск, 1994. С. 185.

[5] Тамсама.

вечнасці, а малады месяц — росту, маладосці, бо не ветахавы месяц у Скарыны, а маладзіковы, які расце, ідзе да поўні»[6], — падключаецца да размовы, дзеліцца сваімі меркаваннямі А. Лойка. Свой адметны погляд у вядомага скарыназнаўцы мастацтвазнаўчай школы В. Шматава: «Гэта не „зацьменне сонца", як думаюць некаторыя; радаснае сонца, якое ўзыходзіць над сумным месяцам (на гравюры ён апускаецца ўніз, „знікае"), азначае асветніцкі дэвіз: „Свяціць заўсёды — удзень і ўначы, святло пераможа цемру". Сэнс відарыса цудоўна звязваецца з асветніцкай дзейнасцю першадрукара-гуманіста»[7]. Мы прывялі толькі асобныя прыклады разумення знака-мітага сігнета. Не менш слушныя думкі, трапныя назіранні, дасціпныя здагадкі выказваюць і іншыя скарыназнаўцы і энтузіясты роднай культуры. Глыбокія рэчы можна трактаваць, інтэрпрэтаваць бясконца і гэтаксама ж бясконца адкрываць у іх новыя грані, сэнсавыя нюансы і адценні.

Адным словам, Скарынавы знак-сігнет просты і складаны, гарманічны і супярэчлівы, шматзначны і не да канца спазнаны, як само жыццё. Яму, гэтаму знаку, выпаў у гісторыі найвялікшы гонар. З цягам часу ён стаўся адным з галоўных і незаменных нацыянальных сімвалаў беларусаў і Беларусі.

Сёння сігнет трывала ўваходзіць у нашу рэчаіснасць. Сустракаемся з ім літаральна на кожным кроку. Да прыкладу, сваёй эмблемай выбрала гэты знак Таварыства беларускай мовы, якое ў новых умовах працягвае патрыятычна-асветніцкія традыцыі Скарыны. Промнямі Скарынавых Сонца і Месяца азораны і адораны Дні беларускага пісьменства — святы на-

---

[6] Лойка А. А. Старабеларуская літаратура. Мінск, 2001. С. 288.

[7] Шматаў В. Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI–XVIII стст. С. 25.

цыянальнай культуры, якія ўжо сталіся традыцыяй. Гэты сімвал упрыгожвае тамы беларускай выдавецкай серыі «Скарбы сусветнай культуры». Дзіва што — Скарына, можа, як ніхто іншы, лучыць нас з сусветам. І на ладных фаліянтах 18-томнай універсальнай Беларускай Энцыклапедыі, выданне якой нядаўна завершана, стаіць таксама выдавецкая марка-эмблема, сканструяваная на аснове Скарынавага сігнета. І гэта абсалютна натуральна: Скарына быў першым нашым энцыклапедыстам. Такія прыклады можна множыць і множыць.

І на тым першасным, без перабольшання, гістарычным партрэце, можна сказаць, першапартрэце, з якога шмат што пачалося, сігнет займае сваё законнае цэнтральнае месца, аздабляючы пярэднюю плоскасць пюпітра, за якім размясціўся ўласнай персонай сам непераўзыдзены і непараўнальны вучоны муж доктар Францыск Скарына са слаўнага горада Полацка. Не раўнуючы як сучасныя самавітыя дзяржаўныя гербы, што ўпрыгожваюць трыбуны-кафедры выступоўцаў у сённяшніх парламентах і на высокіх міжнародных форумах.

— Глядзіце — вось мой знак. Я чалавек Сонца і Маладзіка, я — ад жыцця, дзе ёсць месца і яснасці Дня, і таемнасці Ночы, — нібы гаворыць Скарына.

Вядома, гэта зноў жа ўсяго толькі адна з магчымых інтэрпрэтацый сэнсавага боку сігнета, але тое, што сам Скарына на гравюрным партрэце ідэнтыфікуе сябе з гэтым знакам, — несумненна. І гэта для нас у дадзеным выпадку самае важнае.

Такім чынам, Сонца з Месяцам, Маладзіковае Сонца — індывідуальны знак Скарыны, знак яго самаідэнтыфікацыі. А што азначаюць тады сімвалы абапал яго галавы, схематычныя знакі на шчытах, якія падтрымліваюцца, аберагаюцца львамі? Сёння ў нашай грамадскай свядомасці (маем на ўва-

зе менавіта шырокую грамадскую свядомасць) яны таксама часцей за ўсё ўспрымаюцца як асабістыя знакі Скарыны. Іх малююць мастакі на шматлікіх сучасных партрэтных версіях першадрукара. Бачым іх на партале новага унікальнага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, на помніку Скарыны ва універсітэцкім скверы ў Мінску. Яны вынаходліва выкарыстоўваюцца ў афармленні незлічоных кніг пра Скарыну і айчынныя старадрукі. Гарманічны Т-знак, напрыклад, увасабляе скарынаўскую тэму на вокладцы вядомай кнігі А. Каўкі «Тут мой народ» (выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989). А ў кнізе літоўскай пісьменніцы Э. Легутэ «Францішак Скарына: Пакінуць славу і памяць аб сабе»[8] гэты сімвал у выглядзе мініяцюрнага значка паўтараецца на кожнай старонцы ля кожнай калонлічбы, трывала яднаючыся ў свядомасці чытача з вобразам Скарыны. Пра Скарыну найперш нагадвае нашым сучаснікам і таямнічая «трапецыя».

Калі гэта сапраўды так, калі гэта асабістыя знакі Скарыны, то што яны значаць, навошта — поруч з сігнетам — спатрэбіліся, з якога боку характарызуюць Скарыну? Што гэта — яго дадатковыя гербы? Гербавыя знакі яго бацькоў (ёсць і такая думка)? Указанні на характар заняткаў? Сімвалы духоўных пошукаў і памкненняў? Але вельмі магчыма, што гэта знакі людзей, якія дапамагалі Скарыну ў яго вялікай справе: мецэнатаў, партнёраў па друкаванні і афармленні кніг. Хто яны? Так што да поўнай яснасці тут далёка. І нават

[8] Liegutė E. Pranciškus Skorina: Palikti šlovę ir atminimą savo: Esė. [Vilnius, б. г.]. З гэтым выданнем нашых найбліжэйшых суседзяў і партнёраў па гісторыі можна пазнаёміцца ў аддзеле рэдкай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў Мінску.

да прыблізнай яснасці таксама. А гэта ж надзвычай важна для скарыназнаўства. У сваім даследаванні мы і пастараемся калі не вырашыць гэтае пытанне, то прынамсі наблізіцца да яго вырашэння, падвесці вынікі дыскусій і ўжо гэтым хоць трохі прасунуцца наперад у вывучэнні праблемы.

Зразумела, загадка партрэта можа быць здавальняюча вырашана толькі ў комплексе з іншымі загадкамі скарынаўскіх выданняў, якія, калі сказаць словамі самога Скарыны, шмат «в собе сокритых таин замыкають». У нашым выпадку перш-наперш гэта агульны тытульны ліст «во всю Бивлию», змешчаны, як вядома, у кнізе «Быццё» (1519). Мы бачым там цікавую кампазіцыю з трох гербавых шчытоў, у пэўным прадуманым парадку ўкампанаваных, уштукаваных у арнаментальную рамку тытула. На двух ніжніх шчытах размешчаны сігнет і «трохкутнік» (крыху зменены, мадыфікаваны ў параўнанні з партрэтам). Верхні шчыт — пусты, нічым не азначаны. Чаму?

«Трохкутнік» даволі часта з'яўляецца на іншых фігурных гравюрах і застаўках Скарынавых кніг. «Трапецыя» — толькі на партрэце. Чаму? Што здарылася? З якой-такой нагоды вельмі паслядоўны і сістэматычны ў іншых выпадках Скарына палічыў патрэбным адмовіцца ад знака «трапецыі»?

А ёсць яшчэ дзіўныя прыпіскі на асобніках першых пражскіх выданняў: «А то ся стало накладом Богдана Онкава сына радци места виленского». Усяго нейкі дзесятак слоў, а значэнне іх для гісторыка цяжка пераацаніць. Гэта ж найкаштоўнейшыя для нас, абсалютна адкрытыя, недвухсэнсоўныя сігналы-паведамленні пра партнёра-фундатара Скарыны! Вестачкі, якія цудам прарваліся праз храбціны вякоў, каб дайсці да нас, сённяшніх. Былі яны толькі на першых выдан-

нях, потым зніклі. Чаму? І чаму былі не на ўсім тыражы, а дапісваліся ад рукі толькі на пэўнай частцы асобнікаў?

Так што пытанняў, гэтых «чаму», «навошта» ды «з якой нагоды», набіраецца шмат. А галоўнае з іх — зыходнае, ключавое — можна сфармуляваць так: што хацеў сказаць Скарына, змясціўшы на партрэце — на вельмі прыметным, ганаровым месцы — знакі «трохкутніка» і «трапецыі»? Паведаміць штосьці важнае аб сабе? Аддаць належнае, падзякаваць аднадумцам-паплечнікам? Падаць знак, пакінуць падказку-запавет нашчадкам? Ён жа такі, Скарына, — гаварыў і з патомкамі, глядзеў у будучыню. Пра ўсё гэта абавязкова думаецца-ўспамінаецца кожны раз, калі глядзіш на аўтэнтычны партрэт нашага асветніка.

Дык якую векавечную тайну хаваюць-берагуць загадкавыя львы Скарыны?

Некалькі папярэдніх метадалагічных заўваг. Тэма сімволікі Скарыны шматаспектная[9]. Сваёй галоўнай задачай на дадзеным этапе мы лічым вывучэнне графічных сімвалаў у скарынаўскіх выданнях. Тым не менш нават у такім выглядзе тэма ўяўляецца дастаткова шырокай.

Наша даследаванне можна весці ў некалькіх напрамках і на розных узроўнях. Апрача агульных штудый у галіне скарыназнаўства (жыццё, творчасць, погляды Скарыны) такімі актуальнымі і, як чакаецца, плённымі для нашай тэмы напрамкамі могуць быць:

- вывучэнне сацыяльнай базы грандыёзнага выдавецкага праекта Скарыны, а таксама непасрэднага акружэння першадрукара, яго дзелавых кантактаў і сувязяў;

---

[9] Гл.: Конан У. М. Сімвалы ў творчасці Ф. Скарыны // Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. С. 490–491.

• вывучэнне розных аспектаў тагачаснай сімволікі, эмблематыкі, геральдыкі, не выключаючы сімволікі папулярных у свой час (ды і сёння не пазбаўленых увагі) эзатэрычных, таямнічых вучэнняў алхіміі, астралогіі, кабалы[10];

• дадатковае ўважлівае вывучэнне сімвалаў Скарыны: сістэмнасць іх ужывання, храналогія, частотнасць, зменлівасць і г. д.

Разнастайная сімволіка надзвычай характэрная для культуры сярэднявечча і Рэнесансу. Яшчэ Эразм Ратэрдамскі з'едліва смяяўся са сваіх вучоных і псеўдавучоных сучаснікаў: «З пагардаю пазіраючы на цёмны люд, усяведы месцяць адно на адно трохкутнікі, акружнасці, квадраты ды іншыя матэматычныя фігуры і атрымліваюць штосьці накшталт лабірынта. Потым ставяць, быццам шэрагі ваяроў на ратным полі, радкі літараў і, паўтарыўшы свае штукі некалькі разоў, туманяць глузды недасведчаным людзям»[11].

Аднак пазіцыі таямнічых навук і вучэнняў заставаліся ўсё яшчэ вельмі трывалымі. І, зразумела, усё гэта магло рабіць і рабіла ўплыў на нашага Скарыну.

Складанасці, якія стаяць перад даследчыкам культуры мінулага, выдатна ахарактарызаваны вядомым мастацтвазнаўцам XX ст. Э. Панофскім (па неабходнасці, дзеля сціслацці, абмяжуемся толькі невялікім фрагментам): «Гісторык мастацтваў адрозніваецца ад «наіўнага» гледача тым, што падыхо-

---

[10] Гл.: Холл М. П. Энциклопедическое изложение масонской, герметической, каббалистической и розенкрейцеровской символической философии: Интерпретация секретных учений, скрытых за ритуалами, аллегориями и мистериями всех времен. 2-е изд. Новосибирск, 1993; Морозов Н. Основы культурологии: Архетипы культуры. Минск, 2001.

[11] Эразм Ратэрдамскі Дэзідэрый. Пахвала дурасці / Пер. з лац. У. Шатона. Мінск, 2006. С. 68–69.

дзіць да сітуацыі свядома. Ён ведае, што яго культурны багаж, якім бы ён ні быў, ніколі не будзе адпавядаць культурнаму багажу людзей, што жылі ў іншых краінах і ў іншы час. Таму ён пастараецца ўзнавіць адсутныя звёны, вывучыўшы, наколькі гэта магчыма, акалічнасці, пры якіх ствараліся аб'екты яго штудыі. Ён не толькі збярэ і праверыць усю даступную фактычную інфармацыю пра асяроддзе, эпоху, аўтарства, эстэтычныя нормы дадзенай краіны і эпохі, каб найбольш «аб'ектыўна» падысці да твора мастацтва. Ён возьмецца за чытанне старых кніг па прызначэнні і г. д., але і параўнае дадзены канкрэтны твор з іншымі да яго падобнымі, і пастараецца пазнаёміцца з тэкстамі, у якіх адлюстраваліся багаслоўі або міфалогіі, каб ідэнтыфікаваць яго сюжэт...»[12] Словам, размова ідзе пра магчыма паўнейшую адаптацыю даследчыка ў эпоху, якая даследуецца. Дарэчы, характэрная багатая сімволіка выяўленчага мастацтва эпохі сярэднявечча і Рэнесансу таксама не павінна абмінацца ў нашым даследаванні, а наадварот, быць прадметам самай пільнай увагі, паколькі партрэт і іншыя гравюры скарынаўскіх выданняў — мастацкія творы. Так што прыведзеныя словы карыфея сусветнай мастацтвазнаўчай навукі маюць для нас не толькі тыпалагічнае, але і самае непасрэднае значэнне.

Але, як і заўсёды, пачаць лепш за ўсё з назапашанага досведу пакаленняў, з гістарыяграфіі пытання. Пры гэтым мы зыходзім з таго, што сімволіка Скарыны была зразумелая яго адукаваным сучаснікам (інакш які ў ёй сэнс), потым ключы ад яе былі згублены і толькі праз два з паловай стагоддзі гісторыкі зноў пачалі спасцігаць, «адкопваць» гэты страчаны сэнс і паступова, вельмі паступова дашуквацца ісціны.

---

[12] Панофский Э. Смысл и толкование изобразительного искусства: Статьи по истории искусства: Пер. с англ. СПб., 1999. С. 27.

Раздзел 1

Сімволіку Скарыны чытаюць даследчыкі

Пачаткі навуковага скарыназнаўства адносяцца да апошняй чвэрці XVIII ст. За два з лішкам стагоддзі выдадзены сотні і сотні прац. У многіх так або інакш закраналася скарынаўская сімволіка.

Зірнём на загадкавыя знакі першадрукара вачыма даследчыкаў розных эпох. Вось што на гэты конт удаецца «вылавіць» у моры-акіяне скарыназнаўства. Спыняемся на самых істотных і характэрных публікацыях.

У 1783 годзе ад'юнкт Пецярбургскай Акадэміі навук Іаан Готгільф (а па-руску Іван Міхайлавіч) Штрытэр з захапленнем першапраходца апісаў скарынаўскія выданні, не абмінуўшы і іх мастацкае аздабленне. У «трохкутніку» ён бачыў «знак, які складаецца з вялікай літары Т, якога нага падкрэслена, і да яе прыпісаная ніжняя палова літары Б проста і наадварот»[13] (трэба разумець, «проста і наадварот» — «у звычайным і перавернутым выглядзе»). Нягледзячы на стылёвую мудрагелістасць, гэтыя Т і Б даследчыкі запомняць і пасля не раз будуць на Штрытэра паважліва спасылацца.

---

[13] Цыт. па: Немировский Е. По следам Франциска Скорины. Минск, 1990. С. 54.

Штрытэр апісаў Т-знак паводле агульнага тытульнага ліста да Бібліі. Партрэт Скарыны быў яшчэ невядомы. У «Вопыце расійскай бібліяграфіі» В. С. Сопікава (1813) сімволіка тытульнага ліста падавалася так: «Наверсе пасярэдзіне знаходзіцца пусты нямецкі шчыт[14], а ўнізе два гэткія самыя, з якіх у адным, што па правы бок (ад гледача злева. — *Г. К.*), сонца і месяц, г. зн. цэлае і палавіна чалавечага твару, абкружаныя прамянямі, а ў іншым, што па левы бок, намаляваны знак, які складаецца з вялікай літары Т»[15]. Такім чынам, першыя інтэрпрэтатары ўспрымалі скарынаўскі «трохкутнік» як літарную манаграму.

У 1830 годзе здабыткам навукі стаў, нарэшце, партрэт першадрукара з поўным наборам скарынаўскіх сімвалаў. Гонар адкрыцця гэтай выдатнай выявы належыць прафесару Маскоўскага універсітэта, сакратару Таварыства гісторыі і старажытнасцяў расійскіх І. М. Снегірову, які і паспяшаўся апублікаваць партрэт у «Працах» таварыства. Дзеля важнасці гэтай падзеі зробім выпіску з нататкі Снегірова, якой суправаджалася публікацыя. Перад намі першае апісанне знакамітай гравюры: «Доктар намаляваны сталых гадоў, без барады з вусамі, у шапцы, ён піша за налоем, які засланы дываном з відарысам на ім сонца і ўключэннем у яго паўмесяца, гэты знак (гербавы ці алхімічны?[16]) уключаны ва ўсе застаўкі і нават у некаторыя малюнкі гравіраваныя гэтай кнігі, па абодва бакі Скарыны гербы пражскія, два львы на двух слупах,

---

[14] Маецца на ўвазе адна з прынятых у геральдыцы формаў шчыта.

[15] Сопиков В. Опыт российской библиографии. СПб., 1813. Ч. 1. С. 27–28.

[16] Пытальнік Снегірова. У арыгінале смешная памылка друку: «алхихимический».

якія трымаюць у лапах гербавыя шчыты. Скарына абкружаны кнігамі, над якімі вісіць глобус, пясочным гадзіннікам і іншымі прыметамі вучонасці, пры падножжы яго на падлозе стаіць падсвечнік з умбракулам[17], да якога ляціць пчала, сімвал працавітасці. Над акном, каля якога сядзіць Скарына, паміж кветкавымі перавязямі намаляваны на дошчачцы ≠ а. ф. 31. 1517 год, а ўнізе манаграматычна напісана: Доктар Францыск Скарына»[18]. Снегіроў убачыў нямала. І ў прынцыпе яго бачанне рэалістычнае, адэкватнае, хоць многія дэталі вымагаюць удакладнення. Напрыклад, пагадзіцца, што за плячыма Скарыны пражскія гербы, наўрад ці можна[19]. Тут Снегірова не падтрымаў ніводзін скарыназнавец. Хоць ільвы сапраўды з'яўляюцца характэрнай рысай чэшскай нацыянальна-дзяржаўнай эмблематыкі, але на партрэце Скарыны выконваюць іншую функцыю — яны ўсяго толькі так званыя «шчытатрымальнікі», а не элементы самога герба, яго цэнтральнай, найбольш істотнай часткі. Аднак важна ўжо і тое, што Снегіроў, хоць і ў вельмі агульнай форме, паварочваў інтэрпрэтацыю скарынаўскіх сімвалаў у бок геральдыкі.

На гэты ж шлях ужо на раннім этапе выйшлі і польскія вучоныя. У працы «Гербы ў Польшчы», змешчанай у 1846 годзе ў другім выданні вядомага гербоўніка К. Нясецкага, «трохкут-

---

[17] Парасон; навес; тое, што дае цень.

[18] И. С. Дополнение к статье IX // Труды и летописи Общества истории и древностей российских, учрежденного при Имп. Моск. ун-те. М., 1830. Ч. 5. Кн. 1. С. 309.

[19] Выяву пражскага герба XVI ст. гл.: Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. С. 459; Лойка А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае: Раман-эсэ. Мінск, 1990. С. 368; Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мінск, 1993. С. 70.

нік» ставіўся ў шэраг якарападобных або Т-падобных шляхецкіх гербаў, распаўсюджаных у ВКЛ і Польшчы, і адначасова разглядаўся як літарная манаграма: «Знак гэты ў 1519 годзе Скарына ў Празе падаваў як манаграму літар ТА, а ў Вільні ў 1525 годзе — як Т, апраўленае ў трохкутнікі»[20] (мелася на ўвазе з'яўленне дадатковых дэкаратыўных трохкутнікаў па краях верхняй перакладзіны). Тэкст гэты належаў слыннаму гісторыку Іаахіму Лялевелю, але друкаваўся ў папулярным гербоўніку ананімна, таму шмат хто пасля прыпісваў гэтыя словы Нясецкаму або выдаўцу гербоўніка Я. Н. Бабровічу. Між тым аўтарства Лялевеля несумненнае[21]. Вучоны задумваўся і над значэннем літары Т у гэтай манаграме: «Не прыходзіцца сумнявацца, што гэта сапраўды пачатковая літара Т нейкага слова адпаведнага значэння»[22]. Лялевель першы заўважыў эвалюцыю «трохкутніка» Скарыны, блізкасць гэтага знака да герба «Катвіца» (якар) беларускага шляхецкага роду Калантаяў.

Манаграмай літары Т лічыў знак «трохкутніка» і знакаміты рускі мастацтвазнавец У. В. Стасаў, які пісаў у 1864 годзе: «...манаграма з літарай Т, змешчаная на лісце з партрэтам Скарыны і на большасці іншых карцінак (ілюстрацый. — *Г. К.*) не можа быць прынятая за манаграму гравёра, па-першае, таму што яна стаіць на лістах, відавочна гравіраваных рознымі гравёрамі, а таксама і таму, што на лісце з партрэтам яна змешчаная наверсе (дзе звычайна не ставілася манаграма гравёраў), а ўнізе на тым самым лісце стаіць манаграма,

[20] Niesiecki K. Herbarz Polski. Lipsk, 1839–1846. T. 1. S. 567.

[21] Падрабязней пра гэта гл.: Кісялёў Г. Францыск Скарына і Іаахім Лялевель // Кантакты і дыялогі. 2000. № 11–12, а таксама ніжэй, раздзел II гэтае працы.

[22] Niesiecki K. Herbarz... T. 1. S. 567.

якая складаецца з літар M і Z і відавочна абазначае гравёра. Значэнне яе застаецца пакуль загадкай. Напэўна, яна мае непасрэднае дачыненне да асобы Скарыны ці аўтара карцінак»[23]. Тут для нас каштоўная думка дасведчанага даследчыка, што «трохкутнік» не можа быць манаграмай гравёра, хаця Стасаў і дапускаў, што за ім можа хавацца «аўтар карцінак».

Малодшы сучаснік Стасава, аўтар знакамітай манаграфіі-дысертацыі пра Скарыну П. У. Уладзіміраў і сонца з месяцам, і «трохкутнік» называў гербамі («трохкутнік» лічыў таксама манаграмай). Маладзіковае Сонца ён прылічваў да астралагічных знакаў, а ў «трохкутніку» бачыў злучэнне літар Т і Д, але на сваім прачытанні не настойваў. Спыніўшыся на спробах Штрытэра і Стасава «растлумачыць незразумелую манаграму, якая сустракаецца ва ўсіх выданнях Скарыны», і прапанаваўшы сваю («з дзвюх літар, накшталт Т і Д»), Уладзіміраў палічыў усё ж патрэбным зрабіць рэмарку: «Але значэнне гэтай манаграмы застаецца да гэтай пары нерастлумачаным»[24].

Гербам лічыў скарынаўскае сонца з месяцам знаны збіральнік гравюр Дз. А. Равінскі. Цытуем яго апісанне партрэта першадрукара: «На выяве Скарына сядзіць у працоўным пакоі, за сталом. На абрусе, што засцілае стол, намаляваны яго герб: сонца і месяц… »[25]

---

[23] Стасов В. В. Разбор рукописного сочинения г. Ровинского «Русские граверы и их произведения с 1564 г. до основания Академии художеств» // Отчет о седьмом присуждении наград графа Уварова, 25 сент.1864 г. СПб., 1864. С. 31.

[24] Владимиров П. В. Доктор Франциск Скорина: Его пер., печатные изд. и язык. СПб., 1888. С. IV, 55–56, 80.

[25] Ровинский Д. А. Подробный словарь русских гравированных портретов. СПб., 1888. Т. 3. Стб. 1923–1924.

Пранікліва выказаўся ў эсэ 1919 года пра Скарыну і яго партрэт Змітрок Бядуля: «А на памятку роднаму люду Скарына аставіў партрэт свой, напісаны уласнай рукою.

Ён сядзіць у сваім кабінеце і задумна ў пергаменце старым гусіным пяром нешта піша. У адзенні магістра навук, на галаве — даўні берэт. Перад ім — уласны герб: месяц-сонца. Па бакох такжа гербы красуюць мецэнатаў-пратэктараў. А справа, вышэй астралябія, кніг фаліянты, пясочны гадзіннік. Над калонамі зверху — вянок ад дубовага лісця. А знізу, у кутох, ёсць ліхтар з металёвым люстэркам, муха (так у Бядулі. — *Г. К.*) і жбан, і кошык пляцёны — работа сялянак з-пад Полацку. Проч таго, усюль містычныя знакі, бо ў землях чужых ён здабыў усе навукі тагдашняга часу»[26].

Звернем увагу, што, паводле Бядулі, Скарына сам і намаляваў свой партрэт, дзе побач са сваім гербам змясціў таксама гербы «мецэнатаў-пратэктараў». У той жа час на партрэце магчымы і «містычныя знакі» як даніна тагачасным модным вучэнням (сваіх назіранняў Бядуля, на жаль, не канкрэтызаваў).

Геральдычны характар сімвалаў Скарыны, у тым ліку і Маладзіковага Сонца, прызнаваў вядомы беларускі гісторык У. Ігнатоўскі. У яго «Кароткім нарысе гісторыі Беларусі» (1-е выданне выйшла ў 1919 годзе) пры ўсёй сціслaсці знайшлося месца і для апісання скарынаўскіх кніжных шэдэўраў, прычым вучоны-патрыёт, як і З. Бядуля, не хаваў свайго замілавання, гордасці за славутага беларуса: «Вялікія літары ў кнігах Скарыны ўсе прыгожыя, усе штучна (ад слова «штука» — мастацтва. — *Г. К.*) убраны. Тут ёсць і галінкі, і

[26] Бядуля З. Выбраныя творы. Мінск, 2006. С. 420.

лісці, і кветкі, і звяры. Ёсць тут і герб роду друкара: Сонца і поўмаладзік, злучаныя разам. На Бібліі намалёван і партрэт Скарыны. Друкар сядзіць за сталом і піша; з левага боку ад яго згруджаны фаліянты і кнігі; над галавою намалёваны фамільныя гербы тых мецэнатаў, якія рабілі матэрыяльную і маральную дапамогу яго працы; з правага боку на зямлі стаіць плецены кошык, падобны да якога і цяпер можна спаткаць у вёсцы на Беларусі»[27]. Гісторык не сумняваўся, такім чынам, што знакі над галавой (дакладней — абапал галавы) Скарыны — гербы яго спрыяльнікаў-мецэнатаў.

Іншай думкі прытрымліваўся гісторык і пісьменнік В. Ластоўскі. У сваёй слыннай «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» (1926) ён так апісваў агульны тытульны ліст скарынаўскай Бібліі: «Агаловак надрукаваны чырвонымі літарамі ў чорнай рамцы, запоўненай рысункамі: па бакох расьцінны матыў, уверсе пасярэдзіне — пусты шчыт, а ўнізе два такіх жа шчыты, у адным з іх, у правым, гэрб Скарыны — сонца і месяц у праменях, у левым — скрытапісны знак»[28]. Удакладнім, як мы рабілі гэта ўжо раней, ва ўступнай нататцы, што гледачу «скрытапісны знак» (Т у трохкутніку) бачыцца не злева, а справа. На думку Ластоўскага, «пад крыптонімам Т скрываецца адзін са спатужнікаў Скарыны, хтокольвечы з крыўскіх тагочасных мастакоў»[29]. Функцыянальна сігнет Скарыны Ластоўскі таксама гатовы разглядаць як мастакоўскую манаграму, выказваючы «дапушчэнне, што часьць ры-

---

[27] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі // Крыніца. 1990. № 8. С. 39.

[28] Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўна, 1926. С. 282.

[29] Тамсама. С. 304.

сункаў была зроблена самім Скарынам, прынамсі тыя з іх, на якіх красуе гэрб Скарыны — сонца і месяц»[30]. Гэта ж думка ў больш катэгарычнай форме паўторана ў нататцы «Крыўскія рытаўнікі», змешчанай у часопісе «Крывіч»: «... замест подпісу на сваіх работах клаў свой герб — сонца і месяц»[31]. У артыкуле Ластоўскага «Доктар Францішак Скарына» (1924) таксама знаходзім разважанні пра мастака-«спатужніка», які хаваецца пад крыптанімам Т, прычым Ластоўскі падключае да гэтай размовы і манаграму МТЗ або ТМЗ: «Некаторыя з... рысункаў маюць на сабе вязаны подпіс, у які стала ўходзіць літара Т (у Апостале). Пад партрэтам Скарыны вязь выразна мае тры літары: Т. М. З., гэта ёсць подпіс мастака-рысаўніка. Гэты мастак-рысаўнік, скарынаўскі сучаснік, дагэтуль невядомы. Адно пэўна, што ён, як і Скарына, быў „русін", на гэта паказуе пераезд яго, разам са Скарынай, з Прагі ў Вільню і яго манаграма, зложаная са славянскіх літар»[32]. У наш час гэтую цікавую думку, якая сведчыць пра здольнасць Ластоўскага шырока ахапіць праблему і не баяцца смелых гіпотэз, развівалі іншыя скарыназнаўцы.

У тыя самыя надзвычай плённыя для беларускай культуры 1920-я гады над постаццю Скарыны і яго сімволікай шмат раздумваў даравіты мастацтвазнавец М. Шчакаціхін. У 1925 годзе ў палымянскім артыкуле[33] ён выступіў з дасціпнай гіпотэзай, што Скарына нарадзіўся 6 сакавіка 1486 года, калі

---

[30] Тамсама. С. 307.

[31] Крывіч. 1925. № 10. С. 107.

[32] Ластоўскі В. Доктар Францішак Скарына // Крывіч. 1924. № 2. С. 13.

[33] Шчакаціхін М. Калі радзіўся Францішак Скарына // Полымя. 1925. № 5.

ў Полацку было сонечнае зацьменне. Адсюль і малюнак сонца з месяцам у гербе-сігнеце першадрукара. На думку вучонага, знак гэты не быў гербам у поўным сэнсе слова, паколькі Скарына не належаў да шляхецкага саслоўя і не мог валодаць радавой геральдычнай эмблемай. Хутчэй за ўсё, меркаваў Шчакаціхін, знак гэты створаны самім Скарынам (такога знака няма ў геральдыцы Беларусі і Літвы).

Гэта быў толькі пачатак даследаванняў Шчакаціхіна ў галіне скарынаўскай сімволікі. У грунтоўным артыкуле (па сутнасці, цэлым манаграфічным даследаванні) «Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны», змешчаным у этапнай для скарыназнаўства юбілейнай кнізе «400-лецце беларускага друку» (1926), вучоны ўпершыню сістэматызаваў і прааналізаваў усё багацце мастацкага афармлення скарынаўскіх кніг, закрануўшы і пытанне сімволікі. Яго апісанне партрэта першадрукара адно з лепшых. «На гравюры, — пісаў Шчакаціхін, — мы бачым Скарыну ў яго пакоі, у нізкім крэсле перад пюпітрам, з пяром у руцэ над развінутай кнігай; другая кніга знаходзіцца направа ад яго на падстаўцы. Ён апрануты ў доктарскую мантыю і берэт, з-пад якога выбіваюцца доўгія валасы. Пюпітр пакрыты вузкім абрусам (цяпер часцей у дадзеным выпадку прынята гаварыць «ручнік». — *Г. К.*) з бахрамой, арнаментам і вялікім „гербам". На спінцы крэсла з абодвых бакоў геральдычныя львы, якія падтрымліваюць шчыты са знакамі... »[34]

Далей ідзе ёмістая і вельмі важная для нас падрадковая заўвага, якая датычыць акурат знакаў «трохкутніка» і «трапецыі». «Значэнне гэтых знакаў, — паведамляў у

[34] 400-лецце беларускага друку: 1525–1925. Мінск., 1926. С. 194–195.

заўвазе Шчакаціхін, — няясна; першы з іх, разам з „гербам", паўтараецца, апроч „Партрэту", у некаторых іншых гравюрах; другі сустракаецца толькі адзін раз у „Партрэце". Магчыма, што гэта астралагічныя або магічныя знакі; у кожным выпадку нешта падобнае да першага знаку мы бачылі на старажытных гебрайскіх талісманах, рэпрадукаваных у кнізе „Superstitions de tous les peuples du monde"[35]. Amsterdam 1789. T. IV, табл. XX. З другога боку, большасць даследчыкаў лічыць гэты знак манаграмай з літар Т і Д; Штрытэр жа выказаў думку, што знак гэты ёсць злучэнне двох Б — „проста і наадварот"... Калі прыняць гэта апошняе тлумачэнне, дык можна яшчэ пашырыць яго, лічачы, што асноўны трыкутнік знаку магчыма разумець як літару О; у такім выпадку ўвесь знак тлумачыцца як манаграма БО — быць можа: „Богдан Онькаў", — імя выдаўцы (фундатара. — *Г. К.*) перакладаў Скарыны, вядомае нам па прыпісках: „а то ся стало накладом Богдана Онкова..."»[36]

Перад намі надзвычай цікавыя прафесійныя развагі. І што асабліва ўражвае — пакуль набіраўся і вярстаўся зборнік «400-лецце...», Шчакаціхін паспеў дадаткова паглыбіцца ў геральдычныя даведнікі, у прыватнасці, пазнаёміўся з гербоўнікам К. Нясецкага ў двух яго выданнях (раней яму вядомы быў гербоўнік Б. Папроцкага) і рашуча змяніў сваю думку. Сказаць пра гэта вучоны знайшоў магчымасць у гэтай жа юбілейнай кнізе. Там — у самым канцы — асобным дадаткам надрукаваны яго вельмі грунтоўныя тлумачэнні да ўсяго ілюстрацыйнага матэрыялу зборніка. На с. 336,

---

[35] «Прымхі ўсіх народаў свету» (франц.).

[36] 400-лецце беларускага друку. С. 195.

сярод іншых каментараў, вучоны нібыта наўздагон да асноўнай сваёй працы змясціў наступны характэрны тэкст: «Карыстаемся выпадкам, каб падаць некаторыя дадатковыя весткі аб адным з яшчэ нявытлумачаных знакаў у выданнях Скарыны. Аб гэтым знаку... мы паміналі ў змешчаным у гэтым зборніку артыкуле „Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны" (стар. 195, увага 1), прычым прыводзілі розныя спробы яго тлумачэння, выказаныя ў літаратуры. У сучасны момант, аднак, мы маем падставы лічыць усе гэтыя тлумачэнні, у тым ліку і наша ўласнае, не адпаведнымі запраўднасці. Мы мелі магчымасць праканацца ў чыста геральдычным характары гэтага знаку, хаця адносіны яго да асобы Скарыны застаюцца яшчэ няяснымі. Знак гэты, у тым яго адменніку (варыянце. — *Г. К.*), які знаходзіцца на загалоўным аркушы Скарынавай „Біблії", вядомы Нясецкаму як адзін з варыянтаў беларуска-літоўскага гербу „Kotwica", ужываны родам Калантаяў на Гродзеншчыне і ў Наваградчыне (Niesiecki. Herbarz polski. Tom V. W Lipsku, 1840. Стар. 160–161). Сам Нясецкі ў сувязі з гэтай гербавай фігурай імя Францішка Скарыны не памінае. Але Бабровіч, каментатар Нясецкага ў лейпцыгскім перавыданні яго гербоўніку, ведае аб ужыванні гэтага знаку Скарынай у Празе і ў Вільні (Idem, том I, стар. 567) і нават называе герб Калантаяў уласным імем „Skoryna" ў спісе літоўскіх гербаў (Ibidem, стар. 553 і 555). Магчымая сувязь Скарыны з Калантаямі застаецца, аднак, пры гэтым нявысветленай: відаць, у Бабровіча не было для гэтага матэрыялаў, паколькі і сам Нясецкі падае генеалагічныя нататкі аб Калантаях толькі з XVII сталецця. Нам здаецца, што далейшыя доследы ў гэтым напрамку, у выпадку ўдачы, маглі бы даць цікавыя

вынікі што да пахаджэння Скарыны і яго крэўных сувязей з іншымі беларуска-літоўскімі радзінамі. Можа ў сувязі з гэтым прышлося б таксама пераглядзець і пытанне аб іншым знаку, ужываным Скарынай, — спалучэнні сонца з месяцам. Выказанае намі ў іншым месцы („Полымя" за 1925 г., № 5, стар. 148–151) зацверджанне, што такога знаку няма ў беларуска-літоўскай (а таксама ў польскай) геральдыцы, — захоўвае, зразумела, сваю моц. Але ў сучасны момант мы ўжо не ўпэўнены ў правільнасці высунутай намі наконт пахаджэння гэтага знаку гіпотэзы, бо злучэнне яго з іншай, бясспрэчна геральдычнай фігурай, у двох асобных шчытах, пастаўленых побач як у шлюбных гербах, — што мы бачым, напрыклад, на загалоўным аркушы „Бібліі" — хутчэй вымагае таксама геральдычнага яго тлумачэння, але толькі ўжо на падставе доследаў у галіне заходнееўрапейскай геральдыкі, дзе сустракаюцца знакі сонца і месяца. Спадзяюся, што калінебудзь нам удасца гэта зрабіць».

Такім чынам, Шчакаціхін прадэманстраваў выдатныя даследчыцкія якасці. Літаральна за некалькі месяцаў ён паглыбіўся ў звілістыя лабірынты геральдычных прамудрасцяў, авалодаў асновамі гербазнаўства. Гэты досвед натхніў яго на новыя пошукі, думкі, версіі. Даследчык яшчэ раз пераканаўся ў важнасці ідэнтыфікацыі гэтай сімволікі для скарыназнаўства. Збліжэнне «Скарына — Калантаі» намацана ім дакладна і гэтак жа дакладна апісана паводле тамоў гербоўніка К. Нясецкага. Ён толькі не ведаў яшчэ, што Скарыну ўвёў у Гербоўнік не выдавец Я. Н. Бабровіч, а знакаміты гісторык і не менш знакаміты кнігазнавец І. Лялевель.

Цікава, што пад уражаннем новых, атрыманых на працягу 1926 года звестак Шчакаціхін быў гатовы адмовіцца нават

ад сваёй бліскучай і надзвычай папулярнай гіпотэзы пра сувязь сігнета Скарыны з сонечным зацьменнем 1486 года.

На жаль, колькі-небудзь грунтоўна прадоўжыць даследаванні ў галіне скарыназнаўства, тым больш скарынаўскай сімволікі, Шчакаціхіну не ўдалося — занадта шмат часу адбірала падрыхтоўка фундаментальных «Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва», а ў 1930 годзе даравіты вучоны і нястомны працаўнік быў аблыжна арыштаваны як «нацдэм». Ды і сам Скарына на колькі бясплённых у навуковых адносінах гадоў стаў персонай нон грата для адарваных ад рэальнага жыцця партыйных артадоксаў.

Патроху, спакваля скарыназнаўчыя даследаванні працягваліся ў Заходняй Беларусі.

У 1936 годзе адзін з выдатных пачынальнікаў нацыянальнага руху беларусаў XX ст. Антон Луцкевіч закрануў пытанне пра сімволіку Скарыны ў прысвечаным першадрукару рэфераце на юбілейным пасяджэнні («урачыстай акадэміі») Беларускага навуковага таварыства ў Вільні. Ён паказаў, што апрача літар Д, Т, Б, О, якія называліся даследчыкамі раней, у знак «трохкутніка» ўваходзіць (калі даслоўна паўтарыць яго выраз, — «бясспрэчна ўходзіць») яшчэ літара Г. На жаль, рэферат Луцкевіча вядомы толькі ў кароткім пераказе[37]. Ва ўжо немаладым узросце Луцкевіч не на жарты захапіўся скарынаўскімі загадкамі. У наш час А. Каўка апублікаваў яго лісты ў Прагу да заслужанага скарыназнаўцы А. Флароўскага, выяўленыя ў архіве Расійскай акадэміі

[37] Запісы Беларускага навуковага таварыства. Вільня, 1938. Сш. 1. С. 66. Гл. таксама: Батвіннік М. Навука і невуцтва: Скарыназнаўства ў Акадэміі навук БССР і ў Польшчы (1928–1941) // Полымя. 2000. № 12. С. 106.

навук. У лісце ад 25 ліпеня 1936 года Луцкевіч паведамляў: «... я параўноўваў знакі на гравюры Фр. Скарыны са знакамі астралагічнымі і знайшоў два даволі блізкія скарынаўскім... Хоць першы знак падаецца мне ў Скарыны вензелем з некалькіх літар, у тым ліку і Г, але вельмі праўдападобна, што меркаванне Уладзімірава пра ўплыў астралагічных знакаў сапраўды тут мела месца»[38].

У БССР да скарынаўскай тэмы пачалі вяртацца напярэдадні вайны. Арыгінальна і вынаходліва апісаў партрэт Скарыны пісьменнік Ю. Віцьбіч у патрыятычным артыкуле, апублікаваным у «ЛіМе»: «Першадрукар, апрануты ў доктарскую мантыю і берэт, з гусіным пяром у руцэ сядзіць у сваім пакоі за работай. Аб выключнай напружанасці і ўшчыльнёнасці гэтай работы сведчаць і пясочны гадзіннік, і пчала, у вобразе якой мастакі заўсёды ўяўлялі сабе нястомную працу, і загадзя падрыхтаваная, яшчэ сярод белага дня, свяча з рэфлектарам. Скарыну акружаюць кнігі — ён быў адным з самых адукаваных людзей першае паловы XVI стагоддзя. Разам з тым ён ніколі ня вылазіў з нястач, што без слоў пацвярджаюць і напышлівыя гербы мэцэнатаў на спінцы крэсла і звычайныя вясковыя плеценыя кошыкі пад лаўкай, на якой стаіць такі ж убогі гліняны жбан. На пюпітры можна заўважыць малюнак, вельмі падобны да герба: месяц закрывае сабою напалову сонца, але Скарына не належаў да шляхецкага саслоўя і таму не мог мець родавага геральдычнага герба. Гэта нішто іншае, як своеасаблівая фабрычная марка, што сустракаецца на ўсіх надрукаваных

[38] Скарыніч. Мінск, 2002. Вып. 5. С. 22. Цытата ўдакладнена па копіі ліста, дасланай мне А. Каўкам.

ім кнігах. У астралогіі, з якой яму давялося пазнаёміцца ў Кракаўскім універсітэце, малюнак сонечнага зацьмення азначае:

„Кароткае жыцьцё, смутак, клопаты, нястача".

Ніхто так вычарпальна не расказаў пра гаротнае жыццё першадрукара нашага народа, як ён сам, выбраўшы для сваёй дзейнасці такую адзнаку. І разам з тым, калі бачыш гэты „герб" славутага Скарыны, адразу ўспамінаюцца словы ягонага вялікага сучасніка Эразма Ратэрдамскага:

„Друкарскі знак на кнігах мае большае значэнне для чалавецтва, чым імператарскі герб на манетах"»[39].

Працытаваныя Віцьбічам словы выдатна падсвечваюць дзейнасць Скарыны, які глядзеў на сваю працу выдаўца нацыянальнай Бібліі як на самую высокую місію служэння народу. Аднак з прапанаванай Віцьбічам інтэрпрэтацыяй сэнсу сігнета як сімвалічнага ўвасаблення асабістых нягодаў і нястачаў наўрад ці можна пагадзіцца.

Цікавасць да скарынаўскай тэмы Віцьбіч захоўваў і потым. У прыватнасці, варыянт свайго колішняга лімаўскага артыкула ён апублікаваў у 1947 годзе ў эміграцыйным часопісе. Поглядаў на сімволіку партрэта Віцьбіч не змяніў — абапал галавы асветніка па-ранейшаму бачыў «напышлівыя гербы мецэнатаў»[40].

Пасля вайны скарыназнаўчыя даследаванні ў БССР паступова ажыўляюцца.

---

[39] Віцьбіч Ю. Вялікі сын вялікага народа // ЛіМ. 1941. 17 мая.

[40] Віцьбіч Ю. Вялікі сын вялікага народу (Францішак Скарына) // Шыпшына. 1947. № 4. Камплект рэдкага часопіса, які выпускаўся эмігрантамі ў пасляваеннай Германіі, ёсць у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У 1946 годзе ў артыкуле-зацемцы пад назвай «Мае меркаванні» сваімі думкамі з нагоды працы над драматычнай трылогіяй пра Скарыну падзяліўся з чытачамі ЛіМа пісьменнік М. Клімковіч. Шмат што ў асобе і дзейнасці Скарыны ўяўлялася яму таямнічым і неразгаданым. Пытанняў было безліч: «Чаму ён (Скарына. — *Г. К.*) ставіў на сваіх праваслаўных кнігах каталіцкае імя Францыска, маючы сваё праваслаўнае Георгі? Што азначае загадкавая манаграма „Т. З. Б.", якая нязменна спадарожнічае яго ўласнаму гербу? Ініцыялы рэзчыка па дрэву, таго, хто афармляў кнігі? Кім ён (той рэзчык. — *Г. К.*) быў і чаму, калі ён быў католікам, ён не ставіў свайго імя поруч з імем Францыска, а калі ён быў праваслаўным, што перашкаджала яму падтрымаць свайго патрона, паставіўшы сваё імя поўнасцю? Як, нарэшце, вытлумачыць паездку Скарыны ў Кенігсберг, паступленне на службу ў якасці прыдворнага лекара да Альбрэхта толькі для таго, каб праз дзесяць дзён разбурыць у немца яго друкарскую справу, вывезці ад яго „іудзейскага чалавека, доктара і друкара", і вярнуцца ў Вільню?»[41] Ёсць тут пытанні надуманыя, кан'юнктурныя (напрыклад, навязлівыя супрацьпастаўленні імёнаў асветніка), ёсць сур'ёзныя і глыбокія. Нам у дадзеным выпадку асабліва цікава, што пісьменнік вычытаў у «трохкутніку» яшчэ і літару З, як цікава і тое, што «трохкутнік» суаднесены ў артыкуле з паплечнікам Скарыны — рэзчыкам гравюр (як бачым, у апошнім выпадку Клімковіч у чымсьці працягваў лінію Ластоўскага).

---

[41] ЛіМ. 1946. 18 мая. М. Клімковіч цытаваў вядомае пісьмо герцага Альбрэхта 1530 года паводле старых, не зусім дакладных публікацый. Як удакладнілі потым даследчыкі, Кёнігсберг разам са Скарынам пакінулі два чалавекі: лекар-іудзей і друкар. Гл.: Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў / Уклад. В. Дарашкевіч. Мінск, 1988. С. 102–106, 326.

Філосаф М. Алексютовіч у вядомай скарыназнаўчай манаграфіі (1958) партрэт першадрукара апісаў вельмі коратка і толькі мімаходзь закрануў пытанне пра яго сімволіку, у духу свайго часу падкрэсліўшы свецкі характар усяго антуражу выявы: «На століку, за якім сядзіць Скарына, знаходзяцца ў выглядзе знакаў (так у Алексютовіча. — *Г. К.*) Сонца і Месяц. Гэтае ізабражэнне, якое магчыма з'яўляецца гербам або эмблемай Скарыны, паўтараецца і на некаторых ілюстрацыях да біблейскіх кніг. Характэрна, што на гэтай гравюры няма ні аднаго прадмета рэлігійнага ўжытку, або рэлігійнага сімвала»[42]. «Трохкутнік» і «трапецыю» (апошняя з крыжам) над плячыма Скарыны Алексютовіч як бы не заўважае, прынамсі ніяк на іх не рэагуе.

Уважліва ўглядаўся ў партрэт Скарыны гісторык медыцыны Р. Кручок. У артыкуле для юбілейнага зборніка «450 год беларускага кнігадрукавання» (1968) ён пісаў (нам цікавыя яго назіранні як спецыяліста ў сваёй галіне): «Скарына ў традыцыйнай шапачцы і мантыі. Ён сядзіць на ўзвышэнні, на пярэднім плане якога прымацавана трыма палоскамі беларускага арнаменту палатно ў выглядзе прыспушчанага вымпела з ізабражэннем герба Скарыны. Інтэр'ер пакоя, у якім знаходзіцца Скарына, запоўнен дэталямі, якія характарызуюць яго як урача, вучонага, кнігавыдаўца. На паліцах справа размешчаны вялізныя фаліянты рукапісаў (звычайна гавораць пра кнігі. — *Г. К.*) у тоўстых скураных пераплётах. У ніжнім

---

[42] Алексютовіч М. А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд. Мінск., 1958. С. 79. Тэзіс аб адсутнасці на скарынаўскім партрэце рэлігійных сімвалаў быў характэрны для савецкага скарыназнаўства і ў далейшым. Параўн.: Шматаў В. Ф. Гравюрны партрэт Ф. Скарыны // Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. С. 310.

правым вугле змешчана запаленая свечка, якая сімвалізуе самаадданую працу ўрача. Побач з ёй працавітая збіральніца мудрасці — пчала. У левым ніжнім вугле дзве батанізіркі (падручныя каробачкі батаніка. — *Г. К.*) як атрыбут збіральніка і хавальніка лекавых раслін. Вышэй на падстаўцы апорныя прадметы для кнігі (так у Кручка. — *Г. К.*), у тым ліку посуд з гліны — посуд ведаў. На заднім плане за Скарынай ля пярэдніх сценак унутраных гранёных калон — скульптурныя фігуры мядзведзяў з вагамі мудрасці»[43]. Такім чынам, і «трохкутнік», і «трапецыю» Кручок аднолькава лічыў сімвалічнай выявай вагаў («вагаў мудрасці»). У ліку вельмі нямногіх даследчыкаў (пра гэта вышэй) ён прыняў ільвоў за мядзведзяў (нейкае падабенства сапраўды ёсць)[44].

У 1972 годзе ў Мінску выйшаў у свет надзвычай каштоўны альбом, дзе ўпершыню пад адной вокладкай быў сабраны ці не ўвесь ілюстрацыйны матэрыял са скарынаўскіх выданняў (пра гэта марыў яшчэ В. Ластоўскі). Укладальнікам і каментатарам выступіў мастак Л. Баразна (фотарэпрадукцыі П. Захаранкі). Ва ўступным мастацтвазнаўчым артыкуле Баразны даецца апісанне гравюры з партрэтам першадрукара. У прыватнасці, адзначана: «Па баках гравюры — геральд-

[43] Кручок Р. Р. Аб медыка-біялагічнай дзейнасці і прыродазнаўча-навуковых поглядах Ф. Скарыны // 450 год беларускага кнігадрукавання. Мінск, 1968. С. 383–384.

[44] У далейшым да зробленай Р. Кручком інтэрпрэтацыі антуражу партрэта Скарыны даволі крытычна (хоць і ў агульнай форме) паставіўся другі дасведчаны гісторык медыцыны В. Грыцкевіч (гл.: Грыцкевіч В. Доктар у лекарскіх навуках // Голас Радзімы. 1989. 9 лют.; Грицкевич В. П. Франциск Скорина — врач // Франциск Скорина и традиции гуманизма в славянской культуре: Тез. докл. на конф. в Москве, посвященной 500-летию Скорины. Минск, 1990. С. 20).

дычныя знакі. Велічныя львы, быццам на варце ідэй гуманізму, трымаюць гербы людзей, якія прымалі ўдзел у справах Скарыны. А на абрусе, якім засланы пюпітр, выразна намаляваны герб аўтара»[45]. Аўтара? Так: Баразна лічыў Скарыну аўтарам усіх без выключэння гравюр і заставак, змешчаных у яго кнігах, у тым ліку і партрэта. Звернем увагу на неадэкватны, парадкам-такі перабольшаны выраз «велічныя львы». Гаворачы так, Баразна зыходзіў больш з агульнага ўяўлення пра магутнасць і веліч цара звяроў, чымся з рэалій партрэта. Ільвы там якраз маленькія, цацачныя, зусім не велічныя, у значнай ступені ўмоўныя, стылізаваныя. Сігнет Скарыны Баразна разумеў як мастакоўскую манаграму, праўда, своеасаблівую. «Амаль усе мастакі таго часу, — чытаем у прадмове, — ужывалі манаграмы... Звычайна манаграма рабілася з ініцыялаў альбо ўмоўных знакаў. Манаграма Скарыны мае выгляд герба, які складаецца з малюнкаў месяца і сонца»[46]. Пра «дзіўны» знак «трохкутніка» ў мастацтвазнаўчым уступе да альбома паведамляецца, што апрача партрэта «ён сустракаецца ў цыкле гравюр ілюстрацыйна-тлумачальнага характару, у некаторых застаўках Бібліі, на тэматычнай гравюры да кнігі «Левіт». Можна думаць, што гэты знак, які складаецца з лацінскіх (чаму лацінскіх? — *Г. К.*) літар Б, О, Я, — манаграма Багдана Онькава і Якуба Бабіча. Відаць, Скарына жадаў увекавечыць імёны людзей, якія прымалі актыўны ўдзел у яго высакароднай справе»[47]. Гэтая ж думка ў больш катэгарычнай форме паўторана складальнікам і пры каментаванні агульнага тытульнага ліста да Бібліі: «На ім

---

[45] Гравюры Францыска Скарыны. 2-е выд. Мінск, 1990. С. 33.
[46] Тамсама. С. 23.
[47] Тамсама. С. 37.

(тытульным лісце. — *Г. К.*) Скарына змяшчае свой асабісты герб і манаграму Багдана Онькава і Якуба Бабіча»[48]. Можна было спрачацца з канкрэтным прылічэннем Т-знака да той або іншай асобы, але ў рэшце рэшт па вялікім рахунку вельмі важным і плённым было тое, што Баразна звязваў яго з мецэнацтвам, з фінансавай і ідэйнай падтрымкай велізарнага выдавецкага праекта Скарыны.

Іншую пазіцыю заняў мастацтвазнаўца С. Акуліч. У артыкуле «Шрыфт, арнамент і ксілагравюра ў выданнях Скарыны» (1981) ён вёў гаворку пра «мастака, які афармляў скарынінскую біблію»[49], гэта значыць не лічыў Скарыну аўтарам ілюстрацый. Т-знак, на думку Акуліча, якраз і быў манаграмай гэтага мастака. У апісанні агульнага тытула да Бібліі даследчык, у прыватнасці, адзначыў: «Ніжнюю частку рамкі замяняюць два шчыткі з намаляванымі: злева — кніжным знакам, або так званым гербам Скарыны (сонца і месяц з рысамі чалавечых твараў), справа — манаграмай яшчэ невядомага майстра»[50].

У гэты ж час у даследчыкаў з'яўляюцца новыя версіі, часта ў кароткай форме, як бы мімаходзь, мелькам. Так, у вядомым зборніку навуковых прац «Беларускі асветнік Францыск Скарына і пачатак кнігадрукавання ў Беларусі і Літве» (Масква, 1979) прамільгнула прапанова гісторыка-кнігазнаўцы Т. М. Капрэевай «так званы „герб" Скарыны» лічыць «ідэалагічным сігналам», узятым з астралагічнай сістэмы, а скарынаўскі знак «трохкутніка» звязаць з тэасофскімі

---

[48] Тамсама. Каментар да гравюры № 48.

[49] Акуліч С. А. Шрыфт, арнамент і ксілагравюра ў выданнях Скарыны // Выяўленчае мастацтва Беларусі. Мінск, 1981. С. 134.

[50] Тамсама. С. 135.

традыцыямі, а менавіта з поглядамі і сімволікай філосафа і тэолага XV ст. Мікалая Кузанскага[51]. Але прыведзеныя ёю спасылкі на літаратуру слаба падмацоўваюць гэты тэзіс, хаця слынны мысляр з Кузы сапраўды любіў паразважаць у сваіх трактатах пра ўласцівасці трохкутнікаў.

Трохі раней англійская паэтка В. Рыч у каментары да кнігі сваіх перакладаў беларускай паэзіі «Як вада, як агонь» (1971) указала на магчымую сувязь сігнета Скарыны з алхімічнымі традыцыямі. Карыстаемся выпадкам, каб прывесці ў поўным выглядзе адпаведнае месца з яе каментара ў перакладзе, зробленым для нас літаратуразнаўцам А. Васілевіч: «Кнігі Скарыны вылучаюцца ягоным уласным сімвалам сонца і месяца, знаходзячыся ў моцнай стылістычнай сувязі з ілюстрацыямі алхімічных рукапісаў і раннімі друкаванымі алхімічнымі кнігамі, гэта наводзіць на думку, што прынамсі частку свайго часу ў Празе ён праводзіў у атачэнні майстроў Залатой пуцявіны! (Меркаванне не такое ўжо неверагоднае, калі згадаць моцную сувязь паміж раннім кніжніцтвам і алхімічнай прафесіяй — сам Дантэ Аліг'еры, напрыклад, быў зарэгістраваны як член гільдыі лекараў і аптэкараў у 1295–1296 г.) Хоць я не ведаю ніводнай алхімічнай работы, якая да-

[51] Копреева Т. Н. Франциск Скорина и русская рукописная книжная традиция XV в. // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979. С. 66. Пэўныя сумненні ў плённасці такой трактоўкі выказаў мастацтвазнавец В. Пуцко (г. Калуга), праўда, у вельмі агульнай, асцярожлівай форме: «Калі гэта сапраўды так, то і ўсё афармленне скарынаўскіх выданняў (асабліва Бібліі) трэба разглядаць у тым жа рэчышчы. Але ці не занадта далёка мы плывём „па цячэнні"?» (Пуцко В. Г. Гравюры выданняў Скарыны — ілюстрацыі нямецкіх інкунабул? // Спадчына Скарыны: Зб. матэрыялаў Першых скарынаўскіх чытанняў, 1986. Мінск, 1986. С. 165).

кладна адлюстроўвае сімвал Скарыны, некаторыя да гэтага набліжаюцца; самая блізкая, наколькі я ведаю, знаходзіцца ў „Philosophorum Praeclara Monita" са збору Святога Андрэя, у выяве алхімічнага гермафрадыта. (Згаданая ілюстрацыя належным чынам узнаўляецца на малюнку 16 ва „Уводзінах да хіміі" Джона Рыда (John Read), Лондан, 1936.) Варта адзначыць тым не менш, што ў гэтым рукапісе месяц на зыходзе (звернуты ўправа), а на сімвале Скарыны ён у спрыяльнай пазіцыі росту з „рожкамі", павернутымі налева». Як бачым, і ў дадзеным выпадку поўнага супадзення няма. Хаця, канешне ж, Скарына добра ведаў алхімічныя і астранамічныя вучэнні свайго часу, і назіранні Рыч яшчэ раз пацвярджаюць семантычнае і генезіснае багацце Скарынавай сімволікі.

А літоўскі даследчык Э. Гячаўскас на Фёдараўскіх чытаннях 1982 года знакі на шчытах партрэта расшыфраваў так: «...адзін з гербам Калантаяў, другі, на думку знаўцы геральдыкі Эдмунда Рымшы, — з гербам, належачым роду Жабаў»[52]. Пра магчымую сувязь «трохкутніка» з «Катвіцай» Калантаяў ужо гаварылася, а вось меркаванне, што «трапецыя» — герб беларускага старадаўняга шляхецкага роду Жабаў, было зусім новым. Ды пацвярджэнняў гэтага, на вялікі жаль, знайсці не ўдалося (сам Э. Рымша, аўтар грунтоўных прац па геральдыцы ВКЛ[53], з гэтай нагоды ў друку, здаецца, не выказваўся). Тым не менш важна, што

[52] Гячаускас Э. Франциск Скорина — секретарь вильнюсского епископа Иоанна из князей литовских // Федоровские чтения, 1982. М., 1987. С. 63.

[53] Гл. у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў Мінску кнігі: Rimša E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės miestų antspaudai. Vilnius, 1999; яго ж: Heraldika: Iš praeities į dabartį. Vilnius, 2004.

літоўскія калегі зноў выводзілі даследаванне на геральдычны напрамак.

Захоплена займаўся Скарынам вядомы літаратуразнавец і пісьменнік У. Калеснік. Адмысловы вялікі артыкул прысвяціў ён партрэту першадрукара (Мастацтва Беларусі, 1987, № 1; матэрыял увайшоў таксама ў яго важкую кнігу «Тварэнне легенды»). Калеснік грунтоўна паглыбіўся ў эпоху, паказаў сувязь Скарынавай выявы з раннерэнесансавымі партрэтамі святога Ераніма (або Гераніма), які задоўга да Скарыны ўславіўся поўным выкладам Бібліі на размоўнай латыні (т. зв. Вульгата). Па традыцыі на партрэтах Ераніма побач з мудрым перакладчыкам нязменна маляваўся прыручаны леў, што падкрэслівала духоўную моц біблеіста. Калеснік пасвойму бачыў і тлумачыў і іншыя дэталі партрэта Скарыны: «На дзвюх падстаўках у выглядзе калон, завершаных трыма шарамі, сімваламі трох цнотаў: веры, надзеі і любові, стаяць скульптурныя статуэткі львоў, якія падтрымліваюць лапамі шчыты. На шчытах намаляваны вагі, адна, ураўнаважаная, сімвалізуе справядлівасць, другая, зрушаная, — нейкі момант пералому ці парушэння гармоніі быцця. Перад зрушанаю вагай стаіць клепсідра (пясочны гадзіннік. — *Г. К.*), намякаючы на плыннасць часу, зменнасць усяго існага. Фігуры львоў — цароў над жывёламі — выступаюць ахоўнікамі цішыні і роздуму вучонага. Супадзенне сімволікі ў партрэце Скарыны і Ераніма сведчыць пра добрае знаёмства аўтара і заказчыка з канонамі рэнесансавага жывапісу»[54]. Такім чынам, паводле У. Калесніка, знакі «трохкутніка» і «трапецыі» сімвалізавалі

[54] Калеснік У. Тварэнне легенды: Літаратурныя партрэты і нарысы. Мінск, 1987. С. 107–108.

роздум Скарыны па анталагічных, фундаментальных праблемах быцця.

Сваё арыгінальнае, прынцыпова новае прачытанне Скарынавай сімволікі прапанаваў выдатны спецыяліст па беларускай геральдыцы А. Цітоў. У артыкулах, надрукаваных у часопісах «Мастацтва Беларусі» (1989, № 8) і «Полацак» (1991, № 4), ён выказаў цвёрдую ўпэўненасць, што «трохкутнік» першадрукара — радавы мяшчанскі знак яго бацькі Лукаша Скарыны, а «трапецыя» — матчын радавы знак. Як доктар навук Скарына мусіў атрымаць асабістае шляхецтва і права на адпаведны герб, рэалізаванае ім у сігнеце. Адначасова Цітовым выказана меркаванне, што свой знакаміты сігнет Скарына пераняў ад герба горада Капенгагена (там таксама сонца і маладзік, толькі пададзеныя асобна). А гэта, паводле Цітова, можа сведчыць, што Скарына вучыўся ў Капенгагенскім універсітэце і быў нейкі час на службе ў дацкага караля (як вядома, такая версія — пакуль што яшчэ ў агульнай, вельмі хісткай, недакументаванай форме — існуе).

У кнізе (курс лекцый) «Сфрагістыка і геральдыка Беларусі» (1999) Цітоў паказвае нават тыповасць скарынаўскіх знакаў для айчыннай геральдыкі на пэўным этапе яе станаўлення. Даследчык піша: «Вельмі важным вытокам, які спрыяў адаптацыі (успрыняццю) звычаю ўжываць гербы, было тое, што яшчэ ў сівой даўніне на нашых землях была завядзёнка адзначаць свае ўласныя рэчы, межы валоданняў рознымі знакамі — „знаменамі" або клейнамі. Цікава, што гэты звычай зберагаўся і тады, калі геральдыка ўжо шырока распаўсюдзілася па ўсёй Беларусі. Найбольш яскравым прыкладам гэтага з'яўляюцца размешчаныя Ф. Скарынам гербавыя шчыты — таркі, выявы родавых клейнаў свай-

го бацькі і маці»[55]. Спасылкай на характэрны прыклад Скарыны даследчык падмацоўвае таксама свае развагі пра статус асабістых гербаў, якія «надаваліся пэўнай асобе разам з правам асабістага шляхецтва, як гэта адбылося, напрыклад, з нашым першадрукаром Францыскам Скарынам»[56]. Абрысы агульнага тытульнага ліста да скарынаўскай Бібліі з адпаведнай сімволікай (тры гербавыя шчыты) вынесены нават на вокладку кнігі Цітова, а на с. 98 у якасці ілюстрацый пададзены фрагменты з гравюрнага партрэта: «Асабісты герб доктара вызваленых навук Францыска Скарыны (1517 год)» (сігнет), «Мяшчанскія родавыя клейны бацькі і маці Ф. Скарыны (1517 год)» («трохкутнік» і «трапецыя»). Словам, Цітоў, як і яго далёкі папярэднік у галіне гербазнаўства І. Лялевель, нікольки не сумняваецца ў геральдычнай прыродзе скарынаўскіх знакаў і ўпэўнена ўпісвае іх у айчынную гербазнаўчую навуку.

Тым не менш рознагалосіца ў разуменні Скарынавай сімволікі працягваецца. Як родавы знак Скарыны і адначасова яго мастакоўскую манаграму разумее «трохкутнік» (для яго гэта ва́гі) вядомы калекцыянер А. Белы. Следам за некаторымі іншымі даследчыкамі (мы ўжо згадвалі ў гэтай сувязі В. Ластоўскага і Л. Баразну), ён зыходзіць з таго, што Скарына сам ілюстраваў свае выданні, таму і пазначаў ілюстрацыі адпаведнымі знакамі. У артыкуле «Партрэт Скарыны» (1990) Белы пісаў: «Па нашых падліках, у 29 гравюрах змешчаны герб „залатой кан'юнкцыі", гэта значыць зацьмення сонца і месяца, у 21 — родавы знак першадрукара — Ва́гі, і толькі

[55] Цітоў А. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі: Ілюстраваны курс лекцый. Мінск, 1999. С. 63.

[56] Тамсама. С. 61.

ў 10 гравюрах няма нічога. Акрамя гэтага, ва ўсіх застаўках, многіх віньетках і нават у буквіцах мы сустракаем асабістыя герб і знак Скарыны, што безумоўна сведчыць аб сцвярджэнні аўтарскіх праў першадрукара на гэтыя творы»[57]. На гэтых жа пазіцыях Белы застаецца і ў далейшым[58].

На працягу доўгага часу вельмі плённа вывучае графіку і сімволіку скарынаўскіх выданняў вядомы мастацтвазнавец В. Шматаў. Яго погляды ў гэтых адносінах прайшлі значную эвалюцыю ў адпаведнасці з тым, як сталела, набіралася досведу і само скарыназнаўства. У артыкуле, надрукаваным ва ўжо згаданым зборніку «Беларускі асветнік Францыск Скарына і пачатак кнігадрукавання ў Беларусі і Літве» (1979), ён таксама схіляўся да думкі, што Скарына быў да ўсяго мастаком-рысавальшчыкам і сам праектаваў графічныя і ілюстрацыйныя матэрыялы для сваіх выданняў. З гэтага Шматаў і зыходзіў у сваіх тагачасных развагах пра прызначэнне Скарынавых сімвалаў. Маладзіковае Сонца, на думку даследчыка, «шмат у чым застаецца яшчэ загадкавым. Некаторыя аўтары лічаць яго «гербам» Скарыны. Аднак першадрукар, як вядома, паходзіў з купецкага стану, таму не мог мець свайго фамільнага герба»[59]. (Гэта гаварылася яшчэ да адпаведных публікацый А. Цітова.)

Далей: «Выяву сонца з месяцам, якая сімвалізуе перамогу розуму, святла над цемрай, наўрад ці можна лічыць і вы-

---

[57] Белы А. Партрэт Скарыны // Полымя. 1990. № 7. С. 196.

[58] Белы А. Я. Францыск Скарына — вялікі беларускі мастак эпохі адраджэння // Скарына і наш час: Матэр. II Міжнар. навук. канф.: У 2 ч. Гомель, 2002. Ч. 1. С. 105–111.

[59] Шматов В. Ф. Искусство изданий Франциска Скорины // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. С. 123.

давецкай маркай Скарыны. Бо змяшчэнне маркі выдаўца на кожнай асобнай ілюстрацыі — выпадак у кнігавыдавецкай практыцы небывалы. Відаць, „герб" Скарыны ў дадзеным выпадку выконвае ролю манаграмы мастака-рысавальшчыка. Цікава, што гэтую манаграму мы бачым не толькі на пражскіх, але і на многіх віленскіх ксілаграфіях. Знак, які, на думку Стасава, мае прамыя адносіны да асобы самога Скарыны, таксама сустракаецца на пражскіх і віленскіх гравюрах. Гэта даводзіць, што ўладальнік таямнічых знакаў пераехаў з Прагі ў Вільню»[60].

Падобную (дададзім — у пэўнай ступені карысную для скарыназнаўства, для яго даляглядаў) думку, як помнім, выказваў раней В. Ластоўскі, аднак у Шматава быў свой нюанс. Ластоўскі гаварыў пра мастака-«спатужніка» (партнёра), які вандраваў са Скарынам. У Шматава іншы паварот думкі. «Ці не быў ім сам Скарына?» — пытаўся даследчык, заклікаючы да далейшага паглыбленага вывучэння фактаў жыцця і дзейнасці вялікага першадрукара.

У артыкулах пра партрэт Скарыны 1980-х гадоў, а таксама ў манаграфіі «Мастацтва кнігі Францыска Скарыны» (Масква, 1990) Шматаў карэнным чынам пераглядае, удакладняе сваю пазіцыю. Сонца з маладзіком, сцвярджае цяпер даследчык, гэта герб Скарыны. Асветнік мог атрымаць фамільны герб шляхам набілітацыі. «Знакі ⛤ і ♔ на партрэце цесна звязаны з друкарскай дзейнасцю асветніка. На наш погляд, — працягвае Шматаў, — яны таксама маюць непасрэднае дачыненне да яго асобы або да дзеячаў, якія дапамагалі Скарыну ў выданні Бібліі. Першы знак нечым на-

[60] Тамсама.

гадвае медыцынскія шалі, другі — умоўную выяву друкарскага станка. Першадрукар-медык мог, вядома, абраць сабе такія сімвалы. Але абодва знакі, як сонца і месяц, дадзены на геральдычных шчытах, а гэта значыць, што перад намі гербы або гмеркі»[61]. На думку Шматава, знак ⚔ у залежнасці ад прачытання схаваных у ім літар можа быць суаднесены з Багданам Онкавым або Якубам Бабічам. Перспектыўным даследчык лічыць таксама меркаванне Шчакаціхіна пра магчымую сувязь Т-знака з гербам «Катвіца» Калантаяў. Тым больш, як стала вядома (даецца спасылка на геральдыста і генеалога Банецкага), сучаснік Скарыны Фёдар Калантаеў быў неабыякім патрыётам і заклікаў мяцежнага князя Міхайлу Глінскага выступіць на абарону праваслаўя ў ВКЛ. Надзвычай плённая і прыцягальная гіпотэза Шматава наконт верхняга гербавага шчыта без выявы на агульным тытульным лісце да Бібліі. На думку даследчыка, тут павінен быў знаходзіцца знак ⚔, які пазней быў зрэзаны. Чаму? «Можна дапусціць, — піша Шматаў, — што асоба, якая валодала гербам (гмеркам) ⚔, фінансавала яго (Скарынаву. — *Г. К.*) выдавецкую дзейнасць або была неяк звязана з ёю напачатку (прынамсі, да выхаду ў 1518 г. кнігі «Царствы», дзе апошні раз змешчан партрэт з гэтым знакам). У больш позніх выданнях уладальнік знака не ўдзельнічаў. Асоба з гербам ⚔, наадварот, супрацоўнічала са Скарынам у Празе і ў Вільні»[62].

Выдатныя назіранні! Гіпотэза падкупляла глыбокім пранікненнем у матэрыял, шырынёй пастаноўкі пытання, даз-

---

[61] Шматаў В. Партрэт Францыска Скарыны // Спадчына Скарыны: Зб. матэрыялаў Першых Скарынаўскіх чытанняў, 1986. С. 193–194.

[62] Тамсама. С. 195.

валяла звязаць загадкі партрэта з загадкай тытульнага ліста, адкрывала прастор для новых роздумаў і абагульненняў.

Радзей адважваюцца на гіпотэзы дасведчаныя гісторыкі кнігазнаўчай школы. У манаграфіі Г. Галенчанкі «Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар» (1993) знаходзім некалькі прафесійных апісанняў Т-знака. Гаворачы пра агульны тытул да Бібліі, даследчык, напрыклад, паведамляе: «Ніжняя дошка рамкі мае выявы вядомага «сыгнета» Скарыны (сонца і месяц з чалавечымі тварамі) і геральдычны, імянны, або нейкі іншы, магчыма, сімвалічны знак у форме трохкутніка з каромыслам»[63]. Дзелавітасць, дакладнасць з прысмакам тэхніцызму — і ніякіх «фантазій». У гаворцы пра тытул «Малой падарожнай кніжкі» зноў канстатуецца: «Ніжняя форма — кампазіцыя з «сыгнетам» Скарыны і манаграмай у выглядзе трохвугольніка з вертыкальным штамбам і гарызантальнай перакладзінай ... »[64], хаця ў гэтым выпадку можна гаварыць пра сістэму трохкутнікаў (знак да таго часу моцна мадыфікаваўся і тым самым раскрыў сябе дадаткова). Увогуле даследчык відавочна дыстанцуецца ад спрэчак, дае толькі скупое знешняе апісанне Т-знака, прызнаючы магчымасць самых розных тлумачэнняў. Затое Галенчанка, як ніхто іншы, узброіў даследчыкаў новымі матэрыяламі пра акружэнне Скарыны (Багдан Онкаў і інш.), што — мы будзем пра гэта яшчэ гаварыць — вельмі важна для нашай тэмы.

Блізкая пазіцыя і Я. Неміроўскага. Вось ён углядаецца ў партрэт: «Па абодва бакі ад галавы пішучага чалавека —

---

[63] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мінск, 1993. С. 178.

[64] Тамсама. С. 193.

карнізы, на кожным з іх змешчаны скульптурныя выявы стылізаваных геральдычных ільвоў, якія прытрымліваюць лапамі шчыты. На шчытах адлюстраваны загадкавыя знакі, сэнс якіх дагэтуль не ясны. Гэта — адна з загадак партрэта, усё яшчэ не вырашаных»[65]. Т-знак Неміроўскі апісаў, гаворачы пра агульны тытул да Бібліі. Гэта — «манаграма ў выглядзе трохкутніка з перпендыкулярам, пабудаваным да яго гарызантальнай асновы, і з другой — верхняй — гарызанталлю, якая заканчваецца па краях маленькімі трохкутнікамі»[66]. Вельмі сцісла прыводзяцца асноўныя версіі даследчыкаў і робіцца вывад: «Усе гэтыя тлумачэнні, на наш погляд, суб'ектыўныя і колькі-небудзь сур'ёзнымі матывіроўкамі не падмацаваны»[67]. Даволі стрымана, калі не сказаць больш, ставіцца Неміроўскі і да тлумачэнняў другога знака, які, паводле яго апісання, «уяўляе трапецыю, на верхняй мяжы якой усталяваны крыж, а па баках, з нахілам у розныя бакі, праведзеныя кароткія лініі»[68]. Між іншым, нават само дакладнае апісанне знака, зробленае вопытным спецыялістам, таксама мае для нас немалую цікавасць.

А ў цэлым, на думку сур'ёзных гісторыкаў, дасведчаных, скрупулёзных крыніцазнаўцаў, якія кожны свой крок звяраюць з канкрэтнымі крыніцамі, паказаннямі дакументаў, скарыназнаўства яшчэ не гатовае да вырашэння гэтага пытання.

Але права на гіпотэзу, канешне ж, застаецца. Сучасны англійскі пісьменнік і мысляр Дж. Фаўлз піша: «Калі вучоны

---

[65] Немировский Е. По следам Франциска Скорины. С. 130.

[66] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность... С. 360.

[67] Тамсама.

[68] Тамсама. С. 381.

адварочваецца ад таго, што пакуль яшчэ немагчыма (і, можа быць, не ўдасца ніколі) праверыць і пацвердзіць, нехта мусіць павярнуцца да гэтага тварам»[69].

Перш за ўсё Фаўлз меў на ўвазе мастацтва. Сапраўды, паэт або празаік у творы пра першадрукара можа спыніцца на любой гіпотэзе і нават даручыць яе абгрунтаванне і тлумачэнне свайму герою. Прыкладам, у рамане-эсэ А. Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» (1990) Скарына сам знаёміць чытача са сваім гравюрным партрэтам, прычым у значнай ступені, калі не цалкам, выказвае пры гэтым, канешне ж, погляды аўтара рамана. Вось маналог героя: «Гэта перад вамі я — дваццацісямі- ці, як вы яшчэ думаеце, трыццацігадовы Францыск Скарына — усёй сваёй уласнай асобай, за ўласнай канторкай, пры ўласным сігнеце <...> Злева і справа ад мяне, на ўзроўні майго твару — яшчэ два друкарскіх сігнеты, таксама ў сэрцападобных шчытах, аблапленых ільвамі. Галоўны друкарскі сігнет — на ручніку, — як бы ў цэнтры ўсяе кампазіцыі — з сімволікаю сонца і маладзіка. Сігнеты ж, на якіх апушчаны лапы дужых ільвоў, больш, як бы сказаць, вытворчага зместу, бо яны абодва паўтараюць сабою абрысы друкарскага вінта і прэса. І калі сонца ў вянку праменняў сімвалізуе ў мяне святло навукі і мудрасці, а маладзік пры правай шчацэ сонца — пачатак святла, нараджэнне яго, рост, сілу маладзіковую, то вось гэтыя самыя вытворча-друкарскія сігнеты сцвярджаюць у мяне адназначна толькі адно: чым, якім спосабам і сродкам дасягаю я да сонца навукі і мудрасці. Інакш кажучы, сяброве,

---

[69] Фаулз Дж. Аристос: Размышления, не вошедшие в книгу Екклезиаста. М., 2004. С. 290.

сонца і маладзік — у маім гербе святочным, будзённыя ж мае сігнеты — друкарскі вінт, друкарскі прэс. А ўжо ў цэлым я, працаўнік друкарскага варштата, і да сонца ўпадабляюся і да маладзіка»[70]. Так пісаў калісьці Лойка-пісьменнік. Цікава, што Лойка-вучоны, Лойка-літаратуразнавец больш стрыманы, больш асцярожлівы. А магчыма, тут далучыўся, спрычыніўся новы досвед як самога Лойкі, так і ўсяго скарыназнаўства. Так або інакш, але ў нядаўнім падручніку старабеларускай літаратуры (2001) ён толькі лаканічна — адным штрышком — згадвае знакамітую партрэтную гравюру Скарыны з «выявай мядведзяў[71], якія ашчаперылі тарчы з таксама дасюль канкрэтна не разгаданымі сімвалічнымі знакамі ⛩ і ♁»[72]. Як бачым, пазіцыя А. Лойкі (калі не лічыць усё яшчэ нязвыклых для скарыназнаўцаў «мядзведзяў») збліжаецца тут з пазіцыяй Г. Галенчанкі і Я. Неміроўскага.

Між тым, у наш час назіраецца сапраўдны штурм загадак Скарынавай сімволікі, да якога падключыліся нават спецыялісты дакладных, негуманітарных навук, а таксама дзеячы мастацтва. Першыя прыносяць у дыскусіі ўменне сістэмна мысліць, другія — мастакоўскую інтуіцыю (як ні дзіўна, здараецца і наадварот). Робяцца ўсё новыя і новыя больш-менш дасціпныя спробы. Пагатоў што сёння можна смела закранаць аспекты, яшчэ нядаўна зусім «не модныя», не пажаданыя, а то і проста недазволеныя.

---

[70] Лойка А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае. С. 110–111.

[71] Так у А. Лойкі. Мядзведзяў, а не львоў, бачыў на партрэце гісторык медыцыны Р. Кручок (гл. вышэй), а таксама Р. Равяка (Звязда. 1993. 15 студз.), размова пра скарыназнаўчыя публікацыі якога яшчэ наперадзе. Нейкае падабенства стылізаваных Скарынавых ільвоў з мядзведзямі сапраўды праглядваецца.

[72] Лойка А. А. Старабеларуская літаратура. С. 288.

У 1991 годзе на старонках ЛіМа з артыкулам «Служыў Богу і Уладзе?» выступіў скульптар А. Шатэрнік[73]. Артыкул якраз вельмі канкрэтны і лагічны, я б сказаў, сістэмны. Нагадаем тут яго асноўныя палажэнні («трохкутнік» у Шатэрнікавых развагах пазначаны як знак № 1, «трапецыя» — № 2). Калі Скарына размясціў гэтыя знакі «абапал свайго партрэта» (так у тэксце артыкула. — *Г. К.*), то гаворку, на думку Шатэрніка, трэба весці не пра гербы, а пра духоўныя сімвалы, дэвізы першадрукара. Прасочым за разважаннямі мастака. «Што меў на ўвазе Скарына, калі неаднаразова выкарыстоўваў знак № 1 у аздабленні сваіх кніг?» — ставіць пытанне Шатэрнік і працягвае: «В. Шматаў бачыць у ім медычныя шалі, гэтым нібыта сцвярджаецца справа, якою займаўся Скарына — доктар медыцыны. Не абвяргаючы расшыфроўку названага сімвала як шаляў, я тым не менш бачу ў ім іншы сэнс. Нагадаю: „Спачатку было слова, і слова было…" Калі глядзець на палову знака № 1, то мы ўбачым літару Б, якая ўключае ў сябе яшчэ дзве літары — О і Г. У выніку атрымліваем слова БОГ. (Поўны знак атрымаецца ў выніку люстранога адбітка.)».

Гіпотэза падмацоўваецца дадатковымі тлумачэннямі: «Калі бачыць у гэтым знаку шалі, то Бог — суддзя. Калі знак змешчаны побач з сонцам і месяцам, то Бог — стваральнік Сусвету. І. Штрытэр бачыў тут спалучэнне кірылічных літар Т і Б, што не супярэчыць майму тлумачэнню: Бог пагрэцку — „Тэос"».

Далей пераход да знака № 2: «Сцвярджаючы, што ён, доктар Францішак Скарына, служыць Богу, лагічна будзе

---

[73] Шатэрнік А. Служыў Богу і Уладзе?: Сімволіка Скарыны //ЛіМ. 1991. 31 мая.

дадаць — і Уладзе. Гэта, на маю думку, дазволіць расшыфраваць сэнс другога знака, які больш падобны на Карону (сімвал улады ў Вялікім княстве Літоўскім і Каралеўстве Польскім), чым на схематычны малюнак друкарскага варштата, паводле В. Шматава».

Да таго ж, на думку Шатэрніка, гэты знак вельмі нагадвае герб Кракаўскага універсітэта, дзе вучыўся Скарына. У артыкуле прыводзілася яго схематычная перамалёўка. Сапраўды, нейкае падабенства ёсць. На знаку першадрукара нестае толькі скрыжаваных паходняў — на універсітэцкім гербе яны на геральдычным шчыце пад каронай[74].

Прапановы Шатэрніка былі даволі прыхільна сустрэты грамадскасцю. Яго «арыгінальнае тлумачэнне» Скарынавай сімволікі падтрымаў, у прыватнасці, вядомы пісьменнік У. Арлоў у папулярнай кнізе «Таямніцы полацкай гісторыі» (1994): «Правы знак — выява кароны, сімвала дзяржаўнае ўлады. Такім чынам, на партрэце дэвіз выдатнага палачаніна — служыць Богу і дзяржаве»[75].

Шмат піша пра скарынаўскую сімволіку кандыдат фізіка-матэматычных навук У. Паўловіч. Адна з апошніх яго прац — артыкул «Чароўнае святло гравюраў Скарыны» (Беларуская думка, 2000, № 2). Тут таксама нямала цікавага. Напрыклад, пусты, незапоўнены шчыт на тытульным лісце Скарынавай Бібліі, на думку Паўловіча, — гэта «белае поле», якое сімвалізуе божае святло або душу народную і, нібыта своеасаблівы аконны праём, надае выяве дадатковую глыбіню (пра асаблівую змястоўнасць пустога шчыта пісаў

---

[74] Праўда, ёсць падставы меркаваць, што паходні — якраз галоўны элемент гэтага герба.

[75] Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. С. 183–184.

і англійскі даследчык Г. Пікарда — размова пра гэта наперадзе). У Т-знаку Паўловіч следам за Штрытэрам бачыць літары Т і Б. Трохкутнік, разважае наш даследчык, традыцыйна выкарыстоўваўся для азначэння святой Тройцы. Знак у цэлым паказвае, што праца прысвечана Богу ў тройцы адзінаму. Трапецыя з крыжыкам, на думку даследчыка, — вобразная выява кароны. Як бачым, Паўловіч блізкі тут да Шатэрніка. Любы выпадак такой згоды даследчыкаў (прафесіяналаў або энтузіястаў-аматараў — у дадзеным выпадку без розніцы) заслугоўвае двайной цікавасці.

Хуткі на новыя ідэі спецыяліст у галіне сістэматэхнікі Р. Равяка[76] таксама лічыць, што трапецыя з крыжыкам — гэта карона, але акцэнтуе ўвагу на тым, што ўручае яе, карону, папа рымскі. Таму гэты знак, на яго думку, сімвалізуе каталіцкую рэлігію. У выяве сонца з маладзіком даследчыку бачыцца шасціканцовы крыж — знак праваслаўя (сонца — верхняя частка крыжа з гарызантальнай перакладзінай, маладзік — ніжняя касая перакладзіна). Т-знак Равяка суадносіць з пратэстантызмам. Разважае ён так: «Трохвугольнік і літара Т... чытаюцца адразу. Але калі мы параўнаем некалькі адлюстраванняў, то ясна ўбачым літары Л і А. Асабліва добра яны чытаюцца на гравюрах «Адлюстраванне кіёта» і «Адлюстраванне стала» (прынятыя назвы «Узор кіёта» і «Узор стала». — *Г. К.*). Так, Л (людзі), Ѧ (юс малы), Т (цвёрда) і трохвугольнік —

[76] Аўтар шэрагу аматарскіх публікацый па скарыназнаўстве ў схільнай да сенсацый масавай перыёдыцы. Напрыклад, у артыкуле «Гараскоп і сузор'е Францыска Скарыны» (Звязда. 1993. 15 студз.), маніпулюючы лічбавым значэннем кірылічных літар, прапанаваў лічыць Скарынавым днём нараджэння 18 сакавіка 1470 г. А рэдакцыю газеты «Рэспубліка» (2005, 30 сак.) пераканаў, што на адной з фрэсак у бібліятэцы Ватыкана знакаміты Рафаэль намаляваў нашага Скарыну.

канешне ж, Лютар, заснавальнік пратэстанцкай галіны... Такім чынам, — завяршае думку Равяка, — Скарына як бы прадбачыў, што і пратэстанцтва разам з праваслаўем знойдзе сваіх прыхільнікаў на нашай зямлі»[77]. Лёгкаважкасць, надуманасць, калі не сказаць — наіўнасць, версіі відавочная. Скарына сапраўды вылучаўся рэлігійнай талерантнасцю, шырынёй поглядаў, чуйнасцю да ўсяго новага, у тым ліку, трэба думаць, і да пэўных ідэй пратэстантызму, але прапанаваную Равякам непасрэдную суаднесенасць скарынаўскіх знакаў з плынямі хрысціянства прыняць немагчыма. Нельга не бачыць тут яўных нацяжак. (Да таго ж «юсу малому» ў скарынаўскіх тэкстах адпавядае, канешне ж, «я», а не «ю», як лічыць, здаецца, Равяка.)

У 1990 годзе на юбілейнай навуковай скарынаўскай канферэнцыі ў Вільнюсе са спецыяльным паведамленнем «Да пытання аб значэнні сімвалічных фігур у выданнях Францыска Скарыны» выступіў малады беларускі даследчык-літаратуразнавец А. Мельнікаў. Спаслаўшыся на відавочнае знаёмства Скарыны з моднымі ў сярэднявеччы акультнымі навукамі (астралогія, алхімія), ён звязаў Т-знак з сузор'ем Шалі, а «трапецыю» са знакам Меркурыя (хоць, на наш погляд, падабенства іх даволі адноснае) і шляхам складаных разлікаў паспрабаваў удакладніць дату нараджэння Скарыны. Мельнікаў гаварыў пра «магчымасць вылучэння гіпотэзы аб тым, што ў разгледжаных фігурах Францыск Скарына «зашыфраваў» свае касмаганічныя, прычым не надта арыгінальныя погляды (перавага Ідэі над Формай, Розуму над Матэрыяй і іх спалучэнне ў Свеце і Чалавеку, над якімі ўладарыць Абсалют,

[77] Равяка Р. Тайнапіс скарынаўскіх сімвалаў // Звязда. 1992. 10 крас.

спасціжэнне Божага свету фізічнага пры дапамозе духоўнага), а таксама, верагодна, і дату свайго нараджэння»[78] (такой датай даследчык лічыў 10 кастрычніка 1486 года). Да гонару маладога даравітага даследчыка трэба адзначыць гранічную інтэлігентнасць яго выступлення. «Мы ні ў якой ступені не лічым нашы высновы безагаворачнымі, а ход разважанняў дасканалым і адзіна магчымым»[79], — падкрэсліў Мельнікаў. Ён быў першым (ці адным з першых), хто паспрабаваў вывесці дыскусію за звыклыя, часам празмерна прыземленыя рамкі, рашуча рассунуць далягляды абмеркавання.

У не менш высокую плоскасць пераводзіць гаворку пра скарынаўскую сімволіку філосаф У. Агіевіч, які ў адрозненне ад Мельнікава, на жаль, не дапускае ніякіх альтэрнатыў у вырашэнні гэтых няпростых пытанняў. У 1994 годзе з трыбуны міжнароднай канферэнцыі ў Мінску ён абвясціў: «Намі расшыфраваныя сэнсы знакаў „трохкутнік" і „квадрат" («квадратам» ён называе «трапецыю». — *Г. К.*). Яны поўнасцю адпавядаюць сваім сімвалічным зместам паняццям дзвюх скініяў (храмаў. — *Г. К.*)... Ісцінная скінія нерукатворная — яе сімвал стылізаваны квадратам. Зямны ж узор, працяты святым духам, сімвалізуецца знакам трохкутніка — сімвалам магчымасці і здольнасці чалавека праз спасціжэнне, удасканаленне і творчасць прыступіць да прастола — „квадрата"...»[80]. Яшчэ ра-

---

[78] Мельников А. А. К вопросу о значении символичных фигур в изданиях Франциска Скорины // Франциск Скорина и Вильнюс: Сб. материалов Респ. научн. конф., посвященной 500-летию со дня рождения Франциска Скорины. Вильнюс, 1991. С. 67.

[79] Тамсама. С. 64.

[80] Агіевіч У. Фауст, які не выракся Бога: (Праблема адэкватнага ўспрыняцця Скарыны ў амерыканскім і беларускім друку) // Беларусіка — Albaruthenica. Мінск, 1995. Кн. 5. С. 290.

ней, на самым пачатку 1990-х гадоў, у дакладзе «Полацкая епархія — калыска вялікага палачаніна» Агіевіч наступным чынам тлумачыў сваё бачанне скарынаўскай сімволікі, нібыта самім Скарынам і «вынайдзенай»: «Знак „квадрат" састаўлены з трох элементаў. Чатырохкутніка, які на плошчы гравюры ператварыўся ў трапецыю, каб сузіральнік успрыняў яго перспектыву. Ён сімвалізуе сусвет, касмічны парадак, цэнтр і момант тварэння, пачатак і канец, рай з дрэвам пазнання дабра і зла, храм, дзе адбываецца пазнанне. Другі элемент — меч абарачальны, з якім Бог паставіў Ангела ля ўваходу ў рай пасля выгнання Адама і Евы. Трэці — сіметрычныя зломаныя рыскі, што сімвалізуюць двух херувімаў-ахоўнікаў ля каўчэга запавету, дзе святая святых. Апошнія структурныя часткі састаўнога сімвала аб'яднаны адной ідэяй — ахаваць святыні ад недастойных, а ўсе разам сімвалізуюць магчымасці пазнання праз пераадоленне і дасканаленне, мажлівасць вяртання ў рай, далучэння да Бога паводле храмавага служэння... Знак „трохкутнік", — працягвае далей філосаф, — развівае тэму „квадрата" як знака пастаноўкі праблемы. Трохкутнік сімвалізуе любую субстанцыю, сутнасць якой — спасцігальная, калі пазнанне здзейснена ў храме. Першая літара ад лацінскай назвы яго (храма. — *Г. К.*) — Templum — працінае любую арыстоцелеву сутнасць: зямлю, ваду, паветра, агонь. Пазнанне першаасноў дазваляе прыступіць да пазнання духоўных з'яў, квінтэсенцыі»[81]. У шматлікіх артыкулах, у манаграфіях «Сімволіка гравюры Скарыны» (1999),

[81] Агіевіч У. У. Полацкая епархія — калыска вялікага палачаніна: Праблема імя Скарыны // Тэзісы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1000-годдзю Полацкай епархіі і праваслаўнай царквы на Беларусі. Мінск, 1992. С. 10.

«Імя і справа Скарыны» (2002) Агіевіч настойліва працягвае развіваць думку, што знакі «трохкутнік» і «трапецыя» павінны чытацца ў гнасеалагічным кантэксце, у святле тэорыі пазнання і «біблейскага сімвалагізму». Вось адно з такіх яго вызначэнняў: «Анталагічны знак ♔ ёсць пастаноўка праблемы, метадалагічны знак ♔ — яе рашэнне. Першы гаворыць аб магчымасці таямніцы непазнанага і прызнанні яе наяўнасці Скарынам, другі — аб падуладнасці яе чалавеку, аб аптымістычным разуменні філосафам здольнасці чалавека калі не змяніць, дык зразумець і адпаведна кіравацца ў жыцці набытай мудрасцю. Для Скарыны абодва знакі ёсць сімвалы злучэння зямнога і нябеснага ў хрысціянскай традыцыі, злучэнне ісціны і дабрадзейнасці»[82]. Неаднаразова Агіевіч вяртаецца да сімвалічнай сутнасці прадметаў, якія акаляюць Скарыну на партрэце: «Адны з іх неабходныя для пошукаў ісціны, іншыя — для фіксацыі ведаў і ўвасаблення вынікаў такой дзейнасці. Гэтаму служаць «таямнічыя» знакі на картушах ля калон — ♔ «трохкутнік» і ♔ «квадрат», якімі Скарына сімвалізуе свет бачны і свет нябачны, скінію зямную і скінію нябесную, свет створаны і свет нястворaны. У знаках замацаваныя архетыпы метадаў і сродкаў пазнання»[83].

Цікава, што ў гэткім самым духу, пад відавочным уплывам Агіевіча, тлумачыла сімволіку Скарыны навуковая інфармацыйна-аналітычная газета «Веды», якая пачала выдавацца ў 1997 годзе ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Добра знаёмыя нам выявы «трохкутніка» і «трапецыі» на нейкі час упрыгожылі яе першую паласу, размясціўшыся

---

[82] Агіевіч У. У. Сімволіка гравюры Скарыны. Мінск, 1999. С. 187.

[83] Агіевіч У. Астронімы Скарыны: Альфа і амега жыцця зямнога // Роднае слова. 2001. № 9. С. 79.

па баках загалоўка. «Знакі, што акаляюць назву газеты — скарынінскія, — гаварылася ў рэдакцыйнай урэзцы. — Першы азначае свет бачны, другі — свет нябачны»[84]. Праўда, даволі хутка гэтыя сімвалы з афармлення газеты знікаюць. Відаць, знайшліся ў Акадэміі людзі, якія палічылі падобную іх інтэрпрэтацыю непераканаўчай, недаказанай, суб'ектыўнай.

Артыкулам «Сімволіка на партрэце Скарыны» (1998) унеслі свой уклад у дыскусіі пра Скарынавыя загадкі гомельскія даследчыкі М. Палкаўнічэнка і К. Усовіч. «Самым цікавым, загадкавым і спрэчным ва ўсёй ксілаграфіі (партрэтнай гравюры. — *Г. К.*) з'яўляецца, на нашу думку, прысутнасць тут выяў двух ільвоў з геральдычнымі знакамі»[85], — пішуць даследчыкі. І тут мы з імі абсалютна згодныя. Сапраўды, гэта на сённяшні дзень самая вялікая загадка не толькі партрэта, а, бадай, і ўсяго скарыназнаўства. Прынамсі з тых загадак, што адразу кідаюцца ў вочы, прыцягваюць увагу, трывожаць кожнага, патрабуюць неадкладнага адказу. Што ж канкрэтна, якую разгадку прапануюць гамяльчане? Львы, паводле іх інтэрпрэтацыі, сімвалізуюць двух творцаў біблейскіх тэкстаў: евангеліста Марка і перакладчыка Бібліі на латынь Ераніма. Левы знак ⅄ — камбінацыя пяці літар: А, Б, Д, Г, Т — звязаны са Старым Запаветам (значэнне літар тлумачыцца паводле кнігі «Кабала» Папюса). Правы знак («схематычны малюнак узгорка з пляцоўкай наверсе, на якой стаяць у цэнтры крыж, а па баках два кап'і») сімвалізуе Галгофу і звязаны з Новым Запаветам.

Працягваючы даследаванне, Палкаўнічэнка (мастак па прафесіі) паведаміў у артыкуле «Калі ж нарадзіўся Франці-

---

[84] Веды. 1997. 28 ліст. (№ 1).

[85] Кантакты і дыялогі. 1998. № 9. С. 4.

шак Скарына?», што выкарыстанне літарнай сімволікі кабалы дазволіла яму «расшыфраваць сэнс знака ⚖ («вагі»), змешчанага на знакамітым партрэце Скарыны. Гэты знак ствараецца літарай Т (грэка-візантыйскае «тау»), што азначае «мікракосм, чалавек», і трохкутнікам Δ («дэльта»), які сімвалізуе вучонага і ўваход у Царства ведаў — Браму Святла»[86].

У брашуры «Іканалогія і іканаграфія ілюстрацый і ініцыялаў выданняў Францыска Скарыны» (1999) Палкаўнічэнка дадаткова тлумачыць: «Такім чынам, асноўнае значэнне знака „вагі" — вучоны чалавек падобны да сонца, веды і станоўчыя маральныя якасці робяць яго амаль роўным Богу... Калі ўзяць сімволіку А, Б, Г, Т, Д, а іх можна ўбачыць у знаку, то атрымліваюцца амаль усе значэнні, згаданыя вышэй. У кірыліцы гэта літары Аз, Букі, Глаголь, Тверда, Дабро. Іх можна прачытаць наступным чынам: пісьменнасць, кнігі словам сцвярджаюць добрае»[87]. Палкаўнічэнка часам увогуле здзіўляе сваім умельствам рабіць «расшыфроўкі». Аказваецца, нават з даты на партрэце, як вядома, пазначанай кірылічнымі літарамі, пры дапамозе кабалістычных метадаў можна вычытаць такі сэнс: «Я пачатак хаджэння патомкаў да ведаў і дабрачыннасцей» (варыянт: «Я ўласнага бяссмерця бацька»)[88]. Падобныя яўна нацягнутыя «расшыфроўкі» могуць скампраметаваць любую працу. У той жа час — і гэта станоўчы момант — Палкаўнічэнка бачыць эвалюцыю Т-знака («Знак „вагі", як і сігнет С[карыны], не з'яўляецца

---

[86] Палкаўнічэнка М. Калі ж нарадзіўся Францішак Скарына? // Настаўніцкая газета. 2000. 10 кастр.

[87] Полковниченко Н. М. Иконология и иконография иллюстраций и инициалов изданий Франциска Скорины. Гомель, 1999. С. 9.

[88] Тамсама. С. 4, 17.

нязменным. Выява яго на партрэце і ў віленскіх выданнях вельмі розная...»[89]), хаця прывязка яго да пэўных схем кабалістыкі зусім не пераканаўчая.

Мусім адзначыць таксама, што прапанаваная Палкаўнічэнкам дата нараджэння Скарыны (1482 год)[90] уяўляецца даволі верагоднай — сваімі шляхамі на гэтую ж дату некалі выйшаў здольны віцебскі скарыназнавец Г. Лебедзеў[91].

На міжнароднай канферэнцыі 2004 года «Скарына і наш час» у Гомелі прагучаў шэраг крытычных заўваг Палкаўнічэнкі ў адрас Агіевіча, у прыватнасці адзначаліся вольнасці апошняга ў перадачы аўтэнтычнай канфігурацыі скарынаўскіх сімвалаў: «Знак Скарыны (піктаграма Галгофы), якую філосаф называе квадратам, з першых публікацый У. Агіевіча ўвесь час некарэктна „рэтушуецца на камп'ютэры"»[92].

На згаданай канферэнцыі[93] ў своеасаблівым тандэме з Палкаўнічэнкам выступіла яго дачка Т. Вароніна, якая наступным чынам абмалявала стан дыскусій па гэтым пытанні

---

[89] Тамсама. С. 8.

[90] Палкаўнічэнка М. Калі ж нарадзіўся Францішак Скарына? // Настаўніцкая газета. 2000. 10 кастр.; яго ж. Иконология и иконография иллюстраций... С. 17–19.

[91] Лебедзеў Г. Веліч яго здзяйсненняў: З нагоды выхаду ў свет зборніка дакументаў пра жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны //ЛіМ. 1988. 30 верас.

[92] Полковниченко Н. М. Портрет Ф. Скорины в контексте пансофизма эпохи и ренессансной эмансипации личности // Скарына і наш час: Матэр. III Міжнар. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю з дня нарадж. праф. У. В. Анічэнкі. Гомель, 2004. С. 160.

[93] На аналагічнай канферэнцыі 2002 года. Гл.: Полковниченко Н. М. Гравюры изданий Ф. Скорины и современный уровень искусствознания // Скарына і наш час: Матэр. II Міжнар. навук. канф: У 2 ч. Гомель, 2002. Ч. 1. С. 147–152; Воронина Т. Н. Лингвистические аспекты ренессансной символики пансофизма гравюр изданий Франциска Скорины // Тамсама. Ч. 2. С. 114–118.

і ўклад Палкаўнічэнкі ў вырашэнне праблемы: «Пераважная большасць даследчыкаў разглядалі знак Скарыны (гаворка пра Т-знак. — *Г. К.*) у якасці герба невядомага спонсара яго выданняў. Гэткая трактоўка яго надзвычай слабая і непрымальная. Уладзімір Агіевіч, адышоўшы ад спонсарскай версіі, паспрабаваў расшыфраваць знак у пазнавальным ключы. На жаль, не праясніўшы пытання, ён толькі вельмі заблытаў па сутнасці надзвычай простую сімволіку знакаў, намаляваных на вядомым партрэце беларускага асветніка. Знак Скарыны трэба „чытаць" у кантэксце рэнесансавых пансафізму, захаплення герметыкамі, кабалой і адраджэння неаплатанізму. Сімволіка яго неад'емная ад сімволікі сігнета і канцэпцыі (задумы) партрэта асветніка. Правільная трактоўка яго ўпершыню прапанаваная Мікалаем Палкаўнічэнкам»[94]. Даследчыца спасылалася пры гэтым на вядомую нам брашуру Палкаўнічэнкі «Іканалогія і іканаграфія ілюстрацый...» (1999) і яго невялікую папулярную нататку «Антычная і сярэднявяковая сімволіка сонейка і месяца — «ключ» да сігнета Францыска Скарыны» ў газеце «Культура» за 2–8 верасня 2000 года.

Пры ўсёй крытычнасці ў дачыненні да Агіевіча прапанаваныя Палкаўнічэнкам і падтрыманыя Варонінай расшыфроўкі сэнсу Т-знака па сутнасці даволі блізкія да агіевічаўскіх: «Вядомы знак Ф. Скарыны, які складаецца з дэльты і літары Т, сімвалізуе пазнанне», ці яшчэ: «Знак Скарыны сімвалізуе Чалавека, чалавецтва каля брамы пазнання»[95].

---

[94] Воронина Т. Н. Символика знака Ф. Скорины в контексте пансофизма ренессансных неоплатоников // Скарына і наш час: Матэр. III Міжнар. навук. канф. С. 108.

[95] Тамсама. С. 111.

У заключэнне Вароніна зноў адзначыла: «Прапанаванай М. Палкаўнічэнкам трактоўцы сімволікі знака „Шалі" як чалавецтва каля брамы свету няма пераканаўчых альтэрнатыў. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца бясплённасць шматгадовых пошукаў фармальных аналагаў яго ў гербоўніках»[96]. Але з нашага агляду відаць, што спробы знайсці пэўныя адпаведнікі ў геральдыцы не без поспеху рабіліся яшчэ з часоў І. Лялевеля і былі далёка небясплённымі. Прэтэнзіі Палкаўнічэнкі і яго прыхільнікаў на канчатковае вырашэнне праблемы трэба лічыць заўчаснымі.

Звернемся яшчэ да некаторых спроб у гэтым кірунку апошняга часу.

Спецыялісты па народнай абрадавай сімволіцы і ўвогуле па сімволіказнаўстве І. Мячыкава і А. Жаўняк у артыкуле «Некаторыя геральдычныя фігуры беларускай культуры», надрукаваным у зборніку «Сімвалы ў кантэксце культуры» (2001), таксама «вычытваюць» у «трохкутніку» і «трапецыі» скарынаўскіх выданняў схаваны духоўны сэнс: першы знак, падобны на вáгі, увасабляе, на іх думку, выбар чалавекам правільнага, духоўнага шляху, другі — перамогу жыцця над злом[97]. У падобным духу працягваецца размова пра скарынаўскія сімвалы ў кнізе згаданых аўтараў «Індаеўрапейскія карані беларускай сімволікі» (2002). Зразумела, шэраг такіх магчымых і разам з тым, нельга не прызнаць, вельмі адвольных тлумачэнняў, якія часам робяць уражанне своеасаблівай варажбы, можа быць бясконцым. Цікава таксама, што ў артыкуле 2001 года аўтары аперуюць абрысамі Т-знака выключна

[96] Тамсама. С. 112.

[97] Мячикова И. И., Жевняк О. Г. Некоторые геральдические фигуры белорусской культуры // Символы в контексте культуры. Минск, 2001.

паводле партрэта і нібыта не ведаюць, што гэты знак пражыў у выданнях Скарыны значную эвалюцыю. Затое абрысы, прадстаўленыя на партрэце, перадаюцца занадта педантычна, без уліку магчымай дэфармацыі пад уплывам мастацкай перспектывы. У кнізе 2002 года аўтары знаходзяць такое выйсце з сітуацыі, у якую самі сябе паставілі: «Некаторымі даследчыкамі несіметрычнасць гэтай фігуры адмаўляецца — лічыцца, што гэта нібыта выпадковае скажэнне. Часам таму ў навуковай літаратуры дадзены знак... тлумачаць або як анаграму (спалучэнне літар)[98], або як знак дэталі, якая ўваходзіла ў друкарскае абсталяванне часу Скарыны. Найбольш пэўна, уводзячы ледзьве ўлоўны нахіл верхняга элемента, Скарына адзначыў два гэтыя сэнсы...»[99] Штучнасць гэтага пасажу відавочная, бо не толькі даследчыкі, але і сам Скарына шмат разоў дэманстраваў поўную сіметрычнасць Т-знака.

Вялікую працу па ідэнтыфікацыі, «апазнанні» скарынаўскай сімволікі прарабіў англійскі беларусіст Гай Пікарда, вядомы ў свеце сваімі плённымі даследаваннямі ў галіне беларускай культуры. Скарына — адно з даўніх яго захапленняў. Яшчэ ў 1967 годзе ў часопісе англійскіх беларусістаў вучоны апублікаваў агляд гравюр Скарынавай Бібліі (згадваўся там і Т-знак, які Пікарда, следам за П. Уладзіміравым, лічыў тады манаграмай ТД)[100]. Потым былі дзесяцігоддзі працы і роздумаў. Выхаванец вядомых асяродкаў еўрапейскай адукацыі Оксфарда і Сарбоны, Пікарда добра

---

[98] Хутчэй аўтары мелі на ўвазе «манаграму».

[99] Мячикова Н., Жевняк О. Индоевропейские корни белорусской символики. Минск, 2002. С. 101.

[100] Pichura Y. The Engravings of Francis Skaryna in the Biblija Ruska (1517–1519) // The Journal of Byelorus. Studies. 1967. Vol. 1, № 3. P. 147–167.

паглыбіўся ў сярэднявечную геральдыку (на Захадзе існуюць грунтоўныя традыцыі падобных штудый[101]) — гэта моцны бок яго даследаванняў. Успомнім, яшчэ Шчакаціхін марыў прыцягнуць для тлумачэння Скарынавай сімволікі «доследы ў галіне заходнееўрапейскай геральдыкі». Надзвычай глыбокая і змястоўная, можна сказаць, наватарская англамоўная манаграфія Пікарды пра сімволіку Скарыны ў перакладзе друкавалася ў 1992–1993 гадах у нашым часопісе «Спадчына»[102]. Абапіраючыся на грунтоўнае веданне геральдычных прамудрасцяў і гістарычных рэалій, Пікарда не ўпускаў з відавоку самых шырокіх філасофскіх даляглядаў праблемы. «Кніга мая прысвечана геральдыцы Скарыны ў шырокім філасофскім сэнсе — з пункту погляду таго ўнутранага зместу, які Скарына ўкладаў у ілюстрацыі да сваіх кніг»[103], — тлумачыў даследчык у інтэрв'ю для газеты «Наша слова». Сувязь Скарыны з сучаснымі яму філасофскімі і рэлігійна-містычнымі вучэннямі Пікарда паспрабаваў раскрыць у англамоўнай манаграфіі «Францыск Скарына і кабала» (Лондан, 1990)[104], якая істотна дапоўніла яго «геральдычную» штудыю. Тады ж — як водгук на адпаведныя тагачасныя дыскусіі (мы ахарактарызавалі іх вышэй) — у газетах «Навіны Беларускай акадэміі» і «Голас Радзімы»

---

[101] Гл.: Слейтер С. Геральдика: Иллюстрированная энцикл.: Пер. с англ. 2-е изд. М., 2006.

[102] Пікарда Г. Алегарычная геральдыка Францішка Скарыны і кароткі дапаможнік па беларускай геральдыцы: Пер. з англ. А. Кудраўцава і В. Б. // Спадчына. 1992. № 5–6; 1993. № 1–2.

[103] Пікарда Г. «Беларус мае добрую рэпутацыю ва ўсім свеце» // Наша слова. 1992. № 30. С. 4.

[104] Пікарда Г. Францыск Скарына і кабала: Пер. з англ. В. Небышынец // Крыніца. 1995. № 9.

з'явіўся яго артыкул «Скарына, геральдыка і кабала». Гэта быццам бы сціслы, зручны для цытавання, аўтарэферат яго даследаванняў. Пачынаецца артыкул з элеганцкага палемічнага пасажу, вартага таго, каб яго прывесці: «Я зусім не збіраюся перарываць фантастычныя піруэты і гавоты, якія выробляе грамадскасць вакол сімволікі Францыска Скарыны. І такое, несумненна, уваходзіла ў намеры вялікага чалавека. Аднак дазвольце нагадаць чытачам, што большасць сімвалаў у яго „Бібліі рускай" размешчана на шчытах і гербавых сцягах. Напэўна, гэта сведчыць аб іх сувязі з мастацтвам, навукай і законамі геральдыкі, якая рэгулюецца зводам пэўных правілаў і практыкай, што сягаюць глыбінь Сярэднявечча, а не нястрымнай чалавечай фантазіяй»[105].

Паводле перакананння Пікарды, «тытульны ліст «Бібліі рускай» уяўляе сабою своеасаблівую шкатулку з гербамі тых, хто звязаны з публікацыяй гэтай працы (Бібліі. — *Г. К.*). Зверху ўсярэдзіне змешчаны чысты арнаментальны шчыт, які прадстаўляе аўтара, самога Ягову, бо яго атрыбуты як духа, безумоўна, не могуць быць прадстаўлены якім-небудзь сімвалам»[106].

«Ніжэй, — працягвае даследчык, — на аднолькавых па важнасці і годнасці месцах размешчаны яшчэ два шчыты, што, згодна з правіламі беларускай геральдыкі, азначае адносіны партнёрства паміж іх уладальнікамі. Яны прадстаўляюць

---

[105] Пікарда Г. Скарына, геральдыка і кабала // Навіны Беларускай акадэміі. 1992. 19 чэрв.

[106] Параўн. зафіксаваныя намі вышэй меркаванні на гэты конт В. Шматава і У. Паўловіча, а таксама: Агіевіч У. У. Сімволіка гравюры Скарыны. С. 114–115. З Пікардам пагаджаецца беларускі геральдыст А. Шаланда (Герольд Litherland. 2002. № 3–4. С. 129).

абодвух выдаўцоў працы — Францыска Скарыну і яго невядомага кампаньёна». Спасылаючыся на гербоўнік Нясецкага, Пікарда прылічвае «трохкутнік» «да групы беларускіх геральдычных манаграм, якія ён (гербоўнік. — *Г. К.*) класіфікуе як ключы або сімвалы сувязі». У тэксце «Спадчыны» пра гэта (ужо ў сувязі з партрэтам) сказана трохі інакш: «Знак на правым баку крэсла (ад гледача злева. — *Г. К.*) належыць да групы знакаў, падобных на катвігу (якар. — *Г. К.*) ці ключ, паводле класіфікацыі Нясецкага (І. Лялевеля. — *Г. К.*), а ягоная канфігурацыя вельмі нагадвае арыстакратычны герб Калантая»[107].

«З'яўленне гэтай фігуры і яе паўсюднае выкарыстанне злучанай з пазнейшымі эмблемамі, — раздумвае далей даследчык, — дазваляе ўсё ж зрабіць выснову, што гэта марка друкара. Але ўсе згаджаюцца, што Скарына мусіў мець настаўніка, які быў яго патронам ці галоўным памочнікам у гэтай вялікай справе, і што фігура, якая паўсюль з'яўляецца праваруч Скарыны, павінна пазначаць ці ўшаноўваць менавіта яго»[108].

Наконт другога знака, які мы называем «трапецыяй», а сёй-той па знешніх схематычна-абагуленых абрысах прымае за «Карону», цытуем тэкст Пікарды таксама паводле часопіса «Спадчына»: «Злева ад Скарыны (ад гледача справа. — *Г. К.*) на гэтай гравюры ёсць другая геральдычная эмблема, якая з'яўляецца толькі аднойчы... Эмблема складаецца з чатырохкутніка з простым лацінскім крыжам наверсе і дзвюх нахіленых сіметрычных лініяў, што ідуць ад верхніх кутоў ча-

[107] Спадчына. 1992. № 5. С. 69.
[108] Тамсама. С. 69–70.

тырохкутніка. Гэтая фігура належыць да групы „магільных" сімвалаў, якую, надзіва, не вылучыў Нясецкі, але адабраў Каяловіч і ўключыў туды радавыя гербы Магілы, Багдановіча, Быхаўца, Цехановіча, Слепарода»[109]. Далейшага развіцця гэтае немалаважнае для нас новае назіранне, на жаль, пакуль што не атрымала.

Надзвычай цікава аналізуе Пікарда гравюру «Ізраілевы палкі ля храма» з кнігі «Лічбы», дзе Скарына прадставіў сцягі са сваім сігнетам, «трохкутнікам», а таксама з гербавымі знакамі, якія ідэнтыфікуюцца Пікардам як гербы аўгусцейшых і вяльможных удзельнікаў Венскага кангрэса (ці з'езда) 1515 года. Ды гэта асобная размова.

Вялікіх поспехаў у расшыфроўцы скарынаўскай сімволікі дасягнуў гродзенскі даследчык А. Шаланда. Ён прафесійны геральдыст, у 2000 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па шляхецкай геральдыцы Беларусі XVI–XVIII стст., выдае ў Гародні часопіс па сваёй спецыяльнасці пад назвай «Герольд Litherland». У гэтым часопісе, які выходзіць абмежаваным тыражом, і з'явілася ў 2002 годзе яго невялікая (літаральна на 10 старонак), але надзвычай змястоўная і карысная праца, прысвечаная сімволіцы Скарыны. Вядома ж, штудыя Шаланды вытрымана ў геральдычным ключы, ён адштурхоўваецца ад даследаванняў Г. Пікарды і А. Цітова, але ўносіць у рашэнне праблемы шмат новага. Як і Цітоў, гродзенскі даследчык мяркуе, што знакі «трохкутніка» і «трапецыі» на партрэце першадрукара з'яўляюцца мяшчанскімі клейнамі яго бацькі і маці. Даследчык абгрунтоўвае новую версію, што Скарына як шырока вядомы ў Еўропе чалавек мог атры-

[109] Тамсама. С. 70.

маць асабістае шляхецтва ад імператара Святарнай Рымскай імперыі Максіміляна. Шаланда пераканаўча піша аб глыбокай цікавасці Скарыны да геральдычных пытанняў, знаходзіць у ілюстрацыях скарынаўскіх выданняў 19 гербавых выяў (Пікарда налічваў 14 такіх выяў) і вельмі вынаходліва спрабуе іх ідэнтыфікаваць. Не з усімі сцверджаннямі і меркаваннямі Шаланды можна пагадзіцца, але плённасць вырашэння праблемы скарынаўскай сімволікі на аснове геральдычных падыходаў ім даведзена пераканаўча. Калі дагэтуль загадкі скарынаўскай сімволікі не высветлены канчаткова, дык, на думку Шаланды, «выклікана гэта недаацэнкай беларускімі гісторыкамі магчымасцяў такіх спецыяльных гістарычных дысцыплінаў, як геральдыка, сфрагістыка, вексілалогія і генеалогія, у сувязі з чым іх метады даследавання папросту ігнаруюцца. Праўда, трэба прызнаць, — агаворваецца даследчык, — што адбываецца гэта ад простага няведання, бо доўгі час пералічаныя спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны знаходзіліся ў Беларусі (як і ў іншых савецкіх рэспубліках. — *Г. К.*) у занядбаным стане па вядомых прычынах»[110]. Размова пра многія канкрэтныя высновы і прапановы Шаланды яшчэ наперадзе. Несумненна, яго выдатная праца надзвычай стымулюе далейшыя пошукі.

На гэтым завяршаем пакуль што сістэматычны агляд літаратуры, шматлікіх спробаў дэшыфроўкі, прачытання скарынаўскай сімволікі за больш чым 200-гадовы перыяд. Пара падвесці некаторыя папярэднія вынікі («папярэднія»

---

[110] Шаланда А. Гербы і геральдычныя выявы на гравюрах «Бібліі Рускай» Францыска Скарыны // Герольд Litherland. 2002. № 3–4. С. 122.

таму, што, канешне ж, мы будзем вяртацца да розных аспектаў праблемы ў працэсе далейшых даследаванняў).

Мы пераканаліся, такім чынам, што ў дачыненні сімволікі Скарыны, у прыватнасці знакаў «трохкутніка» і «трапецыі», за многія гады інтэнсіўнай працы скарыназнаўства назапасіла шмат думак і назіранняў. Асабліва плённымі ў гэтай галіне нам уяўляюцца даследаванні М. Шчакаціхіна, В. Шматава[111], Г. Пікарды, А. Цітова, А. Шаланды. Дасягненні ёсць. Разам з тым нельга не адзначыць існаванне вялікай разбежкі ў думках і саміх падыходах да вырашэння гэтай задачы. Іншы раз цяжка пазбавіцца ад уражання, што ніхто нікога не слухае, а наступнікі лянуюцца перачытваць папярэднікаў. Даследчыкі ніяк не падбяруць надзейных ключоў. Няма адзінства нават у галоўным пытанні — у якім кірунку шукаць адказ. Адны лічаць гэтыя знакі сімвалам веры Скарыны, другія — гербавымі знакамі мецэнатаў або бацькоў Скарыны, трэція (асабліва гэта датычыць Т-знака) — мастакоўскай манаграмай майстра, які афармляў скарынаўскія кнігі (прычым не выключаецца, што гэта быў сам Скарына), або маркай друкара-кампаньёна. Нават апісваюць іх даследчыкі кожны па-свойму. Напрыклад, у Т-знаку бачаць самыя розныя літары: А, Д, Т, Б, О, Г, З, Я, Л, Ѧ (юс малы) — ці не цэлы алфавіт у самых розных спалучэннях (і гэта, здаецца, далёка не вычарпальны пералік — адкрыцці і прапановы ў гэтым кірунку працягваюцца літаральна на вачах).

Пры ўсёй павазе да шукальніцкага пафасу многіх пакаленняў скарыназнаўцаў непераканаўчай выглядае пазіцыя

---

[111] Апошнім часам В. Шматаў яшчэ раз падсумаваў свае скарыназнаўчыя пошукі, сцвердзіў высновы ў важкай кнізе: Шматаў В. Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI–XVIII стст. Мінск, 2000.

даследчыкаў, якія бачаць у «трохкутніку» і «трапецыі» сімвал веры Скарыны, надаюць ім самы разнастайны адцягнены ці, наадварот, занадта «прадметны» сэнс (Р. Кручок, Т. Капрэева, У. Калеснік, А. Мельнікаў, А. Шатэрнік, У. Агіевіч, У. Паўловіч, К. Усовіч, М. Палкаўнічэнка, Т. Вароніна, Р. Равяка, І. Мячыкава, А. Жаўняк). Няма згоды і сярод пералічаных даследчыкаў, часам паміж імі прарываецца і непрыкрытая канфрантацыя. Прынцыповую рознасць падыходаў адзначыў яшчэ А. Лойка ў сваёй «Гісторыі старабеларускай літаратуры». Паводле яго вызначэння, аксесуары партрэта Скарыны (у тым ліку і сімвалічныя знакі) інтэрпрэтуюцца даследчыкамі як у плане рэалістычна-рэнесансным (У. Калеснік), так і ў плане містычна-сярэднявечным (робіцца спасылка на У. Агіевіча)[112]. Але, канешне, планаў гэтых або аспектаў можа быць названа больш. Найперш гэта план, так сказаць, непасрэдна візуальны, іншымі словамі — знешняга падабенства скарынаўскіх сімвалаў з друкарскімі прыладамі (А. Лойка ў рамане) або вагамі (Р. Кручок, У. Калеснік), каронай (А. Шатэрнік, У. Паўловіч), асобнымі літарамі (тут могуць быць названы многія даследчыкі, пачынаючы з І. Штрытэра). Далей план рэлігійна-філасофскі (той жа У. Агіевіч), план, які ўмоўна можа быць названы касмаганічным (А. Мельнікаў), план астралагічны (П. Уладзіміраў, А. Луцкевіч, Т. Капрэева, сваю даніну гэтаму напрамку аддаў і М. Шчакаціхін), план алхімічны (І. Снегіроў, В. Рыч). Вылучаюцца тлумачэнні з пазіцый неаплатанізму і кабалістыкі (М. Палкаўнічэнка і Т. Вароніна), з пазіцый сімволікі мастацтва Адраджэння (тыя ж Палкаўнічэнка і Вароніна, а таксама У. Калеснік), сімволікі

[112] Гл.: Лойка А. А. Старабеларуская літаратура. С. 288.

народнай абраднасці (І. Мячыкава, А. Жаўняк) і інш. Але што характэрна — з усіх гэтых пазіцый цяжка растлумачыць, чаму з набору скарынаўскіх сімвалаў выпала «трапецыя», мільгануўшы толькі адзін раз на партрэце, а таксама тое, чаму гэтыя знакі падаюцца на геральдычных шчытах, як і сігнет Скарыны. Бянтэжыць таксама лёгкасць, з якой узнікаюць і змяняюць адна адну падобныя версіі. Да таго ж у шэрагу выпадкаў бяруцца пад увагу абрысы Т-знака толькі на партрэце і ігнаруецца эвалюцыя гэтага сімвала, заўважаная яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. І. Лялевелем.

Не пераконваюць і спробы некаторых інтэрпрэтатараў (В. Ластоўскі, М. Клімковіч, С. Акуліч) давесці, што «трохкутнік» з'яўляецца манаграмай мастака, які афармляў скарынаўскія выданні (мастак-«спатужнік», паводле В. Ластоўскага). Да сказанага вышэй дададзім яшчэ думку мастака і мастацтвазнаўцы Ю. Піскуна, які ў вельмі грунтоўнай, проста бліскучай працы, прысвечанай аўтарству гравюр пражскіх выданняў Скарыны, рашуча запярэчыў тым, хто лічыць «трохкутнік» знакам друкара або мастака. Даследчык сцвярджае, што ў тагачасных чэшскіх выданнях на тытульным лісце ці ў тэксце маглі размяшчацца буйнамаштабныя выявы гербаў толькі аўтара ці мецэната[113].

Найбольш перспектыўным нам бачыцца геральдычны напрамак даследавання, прадстаўлены ў нашым аглядзе літаратуры імёнамі І. Лялевеля, У. Ігнатоўскага, М. Шчакаціхіна, Э. Гячаўскаса (Э. Рымшы?), А. Цітова, Г. Пікарды, А. Шаланды. Так бачыў сітуацыю і выдатны

---

[113] Піскун Ю. А. Гравюры пражскіх выданняў Скарыны: пытанне аўтарства // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. Мінск, 1994. С. 36.

пісьменнік З. Бядуля. На гэты ж кірунак выводзілі працы скарыназнаўцаў мастацтвазнаўчай школы М. Баразны, В. Шматава і толькі што працытаванага Ю. Піскуна. Гэты шматабяцальны напрамак падводзіць нас да вялікай, надзвычай важнай праблемы партнёрства і мецэнацтва, да праблемы акружэння Скарыны і сацыяльнай базы яго выдавецкага праекта. Хто падтрымліваў Скарыну, хто дапамагаў яму ў яго велізарнай гістарычнай справе? — вось адно з першачарговых пытанняў скарыназнаўства. І калі «трохкутнік» і «трапецыю» прыняць за знакі партнёрства, дык каго менавіта ў такім выпадку ўшанаваў, уганараваў Скарына гэтымі знакамі?

Раздзел II

РЭАЛІІ СКАРЫНАЎСКАЙ СІМВОЛІКІ І ЯЕ СУВЯЗЯЎ З ГЕРАЛЬДЫКАЙ

1. Экскурс у геральдыку

Сувязь еўрапейскіх старадрукаў з геральдыкай прасочваецца вельмі выразна. Інкунабулы і палеатыпы, як правіла, упрыгожваліся гербамі мецэнатаў і друкароў, а таксама гарадоў, дзе выдаваліся. Ужо не гаворым пра выданні гістарычнай тэматыкі, літаральна перапоўненыя гербавымі выявамі. Напрыклад, у 1483 годзе ў Аўгсбургу (Германія) выйшла «Хроніка Канстанцкага сабора», прысвечаная вядомаму ў гісторыі з'езду вышэйшага еўрапейскага духавенства і знаці 1414–1418 гадоў, на якім быў асуджаны Ян Гус. У кнізе звыш тысячы гравюр з гербамі ўдзельнікаў. Паводле меркавання даследчыка старадаўняй нямецкай кніжнай ілюстрацыі, «колькасць змешчаных у кнізе гербаў ператварае яе ў адзін з паўнейшых геральдычных зборнікаў Еўропы»[114]. Або возьмем «Саксонскую хроніку» (Майнц, 1492). Па падліках таго ж даследчыка, гербаў тут многія сотні: «Яны складаюць генеалагічныя дрэвы, устаўляюцца ў выявы гарадоў, з'яўляюцца на сцягах, спадарожнічаюць «партрэтам»

[114] Нессельштраус Ц. Г. Немецкая первопечатная книга: Декорировка и иллюстрации. СПб., 2000. С. 154.

князёў, размяшчаюцца на старонках па адным або цэлымі групамі»[115].

Усходнеславянскія старадрукі таксама разглядаюцца спецыялістамі як важныя геральдычныя крыніцы, якія даюць гербазнаўцам своеасаблівы, унікальны ў многіх адносінах матэрыял. Рускі даследчык А. Сілаеў піша з гэтай нагоды: «Гербы мецэнатаў і выдаўцоў былі шырока прадстаўлены ў заходне- і паўднёварускіх выданнях яшчэ з часоў Ф. Скарыны, С. Буднага і І. Фёдарава. Дзякуючы гэтаму старадрукаваныя кнігі становяцца адной з найважнейшых крыніц айчыннага гербазнаўства. Каштоўнасць гэтых крыніц заключаецца перадусім у іх мастацкім афармленні, якое апрача ілюстрацый, арнаментальных заставак і ініцыялаў змяшчае шматлікія выдавецкія маркі»[116].

Асабліва вылучаліся ў гэтых адносінах непаўторныя выданні Скарыны. На думку беларускага гербазнаўцы А. Шаланды, якога мы прадставілі чытачу ў папярэднім раздзеле, «Ф. Скарыну па праву можна лічыць першым беларускім геральдыстам. Самую ж „Біблію", дзякуючы насычанасці гербамі і геральдычнымі выявамі, можна разглядаць як своеасаблівы першы друкаваны шляхецка-мяшчанскі гербоўнік у ВКЛ ... »[117]. І ў пэўным сэнсе можна з ім пагадзіцца.

У энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час» спецыяльнага артыкула «Скарына і геральдыка», на жаль, няма, а між тым вялікая цікавасць нашага першадрукара да геральдычнай сімволікі несумненная — дастаткова ўспомніць яго выдатны герб-сігнет, тытульны ліст «во всю

[115] Тамсама. С. 218.
[116] Силаев В. Истоки русской геральдики. М., 2003. С. 221.
[117] Герольд Litherland. 2002. № 3–4. С. 131.

Бивлию» і шматлікія ілюстрацыі, аздобленыя гербавымі або гербападобнымі знакамі. Асабліва ў гэтых адносінах вылучаюцца гравюры «Асада Іерусаліма» (у 4-й кнізе «Царствы», 1518) і «Ізраілевы палкі ля храма» (кніга «Лічбы», 1519). На першай сцягі абаронцаў Іерусаліма ўпрыгожаны выявамі скарынаўскага герба-сігнета і геральдычнай змяі, якая ідэнтыфікуецца большасцю даследчыкаў як гербавы знак Боны Сфорца — акурат у 1518 годзе тая стала каралевай Польшчы і адпаведна вялікай княгіняй літоўскай[118]. Пра гравюру «Ізраілевы палкі ля храма» з вялікім наборам гербавых знакаў мы будзем гаварыць у асобным параграфе.

Але папярэдне лічым неабходным закрануць некаторыя агульныя аспекты гербазнаўства, важныя для нашай тэмы.

Цяга да сімволікі, мабыць, закладзена ў чалавечых генах. Спрадвеку людзі пазначалі адметнымі ўмоўнымі знакамі свае рэчы і тавары, межы зямельных валоданняў. Здаўна вядомыя таямнічыя знакі і надпісы на камянях (знакамітыя Барысавы ды Рагвалодавы камяні), пячаткі і пломбы з сімволікай, ганчарныя клеймы, бортныя знакі пчаляроў, таўры для клеймавання свойскай жывёлы, адмысловыя меткі на старажытнай цэгле-плінфе. Умоўныя выявы былі на вайсковых сцягах, на шчытах ваяроў. Яскравай сімволікай прасякнута жыццё сярэднявечнага рыцарства. З усяго гэтага вельмі рана нарадзіліся шляхецкія гербы як адзнака прыналежнасці да рыцарскага саслоўя, да пэўнага прывілеяванага, заслужанага роду.

Вывучэннем гербаў займаецца геральдыка.

---

[118] У слушнасці такой ідэнтыфікацыі сумняваецца А. Шаланда. Але для нас у дадзеным выпадку важнае само існаванне гербавага знака, як і праблемы яго ідэнтыфікацыі.

«Што ёсць геральдыка?» — пытаўся вядомы польскі геральдыст XIX ст. Францішак Пекасінскі і адказваў: «Геральдыка ёсць навука, якая дазваляе пазнаваць гербы.

Што ёсць гербы? Гербы — гэта знакі або эмблемы, ужываныя найперш класам спадчыннай шляхты для адрознення яе ад іншых грамадскіх класаў»[119].

Аднак у XIX ст. ужо існавала і больш шырокае разуменне геральдыкі, набліжанае да сучаснага. У энцыклапедыі 1862 года чытаем: «Геральдыка — навука аб гербах. Гаворыць яна аб пачатку гербаў, аб наданні іх краінам, правінцыям, гарадам, інстытуцыям, епархіям, парафіям, брацтвам, сем'ям або пэўным асобам, пералічвае звязаныя з гербамі правы і прывілеі, перамены, якія яны зазналі, ідэнтыфікуе нязнаныя, вучыць ствараць новыя, словам, геральдыка змяшчае ўсю гісторыю гербаў»[120].

Так або інакш, геральдыка шчыльна звязана з генеалогіяй, навукай, якая вывучае гісторыю шляхецкіх і іншых родаў. У грамадстве заўсёды была вялікая патрэба ў спецыялістах па гэтых дысцыплінах. Існуе велізарная літаратура па геральдыцы. Першым польскім геральдыстам, які закрануў таксама беларускую гербавую сімволіку, лічыцца знакаміты сярэднявечны гісторык Ян Длугаш. Пра гербы ахвотна пісалі аўтары беларуска-літоўскіх летапісаў. У вядомай Хроніцы Быхаўца знаходзім, напрыклад, звесткі пра гербавыя знакі паплечнікаў легендарнага родапачынальніка набілітэту

---

[119] Piekosiński F. Studya, rozprawy i materyały z dziedziny historyi polskiej i prawa polskiego. T. 5, z. 1: Herold polski, czyli Przewodnik heraldyczny polski. Kraków, 1899. S. III.

[120] Encyklopedyja powszechna S. Orgelbranda. Warszawa, 1862. T. 11. S. 588.

Літвы Палемона, пра славуты герб «Пагоня» і нават цэлую маленькую аповесць пра тое, як з'явіўся ў ВКЛ папулярны герб Абданк (Габданк). Магнацкія і шляхецкія гербы натхнёна апяваліся тагачаснымі паэтамі. Гербы даюцца за вялікія і важныя заслугі, найперш вайсковыя, ратныя, — наперабой сцвярджалі вершапісцы. Вось, напрыклад, панегірычны твор не апошняга паэта постскарынаўскага часу Андрэя Рымшы «На гербы ясневельможного пана, пана Теодора Скумина, воеводы новгородского, епикграмма» (1581):

Не простым людем гербы зъ неба посылают,
Яковый Скуминове въ своим дому мают...
Вер ми, гербов не дають въ дому седящому,
Але зъ татарми въ полю часто гулящому
Не зъ голою рукою, зъ шаблею острою,
Завжды будучы готов до смертного бою.
Жыви ж зъ тыми гербами, ты, зацный Скумине,
А буяй въ своей славе навеки и ныне![121]

Да ўсяго пераконваемся, як няпроста давалася нашым продкам кніжнае паэтычнае слова, стрыножанае чужароднай сілабікай і жорсткімі правіламі этыкету, які вялікі шлях прарабіла з таго часу беларуская паэзія. «Расшыфраваць», данесці да нас тэксты старадаўніх вершапісцаў дапамагаюць сённяшнія перакладчыкі і інтэрпрэтатары. Працытуем верш таго ж Рымшы «На герб Льва Сапегі» ў перакладзе Алеся Бразгунова:

... Хочаш жа любавацца гербам радаводным —
Зараз можаш пабачыць той, што ў доме годным

---

[121] Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII стагоддзя. Мінск, 2003. С. 456–457.

Здавен слаўных Сапегаў. І што ад веку іх Бог
Трымаў моцна ў цнотах — відаць па лілеях трох,
Пры якіх са зброяю конны воін змясціўся[122] —
Знак таго, што ніхто з іх у жыцці не страшыўся;
Служыў сваім спадарам, не чынячы злога,
Не шкадуючы скарбаў і сябе самога.
Яшчэ ж бачыш, як локаць прастрэлены лукам,
Бачыш стралу, што ў локаць упіваецца туга.
Гэткая рана нікога дома не спаткае,
Толькі тых, хто паганцаў палкі разбівае.
На тых гербах красуе страла з крыжамі
Двума, а трэці — побач, убраны месяцамі.
Гэта значыць, што яны больш за хрысціянства
Клалі здароўе, не шукаючы сабе панства[123].

Хоць і сучасным перакладчыкам бывае нялёгка выбрацца з цянётаў даўняй руціннай метрыкі, але галоўнае мы ясна бачым — агромністае значэнне, высокае грамадскае гучанне геральдыкі ў далёкую мінуўшчыну — для паэта і яго адрасатаў-заказчыкаў тут важная кожная дэталь, кожная драбніца. Можна сказаць, што геральдыка — адна з галоўных тэм тагачаснай паэзіі. На асялку гэтай тэмы паэты адточвалі сваё пяро.

І не толькі паэты.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў Мінску вам пакажуць шматтомныя, багата ілюстраваныя выданні па шляхецкай геральдыцы і генеалогіі Б. Папроцкага, К. Нясецкага, А. Банецкага, А. Каяловіча, іншых не менш

---

[122] У склад старажытнага герба Сапегаў уваходзіла знакамітая Пагоня.

[123] Родная літаратура: Хрэстаматыя для 10 кл. сярэдняй шк. Мінск, 1997. С. 198–199.

шаноўных і знакамітых аўтараў. Іх, гэтыя фаліянты, можна гартаць-разглядаць бясконца, імкнучыся пранікнуць у хітрыя камбінацыі стрэл, крыжыкаў, асобных літар, падкоў, зорак, паўмесяцаў і іншых мудрагелістых геральдычных фігур. Яны заварожваюць, распальваюць фантазію.

Адна з частак геральдычнай працы польскага гісторыка Б. Папроцкага (Кракаў, 1584) мела назву «Пра гербы князёў і рыцарства Вялікага княства Літоўскага». Першыя спецыяльныя працы па геральдыцы і генеалогіі «рыцарства» ВКЛ стварыў у XVII ст. А. Каяловіч, аднак друкарскім спосабам яны тыражаваны значна пазней — на мяжы XIX–XX стст. Для другога выдання гербоўніка К. Нясецкага абагульняльную працу «Гербы ў Польшчы» (з раздзелам «Гербы літоўскія і рускіх ваяводстваў») напісаў у свой час славуты гісторык Іаахім Лялевель (надрукавана ў 1846 годзе ў першым томе гербоўніка — ніжэй мы спынімся на гэтым істотным моманце падрабязна).

Гербы адыгрывалі важную ролю ва ўмацаванні міжнародных сувязяў. Вядома, што ў 1413 годзе адначасова з так званай Гарадзельскай уніяй 47 уплывовых польскіх шляхецкіх родаў «пабраталіся» з рыцарскімі родамі ВКЛ, далучыўшы іх да сваіх гербаў (пра гэта таксама ёсць цікавая міні-аповесць, нават з дыялогамі-дыскусіямі дзейных асоб, у Хроніцы Быхаўца). З гэтага часу ў геральдыцы Польшчы, Беларусі, Літвы, Украіны з'явілася асабліва шмат агульнага. Хаця і тут не ўсё было гладка. Здаралася, нашы нобілі адсылалі пазычаныя гербы назад у Польшчу і вярталіся да ранейшых родных сімвалаў[124].

---

[124] Хроника Быховца / Предисл., коммент. и пер. Н. Н. Улащика. М., 1966. С. 99–100; Semkowicz W. Braterstwo szlachty polskiej z bojarstwem litewskim w unii horodelskiej 1413 roku // Polska i Litwa w dziejowym stosunku. Warszawa etc., 1914. S. 441–442.

З даўніх часоў рабіліся спробы сістэматызаваць геральдычныя знакі паводле іх падабенства і паходжання. Велізарную, проста дзівосную працу ў гэтым кірунку прарабіў, да прыкладу, Ф. К. Пекасінскі, які распрацаваў тэорыю паходжання шляхецкіх гербаў у нашым рэгіёне (ад Польшчы да ўсходніх межаў Беларусі) ад старажытных скандынаўскіх рун, літар рунічнага пісьма. Праўда, гэтую тэорыю не надта спяшаліся прыняць іншыя геральдысты, былі ў Пекасінскага і заўзятыя апаненты. Яшчэ да Пекасінскага цікава сістэматызаваў гербавыя знакі І. Лялевель у згаданай працы «Гербы ў Польшчы». Літаратар Аляксандр Вярыга-Дароўскі (не блытаць з Арцёмам Вярыгам-Дарэўскім) напісаў вучонае, крыху іранічнае эсэ «Рускія пячаткавыя знакі» (1862)[125]. Іронія лёгка тлумачыцца часам напісання. Надышла эпоха дэмакратыі, і нават сам вялікі У. Сыракомля, які як ніхто іншы ганарыўся славаю шляхетных продкаў і выбраў сабе псеўданім па назве радавога герба (герб «Сыракомля» — той жа старажытны герб Габданк з дадатковым крыжыкам наверсе), паўторым, нават сам Сыракомля, калі прадстаўнікі літоўска-беларускай шляхты выказалі саслоўны эгаізм пры выпрацоўцы ўмоў вызвалення сялян, усклікнуў: «Мне брыдка Вільні, брыдка быць ліцвінам // І ганьба мець вось гэты герб з пячаткай!»[126] Зрэшты, яшчэ раней Сыракомля пасмяяўся з генеалагічна-геральдычнай пыхі падупалых старажытных фамілій у камедыі «Граф на Ванторах» (1856)[127]. Герой гэтай камедыі, уладальнік некалі вялікапышных развалін, ганарыцца славай

[125] Беларускі пераклад (М. Хаўстовіча): Спадчына. 1992. № 5.

[126] Сыракомля У. Добрыя весці: Паэзія, проза, крытыка. Мінск, 1993. С. 61 (верш «Вызваленне сялян» у перакладзе М. Лужаніна).

[127] Kondratowicz L. (Syrokomla W.) Poezye. Warszawa, 1872. T. 5. S. 14.

учарашніх дзён, забыўшыся, «што замак абваліцца і герб зломіцца, калі іх не падперці плячом новых заслуг»[128]. Аўтар цалкам на баку двараніна новай генерацыі, які атрымаў свой ганаровы герб з рук караля за геройства пры аблозе Пскова (дзеянне адбываецца ў XVI ст., але ўжо ў другой палове стагоддзя, пасля Скарыны).

Паглыбляючыся ў лабірынты геральдыкі, суадносячы дадзеныя гэтай навукі з этапамі скарынаўскай гістарыяграфіі, з вехамі скарыназнаўства, пераконваемся, што першы ўвёў Скарыну ў абсягі навуковага гербазнаўства якраз знакаміты гісторык-дэмакрат Іаахім Лялевель.

Пра цікавасць да Скарыны выдатнага вучонага, прафесара Віленскага універсітэта Лялевеля, куміра філаматаў, вядома даўно. Найперш спасылаюцца пры гэтым на яго кнігазнаўчую працу «Дзве бібліяграфічныя кнігі» (т. 1–2, Вільня, 1823–1826). Лялевель расказаў у ёй пра выдавецкую дзейнасць Скарыны ў Празе і Вільні, паспрачаўся з папярэднімі даследчыкамі пра храналогію яго выданняў, падкрэсліў іх «надзвычайную рэдкасць», прывёў узоры Скарынавых шрыфтаў, арнаментыкі і сімволікі (сігнет з сонцам і маладзіком і вядомы Т-знак, які знаходзіцца цяпер у цэнтры нашай увагі). І ў шэрагу іншых прац Лялевель з пашанай называў імя беларускага першадрукара, «русіна-палачаніна».

Але скарыназнаўцы не ўлічвалі яшчэ адной адметнай публікацыі Лялевеля, у якой згадваецца Скарына. Маем на ўвазе яго геральдычную працу «Гербы ў Польшчы», апублікаваную, як мы ўжо казалі, ананімна пры перавыданні ў 1839–1846 гадах вядомага гербоўніка К. Нясецкага. Калі

---

[128] Тамсама. S. 54.

быць дакладным, тэкст гэты скарыназнаўцы ведалі, але не звязвалі з Лялевелем. Таму ёсць патрэба спыніцца на гэтым больш дэталёва.

Як вядома, гербоўнік К. Нясецкага ўпершыню быў надрукаваны ў 1728–1743 гадах у чатырох тамах пад назвай «Карона Польска». У 1839 годзе лейпцыгскі выдавец і музычны дзеяч Я. Н. Бабровіч (як і Лялевель, удзельнік паўстання 1831 года) распачаў новае, дзесяцітомнае выданне працы Нясецкага пад назвай «Гербоўнік польскі». Былі зроблены істотныя дапаўненні паводле матэрыялаў пісьменніка І. Красіцкага (у выглядзе асобных уставак яны раскіданы па ўсіх тамах, кожны раз аўтарства іх агаворваецца) і самога Бабровіча (спецыяльны ёмісты дадатак у завяршальным дзесятым томе, які выйшаў у 1845 годзе). Першы том, праца над якім пачалася ў 1839 годзе, выдавец затрымаў, вырашыўшы дапоўніць яго геральдычнымі матэрыяламі агульнага характару.

Зрабіць гэта ён папрасіў Лялевеля, які жыў тады ў эміграцыі ў Бруселі. У сваім аўтабіяграфічным эсэ «Прыгоды ў пошуках і даследаваннях польскіх нацыянальных рэчаў» Лялевель расказвае: «Вясной 1843 г. зазірнуў з Лейпцыга Бабровіч шукаць у Бруселі аўтараў. У гэтым пошуку надышла і мая чарга. Паведамляе мне, што завяршае выданне Нясецкага і хоча, каб я заняўся першым томам»[129].

Для Бабровіча Лялевель прарабіў велізарную працу. Не лічачы параўнальна невялікага даведачнага тэксту «Маршалкі Літоўскага трыбунала», ён напісаў дзве надзвычай каштоўныя манаграфіі, якія займаюць у томе дзвесце

[129] Lelewel J. Dzieła. Warszawa, 1957. T. 1. S. 106.

старонак дробнага, шчыльнага друку. Адна хутчэй гісторыка-юрыдычнага характару — «Пасады і ўстановы» (тут і пра ганаровы званні, узнагароды і тытулы ў Рэчы Паспалітай). Другая чыста геральдычная — «Гербы ў Польшчы» (як мы ўжо казалі — са спецыяльным раздзелам «Гербы літоўскія і рускіх ваяводстваў»).

Між іншым, у згаданай аўтабіяграфіі «Прыгоды ў пошуках...» Лялевель раскрывае і закулісны бок супрацоўніцтва з выдаўцом, скардзіцца на скнарыстасць і «фіглі» Бабровіча, які, налічыўшы аўтару вельмі сціплы ганарар, запатрабаваў да таго ж вяртання тамоў Нясецкага, дадзеных вучонаму для працы. «Высветлілася, што далёка вышэй цаніў ён экзэмпляры свайго выдання, чымся напісанне працы»[130], — са скрухай зазначыў Лялевель. У рэшце рэшт вучоны пагадзіўся на мізэрны ганарар пры ўмове, што атрыманыя тамы Нясецкага застануцца за ім. У снежні 1845 г. Лялевель выслаў Бабровічу рэшту свайго надзвычай важнага для навукі рукапісу.

Згаданыя арыгінальныя распрацоўкі Лялевеля былі надрукаваны ў першым томе «Гербоўніка польскага», які насуперак нумарацыі тамоў выйшаў у 1846 годзе пасля завяршэння ўсяго выдання (на тытуле пазначана: 1839–1846, пачатак і канец працы над томам і ўсёй серыяй). Публікацыя здзейснена ананімна, бо імя Лялевеля было забаронена ў Расіі, дзе Бабровіч спадзяваўся рэалізаваць значную, калі не большую частку накладу. У прадмове выдавец пісаў: «Адклаўшы на самы канец выданне I тома, спадзяюся, што публіка здолее годна ацаніць яго змест, да апрацавання якога спрычынілася,

[130] Тамсама. S. 107.

можа, адзінае сёння ў нас пяро, заўжды гатовае да вырашэння найбольш цяжкіх загадак нашай мінуўшчыны. Перакананы, што пасля гэтых слоў кожны чытач, бліжэй абазнаны з нашай літаратурай, асабліва гістарычнай, адгадае імя знакамітага даследчыка»[131].

Аднак з цягам часу намёк на аўтара губляў сваю празрыстасць. Да таго ж канкрэтныя межы ўдзелу «знакамітага даследчыка» ніяк не былі пазначаны. Так або інакш, ананімнае бытаванне тэксту, вядома ж, не спрыяла замацаванню сапраўднага аўтарства, прыводзіла да блытаніны. Шмат хто ўспрымаў і ўспрымае тэкст выдатнага вучонага як тэкст Нясецкага[132]. Імя Лялевеля ў гэтай сувязі не заўсёды прыгадваюць нават спецыялісты па гісторыі геральдыкі. Між тым, яго ананімная геральдычная праца — важкі ўклад у гербазнаўства не толькі Польшчы, але і Беларусі, Украіны, Літвы, грунтоўныя ўводзіны ў загадкавы свет айчыннай геральдыкі. Лялевель падае ў сваёй працы як гісторыю шляхецкіх гербаў усяго рэгіёна, так і надзвычай цікавую сістэматызацыю гербавых знакаў паводле іх сваяцтва і выгляду (у сваёй галіне нешта накшталт своеасаблівай перыядычнай сістэмы Мендзялеева).

У сваю сістэматызацыю вучоны ўводзіць і скарынаўскі знак «трохкутнік». Пра сігнет з сонцам і маладзіком гаворкі тут няма — гэты высокамастацкі і глыбакадумны сімвал, відавочна, не знаходзіў поўнай ці нават блізкай аналогіі ў

---

[131] Niesiecki K. Herbarz... T. 1. S. VI.

[132] Гл. бібліяграфію: Францыск Скарына. Жыццё і дзейнасць: Паказальнік літаратуры. Мінск, 1995. С. 9. У кнізе Я. Неміроўскага «Па слядах Францыска Скарыны» (1990) лялевелеўскі тэкст пра Скарыну прыпісваецца выдаўцу Я. Н. Бабровічу.

спецыфічных схемах радавой геральдыкі[133]. А «трохкутнік» у вачах Лялевеля лёгка знайшоў сваё месца.

Як мы бачылі вышэй, значэнне і паходжанне гэтага знака няяснае і дагэтуль. Скарыназнаўцы губляюцца нават у вызначэнні напрамку пошукаў. Адны лічаць яго гербам самога Скарыны або яго мецэната, другія — сімвалам духоўных пошукаў нашага асветніка, трэція — манаграмай мастака, які ўдзельнічаў у афармленні і ілюстраванні Скарынавых кніг. І гэтак далей, і гэтак далей. Для нас надзвычай важна, што выдатны гісторык пазамінулага стагоддзя, які шмат займаўся якраз так званымі дапаможнымі гістарычнымі дысцыплінамі (гербазнаўства, сфрагістыка, нумізматыка і г. д.), бачыў у гэтым знаку герб і ўпэўнена ставіў яго ў шэраг якарападобных або Т-падобных гербаў, распаўсюджаных у ВКЛ і Польшчы.

---

[133] Сонца і месяц з чалавечымі тварамі часам фіксуюцца ў старых польска-беларускіх гербоўніках, але паасобку ў розных гербах. У сваім выдатным эсэ пра Скарыну У. Калеснік звярнуў увагу на «выяву сонца ў якасці гербавага знака на гравюры, што паказвае пасяджэнне каралеўскай рады пры Аляксандры Ягелоне» (Калеснік У. Тварэнне легенды. С. 118; рэпрадукцыя гравюры 1506 г. — у кн.: Вялікае княства Літоўскае: Энцыкл.: У 2 т. Мінск, 2006. Т. 1. С. 41; у няпоўным выглядзе: Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 41). На пытанне, каму належыць гэты герб, Калеснік не змог адказаць, прывёў толькі розныя далёкія ад рэальнасці меркаванні, а між тым для геральдыстаў ніякага сакрэту тут няма — гэта зямельны герб украінскага Падолля. Гэткім самым гербам карыстаўся блізкі да Ягайлы ўдзельнік Грунвальдскай бітвы кракаўскі харунжы Машкоўскі. Любілі гэты сімвал і заходнееўрапейскія рыцары (Францыя, Эльзас). У беларусаў сонца з чалавечым тварам сёння трывала асацыюецца з сімволікай і вобразам Скарыны. Гэты знак у нядаўна зацверджаным гербе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка, паводле тлумачэнняў распрацоўшчыкаў, «сімвалізуе гуманістычныя традыцыі асветніцтва і напрамую звязваецца з нашым знакамітым суайчыннікам Францыскам Скарынам» (Звязда, 2006, 23 чэрв.).

Адзначае ён і пазнейшую эвалюцыю, мадыфікацыю Скарынавага знака, спрабуе адгадаць яго паходжанне. Паводле Лялевеля, у сваёй аснове гэта літарная манаграма: «Знак гэты ў 1519 годзе Скарына ў Празе падаваў як манаграму літараў ТА, а ў Вільні ў 1525 годзе як Т, апраўленае ў трохкутнікі»[134] (мелася на ўвазе з'яўленне дадатковых трохкутнікаў па краях верхняй перакладзіны).

Лялевель наогул лічыў, што «рускія» гербы паходзяць ад пячатак, якія ў сваю чаргу ўзніклі на аснове літар. Вось і ў дадзеным выпадку ён пісаў: «Не прыходзіцца сумнявацца, што гэта сапраўды пачатковая літара Т нейкага слова адпаведнага значэння. Не жадаем настойваць, каб абсалютна ўсе літары ў рускіх гербах абавязкова мелі сваё значэнне, але многія з іх яго не пазбаўленыя. S — sigillum [знак, след, пячатка, кляймо], М — метка, П — пячатка, Т, якое досыць часта з'яўляецца ў розных гербах, можа, ёсць тайна, таямніца, secretum. І якраз тое мелі значэнне, бо рускія гербы вялі свой радавод ад пячатак»[135].

Менавіта Лялевель, дзякуючы сваёй сістэме, убачыў блізкасць Скарынавага знака з гербам Kotwica (якар), якім карыстаўся беларускі шляхецкі род Калантаяў. У спісе літоўска-рускіх гербаў, які склаў вучоны, прозвішчы Скарыны і Калантаяў аб'яднаны ўзаемнымі адсылкамі (каб не было сумнення, пра што гаворка, зроблена і спасылка на працу Лялевеля «Дзве бібліяграфічныя кнігі...»)[136]. Гэта дало магчымасць наступным даследчыкам паставіць пытанне аб далучанасці Калантаяў да выдавецкай дзейнасці Скарыны.

---

[134] Niesiecki K. Herbarz... T. 1. S. 567.

[135] Тамсама.

[136] Тамсама. S. 553, 555.

Калантаі — служылая шляхта. Сярод сучаснікаў Скарыны па дакументах праходзіць, напрыклад, «каралеўскі дваранін» Фёдар Калантаеў (у будучым мы яшчэ спынімся на гэтай постаці больш падрабязна). А ці быў калі ўшанаваны шляхецкім званнем купецкі сын Скарына? Ці можна пацвердзіць гэта дакументальна? Ці валодаў Скарына афіцыйна зацверджаным гербам?

Як вядома, шляхецтва надавалася за пэўныя заслугі адпаведнымі каралеўскімі актамі. Прычым не кожная набілітацыя азначала зацвярджэнне новага герба. Магла адбывацца так званая адаптацыя (або адопцыя) — «усынаўленне», прыняцце, далучэнне да герба якой-небудзь прызнанай шляхецкай фаміліі. У такім выпадку патрабавалася згода, а то і ініцыяцыя прадстаўнікоў гэтага роду.

Даследчыкі мяркуюць, што Скарына мог атрымаць набілітацыю як дыпламаваны доктар навук, тым больш што ён меў шырокую вядомасць сваёй вучонасцю і карыснай дзейнасцю ў розных сферах жыцця.

На жаль, акт яго набілітацыі пакуль што не выяўлены (старая дакументацыя дайшла да нас з вялікімі лакунамі), аднак згаданы геральдыст Ф. К. Пекасінскі сабраў значную колькасць (некалькі сотняў) набілітацыйных актаў польска-літоўскай дзяржавы і апублікаваў іх адмысловай падборкай пад назвай «Пералік прывілеяў XV і XVI стагоддзяў аб наданні шляхецтва або прызнанні шляхецтва за чужаземцамі»[137]. Прыводзім паводле гэтай крыніцы ўзоры такіх актаў аб набілітацыі асоб з вучонымі ступенямі (пераважна дактароў

[137] Гл.: Piekosiński F. Rycerstwo polskie wieków średnich. Kraków, 1896. T. 1. S. 251–314 (канкрэтныя старонкі адзначаем у тэксце).

навук) і друкароў. Прыклады гэтыя могуць мець немалаважнае тыпалагічнае значэнне для біёграфа Скарыны (служыць своеасаблівай «інфармацыяй для роздуму»).

Першы такі прыклад з падборкі Пекасінскага адносіцца яшчэ да сярэдзіны XV ст. (парадак набілітацыі пачаў складвацца задоўга да нараджэння Скарыны). Паводле акта ад 23 красавіка 1456 года, кароль Казімір Ягелончык «Гадзіслава сына Мікалая з Гошыц, доктара медыцыны, а таксама брата яго Якуба мянуе [прызнае, зацвярджае] шляхтай з наданнем дэвізу Пагоня і герба ...» (даецца апісанне герба на латыні) [с. 263–264]. Цікава, што працытаваны каралеўскі ўказ распасціраўся нават на брата доктара медыцыны, між тым ніякіх звестак пра шляхецтва Скарынавага брата Івана даследчыкі не маюць. Але, як мы хутка пераканаемся, братоў уключалі ў такія дакументы далёка не заўсёды.

Далей у матэрыялах Пекасінскага ідуць ужо непасрэдна скарынаўскія часы. 12 верасня 1504 года кароль Аляксандр «Мікалаю Чэпелю з Познані, доктару дагматыкі, пробашчу ўроцлаўскаму і гнезенскаму, каноніку кракаўскаму, надае шляхецтва, паводле просьбаў Яна Ласкага, канцлера Каралеўства Польскага, і Яраслава Ласкага, войскага серадзкага, а таксама ўсяго роду Карабітаў, якія яго да свайго роду і герба Кораб адаптавалі» [с. 267][138]. Як бачым, у дадзеным выпадку гаворка ідзе аб адаптацыі. Тое ж мела месца і пры наданні ў 1506 г.

---

[138] Тагачасную гравюру з выявай караля Аляксандра і канцлера Ласкага можна бачыць у кн.: Вялікае княства Літоўскае: Энцыкл. Т. 1. С. 42. Выява абагуленая. Падкрэслена самае неабходнае. Канцлер, як і належыць, трымае ў руках світак граматы і дзяржаўную пячатку, адбываецца зацвярджэнне чарговага важнага дакумента. Унізе на чырвоным геральдычным шчыце герб Ласкіх «Кораб» (карабель).

шляхецтва «Міхалу Ганэлю са Львова, доктару медыцыны і фізіку [лекару?[139]] караля венгерскага і чэшскага Уладзіслава, а таксама архіпрэсвітару будзінскага касцёла найсвяцейшай Панны Марыі», што адбылося «па просьбах Якуба Шыдлавецкага, скарбніка кароннага і старасты сандамірскага і лэнчыцкага, пададзеных ад імя ўсяго роду Адранвонжаў, якія яго да свайго роду і герба адаптавалі ...» [с. 268].

Не адмаўляў заслужаным вучоным людзям у манаршай ласцы і наступны кароль Жыгімонт I (добра вядомы скарыназнаўцам). Здаралася, не абмінаў увагай нават бакалаўраў. Так, 8 снежня 1512 года ён «надае шляхецтва, а таксама герб Юноша Якубу Кутурманскаму, бакалаўру навук вызваленых, а то ў выніку адаптацыі праз Андрэя з Радзеёвіц, ваяводу плоцкага і старасту раўскага» [с. 272]. А ў верасні наступнага года ў Вільні «надае шляхецтва Мацею дэ Краіна, доктару фізікі, а таксама герб: «bipennem album in scuto ubeo et campo flaueo» (Тапор), да герба гэтага адаптавалі яго Андрэй з Тэнчына, кашталян бецкі, і Станіслаў з Храбржа, чашнік каронны» [тамсама]. У лютым 1519 года надаецца «шляхецтва Тыдэману Гысэ, магістру мастацтваў, каноніку і афіцыялу вармінскаму, а таксама братам яго і сёстрам, што паходзяць ад бацькі Альберта Гысэ, гданьчука»; далей апісанне адмысловага герба, «які так мае выглядаць ...» [с. 274–275].

Без істотных змен традыцыя працягвалася і ў бліжэйшы постскарынаўскі час. Прыкладам, 14 сакавіка 1552 года кароль Жыгімонт Аўгуст «Марціну Кромеру, доктару абодвух правоў, кусташу віслицкаму, каноніку кракаўскаму і каралеўскаму сакратару, а таксама братам яго Бартламею і

[139] Адно са старадаўніх значэнняў слова «фізік».

Мікалаю, надае шляхецтва і герб... » [с. 284]. Размова пра вядомага гісторыка, літаратара, гуманіста, тэолага, які паходзіў са спольшчанай нямецкай мяшчанскай сям'і. Ён спрычыніўся і да нашай гісторыі. Асобныя артыкулы пра М. Кромера ёсць у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», як і ў энцыклапедыі «Вялікае княства Літоўскае».

Праз некаторы час, 12 жніўня 1556 года, будучы ў Вільні, Жыгімонт Аўгуст «надае шляхецтва Стэфану Мікану[140], доктару філасофіі і медыцыны, а таксама герб... » [с. 288]. У студзені 1559 года «зацвярджае адаптацыю Шымона Марыцыуша, доктара абодвух правоў, да герба Хамут, здзейсненую праз Міхала Вулькоўскага, харунжага паморскага» [с. 290]. У 1571 годзе «Станіславу Сакалоўскаму, магістру мастацтваў вызваленых, звычайнаму прафесару філасофіі і лацінскай мовы ў Кракаўскай акадэміі, надае шляхецтва, а таксама герб: „lilium album in campo rubeo" (Газдава)» [с. 298]. А 24 красавіка наступнага года «зацвярджае шляхецтва Станіслава Завадскага, званага Picus [Дзяцел], фізіка, доктара медыцыны, падканцлера Кракаўскага універсітэта, сына шляхетнага Мікалая Завадскага з Завады Плоцкага павета, і надае яму да даўніх атрыманых ад продкаў гербаў — Рагалі, Газдавы, Сулімы і Боньчы — новы герб... » [с. 298–299]. У дадзеным выпадку перад намі ўрачысты акт пацвярджэння ранейшага шляхецтва і дадатковага ўзбагачэння сямейных ганаровых кляйнотаў. Ды і ва ўсіх адносінах выпадак не шараговы, а хутчэй выключны. С. Завадскі — для свайго часу вельмі заслужаны чалавек. Як і Скарына, вучыўся ў Кракаве,

[140] Як і Скарына, С. Мікан — выхаванец Кракаўскага універсітэта. Выкладаў рыторыку і дыялектыку ў Кракаве, быў прыдворным лекарам пазнанскага біскупа.

удасканальваўся ў навуках у Падуі. Потым узначальваў родны універсітэт, быў і бурмістрам стольнага Кракава. Славіўся як выдатны прамоўца («Другі Цыцэрон», «Vir dissertissimus» [«Муж найкрасамоўны»], — гаварылі пра яго).

Нарэшце, два апошнія прыклады, якія хацелася б прывесці, звязаны з энергічнай дзейнасцю караля Стэфана Баторыя, абодва датуюцца 1581 годам. 2 сакавіка яго каралеўская міласць «Якубу Усцянскаму, доктару філасофіі і медыцыны, надае шляхецтва, а таксама герб Ястрабец, да якога яго адаптаваў Ян Бяйкоўскі з Бейкава, стольнік Перамышльскай зямлі» [с. 307], а 20 лістапада «Валентыю Лапчынскаму, тыпографу, надае шляхецтва, а таксама герб Еліта, і то з дазволу канцлера Яна Замойскага і гэтага роду, аднак зменены наступным чынам ... » (размова пра новы варыянт герба Еліта) [с. 310]. В. Лапчынскі (да набілітацыі Лапка) — сын вясковага солтыса, здольны самародак, узначальваў паходную друкарню Баторыя і вызначыўся ў цяжкіх паходах пад Гданьскам, Полацкам, Вялікімі Лукамі і Псковам, за што і атрымаў шляхецтва і герб свайго апекуна канцлера Замойскага (дарэчы, многія даследчыкі мяркуюць, што герб Еліта сярод іншых гербаў прадстаўлены на скарынаўскай ілюстрацыі «Ізраілевы палкі ля храма»).

Спынім на гэтым пералік прыкладаў і паралеляў. Намі разгледжаны розныя варыянты каралеўскіх набілітацыйных актаў — аб наданні шляхецтва з адначасовым зацвярджэннем новага герба, аб адаптацыі да існуючых гербаў, аб пацвярджэнні ранейшага шляхецтва.

Магчыма, існаваў аналагічны дакумент (паводле першага або другога варыянтаў) і ў дачыненні Скарыны. Аднак на падставе прыведзеных прыкладаў мы пераканаліся, што на-

суперак распаўсюджанаму меркаванню доктарская ступень не цягнула за сабой аўтаматычна набілітацыю — патрэбны былі нейкія дадатковыя акалічнасці (з другога боку, здараліся выпадкі надання шляхецтва не толькі дактарам, але і магістрам і нават бакалаўрам). Таму не выключаем, што фармальнай набілітацыі Скарыны не было і яго выдатны герб-сігнет з сонцам і месяцам так і застаўся незацверджаным, што, дарэчы, магло даваць дадатковыя магчымасці (большую свабоду) для яго выкарыстання[141].

Падобна, недалёкім ад ісціны быў У. Калеснік, калі пісаў: «Над Скарынавым родам не загарэлася зорка ўдачы, якая зрэдку ўводзіла гараджан у гербоўны стан. Не давялося яму атрымаць герба і за вучонасць ад «наиласкавшего Жигимонта Казимировича», хоць той ахвотна і часта надаваў гербы вучоным, але толькі тым, што працавалі ў Кракаўскім (Ягелонскім) універсітэце»[142]. Што Жыгімонт I, як і іншыя валадары Польшчы і ВКЛ, асабліва апекаваўся вучонымі Кракаўскай акадэміі — у гэтым мы толькі што пераканаліся самі на канкрэтных прыкладах.

---

[141] У якасці пэўнай паралелі дададзім, што не захаваўся і акт аб набілітацыі рускага першадрукара Івана Фёдарава («друкарь Москвитин»), які пасля выезду з Масквы ў Беларусь (1566) карыстаўся вядомым мясцовым шляхецкім гербам Шранява. Вельмі магчыма, што ў дадзеным выпадку мела месца адаптацыя, для чаго Фёдараў мусіў атрымаць згоду прадстаўнікоў аднаго са шматлікіх родаў, далучаных да гэтага герба. Менш пераканаўчай, улічваючы заўсёднае падкрэсліванне Фёдаравым сваёй сувязі з Масквой і некаторыя іншыя акалічнасці, нам уяўляецца версія аб яго беларускім паходжанні, хаця і ад яе адмаўляцца пры сённяшнім узроўні нашых ведаў не варта. Цікава таксама, што гербам Шранява карыстаўся адметны старажытны род Вярыгаў, які вылучыў у XIX ст. беларускага пісьменніка Арцёма Вярыгу-Дарэўскага.

[142] Калеснік У. Тварэнне легенды. С. 117–118.

Але, можа быць, Скарына атрымаў набілітацыю дзенебудзь яшчэ — у Капенгагене, Кёнігсбергу?..

Новы, нечаканы паварот у вырашэнні гэтага пытання прапанаваў нядаўна А. Шаланда ў сваёй выдатнай штудыі, прысвечанай скарынаўскай сімволіцы. Ён звярнуў увагу на геральдычную застаўку, выкарыстаную Скарынам 4 разы — у кнігах 1518 года «Песня песням», «Прамудрасць» і 1519 года «Левіт», «Лічбы». Як спецыяліста ў галіне геральдыкі яго ўразіла, што сігнет Скарыны тут афармлены па ўсіх правілах поўнага шляхецкага герба: у цэнтры на тарчы-шчыце сам герб, дакладней, яго ядро (сонца з месяцам), над тарчай шлем-гелм, на гелме кляйнот з той жа выявай, што і на тарчы, толькі ў мініяцюры і г. д. (гл. энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час», с. 338). Аддадзім належнае назіральнасці Аляксея Шаланды. Вось жа — сотні даследчыкаў бачылі гэтыя застаўкі, і ніхто не звярнуў увагі на гэтыя важныя акалічнасці. Дапамагла спецыяльная падрыхтаванасць Шаланды ў галіне геральдыкі, дзе кожная дробязь мае сваё значэнне. «Сам па сабе такі герб шмат пра што гаворыць, — разважае пільны гродзенскі даследчык. — Па-першае, адсутнасць кароны сведчыць пра набілітацыю мешчаніна, якім і з'яўляўся палачанін Ф. Скарына. Па-другое, гелм у профіль сведчыў пра нованабілітаванага, г. зн., што менавіта асабіста наш друкар атрымаў гэты герб... Па-трэцяе, характар гербавай выявы быў непасрэдна звязаны з адной са спецыяльнасцяў Ф. Скарыны — астраноміяй і сведчыў пра яго тытул доктара „в науках вызволеных"... »[143] Адзначыўшы, што выявы сонца і месяца, хоць і ў нязлучаным выглядзе, былі даволі папулярныя

[143] Герольд Litherland. 2002. № 3–4. С. 123.

ў нямецкай прыватнаўласніцкай геральдыцы, Шаланда робіць выснову: «Усё гэта дазваляе меркаваць, што набілітацыя доктара мастацтваў Ф. Скарыны наступіла ў межах Святой Рымскай імперыі...»[144]. Такім чынам, Шаланда атрымаў вельмі важны навуковы вынік, які ў перспектыве можа істотна ўзбагаціць скарыназнаўства. Вынікае, згаданай застаўкай Скарына сам пацвердзіў сваё шляхецтва. Але, з другога боку, гэта магло быць і своеасаблівай гульнёй вялікага чалавека, яго гарэзлівым, вольным, хоць і рызыкоўным, абыходжаннем з саслоўнымі правіламі сучаснага яму грамадства. Так бы мовіць, спробай «прымерыць» на сябе шляхецкія кляйноты — вось так бы, маўляў, выглядаў мой пуцяводны сігнет-талісман, калі б які асвечаны манарх меў ласку набілітаваць мяне[145].

Звыклая яму стыхія апрача шмат у чым транснацыянальнай вучонай карпарацыі — месцічы, бюргерства, купецтва. Там таксама была свая «геральдыка», свае мяшчанскія, купецкія гербападобныя знакі. Пра іх вядома менш. Прынамсі такой значнай літаратуры, як пра шляхецкія гербы, пра знакі купцоў-негацыянтаў не існуе.

А шкада, бо Скарына сваім паходжаннем і пазнейшымі партнёрскімі стасункамі быў моцна звязаны якраз з асяроддзем месцічаў-гараджан. Для разумення купецкай сімволікі нам таксама важны еўрапейскі вопыт, бо Беларусь, ВКЛ уваходзілі ў культурную прастору еўрапейскіх краін.

У «Энцыклапедыі знакаў і сімвалаў» Джона Фолі чытаем пра бюргерскую, купецкую сімволіку: «Купецкія зна-

---

[144] Тамсама.

[145] Дарэчы, структурна (суадносінамі частак) гербавая выява на застаўцы Скарыны нагадвае герб вынаходніка кнігадрукавання І. Гутэнберга (гл.: Слово о книге / Сост. Е. С. Лихтенштейн. М., 1984. С. 67).

кі — асабістыя меткі, якія ставіліся з пачатку XIII-га да канца XVI стагоддзя гандлярамі і камерсантамі па ўсёй Еўропе. Папярэднікі таварных знакаў, яны ўказвалі гандляра і служылі гарантыяй, што тавары, якія ён прадае — часта з розных крыніц, — адпавядаюць адной якасці»[146]. Спачатку няхітрыя, а з часам усё больш складаныя і мудрагелістыя, знакі маляваліся, наносіліся фарбай або надрапваліся на саміх таварах ці на мяшках, у якіх тавары знаходзіліся, а таксама наносіліся клеймамі. Асаблівае развіццё купецкія знакі атрымалі ў гарадах Ганзы, як вядома, цесна звязаных гандлёвымі інтарэсамі з ВКЛ, з Беларуссю[147]. Фолі паведамляе: «У межах Ганзы — гандлёвай асацыяцыі на Балтыцы, што мела гандлёвыя пункты па ўсёй Еўропе, — такія знакі служылі пацвярджэннем уласнасці. У 1332 годзе тры іспанскія купцы, прад'явіўшы свае знакі, атрымалі назад упакоўкі з воскам, выкінутыя на берагі Фландрыі пасля караблекрушэння»[148]. Пад канец

---

[146] Фоли Дж. Энциклопедия знаков и символов: Пер. с англ. М., 1997. С. 244–245.

[147] Яшчэ ў дагаворных граматах XIII ст. фіксавалася традыцыя: «Полочаном, Видьбляном вольное торгованье в Ризе, на Готьском бере[зе] и в Любьце» (Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. док. и материалов. Минск, 1959. Т. 1. С. 75). З далёкіх ваяжаў, плаванняў нашы продкі прывозілі элементы еўрапейскага вопыту.

[148] Фоли Дж. Энциклопедия знаков и символов. С. 245. Вядома, напрыклад, што Нямецкі купецкі двор з царквою св. Пятра быў у Ноўгарадзе. Тавары захоўваліся ў храме ў скрынях і бочках і памячаліся спецыяльнымі знакамі (Рыбина Е. А. Иноземные дворы в Новгороде XII–XVII вв. М., 1986. С. 104). Цікава, што і ў Полацку галоўным грамадскім месцам і складам нямецкай абшчыны (гандлярскай факторыі) быў каталіцкі храм (Сагановіч Г. Ганза // Вялікае княства Літоўскае: Энцыкл. Мінск, 2005. Т. 1. С. 494). Недастаткова распрацаваная тэма «Полацк і Ганза», «Ганза і Беларусь» заслугоўвае спецыяльнай самавітай манаграфіі, якая можа быць карыснай і для скарыназнаўства.

XVI ст., паводле Фолі, купецкімі знакамі карыстацца перасталі, паколькі гандаль узяла ў свае рукі невялікая колькасць гандлёвых дамоў, якія мелі спецыяльныя таблічкі са сваімі знакамі. «Купецкія знакі, — заўважае Фолі, — у цяперашні час можна бачыць адно на будынках, што былі колісь уласнасцю гэтых купцоў, ды на намагільных камянях»[149]. Вядома ж, гэта пераважна, калі не выключна, датычыць добраўпарадкаванай і адносна стабільнай Заходняй Еўропы — у нас жа з такой далёкай мінуўшчыны, бадай, не захавалася ні купецкіх старадаўніх будынкаў, ні тым больш магіл негацыянтаў.

І яшчэ адну заўвагу Фолі мусім занатаваць: «У тых выпадках, калі купца ўдастойвалі герба, знак ставіўся на шчыце»[150]. Гэта каштоўна для нас, бо скарынаўскія сімвалы якраз на геральдычных шчытах.

Шэраг звестак пра мяшчанскія знакі паведамляюць польскія даследчыкі. Геральдыст пачатку XX ст. У. Сямковіч рэзка аддзяляў іх ад шляхецкіх гербаў, абапіраючыся на выпрацаваны тагачаснай навукай і практыкай крытэрый. «Бо гэтым крытэрыем, — сцвярджаў ён, — не з'яўляюцца толькі вонкавы бок знака і нават прыкметы яго спадчыннасці; мелі пячаткавыя знакі, нават ужо часткова спадчынныя, польскія ваяры [milesi] у XIII ст., мела свае знакі, т. зв. гмеркі, наша мяшчанства ў XIV і XV ст., аднак эмблемы гэтыя гербамі назваць нельга»[151]. Галоўны крытэрый, паводле Сямковіча, заключаўся ў саслоўным падыходзе: «Герб на Захадзе і ў Польшчы ёсць адзнака прыналежнасці да шляхты як прывілея-

---

[149] Фоли Дж. Энциклопедия знаков и символов. С. 246.

[150] Тамсама.

[151] Semkowicz W. Braterstwo szlachty polskiej z bojarstwem litewskim... S. 415.

ванага і замкнёнага ў сабе стану. Толькі шляхціц можа валодаць гербам, хто яго не мае, не ёсць шляхціц»[152]. Эвалюцыю ад простых старажытных схематычных знакаў да спадчынных гербаў даследаваў сучасны літоўскі гісторык Э. Гудавічус у спецыяльнай манаграфіі «Меткі ўласнасці і знакі ў Літве XII–XX ст.» (1980)[153].

Звесткі пра існаванне гербавых ці, дакладней, гербападобных знакаў у старадаўнім беларускім мяшчанска-купецкім асяроддзі знаходзім у вядомага нашага геральдыста А. Цітова. Вось што ён піша пра гэта ў артыкуле «Загадка герба Францішка Скарыны»: «У фармальным сэнсе ўвогуле яны не гербы, хоць і размяшчаюцца на геральдычных, турнірных шчытах (тарках). Выявы асабістых клейнаў былі ў тыя часы таксама ўласнараспазнаўчымі знакамі і мелі тую ж ролю, што і шляхецкія гербы, клейны, пярсцёнкі. Яны былі ва ўжытку бюргерства і нават сялянства. Клейны як уласнараспазнаўчы сродак перадаваліся ў спадчыну. Часам сыны дадавалі да іх адну ці дзве рысачкі, каб мелася адрозненне ад бацькоўскага клейна ці іншых жывучых асобна дарослых з той жа сям'і. Незалежна ад саслоўнага становішча ўладальніка, клейны ў паўсядзённым жыцці часта зваліся гербамі. Больш таго, некаторыя з іх з цягам часу набылі нязменны выгляд і сталі гербамі. Іншыя, у сувязі з ваеннымі ліхалеццямі, эканамічным заняпадам уладальнікаў, згубіліся ў нетрах гісторыі»[154].

---

[152] Тамсама. S. 415–416.

[153] Gudavičius E. Žymenys ir ženklai Lietuvoje: XII–XX a.: Apybraiža. Vilnius, 1980.

[154] Цітоў А. Загадка герба Францішка Скарыны // Полацак. 1991. № 4. С. 10–11.

У працах гісторыкаў трапляюцца згадкі пра адмысловыя знакі, якімі маркіравалі свае вырабы беларускія рамеснікі, у прыватнасці, металісты і ювеліры[155]. Ды, на жаль, гэта скупыя, адрывістыя звесткі.

Даследчыкі слушна мяркуюць, што вывучэнне мяшчанскай геральдыкі Беларусі застаецца на сёння актуальнай задачай. А. Шаланда ў канцэптуальным артыкуле, прысвечаным гэтаму пытанню, паўтарыў надзвычай важную для нас думку, «што нераспрацаванасць мяшчанскай геральдыкі ВКЛ спрыяла або недакладнай, або зусім памылковай расшыфроўцы геральдычнай інфармацыі з гравюраў Ф. Скарыны»[156].

Але ўжо сёння не даводзіцца сумнявацца ў шырокім распаўсюджанні ў скарынаўскі час у купецкім, мяшчанскім асяроддзі асабістых знакаў-клейнаў (Шаланда прапануе называць іх «гербікамі»), якія, у адрозненне ад шляхецкіх гербаў, насілі спецыфічны, нефармальны характар. А паколькі Скарына меў падтрымку найперш у гарадах, то знакі некаторых грашавітых купцоў-фундатараў свабодна маглі трапіць у выданні нашага першадрукара.

Так або інакш, геральдыка, як шляхецкая, так і мяшчанская, мае першараднае значэнне для даследавання Скарынавай сімволікі, прадстаўленай на «аўтапартрэце» і ілюстрацыях да Бібліі, для крытычнай праверкі версій аб яго паплечніках і дзелавых партнёрах.

---

[155] Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Минск, 1966. С. 108.

[156] Шаланда А. Мяшчанская геральдыка ВКЛ у XV–XVIII ст.: да пастаноўкі праблемы // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Białystok, 2003. № 19. S. 233.

2. Што азначаюць скарынаўскія сімвалы на ілюстрацыях?

Вялікае значэнне для нашага даследавання мае пытанне аб аўтарстве ілюстрацыйнага матэрыялу ў скарынаўскіх выданнях.

Сапраўды, хто стварыў усё гэтае багацце сюжэтных гравюр, заставак, буквіцаў? Хто распрацаваў непераўзыдзеныя і дагэтуль скарынаўскія шрыфты? У чыёй душы зарадзілася-ўзнікла гэтая велічная прастата і гармонія? Хто рабіў папярэднія малюнкі і рэзаў па іх гравюры, забяспечыўшы самы высокі ўзровень мастацкага афармлення кніг? І, нарэшце, што даюць даследчыкам у гэтых адносінах сігнет і іншыя сімвалы скарынаўскіх выданняў, якія ў іх функцыі? Што ў рэшце рэшт азначае іх прысутнасць (у адзіночку, як нярэдка выступае сігнет, або гарманічнаю параю — сігнет і «трохкутнік») на ілюстрацыях?

Скарыназнаўцы адказваюць на гэтыя пытанні па-рознаму.

Г. Галенчанка, гаворачы пра ілюстрацыйнае багацце скарынаўскіх выданняў, схільны называць сігнет Скарыны «выдавецкім знакам». Працытуем яго каментарый да факсімільнага выдання Скарынавай Бібліі: «Кнігі багата ўпрыгожаны шматлікімі ілюстрацыямі (44 гравюры з 38 дошак). Усе ксілаграфіі, акрамя „партрэта Скарыны" ў кнігах „Ісус Сірахаў" і „Царствы", дапасаваны да тэксту ў Бібліі. Некаторыя з іх (як і асобныя ініцыялы) маюць „выдавецкі знак" Скарыны — сонца і наплываючы на яго месяц»[157].

[157] Галенчанка Г. Археаграфічны каментарый // Біблія: Факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынам у 1517–1519 гадах: У 3 т. Мінск, 1991. Т. 3. С. 781.

Праўда, як бачым, даследчык ставіць вызначэнне «выдавецкі знак» у двухкоссе, як бы надаючы яму статус умоўнасці.

Шэраг даследчыкаў (Л. Баразна, А. Белы, у пэўнай ступені В. Ластоўскі і інш.) лічылі або лічаць у наш час Скарыну аўтарам усіх ці пераважнай большасці малюнкаў у яго кнігах. Адпаведна знакаміты сігнет Маладзіковае Сонца прымаецца ў такім выпадку за манаграму мастака і больш таго — за бясспрэчны доказ аўтарскай прыналежнасці той або іншай ілюстрацыі Скарыну. Цікава, што падобнае дапушчэнне рабіў нават такі дасведчаны і абачлівы даследчык-кнігазнавец, як Я. Неміроўскі. Уважліва разгледзеўшы ў сваёй фундаментальнай кнізе «Францыск Скарына» (параграф «Выдавецкі знак») выпадкі частага выкарыстання сігнета Скарыны ў ілюстрацыях, ён канстатаваў, што ролю выдавецкага знака выява сонца і месяца выконвае па сутнасці толькі ў трох Скарынавых кнігах: «Ісуса Сірахава» і «Царстваў», дзе гэты знак адлюстраваны на партрэце, які непасрэдна суседнічае з пасляслоўем, і ў кнізе «Быццё», дзе знак знаходзіцца на тытульным лісце. Выдавецкі знак, на думку вучонага, звычайна змяшчаюць у кнізе ўсяго адзін раз, а ў кнігах Скарыны ён, як правіла, сустракаецца два-тры, а то і больш разоў. У кнігах «Царстваў», паводле Неміроўскага, мы знаходзім выяву сонца і месяца на партрэце Скарыны, на дзвюх фігурных гравюрах, на чатырох застаўках, а ўсяго ажно 7 разоў. Адсюль вывад: «Усё гэта прымушае нас усумніцца ў тым, што выява сонца і месяца — выдавецкі знак Францыска Скарыны. Хутчэй за ўсё гэта знак мастака, у якім мы можам бачыць самога беларускага асветніка»[158].

---

[158] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность... С. 272.

Пераканана падтрымаў ідэю аўтарскай прыналежнасці Скарыну ўсяго багацця мастацкага афармлення пражскіх і віленскіх выданняў 1517–1525 гадоў мастак В. Асташонак у артыкуле «Над Скарынавай кнігай» (1988). У прыватнасці, ён пісаў з пэўнай доляй патэтыкі: «Немагчыма ўявіць сабе, што аўтар гэтых выдатных твораў (калі б ім быў нехта іншы, а не Скарына) пажадаў застацца інкогніта (і гэта ў эпоху Адраджэння!) і не рабіў бы спробы зацвердзіць сваё аўтарства, а на ўсіх гравюрах адлюстроўваў герб свайго заказчыка-кнігавыдаўца. Ці можна паверыць, што гэты мастак — чэх ці немец, як лічаць некаторыя даследчыкі, — так самааддана, у дадатак з добрым веданнем беларускага матэрыялу, працаваў на чужую для яго культуру? Ці можна паверыць, што імя гэтага мастака магло „згубіцца" ў гісторыі мастацтва Еўропы?»[159] І рабіў выснову: «... настаў час вызначыць Скарыну тое месца ў гісторыі мастацкай культуры Беларусі і Еўропы, якое яму па праву належыць. Пара ўвесці ў навуковы і культурны ўжытак паняцце: Францыск Скарына — вялікі беларускі мастак эпохі Адраджэння»[160].

Аднак многія іншыя даследчыкі, і такіх, мусіць, большасць, усё ж бачаць побач са Скарынам іншага мастака-гравёра, які афармляў кнігі, ці нават некалькі такіх мастакоў. Напрыклад, у рэцэнзіі на альбом «Гравюры Скарыны» Лявона Баразны, надрукаванай у 1975 годзе ў «Запісах» замежнага Беларускага інстытута навукі й мастацтва, С. Брага (В. Тумаш) не пагадзіўся з поглядам Баразны «як вельмі спрэчным», што мастак, «які рысаваў усе праскія дрэва-

[159] Асташонак В. Над Скарынавай кнігай: Да 500-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны // Беларусь. 1988. № 9. С. 25.

[160] Тамсама.

рыты Скарынавых выданьняў, колькідзесят іх заставіцаў ды соткі аздобных ініціялаў, гэта сам доктар Скарына. Думку гэтую, — працягваў рэцэнзент, — ціраз выказвалі, яшчэ ад мінулага стагодзьдзя, і аўтары іншыя, хоць ніякіх канкрэтных на гэта довадаў ніхто ніколі не прывёў»[161]. Выказваючы нязгоду з такім падыходам, Тумаш спасылаўся на вядомую манаграму МТЗ (МЗ) у левым ніжнім куце Скарынавага партрэта як ужо несумненную мастакоўскую манаграму. На думку Тумаша, гэты манаграміст (на жаль, канкрэтна даследчыкамі так і не ідэнтыфікаваны) быў не толькі аўтарам партрэта, але і «адзіным, ці, найменш, галоўным мастаком друкаваных у Бібліі дрэварытаў ды заставіцаў»[162].

Збалансаваны пункт погляду спрабуюць знайсці аўтары энцыклапедычнага даведніка «Францыск Скарына і яго час». У змешчаным там артыкуле «Ілюстрацыі ў выданнях Ф. Скарыны» В. Шматаў піша: «Паводле стылю яны (ілюстрацыі. — *Г. К.*) не аднолькавыя. Даследчыкі (М. Шчакаціхін, Л. Баразна) вылучаюць некалькі стылістычных груп, што сведчыць аб выкананні іх некалькімі майстрамі, на партрэце Скарыны адзін з іх пакінуў сваю манаграму (маецца на ўвазе ўсё тая ж манаграма МЗ або МТЗ. — *Г. К.*). Астатнія творы ананімныя. Многія ілюстрацыі пазначаны гербам-сігнетам Скарыны, што сведчыць пра непасрэднае дачыненне першадрукара да гэтых твораў. Бясспрэчна, Скарына быў асноўным ініцыятарам ілюстравання сваіх выданняў, арганізатарам усіх работ у сваёй (або арандаванай) друкарні, а магчыма, і аўтарам асобных малюнкаў да гравюр, кампазіцый; яму на-

---

[161] Запісы. Нью-Йорк, 1975. Т. 13. С. 107.
[162] Тамсама.

лежаць усе подпісы да ілюстрацый»[163]. Такім чынам, на думку Шматава, сігнет сведчыць пра непасрэднае дачыненне Скарыны да ілюстрацый, але пераважна на ўзроўні ідэй, ініцыятывы і арганізацыі работы. Размова працягваецца ў артыкуле «Манаграма» (аўтары В. Дышыневіч, М. Ткачэнка, В. Шматаў), дзе выказваецца думка, што манаграміст МЗ (МТЗ) быў гравёрам партрэта, а не яго мастаком-малявальшчыкам. «Апрача партрэта Скарыны, — гаворыцца ў артыкуле, — ён, магчыма, выканаў шэраг манументальных дрэварытаў: „Юдзіф і Агаферн", „Плач Ераміі", „Самсон і леў", „Эсфір перад Асферам" і інш. Усе яны адзначаны друкарскім сігнетам Скарыны — выявай сонца і месяца, што сцвярджае аўтарскія правы Скарыны на гэтыя творы (нават калі ён не прымаў асабістага ўдзелу ў выкананні, а запрасіў да сябе манаграміста ці заказаў яму ілюстрацыі)»[164]. Праблемай «аўтарскіх правоў» тлумачаць з'яўленне герба-сігнета Скарыны на гравюрах яго выданняў У. Конан і В. Шматаў у артыкуле пра гравюру «Асада Іерусаліма» ў гэтым самым энцыклапедычным даведніку.

Сваё разуменне пытання выказвае В. Чамярыцкі ў абагульняльным артыкуле для біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменнікі»: «Шмат якія гравюры і застаўкі скарынаўскіх выданняў пазначаны яго асабістым знакам-сігнетам, своеасаблівым гербам — змешчанай на шчыце выявай сонца і сярпа месяца з чалавечымі тварамі, што сімвалізуе кнігу як крыніцу мудрасці, ведаў, асветы, адраджэння. Сігнет указвае таксама на аўтарскую належнасць

[163] Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. С. 343.
[164] Тамсама. С. 403.

Скарыне гэтых твораў мастацтва і саміх выданняў, у якіх яны змешчаны»[165].

Думаецца ўсё ж, што сігнет сцвярджаў хутчэй уладальніцкія, а не аўтарскія правы на ілюстрацыі. Правы перакладчыка-наватара, выдаўца-ўладальніка, чалавека, які даваў сваё імя ўсяму выдавецкаму праекту, а не аўтара ілюстрацый у поўным сэнсе слова. Нельга не пагадзіцца, што Скарына ў любым выпадку прымаў непасрэдны ўдзел у афармленні сваіх выданняў, асабліва на папярэднім этапе афарміцельскай працы — ставіў задачу, праектаваў шрыфты (прынамсі, фармуляваў канцэпцыю шрыфтоў), рабіў першапачатковыя накіды малюнкаў, быў генератарам творчых ідэй, аднак даводзілі (калі не сказаць выконвалі) малюнкі і рэзалі гравюры хутчэй за ўсё іншыя (на гэта ўказвае розная манера выканання; ды і, шчыра кажучы, хапала ў Скарыны іншых клопатаў па перакладзе і выданні Бібліі). Так што сігнет з сонцам і паўмесяцам — усяго толькі асабісты знак Скарыны як кіраўніка і натхняльніка манументальнага выдавецкага праекта, у аснове якога ляжала яго карпатлівая і адказная творчая праца перакладчыка. Умоўна сігнет можна назваць і выдавецкім знакам, хаця функцыі яго шырэйшыя — і гэта выдатна паказаў Я. Неміроўскі. На гэтым знаку адбітак выключнай творчай індывідуальнасці Скарыны, якому ў вышэйшай ступені было ўласцівае пачуццё гонару і радасці за вялікую гістарычную справу, да якой яму выпала спрычыніцца, і за свой далёка не шараговы ўдзел у гэтай справе.

У тыя часы, як вядома, гравюрныя дошкі вельмі цаніліся і пераходзілі ад аднаго друкара да другога. Ужо не гаворым пра

---

[165] Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўн. Мінск, 1995. Т. 5. С. 332.

звычайную практыку запазычання сюжэтаў і кампазіцыйных рашэнняў. Наяўнасць на гравюры Скарынавага знака даказвае найперш або як мінімум тое, што яна, дадзеная гравюра, выконвалася спецыяльна для Скарыны, па яго замове, хаця і ў гэтым выпадку зусім правамернае пытанне пра сюжэтныя запазычанні, першаўзоры і г. д. Украінскі гісторык старадаўняй кніжнай справы М. Макаранка ў працы «Арнаментацыя ўкраінскай кніжкі XVI–XVII ст.» (1926) справядліва адзначаў: «У выданнях Фр. Скарыны маем ілюстрацыі з дэкаратыўнымі элементамі (вызначэнне не самае ўдалае — размова пра скарынаўскую сімволіку. — *Г. К.*); гэтыя элементы сведчаць пра тое, што згаданыя ілюстрацыі былі скампанаваны і выкананы па замове самога выдаўца — Скарыны, для яго выданняў. Так, у чацвёртай кніжцы Царстваў (Біблія) на малюнку, падпісаным так: „Навходносор царь Вавилонский Добывает Ерусалима" (больш ходкая цяпер сціслая назва: «Асада Іерусаліма». — *Г. К.*), бачым звычайны сюжэт сярэднявечнага баявога проціборства пад харугвамі; на харугвах — герб самога выдаўца Скарыны (сонца, з'яднанае з месяцам). Той самы герб бачым у кнізе „Лічбы" на гравюры „Людие Израилевы с полки своими около храму божия" (пашыраная сёння адаптаваная назва «Ізраілевы палкі ля храма». — *Г. К.*). Вось жа тут мы на свае вочы бачым, як ствараюцца самі гэтыя аздобы, і маем пэўную падставу гаварыць, што гэтыя ілюстрацыі тут жа і скампанаваны, а не прыйшлі сюды з іншага месца разам з запазычаным сюжэтам, з яго апрацоўкай ды тэхнікаю выканання»[166]. Пра гэта ж пісаў гісторык медыцы-

[166] Макаренко М. Орнаментация української книжки XVI–XVII ст. Київ, 1926. С. 212–213.

ны Рыгор Кручок у юбілейным зборніку «450 год беларускага кнігадрукавання» (1968): «Прыналежнасць амаль усіх ілюстрацый Скарыне як заказчыку відавочная, паколькі на іх стаіць герб Скарыны, на якім намаляваны сонца, месяц ... »[167]. Падобнай плённай, канструктыўнай думкі прытрымліваўся і рускі славіст, гісторык кнігадрукавання Аляксандр Сяргеевіч Мыльнікаў, які заўважыў у сваёй манаграфіі «Чэшская кніга: нарысы гісторыі» (1971): «Яркая індывідуальнасць кніжнай ілюстрацыі Ф. Г. Скарыны нібыта падкрэсліваецца на гравюрах выявай яго герба — сонца і месяца, якія нязменна паўтараюцца. Усё гэта сведчыць пра тое, што Скарына не механічна выкарыстоўваў гравюры з выданняў падобнага кшталту, а спецыяльна заказваў іх (каму? дзе?) для сваіх кніг»[168].

У сціслай форме гэтую ж думку сфармуляваў В. Шматаў: «... многія гравюры пазначаны ўласным гербам Скарыны — сведчаннем іх прыналежнасці заказчыку»[169] (адначасова слушна сцвярджаецца: «... большасць ілюстрацый — вынік творчага супрацоўніцтва Скарыны з гравёрамі-выканаўцамі»[170]).

Такім чынам, Скарына — заказчык, Скарына — дбайны, дальнабачны выдавец, які побач з першачарговым клопатам пра змястоўнасць рупіцца пра паліграфічна-мастацкую адметнасць сваіх выданняў, Скарына — арганізатар мастацкага афармлення выдаваных кніг і адначасова як аўтар перакладу галоўны гаспадар-распарадчык усяго выдавецкага праекта

---

[167] 450 год беларускага кнігадрукавання. С. 383.

[168] Мыльников А. С. Чешская книга: очерки истории. М., 1971. С. 89–90.

[169] Шматаў В. Мастацтва беларускай кнігі XV — сярэдзіны XVI ст. // Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990. С. 466.

[170] Тамсама. С. 467.

і яго вынікаў[171], — вось пра што сведчыць найперш адбітак яго сігнета на ілюстрацыях. У рэшце рэшт Скарына даў сваё імя ўсяму бліскучаму праекту і вельмі клапаціўся, каб гэтую акалічнасць заўважылі яго сучаснікі і нашчадкі.

Калі перайсці да Т-знака, то яшчэ ў 1864 годзе бліскучы мастацтвазнаўца Уладзімір Васільевіч Стасаў цвёрда вырашыў, што гэты знак не можа быць манаграмай гравёра. Доказ той самы, што прыводзіўся пазней і Тумашам (мы пра гэта ўжо згадвалі), — на Скарынавым партрэце манаграма мастака ўнізе злева, а Т-знак каля галавы выконвае іншую функцыю. Але якую? Тут Стасаў вагаўся: «Відавочна, яна (манаграма з «трохкутнікам». — *Г. К.*) мае прамое дачыненне да асобы Скарыны ці аўтара карцінак»[172]. У апошнім выпадку было толькі вельмі няпэўнае дапушчэнне.

Між тым і дагэтуль знаходзяцца даследчыкі, якія на ўсе сто працэнтаў звязваюць Т-знак з аўтарствам гравюр скарынаўскіх выданняў. Так, калекцыянер і мастацтвазнаўца Анатоль Белы лічыць гэты знак радавым знакам Скарыны і адначасова — побач з сігнетам — яго манаграмай як мастака-рысавальшчыка і гравёра, ці не адзінага афарміцеля ўсіх сваіх выданняў. Змяшчэнне на ілюстрацыях герба-сігнета і Т-знака («Вáгі»), на думку А. Белага, «безумоўна, сведчыць аб сцвярджэнні аўтарскіх праў першадрукара на гэтыя творы»[173].

Варшаўскі мастацтвазнаўца Вальдэмар Дэлюга ў артыкуле «Францыск Скарына і габрэйскія друкары ў Пра-

---

[171] Відаць, аддалена ролю Скарыны ў чымсьці можна параўнаць і з роллю дырыжора або рэжысёра, тым больш калі гэты рэжысёр ставіць фільм па ўласным сцэнарыі.

[172] Отчет о седьмом присуждении наград графа Уварова... С. 31.

[173] Белы А. Партрэты Скарыны // Полымя. 1990. № 7. С. 196.

зе» (2000) адзначае: «Пяць гравюр і тытульная старонка да Бібліі Скарыны пазначаны двума гмеркамі (штэмпелямі родавых гербаў [удакладненне перакладчыка]; маюцца на ўвазе адбіткі сігнета і «трохкутніка». — *Г. К.*). Трэба меркаваць, што іх аўтарам з'яўляецца адзін і той жа аўтар»[174]. Нягледзячы на стылістычную ў дадзеным выпадку неахайнасць перакладу, думка зразумелая. Як бачым, гэта пазіцыя нечым блізкая да пазіцыі Белага, г. зн. сігнет і «трохкутнік» успрымаюцца як манаграмы аднаго і таго ж мастака, прынамсі Дэлюга дае падставы для такога разумення. Адначасова даследчык паведамляе, што характэрны для пражскіх выданняў Скарыны спосаб афармлення групы гравюр з радавым гербам (у тым ліку тытульнай старонкі) мае свае аналогіі ў тагачасных габрэйскіх выданнях (на жаль, гэтае каштоўнае назіранне не канкрэтызуецца).

А. Шатэрнік, які, як мы бачылі ва ўступным раздзеле, надае скарынаўскай сімволіцы адцягнены сэнс («трохкутнік» — Тройца або Бог, «трапецыя» — карона; у выніку атрымліваецца дэвіз «Служыць Богу і Уладзе»), ніяк не пагаджаецца, што мы маем справу з фамільнымі знакамі-гербамі. «Паўстае пытанне, — піша Шатэрнік, — калі гэтыя знакі з'яўляюцца гербамі (тым больш, як мяркуюць даследчыкі, канкрэтных асобаў), то навошта Скарына так часта выкарыстоўвае іх у гравюрах на біблейскія тэмы?»[175] У адказ мы запытаемся — а чаму з сістэмы Скарынавых сімвалаў вельмі хутка выпала «трапецыя», мільгануўшы толькі адзін раз — на пар-

---

[174] Кантакты і дыялогі. 2000. № 9. С. 11. Параўн.: Deluga W. W poszukiwaniu źródeł i inspiracji ilustracji drzeworytniczych do wydań Franciszka Skoryny // Беларусіка — Albaruthenica. Мінск, 1998. Кн. 9. С. 105.

[175] Шатэрнік А. Служыў Богу і Уладзе? // ЛіМ. 1991. 31 мая.

трэце. Калі прыняць тлумачэнні Шатэрніка, выпала «Карона» і засталася «Тройца», і, такім чынам, дэвіз «Служыць Богу і ўладзе» ператварыўся ў аднабаковую, усечаную ў параўнанні з поўным варыянтам сентэнцыю «Служыць Богу».

Выпадзенне, знікненне «трапецыі», яе, скажам так, аднаразовасць, на нашу думку, з'яўляецца важным аргументам і супраць меркаванняў шматлікіх іншых даследчыкаў, якія надаюць сімволіцы Скарыны той або іншы адцягнены сэнс.

Глыбокае разуменне сітуацыі выказаў мастак і мастацтвазнаўца Юрый Піскун, які ў грунтоўным, праніклівым артыкуле пра аўтарства гравюр пражскіх выданняў Скарыны (1994) упэўнена запярэчыў тым скарыназнаўцам, хто лічыць «трохкутнік» знакам друкара або мастака. На яго думку, «такая практыка не была ўласціва тагачаснаму чэшскаму кнігадрукаванню. Прэрагатыва размяшчэння на тытуле кнігі ці ў яе тэксце буйнамаштабнага адлюстравання герба ў той час належала аўтару кнігі ці мецэнату. Характэрным з'яўляецца таксама размяшчэнне на тытульных лістах адлюстраванняў гербаў краіны і роднага горада ўладальніка друкарні, у той час як уласныя клеймы выдаўца і гравёра змяшчаліся так, што не вельмі кідаліся ў вочы, — яны былі дробнага памеру і падаваліся без гербавага шчыта»[176].

Мы перакананы, што «трохкутнік» не мастакоўскі знак (як і Маладзіковае Сонца), а знак яшчэ аднаго ўдзельніка вялікага асветніцкага праекта па выданні Бібліі на «рускай» (беларускай) мове. Удзельніка крыху іншага плана, чым мастак. Як вядома, галоўным рухавіком праекта быў сам

[176] Піскун Ю. А. Гравюры пражскіх выданняў Скарыны: пытанне аўтарства // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. С. 36–37.

Скарына (яго сігнет — Маладзіковае Сонца). Але яму для здзяйснення смелай задумы патрэбны былі яшчэ фундатары, знакамі якіх, мяркуем, былі «трохкутнік» і «трапецыя». Ужо даводзілася пісаць[177], што само размяшчэнне гэтых знакаў абапал галавы Скарыны, над яго плячамі, пралівае святло на статус іх носьбітаў. Яны — паплечнікі, людзі, што стаяць поплеч. Скажуць, што такога слова няма ў «Слоўніку мовы Скарыны». Ды ці было яно ў скарынаўскія часы наогул, ці не надаю я гэтаму слову сучасны сэнс? Але ж слова было, і акурат на Полаччыне. Зазірнём у каштоўную першакрыніцу XVI ст. — апісанне полацкай рэвізіі 1552 года. Там, у прыватнасці, апісаны полацкія ўмацаванні і павіннасці гараджан-месцічаў па наглядзе за гэтымі ўмацаваннямі. На кожную частку гарадской сцяны (так званую гародню[178]) прызначаўся старшы, якому падпарадкоўвалася некалькі «паплечнікаў». Для пераканаўчасці пададзім невялікі фрагмент:

«Подле тое городня Петра Слепого с поплечники его.

Подле тое городня Осташка Мелешковича с Тросницы с поплечники его.

Подле тое две городни ковалов конюшенских.

Подле тых городня Семена Савича с поплечниками его с Пятницкое улицы»[179].

Фіксуецца слова «поплечникъ» са значэннем «паплечнік, таварыш па справе, саўдзельнік, кампаньён» і ў чарговым 26-м выпуску «Гістарычнага слоўніка беларускай мо-

---

[177] Кісялёў Г. Францыск Скарына: загадкі партрэта // Роднае слова. 2006. № 3. С. 99.

[178] Інакш — гарадня. Гл.: Ткачоў М. А. Гародня, гарадня // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мінск, 1993–2003. Т. 2. С. 489.

[179] Полоцкая ревизия 1552 года, изд. И. И. Лаппо. М., 1905. С. 9.

вы», які выйшаў зусім нядаўна ў выдавецтве «Беларуская навука». У слоўніку прыводзяцца шматлікія характэрныя прыклады адпаведнага ўжывання слова са спасылкамі на гістарычныя крыніцы 1501, 1539, 1540, 1552 і іншых гадоў.

Слова ёсць таксама ў польскай мове, якой Скарына, несумненна, выдатна валодаў як колішні кракаўскі студэнт. Да таго ж паміж блізкімі мовамі ішоў інтэнсіўны абмен у формах і выразах, што адбілася і на тэкстах Скарыны[180]. Цікава, што міні-артыкул пра слова, якое прыцягнула нашу ўвагу, знаходзім у вядомай «Старапольскай энцыклапедыі» З. Глогера. Вось у перакладзе яго поўны тэкст: «Poplecznik. Даўнія польскія рубакі, калі толькі мелі плечы, заслоненыя таварышам, не лічыліся з колькасцю праціўнікаў і смела з імі біліся. Таварыш, што засланяў ваяра ззаду, зваўся паплечнікам, і выраз гэты стасавалі пазней да кожнага, хто падтрымліваў кагосьці ці то шабляй, ці словам, ці клопатамі ў якой-небудзь справе»[181].

Такім чынам, слова «паплечнік», як і самі стасункі ў пэўных сферах жыцця, якія пазначаліся гэтым словам, былі звыклыя для Скарыны і яго сучаснікаў. Такімі ж «паплечнікамі» былі для Скарыны фундатары. І гэта наш асветнік паспрабаваў паказаць графічна на «аўтапартрэце». Так што, паводле нашага перакананння, цэнтральнай ідэяй партрэта была не генеалагічная ідэя або праграма (Скарына і яго бацькі), як мяркуюць шаноўныя геральдысты А. Цітоў і А. Шаланда, а ідэя партнёрства (Скарына і паплечнікі).

---

[180] Булахов М. Г. Отражение 500-летнего языкового опыта славян в изданиях Ф. Скорины // Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя: Матэр. міжнародн. кангрэса. Мінск, 1998. Кн. 1. С. 18.

[181] Gloger Z. Encyklopedia staropolska. Warszawa, 1978. T. 4. S. 95.

Мяркуючы па партрэце, галоўных паплечнікаў-фундатараў было два — знакам аднаго быў «трохкутнік», другога — «трапецыя». Ёсць падставы думаць, што ў 1518 годзе носьбіт «трапецыі» па нейкай прычыне выходзіць з выдавецкай суполкі. Застаюцца двое — Скарына і носьбіт «трохкутніка». З гэтага моманту наш асветнік яшчэ больш пачынае цаніць свайго кампаньёна. «Трохкутнік» побач з Маладзіковым Сонцам стаў шырока выкарыстоўвацца для аздобы ілюстрацый, зноў і зноў славячы і сцвярджаючы плённы саюз выдаўца (Скарына) і нявысветленага пакуль што фундатара, саюз навукі і капіталу, саюз гуманітарыя і фінансіста.

Такая склалася ў нас папярэдняя рабочая гіпотэза. Зразумела, яна вымагае яшчэ ўсялякай крытычнай праверкі, шматлікіх дадатковых паэтапных пошукаў і даследаванняў. Адзін з такіх кірункаў далейшай працы — рознабаковае скрупулёзнае вывучэнне Т-знака. Тым больш што матэрыялу тут у нас хапае. Прыгледзімся да гэтага адметнага скарынаўскага сімвала больш уважліва і дэталёва.

3. Назіранні за «паводзінамі» трохкутніка

Ніхто яшчэ, здаецца, не прааналізаваў больш-менш падрабязна і паслядоўна храналогію і характар выкарыстання Т-знака, або «трохкутніка», у выданнях Скарыны, як гэта зроблена даследчыкамі адносна Маладзіковага Сонца (гл., напрыклад, кнігу Я. Неміроўскага «Францыск Скарына: Жыццё і дзейнасць беларускага асветніка», параграф «Выдавецкі знак»[182]). А гэта можа даць надзвычай цікавыя і карысныя для нашага даследавання вынікі.

Пералічым у храналагічнай паслядоўнасці ўсе вядомыя выпадкі выкарыстання або з'яўлення «трохкутніка», узяўшы за аснову «Паказальнік мастацкага ўбрання пражскіх выданняў Францыска Скарыны», складзены ў свой час тым жа самым Неміроўскім[183].

Вырашэнне гэтай задачы становіцца магчымым таму, што Скарына, чалавек па-еўрапейску адукаваны, разумеў важнасць сваёй справы для гісторыі, любіў дакладную храналогію і забяспечыў зусім пэўнымі канкрэтнымі датамі большасць сваіх кніг.

Дык вось, мы ведаем, што дэбют нашага знака (яго першае публічнае з'яўленне) адбыўся 5 снежня 1517 года. Гэта дата выхаду ў свет кнігі «Ісус Сірахаў» (чацвёртае паводле храналогіі пражскае выданне Скарыны) з партрэтам выдаўца. Менавіта ў гэты дзень чытачы маглі разгледзець на партрэце першадрукара і Маладзіковае Сонца (яно з'яўлялася перад

---

[182] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность... С. 270–273.

[183] Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. С. 223–225.

гэтым не так падкрэслена на адной з заставак Псалтыра), і «трохкутнік», і «трапецыю» — цэлую сістэму сімвалаў.

У кнізе «Царствы» (10 жніўня 1518 года) знак «трохкутніка» ў тым жа самым акружэнні можна было ўбачыць зноў — на апублікаваным паўторна партрэце першадрукара.

У 1519 годзе «трохкутнік» з'яўляецца на змешчаным у кнізе «Быццё» агульным тытуле на ўсю Біблію. У звязцы са Скарынавым сігнетам, справа ад яго.

Пяць разоў «трохкутнік» надрукаваны ў недатаванай кнізе «Выхад», якую даследчыкі адносяць да 1519 года. Гэта гравюры «Узор ківота», «Узор стала», «Узор свяцільніка», «Узор трэбніка», «Узор рыз». Кожны раз у звязцы з сігнетам. У чатырох выпадках «трохкутнік» размешчаны злева, сігнет справа. І толькі на гравюры «Узор рыз» сігнет займае сваё «законнае» месца злева.

Дзве апошнія гравюры «Узор трэбніка» і «Узор рыз» (варыянт пад назвай «Сей есть Аарон») паўтораны каля гэтага часу ў кнізе «Левіт». Тамсама надрукавана гравюра «Бог і Майсей» з сігнетам і «трохкутнікам».

Гэтым жа самым часам датуецца кніга «Лічбы» з гравюрай «Ізраілевы палкі ля храма», дзе сігнет і «трохкутнік» адлюстраваны на сцягах справа (на іншых сцягах — таксама свае гербавыя знакі; больш падрабязна будзем гаварыць пра гэта ў падраздзеле «Геральдычная сюіта „Людие израилевы ..."»).

Па выданнях 1522–1525 гадоў (віленскі перыяд) карыстаемся паказальнікам Г. Галенчанкі «Арнаментальныя формы ў віленскіх выданнях Скарыны»[184]. У гэтых выдан-

[184] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 192–196.

нях «трохкутнік» прадстаўлены, па сутнасці, на адной застаўцы: пасярэдзіне яе на чорным фоне арнаментальныя шчыты — злева сігнет, справа Т-знак, які набыў новы выгляд: верхнюю перакладзіну таксама завяршаюць трохкутнікі. Але выкарыстоўвалася гэтая застаўка шмат разоў, прычым вельмі вынаходліва і разнастайна, што называецца, на ўсю поўніцу: то станавілася верхняй або ніжняй формай тытульных аркушаў (Псалтыр у «Малой падарожнай кніжцы», каля 1522; «Апостал», 1525), то проста як застаўка (8 разоў у трэцяй і чацвёртай частках «Апостала»). На тытулах Псалтыра і пасланняў апостала Паўла гэтая форма знізу, на агульным тытуле «Апостала» зверху, прычым у перакуленым выглядзе («трохкутнік» апынуўся злева, сігнет справа).

Цікава, што гэтая застаўка, як і некаторыя іншыя ілюстрацыйныя матэрыялы Скарыны, выкарыстоўвалася віленскімі друкарамі яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў пасля спынення дзейнасці Скарыны. У прыватнасці, вядома, што гэтая застаўка надрукавана ў 1596 годзе ў «Грамматике Словенской» Л. Зізанія, выпушчанай у Вільні брацкай друкарняй[185]. Трэба думаць, што адлюстраваныя на застаўцы сімвалы хутчэй за ўсё ўспрымаліся ў такіх выпадках ужо чыста дэкаратыўна і толькі для асабліва абазнаных яны былі жывым напамінкам пра папярэднюю бліскучую эпоху Скарыны[186].

---

[185] Анушкин А. Во славном месте Виленском: Очерки из истории книгопечатания. М., 1962. С. 101.

[186] Наўрад ці можна пагадзіцца з думкай (Шматаў В. Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI–XVIII стагоддзяў. Мінск, 1984. С. 61), што Л. Зізаній свядома падкрэсліваў тым самым арыентацыю на скарынаўскія традыцыі.

Выяўляем агульныя заканамернасці ў «паводзінах» Т-знака:

1. Гэты знак выкарыстоўваўся Скарынам на працягу ўсёй друкарскай дзейнасці як у Празе, так і ў Вільні.

2. «Трохкутнік» ніколі не з'яўляецца адзін. Можна сказаць, па сваім характары ён быў «кампанейскім». Заўсёды яму спадарожнічае сігнет, а на партрэце і знак «трапецыі». Мяркуючы па тым, як гэтыя сімвалы размяшчаліся, сігнет, «трохкутнік» і «трапецыя» — знакі аднаго ўзроўню (хіба толькі на партрэце і памерамі, і месцам размяшчэння падкрэслена цэнтральная роля сігнета). Аднак, у адрозненне ад «трохкутніка» і «трапецыі», сігнет у многіх выпадках з'яўляецца самастойна, без «світы». Таму сонца з маладзіком зусім справядліва лічыцца асабістым знакам (ці прынамсі галоўным асабістым знакам) Скарыны (не кажучы пра асабліва глыбакадумную змястоўнасць самой выявы сігнета).

3. Знак «трохкутніка» меў схільнасць на працягу часу змяняцца, што заўважана ўжо І. Лялевелем. Зыходнымі можна лічыць яго абрысы на партрэце. Мы маем тут справу з так званым лінейным (схематычным) варыянтам. Па сутнасці, выява зводзіцца тут да пяці простых ліній: тры складаюць трохкутнік, да іх дадаюцца гарызантальная лінія зверху і вертыкаль-медыяна, якая дзеліць трохкутнік папалам. Такую фігуру можна лёгка намаляваць нават з заплюшчанымі вачыма. Гэты вельмі гарманічны, у пэўным сэнсе элементарны знак мог узнікаць у гісторыі чалавецтва шмат разоў пры самых розных нагодах і акалічнасцях. У кнігах па гісторыі пісьменнасці мне даводзілася сустракаць дакладна гэткі ці амаль гэткі знак як старажытнаіндыйскую літарную лігатуру або ў іншым выпадку як графему крыцкага «лінейнага пісьма» II тысячагод-

дзя да н. э.[187] М. Шчакаціхін у свой час бачыў «нешта падобнае» на старажытнаяўрэйскіх талісманах, рэпрадукаваных у французскамоўнай кнізе «Прымхі народаў свету», выдадзенай у Амстэрдаме ў канцы XVIII ст. У лісце да скарыназнаўца А. Флароўскага 1936 года А. Луцкевіч паведаміў, што знайшоў знак, блізкі да Скарынавага «трохкутніка» ці цалкам аналагічны яму, сярод астралагічных знакаў[188]. Пачынаючы з І. Лялевеля робяцца больш-менш удалыя спробы адшукаць аналогіі ў геральдычных сістэмах і г. д.

Між іншым у японцаў і цяпер ёсць графема, якая амаль паўтарае скарынаўскі знак. Ці не адзінае адрозненне — вертыкальная лінія даўжэйшая і працінае трохкутнік наскрозь, выступаючы канцамі-патарчакамі зверху і знізу. І што самае цікавае — гэты іерогліф мае два значэнні: «кніга» і «пачатак»![189] Здаецца, поўная адпаведнасць Скарынавай сітуацыі. І тым не менш, канешне ж, гэта ўсяго толькі выпадковае супадзенне.

Так што гэты просты і гарманічны знак можа выклікаць шмат самых розных асацыяцый. І вось па нейкай прычыне (мы якраз яе і даследуем) гэты знак трапіў у выданні Скарыны.

У Скарынавых выданнях адбываліся метамарфозы знака, найперш мяняліся памеры і адпаведна суадносіны розных яго элементаў. У параўнанні з партрэтам на агульным

---

[187] Гриневич Г. Праславянская письменность. М., 1993. Т. 1. С. 313–314; Дирингер Д. Алфавит: Пер. с англ. М., 1963. С. 97.

[188] Скарыніч. Мінск, 2002. Вып. 5. С. 22.

[189] Фельдман-Конрад Н. И. Японско-русский учебный словарь иероглифов. М., 1977. С. 306. У Японію гэты іерогліф трапіў у вельмі даўнія часы з Кітая, дзе азначае сёння «корань, аснова, крыніца, сшытак, выданне, адбітак». Гл.: Русско-китайский и китайско-русский словарь. М., 2000. С. 167.

тытуле Бібліі сам трохкутнік трохі змяншаецца адносна іншых элементаў знака, «зніжаецца ростам» (даходзіць да дзвюх трэцяў вышыні вертыкалі), маленькія трохкутнічкі з'яўляюцца па краях верхняй перакладзіны. Гэты працэс завяршаецца ў віленскіх выданнях. Зыходны трохкутнік дастае тут толькі да паловы вертыкалі, насустрач яму зверху цягнуцца даволі вялікія трохкутнікі, што ўтварыліся па краях перакладзіны. Знак можа разглядацца ўжо як сістэма з трох трохкутнікаў: ніжні большы, верхнія меншыя. Ці нават сістэма з чатырох прыблізна роўных трохкутнікаў, калі ніжні, раздзелены вертыкаллю, прыняць за два. Што да выкарыстання ў кнігах «Выхад», «Левіт» і «Лічбы», то тут яго выява блізкая да зыходнай (на партрэце). Толькі, можа быць, лініі сталі таўсцейшыя, больш пазначыліся звернутыя ўніз вострыя канцы верхняй перакладзіны (якія, як мы бачылі, мелі тэндэнцыю ператварыцца ў дадатковыя трохкутнікі).

4. Часцей за ўсё Т-знак з'яўляецца ў асаблівых выпадках — на партрэце, тытулах, застаўках. Гэткім самым асаблівым выпадкам можна лічыць яго з'яўленне на сцягу ў гравюры «Ізраілевы палкі ля храма». І зусім інакш выглядае выкарыстанне гэтага знака на гравюрах у кнізе «Выхад». Справа ў тым, што гэта гравюры не столькі мастацкія, колькі тэхнічна-прыкладныя. Пачынаючы з М. Шчакаціхіна, даследчыкі кожны раз вылучаюць іх у асобную групу. Нават назвы іх гавораць самі за сябе: «Узор ківота», «Узор стала», «Узор свяцільніка» і г. д. Паказальна, што менавіта наконт гэтых гравюр Скарына палічыў неабходным даць дадатковыя тлумачэнні: «Кто бы пак межи простыми людми братии моей захотел яснее разумети, яковым обычаем был храм уделан, кивот, стол, требник, ризы жреческии, тое все вымалеванае нижей знай-

деть»[190]. Такімі словамі для лепшага засваення матэрыялу звычайна ўводзяцца ў тэкст тэхнічных, папулярных і навучальных кніг схематычныя малюнкі тлумачальнага характару. У прынцыпе — па сваім прызначэнні — гэта малюнкі такога ж кшталту, як і адпаведныя схемы, скажам, у кнізе другога нашага знакамітага земляка Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі» (1650). Можна сказаць, што гэта самыя неарыгінальныя з мастацкага боку гравюры ва ўсіх скарынаўскіх выданнях. Такія творы, даступныя і рамесніку, не дадаюць мастаку вялікага гонару і адпаведна не патрабуюць пільнай абароны як аўтарская ўласнасць. Лявон Баразна ў сваім аглядзе скарынаўскіх гравюр нават не стаў пра іх дэталёва гаварыць, а толькі пералічыў. Паводле назіранняў мастацтвазнаўцы В. Пуцко, яны ўзыходзяць да старажытнаяўрэйскіх крыніц (яўрэйскіх рукапісаў «Пяцікніжжа»)[191]. Яны — пераймальныя і ў большасці сваёй застылыя, пазбаўленыя дынамікі і руху. Таму цяжка пагадзіцца з тымі, хто мяркуе, што «трохкутнік» — манаграма мастака. Думаю, што сігнет і «трохкутнік» з'явіліся на гэтых гравюрах, каб трошкі іх ажывіць, зрабіць цікавейшымі, а заадно і яшчэ раз напомніць пра выдаўца і яго кампаньёна, быццам бы прадэманстраваць, пацвердзіць і замацаваць гэ-

[190] Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мінск, 1990. С. 163.

[191] Пуцко В. Г. Иллюстрации пражских изданий Ф. Скорины и ксилографии европейских инкунабул // Франциск Скорина — белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. Мінск, 1989. С. 186. Зрэшты, выказваліся думкі пра сувязь «прадметна-пазнавальных дрэварытаў» скарынаўскіх выданняў з нямецкімі крыніцамі (Шчакаціхін М. Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны // 400-лецце беларускага друку. С. 184, 210, 212; Шматаў В. Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI–XVIII стагоддзяў. С. 45; яго ж. Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI–XVIII стст. С. 35).

тае партнёрства, своеасаблівы тандэм. Гэта працягваецца і ў кнізе «Левіт», дзе, як мы ўжо казалі, паўторна змешчаны гравюры «Узор трэбніка» і «Узор рыз» і сюжэтная гравюра «Бог і Майсей». Апошняя, на думку спецыялістаў, таксама не з'яўляецца шэдэўрам, а наадварот «па мастацкіх якасцях саступае іншым ілюстрацыям Бібліі. Яна некалькі плоскасная ў прасторавым вырашэнні, форма выяўлена шчыльнымі штрыхамі, пакладзенымі ў розных напрамках»[192]. Яна нібы займае пераходнае месца паміж прыкладнымі і сюжэтнымі гравюрамі. Па гэтай прычыне, а часткова, магчыма, і па інерцыі яна праштэмпелявана двума знакамі — сігнетам і «трохкутнікам». У любым выпадку і гэтая гравюра не дадавала мастаку славы. Таму «трохкутнік» — наўрад ці манаграма мастака.

Паказальна, што ў кнізе «Царствы» (выйшла ў свет 10 жніўня 1518 года) змешчана яшчэ шэсць гравюр прыкладной серыі: «Узор храма», «Вобраз двух херувімаў», «Узор дома», «Узор двух слупоў», «Узор мора», «Узор дзесяці падставак». Тады — у жніўні 1518 года — не спатрэбілася аздабляць іх сігнетам і «трохкутнікам». Затое поўны набор сімвалічных знакаў (сігнет, «трохкутнік», «трапецыя») мы бачым на партрэце Скарыны, змешчаным (як мы ведаем — паўторна) у гэтай кнізе.

У 1519 годзе ў кнізе «Быццё» «трапецыя» знікае з надрукаванага там агульнага тытула да Бібліі (прынамсі, калі быць дакладным, на гэтым тытуле толькі два сімвалы, трэці шчыт, скажам так, шматзначна пустуе і наводзіць на думку, што там магла б быць «трапецыя»).

---

[192] Конан У. М., Шматаў В. Ф. «Бог і Майсей» // Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. С. 268–269.

Да гэтага ж часу адносіцца ўзмоцненае выкарыстанне «трохкутніка» (у звязцы з сігнетам) у кнігах «Выхад», «Левіт», «Лічбы».

Ці выпадковая такая храналагічная сіметрыя? Думаецца — не.

Многія даследчыкі адзначаюць сімптомы нейкага крызісу ў дзейнасці Скарыны, які прыпадае якраз на другую палову 1518 года.

Яшчэ Пётр Уладзіміравіч Уладзіміраў, аўтар першай, выдатнай манаграфіі пра Скарыну, ахарактарызаваўшы рэгулярнае выданне ранніх пражскіх кніг да жніўня 1518 года, заўважае: «Пасля гэтага хуткага з'яўлення кнігі за кнігай надыходзіць прамежак амаль у шэсць месяцаў, калі нарэшце 20 снежня 1518 года з'яўляецца невялікая кніжка Ісуса Навіна, у 48 аркушаў. Якраз гэтаксама дзіўным уяўляецца з'яўленне толькі 9 лютага 1519 года яшчэ меншай кніжкі Юдзіф, у 26 аркушаў»[193].

Пра перамены 1518 года, выкліканыя нейкімі крызіснымі з'явамі, гаворыць і беларускі даследчык Г. Лебедзеў у артыкуле «Скарына — першадрукар? Не, Скарына — першавыдавец» (1993). Вось паслухаем: «Былі ў пражскім друкаванні і зрывы, нерытмічнасць выхаду кніжак у свет, было і такое становішча, калі ўвесь пражскі перыяд 1517–1519 гг. можна смела падзяліць на два асобныя этапы з перапынкам у некалькі месяцаў (з 10 жніўня да 20 снежня 1518 года). Некаторыя, можа, і не зусім важныя прычыны гэтага перапынку можна заўважыць па саміх кніжках, выдадзеных там Ф. Скарынам, — яны ляжаць амаль на паверхні: быў яўны

[193] Владимиров П. В. Доктор Франциск Скорина... С. 65.

недахоп у гравіраваных па дрэве матэрыялах. І вось чаму: гравіраваныя ілюстрацыі першага этапу значна адрозніваюцца ад ілюстрацыйнага матэрыялу другога. Першыя, за невялікімі выключэннямі, што маюць асобнае тлумачэнне, — без гербавых знакаў, розныя па памерах, некаторыя з іх было няпроста прыстасаваць да памераў абраных фарматаў аркушаў і шрыфтавога набору, а адна з іх — з недарэчнай рамкай унізе, якая ахоплівала зрэзаны, відавочна лацінскі, надпіс. Гравюры ж другога этапу — усе, як на падбор, з гербавымі знакамі — значыць, заказныя, «імянныя». Яны ўсе добра стасуюцца да прапорцый аркушаў і шырыні наборных вярстатак. Усе выкананы ў адзіным стылі і манеры. Нездарма іх хваляць сучасныя мастацтвазнаўцы, зусім не звяртаючы ўвагі на некаторыя недахопы. А недахопы гэтыя — абсалютна такія ж, як у некаторых гравюрах, якімі карысталіся Павел Севярын і Ян Севярын Малодшы пасля 1520 г.»[194].

Такім чынам, паводле Лебедзева, Скарына шчасліва, нават з пэўнымі набыткамі, выйшаў з крызісу, завязаўшы сувязі з чэшскімі друкарамі Севярынамі.

А па назіраннях С. Шупы, якраз «...у пэрыяд паміж жніўнем і сьнежнем 1518 году Скарына ў Празе ўступіў у кантакт зь іўдзейскімі коламі, заручыўшыся іхнаю дапамогаю й кансультацыямі ў пытаньнях гэбрайскае філялёгіі й біблеістыкі»[195].

Як бачым, у поле зроку пільных даследчыкаў трапілі шматлікія сімптомы або праявы сур'ёзных навацый ва ўмовах

---

[194] Лебедзеў Г. Скарына першадрукар? Не, Скарына першавыдавец // Беларусіка — Albaruthenica. Мінск, 1993. Кн. 1. С. 293.

[195] Шупа С. Гэбрайскія элемэнты ў праскіх выданьнях Францішка Скарыны // Запісы. Нью-Йорк, 1994. Кн. 21. С. 71.

працы нашага асветніка ў другой палове 1518 года. Праявы рознага кшталту. Але ўсе яны з розных бакоў сведчылі аб якасных зменах у дзейнасці Скарыны: штосьці адбылося неардынарнае, ён страціў нешта важнае, што прымусіла яго шукаць новых сувязяў і кантактаў, новых арганізацыйных формаў. Гэта магло быць, напрыклад, стратай важнага, нават вельмі важнага партнёра па выданні нацыянальнай Бібліі. Партнёра, з якім пачынаў у 1517 годзе і ідэнтыфікацыйным знакам якога была «трапецыя». Гэта было для Скарыны не толькі моцным ўдарам, які ён годна вытрымаў, але і найвялікшым жыццёвым урокам. Ён стаў больш уважлівым да апошняга партнёра, які не здрадзіў яму і агульнай ідэі. Партнёра — з тых, з кім яны разам распачыналі вялікую справу кнігадрукавання на роднай мове. Цяпер Скарына быў гатовы на ўсё, каб толькі ўтрымаць паплечніка, імкнуўся ўсяляк выказаць яму сваю ўвагу і павагу. «Трохкутнік» партнёра стаў суседнічаць сігнету Скарыны амаль на кожнай ілюстрацыі. Хоць гэта і не было прынята ні ў Еўропе, ні тым больш у нас. Але Скарына не баяўся быць наватарам. Ён даверяў не толькі перадавому вопыту Еўропы, але і сваёй магутнай інтуіцыі, голасу свайго славянскага сэрца. Менавіта з гэтай прычыны яму здзіўляюцца, яму аддаюць належнае як айчынныя, так і замежныя даследчыкі.

У заключэнне гэтага параграфа паспрачаемся з некаторымі палажэннямі вельмі шанаванага намі даследчыка А. Шаланды, выказанымі ім у штудыі «Гербы і геральдычныя выявы на гравюрах «Бібліі Рускай» Францыска Скарыны»[196], якія не можам прыняць.

---

[196] Герольд Litherland. 2002. № 3–4.

Для нас несумненна, што Т-знак на працягу выдавецкай дзейнасці Скарыны ў Празе і Вільні (1517–1525) сам сабой графічна развіваўся, прымаў розныя формы ад гранічна спрошчаных, схематычных, лінейных да больш прадстаўнічых, так сказаць, «арэчаўленых»[197], але належаў адной і той жа асобе — партнёру Скарыны па выданні Бібліі і іншых духоўных кніг. А вось Шаланда кожную прамежкавую форму прымае за асобны герб (або, паводле яго тэрміналогіі, «гербік»): на партрэце гэта нібыта «гербік» бацькі, на ілюстрацыях пражскіх выданняў «гербік» старэйшага брата Івана, на агульным тытуле да Бібліі і віленскіх выданнях — мяшчанскі «гербік» самога Ф. Скарыны. Аддаем належнае досціпу і вынаходлівасці Шаланды, але не лічым такую ўскладнёную і мудрагелістую версію апраўданай. На самай справе, змены абрысаў «трохкутніка» — гэта вынік яго натуральнага самаразвіцця, паступовай эвалюцыі ў часе. Асабліва важна падкрэсліць відавочную паступовасць у зменах, адсутнасць рэзкіх скачкоў. Скарына даў нам рэдкую магчымасць назіраць гэты працэс ва ўсёй паслядоўнасці, як на кінаплёнцы. Ва ўсіх выпадках «трохкутнік» увасабляў адну і тую ж асобу — так уяўляў сабе справу яшчэ ў першай палове XIX ст. выдатны геральдыст І. Лялевель. Такім надзейным, пастаянным партнёрам сапраўды мог быць і Іван Лукіч Скарына, родны брат першадрукара (яму мы прысвецім спецыяльны нарыс у трэцім раздзеле нашага даследавання).

---

[197] Такі працэс як агульная характэрная заканамернасць адзначаны, напрыклад, літоўскім даследчыкам Э. Гудавічусам: Gudavičius E. Žymenys ir ženklai Lietuvoje: XII–XX a.: Apybraiža. P. 72, 82.

4. Геральдычная сюіта «Людие израилевы...»

Адной з самых цікавых, змястоўных і загадкавых ілюстрацый Скарынавай Бібліі з'яўляецца гравюра з тытульнага ліста кнігі «Лічбы» (1519) «Людие израилевы с полки своими около храму божия», або, як яе яшчэ называюць больш коратка, адаптавана, «Ізраілевы палкі ля храма», а то і зусім па-сучаснаму «Марш дванаццаці радоў», «Марш дванаццаці плямёнаў».

Сутнасць яе такая. Паводле старазапаветнага падання, падчас вандравання ізраільцян з Егіпта ў «зямлю абетаваную» кожны род мусіў вылучыць ваяроў для аховы найвялікшага скарбу — пераноснага храма-скініі. Вызначаўся дакладны рэгламент размяшчэння і руху гэтага прадстаўнічага апалчэння, падзеленага паводле родава-племянных адзнак на асобныя «станы», якія мелі свае сцягі і іншыя знакі адрознення. У час руху і на прывалах усё войска размяшчалася вакол скініі па сваіх «парадках», што і знайшло адлюстраванне ў гравюры Скарыны.

Аднак цікава, што Скарына актуалізуе выяву. Адзенне ваяроў — сучаснае Скарыну, і гербы на сцягах таксама. Дастаткова сказаць, што справа ў цэнтры мы бачым на адным са сцягоў усё той жа «трохкутнік» Скарыны, на суседнім, трохі вышэй, — выразныя абрысы яго Маладзіковага Сонца.

А што на іншых сцягах?

Невялікая (105 × 105 мм) гравюра густа «заселена» людзьмі і рэчамі. Мініяцюрныя геральдычныя выявы на сцягах часцяком не вельмі выразныя, і разгледзець іх няпроста. Тым не менш такія спробы рабіліся і робяцца. Ужо П. Уладзіміраў у сваёй этапнай для скарыназнаўства кні-

зе (1888) спрабаваў разабраць гэтыя выявы. «Прадстаўнікі кален ізраілевых паказаны са сцягамі, — пісаў вучоны. — На гэтых сцягах надзвычайныя наступныя гербы: W, двухгаловы імперскі арол (маецца на ўвазе герб Габсбургаў, ён жа герб Свяшчэннай Рымскай імперыі. — *Г. К.*), дрэва (Аўгсбург (горад на паўднёвым захадзе Германіі, буйны гандлёва-фінансавы цэнтр, а таксама асяродак кнігадрукавання, лютэранства і германскага Адраджэння, тут час ад часу збіраўся агульнаімперскі рэйхстаг. — *Г. К.*)), карона (Кёльн (горад на Рэйне, цэнтр кнігадрукавання, гандлю і прамысловасці, уваходзіў у Ганзейскі саюз. — *Г. К.*)), тры ражкі як папяровы знак у выданнях Ераніма Віетара (Vietor), герб Скарыны — злучэнне сонца і месяца, і іншы герб, які сустракаецца ва ўсіх выданнях Скарыны, быццам бы спалучэнне літар Т і Д»[198].

М. Шчакаціхін у вядомым даследаванні гравюр і кніжных аздобаў Скарыны (1926) са спасылкамі на гербоўнік Папроцкага дапоўніў і ўдакладніў апісанне свайго папярэдніка: «Навокал скініі прадстаўнікі ізраільскіх кален са зброяй і сцягамі, на некаторых з іх панцыры, на галовах — шаломы; фігуры дробныя, пераважна ў профіль; на сцягах знакі і гербы: літара W, двохгаловы арол, дрэва, карона, тры ражкі — польска-літоўскі герб «Trąby» (зроблена падрадковая спасылка на Папроцкага. — *Г. К.*), які Уладзіміраў выпадкова набліжае да папяровага знаку ў выданнях Vietor'а, шасціканцовая зорка з двох трыкутнікаў, два квадраты, кружок са стрэлкай наверсе з упісанай у яго пяціканцовай зоркай, крыж (робіцца заўвага: паводле Папроцкага, блізкі да гербаў «Dębno» і «Tarnawa». — *Г. К.*), літара Ж або не-

[198] Владимиров П. В. Доктор Франциск Скорина... С. 80.

шта падобнае да гербу «Jelita», нарэшце — звычайныя знакі Скарыны: сонца і месяц і манаграма Ѧ»[199].

Л. Баразна (1972) адзначыў у агульнай форме: «А на сцягах ахоўнікаў скініі — знакі, якія маюць дачыненне да Скарыны»[200]. І ў другім месцы: «...канкрэтным і ўпэўненым штрыхом намаляваны фігуры рыцараў-вандроўнікаў у зброі, што бытавала ў Беларусі XV стагоддзя. Пад спякотнымі праменнямі сонца яны вяртаюцца на родную зямлю, а над імі развяваецца сцяг з гербам Скарыны»[201].

Свой погляд, свае падыходы ва У. Калесніка (1987). Раздумваючы пра Скарынаву кан'юнкцыю сонца і месяца, ён пісаў: «На Скарынавай гравюры да кнігі Лічбаў маецца подпіс: „Людие израилевы с полки своими около храму божия". Прыглядзеўшыся, мы ўбачым, што адзін з воінаў нясе сцяг з выявай сонца і месяца. Да таго ж дрэўка, ніжэй, прымацаваны шчыт з выявай вагі («трохкутнік». — *Г. К.*). Калі б гэта былі гербавыя знакі Скарыны, то змяшчаць іх у падобным кантэксце было б недарэчнасцю. Сонца і месяц, відаць, выступаюць тут як сімвалы ідэй абнаўлення жыцця»[202].

Удакладнім: у сапраўднасці ніякага шчыта з трохкутнікам няма — выявы сігнета і трохкутніка знаходзяцца на сцягах, кожны на сваім дрэўку. І яшчэ запярэчым шаноўнаму вучонаму: паколькі на іншых сцягах гербавыя знакі, то і нашы сігнет і «трохкутнік» успрымаюцца на гэтай гравюры менавіта як гербы.

---

[199] Шчакаціхін М. Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны // 400-лецце беларускага друку. С. 208.

[200] Гравюры Францыска Скарыны. 2-е выд. Тлумачэнні да іл. № 13.

[201] Тамсама.

[202] Калеснік У. Тварэнне легенды... С. 119.

Аб'ектывізаванае апісанне гравюры далі У. Конан і В. Шматаў у энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час» (1988): «Звяртаюць на сябе ўвагу нявывучаныя выявы гербаў (або сімвалічных знакаў) на сцягах, знак Ѧ, двухгаловы арол (герб Свяшчэннай Рымскай імперыі), літара Ж (герб «Еліта»), кружок са стрэлкай уверсе і ўпісанай у яго зоркай (герб князёў Астрожскіх?), літара W, тры ражкі (герб «Трубы»?), карона з зоркай і інш. Не выключана, што гэтыя гербы на сцягах маюць дачыненне да пэўных асоб (магнатаў, фінансістаў, пакравіцеляў), якія спрыялі кнігавыдавецкай дзейнасці Скарыны»[203].

Дададзім, што нават «няўзброеным вокам» на сцягу ў левым верхнім рагу відаць шасціканцовая зорка Давіда (яна дакладна апісана, але не названа М. Шчакаціхіным).

Арыгінальны і шмат у чым глыбокі даследчык Генадзь Лебедзеў у артыкуле «Гуманістычны «нікадэмізм» Францыска Скарыны — аснова яго светаразумення і творчасці» (1989) інтэрпрэтуе гравюру ў аспекце свайго погляду на першадрукара як на чалавека, які не прытрымліваўся якой-небудзь адной пэўнай канфесіі. Цытуем: «Гравюра, як высветлена, выканана не Скарынай, але іменна ён пагадзіўся яе надрукаваць у сваёй кнізе, ператварыўшы такім чынам ва ўласную „візітную картку". На ёй каля каўчэга запавету паказаны не свяшчэннікі якой-небудзь канфесіі, а звычайныя свецкія людзі. А вакол ідуць „полки" — групы воінаў са сцяжкамі, на якіх — геральдычныя знакі: чорны двухгаловы арол — сімвал тады яшчэ цалкам каталіцкай Свяшчэннай Рымскай імперыі і адначасова — вольнага імперскага горада

[203] Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. С. 342.

Нюрнберга, а побач — гербы літоўскіх магнатаў-каталікаў Радзівіла і Гаштольда, герб праваслаўнага гетмана Канстанціна Астрожскага, а далей — сімвал яўрэйскіх абшчын, сімвал Тэўтонскага ордэна... Адно гэта паказвае тую прорву, якая аддзяляе Скарыну ад кожнай з тагачасных цэркваў: ні адна з іх не магла прыняць ідэю „ўсеагульнай рэлігіі"[204].

Я. Неміроўскі ў кнізе «Францыск Скарына» (1990), апісваючы выяву, як і заўсёды, стараецца не адрывацца ад рэалій, паслядоўна трымацца канкрэтыкі: «У цэнтры гравюры намалявана пераноснае свяцілішча-скінія з каўчэгам запавету. У час паходу яго пераносілі прадстаўнікі 12-ці кален Ізраілевых. Яны намаляваны вакол скініі, па перыферыі ілюстрацыі. Кожнае нясе сцяг. На кожным сцягу свой герб. Малюнкі гербоў не маюць ніякага дачынення да Старога запавету. Намаляваны, напрыклад, выдавецкі знак Скарыны (Маладзіковае Сонца. — *Г. К.*), знак, які сустракаўся на агульным тытуле Бібліі (гаворка пра «трохкутнік». — *Г. К.*), карона, лацінская літара W, шасціканцовая зорка, двухгаловы арол. На адным са сцягоў страла з паўкружжам на канцы, паўмесяц і шасціканцовая зорка. Гэта радавы герб князёў Астрожскіх. Ці не сведчыць гэта пра тое, што князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі мае дачыненне да фінансавання Бібліі?»[205]

І далей: «Знак у выглядзе трох перакрыжаваных булаў, які мы бачым на адным са сцягоў, нагадвае герб „Эліта", які належыць украінскаму шляхецкаму роду Карытка. А знак у выглядзе трох паштовых ражкоў, як адзначаў яшчэ

---

[204] Беларуская літаратура. Мінск, 1989. Вып. 17. С. 28.

[205] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность... С. 378–379.

П. У. Уладзіміраў, ва ўсім падобны да вадзянога знака паперы, што сустракаецца ў выданнях кракаўскага друкара Ераніма Віетара»[206].

У параўнанні з папярэднікамі шаноўны вучоны дакладна апісаў герб Астрожскіх (зорка шасці-, а не пяціканцовая, «кружок» вакол яе ўтвараюць згаданыя паўкружжа і паўмесяц). З другога боку, даследчык не ўлічыў каштоўную папраўку Шчакаціхіна: знак у выглядзе трох ражкоў (відаць, паляўнічых, а не паштовых) — вельмі вядомы старадаўні беларуска-літоўскі герб, якім карысталіся Радзівілы. Што да герба «Еліта» (не «Эліта»!), то ён уяўляў сабой скрыжаванне трох дзідаў, а не булаў, і карысталіся гэтым гербам дзесяткі шляхецкіх родаў, якія пералічаны ў многіх даведніках, скажам, у артыкуле «Jelita», змешчаным у вядомай польскай «Вялікай усеагульнай ілюстраванай энцыклапедыі» канца XIX ст.[207]

Р. Равяка ў адпаведнасці са сваёй ідэнтыфікацыяй трох скарынаўскіх сімвалаў (сігнет — праваслаўе; трапецыя — яна ж карона — каталіцызм; трохкутнік — пратэстанцтва) тлумачыць сэнс гравюры: «Наперадзе палкоў ідуць тры сцяганосцы з сімваламі хрысціянскай веры»[208].

У. Паўловіч таксама абапіраецца на сваю ідэнтыфікацыю Т-знака («Троіца») і «трапецыі» («Карона»). У артыкуле

---

[206] Тамсама. С. 379.

[207] Wielka encyklopedya powszechna ilustrowana. Warszawa, 1903. T. 31–32. S. 834–835. У «Гербоўніку беларускай шляхты» (т. 1, 2002) напісанне назвы герба — «Яліта». Дарэчы, Ж-падобны знак Скарынавай гравюры мог быць і скрыжаваннем трох стрэл. Такі герб называўся «Белты» (ад слова «белт» — старадаўняя польская назва стралы для лука і арбалета).

[208] Равяка Р. Тайнапіс Скарынаўскіх сімвалаў // Звязда. 1992. 10 крас.

«Сімволіка Скарыны» (1993) ён адзначае, што гэтыя сімвалы «ўжываюцца Скарынаю паралельна з фамільнымі гербамі (к прыкладу, герб Астрожскіх) і вядомымі старажытнымі геральдычнымі знакамі. Так, найбольш багатая на сімволіку гравюра „Ізраілевы палкі ля храма божага" ўключае ў адпаведнасці з біблейскім сюжэтам тузін знакаў. Аднак Скарына надае ім сучаснае гучанне і адпаведны патрыятычны змест. Сімвалы „Троіца", „Карона", сігнет „Сонца і месяц" і герб князёў Астрожскіх змешчаны побач на пярэднім плане гравюры на разгорнутых сцягах. Скарына падкрэслівае, што мудрасць (сігнет „Сонца і месяц"), сіла і адвага (герб Астрожскіх) павінны служыць Богу („Троіца") і дзяржаве („Карона"). Патрэбна звярнуць увагу і на паслядоўнасць размяшчэння знакаў адпаведна іх семантыцы: Святая Троіца, мудрасць, дзяржава і толькі потым — сіла і адвага. Чыста біблейская тэма кампазіцыйна адыходзіць на задні план. Ні адзін з прыведзеных на гэтай і іншых гравюрах сімвалаў не мае адносінаў да кабалістыкі»[209].

Даволі бегла апісвае ілюстрацыю «Людие израилевы...» мастацтвазнаўца В. Пуцко ў рабоце «Сюжэты скарынаўскіх гравюр» (1997–1998): «Гэта шматфігурная кампазіцыя, у яе цэнтры скінія — рухомы храм, абкружаны воінамі, якія ідуць у паходным парадку. Кожнае падраздзяленне мае свой сцяг з адпаведнай эмблемай: адлюстраванне сярэдневечнай практыкі. Сярод эмблем шчыт Давіда, хрызма[210], двухгаловы арол. Тыпалогія воінскіх даспехаў і ўзбраення прыкметна набліжаная ла рэалій XIV–XV стст. Аднак агульная схема відавочна абавя-

[209] Паўловіч У. Сімволіка Скарыны // ЛіМ. 1993. 30 ліп.

[210] Перасячэнне трох простых ліній, якое можна разумець як манаграму І. Х. — Ісус Хрыстос.

зана візантыйскай традыцыі...»[211] Як бачым, геральдыка не была ў дадзеным выпадку ў цэнтры ўвагі даследчыка.

Арыгінальнае, хоць і не пераканальнае меркаванне выказаў М. Палкаўнічэнка ў працы «Іканалогія і іканаграфія ілюстрацый і ініцыялаў выданняў Францыска Скарыны» (1999): «Гравюра „Ізраілевы палкі ля храма" з тытульнага ліста кнігі „Лічбы" выяўляе ідэю захавання вялікай спадчыны антычнай культуры.

Скінія з чатырох бакоў абкружаная экскортам. Наперадзе працэсіі каля правага краю гравюры нясуць штандарты з выявамі сігнета і знака («трохкутніка». — *Г. К.*) Скарыны. Выява двухгаловага арла на пярэднім плане спачатку нагадвае пра Прагу — сталіцу Свяшчэннай Рымскай імперыі. Потым робіцца зразумелай асноўная думка. Штандарт з выявай арла, перакрываючы выяву скініі, быццам бы накладваецца на яе і гэткім чынам з'яўляецца яе ўласцівасцю і таму пільна ахоўваецца»[212]. Вынікае, на думку Палкаўнічэнкі, Скарына быў патрыётам Свяшчэннай Рымскай імперыі. З чаго б гэта? Поўная ж назва гэтай дзяржавы — «Свяшчэнная Рымская імперыя германскай нацыі»[213].

На думку С. Даніленкі (артыкул «Старазапаветная вобразнасць у геральдычнай традыцыі Рэчы Паспалітай», 2001), агульны сэнс сваёй ілюстрацыі раскрыў сам Скарына ў прадмове да кнігі «Лічбаў»: «И тако четыредесят лет ходиша

---

[211] Пуцко В. Сюжеты скарининских гравюр // 480 год беларускага кнігадрукавання: Матэрыялы трэціх Скарынаўскіх чытанняў. С. 114.

[212] Полковниченко Н. М. Иконология и иконография иллюстраций и инициалов изданий Франциска Скорины. С. 22.

[213] Праўда, паводле меркавання А. Шаланды (гл. вышэй падраздзел або параграф 1), Скарына атрымаў (мог атрымаць) набілітацыю ад імператара Максіміляна, і гэта трохі падмацоўвае пазіцыю Палкаўнічэнкі.

по пустыни, вышедши из земли Египетское, поколе не пришли до земли обетованное, знаменующе нам, хрестианом, иже з великим терпением из сего веку темного имамы вниити во царство божие»[214]. Паводле Даніленкі, вялікі асветнік меў на ўвазе цяжкасці і адказнасць шляху да «абяцанай зямлі», якой для патрыёта Скарыны і яго сучаснікаў было ВКЛ (так званая канцэпцыя «Новага Ізраіля»)[215]. Тлумачэнне дасціпнае, але занадта агульнае і таму недастатковае — яго нельга адкінуць і цяжка прыняць.

Аднак што цікава — сама магчымасць многіх інтэрпрэтацый гаворыць аб глыбіні і неардынарнасці гэтай ілюстрацыі.

Велізарную адметную працу па ідэнтыфікацыі гербаў гэтай гравюры і яе агульным асэнсаванні прарабіў Г. Пікарда. Яму належыць ідэя, што ў сваёй большасці гэта гербы ўдзельнікаў Венскага з'езда манархаў 1515 года. На гэтым з'ездзе (Пікарда, як і некаторыя іншыя даследчыкі, называе яго кангрэсам) імператар Максімілян, кароль Жыгімонт I і кароль Венгрыі Ласла II у прысутнасці шматлікіх ваяводаў і дзяржаўных дзеячоў дамовіліся вырашаць усе спрэчкі праз дынастычныя шлюбы, каб стварыць трывалую кааліцыю супраць турэцкай пагрозы. Мяркуюць, што на з'ездзе прысутнічаў і Скарына.

Паводле Пікарды, расстаўляючы на гэтай гравюры сваіх сучаснікаў, Скарына ў той ці іншай ступені надзяляў іх рысамі адпаведных біблейскіх персанажаў.

---

[214] Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. С. 59.

[215] Даніленка С. Старазапаветная вобразнасць у геральдычнай традыцыі Рэчы Паспалітай // Край = Kraj. Мінск, 2001. Вып. 1–2 (2–3). С. 167–168.

Найперш англійскі даследчык задаўся пытаннем — хто, паводле Бібліі, павінен стаяць там, дзе на гравюры развяваецца сцяг Скарыны, і атрымаў выдатны вынік: першадрукар атаясамлівае сябе ў дадзеным выпадку з біблейскім Ізахарам (Ісахарам), сімвалам якога, згодна з бібліястычнымі тлумачэннямі, была акурат выява сонца і месяца! Вось якія глыбокія карані, выхады на самыя розныя праявы сусветнай культуры мае, высвятляецца, скарынаўскі сігнет.

Пойдзем далей.

Злева ад Скарыны-Ісахара нясуць сцяг з крыжам (Пікарда тлумачыць: чырвоны крыж на белым полі — адна з эмблемаў ВКЛ).

Справа ад Скарыны вядомы нам Т-знак. Паводле Бібліі, тут павінен быць Завулон (Забулён), брат Ісахара, гандляр, які ўсяляк памагаў Ісахару і даваў яму магчымасць прысвяціць сябе вывучэнню святога пісьма. Эмблемай Завулона быў карабель. На карабель (лодку з адным ветразем) падобны Т-знак, калі яго перавярнуць. Дарэчы, выява карабля, заўважае Пікарда, была на пячатцы Полацка XVI ст.

Большыя або меншыя адпаведнасці Пікарда знаходзіць паміж біблейскімі персанажамі і асобамі, якія сімвалізуюцца гербамі гравюры. Тут нам больш цікавая ідэнтыфікацыя гербаў.

Двухгаловы арол — імператар Максімілян (з гэтым згодныя ўсе). Дададзім ад сябе, што Максімілян быў вядомым бібліяфілам, апекуном кніжнага і графічнага мастацтва, аўтарам рыцарскіх раманаў. Словам, гэта таксама шмат у чым рэнесансны чалавек, блізкі па духу Скарыну.

Гербам Абданк (W), на думку Пікарды, ушанаваны род Гаштольдаў. Уплывовы дзеяч ВКЛ Альбрэхт Гаштольд ездзіў з вялікім князем у 1515 годзе ў Вену.

Шостым у Скарынавым алегарычным парадку (цытуем даследаванне Пікарды) «ідзе сцяг з фігурай, якую некаторыя лічылі выявай дрэва. У прыватнасці, Уладзіміраў уважаў, што гэта герб баварскага горада Аўгсбурга, з якім, на яго думку, у Скарыны павінны быць сувязі. Аднак гарадскі герб Аўгсбурга — не дрэва, а хваёвая шышка наверсе калоны, так званы Stadtpyr. Невялікі памер сцягу не дазваляе з упэўненасцю сказаць, якая на ім фігура, але падаецца, што гэта добра вядомая эмблема ружы роду Порай...»[216] Гербам карысталіся многія роды, у тым ліку старадаўнія жамойцкія сем'і Рымгайлы, Гедройці (Гедройцы). Носьбіта гэтага герба Ота з Ходча Жыгімонт I падчас вайны з Масковіяй прызначыў у 1515 годзе падольскім ваяводам. Яго брат львоўскі каштэлян Станіслаў з Ходча прысутнічаў на Венскім з'ездзе, пазней быў каронным вялікім гетманам.

Каронай на сцягу ў верхнім правым рагу гравюры, паводле Пікарды, Скарына ўшанаваў не горад Кёльн, як думаў Уладзіміраў, а дацкага і шведскага караля Ганса (па некаторых звестках, а дакладней — меркаваннях, Скарына быў нейкі час яго сакратаром). У 1513 годзе кароль Ганс памёр, але яго сын Крыстыян II таксама меў сімпатычныя Скарыну рысы — спрыяў кнігадрукаванню і навуцы. У гравюры «Ізраілевы палкі ля храма» Скарына, на думку Пікарды, з пэўным досціпам у традыцыях вельмі празрыстага агульнадаступнага каламбура суадносіў уладароў Даніі з біблейскім Данам.

Наступны знак (зорка над маладзіком, а над імі страла на паўколе) Пікарда, следам за іншымі даследчыкамі, лічыць

---

[216] Пікарда Г. Алегарычная геральдыка Францішка Скарыны і кароткі дапаможнік па беларускай геральдыцы // Спадчына. 1992. № 6. С. 46.

гербам знакамітага князя Канстанціна Астрожскага, хоць і невядома дакладна, ці прысутнічаў той на Венскім з'ездзе.

Далей ідзе геральдычная кампазіцыя з квадратаў — выразна відаць два верхнія квадраты, але, магчыма, пад імі яшчэ такія самыя фігуры. Пікарда дапускае (у дадзеным выпадку вельмі адвольна), што Скарына меў на ўвазе папулярны герб Корчак (тры прастакутнікі рознай даўжыні адзін пад адным: наверсе самы вялікі, унізе найменшы). На нашу думку, такое дапушчэнне наўрад ці можна прыняць.

Наступны знак у выглядзе трох рысак, што перасякаюцца «і ўтвараюць кшталт, падобны да зоркі» (або да літары Ж)[217], англійскі даследчык, следам за М. Шчакаціхіным, прылічвае да геральдычнай групы Еліта, да якой належалі Замойскія, таксама адметны ўплывовы род. Мікола Замойскі мужна ратаборствааў з татарамі і туркамі. «У 1515 годзе ён быў прызначаны каралеўскім сакратаром, магчыма, спецыяльна, каб суправаджаць свайго пана на Венскі кангрэс ... »[218]

Далей, як і іншыя даследчыкі, Пікарда бачыць шасціканцовую зорку з двух трохкутнікаў і адзначае, што «да XVII стагоддзя яна яшчэ не стала адным з найбольш распаўсюджаных гэбрайскіх сымбаляў — Магэн Довід, ці Давідава Зорка»[219]. Праўда, паведамляе даследчык, яшчэ ў XIV стагоддзі кароль Багеміі Караль IV даў яўрэйскай грамадзе ў Празе прывілеі, у тым ліку права карыстацца «сцягам караля Давіда» з характэрнай фігураю шасціканцовай зоркі. Добра ладзіў з яўрэйскімі фінансістамі і Жыгімонт I. Пікарда адзначае: «Хаця Скарына мусіў сустракаць шмат гэбраяў у Полацку,

---

[217] Як мы бачылі вышэй, В. Пуцко лічыць гэты знак хрызмай.

[218] Пікарда Г. Алегарычная геральдыка ... С. 49.

[219] Тамсама. С. 49–50.

Вільні і Кракаве, яму маглі спатрэбіцца дадатковыя звесткі з гэбрайскіх кабалістычных тлумачэнняў, рабінічных тэкстаў і традыцыяў, якія ён мог атрымаць ад вучоных гэбраяў пражскай... сінагогі, знакамітага цэнтру містычных навук, падчас перакладу і напісання каментарыяў да Бібліі. Тады іхняя эмблема зусім дарэчы ў шэрагах маршу»[220]. Сувязі Скарыны з яўрэйскімі біблеістамі, як мы бачылі ў папярэднім падраздзеле, заўважыў і С. Шупа.

Апошні сцяг з характэрным гербам з трох рагоў, як і раней меркавалі даследчыкі, паводле Пікарды, сімвалізуе Радзівілаў. Мікалай Радзівіл, канцлер ВКЛ, таварышыў Жыгімонту на Венскім з'ездзе 1515 года, а пазней набыў годнасць князя Свяшчэннай Рымскай імперыі. Яго сын Юрый Радзівіл, таксама сучаснік Скарыны, гетман ВКЛ, браў удзел не менш як у трыццаці бітвах супраць татар і маскавітаў, заслужыўшы сабе ганаровы тытул «Victor» і мянушку «Літоўскі Геркулес».

«З дванаццаці скарынаўскіх сцягоў, — рэзюмуе Пікарда, — не менш за дзесяць — Жыгімонта I, Скарыны, Максіміляна, Гаштольда, Ота з Ходча, Ганса Дацкага і ягонага сына Крыстыяна II, Астрожскага, Замойскага і Радзівіла — адпавядаюць іхнім героям і разам з тым маюць пэўную сувязь з біблейскімі якасцямі павадыроў Ізраіля»[221].

Даследчык падкрэслівае патрыятычны сэнс такой інтэрпрэтацыі: «Дзевяць з дванаццаці сымбаляў звязаны з суайчыннікамі па Польска-Літоўскай садружнасці, у тым ліку з каралём Жыгімонтам I Ягайлавічам, а два — з прэстыжнымі саюзнікамі — Імперыяй і Паўночным Звязам (унія Даніі,

[220] Тамсама. С. 50.
[221] Тамсама. С. 51.

Швецыі, Нарвегіі пад вярхоўнай уладай дацкіх каралёў. — *Г. К.*). Адсюль ясна відаць, што алегарычны „Абраны народ" — гэта насельніцтва „Русі". Большасць з гэтых людзей прысутнічала на вялікім мірным кангрэсе ў Вене ў 1515 годзе, на якім, як лічыцца, меў быць і Скарына. У працэсіі няма белых польскіх арлоў ці іншых эмблемаў за выключэннем толькі напалову звязанага з імі Замойцкага, няма жмудска-летувіскіх медзвядзёў, галіцкіх ільвоў і, безумоўна, няма нават намёку на маскоўскага св. Георгія... »[222]

Зробім тут невялікае ўдакладненне: св. Георгій (Юрый) быў гербам таксама многіх беларускіх праваслаўных магнацкіх родаў, напрыклад тых жа князёў Астрожскіх. А. Гваньіні ў сваёй «Хроніцы Еўрапейскай Сарматыі» пісаў: «Здаўна носіць дом князёў Астрожскіх герб св. Юр'я, роўна як перад тым насілі і іншыя рускія князі і цяпер [князь] Маскоўскі носіць, аднак пры гэтым карыстаюцца зараз і іншымі высакароднымі кляйнотамі»[223].

Але гэта толькі прыватныя папраўкі. У цэлым жа праца англійскага скарыназнаўца ўражвае і захапляе.

Адкрыццё Пікарды цяжка пераацаніць. Мы атрымалі не толькі магчымы ключ да гравюры «Людие израилевы...», але і цікавыя новыя матэрыялы пра сэнс і паходжанне сігнета Скарыны. Гэта не значыць, што Скарына браў свой сігнет менавіта з біблейскага сімвала Ісахара. Нагадаем яшчэ раз пра шматзначнасць, полісемантычнасць сігнета Скарыны. Меў рацыю пісьменнік У. Арлоў, гаворачы ў «Таямніцах полац-

[222] Тамсама.

[223] Gwagnin A. Kronika Sarmacyey Europskiej. [Kraków], 1611. S. 267. (Рэдкае выданне ёсць у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.)

кай гісторыі»: «З мноства гэтых значэнняў часам выбіраюць нейкае адно, але Францішак Скарына відавочна глядзеў на сэнс свайго герба вельмі шырока»[224]. Вось і Пікарда адкрыў дадатковую глыбіню гэтага сімвала, выявіў яшчэ адну яго зусім нечаканую, проста дзвівосную грань. Аб'яднаўшы, атаясаміўшы сябе з Ісахарам, Скарына як бы паведамляе нам новыя звесткі пра сябе. Паводле Бібліі, Ісахар паходзіў з гандляроў, але ён і яго нашчадкі былі людзьмі вучонымі і справядлівымі, займаліся навукамі. Такі ж жыццёвы шлях і самога Скарыны.

Яшчэ больш важна, што пошукі Пікарды выводзяць нас на кампаньёна Скарыны, ушанаванага ў яго выданнях «трохкутнікам». Паводле біблейскіх звестак, гэта Завулон (Забулён), таксама гандляр, брат Ісахара. Гэта ён, паводле Бібліі, забяспечваў Ісахару магчымасць займацца навукамі, вывучэннем святога пісьма. Такім чынам, даўнія здагадкі даследчыкаў, што за «трохкутнікам» хаваецца кампаньён-мецэнат Скарыны, атрымалі новае пацвярджэнне. Не выключана, што тут ёсць яшчэ ўказанне на прыналежнасць гэтага кампаньёна да купецкага саслоўя.

Праўда, Пікарда дапускае яшчэ магчымасць, што пад маскай Завулона хаваецца якісьці вопытны майстар, у якога Скарына вучыўся кнігавыдавецкай справе. Уводзіцца надзвычай цікавая, хоць і вельмі хісткая версія, што гэта мог быць Джон Летаў (Ян або Іван з Літвы), які на пачатку 1480-х гадоў, на самым заранку кнігадрукавання, выдаваў кнігі ў Лондане і, паводле гістарычных сведчанняў, сваім майстэрствам вылучаўся сярод друкароў тагачаснай Англіі.

---

[224] Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. С. 185.

Сам па сабе, нават узяты асобна, перад намі выдатны факт: дзівосная постаць — майстар-літвін, выхадзец з ВКЛ (ёсць усе падставы думаць, што гэта беларус), закінуты лёсам у туманны Альбіён, годна сцвердзіў свой прафесіяналізм сярод энергічных брытанцаў. Мы прывыклі пачынаць гісторыю беларускіх культурных сувязяў з Лонданам з XIX ст., калі на берагах Тэмзы атайбаваўся эмігрант з Беларусі Аляксандр Рыпінскі, пісаў і друкаваў там свае творы, удасканальваўся ў фотамастацтве. Аказваецца, гэты пачатак трэба адсунуць ажно на чатыры стагоддзі раней. (Дарэчы, у сучасніка Скарыны З. фон Герберштэйна можна вычытаць, што ўжо ў самыя далёкія, даўнія часы з Брытаніі ў Вільню вазілі соль.)

Пікарда ці не першы ў гэткім ракурсе зацікавіўся феноменам Джона Летаў, піянера англійскага кнігадрукавання, апублікаваў у 1965 годзе ў лонданскім беларускім часопісе «Божым шляхам» манаграфічны артыкул «Ян з Літвы (Першы Беларускі Друкар у Лёндане)»[225], прывёў важкія сведчанні гісторыкаў і бібліёграфаў (пачынаючы са «Слоўніка друкароў і кнігадрукавання» С. Тымперлі, Лондан, 1839), выказаў думку, што Ян вучыўся друкарскай справе ў немца Ёгана Буля з Брэмена. «Брэман, — заўважае Пікарда, — быў адным з гарадоў Ганзы і меў гандлёвыя зносіны з Данцыгам, Кэнігсбэргам і з гарадамі гоцкага ўзьбярэжжа. (Дададзім ад сябе, што ў сферы інтарэсаў Ганзы знаходзілася і Прыдзвінне

[225] Значна пазней апублікаваў свой артыкул літоўскі кнігазнавец Л. Уладзіміраў: Владимиров Л. И. Литовец Джон Леттоу — лондонский первопечатник // Книга: исследования и материалы. М., 1973. Т. 26. Артыкула Г. Пікарды ў лонданскай беларускай газеце Уладзіміраў, мабыць, не ведаў, на яго не спасылаўся.

з Полацкам і Віцебскам, цяпер пра гэта шмат пішуць. — *Г. К.*) Ганза мела таксама сваё прадстаўніцтва ў Лёндане, якое было звычайным месцам затрымкі для падарожнікаў з усходняй Прыбалтыкі»[226]. Гэтага месца ў англійскай сталіцы мусіў трымацца і Ян з далёкай Літвы. У часопісе прыводзілася рэпрадукцыя старой англійскай гравюры: Тэмза, лодкі, прыстань, цесная гарадская забудова, спічастая вежа царквы, заезны двор Балтыйскай Ганзы. Подпіс тлумачыць: «Каля царквы ўсіх Сьвятых, праўдападобна леваруч, знаходзілася друкарня Яна з Літвы (1480)». Імкненне даследчыка да канкрэтнасці, дакладнасці ўражвае. Па звестках Пікарды, гэта была наогул першая друкарня на тэрыторыі лонданскага Сіці. Некалькі гадоў Ян з Літвы друкаваў у Лондане кнігі філасофскага, рэлігійнага і найбольш юрыдычнага характару. Потым сляды яго губляюцца.

У працы «Алегарычная сімволіка» Пікарда дапускае, што скарынаўскі «трохкутнік» з'яўляецца манаграмай літар ІЛ[227], і выказвае думку, што на старасці гадоў той Іван з Літвы мог стаць апекуном і настаўнікам Скарыны[228].

Прыгожая версія, але матэрыялу для яе ўгрунтавання пакуль што надзвычай мала.

---

[226] Піхура Г. [Пікарда Г.] Ян з Літвы (Першы Беларускі Друкар у Лёндане) // Божым шляхам. 1965. № 3. С. 5.

[227] Перад намі зусім новае літарнае прачытанне «трохкутніка». І — адзінаццатая літара, здабытая даследчыкамі з гэтага сімвала. Як і ў шмат якіх іншых выпадках літарнай расшыфроўкі «трохкутніка», нельга сказаць, каб такое прачытанне было пераканаўчым. Крытычныя заўвагі з нагоды такой расшыфроўкі гл.: Піскун Ю. А. Гравюры пражскіх выданняў Скарыны: пытанне аўтарства // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. С. 36–37.

[228] Пікарда Г. Алегарычная сімволіка... С. 48–51.

Аднак і без таго Пікарда істотна ўзбагаціў нашы веды пра Скарынаву сімволіку і скарыназнаўства наогул збліжэннямі:

Скарына — Ісахар,

Невядомы паплечнік Скарыны (носьбіт Т-знака) — Завулон.

Досыць самавіта выглядае і ўказанне Пікарды на сувязь сюжэта гравюры «Ізраілевы палкі...» з Венскім з'ездам 1515 года, але асабліва нас цікавіць згаданае збліжэнне Скарыны і яго паплечніка з Ісахарам і Завулонам.

Філосаф Уладзімір Агіевіч у выступленнях на канферэнцыях і ў друку, у кнізе «Сімволіка гравюры Скарыны» (1999) прымае збліжэнне Скарыны з Ісахарам, а ўсё астатняе ў пабудове Пікарды адпрэчвае. У 1994 годзе з трыбуны міжнароднай навуковай канферэнцыі па праблемах беларуска-амерыканскіх гістарычна-культурных дачыненняў ён абвінаваціў англійскага даследчыка, што той не здолеў разабрацца «з размяшчэннем „палкоў Ізраілевых" на адпаведнай гравюры Скарыны, паставіў Ісахара справа ад Іуды (трэба наадварот), тым самым прыпісаўшы і Скарыне элементарную непісьменнасць, няведанне парадкаў шыхтавання каленаў Ізраілевых пры выхадзе з Егіпта. Не заглянуўшы ў святцы і запусціўшы дванаццаць каленаў стартаваць не з сваіх пазіцыяў, Пікарда напісаў цэлую працу „Алегарычная геральдыка Францыска Скарыны"»[229]. Сур'ёзныя прэтэнзіі. Якімі ж «святцамі» карыстаўся наш вучоны крытык Пікарды? Гаворачы пра расстаноўку ізраілевых палкоў вакол скініі, Агіевіч абапіраецца на вядомую рускую «Тлумачальную Біблію» пачатку XX ст., падрыхтаваную пад кіраўніцтвам

[229] Беларусіка — Albaruthenica. Мінск, 1995. Кн. 5. С. 294–295.

прафесара А. П. Лапухіна (перавыдадзена ў наш час). У адпаведным каментарыі там гаворыцца: «У сваім паходным руху па Аравійскай пустыні ізраільскі народ уяўляў правільна арганізаваную армію, падзеленую на 4 часткі, па 3 каленныя палкі ў кожнай. У авангардзе знаходзілася калена Іуды, маючы: на правым фланзе Завулона, на левым — Ісахара. Левы бок стана прыкрываўся Данам, Асірам, Нефалімам; правы — Рувімам, Гадам, Сімеонам. Ар'ергард складалі: Яфрэм, Манасія, Веніямін. У цэнтры падоўжанага чатырохвугольніка, які ўтвараецца станам, змяшчаліся: скінія, палаткі Майсея, Аарона, святароў і левітаў»[230]. Пры такой расстаноўцы «трохкутнік» прыпадаў на Іуду. Гэта і прымае за аснову сваіх далейшых разважанняў Агіевіч.

Аднак сам Скарына пры ўсёй яго праніклівасці і гатоўнасці да дыялога з сучаснікамі і нашчадкамі, канешне ж, не мог ведаць тлумачэнняў вучоных біблеістаў пачатку XX ст. Для нас важна ведаць, як разумеў сітуацыю ён сам. На шчасце, захавалася недвухсэнсоўнае сведчанне самога першадрукара — цытуем яго прадмову да кнігі «Лічбы», дзе Скарына сцісла і энергічна, як спрактыкаваны стратэг, характарызуе расстаноўку ізраільскіх палкоў:

«Три поколения о хоругвями своими, Іудино, Ізахарово[231] и Зевулоново — на восток солнеца пред храмом.

Иные три поколения с хоругвями своими, Даново, Асерово и Нефталимле, — на едином боку от полуденное страны храму божыя.

---

[230] Толковая Библия, или Комментарий на все книги св. Писания Ветхого и Нового завета / Под ред. А. П. Лопухина. СПб., 1904. Т. 1. С. 508–509.

[231] У «Творах» Ф. Скарыны (1990) няправільная разбіўка на словы: «і Захарово» (Заўважана У. Агіевічам).

Третие три поколения с хоругвями своими, Рувимово, Симеоново и Гадово, — на другом боку от полунощное страны храмовы.

Останочные три поколения с хоругвями своими, Ефраимле, Манасиево и Вениаминово, — на запады со заду всех ополчахуся»[232].

Тут «трохкутнік» прыпадае на Завулона. Таму ідэнтыфікацыя Пікарды зусім апраўданая, лагічная. Здаецца нават, гэта адзіна магчымае рашэнне.

Дарэчы, у самім тэксце Бібліі, у тым самым выданні А. П. Лапухіна, размяшчэнне палкоў аналагічнае, як і ў прадмове Скарыны: «З пярэдняга боку да ўсходу ставяць стан: сцяг стана Іудзіна ... пасля яго ставіць стан калена Ісахарава ... (далей ставіць стан) калена Завулона ... »[233] Гэтаксама ж паказана размяшчэнне сіл «авангарда» і на вельмі дэталізаванай, педантычна прывязанай да біблейскага тэксту ілюстрацыі «Калены Ізраілевы» з Брэсцкай Бібліі 1563 года[234]. Вынікае, Пікарда не памыліўся, адносячы «трохкутнік» да Завулона.

Такім чынам, гравюра «Людие израилевы ... » з кнігі «Лічбы» не толькі пераканаўча і з асаблівай паўнатой сведчыць пра вялікую цікавасць Скарыны да геральдыкі і сучаснага яму грамадска-палітычнага жыцця ВКЛ і Еўропы, не толькі дае важны дадатковы матэрыял для разумення семантыкі і

---

[232] Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. С. 59.

[233] Толковая Библия, или Комментарий ... Т. 1. С. 508.

[234] Рэпрадукцыю гл.: Нікалаеў М. В. Шэдэўр брэсцкай друкарні // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: Новыя даследаванні. Мінск, 1989. С. 145. Дарэчы, параўнанне гэтай гравюры са скарынаўскай выдатна паказвае арыгінальнасць і смеласць Скарыны, мастацкую свежасць яго выданняў.

генезісу скарынаўскага сігнета, але і падказвае даследчыкам новыя шляхі для высвятлення партнёраў (прынамсі аднаго партнёра) беларускага першадрукара.

І гэта для нашага даследавання самае галоўнае. Як надзвычай важна і для ўсяго скарыназнаўства.

Што да агульнай ацэнкі наватарскай працы Пікарды, дык яе па сваёй значнасці можна паставіць у адзін шэраг з адкрыццём скарынаўскіх акравершаў і гімнаграфіі, здзейсненым А. Турылавым[235].

Высока ацаніў працы англійскага даследчыка беларускі геральдыст А. Шаланда. Хоць, здаецца, ідэі Пікарды, што на гравюры «Ізраілевы палкі...» — удзельнікі Венскага з'езда 1515 года, ён не падтрымаў, як не падтрымаў і некаторых канкрэтных яго ідэнтыфікацый. У бліскучай штудыі А. Шаланды шмат карысных удакладненняў і плённых прапаноў, якія яшчэ доўгі час будуць служыць прадметам вучоных абмеркаванняў. Аўтар прадэманстраваў зайздросную назіральнасць, багатыя веды ў розных галінах гербазнаўства. Аднак выснову гродзенскага даследчыка пра цэнтральную ідэю гравюры «Ізраілевы палкі...» наўрад ці можна прыняць. «Можна меркаваць, — піша даследчык, — што ідэя гравюры „Палкі" была наступная: на сцягах былі змешчаны гербы і геральдычныя выявы апякуноў, фундатараў, выканаўцаў і ўладальнікаў пражскіх друкарняў, дзе друкаваўся наклад „Бібліі Рускай"»[236]. У іншым месцы апекуны-спрыяльнікі (прынамсі галоўныя з

---

[235] Кісялёў Г. «Писал доктор Скоринич Францискус»: Пасланне, атрыманае праз пяць стагоддзяў, або Ці заўсёды можна верыць бібліёграфам? // ЛіМ. 2001. 26 студз.

[236] Шаланда А. Гербы і геральдычныя выявы на гравюрах «Бібліі Рускай» Францыска Скарыны // Герольд Litherland. 2002. № 3–4. С. 125.

іх) пералічаны даследчыкам пайменна: «Друкаванню „Бібліі Рускай" спрыялі імператар СРІ Максімільян І Габсбург, кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары, кароль чэшскі Людвік, магнаты Альбрэхт Гаштольд, Юры Радзівіл, князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі, віленскія мяшчане, жыдоўская грамада ў ВКЛ»[237]. Ці не зашмат «апекуноў»? Чаму ж тады так цяжка і няпроста складвалася жыццё Скарыны? Вось ужо сапраўды атрымліваецца — у сямі нянек дзіця без вока. Прапанаваны Шаландам вывад супярэчыць назіранням большасці сучасных сур'ёзных скарыназнаўцаў. Аргументацыя Шаланды не заўсёды пераконвае, а часам выглядае зусім лёгкаважкай. Напрыклад (працытуем): «Адсутнасць польскага арла ці „Пагоні" тлумачыцца неафіцыйным характарам падтрымкі друкавання „Бібліі Рускай" з боку Жыгімонта Старога»[238]. Але, калі нават стаць на пункт гледжання Шаланды, неафіцыйнай была падтрымка і з боку іншых каранаваных асоб і магнатаў, а між тым іх гербы на скарынаўскай ілюстрацыі змешчаны. Чаму ж так не пашанцавала Жыгімонту?.. Што датычыць апошняга, дык яшчэ ў артыкуле з нагоды Першых Скарынаўскіх чытанняў (1986) знаўца эпохі Г. Галенчанка з усёй пэўнасцю адзначыў: «Няма падстаў, як гэта адчувалася ў асобных выступленнях, прадстаўляць Жыгімонта Старога апекуном беларускага першадрукара. Патрыятычна-асветніцкая і выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны ніяк не адпавядала палітычным і канфесіянальным мэтам вярхоўнай улады Польшчы і каталіцкай іерархіі»[239].

---

[237] Тамсама. С. 131.

[238] Тамсама. С. 127.

[239] Галенчанка Г. Скарынаўскія чытанні ў Мінску // Шляхам гадоў. Мінск, 1990. [Вып. 1]. С. 350.

У наступным раздзеле мы якраз будзем гаварыць пра сацыяльную апору дзейнасці Скарыны, пра яго рэальных спрыяльнікаў. І трэба сказаць, мы ўяўляем карціну зусім не так, як бачыцца яна А. Шаланду.

Раздзел III

Сацыяльная апора дзейнасці Скарыны і яго паплечнікі

1. Магнаты не падтрымалі Скарыну. Яго апора – у гарадах

У 1563 годзе — прыкладна праз паўстагоддзя ці трохі меней пасля Скарынавай Бібліі — у Бярэсці на Бугу, адным са значных гарадоў старадаўняй Беларусі-Літвы, выйшла польскамоўная кальвінская Біблія. На ёй пазначана зусім пэўна, з гонарам за добрую і важную справу: «Друкавана ў Берасці Літоўскім паводле загаду і коштам яснавяльможнага пана Мікалая Радзівіла, князя на Алыцы і Нясвіжы, ваяводы віленскага, у Вялікім княстве Літоўскім найвышэйшага маршалка і канцлера»[240]. На першым лісце быў герб Радзівілаў, потым ішло прысвячэнне тагачаснаму каралю і вялікаму князю Жыгімонту Аўгусту. Гербамі магнатаў-фундатараў аздабляў свае кнігі Іван Фёдараў у перыяд дзейнасці ў Беларусі і Украіне. На адвароце загалоўнага ліста «Евангелля вучыцельнага», выпушчанага ў 1569 годзе ў Заблудаве, красаваўся герб вяльможнага мецэната з пазначэннем яго поўнага тытула: «Григореи Александровичь Ходкевича, пан виленьскии,

[240] Грыцкевіч А. Берасцейская Біблія // Вялікае княства Літоўскае: Энцыкл. Т. 1. С. 315.

гетман найвышшии Великаго князьства Литовскаго, староста городеньскии и могилевскии»[241]. У Астрожскай Бібліі, надрукаванай тым самым І. Фёдаравым у 1581 годзе, герб князя Канстанціна Канстанцінавіча Астрожскага, арганізатара друкарні, на сродкі якога ажыццёўлена выданне, дапаўняўся ўзнёслымі вершаванымі куплетамі на гэты герб. Потым ішла вялікая прадмова на славянскай і грэчаскай мовах, напісаная ад імя Астрожскага.

Нічога падобнага мы не бачым у выданнях Скарыны. Няма і іншых больш-менш пераканаўчых звестак пра сувязі Скарыны з магнатамі, пра падтрымку апошнімі Скарынавай справы.

Нярэдка ў даследчыкаў пракідаецца думка, што Скарынам апекаваўся вядомы абаронца праваслаўя ў краі князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі, бацька фундатара Астрожскай Бібліі. Прыкладаў такога кшталту як у скарыназнаўчай, так і ў агульнагістарычнай літаратуры больш чым дастаткова. «Магчыма, быў адным з апекуноў Скарыны на пачатковым этапе яго кнігадрукарскай дзейнасці»[242], — паведамляе пра князя Канстанціна Іванавіча В. Дарашкевіч. «Астрожскі быў магутным мэцэнатам праваслаўнай царквы і кнігадрукавання. Мяркуюць, што пад яго апекай знаходзілася і друкарская справа Ф. Скарыны ў Вільні»[243], — адзначаў У. Калеснік у энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час». У артыкуле пра Астрожскага ў гэтым жа даведніку, які па праве называюць Скарынаўскай энцыклапедыяй, М. Батвіннік адзначыў, хоць

---

[241] Иван Фёдоров и восточнославянское книгопечатание. Минск, 1984. С. 80.

[242] Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 325.

[243] Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. С. 224.

і досыць асцярожліва: «Ёсць меркаванне, што А[строжскі] дапамагаў С[карыне] ў друкарскай дзейнасці» (с. 251). Аднак у паказальніку артыкулаў гэтага даведніка К. І. Астрожскі праходзіць ужо пад рубрыкай «Блізкае акружэнне і паплечнікі» Скарыны (с. 597). Не чужая думка аб спонсарстве Астрожскага ў дачыненні да Скарыны і А. Мальдзісу — спашлёмся на яго выступленне на абмеркаванні энцыклапедычнага даведніка «Францыск Скарына і яго час» у Маскве адразу пасля яго выхаду. Князь Астрожскі, на думку даследчыка, «падтрымліваў Скарыну, фінансаваў, відавочна, яго выданні»[244]. Ці вось яшчэ прыклад. «К. І. Астрожскі хутчэй за ўсё прымаў якісьці ўдзел у выдавецкай дзейнасці Скарыны. Можа, пад яго ўздзеяннем і адбыўся пераезд Скарыны з Прагі ў Вільню ў 1522 г. Чалавек вельмі ўплывовы, які ўсяляк апекаваў духоўнаму жыццю праваслаўнага насельніцтва княства, князь Канстанцін, бясспрэчна, заахвочваў асветніцтва Скарыны»[245], — чытаем у фундаментальнай манаграфіі Я. Неміроўскага «Францыск Скарына». Згаджаецца з гэтым і вядомы гісторык Г. Сагановіч у папулярным нарысе пра Астрожскага: «Не выключана, што ў 1522 годзе князь Астрожскі спрыяў адкрыццю друкарні Францішка Скарыны ў Вільні, а пасля матэрыяльна падтрымаў і выданне кніг»[246]. Такім чынам, многія сучасныя даследчыкі гатовыя прызнаць князя Астрожскага апекуном Скарыны і разыходзяцца толькі ў прыватнасцях, напрыклад, у пытанні, калі гэта было: на пачатковым этапе кнігавыдавецкай дзейнасці

---

[244] Скарыніч. Мінск, 1991. Вып. 1. С. 25.

[245] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность... С. 411.

[246] Сагановіч Г. М. Айчыну сваю баронячы: Канстанцін Астрожскі. Мінск, 1992. С. 57.

першадрукара (В. Дарашкевіч) ці ўжо ў Вільні (У. Калеснік, Г. Сагановіч, у гэткім самым духу можна зразумець і Я. Неміроўскага). Але ў такім выпадку абавязкова былі б адпаведныя зусім пэўныя ўказанні ў Скарынавых кнігах. Скарына не мог парушаць прынятага ў той час этыкету. Мікраскапічнай выявы герба Астрожскіх побач з іншымі гербамі на гравюры «Ізраілевы палкі ля храма», канешне ж, было б у такім выпадку недастаткова.

Ды трэба яшчэ разабрацца, ці герб Астрожскіх на Скарынавай гравюры. Падаючы выяву герба Астрожскіх на ўклейцы да свайго нарыса, Г. Сагановіч тлумачыць яго як камбінацыю двух гербаў: «Князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі аб'яднаў у сваім гербе Агоньчык (уверсе) і Ляліву (унізе). Агоньчык — у чырвоным полі палова белай стралы, скіраванай дагары, на паўкрузе; Ляліва — залаты маладзік ражкамі ўгару, пасярод якога — шасціканцовая зорка». Верхняе паўкружжа і паўмесяц унізе быццам бы ўтвараюць кола. Прыблізна так «расчытвалі» і скарыназнаўцы герб на Скарынавай гравюры (гл. вышэй падраздзел «Геральдычная сюіта „Людие израилевы…"»).

Зазірнём дадаткова ў спецыяльныя выданні, у шаноўныя геральдычныя, гербазнаўчыя крыніцы. А. Каяловіч у XVII ст. пісаў пра Астрожскіх: «Паходзяць з князёў рускіх, уласным гербам якіх быў Вершнік, што працінае кап'ём смока (святы Юрый або Георгій Пераможац. — *Г. К.*). Як іх патомства, кінуўшы гэты кляйнот, пачало ўжываць Ляліву, злучаную з Агоньчыкам, ведаць не магу»[247]. На думку аўтарытэтнага ге-

[247] Kojałowicz W. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego, tak zwany Compendium. Kraków, 1897. S. 209.

ральдыста XIX — пачатку XX ст. А. Банецкага, Канстанцін Іванавіч Астрожскі выбраў сабе такі герб таму, што адзін яго сын — Ілля — быў жанаты з Касцялецкай (герба Агоньчык), а другі — Канстанцін — з Тарноўскай (герба Ляліва). У сваёй аснове, калі мець на ўвазе род Астрожскіх наогул, заслужаны геральдыст мае, канешне ж, рацыю, але з адной вельмі істотнай храналагічнай папраўкай: гэтыя шлюбныя саюзы адбыліся адпаведна ў 1539 і 1553 гадах, а Канстанцін Іванавіч памёр у 1530 годзе. Таму герб Астрожскіх як злучэнне Агоньчыка і Лялівы мог сканструявацца толькі пасля 1553 года, калі ні Канстанціна Іванавіча, ні Скарыны ўжо не было ў жывых. Маскоўскі гісторык Л. У. Собалеў у нядаўнім артыкуле «Генеалагічная легенда роду князёў Астрожскіх» прыходзіць да высновы, што гэта адбылося ўжо ў другой палове XVI ст. пры князю Канстанціне Канстанцінавічу[248], таксама славутым дзеячы праваслаўнай асветы (вось ён ужо сапраўды быў шчодрым фундатарам кнігадруку, арганізатарам друкарняў). Калі пагадзіцца з гэтым, вынікае, што на гравюры Скарыны — не герб Астрожскіх, а штосьці іншае. Скарыназнаўцам разам з геральдыстамі трэба яшчэ папрацаваць у гэтым напрамку. (У любым выпадку скарынаўская ілюстрацыя «Ізраілевы палкі ля храма» 1519 года — важная крыніца, якую не можа абмінуць даследчык гісторыі герба Астрожскіх.)

Дык ці быў знакаміты князь Астрожскі, пераможца масквіцян у Аршанскай бітве 1514 года, Канстанцін I, як часам называюць яго для адрознення ад сына, апекуном Скарыны? Паслухаем апанентаў.

---

[248] Славяноведение. 2001. № 2. С. 38.

Яшчэ А. Флароўскі лічыў неабгрунтаванай, не пацверджанай крыніцамі думку пра такое апякунства, выказаную нямецкім гісторыкам К. Фёлькерам у «Царкоўнай гісторыі Польшчы» (1930). Працытуем класічную манаграфію Флароўскага (1940–1946): «Völker (Kirchengeschichte, 107) нядаўна назваў выданне Скарыны — «eine vom Fürsten Konstantin Ostrorog (sic!) geförderte Übersetzung»[249], маючы на ўвазе, відаць, знакамітага князя Канстанціна Іванавіча Астрогскага, які быў у 1511–1522 гг. кашталянам віленскім, — але на чым грунтуе Völker гэта сваё сцверджанне, для нас незразумела, агульных дадзеных пра князя Канстанціна Іванавіча як пра мецэната і апекуна рускай праваслаўнай і духоўнай культуры для гэткага канкрэтнага сцверджання недастаткова»[250].

«У матэрыялах аб Скарыне імя князя Астрожскага наогул нідзе няма»[251], — канстатаваў Флароўскі праз чвэрць стагоддзя ў падагульняльным аглядным артыкуле «Skoriniana» (1968). І хоць выдатны скарыназнаўца дадаў з надзеяй: «Магчыма, праўда, пакуль што!», але такіх матэрыялаў няма, на жаль, і дагэтуль, калі не лічыць выяўленага даследчыкамі подпісу князя Астрожскага пад судовым дэкрэтам 1529 года па маёмаснай справе Скарынавай жонкі Маргарыты[252]. Гэта самы звычайны афіцыйны подпіс службовай асобы, які

---

[249] «Князем Канстанцінам Астрарогам (*sic!*) падтрыманы пераклад» (*ням.*).

[250] Флоровский А. В. Чешская Библия в истории русской культуры и письменности: (Фр. Скорина и продолжатели его дела) // Sborník filologický. Praha, 1940–1946. Sv. 12. S. 191.

[251] Флароўскі А. В. Skoriniana // 450 год беларускага кнігадрукавання. С. 399.

[252] Францыск Скарыны: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 91–92.

ніяк не можа служыць сведчаннем якіх-небудзь дадатковых стасункаў за парогам урадавай установы.

«Указанняў на князёў і баяр заходняй Расіі мы не знаходзім у Скарыны...»[253] — пісаў яшчэ ў пазамінулым стагоддзі аўтар першай грунтоўнай манаграфіі пра беларускага асветніка П. Уладзіміраў.

Глыбокія знаўцы эпохі сцвярджаюць, што магнаты, як і высокія царкоўныя іерархі, не падтрымалі Скарыну. Вячаслаў Чамярыцкі ў палымянскім артыкуле «...Народу свайму ўслугуючы» (1987) адзначыў: «Можна, напрыклад, яшчэ зразумець, чаму кнігавыдавецкая культурна-асветніцкая дзейнасць Скарыны не магла знайсці падтрымкі ў ярага каталіка, літоўскага арыстакрата, канцлера Альбрэхта Гаштольда. Куды цяжэй вытлумачыць, чаму міма нашага гуманіста прайшлі магутныя беларуска-ўкраінскія магнаты і праваслаўная царква Вялікага княства Літоўскага, зусім не бедная тады. Жывучы ў нялёгкіх умовах у Вільні, Скарына хутчэй знайшоў пэўную дапамогу і падтрымку ў мясцовага каталіцкага біскупа, чым у праваслаўнага мітрапаліта. А беларускі ж гуманіст выдаваў свае кнігі ў першую чаргу для праваслаўнай Русі»[254].

У дакладзе «Індывідуальнасць Францыска Скарыны» на Першых скарынаўскіх чытаннях (1986) Алег Лойка тлумачыў гэта непрыняццем ідэй гуманізму вярхамі тагачаснага феадальнага грамадства: «Феадалізм увайшоў тут у поўную сілу не дзеля таго, каб спрыяць ідэі Скарыны з яго службай паспольству, з яго мірнай місіяй кніжніка. Таму Скарыну і не падумалі падтрымліваць ні князь Канстанцін

---

[253] Владимиров П. В. Доктор Франциск Скорина... С. 48.
[254] Полымя. 1987. № 8. С. 203.

Іванавіч Астрожскі, ні Радзівілы, ні Альбрэхт Гаштольд, ваявода віленскі, канцлер усёй дзяржавы. Такім чынам, і ў гэтай сувязі Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае нібы незаконнароджанага сына свайго Скарыну ад сябе адкідвала: Скарыну адкідвалі ад Белай Русі цёмныя феадальныя сілы краіны»[255]. Безагаворачнае прылічэнне ўсіх пералічаных дзеячоў да «цёмных феадальных сіл», мабыць, не зусім карэктнае, але тое, што іх памкненні не супадалі з памкненнямі Скарыны, у чымсьці важным розніліся, разыходзіліся, гэта праўда. Працягваючы гэтую размову ў навейшым даследаванні «Старабеларуская літаратура» (2001), Лойка звяртае ўвагу на незалежнасць Скарыны ў поглядах і ўчынках, на ўласцівае яму пачуццё ўласнай годнасці: «Апошняе, відаць, у найбольшай ступені размяжоўвала Ф. Скарыну з феадальнымі вярхамі Вялікага княства Літоўскага і праваслаўна-славянскай арыентацыі (князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі), і каталіцка-літуанскай лініі (віленскі ваявода Альбрэхт Гаштольд). Незалежнасцю сваіх поглядаў і ўчынкаў адмежаваўся Ф. Скарына і ад лютэранскай арыентацыі, парваўшы з прускім князем Альбрэхтам»[256].

Добра сказаў пра Скарыну святар і даследчык Адам Станкевіч, выдатна абазнаны ў канфесіянальнай праблематыцы: «...ён ня быў абаронцам ці стороннікам аднаго з успомненых вызнаньняў у вузкім значэньні. Ён быў вялікім Беларусам хрысьціянінам і гуманістам агулам, каторы даў Біблію як аснову тады ўсякай веды Беларускаму народу ў яго роднай беларускай мове і заклаў асновы да ўводзін гэтага на-

[255] Спадчына Скарыны: Зб. матэрыялаў Першых скарынаўскіх чытанняў, 1986. С. 73.

[256] Лойка А. А. Старабеларуская літаратура. С. 291.

роду ў агульналюдзкую сям'ю»[257]. У гэткім жа духу выказваўся англійскі скарыназнаўца Г. Пікарда: «Людзі пытаюць: быў ён католік, праваслаўны ці пратэстант. Я думаю, што ён быў проста хрысціянін»[258] (інтэрв'ю газеце «Наша слова», 1992). Шмат цікавых думак аб канфесіянальнай і грамадскай талерантнасці нашага асветніка прыведзена ў дакладзе А. Мальдзіса на X Міжнародным з'ездзе славістаў «Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў» (1988). Ужо сама назва даклада добра перадае галоўны ідэйны стрыжань, маральна-этычны рухавік дзейнасці Скарыны. Наш вялікі асветнік эпохі Адраджэння рабіў асноўную стаўку на тое, што аб'ядноўвала, а не раз'ядноўвала людзей.

Чалавек вельмі шырокіх поглядаў, а магчыма, і прыхільнік ідэй сусветнай царкоўнай уніі (пра гэта таксама гавораць даследчыкі, у прыватнасці У. Конан, І. Саверчанка), Скарына спрабаваў прымірыць розныя плыні хрысціянства і ў выніку пазбавіўся падтрымкі як праваслаўных, так і каталіцкіх артадоксаў.

Ці заўсёды ўлічваюць гэта даследчыкі? На жаль, не. У артыкуле «Магнаты і кнігадрукаванне ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI стагоддзі» (зб. «Марцінас Мажвідас і духоўная культура ВКЛ», 1999) вядомы сучасны генеалог А. Нарбут, назваўшы шэраг друкарняў той эпохі, уключаючы друкарню Скарыны, робіць выснову: «Такім чынам, усе пералічаныя друкарні былі створаны і існавалі на сродкі і пры

---

[257] Станкевіч А. Доктар Францішак Скарына — першы друкар беларускі: 1525–1925. Вільня, 1925. С. 24.

[258] Пікарда Г. «Беларус мае добрую рэпутацыю ва ўсім свеце» // Наша слова. 1992. № 30. С. 4.

падтрымцы магнатаў ВКЛ»[259]. Выснова гэта слушная толькі часткова. Самае яскравае і важнае кнігавыдавецкае прадпрыемства XVI ст. (друкарская дзейнасць Скарыны) не мае хоць колькі-небудзь даведзенай сувязі з магнатамі. Магнаты, у залежнасці ад сваіх поглядаў і гістарычнай сітуацыі, гатовыя былі падтрымаць ясна абазначаных каталікаў, праваслаўных, пратэстантаў і не падтрымалі гуманіста Скарыну.

Ён знайшоў апору ў гараджанах. Пра гэта з рознай нагоды пісалі многія даследчыкі. І не толькі беларускія або рускія. Так, выдатны ўкраінскі гісторык Міхайла Грушэўскі, не бачачы «магнацкіх рук» у «манументальнай справе» Францыска Скарыны, указваў на мяшчанскае асяроддзе Беларусі і Украіны як на жыватворную глебу, на якой расквітнела кветка Скарыны[260]. Можна пагадзіцца ў цэлым з беларускім літаратуразнаўцам 1920-х гадоў прафесарам М. Піятуховічам, які сказаў у характэрнай стылістыцы свайго часу, што «Францішак Скарына і яго дзейнасьць уяўляюць сабой арганічны прадукт гарадское культуры, якая разьвінулася ў нас на аснове гандлёвага капіталу»[261].

Скарына — месціч-гараджанін па нараджэнні, па паходжанні, па духу. Ёсць свая глыбокая заканамернасць у тым, што ён прыйшоў на свет у буйнейшым на той час горадзе Беларусі (калі браць яе сённяшнія межы) Полацку, выбітным гандлёвым цэнтры, порце на мнагаводнай рацэ, гербам яко-

---

[259] Мартинас Мажвидас и духовная культура Великого княжества Литовского XVI века. Вильнюс; М., 1999. С. 98.

[260] Гл.: Грушевський М. Історія української літератури. Київ, 1926. Т. 5. С. 119–137.

[261] Піятуховіч М. Францішак Скарына і яго літаратурная дзейнасць // 400-лецце беларускага друку. С. 176.

га быў карабель пад парусамі. Карабель як сімвал адкрытасці перад светам, сімвал зведаных і нязведаных шляхоў, сімвал пераадолення межаў і адлегласцяў[262]. У Полацку пачатак дарог Скарыны. У Вільні, сталіцы рэгіёна, дзе, магчыма, яму давялося быць шкаляром[263], ён знайшоў уплывовых аднадумцаў і паплечнікаў. Кракаў, дзе быў студэнтам, уганараваў яго дыпломам бакалаўра, бліскучая італьянская Падуя — высокай ступенню доктара медыцыны. «У славном старом месте Празском» ён здзейсніў сваю мару — надрукаваў «Рускую Біблію» на звыклай і зразумелай «паспалітым людзям» мове. Бываў у Каралеўцы (Кёнігсбергу) і іншых гарадах Еўропы. Скарына любіў горад. Цёплыя, удзячныя словы ён знаходзіў у сваіх выданнях для роднага Полацка, для Вільні, з якой цесна звязаў сваё жыццё, для мілай старой Прагі. Ілюстрацыі яго кніг напоўнены гарадскімі краявідамі (гравюры «Памазанне Давіда», «Давід перад ківотам», «Асада Іерусаліма» з 1-й, 2-й і 4-й кніг «Царствы», «Плач Ераміі» з аднайменнай кнігі і інш.), размаітымі вобразамі звабліваў гарадской мітульгі: жывыя, дынамічныя малюнкі новабудоўлі (3-я кніга «Царствы»), вучонага дыспуту (кніга «Ісус Сірахаў») і г. д.

Гарады — вельмі даўняе спараджэнне цывілізацыі — на парозе эпохі Адраджэння былі прадвеснікамі новага жыцця, правобразамі новых сацыяльна-вытворчых адносінаў. «Гарадское паветра робіць свабодным», — гаварыла старая нямецкая прымаўка. Параўнальна (па сённяшніх мер-

---

[262] Сімвалазнаўцы лічаць карабель эмблемай паспяховага плавання, дасягнення мэты, а таксама марскога гандлю. Гл.: Энциклопедия символов, знаков, эмблем / Авт.-сост. К. Королев. М., 2005. С. 302.

[263] Кісялёў Г. Ці быў Скарына віленскім шкаляром? (Апокрыф Кіркора і сучасныя падыходы) // Скарыніч. Мінск, 2002. Вып. 5.

ках) невялікія, сціснутыя мурамі, гарадскія паселішчы ўяўляліся людзям той далёкай эпохі гігантамі, своеасаблівымі мегаполісамі, «гарадамі-сонцамі», як характарызуюць іх гісторыкі[264]. Расійскі даследчык А. А. Сванідзе ў калектыўнай манаграфіі, прысвечанай еўрапейскаму гораду позняга сярэднявечча, так акрэслівае характэрныя энергічныя рытмы і рысы тагачаснага гарадскога соцыуму: «У горадзе купляліся і прадаваліся прадукты працы і сама праца, рамесныя вырабы і сельскагаспадарчыя прадукты, веды і грошы. Сам горад уяўляў сабой важны рынак збыту і наогул сферу прымянення для самых разнастайных формаў дзейнасці: яго грамадскія і прыватныя пабудовы, абаронныя і іншыя збудаванні, арсенал, манетная майстэрня і г. д. — дыктавалі попыт на лес і цэглу, на працу будаўнікоў, мастакоў, ваенных інжынераў; горад меў патрэбу ў салдатах, асобах, гатовых прапанаваць платныя паслугі, аптэкарах і настаўніках, натарыусах і вартаўніках і многіх іншых»[265]. Дададзім, што кнігадрукаванне, якое цікавіць нас у першую чаргу, абапіралася на пэўныя тэхнічныя дасягненні свайго часу, на спецыялістаў рознага профілю (якія маглі б кваліфікавана спраектаваць і зрабіць друкарскі станок, распрацаваць і адліць шрыфты, выканаць дрэварыты і г. д.). Такіх спецыялістаў лёгка было адшукаць у горадзе, дзе канцэнтравалася разнастайная рамесная вытворчасць.

Побач з майстрамі, рамеснікамі вядучую ролю ў жыцці гарадоў адыгрывала купецтва. Прафесія купца, дзе ўсё залежала ад асабістых якасцяў, была прываблівай для энергічных,

---

[264] Город в средневековой цивилизации Западной Европы. Т. 1. Феномен средневекового урбанизма. М., 1999. С. 172.

[265] Тамсама. Т. 2. Жизнь города и деятельность горожан. М., 1999. С. 8.

ініцыятыўных, смелых і кемлівых людзей. Гэта знайшло адлюстраванне ў тагачаснай літаратуры. Адзін з персанажаў скарынаўскага сучасніка Эразма Ратэрдамскага дзеліцца перажытым: «Ад прыроды я быў прагны да новых уражанняў, хацеў убачыць чужыя землі і гарады, спазнаць чужыя мовы і норавы, а найлепшыя магчымасці для гэтага даваў, як мне здавалася, гандаль. Да таго ж з мноства новых звестак нараджаецца дасведчанасць, разважлівасць»[266]. Надзвычайнай папулярнасцю карысталася «Кніга аб разнастайнасці свету» нястомнага падарожніка Марка Пола. Ёю захапляўся мараплавец Калумб. Гэта былі часы вялікіх геаграфічных адкрыццяў, часы пазнання зямлі да самых далёкіх і цяжкадаступных яе закуткоў. Не дзіўна, што сярод купцоў-першапраходцаў было нямала адукаваных людзей, купцы часцяком рабіліся пераносчыкамі навамодных ідэй, перадавога вопыту, распаўсюджвальнікамі культурных навінак.

Самабытныя месты-гарады Вялікага княства, падтрыманыя магдэбургскім правам[267], перажывалі ў той час перыяд уздыму, стараліся ва ўсім браць прыклад з заходнееўрапейскіх гарадоў. У вялікіх гарадскіх асяродках ВКЛ утварылася досыць багатая і ўплывовая эліта з вярхушкі купцоў і рамеснікаў. Купцы Беларусі-Літвы мелі самыя шырокія і трывалыя міжнародныя сувязі. Гэта было прадвызначана самім геаграфічным становішчам краю. Беларускі даследчык В. Дружчыц у свой час так ахарактарызаваў абсягі гандлёвых інтарэсаў, дзела-

[266] Эразм Роттердамский. Разговоры запросто. М., 1969. С. 230.

[267] Гады надання самакіравання на падставе т. зв. магдэбургскага права, прыстасаванага да мясцовых умоў: Вільня — 1387, Берасце — 1390, Коўна — 1408, Кіеў — 1494–1497, Гародня — 1496, Полацк — 1498, Менск —1499, Новагародак — 1511, Магілёў — 1577, Віцебск — 1597, Смаленск — 1611.

вых кантактаў віленскіх купцоў скарынаўскай эпохі: «Места Вільня вядзе ў XVI сталецьці значны гандаль. Яна гандлюе з Рыгаю, Псковам, з Польшчай, Прусіяй, Сылезіяй, Вэнгрыяй і іншымі заходня-эўрапейскімі дзяржавамі і местамі. У Вільні знаходзіцца склад прывазных сукон, якія адсюль развозяцца па іншых гарадох. Вільня з'яўляецца пасярэднікам у гандлі Маскоўскага княства з Заходняй Эўропай. Праз тэрыторыю Літоўска-Беларускага княства ішлі ў Маскоўшчыну косы, серабро і іншыя рэчы. З Масквы ішлі ў Вільню і далей — у Заходнюю Эўропу — „косматыя скуры" (хутры), лён, пянька і іншыя тавары. Літоўска-Беларускае княства вывозіць у XVI сталецьці лес, жыта, ячмень, пшаніцу, авёс, гарох, воск, мёд, сала, хмель, дзёгаць, смалу, касматыя скуры, скуры жывёлы, жывую жывёлу і іншую сыравіну. З Эўропы прывозіцца сукно, бавоўна, тонкае палатно, вырабы з жалеза, медзі, сталі, дарагія каменьні, конская збруя, польскае і вэнгерскае шкло, цукар, розныя карэньні, селядцы і соль»[268]. Польскі гісторык Р. Рыбарскі адзначае прыярытэт Вільні ў гандлёвых кантактах з Ганзай (на яго думку, у гэтых адносінах са сталіцай ВКЛ не мог параўнацца ніводзін горад Польшчы)[269]. А гэта зноў адкрывала перад «ліцвінамі» шырокія далягляды, спрыяла еўрапеізацыі. Не саступаў Вільні і Полацк, здаўна добра вядомы дзелавым людзям Еўропы. Апошнім часам археолагі адкапалі тут разлеглы старажытны пасад. Паводле паведамленняў прэсы, «у знойдзенай частцы горада жылі купцы, рамеснікі, у асноўным заможны люд. Каля берага меўся прычал, у які заходзілі замежныя ганд-

[268] Дружчыц В. Места Вільня ў першай палове XVI сталецьця // 400-лецьце беларускага друку. С. 118.

[269] Rybarski R. Handel i polityka handlowa Polski w XVI w. Poznań, 1928. T. 1. S. 271.

лёвыя караблі»[270]. Цікава, што полацкія майстры-рызыканты ў XV–XVI стст. наладзілі масавую чаканку манеты суседняй Лівоніі і літаральна наваднілі рынак сваімі «падпольнымі» вырабамі[271]. Палачане высока трымалі галаву, ганарыліся сваім горадам. «А Полтеск теж есть хвалячи бога место словутное, как и которое, а не есть нижшое во чести и во всем ни Вильни, а ни Мариборка, а ни Кданьска»[272], — з годнасцю гаварылася ў пасланні палачан у Рыгу 1464 года. Старажытны горад на Дзвіне станавіўся тут упоравень не толькі з Вільняй, але з буйным балтыйскім портам Гданьскам і грознай сталіцай крыжакоў Мальбаркам (Марыенбургам). Цікавыя тут нават маштабы супастаўлення, сам падбор аб'ектаў для параўнання.

Купецкі занятак (рамесніцкі таксама), як правіла, перадаваўся з пакалення ў пакаленне. У Вільні, Полацку, іншых гарадах узніклі цэлыя купецкія дынастыі, якія валодалі немалымі капіталамі. Асабліва вялікія прыбыткі прыносіў замежны гандаль. Па назіраннях гісторыка З. Капыскага, «... буйныя аперацыі пераважалі ў купецтва, звязанага з іншаземным гандлем, унутраны ж гандаль не стварыў колькінебудзь прыкметнай групы багатых людзей»[273]. Гісторыкі адшукалі красамоўныя дакументальныя сведчанні аб нешараговым, вытанчаным побыце, прадметах раскошы, якімі акружалі сябе разбагацелыя на прыбытковых гандлёвых аперацыях купцы. Так, пералік залатога і сярэбранага посуду,

[270] Звязда. 2007. 27 крас.

[271] Юргенсон У. Фальшывая валюта як... помнік увішнасці // ЛіМ. 2007. 15 чэрв.

[272] Хорошкевич А. Л. Полоцкие грамоты XIII — начала XVI в. М., 1977. Т. 1. С. 220.

[273] Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Минск, 1966. С. 156.

тавараў, хатніх рэчаў, адзення ў тастаменце полацкага купца Хадыкі (1626) займае некалькі старонак шчыльнага тэксту. Характэрная дэталь — на заходнееўрапейскі манер сцены яго дома ўпрыгожвалі «16 карцін на палатне»[274]. Няхай гэта трохі пазнейшы перыяд, але ў скарынаўскія часы жыццё было больш стабільным і, вынікае, умовы для гандлю лепшыя. А значыць, былі і стабільныя прыбыткі. Абзаводзіліся самавітыя, «славетныя» купцы таксама кнігамі, у тым ліку і скарынаўскага друку[275]. А «Року тысяча пятьсотъ пятьдесятъ осмого» (1558) заможныя віцебскія мяшчане запісалі на Рынкавую Уваскрасенскую царкву ў сваім горадзе асобнік чацвёраевангелля, толькі што выдадзенага ў Маскве[276]. Кнігі не ведалі межаў.

Калі ўзяць непасрэдна скарынаўскія часы, багаццем, энергіяй, шырокімі сувязямі вылучаўся сярод іншых віленскі радца (сябра магістрата) Багдан Онкаў, які прычыніўся да выдавецкага праекта Скарыны. Онкаў — далёка не нуварыш. За ім стаяла трывалая сямейная традыцыя. Ужо бацька яго ўдачлівы купец Онка Грыцэвіч настолькі цвёрда стаяў на нагах, што пазычаў грошы вялікаму князю.

Ды і брат Скарыны Іван, полацкі, а потым і віленскі купец, таксама чалавек з размахам, вёў шырокі міжнародны

---

[274] Тамсама. С. 51.

[275] Копысский З. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Минск, 1975. С. 70.

[276] Лабынцаў Ю. Віцебскі запіс на першай рускай кнізе // ЛіМ. 1986. 12 верас. Гэта самы стары і таму вельмі каштоўны для навукі запіс на рускай недатаванай кнізе. Дарэчы, звяртае на сябе ўвагу, што ў Віцебску, як і наогул у ВКЛ, датавалі тады па-еўрапейску ад нараджэння Хрыста (так датаваў свае кнігі і Скарына), а ў Маскоўскай дзяржаве прытрымліваліся летазлічэння ад стварэння свету.

гандаль скурамі і футрамі. Гэта быў тады самы хадавы тавар у Еўропе. Дакументы сведчаць, у прыватнасці, што Іван меў гандлёвы склад у Познані (на захадзе Польшчы), дзе на момант яго смерці (1529) засталося каля 50 тысяч скур рознага памеру і якасці[277]. Усё гэта дае падставу разглядаць Івана як аднаго з магчымых фундатараў выдання «Рускай Бібліі».

Гісторыкі адзначаюць сувязь гарадоў з рэфармацыйнымі ідэямі, блізкімі і Скарыну. Паводле слоў З. Капыскага, «эканамічнае жыццё гарадоў і народжаныя ім маёмасныя і сацыяльныя кантрасты жывілі грамадскія погляды беларускіх гуманістаў і прадстаўнікоў рэфармацыйнага руху»[278]. Яшчэ больш канкрэтызуе гэтую думку Г. Галенчанка: «У грамадскай дзейнасці гандлёва-прадпрымальніцкіх слаёў віленскага мяшчанства выразна адчуваліся секулярызацыйныя, у пэўным сэнсе рэфармацыйныя тэндэнцыі»[279].

Адным словам, багатае купецтва гарадоў ВКЛ, у першую чаргу Вільні і Полацка, было тым асяроддзем, дзе Францыск Скарына знайшоў сваіх прыхільнікаў і спрыяльнікаў. Для падтрымкі Скарыны купцы мелі фінансавыя магчымасці. Не менш важнай была духоўная зацікаўленасць гарадской эліты.

Трэба адзначыць адну асаблівасць гарадской эліты ВКЛ і Польшчы. Пры ўсёй сваёй фінансава-эканамічнай моцы яна ў адрозненне ад бюргерства Захаду не мела палітычных правоў у маштабе дзяржавы. Польскі гісторык Ю. Бардах піша пра гэта так (з выкарыстаннем часам нязвыклай для

---

[277] Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 115–119, 328.

[278] Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. С. 201.

[279] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 132.

нас тэрміналогіі): «Пры феадальным ладзе найвышэйшыя ўзроўні ў грамадскай ерархіі займалі ўласнікі зямельных уладанняў, што ўдзельнічалі ў ажыццяўленні ўлады і былі носьбітамі дзяржаўнай ідэі. У бальшыні краін Заходняй Еўропы да палітычнага народу належала таксама цалкам або часткова заможнае мяшчанства — багатыя купцы, гарадскі патрыцыят. У польска-літоўскай Рэчы Паспалітай да палітычнага народу належала выключна шляхта»[280]. Такім чынам, самы багаты, «славетны» віленскі або полацкі купец у палітычным сэнсе належаў да «паспольства», якому найперш былі адрасаваны скарынаўскія выданні.

Сама ідэйная накіраванасць дзейнасці Скарыны атрымлівала жывы водгук сярод адукаваных гараджан. Ісці ў Еўропу, але заставацца сабой («Руссю» — Беларуссю) — асноўная патрыятычная ідэя Скарыны. На грунце фундаментальных хрысціянскіх каштоўнасцяў, у яго заўсёды максімальна набліжаных да рэаліяў жыцця, увязаных з паўсядзённасцю, наш асветнік прапаведаваў мір і згоду, адкрытасць, гэтак патрэбныя дзелавым людзям. А «Малая падарожная кніжка», выпушчаная ў Вільні каля 1522 года, ужо наўпрост адрасавана вечным падарожнікам-купцам, была для іх духоўным падмацункам у дарозе.

Яны першыя і ацанілі і сам цуд кнігадрукавання, і гуманістычныя канцэпцыі Скарыны.

Дзейнасць Скарыны маглі падтрымаць і асобныя асвечаныя прадстаўнікі шляхецкага саслоўя. Уся эканоміка ВКЛ, Беларусі-Літвы ў скарынаўскія часы была на ўздыме, паўсюль

[280] Бардах Ю. Ад палітычных да этнічных народаў у Цэнтральна-Ўсходняй Еўропе // Бардах Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2002. С. 318.

выраслалі новыя паселішчы, унушальныя замкі і храмы, хаця фінансавыя магчымасці ўладальнікаў маёнткаў сярэдняй рукі былі, мабыць, меншыя, чым у купецкай эліты.

Скарыну для здзяйснення высокіх асветніцкіх планаў патрэбны былі аднадумцы, паплечнікі, спрыяльнікі, як і сам ён быў патрэбны прыхільнікам прагрэсу. Формы партнёрства і супрацоўніцтва маглі быць розныя. Вядомы кнігазнавец У. С. Люблінскі на еўрапейскім матэрыяле абмалёўвае магчымыя сцэнарыі так: «І на абзавядзенне, і на ўласна выпуск кнігі, а асабліва на яе камерцыйную рэалізацыю вельмі часта было больш лёгка асмеліцца не паасобку. Адсюль — кампаніі як форма раўнапраўнага вытворчага саюзу без відавочна выяўленай спецыялізацыі ўдзельнікаў. Калі ж друкар працуе самастойна [...] ва ўсіх гэтых выпадках ён будзе зацікаўлены ўвайсці ў дагаварныя дачыненні з чалавекам, які, хоць і не будзе дзяліць працы ўнутры друкарні, дасць неабходныя сродкі, паставіць паперу і да т. п., а галоўнае, адразу аплаціць увесь тыраж (або, як нярэдка бывала, абумоўленую яго частку). Гэткай асобай звычайна з'яўляўся які-небудзь паспяховы друкар ці кнігагандляр, але вельмі часта і грашавіты чалавек, зусім з кнігадрукаваннем не звязаны»[281]. Для Беларусі скарынаўскага часу, улічваючы спецыфічнасць асобы і дзейнасці Скарыны, такім чалавекам перш за ўсё мог быць купец.

Хто ж канкрэтна стаяў або мог стаяць за Скарынам? Хто працягнуў яму руку дапамогі? Хто ўспрыняў яго справу як сваю асабістую? Прыгледзімся да некаторых цікавых з гэтага пункта погляду персаналій.

---

[281] Люблинский В. С. На заре книгопечатания: Пособие для учителей. Л., 1959. С. 111.

2. Багдан Онкаў, дзеславы чалавек скарынаўскай эпохі

Яшчэ ў першай палове XIX ст. дапытлівыя даследчыкі мінулага, заўзятыя аматары кніжных рэдкасцяў, нястомныя вышукоўцы старадрукаў, інкунабулаў і палеатыпаў заўважылі на ўцалелых у віхурах гісторыі экзэмплярах Скарынавых кніг надпісы: «А то ся стало накладом Богдана Онкова сына радци места виленского». Калі асучасніць мову, атрымаецца: «А гэта сталася (здзейснілася, адбылося) коштам Багдана Онкава сына (Онкавіча), радцы (саветніка) места (горада) Вільні». У такой нязменнай форме (часам чытаюць — Оньнкаў) надпіс паўтараўся на тытульных лістах (як выключэнне — у канцы) многіх кніг. У адным выпадку тэкст больш сціслы, быццам бы падкарочаны: «А накладом Богдановым Онковичз виленского места». Надпісы зроблены ад рукі вельмі акуратна (прынамсі старанна) у духу друкаваных літар. Рабіліся яны толькі на першых пражскіх выданнях і не на ўсіх экзэмплярах, а на частцы тыражу. Гэта кнігі 1517 года Псалтыр, «Іоў», «Прытчы», «Ісус Сірахаў», 1518 года «Эклезіяст» і «Прамудрасць». Усяго, па скрупулёзных падліках спецыялістаў, захаваўся 71 экзэмпляр названых кніг з тытульнымі лістамі. На іх выяўлена 19 запісаў, гэта значыць 26,76% кніг з запісамі, або, прасцей кажучы, кожная чацвёртая кніга[282].

Пасля выхаду кнігі «Прамудрасць» (19 студзеня 1518 года) новых надпісаў такога кшталту на Скарынавых выданнях не было, ва ўсякім выпадку яны невядомыя.

---

[282] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 152.

Надпісы выяўлены на ўсіх пражскіх выданнях першапачатковага перыяду хіба за выключэннем кнігі «Песня песням» (9 студзеня 1518 года), хоць гэтай кнігі ў розных бібліятэках і музеях свету захаваўся цэлы дзесятак экзэмпляраў (з іх пяць з тытуламі).

Даследчыкі з розных бакоў абдумвалі сітуацыю з надпісамі і адначасова па крупінках збіралі звесткі пра таямнічага Багдана Онкава.

Ясна, што надпісы ў спалучэнні з тытульнымі звесткамі фіксавалі ўзаемаадносіны фундатара і выдаўца: фундатар фундаваў, выдавец выдаваў. Няяснасці пачыналіся потым — з наступных пытанняў.

а) Хто ён, фундатар, — бескарыслівы асвечаны мецэнат або проста камерсант-заказчык, дзелавы чалавек, які адчуў магчымасць падзарабіць і вырашыў пагрэць на новай справе кнігадрукавання ўчэпістыя рукі?

б) Чаму надпісы зроблены ад рукі, а не выкананы друкарскім спосабам разам з астатнім тэкстам?

в) Дзе (у Празе? Вільні?) і кім яны, гэтыя надпісы-прыпіскі, рабіліся?

г) Чаму надпісы знаходзім толькі на частцы тыражу?

д) Што азначае іх знікненне?..

Словам, пытанняў было шмат. Гісторыя давала скарыназнаўцам унікальны, надзвычайны шанц пранікнуць у таямніцу з'яўлення Скарынавых кніг, які аніяк нельга было ўпусціць. І вучоныя, умудроныя ў росшуках мужы шчыравалі.

Цікава назіраць, як паступова назапашваліся веды вакол гэтай загадкі, як сутыкаліся думкі вучоных розных пакаленняў.

Яшчэ ў далёкім 1813 годзе адзін з заснавальнікаў рускага кнігазнаўства Васіль Сцяпанавіч Сопікаў, апісваючы ў сваім «Вопыце расійскай бібліяграфіі» экзэмпляр Скарынаўскага «Эклезіяста» з бібліятэкі графа Ф. А. Талстога, пазначыў: «На першай старонцы гэтай кнігі знаходзіцца наступны подпіс: А тося стало накладом (иждивением) Богдана Анкова сына, Радци Виленского. Літары цалкам падобныя з друкаванымі; гэта прымушае меркаваць, што надпіс гэты зроблены неўзабаве пасля надрукавання кнігі»[283].

Звяртае на сябе ўвагу форма «Анкова». Магчыма, гэта рэальны варыянт скарынаўскіх часоў (жывая беларуская мова любіць варыянтнасць), а магчыма, недагляд таго ж Сопікава — праверыць нельга, бо гэты паасобнік з бібліятэкі Талстога да нас не дайшоў.

Археограф і кнігазнавец Аляксей Ягоравіч Віктараў у артыкуле «Цудоўнае адкрыццё ў старажытнарускім кніжным свеце» (1867 год — гаворка ішла пра сенсацыйную для таго часу знаходку невядомага раней поўнага экзэмпляра скарынаўскага першынца — Псалтыра) меркаваў, што словы аб Онкаве прызначаліся для публікацыі і толькі «па памылцы не трапілі ў друк»[284]. Пазней яму вельмі слушна, лагічна пярэчыў гісторык-славіст Антоній Васільевіч Фларовскі ў сваёй вядомай манаграфіі «Чэшская біблія ў гісторыі рускай культуры і пісьменнасці» (Прага, 1940–1946): «... як была магчымая

[283] Сопиков В. Опыт Российской Библиографии, или Полный словарь сочинений и переводов, напечатанных на Славенском и Российском языках от начала заведения типографий до 1813 года. СПб., 1813. Ч. 1. С. 40.

[284] Викторов А. Замечательное открытие в древнерусском книжном мире (Первая книга, напечатанная доктором Фр. Скориной) // Беседы в Обществе любителей российской словесности при Имп. Московском университете. 1867. Вып. 1. Отд. 1. С. 5.

такая сістэматычная памылка пры рабоце больш двухгадовай працягласці? Прыпіскі аб Онькаве ёсць на экзэмплярах кніг Скарыны рознага часу выхаду ў свет»[285]. «Вельмі цікава пры гэтым, — разважаў удумлівы даследчык, — што Скарына праз друк высоўвае на першае месца сваю ўласную ролю ў выдавецкай працы, шмат разоў паўтараючы сваё поўнае імя з прывядзеннем і свайго звання, а Онькаў імянуецца толькі дадаткова на экзэмплярах біблейскіх кніг і толькі ў рукапісных прыпісках, сучасных, праўда, самому выданню. Складваецца ўражанне, што Онькаў нібыта пазней уступіў у справу, калі ўжо быў закончаны набор і выпуск кніг, гэта значыць як быццам ён ужо гатовае выданне закупіў пасля яго заканчэння, чаму і спатрэбіліся хаця б запозненыя адзнакі, што „то ся стало накладом Богдана Онькова сына"»[286]. Развагі Флароўскага заўсёды вельмі лагічныя, абгрунтаваныя. З імі цяжка спрачацца. Як было ўжо сказана, «накладам» тут азначае «коштам». Онкаў — фундатар. Але можна думаць, Онкаў ужо на раннім этапе прымаў дзейсны ўдзел у фінансаванні і арганізацыі ўсёй велізарнай справы па выданні Бібліі. Акурат так разумеў, напрыклад, сітуацыю дасведчаны бібліяфіл пазамінулага стагоддзя Іван Пракопавіч Каратаеў, які ў сваім «Апісанні славянарускіх кніг» (1883) заўважыў у дачыненні да пражскай Бібліі Скарыны: «З сучасных прыпісак, якія знаходзяцца ў некаторых кнігах, даведваемся, што яна выдана коштам віленскага саветніка Багдана Онькава...»[287] У

[285] Флоровский А. В. Чешская Библия в истории русской культуры и письменности (Фр. Скорина и продолжатели его дела) // Sbornik filologický. Praha, 1940–1946. Sv. 12. S. 192.

[286] Тамсама. С. 191–192.

[287] Каратаев И. Описание славянорусских книг, напечатанных кирилловскими буквами. СПб., 1883. Т. 1. С. 29.

такім жа духу выказваўся і яго сучаснік Міхаіл Аляксандравіч Максімовіч, паводле прынятых сучасных дэфініцый, вучоны ўкраінскі і рускі, што, вядома ж, зусім не замінала яму лічыць Скарыну «нашым»: «Там [у Празе] у 1517–19 гадах надрукаваны быў па частках пераклад Бібліі нашага палачаніна Скарыны пад назвай: Біблія Руска, коштам Багдана Онькав, у 4-ку»[288].

Выдатны ўкраінскі гісторык Міхаіл Грушэўскі пытанне пра звязаныя з Онкавым прыпіскі разглядаў у шырокім кантэксце агульнай праблемы сацыяльнай апоры скарынаўскай дзейнасці. Згадаўшы Онкава, а разам і Бабіча, вучоны з поўнай падставай сцвярджаў: «Гэтыя факты праліваюць святло на тую культурную сферу, у якой развіваліся новыя асветныя і культурныя інтарэсы — гэта заможнае, дастаткова асвечанае мяшчанства большых беларускіх местаў, перадусім Вільні, папярэднікі пазнейшых мецэнатаў пісьменства і асветы — Мамонічаў, Зарэцкіх і іншых»[289]. Прыпіскі на Скарынавых кнігах займалі Грушэўскага і значна пазней, калі ён працаваў над не менш манументальнай «Гісторыяй украінскай літаратуры». Цікава, што ў сваіх новых высновах ён часткова аспрэчваў сябе маладзейшага. «Мажліва, — пісаў вучоны, — што гэтая сігнатура (прыпіскі пра Онкава. — *Г. К.*) была дададзена да іх яшчэ пры выпуску гэтых кніг са складу, па жаданні накладцы (фундатара; гаворка пра Онкава. — *Г. К.*). Але наўрад ці і гэтае тлумачэнне пра ўдзел у выданні Багдана Онькавіча вырашае справу. Параўнанне такога імпазантнага размаху пражскага выдавецтва з яго даволі сціплым працягам у самой Вільні (толькі дзве кнігі!) прыводзіць да думкі,

---

[288] Максимович М. А. Собр. соч. Киев, 1880. Т. 3. С. 663.

[289] Грушевський М. С. Історія України — Руси. Київ; Львів, 1907. Т. 6. С. 429.

што дапамогай асобных віленскіх мяшчан справа, мабыць, не скончылася. Мусіць, пражскае прадпрыемства Скарыны мела за сабой нейкую большую і мацнейшую групу ці арганізацыю — мажліва, тую самую, якая высунула папярэдняе выдавецтва Фіёля»[290]. Ацэньваючы гэтую думку паважанага вучонага, як заўсёды, маштабную, трэба мець на ўвазе натуральнае імкненне Грушэўскага як украінскага патрыёта цясней звязаць Скарыну з Украінай (Ш. Фіёль працаваў у Кракаве ў непасрэднай блізкасці ад заходнеўкраінскіх земляў). Цяжка пазбавіцца ад уражання, што Грушэўскі прымяншае ў дадзеным выпадку значэнне Онкава і ўсяго віленскага купецка-мяшчанскага асяродку. Тым не менш у кожным разе для нас каштоўная агульная выснова выдатнага дзеяча навукі і культуры, што апорай Скарыны, як і Фіёля, былі гараджане, а магчыма — дапускаў вучоны — і асобныя прадстаўнікі сярэдняй (шараговай) шляхты.

Свой уласны погляд на надпісы, звязаныя з Онкавым, меў беларус Ігнат Дварчанін (1895–1937). Як бачым, пражыў ён нядоўга, яго жыццё абарвалася ў сумнай памяці 1937 годзе. Дзеяч беларускага нацыянальнага руху, знаўца літаратуры і сам паэт, ён у той жа час меў схільнасць да навуковай працы, умеў быць аб'ектыўным. Захавалася яго цікавая характарыстыка, зробленая таварышам па салавецкай высылцы: «Бледны, з чорнаю барадою, крыху згорблены, Дварчанін сваёй манэраю ў размовах нагадваў прафэсара. Ён ніколі не казаў прамоваў, як гэта рабіў Рак-Міхайлоўскі, і не ставіў кропкі над «і». Не, ён спакойна

[290] Грушевський М. Історія української літератури. Київ, 1926. Т. 5. С. 121.

намагаўся ўсё ўзважыць, пераацаніць і знайсьці забыты ўжо шлях да собскай нацыі»[291]. Словам, гэта вартасці сапраўднага вучонага, які бачыць з'яву ў самых розных аспектах і сувязях. Трапіўшы ў маладыя гады на вучобу ў Чэхію, у цудоўную старажытную Прагу, Дварчанін не мог не захапіцца Скарынам, тым больш што акурат падаспеў чарговы вялікі юбілей беларускага кнігадрукавання. У 1926 годзе малады даравіты даследчык абараніў у Празе дысертацыю «Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве». Гэта ці не першая беларуская дысертацыя ў галіне скарыназнаўства, хоць і напісаная па-чэшску. Яе рукапіс, на шчасце, захаваўся. У 1991 годзе гэтае даследаванне ў перакладзе з чэшскай мовы выдадзена ў Мінску. Дык вось, Дварчанін колькі разоў згадвае ў сваёй дысертацыі надпісы пра Онкава. На яго думку, у гэтых надпісах Скарынам недастаткова выказваецца павага да фінансіста: «Мецэната сваіх пражскіх выданняў Багдана Онкава ён не ўсхваляе, а абмяжоўваецца толькі простым упамінаннем...»[292] Вельмі тонкае назіранне! Дварчанін чуйна адчуў сітуацыю. Праўда, тлумачыць ён гэта непераканаўча: маўляў, Онкаў у маладыя гады мог быць сябрам Скарыны (магчыма, разам вучыліся), і з ім па-прыяцельску можна было не цырымоніцца. Але ж мы ведаем, што Скарына ўмеў быць удзячным і ў патрэбных выпадках не шкадаваў людзям высокіх слоў. Напрыклад, у зусім іншай танальнасці вытрымана згадка пра другога спрыяльніка Скарыны ў пасляслоўі да віленскага

[291] Спадчына. 2000. № 2. С. 193.

[292] Дварчанін І. С. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве: Пер. з чэш. Мінск, 1991. С. 73.

«Апостала» 1525 года: «Совершися в дому почтивого мужа Якуба Бабича, наистаршего бурмистра славнаго и великаго места...»[293] Вось калі наш Скарына шчыры, вось калі яго душа поўніцца пачуццём нічым не замутнёнай падзякі!

Сучасны беларускі гісторык Г. Галенчанка ў адной з рэцэнзій 1974 года яшчэ больш падкрэсліў неардынарнасць, нават канфліктнасць сітуацыі: кожная прыпіска пра Онкава «...зроблена ад рукі, не надрукавана; выходзіць, уяўляе сабой дапаўненне, унесенае пасля выдання кнігі, супраць волі выдаўца»[294]. Працяг тагачаснага роздуму Галенчанкі з гэтай нагоды знаходзім у тэзісах яго даклада пра акружэнне Скарыны на Другой усесаюзнай канферэнцыі па праблемах кнігазнаўства (той жа 1974 год). Вось што тады ён сказаў: «Запісы на кнігах Скарыны, на нашу думку, зроблены ў Вільні рукой Б. Онкава або якога-небудзь падапечнага грамацея. Першадрукар не стаў бы аздабляць аляпаватымі надпісамі старонкі сваіх выданняў, тым больш — тытульныя лісты»[295]. Канфліктнасць, элементы супрацьстаяння, канфрантацыі заўважаны абсалютна правільна, хаця некаторыя нюансы (дзе і кім зроблены надпісы, наколькі яны «аляпаватыя») патрабавалі, магчыма, удакладнення, і ў далейшым Галенчанка ў поўным аб'ёме на сваёй фармулёўцы, здаецца, не настойваў. Ён гаварыў: «Тэкст надпісу пераймае шрыфт

---

[293] Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. С. 123.

[294] Голенченко Г. Я. Гравюры Франциска Скорины // Книга: исследования и материалы. М., 1974. Т. 28. С. 194.

[295] Голенченко Г. Я. Новое о Франциске Скорине и его окружении // Книговедение и его задачи в свете актуальных проблем советского книжного дела: Вторая Всесоюз. конф. по проблемам книговедения: Секция истории книги: Тез. докл. М., 1974. С. 25.

выданняў Скарыны...» (1976)[296] або: «Графіка літар і іх памеры нагадваюць адліўныя „тытульныя" шрыфты Скарыны» (1993)[297]. Тым не менш па-ранейшаму лічыў, што надпісы «не ўпрыгожвалі» скарынаўскіх выданняў.

Паспрабуем і мы па даступных нам крыніцах бліжэй прыгледзецца да надпісаў пра Онкава. Балазе літаральна кожны экзэмпляр скарынаўскіх выданняў з усімі паметкамі-маргіналіямі рупліва ўлічаны і апісаны скарыназнаўцамі. Ды і рознага кшталту рэпрадукцый цяпер хапае.

Звернем увагу на нюансы афармлення кнігі «Іоў», другога па храналогіі пражскага выдання Скарыны.

Тытульны ліст да кнігі «Іоў» Скарыну даўся не адразу. Існуюць два варыянты яго афармлення. Такія выпадкі заўсёды прыцягваюць асаблівую ўвагу даследчыкаў. Які варыянт папярэднічаў? Чаму спатрэбіліся змены? Што выдаўца не задаволіла? Але нас цікавяць цяпер не столькі варыянты друкарскага афармлення, колькі варыянты прыпісак. Рэпрадукцыя аднаго — у 1-м выпуску літаратурна-навуковага гадавіка «Скарыніч» (на ўклейцы пасля с. 128). Пад арнаментальнай застаўкай буйным, непаўторна прыгожым скарынаўскім шрыфтам, з дабаўкай вялікай буквіцы-ініцыяла, надрукавана назва, як заўсёды, са звесткамі пра выдаўца-перакладчыка (на гэты раз сціпла-лапідарнымі):

ПОЧИНАЕТСЯ КНИГА СВЕ
ТОГО ИОВА, ЕЖЕ СЛО

[296] Голенченко Г. Я. Новое о Франциске Скорине // Проблемы рукописной и печатной книги. М., 1976. С. 136.

[297] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 152.

ВЕТЬ ИОВ, ЗУПОЛНЕ
ВЫЛОЖЕНА ДОКТОРОМ
ФРАНЦИСКОМ СКОРИНОЮ
С ПОЛОЦЬКА.

Ніжэй праз невялікі інтэрвал як сэнсавы працяг ідзе паважны чатырохрадковы верш-рэчытатыў, набраны больш дробнымі літарамі:

Богу в Троици единому ко чти и ко славе,
Матери его пречистой Марии к похвале,
Всем небесным силам и святым его к веселию,
Людем посполитым к доброму научению.

Нездарма даследчыкі гавораць пра геніяльную інтуіцыю Вялікага Палачаніна ў галіне вершаскладання[298]. Нават размяшчэннем радкоў верша (другі і чацвёрты радкі з водступамі) Скарына як бы прадугадваў моду пазнейшых вякоў, набліжаўся да нас. Глядзіш на старонку і нібыта чуеш, як гэта ў свой час чыталася-спявалася. Скупымі, па сутнасці, мінімальнымі, сродкамі дасягнуты значны эфект. Усё стройна, самавіта, «благолепно», ладам, як мае быць. Кніга гатовая ісці ў свет, радаваць чытачоў мудрасцю, духоўным спажыткам, красою. І раптам выверанны, сто разоў прадуманы, прыняты сэрцам беспамылковы інтэрвал паміж назвай і вершаваным працягам-эпіграфам пачынае запаўняцца дадатковымі словамі. Памерам і абрысамі рукапісны шрыфт акурат такі самы, як і папярэдні друкаваны. Што называецца, адзін к

[298] Чемерицкий В. А. Франциск Скорина и становление белорусской литературы // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979. С. 76.

аднаму. Магчыма, і ўпісваў іх той самы майстра-мастак, што распрацоўваў і шрыфт скарынаўскіх выданняў (даследчыкі[299] не выключаюць і самога Скарыну):

А НАКЛАДОМ БОГДАНОВЫМ ОНКОВ

«В» фактычна ўжо вылезла за наборную паласу. А фраза яшчэ далёка не скончана. Майстра-каліграф апынуўся ў нялёгкім становішчы. Таму ён прыставіў яшчэ адну літару И, вынес над ёй маленькае «ч» (атрымалася: Онкович) і паспешліва прыпісаў дробным почыркам на полі ў выглядзе нейкай тлумачальнай глосы:

з виленского места

Фраза скомкана. Ды не гэта галоўнае. Выйшла так, што Багдан нібы спрачаецца з Францыскам, каб той не надта важнічаў ды помніў, на чые кроўныя грошыкі гэты рукатворны цуд рабіўся, а маладзенькая тады яшчэ Вільня імкнецца адсунуць дзядулю Полацк — няхай падзеліцца славаю. Гармонія парушана. Затое мы адчулі дыханне жывых жарсцяў вельмі далёкага часу, спаборніцтва амбіцый.

У іншых экзэмплярах выйсце было знойдзена такое (гл. рэпрадукцыю ў энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час», с. 26). Мастак рабіў прыпіску зноў жа ў цэнтры тытула шрыфтам сярэдняга памеру, часткова захопліваючы і левае, і правае палі старонкі, для эканоміі месца злітным тэкстам без падзелу на словы, з выкарыстаннем

[299] Гл.: Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам. Мінск, 1990. С. 302.

вынасных літар і элементаў вязі. Атрымліваўся вельмі доўгі і цесны радок, які пры ўсім майстэрстве каліграфа выглядае ўсё ж нейкім чужародным ражном, што разбівае гарманічнае суладдзе старонкі:

АТОСЯСТАЛОНАКЛАДОМБОГДАНАОНКОВА
СЫНАРАДЦИМЕСТАВИЛЕНСКОГО

А часам са знешняга боку выходзіла зусім прыстойна. Возьмем тытульны ліст кнігі «Ісус Сірахаў» (энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час», с. 40). Зверху дзве трэці старонкі займае выдатная гравюра «Дыспут» (як пісалі ўжо многія, здаецца, зусім не царкоўная, а навеяная хутчэй універсітэтамі ды звыклымі Скарыну вучонымі зборышчамі і ў гэтым сэнсе аўтабіяграфічная). Падзеленая на два радкі прыпіска пра Онкава даволі натуральна падключаецца да друкаванага загалоўка, хаця злітнасць літар у ёй застаецца:

КНИГА ИСУСА СИРАХОВА РЕКОМАЯ
ПАНАРЕТОС ЕКЛЕСИАСТЫКУС ИЛИ
ЦЕРКОВНИК, ЗУПОЛНЕ ВЫЛОЖЕ
НА НА РУСКЫИ ЯЗЫК ДОКТО
РОМ ФРАНЦИСКОМ СКОРИНОЮ С ПОЛОЦКА.
АТОСЯСТАЛОНАКЛАДОМБОГДАНАОНКОВАСЫНА
РАДЦИМЕСТАВИЛЕНЬСКОГО

Тут усё зроблена настолькі акуратна, густоўна ў напісанні і размяшчэнні двух новых радкоў, што на рэпрадукцыі (вельмі якаснай) дапісаны тэкст проста немагчыма адрозніць ад

друкаванага. Хаця злітнасць літар у прыпісцы стварае ўсё ж нейкую скарагаворку, прастарэканне. Атрымліваецца — пра Скарыну ўрачыста, з расстаноўкай, на поўны голас, а пра Онкава — абы адчапіцца.

А калі па шчырасці — самае месца для такіх прыпісак, раз іх ужо трэба было рабіць, — у канцы кнігі. Як прыстойна з мастацкага боку (ды і ў сэнсавых адносінах таксама) глядзіцца, напрыклад, гэтая прыпіска на апошняй старонцы пражскага Псалтыра адразу следам за калафонам-пасляслоўем (рэпрадукцыя ў энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час», с. 25). Але такіх канцавых прыпісак зусім мала. Онкаў чамусьці нястрымна рваўся наперад, на тытульны ліст.

Пара бліжэй пазнаёміцца з кампаньёнам Скарыны. Балазе даследчыкі зрабілі ў гэтым кірунку нямала. Багдан Онкаў быў буйной, каларытнай асобай свайго часу, і яго дзейнасць адлюстравалася ў дакументацыі розных устаноў ВКЛ ажно да вялікакняжацкіх канцылярый.

Шэраг каштоўных згадак пра Онкава і яго сям'ю апублікаваны ў 1915 годзе ў 21-й кнізе самавітага выдання «Апісанне дакументаў і папер, якія захоўваюцца ў Маскоўскім архіве Міністэрства юстыцыі» (паводле матэрыялаў так званай Літоўскай метрыкі, што захоўваліся ў той час у гэтым архіве — цяпер у Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў). Але яшчэ задоўга да гэтага да матэрыялаў Літоўскай метрыкі (знаходзіліся тады ў Пецярбургу) звяртаўся аўтар першай сур'ёзнай манаграфіі пра Скарыну Пётр Уладзіміравіч Уладзіміраў. Можна сказаць, што ён і тут паказаў дарогу, правёў адметную баразну. А да яго адпаведныя згадкі ў сваёй «Гісторыі горада Вільні» (т. 2, 1837) пакінуў Міхаіл Балінскі.

Надзвычай шмат зрабіў для высвятлення постаці Багдана Онкава ўжо згаданы гісторык-крыніцазнавец Георгій Галенчанка. Знойдзеныя ў архівах цікавыя матэрыялы пра Онкава ён прывёў у артыкуле «Новае пра Францыска Скарыну», змешчаным у калектыўным зборніку «Праблемы рукапіснай і друкаванай кнігі» (М., 1976) і ў сваёй вядомай манаграфіі «Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар» (Мінск, 1993). Змястоўны параграф пра Онкава ёсць у фундаментальнай кнізе Яўгена Неміроўскага «Францыск Скарына» (1990), якую недарма называюць «другой Скарынаўскай энцыклапедыяй» — такі вялікі, разнастайны, усеахопны сістэматызаваны ў ёй матэрыял. Але цікава, што ніводнай спецыяльнай працы пра Онкава яшчэ не было, калі не лічыць даведачнага артыкульчыка Галенчанкі і Неміроўскага ў энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час».

Мае папярэднікі, прызнаныя майстры гістарычных даследаванняў, настолькі добра прарабілі сваю работу, што застаецца ў большасці выпадкаў паўтараць-пераказваць іх працы (асабліва выдатны, адкрывальніцкі артыкул Галенчанкі). Толькі зрэдку даводзілася весці самастойны пошук, звяртацца да першакрыніц, уносіць невялікія карэктывы.

Багдан Онкаў паходзіў з багатай, амбітнай і ўплывовай купецкай дынастыі, якая мела таксама і зямельныя валоданні і паступова набыла шляхецтва.

Сталага прозвішча гэтая сям'я, як і многія сучаснікі, яшчэ не мела. Дзеда звалі Грыц (Рыгор), бацьку — Онка або Онька. Гэта змяншальная, размоўная форма нейкага хрысціянскага імя. Але якога?

Нялёгкае пытанне. Часам, хоць і досыць рэдка, гэтая адметная форма, як і вытворныя ад яе, пракідаецца ў тага-

часных дакументах. Напрыклад, у попісах (мабілізацыйных рэестрах) 1528 года па Бельскім павеце (Падляшша) «земян» (дробнай шляхты), якія прызываліся ў войска ВКЛ. Вёска Лапы: «Онкъ Жикгимонътович сам (з нагоды небагатага маёмаснага становішча ідзе на вайну адзін, нікога з сабой не вядзе. — *Г. К.*)... Марько Онкович сам. Войтко Онкович сам»[300]. Вёска Здроды: «Миколай Онкович сам... Матей Онкович сам... Станислав Онкович сам»[301]. Так што імя жыло, паважліва па тым часе ўпісвалася ў дзяржаўныя акты. Але цяпер яго нешта не чуваць. Якое кананічнае імя ў яго аснове? Ніхто адказаць мне не мог. Давялося прагледзець процьму антрапанімічных выданняў, слоўнікаў беларускіх, рускіх, украінскіх, старажытнарускіх і нават польскіх імён. Зазірнуў нават у працу эмігранта Я. Станкевіча з характэрнай для яго назвай «Хрышчоныя ймёны вялікалітоўскія (беларускія)» (1963). Усё было марна. Адказ, дакладней, падказку, нейкі арыенцір, знайшоў у грунтоўнай даведачнай кнізе М. А. Пятроўскага «Слоўнік рускіх асабовых імён» (М., 1980). У паказальніку змяншальных формаў там зафіксаваны формы «Онька, Онюшка, Оня» і прыведзены іх кананічныя адпаведнікі — цэлыя два з паловай дзесяткі імён, пераважна рэдкіх, хаця ёсць сярод іх і асобныя вельмі распаўсюджаныя (даём пералік, як у Пятроўскага, у рускім напісанні): Андрей, Анин, Анисий, Геронтий, Иона, Леонтий, Неон, Онисий, Онисим, Онисифор, Онуфрий, Пассарион, Пеон, Пион, Пионий, Родион, Сасоний, Семен, Серапион, Таврион, Татион, Феогний, Флегонт, Хрисогон, Худион[302].

---

[300] Русская историческая библиотека. Пг., 1915. Т. 33. С. 145.

[301] Тамсама. С. 167.

[302] Петровский Н. А. Словарь русских личных имен. 2-е изд. М., 1980.

Як бачым, агульным для гэтых вельмі розных імён быў склад «он», «ён» або «ан». У Беларусі XV–XVI стст. гэты набор імёнаў мог адрозніваццa, але наўрад ці істотна. Адно з іх і было хросным імем бацькі нашага героя. Якое — цяжка сказаць. Так што застаецца пакуль што называць яго, як у старых дакументах, амаль па-прыяцельску Онкам.

Дык вось, бацька Багдана Онка Грыцэвіч (Грыцаў) у часы вялікіх князёў ВКЛ і каралёў польскіх Казіміра IV (1440–1492) і Аляксандра (1492–1506) вёў шырокія гандлёвыя і фінансавыя аперацыі, пастаўляў у Вялікае княства сукны, разнастайныя дарагія тканіны, у тым ліку заморскія, і іншыя тавары. Быў настолькі багаты, так цвёрда стаяў на нагах, што нават пазычаў грошы ўраду. Справа бяспройгрышная. Для пагашэння пазык у 1500–1502 гадах крэдытору аддаваліся корчмы і мытныя зборы ў самых розных месцах ці не па ўсёй Беларусі: у Рэчыцы, Мазыры, Бабруйску, Смаленску, Оршы («Рша»), Менску (так пісалася тады назва сённяшняй нашай сталіцы). У віленскім магістраце Онка Грыцэвіч, як і належыць шанаванай асобе, быў нейкі час бурмістрам.

Багдан Онкаў — сын Онкі і Ульяны — паўнапраўна ўдзельнічаў у справах бацькі ўжо ў канцы XV ст. Імёны гэтых увішных людзей былі добра вядомыя як у ВКЛ, так і далёка за яго межамі. У 1498 годзе пасольства вялікага князя маскоўскага Івана Васільевіча запатрабавала аплаціць старую кабалу (даўгавое абавязацельства) на 100 рублёў «новгородцкими денгами», што была выдадзена «слуге нашему» князю Фёдару Іванавічу Бельскаму «вилневцами» Онкам Грыцавым, Уллянай і Багданам Онкавым. Фёдар Бельскі — постаць для свайго часу вельмі вядомая, нечым знакавая. Патомак Гедзіміна, праўнук Альгерда, ён уцёк у Маскву ў 1482 годзе

пасля няўдалай змовы супраць караля і вялікага князя Казіміра. Хаўруснікі князі Гальшанскі і Алелькавіч паплаціліся галавою, або, як тады гаварылі, «горлам» (падзеі згадваюцца ў рамане У. Караткевіча «Чорны замак Альшанскі»).

Выяўленыя кантакты Онкава і — хутчэй — яго бацькоў з Бельскімі вельмі ўражваюць даследчыкаў. Асабліва тым, што дазваляюць працягнуць нітачку — праўда, пакуль яшчэ вельмі цянюткую, нетрывалую — да загадкі друкарні Швайпольта Фіёля, першай у гісторыі кірылічнай друкарні, якая дзейнічала ў Кракаве ў 1491 годзе і, вядома ж, была, магла быць нейкім арыенцірам або штуршком для Скарыны. «Цікава, — адзначае ў сувязі з гэтым Г. Галенчанка, — што ў кніжных зборах князёў Бельскіх доўгі час захоўваліся выданні Швайпольта Фіёля. Ці не сведчыць гэта аб тым, што віленскія купцы былі нейкім чынам звязаны з першай кірылічнай друкарняй у Польшчы? Ва ўсякім разе Онкавы (Грыцэвічы. — *Г. К.*) гандлявалі сукнамі і іншымі таварамі ў Польшчы ў 1480–1490-я гады. Нагадаем, што Кракаў у той час быў важным цэнтрам суконнай вытворчасці ў Еўропе»[303].

Ды і ўвогуле цікавага тут нямала. Гаворачы строгай мовай юрыстаў, у якасці дзеяздольнай юрыдычнай асобы выступае тут чамусьці і маці Улляна. Чаму? Няйнакш паходзіла з багатай сям'і і мела сваю маёмасць. Ці Онка ўзяў яе ўдавой, як было, напрыклад, са Скарынам: яго Маргарыта, удава месціча Адверніка, валодала ў Вільні нерухомай і рухомай маёмасцю. А можа, справа прасцей: пазычаючы немаладому віленскаму купцу значную суму грошай, князь Бельскі ўпісаў

[303] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 154.

у «кабалу» ва ўмовах характэрнай для нашых земляў жыццёвай нестабільнасці і яго сямейнікаў, каб лягчэй потым спагнаць доўг.

Атрымліваем таксама магчымасць памеркаваць пра ўзрост Багдана, што немалаважна для скарыназнаўства, паколькі Онкаў — адна з ключавых постацяў Скарынавай біяграфіі. «Напэўна, гэтая кабала была падпісана „вилневцами" да 1482 года»[304], — з поўнай падставай зазначае Галенчанка. Калі гэта сапраўды так, то да 1482 года Багдан быў дарослым чалавекам і за дату яго нараджэння можна без вялікай рызыкі ўмоўна прыняць 1460 год (гэта пакаленне знакамітага князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага). У любым выпадку Онкаў быў, мяркуючы па ўсім, значна старэйшы за Скарыну, калі нават дапусціць, што Францішак нарадзіўся ў 1470-я або на самым пачатку 1480-х гадоў, як мяркуюць некаторыя даследчыкі.

Пасля смерці бацькі (1506) Багдан Онкаў, натуральна, становіцца яго галоўным спадчыннікам. Канцылярыі вялікіх князёў Аляксандра і Жыгімонта зацвярджаюць за ім усе набытыя і спадчынныя землі, ён атрымлівае новыя гаспадарскія «лісты» на возера, землі, «ніўкі», сенажаці ў Віленскім павеце. Ён няспынна нешта мяняе, збірае, набывае, выгадвае. Маёнтак каля Швянцянаў мяняе на землі ў Віленскім цівунстве Юргелеўшчыну і Андросаўшчыну, а потым гэтую Юргелеўшчыну і іншыя маёнткі паўторна мяняе на маёнтак Кузмянішкі каля Трашкунаў на сумежжы Літвы і Беларусі (тагачасны Віленскі павет).

Ён быў годным прадаўжальнікам справы свайго бацькі, збіраў грошык да грошыка, свята помніў даўгі, тым больш чу-

---

[304] Тамсама.

жыя, калі можна было істотна папоўніць каліту. Онкава, як і яго бацьку, добра ведалі пры каралеўскім (вялікакняжацкім) двары. У 1508 годзе Багдан прадставіў у канцылярыю Жыгімонта I пазыковыя лісты яго папярэдніка вялікага князя Аляксандра. У Літоўскай метрыцы, тамы якой паступова выдаюцца, становяцца даступнымі грамадскасці, ёсць такі запіс: «Бил нам чолом радца места Виленского (заўважым, дакладна як у скарынаўскіх кнігах. — *Г. К.*) Богдан Онкевич Грицевича о том, што брат наш Александр, король его милость, брал у отца его у в Онка (магчымае прачытанне: у Вонка. — *Г. К.*) ку потребе земской через руки пана Литаворавы Хребтовича и брата его пана Федковы Хребтовича, подскарбего земского, и теж через руки подскарбего сваго дворного Коварского готовые пенези (грошы. — *Г. К.*) и оксамиты, отласы, одамашки (шаўковыя тканіны з Дамаска. — *Г. К.*), сукна и иншыя речи. Всего того остал его милость отцу его винен триста коп и полпятидесят коп грошеи ... »[305]

З улікам працэнтаў сума нявыплачанага доўгу дасягала амаль паўтысячы коп літоўскіх грошаў. Сума вельмі значная (у капе 60 грошаў). У забеспячэнне доўгу ўрад Жыгімонта аддае Багдану на шмат гадоў мядовыя, піўныя, вінныя корчмы ў Бабруйску, Свіслачы і іншых месцах.

Як адкрылася даследчыкам, бацька Багдана Онка Грыцаў быў своеасаблівым фінансістам і пастаўшчыком двара яго міласці караля і вялікага князя (ажно да прадметаў раскошы) і знаўся з першымі саноўнікамі дзяржавы. Падскарбі — фактычна міністр фінансаў, меў нават больш шырокія функцыі.

---

[305] Литовская метрика: Кн. 8 (1499–1514). Кн. зап. 8. Вильнюс, 1995. С. 144–145.

Асабліва прыкметнай постаццю быў Івашка Літавор Храптовіч. Патрыёт ВКЛ, у прамове пры ўступленні Аляксандра на велікакняжацкі пасад ён заклікаў, каб той «правіў і судзіў праўдзівым літоўскім і Вітаўтавым прыкладам»[306]. Неаднойчы ездзіў паслом па найважнейшых дзяржаўных справах у Польшчу і Маскву. У 1493 годзе перадаў пасаду падскарбія свайму малодшаму брату Федку. Апошні за ўдзел у мяцяжы Глінскага (1508) страціў усе пасады і толькі ў 1522 годзе, незадоўга да смерці, быў зацверджаны каралём у якасці апекуна знакамітага Лаўрышаўскага манастыра. Так сказаць, ціхі занятак дзеля выратавання душы. Магчыма, мяцеж зачапіў бы і Літавора, ды ён у гэты час чакаў перамен да лепшага ў маскоўскім палоне, куды трапіў разам з Астрожскім пасля злашчаснай Вядрошы.

Думаецца, што самыя шырокія сувязі з важнымі асобамі дзяржавы і за яе межамі былі і ў Багдана. Ды так яно ўласна і было, на што ёсць дакументальныя сведчанні.

У 1520-х гадах неўтаймоўны Онкаў скардзіўся на абрабаванне яго ў Маскве, куды ён ездзіў, каб атрымаць грошы ад сваіх даўніх даўжнікоў. На «Лутцкой» (Велікалуцкай) дарозе ў яго адабралі тавары, 150 рублёў гатоўкай і даўгавыя лісты «Ошемячича и Можайского» на 900 коп «широких грошей». Добра яшчэ, што ногі ўнёс. У 1527 годзе гісторыя гэтая сталася тэмай афіцыйных перамоў на самым высокім узроўні паміж дзяржаўнымі мужамі Польшчы — ВКЛ і Масквы. Як мяркуе Г. Галенчанка[307], размова тут пра ноўгарад-северскага князя Васіля Шамячыча, які перабег з Літвы ў

[306] Polski Słownik Biograficzny. Kraków, 1937. T. 3.

[307] Голенченко Г. Я. Новое о Франциске Скорине // Проблемы рукописной и печатной книги. М., 1976. С. 139.

Маскву ў 1500 годзе. Згаданы «Можайский» — няйнакш князь Васіль Сямёнавіч Старадубскі, спадчынныя землі якога знаходзіліся ў Мажайску. Вось ажно куды сягалі інтарэсы грашавітага Онкава. І нішто яму не перашкода, нішто яго не палохае: ні межы, ні мытні, ні рабаўнікі на дарогах, ні нязвыклыя літвінам-беларусам маскоўскія парадкі, ні татарская небяспека (лятучыя загоны крымчакоў рыскалі па землях ВКЛ і пасля Клецкай паразы). Шырыня дзелавых сувязяў у гэтага энергічнага купца і фінансіста проста дзівосная. У адным з дакументаў ён названы нават смаленскім радцам, але не выключана, што гэта ўсяго толькі памылка пісара. Хоць і да Смаленска наш Багдан сапраўды меў дачыненне праз карчомныя ды мытныя справы.

Магчыма, разам з іншымі таварамі Онкаў вазіў у Маскву і скарынаўскія выданні. Адзін з самых дасведчаных скарыназнаўцаў А. Фларо́ўскі, каментуючы вядомы эпізод са спаленнем скарынаўскіх кніг у Маскве, цалкам дапускаў, што прывёз іх туды не сам Скарына, а Багдан Онкаў. «Наўрад каб вопытны фінансіст, які ўклаў, відаць, немалую долю сваіх грошай у кніжную справу Скарыны, мог пакінуць зусім паза ўвагай умовы кніжнага рынку Масквы»[308], — пісаў вучоны ў аглядным, абагульняльным артыкуле «Skoriniana». У такім жа духу апісаны гэты эпізод і ў кароткай скарынаўскай хроніцы, складзенай у наш час чэшскімі вучонымі, вельмі ўважлівымі да ўсіх рэалій скарыназнаўства: «1522–27: паездка віленскага купца Багдана Онькава ў Маскву (быў адным з накладцаў (фундатараў. — *Г. К.*) Скарынаўскай бібліі).

---

[308] Фларо́ўскі А. В. Skoriniana // 450 год беларускага кнігадрукавання. С. 405.

Магчыма, Маскву наведаў і Скарына. Па загадзе Васіля III, вялікага князя маскоўскага, у Маскве прывезеныя кнігі былі спалены»[309]. Заслужаны скарыназнавец дыяспары Вітаўт Тумаш у майстэрскай, хоць, можа, і залішне палітызаванай працы «Доктар Скарына ў Маскве» (асобнае выданне выйшла ў Мінску ў 1993 годзе) настойвае, што гэта быў менавіта Скарына. Можа быць, можа быць. У любым выпадку на «маскоўскім напрамку» навукоўцы бачаць не толькі Скарыну, але і Онкава. І трэба думаць, гэты шлях быў для апошняга больш звыклым, наезджаным, чым для Скарыны.

І дома справы заўсёды знаходзіліся. Багдан Онкаў — актыўны ўдзельнік віленскага гарадскога кіравання і самакіравання: асэсар на судзе маршалкаў, радца, бурмістр. Апошні раз састарэлы Багдан Онкаў згадваецца ў спісах членаў віленскай рады ў 1527 годзе. Праз дзевяць гадоў урадавыя камісары размяжоўваюць зямельныя ўладанні ў Віленскім павеце паміж спадчыннікамі Багдана Онкава і яго суседзяў. У гэты час абодва сыны Багдана, як высветліў усё той жа Г. Галенчанка[310], неслі земскую («баярскую») службу.

Горад для нашчадкаў Багдана ўжо цеснаваты, калі не сказаць — зусім зацесны. Нават такі бойкі сталічны горад, як Вільня. У 1540-я гады віленскі магістрат распачаў працэс супраць старэйшага сына Багдана Онкава Марціна, які «выломліваўся» (цудоўнае, сакавітае слова са старых дакументаў выдатна перадае энергію Марціна) з магістрацкай юрысдыкцыі. Члены гарадской рады грунтаваліся на тым, што дзед і бацька Марціна з даўніх гадоў жылі ў Вільні і

---

[309] Francisko Skoryna v díle českých slavistú. Praha, 1992. S. 7.

[310] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 155.

займалі пасады бурмістраў. Праўду казалі радцы, ды і Марцін быў зубасты, не маўчаў. Па словах адказчыка, «то чынілі для фартуны і пажытку свайго». Неверагодна: сын Багдана, таго самага, які яшчэ нядаўна так ганарыўся сваім званнем «радца места виленского», з прыемнасцю бачыў гэтае званне на тытулах скарынаўскіх выданняў, цяпер задзіраў нос перад гараджанамі, саромеўся «паспалітага» паходжання. Ды і сапраўды ў грамадскім статусе сям'і былі вялікія перамены. Марцін сцвярджаў, што ў яго няма дамоў у Вільні, ён не ўдзельнічае ў гандлі, а ягоны фальварак куплены бацькам у баяр гаспадарскіх. Жыгімонт I стаў на бок Марціна і вызваліў яго ад «служб местских» (гарадскіх). Канешне ж, трэба думаць, былі задзейнічаны лабісты-саноўнікі і ўлічаны заслугі дынастыі Онкавых-Грыцэвічаў перад каралеўскім (велікакняжацкім) дваром.

У 1552 годзе прыдворны шляхціц Жыгімонта Марцін Онкаў (Hankowicz, Ганковіч) разам з віленскім лаўнікам Янам Тоўсцікам выстаўляў фінансавыя прэтэнзіі да нашчадкаў Скарыны. Мабыць, гэта азваліся нейкім чынам даўнія агульныя справы Багдана Онкава і нашага першадрукара. Адпаведныя дакументы на сярэднявечнай дзелавой лаціне (Еўропа!) і ў сучасных навуковых перакладах апублікаваны ў грунтоўнай кнізе Віктара Дарашкевіча «Францыск Скарына: Зборнік дакументаў і матэрыялаў» (1988).

Вось такія высветліліся факты. І мы цяпер можам зноў вярнуцца да загадкавых, інтрыгоўных надпісаў на кнігах Скарыны.

Іх знікненне пасля 19 студзеня 1518 года (выхад кнігі «Прамудрасць») Г. Галенчанка тлумачыць наступным чынам: «Магчыма, у гэты перыяд Скарына заручыўся ўжо падтрымкай іншых заможных мяшчан на сваёй радзіме... Верагодна

таксама іншае тлумачэнне гэтага факта: рукапісныя надпісы не ўпрыгожвалі выданняў Скарыны і ён або сам Онкаў адмовіліся ад іх. Трэба адзначыць, — працягвае даследчык, — што згаданыя вышэй прыпіскі з прозвішчам адукаванага віленскага купца-прадпрымальніка, як і «партрэт» Скарыны ў Бібліі, — сведчанні свецкага індывідуалізму, прыкметнай рысы еўрапейскага Адраджэння»[311].

Даследчык мяркуе, што Онкаў належаў да асвечаных і патрыятычна настроеных дзеячоў. На думку вучонага, у яго, як і ў Бабіча, былі, мусілі быць ужо не рэдкія тады, хоць, можа, па тым часе і колькасна невялікія, асабістыя кнігазборы, у якіх не апошняе месца займалі выданні Скарыны[312].

Іншую ацэнку стымулаў Онкава, а таксама і Бабіча, даваў у свой час філосаф М. Алексютовіч, аўтар вядомай манаграфіі пра Скарыну (1958). Спыненне кнігавыдавецкай дзейнасці Скарыны пасля 1525 года даследчык тлумачыў у прыватнасці расчараваннем і адмовай ад далейшай падтрымкі яго прагматычных мецэнатаў Онкава і Бабіча: «Гэтыя асобы наўрад ці разумелі як след сапраўды вялікую і па маштабах і па свайму значэнню культурную дзейнасць Скарыны на карысць свайго народа. Хутчэй за ўсё яны аказвалі яму матэрыяльную падтрымку ў першы час (і ў Празе, і ў Вільна), зыходзячы з пэўных камерцыйных разлікаў. Але ў XVI стагоддзі кніжная справа яшчэ не прыносіла колькі-небудзь значных даходаў.

---

[311] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 155.

[312] Голенченко Г. Я. Книги Франциска Скорины в белорусских, русских и украинских собраниях XVI–XVII в. // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979. С. 150–151.

Пераканаўшыся ў гэтым, зацікаўленыя асобы з цягам часу маглі змяніць свае адносіны да Скарыны, пазбавіць яго матэрыяльнай дапамогі і абароны, без чаго ён, збяднеўшы да гэтага часу канчаткова, не мог самастойна весці кніжную справу»[313].

Блізкую пазіцыю займае Я. Неміроўскі. Выпісваем са згаданай яго кнігі: «Воблік Багдана Онкава чытачу ясны. Гэта буйны фінансіст, прадпрымальнік, які ўкладвае сродкі ў розныя галіны і аперыруе велізарнымі сумамі грошай. Чакаць ад такога чалавека ініцыятывы на ніве асветніцкай дзейнасці не прыходзіцца. Ды і ў мецэнацтва верыцца з цяжкасцю.

Думаецца, што Онкава і Скарыну звязвалі толькі фінансава-матэрыяльныя адносіны. Віленскі купец набыў частку тыражу першых пражскіх выданняў, разлічваючы збыць іх з немалой карысцю для сябе. Фінансавы поспех аперацыі, магчыма, не спраўдзіў надзей, што на яе ўскладаліся. Гэта прымусіла Багдана Онкава адмовіцца ад падтрымкі выдавецкай дзейнасці беларускага асветніка. Вось таму на апошніх пражскіх выданнях мы імя Багдана Онкава не знойдзем. Няма яго і на віленскіх выданнях, дзе, як мы даведваемся, месца Онкава заняў віленскі бурмістр Якуб Бабіч»[314].

Магчыма і так, ды ўсё ж нешта ў падобных тлумачэннях не да канца нас задавальняе. Ці не спрашчаюць шаноўныя вучоныя супярэчлівае аблічча Онкава? Чалавек, які думае толькі пра грошы, не стаў бы рабіць надпісы на кнігах або патрабаваць, каб такія надпісы рабіліся. Ён спрабаваў бы прадаць кнігі, не пэцкаючы іх надпісамі. У наяўнасці, прынамсі, вялікія амбіцыі Онкава (яны праявіліся і ў дзецях, якія

---

[313] Алексютовіч М. А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд. Мінск, 1958. С. 53–54.

[314] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность... С. 226.

пыхліва і грэбліва атрасаліся потым ад прыкметаў простага гарадскога паходжання). Магчыма, празмерны характар гэтых амбіцый акурат і ўскладніў стасункі Скарыны (таксама вельмі амбітнага) з Онкавым.

Мы ўжо не гаворым пра пазіцыю тых гісторыкаў, якія адмаўлялі ў ідэйных стымулах не толькі Онкаву, але і самому Скарыну. Напрыклад, польскі гісторык Г. Лаўмянскі сцвярджаў у раннім, па-маладому максімалісцкім, а то і эпатажным артыкуле (1925): «Таксама не з ідэальных, а з матэрыяльных меркаванняў фінансаваў пражскі тыраж віленскі мешчанін Багдан Онкавіч»[315].

Але слушна сказана — не хлебам адзіным жывы чалавек, не ўсё ў нашым жыцці зводзіцца да грубай матэрыі.

Літоўскі кнігазнаўца Л. Уладзіміраў адзначае, што праваслаўныя віленскія купцы — мецэнаты Скарыны — ставілі перад сабой высокія грамадскія мэты — асвета народа, абарона веры: «Тое, што апекуны Ф. Скарыны Багдан Онкаў і Якуб Бабіч былі праваслаўнымі, не выклікае сумненняў, і было б няправільна тлумачыць падтрымку імі кнігавыдавецкай дзейнасці Скарыны толькі камерцыйнымі інтарэсамі, а не ў першую чаргу асветнымі, нацыянальнымі і канфесіянальнымі, якія ў гэтую эпоху ў значнай ступені супадалі»[316].

З гэтай жа пасылкі зыходзіць А. Каўка, гаворачы ў кнізе «Тут мой народ» (1989) пра адукаваных мецэнатаў кніжнай справы Бабіча і Онкава: «Інакш ці патрапілі б яны зразумець

---

[315] Łowmiański H. [Recenzja na ks.: Станкевіч А. Доктар Францішак Скарына — першы друкар беларускі. Вільня, 1925] // Ateneum wileńskie. 1925. R. 3, z. 9. S. 176.

[316] Владимиров Л. И. Издательская деятельность Франциска Скорины в Великом княжестве Литовском // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1975. С. 38.

веліч Скарынавага пачынання і паступіцца сваімі сродкамі дзеля справы па тым часе далёка не прыбыльнай»[317].

Яшчэ П. Уладзіміраў бачыў сувязь Онкава і Бабіча, а праз іх і Скарыны, з мяшчанскімі і канфесіянальнымі згуртаваннямі — брацтвамі.

У. Конан упэўнена ставіць Онкава і Бабіча ў шэраг тыповых мецэнатаў свайго часу: «Развіццю навукі, вышэйшай адукацыі і літаратуры садзейнічаў характэрны для эпохі Адраджэння інстытут мецэнацтва (пісьменнік і апякун Гусоўскага Эразм Вітэліус, віленскія апекуны скарынаўскіх выданняў Багдан Онкаў, Якуб Бабіч і інш.)»[318].

Пра ідэйныя, духоўныя сувязі Скарыны і Онкава пераканана піша Алег Лойка ў найноўшым даследаванні «Старабеларуская літаратура» (2001): «Позвы да друкарскай дзейнасці былі ў Ф. Скарыны адраджэнскага, асветніцкага, гуманістычнага характару. Не выключана, што сваю справу зрабілі тут і першамецэнаты выдавецкай дзейнасці, асабліва Багдан Онкаў, які ўспамагаў Скарыне ў Празе ў 1517–1518 гадах. Гэта... было засведчана Скарынам спецыяльнымі ўпісамі ў кнігадрук ад рукі слоў: „А то ся стало..." Вядома, што бацька Багдана Онка Грыцаў бачыў у князя Фёдара Іванавіча Бельскага ва ўласнасці першадрук Швайпольта Фіёля. Актыўны, энергічны Багдан Онкаў адсюль мог паўзяць ідэю друкавання кніг і „заразіць" ёю і Якуба Бабіча, і Францыска Скарыну»[319]. Такім чынам, Онкаву

---

[317] Каўка А. Тут мой народ: Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI — пачатку XX стст. Мінск, 1989. С. 31.

[318] Конан У. М. Эстэтычныя і этычныя погляды Францыска Скарыны // Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990. С. 323.

[319] Лойка А. А. Старабеларуская літаратура. С. 275.

адводзіцца ў гэтых развагах вельмі важнае, нават прыярытэтнае месца (хаця сцвярджэнне, што Онка «бачыў» у Бельскага кнігі Фіёля не зусім карэктнае для навуковай штудыі, вядома толькі, што такія кнігі ў Бельскіх былі).

Прыпіскі з імем Онкава згадваюцца і ў знакамітым Лойкавым рамане-эсэ «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» (1990). Пісьменнік дапускае, што іх рукапісны, быццам бы вымушаны характар мог пакрыўдзіць Онкава і паўплываць на далейшае фінансаванне выдавецкай дзейнасці Скарыны: «Але чаму Онкаў запярэчыў тады тым прыпіскам? Можа, таму, што былі яны рукапісныя? Ён, Скарына, малады, не падумаў тады, што такое можа не спадабацца шмат старэйшаму ад яго Багдану Онкаву, што такое можа ціха паўплываць на іх узаемаадносіны. Не такі быў чалавек Багдан Онкаў, каб уголас заяўляць аб сваіх крыўдах. Але калі б не ад рукі рабіў тыя прыпіскі тады ён, Францішак Скарына, а друкарскім цісненнем, то, можа, на другім годзе і не прыпыніў бы сваё шчадраванне яму Багдан Онкаў?..»[320]

У сваёй аснове калізія схоплена дакладна. Хаця думаецца ўсё ж, што Онкаў быў з тых, напорыстых, энергічных людзей, якія ўголас крычаць-заяўляюць пра свае крыўды і правы.

А вось як бачыць сітуацыю мовазнавец У. Свяжынскі ў папулярнай кніжцы «Слова Скарыны» (1984): «У адным з раёнаў Прагі, які называўся Старое месца, на працягу 1517–1519 гг. з-пад дошак друкарскага станка Скарыны выходзяць 23 біблейскія кнігі. Фінансавую дапамогу Скарыне ў ажыццяўленні яго геніяльнай задумы аказваў віленскі купец Багдан Онькаў, або Аньковіч. Пасля выхаду кніг ён скупіў

[320] Лойка А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае. С. 307.

увесь тыраж, каб затым прадаць з выгодай для сябе. На вокладцы адной з кніг захаваўся надпіс Онькава...» (прыводзіцца вядомы надпіс)[321]. Тут таксама ёсць з чым паспрачацца, ужо не гаворачы пра элементарную недакладнасць апошняга пасажу (надпісы рабіліся на многіх кнігах, і не на вокладцы, а на тытульных лістах). Падстаў сцвярджаць, што Онкаў «скупіў увесь тыраж», няма. Больш карэктна выказваецца з гэтай нагоды Г. Галенчанка: «Значная частка пражскіх кніг належала Багдану Онкаву, які аказваў фінансавую падтрымку друкарні»[322].

Пара падвесці некаторыя вынікі.

Я таксама разам з іншымі або, лепш сказаць, следам за іншымі прайшоў сваю частку дарогі, знаёміўся з разумнымі кнігамі гісторыкаў, кратаў непадманныя першакрыніцы і маю права на сваю думку. Дык асабіста мне карціна бачыцца так. Багдан Онкаў, багаты, дастаткова асвечаны і вельмі амбітны купец, побач з некаторымі іншымі прадстаўнікамі гарадской эліты (Бабіч, Адвернік? брат Іван?) і асвечанай сярэдняй шляхты (Калантай?) узяў актыўны ўдзел у арганізацыі і фінансаванні выдання Скарынавай Бібліі (магчыма, сваю зацікаўленасць і падтрымку ён выказваў ужо на этапе перакладу Бібліі і падрыхтоўкі яе да друку). Ён унёс чацвёртую частку патрэбнага капіталу. Убачыўшы, што Скарына на старонках выданняў рэкламуе толькі свой удзел у гэтай вялікай справе, рашуча запатрабаваў, каб пра яго, Онкава, дачыненне было сказана хаця б у дадатковых прыпісках ад рукі. У

---

[321] Свяжынскі У. М. Слова Скарыны. Мінск, 1984. С. 12.

[322] Галенчанка Г. Я. Кнігі Ф. Скарыны ва ўсходнеславянскіх зборах // Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. С. 379.

адпаведнасці са ўнесеным капіталам — на кожнай чацвёртай кнізе. І не абы-дзе, а на самым бачным месцы.

Скарына з нялёгкім сэрцам выканаў патрабаванне Онкава, хоць гэта вяло да пэўных страт у мастацкім афармленні кніг. Мяркуючы па ўсім, адпаведныя надпісы рабіліся ў Празе, у выдавецкім, калі так можна сказаць, офісе Скарыны (параўнайце ў М. Грушэўскага — «пры выпуску кніг са складу») самім Скарынам або яго мастаком.

Перад намі канфліктная сітуацыя, сутыкненне амбіцый (справа сярод людзей, у тым ліку сярод беларусаў, вядомая).

Ці знятыя былі потым супярэчнасці паміж двума галоўнымі дзеячамі маштабнага выдавецкага праекта, або справа дайшла да поўнага разрыву (знікненне надпісаў можа быць сведчаннем і таго, і другога), пакажуць далейшыя даследаванні. Здаецца, болей шанцаў за апошнім меркаваннем, бо такія сутычкі амбіцый, як правіла, не забываюцца, бясследна не праходзяць.

Як і Скарына, Багдан Онкаў — сын сваёй эпохі. Звычайны, здавалася б, купец-негацыянт, «залаты мяшок», ён быў разам з тым яскравай, каларытнай асобай, рэнесансным чалавекам вялікай энергіі і размаху. Наогул у той час існавала цікавая сацыяльная праслойка, з якой выйшлі і Скарына, і яго паплечнікі-партнёры Онкаў і Бабіч. Эканамічна незалежныя, сацыяльна і нацыянальна актыўныя гараджане-месцічы, купцы з рысамі грамадскіх дзеячаў. Людзі цэльныя, бывалыя, дасведчаныя, яны паглядзелі свету, мелі развітае, часам нават гіпертрафаванае пачуццё ўласнай годнасці. Гэта пра іх, купцоў таго часу, сказаў А. Лойка: «Бо і славу трэба ж, нарэшце, учыніць купцу-першапраходцу, адкрывальніку зямель, яднальніку іх, пашыральніку культуры, чалавеку смеламу, ад-

чайнаму, рызыкоўнаму, па-свойму гераічнаму... »[323] Традыцыі Онкава і Бабіча годна працягвалі Мамонічы. Можна назваць і яшчэ сякія-такія імёны. Потым такой актыўнай праслойкі ў беларускіх гарадах мы не назіраем (прынамсі ў вялікіх маштабах). Яна паступова некуды знікла, здрабнела, паблякла. Прычын можна назваць колькі хочаце: бясконцыя войны, пажары, эпідэміі, эканамічны заняпад, рэлігійны разброд, запаўненне гарадоў чужародным элементам. І ўсё-такі, як нам здаецца, самай страшнай хваробай, якая літаральна на вачах з'ела вялікі народ эпохі Скарыны (а гэта і Онкаў, і Гусоўскі, і бліскучы ваяр князь Астрожскі, і, калі хочаце, князь Міхайла Глінскі з яго шэкспіраўскімі жарсцямі), быладэнацыяналізацыя адукаваных людзей, у тым ліку гараджан. Жывая празрыстая мова Скарыны, яго эпохі, засмечваецца, становіцца ўсё больш штучнай і, урэшце, адкідаецца на ўзбочча жыцця. Скарына да гэтага ліха не дажыў, пры ўсім сваім велізарным правідчым дары, магчыма, нават не падазраваў, што такое можа здарыцца. У яго не знаходзім трывогі на гэты конт. У яго яшчэ быў свой народ, з якім ён размаўляў на адной мове. У гэтым яго шчасце і сіла. Таму ён, Скарына, такі гарманічны і сонечны. Нават з урадам можна было дамовіцца на той самай мове: «Літоўскі тагачасны ўрад (правіцельства) са сваімі князямі меў — як то кажуць — усе клёпкі ў галаве...» (Я. Купала)[324]. Але хутка ўсё перамянілася, стала на галаву. Літаральна праз некалькі дзесяцігоддзяў у прадмове да свайго Евангелля (1580) другі патрыёт і працаўнік Беларусі Васіль Цяпінскі са збянтэжа-

---

[323] Лойка А. Скарына Сярэднявечны, Скарына Адраджэнскі: [Інтэрв'ю] / Зап. С. Кавалёў // Беларусь. 1990. № 2. С. 23.

[324] Купала Я. Ці маем мы права выракацца роднай мовы? // Купала Я. Поўны зб. тв. Мінск, 2002. Т. 8. С. 36.

насцю і болем ставіць горкі дыягназ, бачачы «в таком зацном руском, а з(в)лаща перед тым довстипном учоном народе, езыка своего славнаго занедбане, а просто взъгарду»[325].

Што да патомкаў Онкава, дык яны, парваўшы з купецтвам, бясследна расталі ў шляхецкай масе і нічым асаблівым сябе ў гісторыі не праявілі[326].

---

[325] Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII стагоддзя. Мінск, 2003. С. 407.

[326] Апошнім часам шэраг спрэчных думак пра Онкава выказаў журналіст Р. Андрэявец (гл.: Андрэявец Р. Яшчэ раз пра «першамецэната» Багдана Онкава // Голас Радзімы. 2005. 8 снеж.; яго ж. Ці быў мецэнатам Багдан Онкаў // Бел. гіст. часоп. 2006. № 5). У прыватнасці, ён лічыць, што мецэнацтва сярод купцоў у часы Онкава яшчэ не магло быць — гэта з'ява пазнейшай эпохі. Аднак патрыятычна настроеныя людзі, гатовыя ўсімі даступнымі спосабамі падтрымаць агульную карысную і важную для грамадства справу, былі заўсёды. Нельга пагадзіцца таксама з тлумачэннем Андрэяўца тагачаснага слова «наклад», як і з тым, што дадатковыя тэксты-надпісы пра Онкава рабіліся нібыта пры дапамозе спецыяльна выробленых штампаў (гл. пра гэта: Чамярыцкі В. «Ці быў першамецэнатам Багдан Онкаў?» // Голас Радзімы. 2005. 13 кастр.).

3. Сядамі Якуба Бабіча

У выданнях Скарыны мы знойдзем канкрэтныя, прамыя, выказаныя словамі сведчанні толькі пра двух спрыяльнікаў-мецэнатаў яго выдавецкай дзейнасці. Толькі два імёны — Багдан Онкаў і Якуб Бабіч. Абодва месцічы, прадстаўнікі віленскай гарадской эліты. Ужо гаварылася: па сваім характары і танальнасці сведчанні гэтыя розныя. Адносна Онкава гэта нейтральныя рукапісныя даведкі-канстатацыі «А то ся стало накладом...» на некаторых пражскіх выданнях. Калі б не гіпертрафаваная амбітнасць Онкава, не яго празмерная настойлівасць, мы б і не даведаліся пра яго ўдзел у грандыёзным Скарынавым праекце. У дачыненні Бабіча ўжо не рукапісны, не дадатковы, а паўнапраўны друкарскі тэкст віленскага перыяду, вытрыманы ў звычайнай для Скарыны ўрачыста-ўзнёслай, душэўна-шчодрай танальнасці: «Совершися в дому почтивого мужа Якуба Бабича, наистаршего бурмистра славнаго и великаго места Виленскаго»[327].

Разумеецца гэта так, што бурмістр Бабіч даў Скарыну сродкі, прынамсі памяшканне ва ўласным доме, дзе апошні зладзіў сваю друкарню. У такім выпадку гэта першае ў гісторыі беларускага, усходнеславянскага кнігадрукавання (як і кнігадрукавання Літвы) указанне на адрас друкарні: пазначаны не толькі горад, але і дом. Нават і тут, у гэтай тэхнічнай дробязі, Скарына быў першым.

Энергічна настойвалі на гэтай версіі аўтары грунтоўнай кнігі «Друкары даўняй Польшчы з XV да XVIII стагоддзя.

---

[327] Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. С. 123.

Частка 5. Вялікае княства Літоўскае» (1959)[328]. Вось і В. Тумаш у адной з публікацый 1975 года спецыяльна адзначыў: «Віленская друкарня гадоў 1522–1525 Франьцішка Скарыны хоць мясьцілася ў доме найстаршага бурмістра Вільні Якуба Бабіча, была ўсё-ж друкарняй ня Бабіча, але доктара Скарыны»[329]. Ды гэта, уласна кажучы, агульнапрыняты цяпер погляд.

Праўда, пільны даследчык Скарынавай спадчыны Генадзь Лебедзеў у сваёй працы «Скарына — першадрукар? Не, Скарына — першавыдавец» (1990) звярнуў увагу на тое, што формула «в доме» (па латыні: in domo, in aedibus) была звычайнай для заходнееўрапейскага кнігадрукавання і абазначала «ў друкарні»[330]. Тады атрымлівалася, што Бабіч быў уладальнікам друкарні, у якой выдаваў свае кнігі Скарына. Але гэтаму супярэчыць відавочная адсутнасць у Бабіча якога-небудзь папярэдняга вопыту ў гэтай новай справе, а таксама тыя акалічнасці, што ў віленскай друкарні шырока выкарыстоўваўся друкарскі матэрыял, прывезены Скарынам з Прагі, ды і ніякіх іншых кніг, апрача скарынаўскіх, гэтая друкарня не выпускала. Так што хутчэй за ўсё чуйны да ўсялякай навізны Скарына ўжыў модны на Захадзе выраз проста дзеля прэстыжнасці, і ёсць усе падставы трымацца традыцыйнага погляду па гэтым пытанні. Але, магчыма, нейкая рацыя ёсць і на баку Лебедзева. Выраз «друкарня Бабіча» ўжываўся часам

---

[328] Kawecka-Gryczowa A., Korotajowa K., Krajewski W. Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. Z. 5: Wielkie Księstwo Litewskie. Wrocław; Kraków, 1959. S. 34.

[329] Тумаш В. Друкарня Пётры Мсьціслаўца // Запісы. Нью-Йорк, 1975. Т. 13. С. 20.

[330] Беларусіка — Albaruthenica. Мінск, 1993. Кн. 1. С. 290–292.

некаторымі даследчыкамі ў мінулым. Для XIX ст. В. Тумаш адзначыў толькі адзін такі выпадак, спаслаўшыся на вядомы альбом І. П. Сахарава «Узоры славяна-рускага кнігадрукавання з 1491 года», дзе ёсць спецыяльны раздзел «Віленская друкарня. 1525 г. Бурмістр Якаў Бабіч». Але выпадкаў такіх, канешне, болей. Яшчэ М. Балінскі пісаў у «Гісторыі места Вільні» (т. 2, 1837): «Ужо ў Вільні ў 1525 годзе знаходзілася друкарня, у якой Якуб Бабіч друкаваў кнігі славянскія» (і толькі ў падрадковай заўвазе згадаў імя Скарыны як перакладчыка)[331]. Можна назваць таксама агульнавядомы тэкст А. Кіркора ў «Жывапіснай Расіі» (1882)[332] або грунтоўную «Гісторыю рускай царквы» мітрапаліта Макарыя (Булгакава; т. 9, 1879), дзе згадваецца «друкарня Бабіча». Прывядзём таксама яшчэ адзін, трохі пазнейшы прыклад: на пераплёце асобніка Скарынавага «Апостала», які захоўваецца ў бібліятэцы Віленскага універсітэта, ёсць надпіс пачатку XX ст.: «Апостол напечатан в Вильне в типографии Якова Бабича «працею доктора Франциска Скорины лета 1525». Переплет сделан в апреле 1905 года. Ф. Добрянский»[333]. Вядомы віленскі археограф і кнігазнавец Флавіян Мікалаевіч Дабранскі закранаў гэтае пытанне і ў папулярнай даведачнай кнізе «Старая і новая Вільня»: «Да часу Жыгімонта Казіміравіча, які вылучаўся любоўю да асветы, належыць пачатак кнігадрукавання ў Вялікім княстве Літоўскім. У 1525 годзе Францыск Скарына родам з Полацка, які аднак меў роднага брата ў ліку віленскіх грама-

---

[331] Baliński M. Historya miasta Wilna. Wilno, 1837. T. 2. S. 87.

[332] Крыніцазнаўчы аналіз гл.: Кісялёў Г. Ці быў Скарына віленскім шкаляром?: (Апокрыф Кіркора і сучасныя падыходы) // Скарыніч. Мінск, 2002. Вып. 5.

[333] Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 306–307.

дзян, надрукаваў у Вільні „Учынкі і пасланні апостальскія" на рускай мове (кірыліцай) у друкарні Якава Бабіча. Такім чынам, першая кніга, надрукаваная ў Літве, ёсць кніга руская. Сам Скарына быў католік і рабіў пераклад з Вульгаты, кіруючыся чэшскім каталіцкім перакладам Бібліі. У тым жа самым 1525 годзе Ф. Скарына надрукаваў у Вільні Канонік, ці Акафіснік, г. зн. малітоўнік на рускай жа мове, і звыш гэтага Саборнік, ці каляндар на ўвесь год з паказаннем евангелляў і апостала на розныя дні паводле статута царкоўнага. Друкарня Бабіча перайшла потым да пачэснай фаміліі Мамонічаў»[334]. Ды і Вацлаў Ластоўскі ў сваёй «Кароткай гісторыі Беларусі» (1910) разумеў справу гэтаксама ж: «Тымчасам у Вільні стараньнем Бабіча, бурмістра гор. Вільні, заложэна была вялікая друкарня. Тады Скорына вярнуўся ў Вільню... Бабіч перэдаў сваю друкарню каля 1575 году брацьцям Мамонічам...»[335] (мімаходзь адзначым несумненную залежнасць гэтага тэксту ад тэксту А. Кіркора і Ф. Дабранскага).

З другога боку, выраз «у дому» ў значэнні «ў друкарні» або блізкім да такога значэння сэнсе вядомы ў постскарынаўскія часы і на нашых землях, у прыватнасці, дапасоўваўся часам да друкарні Мамонічаў, якая працягвала ў Вільні традыцыі Скарыны ў другой палове XVI ст. Так, выданні Літоўскага статута (1588) мелі пазначкі «Друкавана ў дому Мамонічаў», «У друкарні дому Мамонічаў» (у апошнім выпадку «дом» як бы сінонім «фірмы», «фаміліі»). Таму можна прапанаваць кампраміснае рашэнне, назваўшы друкарню, адкуль выйшлі скарынаўскія «Малая падарожная кніжка»

[334] Добрянский Ф. Старая и новая Вильна. 3-е изд. Вильна, 1904. С. 35.

[335] Власт [Ластоўскі В. Ю.]. Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910. Рэпрынт — Мінск, 1992. С. 50.

і «Апостал», друкарняй Скарыны — Бабіча або Бабіча — Скарыны.

Прыведзены намі вышэй агульнавядомы тэкст Скарыны пра Бабіча («Совершися в дому почтивого мужа...») ёсць толькі ў адным экзэмпляры-канвалюце віленскіх скарынаўскіх выданняў, які захоўваецца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве. Гэта пасляслоўе або прадмова на адным лістку, дзе гаворыцца пра парадак выкарыстання Скарынам чорнай і чырвонай друкарскіх фарбаў. Між іншым, скарынаўскі тэкст вылучаецца яшчэ ў дадзеным выпадку асабліва душэўным, інтымным зваротам да чытача «Имашь пак в сей книзе, мой любимый приятелю...». Звычайна адносяць гэты лісток да «Апостала» 1525 года, а нястомны на новыя навуковыя ідэі Г. Лебедзеў звязвае яго з «Малой падарожнай кніжкай», якая выйшла значна раней за «Апостала» і датуецца прыблізна 1522 годам. Нягледзячы на дасціпнасць аргументацыі Лебедзева, пакуль што гэтая прапанова не атрымала колькі-небудзь шырокай падтрымкі скарыназнаўцаў.

Ды для нашага даследавання гэтыя нюансы не маюць прынцыповага значэння. Яны не мяняюць сутнасці: Якуб Бабіч — блізкі Скарыну чалавек, прыхільнік яго кнігавыдавецкай (мабыць, і шырэй — асветніцкай) дзейнасці.

Высокае месца Якуба Бабіча ў жыцці і дзейнасці Скарыны вызначыў яшчэ П. Уладзіміраў у сваёй выдатнай манаграфіі (1888). Ён параўнаў ролю Бабіча для Скарыны з роллю пісара ВКЛ Фёдара, які прытуліў у сябе ў Вільні складальніка-скрыптара унікальнага рукапіснага зборніка «Дзесятаглаў» (1502–1507) Мацвея Дзесятага, стварыўшы яму ўсе неабходныя ўмовы для плённай працы. Становішча Скарыны ў Вільні ў гэтым плане (наяўнасць самавітага апекуна-мецэната)

здавалася Уладзіміраву больш пэўным, чым у Празе. Нават чымсьці эталонным. «Калі каля 1525 (1522. — *Г.К.*) года, — пісаў вучоны, — пасля спынення дзейнасці ў Празе доктар Францыск Скарына знайшоў у Вільні ў асобе Якуба Бабіча апекуна сваёй друкарскай і літаратурнай дзейнасці, своеасаблівага „хрысталюбца" для кніжнай справы накшталт упамянутага вышэй Фёдара пісара, які прытуліў у 1502 годзе выратавальніка „Дзесятаглава", то і для пражскай дзейнасці Францыск Скарына меў патрэбу ў гэткіх самых апекунах»[336]. Дык вось, што тычыцца Прагі, у гэтым сэнсе для даследчыкаў шмат няяснага (зусім пэўна можна гаварыць толькі пра грошы Онкава, але колькі іх, ці хапіла на ўсё выданне?..), а ў Вільні быў уласнай персонай «хрысталюбец» Бабіч.

Паспрабуем уявіць сабе аблічча гэтага блізкага Скарыну чалавека, адзінага, каго назваў сам Скарына ў сваіх выданнях. Назваў адкрыта ў друку, а не ў пазнейшых вымушаных — такое ўражанне — прыпісках.

«Бабічы» — адно са старадаўніх беларускіх прозвішчаў. Бытавала ў розных слаях насельніцтва (былі нават князі Бабічы). Цікава, што адзін з Бабічаў у XIX ст. валодаў домам у Віцебску: на пісьме тагачасных віцебскіх інтэлектуалаў Л. Сулістроўскага і А. Вярыгі-Дарэўскага А. Кіркору ў Вільню 1858 года пазначана: «У Віцебску на Афіцэрскай вуліцы ў доме Бабіча»[337]. Як быццам рэхам з далёкіх скарынаўскіх часоў, паўтарылася формула «ў доме Бабіча». Даволі шырока гэтае прозвішча ўжываецца і сёння. Адно з тлумачэнняў зафіксавана ў папулярнай кніжцы пісьменніка Уладзіміра

---

[336] Владимиров П. В. Доктор Франциск Скорина... С. 48.

[337] Пачынальнікі. Мінск, 1977. С. 227.

Юрэвіча «Слова жывое, роднае, гаваркое...» (1992): «Бабіч. Так называлі дзіця, якое нараджала сама бабка-павітуха, тая жанчына, што бабіла нованароджаных, прымала роды. Гэткая мянушка засталася прозвішчам»[338]. У розных месцах Беларусі ёсць нямала паселішчаў з назвай «Бабічы», якая, мяркуючы па ўсім, паходзіць ужо ад прозвішча (напрыклад, выпуск 28 «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» фіксуе ў Полацкім ваяводстве XVII ст. тапонім «Бабічаў след»[339]). Гэта сведчыць пра распаўсюджанасць прозвішча і самой з'явы і дае падставы паспрачацца з энцыклапедыяй «Этнаграфія Беларусі», якая сцвярджае: «Такая з'ява (нараджэнне дзіцяці павітухай. — *Г. К.*) сустракалася рэдка і выклікала кпіны аднавяскоўцаў»[340].

Да таго ж прозвішча магло ўтварацца і іншым шляхам, мець іншую семантыку. Так, ужо згаданыя князі Бабічы вялі пачатак ад сучасніка Вітаўта князя Івана Сямёнавіча Друцкага, які насіў мянушку Баба[341]. Аднекуль падхапіла сваю назву і рэчка Бабіч, прыток Дняпра, якую даведнікі фіксуюць на Магілёўшчыне.

Пра скарынаўскага спрыяльніка «пачцівага мужа» Бабіча вядома куды меней, чым пра Онкава. Артыкул пра яго ў Скарынаўскай энцыклапедыі ў некалькі разоў меншы за артыкул пра Онкава. Нестае звестак.

Звязаныя з Бабічам архіўныя матэрыялы прыводзілі П. Уладзіміраў, які спецыяльна прыязджаў для сваіх пошукаў

---

[338] Юрэвіч У. Слова жывое, роднае, гаваркое... Мінск, 1992. С. 136.

[339] Историко-юридические материалы, извлеченные из архивных книг губерний Витебской и Могилевской. Витебск, 1900. Вып. 28. С. 284.

[340] Этнаграфія Беларусі. Мінск, 1989. С. 43.

[341] Вольф Ю. Князі на абшарах ВКЛ ад канца XIV ст. // Спадчына. 1993. № 1. С. 111.

у Вільню, Г. Галенчанка, Я. Неміроўскі, іншыя даследчыкі. «Але ў цэлым яго жыццёвы шлях і сёння яшчэ застаецца загадкавым»[342], — канстатуе Неміроўскі.

Паводле адшуканых навукоўцамі архіўных матэрыялаў, Бабіч значыўся віленскім бурмістрам ужо ў 1519 годзе. Бурмістрам ён лічыцца і ў 1521 годзе разам з Андрэем Мікалаевічам. У наступным годзе засведчыў «тэстамант» заможнага віленскага «залатара» (ювеліра) Вінцэнта Вольфганга. Завяшчанне было напісана Вінцэнтам «на смертельной своей постели» ў прысутнасці віленскага войта Нікля Пракаповіча і «прысяжнікаў». Віленскія дамы і частка рухомай маёмасці былі завешчаны жонцы залатара Барбары «цорце Яна Валькера з Познані»[343]. Дакумент, вядомы яшчэ з часоў П. Уладзімірава, сведчыць пра высокую юрыдычную культуру старадаўняй Беларусі-Літвы і зноў пацвярджае важную для нас думку пра самыя шырокія міжнародныя сувязі віленскіх купцоў і рамеснікаў, месцічаў слаўнага места Віленскага.

Як было прынята ў тыя часы, Бабіч мог фігураваць у дакументах і без прозвішча. Па назіраннях Г. Галенчанкі, у 1516 і 1517 гадах у спісах «прысяжных» асоб віленскай рады сустракаюцца Якуб Бернатавіч і Якуб Пятровіч. Першы, мяркуючы па бацькавым імені, католік, другі — можна думаць, праваслаўны. Вучоны выказвае думку: «Калі ўзяць пад увагу, што члены рады ў тагачасных дакументах нярэдка фіксуюцца... пад імем бацькі, можна меркаваць, што Якуб Пятровіч быў якраз тым самым Бабічам»[344].

---

[342] Немировский Е. По следам Франциска Скорины. С. 65.

[343] Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 151.

[344] Тамсама.

Паводле архіўных раскопак польскага гісторыка Г. Лаўмянскага 1920-х гадоў (артыкул «Віленскія паперні XVI стагоддзя»), апошні раз у якасці бурмістра Якуб Бабіч згадваецца ў 1527 годзе[345]. Лічыцца, што неўзабаве пасля гэтага ён памёр. З 1540 года ў спісах прысяжных асоб віленскага магістрата з'яўляецца Сымон Якубавіч Бабіч, напэўна, сын нашага Якуба Бабіча. Віленскі мешчанін Іван Бабіч згадваецца ў судовых актах 1531–1541 гадоў.

Дзе знаходзіўся ў Вільні дом Якуба Бабіча, у якім размясцілася друкарня Скарыны? Пра гэта шмат меркавалі-спрачаліся вучоныя. Нават выдатны пісьменнік Юзаф Ігнацы Крашэўскі, аўтар шматлікіх раманаў і аповесцяў, закранаў гэтае пытанне ў манаграфіі па гісторыі Вільні (1842)[346]. Дом Бабіча, сведку высокіх мар і прац Скарыны, шукаў у Вільні гісторык-нашанівец, дзеяч нацыянальнага адраджэння XX ст. Вацлаў Ластоўскі. Адпаведная згадка ёсць у яго артыкуле «Доктар Францішак Скарына» (1924): «Дом гэты, паводле мяйсцовай традыцыі, знаходзіўся недалёка ад ратушы, каля «Інбараў», але ў каторым з істнуючых тут дагэтуль старасьвецкіх дамоў памяшчалася друкарня Скарыны, напэўна невядома»[347]. Добра арыентаваўся ў рэаліях старой Вільні беларускі гісторык Васіль Дружчыц, які ў артыкуле пра сталіцу ВКЛ у зборніку «400-лецьце беларускага друку» (1926) пі-

---

[345] Łowmiański H. Papiernie wileńskie XVI wieku // Ateneum Wileńskie. 1924. Z. 7–8. S. 412. Паводле Г. Галенчанкі, Бабіч не сустракаецца ў дакументах магістрата з 1526 года. Г. Лебедзеў абмяжоўвае час бурмістраўства Бабіча 1519–1521 гадамі.

[346] Kraszewski J. I. Wilno od początków jego do roku 1750. Wilno, 1842. T. 4. S. 62.

[347] Ластоўскі В. Доктар Францішак Скарына (1525–1925) // Крывіч. 1924. № 2(8). С. 9.

саў: «У пачатку XVI сталецьця зьяўляецца першая друкарня, якую адчыніў віленскі бурмістр Якуб Бабіч на Вялікай вуліцы, супраць Васкрасенскай царквы, побач з домам Яна Зарэцкага, скарбніка літоўскага»[348]. Вось і Дружчыц, зазначым, схільны называць першую віленскую друкарню друкарняй Бабіча.

Паглыбляючыся ў гэтую тэматыку, я адкрыў для сябе надзвычай цікавую працу беларуса Юльяна Крачкоўскага па тапаграфіі старой Вільні. Яна друкавалася двойчы: як прадмова да 20-га тома Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі (1893) і асобнай кніжкай пад назвай «Старая Вільня да канца XVII стагоддзя». Крачкоўскі (дарэчы, бацька знакамітага акадэміка-арабіста) надта ж дэталёва па дакументах уяўляў сабе старажытную сталіцу ВКЛ, здаецца, ведаў у ёй не толькі кожны дом, але і кожны каменьчык. Давялося зазірнуць і ў грунтоўную манаграфію пра віленскую друкарскую дынастыю Мамонічаў, выдадзеную ў 1938 годзе на польскай мове беларускім паэтам і гісторыкам Х. Ільяшэвічам[349], і ў папулярныя кніжкі кнігазнаўцы-шукальніка А. Анушкіна па гісторыі кнігадрукавання ў Вільні, і ў віленскія гарадскія даведнікі розных часоў. Здаецца, усе (ці амаль усе) сыходзяцца на тым, што дом Якуба Бабіча знаходзіўся непадалёк ад ратушы (цяпер Мастацкі музей Літвы) на рагу вуліц Вялікай (па-літоўску Дзіджоі, у савецкі час называлася вуліцай М. Горкага) і Шкляной (Сціклю). Дом гэты ў хуткім часе пасля выпуску Скарынавых кніг перайшоў да вядомых віленскіх кніжнікаў Зарэцкіх, а потым да Мамонічаў. З 1575 года тут дзейнічала

---

[348] Дружчыц В. Места Вільня ў першай палове XVI сталецьця // 400-лецьце беларускага друку. С. 30.

[349] Iljaszewicz T. Drukarnia domu Mamoniczów w Wilnie (1575–1622). Wilno, 1938. S. 42.

друкарня Мамонічаў, дзе некалькі гадоў працаваў славуты друкар Пятро Мсціславец. Перадваенныя здымкі гэтага дома можна бачыць у згаданай манаграфіі Ільяшэвіча. Частка дома згарэла падчас вайны[350]. У наш час звесткі папярэднікаў істотна дапоўніў архіўнымі пошукамі (у прыватнасці, у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літвы) Г. Галенчанка[351]. На гэтым доме ў 1970-я гады ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў гонар Скарыны і яго друкарні. Ва ўнутраным двары дома — тэматычна блізкая, настраёвая скульптура «Летапісец»[352].

Дзеля справядлівасці адзначым, што асобныя даследчыкі (Я. Неміроўскі, Л. Уладзіміраў), як у свой час і В. Ластоўскі, у большай або меншай ступені сумняваюцца ў магчымасці дакладна — на ўсе сто працэнтаў — вызначыць месца ў Вільні, дзе знаходзілася друкарня Скарыны.

Вельмі важнае пытанне — з якога часу пачалося плённае супрацоўніцтва паміж Скарынам і Бабічам. Ці толькі ў 1920-х гадах, калі Скарына перанёс сваю выдавецкую

---

[350] Гл.: Мацейка Ю., Гудинас П. Вильнюс: Путеводитель по городу. Вильнюс, 1962. С. 138.

[351] Голенченко Г. Я. Новое о Франциске Скорине // Проблемы рукописной и печатной книги. М., 1976. С. 133–134; Галенчанка Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. С. 150–151, 271–272.

[352] Здымак двара са скульптурай гл. на ўклейцы ў кнізе А. Каўкі «Тут мой народ». Пад здымкам подпіс: «Частка былой камяніцы бурмістра Якуба Бабіча ў Вільні, дзе ў 1522–1525 гг. мясцілася друкарня Ф. Скарыны». Двор са згаданай скульптурай бачым таксама на здымку ў энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час» на с. 283. Подпіс тут такі: «Унутраны дворык на месцы дома, у якім была друкарня Ф. Скарыны». Хораша апісаў гэтае святое для нас месца Л. Луцкевіч у артыкуле «Старажытная Вільня, беларуская Вільня» (Беларусь. 1993. № 4).

дзейнасць у Вільню, ці раней? Адам Кіркор лічыў Бабіча галоўным апекуном-дабрадзеем, які падтрымліваў Скарыну літаральна з маленства і вывеў яго на дарогу патрыятычнага асветніцтва. І сёння большасць даследчыкаў мяркуе, што Бабіч аказваў Скарыну падтрымку ўжо ў пражскі перыяд. Вышэйзгаданы літоўскі кнігазнаўца А. Уладзіміраў, гаворачы ў зборніку «Беларускі асветнік Францыск Скарына і пачатак кнігадрукавання ў Беларусі і Літве» (1979) пра мецэнацтва Онкава, спецыяльна дадаў: «Кнігавыдавецкую дзейнасць Ф. Скарыны ў Празе, верагодна, падтрымліваў і Якуб Бабіч, другі дзеяч «рускай лавіцы» вільнюскага магістрата»[353].

Ільяшэвіч адзначаў самаахвярнасць Бабіча, параўноўваў яго ролю з роляй дзеячаў наступнага перыяду Мамонічаў: «Ставала ў Вільні людзей вучоных і ахвярных, якія не шкадавалі сродкаў на асветныя мэты. Да такіх належалі, здаецца, як Якуб Бабіч, які падтрымліваў Скарыну, і браты Кузьма і Лукаш Мамонічы»[354]. З іншага боку, не адмаўляў даследчык і наяўнасць у такіх дзеячаў пэўных матэрыяльных інтарэсаў: «Рэч ясная, што гэтыя фундатары-капіталісты атрымлівалі з падтрымкі культурна-асветных пачынанняў матэрыяльную карысць»[355].

Але для высвятлення біяграфічных звестак прадстаўніка віленскай купецка-мяшчанскай эліты Якуба Бабіча і яго сувязяў са Скарынам патрабуюцца дадатковыя даследаванні, пошук новых крыніц.

---

[353] Владимиров Л. В. Издательская деятельность Скорины в Великом княжестве Литовском // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979. С. 38.

[354] Iljaszewicz T. Drukarnia domu Mamoniczów w Wilnie... S. 32–33.

[355] Тамсама. S. 33.

4. Брат

Адразу пасля вайны, у 1946 годзе, у часопісе «Беларусь» сярод іншых гістарычна-краязнаўчых матэрыялаў рубрыкі «Наш даведнік» была надрукавана нататка «Браты Скарыны» (такі своеасаблівы быў выбраны для гэтай маленькай публікацыі ракурс). Вось яе поўны тэкст:

«Беларускі першадрукар Георгі-Францішак Скарына быў сынам багатага купца Лукаша Скарыны з горада Полацка, які вёў гандаль з Рыгай, Гданскам, Пазнанню і іншымі гарадамі на захадзе. Вядома, паводле дакументальных звестак, што ў Лукаша Скарыны, бацькі першадрукара, былі яшчэ два сыны. Адзін з іх, Іван, жыў у Пазнані, дзе гандляваў скурамі. Памёр ён у 1529 годзе. Другі брат, імя якога для гісторыі не захавалася, таксама быў купцом. Сын яго Раман, пляменнік Скарыны, жыў у Гданску»[356].

Подпісу няма. Магчыма, аўтарам нататкі быў гісторык Ф. Дамінікоўскі, які працаваў у гэты час над даведнікам «Выдатныя людзі Беларусі» і актыўна супрацоўнічаў з часопісам «Беларусь», падпісваючы свае краязнаўчыя нататкі поўным прозвішчам або крыптанімам Ф. Д., а часам пакідаючы іх зусім без подпісу.

У любым выпадку нататка адлюстроўвае тагачасны не надта высокі ўзровень нашых ведаў. Беларуская гуманітарная навука пачала толькі-толькі прыходзіць у прытомнасць пасля бязлітасных сталінскіх рэпрэсій і цяжкіх ваенных страт. Побач са слушнымі звесткамі ў публікацыю трапіла яўная блытаніна. Сёння скарыназнаўцы, канешне ж, гавораць толькі

[356] Браты Скарыны // Беларусь. 1946. № 1. С. 60.

пра аднаго Францішкавага брата Івана (Раман быў якраз яго сынам).

Пачаткі радаводу Скарынаў як выхадцаў з «паспалітага люду» не дакументаваны. Аднак прозвішча само змяшчае ў сабе важную інфармацыю, з'яўляецца своеасаблівай каштоўнай біяграфічна-генеалагічнай крыніцай. Пра гэта дакладна і змястоўна сказаў В. Чамярыцкі ў артыкуле пра Скарыну для шасцітомнага слоўніка «Беларускія пісьменнікі»: «Сямейнае прозвішча паходзіць ад старажытнага славянскага слова „скора" (скура), адсюль — скарняк, па-старабеларуску — скарыніч, што азначала прафесію рамесніка, які займаецца апрацоўкай скур. Відаць, роданачальнікам Скарынаў быў гарбар, нашчадкі якога разбагацелі і заняліся гандлем. Скарынічам называў сябе Францішак Скарына ў сваіх акафістах-акравершах. Пад гэтым прозвішчам часам згадваецца ў дакументах і яго родны брат Іван»[357]. Яшчэ больш падрабязныя звесткі такога кшталту, грунтоўныя этымалагічныя даведкі, знаходзім у Я. Неміроўскага, які ўпэўнена сцвярджае: «Ля вытокаў... прозвішча Скарына, бясспрэчна, палягае старажытнарускае слова *скора*, што значыла *скура, футра, сырая скура*»[358]. І далей: «Бацька і брат Францыска Скарыны гандлявалі пушным таварам і скурамі. Прафесія, відаць, была фамільнай і спадчыннай. Адным з роданачальнікаў сям'і быў, напэўна, рамеснік — *скарыніч*, які, разбагацеўшы, стаў займацца гандлем»[359].

---

[357] Чамярыцкі В. А. Скарына Францішак // Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграф. слоўнік. Мінск, 1995. Т. 5. С. 329.

[358] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя. С. 152.

[359] Тамсама. С. 153.

Як і належала купцу, бацька быў энергічным і смелым чалавекам. Прафесія была рызыкоўнай. Купцоў у тыя часы падпільноўвала шмат небяспек, іх нярэдка рабавалі на дарогах, ды і самі яны былі не без граху і пры выпадку маглі штосьці прыхапіць звыш звычайнага купецкага барышу, тым больш ва ўмовах частых парубежных ускладненняў, войнаў і сутычак паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. У 1492 годзе шаноўны Лука Скарына «засвяціўся» ў гістарычным дакуменце — пераліку прэтэнзій і крыўдаў парубежных маскоўцаў да жыхароў ВКЛ. Трапіла ў пералік і такое: «Да в Поло[т]ску пограбили лучанина Дороню Иванова купци полотцкіе Лукіан Скорина да Прокофьев, а взяли грабеж[у] на сорок рублев...»[360]. Як там было насамрэч, мы не ведаем[361] — для нас сёння гэта ўсяго толькі сведчанне суровай і няпростай рэальнасці далёкай эпохі[362]. Прынамсі гэта паказвае, што бацька быў не з баязлівага дзесятка. Яго, як і іншых купцоў таго часу, не палохалі далёкія і небяспечныя дарогі, ён спадзяваўся на свой купецкі фарт, быў гатовы да любых паваротаў лёсу.

Энергію і жыццёвую сілу бацькі наследавалі сыны Іван ды Францішак. Толькі пуцявіны ім выпалі розныя. Старэйшы Іван прыняў на свае моцныя плечы купецкую справу бацькі,

---

[360] Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 46.

[361] Прэтэнзіі такога кшталту былі ўзаемныя. Пра абрабаванне Б. Онкава ў Маскоўскай дзяржаве мы згадвалі вышэй.

[362] Дарэчы, знакаміты рускі першадрукар Іван Фёдараў, будучы кіраўніком манастыра пад Астрогам ва Украіне, таксама ўдзельнічаў у жорсткіх разборках з суседзямі — крыўдзіцелямі манастыра. Вядомы гісторык-кнігазнаўца Я. Неміроўскі каментуе гэта так: «Іван Фёдараў не быў ні добранамерным „дыяканам", ні разбойнікам з вялікай дарогі. Ён жыў у жорсткі час і падпарадкоўваўся яго законам» (Немировский Е. Л. Путешествие к истокам русского книгопечатания. М., 1991. С. 133).

схільны да навукі і тонкасцяў прыгожага слова Францішак абраў іншы шлях. Зусім як у біблейскіх братоў Ісахара і Завулона, якіх нам нагадаў англійскі скарыназнавец Г. Пікарда (гл. параграф «Геральдычная сюіта „Людие израилевы ...”»).

Некаторыя рысы купца-негацыянта, уменне ашчаджаць і выгадваць капейчыну можна заўважыць і ў Францішка. Ужо не гаворым пра тое, што сама справа, якой ён сябе прысвяціў — выданне «Рускай Бібліі», — патрабавала немалых дзелавых якасцяў. Звернем увагу на некаторыя іншыя прыклады разважлівасці і ашчаднасці. Хоць паходзіў з сям'і досыць заможнай, ён дзеля эканоміі сродкаў умеў абмежавацца ў выдатках, а часам і зусім прыкінуцца бедняком. Паступаючы ў 1504 годзе ў Кракаўскі універсітэт, ён заплаціў 2 грошы. Віктар Дарашкевіч каментуе гэтую акалічнасць: «Скарына ўнёс ва універсітэцкую касу сярэднюю (па сутнасці, мінімальную, ці блізкую да мінімальнай. — *Г. К.*) суму грошай. Як паказвае спіс шкаляроў таго ж факультэта, Венцаслаў, сын Венцаслава са Слуцка, заплаціў 4 грошы, Георгій, сын Якуба з Ваўкавыска, — 2 грошы, Мікалай, сын Андрэя з Ашмян, — 7 грошаў. Гэты запіс дае падставу меркаваць, што Скарына жыў у бурсе для бедных»[363]. Ну няхай сабе — гэта ранняе юнацтва. Але бедным чалавекам Скарына адрэкамендаваўся ў 1512 годзе і ў Падуі пры атрыманні ступені доктара медыцыны. Звычайна такая працэдура пагражала немалымі выдаткамі. Праўда, да гэтага часу памёр бацька (і гэта адлюстравана ў актах Падуанскага універсітэта), але грошы ў сям'і вяліся — прыбытковую сямейную гандлёвую справу паспяхова працягваў брат Іван,

[363] Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 319.

як мы даведаемся ніжэй, была ў братоў і нейкая супольная зямельная ўласнасць.

Сям'я Скарынаў вылучалася дынамічнасцю, рана завязала цесныя сувязі з велікакняскай сталіцай Вільняй. З дакумента 1518 года відаць, што «Іван Скарыніч, палачанін» быў у Вільні сваім чалавекам і называўся нават «віленскім грамадзянінам». Фіксуюцца і іншыя яго тагачасныя шырокія сувязі (аж да Львова)[364].

Вядомы скарыназнавец Я. Неміроўскі характарызуе Івана як «аднаго з найбуйнейшых і заможных купцоў Вялікага княства Літоўскага»[365]. Для нас гэта мае прынцыповае значэнне, бо высвечвае маштабы асобы.

Як і бацька, Іван узнімаўся-багацеў на скуры. На гэты хадавы тавар быў сталы попыт і дома, і за мяжой. Скура абувала і апранала, засланяла ў баі, з яе рабіліся даспехі паспалітых воінаў (тых жа апалчэнцаў-гараджан[366]). А колькі скуры ішло на конскую вупраж, на кніжныя пераплёты і выраб пергаменту. Вазы са скурамі — звычайная карціна на дарогах ВКЛ.

Купецкі інтарэс вымагаў пастаянных паездак на Захад, сталай там прысутнасці. Еўропа была вельмі зацікаўлена ў бесперабойных пастаўках скуры і футраў, напрамілы бог чакала купецкіх абозаў з ВКЛ. Пэўным цэнтрам, перавалачным пунктам у гандлі скурамі была Познань, дзе трывала атайбаваўся Іван.

---

[364] Тамсама. С. 46–48.

[365] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя. С. 489.

[366] Ткачоў М. А. «Зброя» гарадскіх жыхароў Беларусі ў часы сярэдневякоўя // Из истории науки и техники Белоруссии: Тез. докл. конф. Минск, 1988. С. 182.

У Івана быў сын Раман (па дакументах, таксама «віленскі грамадзянін») і дзве замужнія дачкі (іх мужы — полацкія мяшчане Міхна Аўсяннік і Еска Сцяпанавіч).

Апрача купецкіх капіталаў і наладжаных дзелавых сувязяў браты Іван ды Францішак атрымалі ў спадчыну пасля бацькі нейкае «именье» (маёнтак) і «дворыща» ў полацкім замку. Маёнтак не такі ўжо вялікі. Тым не менш прэстыж сям'і гэта падвышала. Паводле мабілізацыйнага попісу 1528 года палачанін «Иван Скорник» выстаўляў у войска са свайго маёнтка аднаго коннага ваяра[367]. У наступным годзе Іван памёр. З дакументаў 1535 года відаць, што «именье» трымаў «у опеце» зяць Еска і спрачаўся з другім знаёмым нам зяцем Міхнам у сувязі з уплатай нейкіх даўгоў цесця Івана Скарыніча. Раман — па ўсім відаць, паваротлівы, граматны, а можа, і паеўрапейску адукаваны чалавек — служыў тады «в Немцах». У маёнтку «была часть доктора Франъцышка Скорыны», якую апошні даручыў таксама Ескавай «опеце»[368]. Паводле матэрыялаў полацкай рэвізіі 1552 года, зяць Еска валодаў у горадзе зямлёй, якую арандавалі мяшчане (хутчэй за ўсё гэта скарынаўскае «дворыща»), і разам з сынам Міхны трымаў «именье сяло Тройдевичы», з якога ставіў у войска коннага ваяра[369]. Несумненна, гэта той самы маёнтак Скарынаў. Трэба пагадзіцца з вядомым расійскім спецыялістам па генеалогіі А. Нарбутам, які пісаў, што «Еску Сцяпанавічу, мужу адной з дачок Івана Скарыны, удалося захаваць у сваіх руках большую частку спадчыннай маёмасці Івана і Францыска ў

---

[367] Русская историческая библиотека. Т. 33. Стб. 196.

[368] Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 46–50.

[369] Тамсама. С. 51–52.

Полацку»[370]. У Полацку яго цанілі. У 1553 годзе радцу Еску Скарыну (такім чынам — і гэта паказальна — часам называлі ў дакументах Еску Сцяпанавіча) палачане пасылалі ў Рыгу з важным даручэннем[371].

Вялікае значэнне для скарыназнаўства, у прыватнасці для высвятлення маёмаснага становішча Івана Скарыны і яго ўзаемадачыненняў з Францішкам, маюць так званыя «пазнанскія акты» 1529–1532 гадоў, якія захаваліся ў Пазнанскім архіве (Польшча) і ў найбольш поўным выглядзе надрукаваны ў складзеным В. Дарашкевічам зборніку дакументаў і матэрыялаў «Францыск Скарына» (1988).

Нагадаем сцісла калізію гэтых дакументаў. У 1529 годзе памёр Іван Скарына. Пад домам-камяніцай самавітага пазнанскага купца Якаба Корбы[372] застаўся склад з таварамі нябожчыка — скурамі. Не прымусілі сябе доўга чакаць, азваліся і крэдыторы. Высветлілася, што Іван дзеля поспеху сваіх маштабных гандлёвых аперацый смела браў крэдыты, залазіў у даўгі. Гарадскія ўлады Познані ў прысутнасці Францыска і Іванавага сына Рамана як законнага наследніка ў кастрычніку 1529 года зрабілі вопіс і ацэнку скур. Усяго было налічана 47 468 скур рознага памеру і якасці, за кошт якіх належала задаволіць крэдытораў. Запазычанасць Івана пазнанскаму купцу і радцу Клаўсу Гоберлянду складала 500 фларэнаў[373],

---

[370] Нарбут А. Н. Родословная рода Франциска Скорины // Великою ласкою: Францишек Скорина в традициях славянского просветительства. М., 1994. С. 87–88.

[371] Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 52–53.

[372] Па звестках Г. Лебедзева, дом знаходзіўся ў цэнтры Познані на Рынкавай плошчы і захаваўся дагэтуль. Гл.: Лебедзеў Г. Дом Скарыны ў Познані // ЛіМ. 1990. 18 мая.

[373] У адным фларэне лічылася 30 грошаў.

нейкаму Фальковічу — 200, брату Францішку — 400 і г. д. Нейкі Ешка Стафановіч выставіў іск на 100 коп літоўскіх грошаў. Гэта была сума жалавання, затрыманага Іванам за 10 гадоў. Я. Неміроўскі не без падстаў ідэнтыфікуе гэтага Ешку Стафановіча з Іванавым зяцем Ескам Сцяпанавічам: Еска, відаць, служыў у свайго цесця[374]. Сапраўды, для маштабных купецкіх аперацый Івана патрэбны былі самавітыя і верныя памочнікі. Ды і хто ж, апрача блізкага сваяка, згадзіўся б 10 гадоў чакаць жалавання. З усімі крэдыторамі і ісцамі акуратна разлічыўся Раман за кошт скураў, што засталіся на Іванавым складзе. Францішак выступаў у гэтым выпадку не толькі ад сябе, але ад імя сваёй жонкі Маргарыты, якая таксама ўдзельнічала ў крэдытаванні Івана. Усяго Францішку перадалі 26 тысяч скур на суму 520 фларэнаў. Крэдыторы прызналі сябе цалкам задаволенымі і ўрачыста засведчылі, што не маюць прэтэнзій да нябожчыка і яго наследнікаў.

Але, як вядома, праз некаторы час, у лютым 1532 года, калі кароль Жыгімонт быў у Вільні, да яго звярнуліся яўрэі Лазар і Майсей са скаргай, што нябожчык Іван Скарына нібыта завінаваціўся ім звыш 12 тысяч літоўскіх грошаў (звыш 400 фларэнаў), а яго спадчыннік доктар Францішак злосна ўхіляецца ад уплаты братавага доўгу. Ва ўсёй гэтай гісторыі шмат незразумелага, падспуднага: чаму гэтыя Лазар ды Майсей так доўга чакалі? Ды і сапраўдны наследнік Раман чамусьці ў такой якасці на гэты раз зусім не згадваўся. Кароль (чаму так паспешліва і легкаверна?) аддаў загад зняволіць Францыска ў турму. У сакавіку таго ж года наш асветнік, які прыехаў у Познань, апы-

[374] Немировский Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя. С. 491.

нуўся за кратамі. З найлепшага боку ў гэтай сітуацыі паказаў сябе пляменнік Раман, які, паводле дакументаў, жыў тады ў Гданьску. Ён адразу ж прыехаў у Познань на выручку і заявіў, што, будучы законным спадчыннікам бацькі, даўно прыняў на сябе ўсе яго даўгі. Тым не менш кароль загадаў да суда не вызваляць Францыска. Нарэшце, 24 мая 1532 года (мяркуецца, пасля ўмяшання апекуна Францыска віленскага біскупа Яна) кароль выдаў указ вызваліць нашага асветніка. Адметны штрышок: выйшаўшы на волю, Скарына запатрабаваў, каб несумленны ісцец Майсей кампенсаваў яму маральны ўрон у памеры 6000 фларэнаў. (Сума астранамічная. Скарына вельмі высока цаніў сваю чалавечую годнасць.)

У лістападзе 1532 года Раман дамогся аўдыенцыі ў караля ў Кракаве, пасля чаго выйшлі два новыя каралеўскія ўказы, якія вельмі высока ўзнімалі статус доктара Францыска Скарыны: аб'яўлялася, што ніхто, апрача самога караля, не можа прыцягваць яго да суда. Праўда, звестак аб грашовай кампенсацыі за панесеныя крыўды, за маральныя страты ў дакументах не захавалася.

«Пазнанскія акты» важныя для даследчыкаў у многіх адносінах. Яны паказалі, па-першае, што сям'я Скарынаў валодала значнымі капіталамі, а па-другое, што дачыненні паміж прадстаўнікамі сям'і (роду) былі самыя добрыя, сваяцкія. Брат Францішка Іван і пляменнік Раман Іванавіч былі еўрапеізаванымі людзьмі, цалкам здольнымі ацаніць значэнне асветніцкай дзейнасці Францішка. Цікава таксама, што Францішак, як і яго жонка Маргарыта, прымалі нейкі ўдзел у камерцыйных аперацыях Івана.

У святле сказанага цалкам натуральным уяўляецца меркаванне, што Іван быў (мог быць) адным з фундатараў гіста-

рычнага выдавецкага праекта Францішка. Такая думка выказвалася многімі вучонымі.

Вось і геральдыст А. Шаланда лічыць, што менавіта Івану належыць знак «трохкутніка» на ілюстрацыях скарынаўскай Бібліі.

Спалучэнне сонца-месяца з «трохкутнікам» увасабляла б у такім выпадку плённы тандэм двух братоў (фінансіста і гуманітарыя).

Пошукі ў гэтым напрамку могуць мець важныя вынікі.

Дададзім да сказанага пару невялікіх назіранняў.

Не пазбаўленымі цікавасці, напрыклад, нам падаліся звесткі ў вядомым слоўніку У. І. Даля, які фіксуе самыя глыбінныя пласты ўсходнеславянскай лексікі. Слоўнікавы артыкул на слова «скара́» (такі націск прапануе Даль) шмат у чым пераклікаецца са звесткамі Я. Неміроўскага і В. Чамярыцкага, прыведзенымі намі вышэй: «Скара́, скора́... скорье... шкура, кожа, сырье, шкура товарная і мягкая рухлядь, пушной товар... Скорнячить, скорняжить, выделывать шкуру на мех, сбивать мездру, квасить, выминать, словом, заниматься скорнячеством, скорняжничаньем, — няжным, скорнячьим промыслом, или скорняжничать, кормиться промыслом скорняка. Скорняк нередко бывает сам же тулупником, швецом». Вось і Даль са свайго боку пацвярджае тэзіс аб перарастанні адной роднаснай прафесіі ў другую. Але найбольш мяне зацікавіла завяршэнне гэтага слоўнікавага артыкула: «Скорняк, или вернее ускорняк, треугольник, угол, вырезок косячком; гусек под полку, треугольничком»[375].

---

[375] Даль В. Толковый словарь живого великорусского языка. М., 1980. Т. 4. С. 192–193.

Вынікае, таямнічыя глыбіні мовы, непараўнаным знаўцам якіх быў Даль, няхай ускосным чынам, зноў выводзяць нас на трохкутнік.

І яшчэ. У свой час Г. Пікарда, захоплены ідэяй звязаць нейкім чынам, зблізіць Скарыну з піянерам англійскага кнігадрукавання Янам (Іванам) Ліцвінам, заўважыў на некаторых буквіцах скарынаўскіх выданняў мініяцюрныя ініцыялы І. Л. (гл., напрыклад, у энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час» на с. 346 буквіцы «І» і «И»). Ён прапанаваў чытаць іх як Іван Ліцвін. Я не падтрымліваю гэтай ідэі, але мне здаецца цалкам рэалістычным такое прачытанне: «І[ван сын] Л[укі]».

Высновы:

1) Брат першадрукара Іван, цалкам верагодна, мог быць адным з галоўных яго паплечнікаў-фундатараў.

2) «Трохкутнік» скарынаўскіх выданняў, магчыма, з'яўляецца мяшчанскім, купецкім знакам Івана і ўшаноўвае актыўны ўдзел апошняга ў славутым выдавецкім праекце Францыска Скарыны.

5. Каралеўскі дваранін Федка Калантаеў

Першы звязаў Т-знак Скарыны з гербам «Катвіца» беларускага шляхецкага роду Калантаяў гісторык І. Лялевель. Потым пра гэтую сувязь гаварылі М. М. Шчакаціхін, В. Ф. Шматаў, літоўскі даследчык Э. Гячаўскас і іншыя навукоўцы.

Мы помнім, што яшчэ ў 1926 годзе Шчакаціхін збіраўся пайсці па гэтым следзе, развіць гэты інтрыгоўны, перспектыўны сюжэт. На жаль, лёс судзіў інакш. У сувязі з высылкай з Беларусі зрабіць гэта яму не ўдалося.

Што высветлілася з таго часу?

Даследчыкі прыглядаюцца да Калантаяў, трымаюць іх навідавоку. Здаецца, нават безадносна ад верагоднай сувязі Калантаяў са Скарынам. Цяпер у грамадстве агульная цікавасць да гісторыі нашага набілітэту. Невялікі артыкул пра род Калантаяў, заснаваны на матэрыялах «Гербоўніка» А. Банецкага і Польскага біяграфічнага слоўніка, ёсць у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (т. 1, 1993). Там прачытаем, што Калантаі — шляхецкі род герба «Катвіца», прадстаўнікі якога займалі дзяржаўныя і адміністрацыйныя пасады ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Паходзіць з бранскіх баяраў Калантаевічаў, з якіх Васька ў 1498 годзе атрымаў ад караля і вялікага князя Аляксандра маёнтак Звонкавы. У наступным годзе ў аналах гісторыі — інакш кажучы, у гістарычных дакументах — згадваюцца Сямён, Багдан і Федзька Калантаевічы. Па звестках Банецкага, людзі яны былі не самыя заможныя. Гэта відаць з так званых вайсковых «попісаў», своеасаблівых мабілізацыйных рэестраў таго часу. Калі вялікія паны-магнаты са сваіх латыфундый давалі ў агульнадзяржаўнае

войска па некалькі дзесяткаў, а то і сотняў ваяроў з усім баявым рыштункам, то згаданы Сямён Калантаевіч у пачатку XVI ст. ставіў у войска ўсяго толькі чатырох, а Іван — двух вершнікаў.

Чытаем далей: «Фёдар Іванавіч Калантаеў у 1508 быў абвінавачаны як падбухторшчык князя М. Л. Глінскага на мяцеж, але здолеў апраўдацца. У 1508 ён атрымаў ад Жыгімонта I маёнтак Клевіцы, які раней належаў Глінскаму, а ў 1518 названы каралеўскім дваранінам. Меў сыноў: Івана, Барыса, Герасіма (каралеўскія дваране ў 1540–41) і Фёдара. Іван Фёдаравіч Калантаевіч набыў землі ў Новагародскім пав.»[376].

У XVII–XVIII стст., паводле звестак «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (т. 4, 1997), прадстаўнікі роду Калантаяў асноўныя зямельныя ўладанні мелі на Валыні і ў Ваўкавыскім павеце, дзе займалі ўрады падстолія, гродскага і земскага суддзяў, войскага, стражніка, лоўчага, чашніка, харунжага і г. д. Як бачым, усё гэта — не самыя высокія пасады і тытулы, перад намі «птушкі сярэдняга палёту».

У канцы XVIII ст. гэты род вылучыў найбуйнейшага дзеяча эпохі Асветніцтва ў Рэчы Паспалітай Гуга Калантая (1750–1812), аднаго з аўтараў Канстытуцыі 3 мая і Паланецкага універсала, ініцыятара першых праграм фальклорна-этнаграфічных даследаванняў у Польшчы, Літве, Беларусі, а ў часы Скарыны гэта быў, здаецца, небагаты дваранскі служылы род, нейкім чынам замяшаны ў мяцяжы Глінскіх.

Трэба ўсё гэта як след ацаніць-узважыць. Паглыбляемся ў каларытную гісторыю сярэднявечнай Беларусі. Што вядома пра тыя далёкія падзеі?

---

[376] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск, 1997. Т. 4. С. 15.

Пра мяцеж Глінскага або Глінскіх — адметную падзею скарынаўскіх часоў — напісана нямала. Спецыялісты лічаць, што мяцеж з'явіўся вынікам барацьбы дзвюх груповак буйных феадалаў за ўладу ў ВКЛ у канцы княжання вялікага князя Аляксандра. Адзін з найбагацейшых і ўплывовых магнатаў краіны князь Міхаіл Львовіч Глінскі, чалавек страсны, амбітны, па-еўрапейску адукаваны (выхоўваўся пры дварах імператара Максіміляна і іншых заходніх манархаў), маршалак дворны літоўскі, нядаўні бліскучы пераможца татар пад Клецкам (1506), узначальваў групоўку, што выступала за перадачу ўлады пасля смерці Аляксандра яго малодшаму брату Жыгімонту. Так і сталася. Ды, як нярэдка здараецца, Жыгімонт аказаўся няўдзячным і пасля абрання на пасад змяніў стаўленне да Глінскага. Супраць князя Міхаіла ўмела інтрыгаваў яго асабісты вораг ваявода трокскі і маршалак земскі Ян Забярэзінскі. Спробы шукаць праўды ў Жыгімонта не далі вынікаў. Абураны Глінскі з атрадам баяр-васалаў і сваякоў у лютым 1508 года, акурат на Грамніцы, напаў на дом Забярэзінскага каля Гародні. Сапернік-крыўдзіцель (ці проста ненавісны сапернік — усіх рэалій мы за смугою стагоддзяў не дашукаемся) быў забіты. Мяцеж пачаўся. Рубікон пяройдзены. Пасля няўдалай спробы атакаваць Коўну Глінскі праз Наваградчыну пайшоў са сваімі клеўрэтамі на Палессе, дзе ў яго былі вялікія валоданні з гарадамі Мазыр і Тураў. Будучы католікам, ён агітаваў беларускіх і ўкраінскіх феадалаў абараняць праваслаўе. «Міжусобіца набыла рысы нацыянальна-вызваленчай барацьбы»[377], — пісалі яшчэ нядаўна вельмі шанаваныя даследчыкі, хаця размова павінна ісці хутчэй пра

[377] Калеснік У. Тварэнне легенды. С. 182.

магчымыя тэндэнцыі, чым пра рэаліі. Ёсць звесткі, што Глінскі разлічваў утварыць на ўсходніх і паўднёвых землях ВКЛ самастойнае княства. І, канешне ж, самому ўстаць на чале гэтай новай дзяржавы. Час быў спрыяльны. Толькі вось дзеля чаго: для здрадлівай помсты (пачуцця дробнага, тым больш для дзяржаўнага чалавека такога рангу) або для высокага патрыятычнага чыну?.. З ВКЛ тады якраз ваяваў вялікі князь маскоўскі Васіль III. Глінскі становіцца яго натуральным саюзнікам. Заключаецца пагадненне аб сумесных дзеяннях і перадачы занятых у Беларусі гарадоў і фартэцый братам Глінскім. Ды шырокі рух выклікаць так і не ўдалося. Пад сцягамі Глінскіх згуртаваліся толькі каля дзвюх тысяч чалавек, пераважна іх васалы. Паўстанцы зрабіліся, па сутнасці, усяго толькі дапаможным войскам вялікага князя маскоўскага. З Палесся Глінскі рушыў на Бабруйск, дзе злучыўся з арміяй маскоўскага князя В. І. Шамяціча. Яны разам асадзілі Мінск. «И стояли под Менском две недели, и к городу приступали, ис пушек били, а землю литовскую воевали мало не до Вильни»[378], — гаворыць летапісец. Ды Мінск узяць не змаглі, як выстаяў і Слуцк. Не будзем пералічаць усіх перыпетый гэтай шэрай, бясколернай вайны. Глінскі дзейнічаў то разам з Шамяцічам, то асобна. У верасні 1508 года паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай быў заключаны «вечны мір», на Палессе супраць Глінскага рушыла беларуска-літоўскае войска на чале з гетманам К. Астрожскім. Па дамоўленасці з Васілём III Глінскі з братамі і васаламі перабраўся ў Маскву, дзе атрымаў у якасці ўдзела Малаяраславец і Бароўск. Сучасныя гісторыкі лічаць,

---

[378] Новое о восстании Михаила Глинского в 1508 году / Публ. А. Зимина // Сов. архивы. 1970. № 5. С. 71.

што мяцеж, які не падтрымала асноўная частка беларускіх і ўкраінскіх феадалаў, быў выкарыстаны Васілём III для заваявання беларускіх земляў. Мяцеж дапамог яму заключыць выгадны мір, паводле якога за Маскоўскай дзяржавай былі замацаваны вялікія тэрыторыі, захопленыя ў час папярэдніх войнаў.

Дэкларавaны «вечны мір» паміж Масквой і ВКЛ трываў нядоўга. І вось ужо зноўку свішчуць кулі, льецца зусім не чужацкая кроў. У 1514 годзе Глінскі ўдзельнічаў на баку масквіцян ва ўзяцці Смаленска, разлічваючы, што горад будзе перададзены яму. Расказваюць, што асабліва паспяхова дзейнічалі выпісаныя Глінскім з-за мяжы пушкары — майстры агнявога гарматнага бою. Смаленск паў, але Глінскаму (у Маскве яго звалі Немцам) не дастаўся. Пакрыўджаны князь пачаў тайныя перамовы з Жыгімонтам пра вяртанне ў ВКЛ, ды быў выкрыты і кінуты маскоўскімі ўладамі ў цямніцу. Толькі праз дзесяць з нечым гадоў па просьбе пляменніцы Алены, жонкі Васіля III, ён атрымаў волю і ў прыдачу гарады Юр'явец, Старадуб і іншыя. Пасля смерці Васіля III Глінскі ўвайшоў у склад Вялікай думы пры Алене (Алена была рэгенткай пры сваім малалетнім сыне Іване IV, якога назавуць потым Іванам Грозным, а то і Жахлівым). Глінскі зноў апынуўся на самай вяршыні ўладнай піраміды. Ды ненадоўга. У выніку новага канфлікту прыдворных груповак наш герой трапіў у астрог, адкуль ужо не выбраўся.

Вось такі шлях амбітнага магната, які, мабыць, нямала ўзяў ад свайго сучасніка Макіявелі. Гэтая каларытная шэкспіраўскіх страсцей і размаху постаць засталася ў памяці нашчадкаў. Да вобраза мяцежнага князя не раз звярталіся пісьменнікі, мастакі. Глінскі — адзін з герояў паэтычнага

цыкла нашага земляка Ю. Нямцэвіча «Гістарычныя песні» (1816). Паплечнік Т. Касцюшкі Нямцэвіч бачыў у сваім герою трагічную постаць: «Калі б не пыха, варты вялікай славы»[379]. Вядомая гістарычная дума паэта-дзекабрыста К. Рылеева «Глінскі» (1822) — наследаванне Нямцэвічу. Рылееву ў сваю чаргу наследаваў беларус П. Зніч, аўтар гістарычнай драмы «Здрада», надрукаванай у 1920-х гадах у зборніку «Замежная Беларусь» (Прага, выдавецтва імя Ф. Скарыны). Удзельнік паўстання 1863 года мастак К. Альхімовіч таксама захапіўся тым далёкім часам, напісаў гістарычнае палатно «Смерць Глінскага ў цямніцы» (1884). Можна назваць і іншых мастакоў.

Спачувальныя старонкі пра Глінскага знаходзім у папулярнай кнізе пісьменніка У. Бутрамеева «Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі» (1995), разлічанай на юнага чытача. Патрыятычным дзеячом малюецца князь Міхаіл у драматычнай паэме Міколы Арочкі «Судны дзень Скарыны» (напісана ў 1986–1989 гадах, першае выданне выйшла ў 1991 годзе). Яшчэ адзін наш сучаснік Вітаўт Чаропка, аўтар некалькіх цікавых твораў пра тую эпоху, паказвае мяцежнага князя неадназначна. «Што ж, за хвіліны свайго трыумфу Глінскі плаціў па найвышэйшаму рахунку — сваёй нядоляй. І трагедыя ягоная ў тым, што нарадзіўся ён таленавітым і самалюбівым, дзейсным і смелым. І застаўся самім сабой да апошняга ўздыху»[380], — такі прысуд выносіць пісьменнік-гісторык у кнізе «Уладары Вялікага княства» (1996). Драматург Алесь Петрашкевіч у сваіх гнеўных адмоўных ацэнках (гістарычная

---

[379] Niemcewicz J. U. Śpiewy historyczne. Warszawa, 1904. S. 144.

[380] Чаропка В. Уладары Вялікага княства. Мінск, 1996. С. 42.

драма «У нядзельку параненьку...», артыкул «Ахвяра ўласнага авантурызму», 2000–2001) больш катэгарычны.

Але вернемся да Калантаяў. Дакументы сведчаць, што Фёдар Калантаеў меў дачыненне да мяцяжу Глінскіх, быццам бы стаяў нават ля яго вытокаў[381]. На гэты конт ёсць цікавыя паказанні. Напярэдадні мяцяжу Глінскі, «созвавши многих людей», нібыта паведаміў ім: «... пришел ко мне Федор Колонтаев, а пал передо мною крыжом, а рек так: поведаю тобе, княже Михайле, штож тыми разы на том нинешнем сойме, што маеть быти в Вильни о громницах (грамніцы святкуюцца народам і цяпер у лютым месяцы. — *Г. К.*) всих нас Русь мают хрестити в Лядскую веру, а хто бы не хотел пойти в Лядскую веру, тых мають стинати; а то мне поведал заисто пан Иван Сопега маршалок, штож так маеть быти». Калі верыць Глінскаму, Калантаеў прасіў: «Про то, господине княже Михайле, со слезами чолом бью твоей милости, для Бога змилуйся, вступися за нас!»[382]

Кароль і вялікі князь Жыгімонт, якому паведаміў пра гэта яго датычны да мяцяжу канюшы Марцін Храптовіч, быў разгневаны. Паклікаўшы да сябе Калантаева, учыніў строгі допыт. Калантаеў ад усяго адмовіўся, здолеў апраўдацца і павярнуць справу на сваю карысць. У тым самым 1508 годзе — чытаем у падручных даведніках — ён атрымаў ад Жыгімонта маёнтак Клевіцы, які раней належаў Глінскаму. Напярэдадні выдання першай Скарынавай кнігі мяцеж ужо стаў забы-

---

[381] Асобныя згадкі пра сувязі Ф. Калантаева з Глінскімі яшчэ да мяцяжу гл.: Шніп М. А. Сацыяльны склад удзельнікаў мяцяжу Глінскіх у ВКЛ // Веснік БДУ. Сер. 3. 2007. № 2. С. 5.

[382] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собр. и изд. Археографическою комиссиею. СПб., 1863. Т. 1. С. 35.

вацца, Глінскія досыць даўно былі ў Маскве, а апраўданыя Жыгімонтам Калантаі лічыліся каралеўскімі дваранамі. Наколькі яны маглі быць карыснымі Скарыну, цяжка сказаць. Ці былі ў іх на гэта адпаведныя сродкі?

Ды і поўнай упэўненасці, што Т-знак Скарыны гэта Катвіца Калантаяў, не было. Па-першае, падабенства ўсё ж даволі адноснае, прынамсі няпоўнае, а па-другое, сам І. Лялевель, здзейсніўшы сваю выдатную сістэматызацыю гербавых знакаў, як першакласны крыніцазнавец, вучоны дзівоснай інтуіцыі досыць крытычна глядзеў на сапраўднае сваяцтва нават падобных гербаў. «Розныя якарападобныя фігуры літары Т, стрэлаў, крыжоў утварылі ў Літве групу гербаў, ахрышчаных Катвіцамі... Іх ні ў якім разе нельга лічыць адной разрослай сям'ёй, наяўнасць у гербе якара яшчэ не сведчыць, што гэта герб Катвіца»[383], — сцвярджаў вучоны.

Да таго ж і сама Катвіца Калантаяў змянялася ў пакаленнях, пераходзячы ад аднаго прадстаўніка роду да другога. У 1984 годзе нястомны шукальнік і даследчык гербавых і пячаткавых знакаў Анатоль Цітоў пазнаёміў нашу грамадскасць з новай знаходкай — пячаткай 1553 года гаспадарскага двараніна Барыса Фёдаравіча Калантая (гэта сын Фёдара Іванавіча). Ніжняя частка гербавага знака на пячатцы сапраўды падобна да скарынаўскага Т-знака, толькі бакавінкі-«плечы» трохкутніка акруглыя, пакатыя, а не прамыя; над гарызантальнай рысай дзіўная дадатковая дэталь — пяціканцовая зорка[384].

---

[383] Niesiecki K. Herbarz Polski. T. 1. S. 574.

[384] Цітоў А. Беларускія пячаткі: (Дакастрычніцкі перыяд) // Мастацтва Беларусі. 1984. № 2. С. 34.

Асабліва важнай была наяўнасць у выяўленым гербавым знаку Барыса Фёдаравіча медыяны — вертыкальнай рысы, якая напалам разразала трохкутнік. У гербоўніках гэтай медыяны якраз і неставала.

Адкрыццё Цітова падвысіла шанцы Калантаяў як магчымых спрыяльнікаў Скарыны.

Так што гэты напрамак ніяк нельга было лічыць адпрацаваным, закрытым. Жыццё падкідвае свае сюрпрызы. Ды яшчэ якія. Праглядаючы «Энцыклапедыю гісторыі Беларусі» (т. 2, 1994), напаткаў артыкул пра Расійскую дзяржаўную бібліятэку (так называецца цяпер знакамітая маскоўская Ленінка). Напісаў яго наш вядомы гісторык, знаўца архіўных і бібліятэчных сховішчаў Георгій Галенчанка. Сярод іншых беларускіх матэрыялаў рукапіснага аддзела сусветна вядомай бібліятэкі ён назваў службовую Мінею пачатку XVI ст., напісаную «замыслом и гаданием» беларускага шляхціца Ф. І. Калантаева. Няўжо той самы? У скарыназнаўчым друку пра гэта, здаецца, яшчэ не было. Не згадваецца гэты рукапіс і ў грунтоўнай кнізе Міколы Нікалаева «Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях» (1993), дзе, здаецца, вычарпальна прадстаўлена багацце беларускіх сярэднявечных кніжных рукапісаў. Галенчанка, да якога я звярнуўся з роспытамі, пацвердзіў: так, гэта той самы Фёдар Іванавіч Калантаеў, датычны да мяцяжу Глінскага. Гэта значыць Калантаевы, і ў першую чаргу Фёдар Іванавіч, былі кніжнікамі, любілі кніжную прамудрасць, што і магло паслужыць асновай для іх збліжэння са Скарынам.

Як растлумачыў мне Галенчанка, рукапісная Мінея Фёдара Калантаева напісана каля 1519 года, даволі рана трапіла на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы, працяглы час

знаходзілася ў Троіца-Сергіевай лаўры, адкуль і трапіла потым у галоўную бібліятэку Расіі.

Давялося заняцца гісторыяй кніжных і рукапісных збораў славутай лаўры. Можа, дзе была якая згадка пра Мінею Калантаева ці пра іншыя кнігі асвечанага і дапытлівага беларускага двараніна? Аказалася, што яшчэ ў 1878 годзе працавітыя ды ўвішныя лаўраўскія манахі Іларый і Арсеній выпусцілі трохтомнае «Апісанне славянскіх рукапісаў бібліятэкі Свята-Троіцкай Сергіевай лаўры». Там, у другім томе, пад № 495 апісана і кніга Калантаева. Так што ў нас ёсць магчымасць зірнуць на кнігу вачыма вучоных чарняцоў. Як прафесіяналам ім няцяжка было вызначыць, што гэта праваслаўная службовая Мінея з Літоўскай Русі на лістапад і снежань. Фармат вялікі — «у аркуш». Напісана паўуставам у дзве калонкі. У кнізе 299 аркушаў. Пачатак XVI ст. Ёсць і ацэначная рэмарка па змесце: «З рускіх святых служба змешчана аднаму прападобнаму Варлааму Хутынскаму» (магчыма, кніга, што ўзнікла ў ВКЛ, больш арыентавалася на агульнахрысціянскія святыні).

Найбольш для нас цікавае пасляслоўе да Мінеі, прыведзенае ў «Апісанні...». Апусцім традыцыйную агульную яго частку з падзякай госпаду Богу, што спадобіў завяршыць цяжкую працу па перапісцы, і чытаем далей: «Списана бысть сия книга на имя Минея месяца сентября 10, индикта 7, при державе Великого Короля Жикгимонта, замыслом и гаданием благоверного пана Федора Ивановича Калантаева, рукою многогрешного диякона Тимофея». Далейшы папсаваны тэкст не здолелі да канца расчытаць нават спрактыкаваныя ў гэтай справе манахі-кніжнікі: «А буде где описал въ... мысли свои неубрежени, вы отци и братие си... а

мене не кленете». Ды, зрэшты, гэта зноў жа традыцыйная формула кнігапісцаў: чытайце, папраўляйце памылкі, ды не кляніце.

«Індыкт» — старадаўняя еўрапейская форма датавання па 15-гадовых цыклах, якая побач са звычайным датаваннем ад нараджэння Хрыстова або ад стварэння свету шырока ўжывалася ў сярэднявечнай Беларусі. Індыкт 7 прыпадае якраз на 1519 год (у чэшскай Празе яшчэ напоўніцу працягвалася друкарска-выдавецкая дзейнасць Скарыны, адна за другой выходзілі яго кнігі).

На кнізе ёсць больш позні недатаваны надпіс аб продажы: «Продал сию книгу поп Кузма и руку приложил, а поручился Миля Ветошкин». Прозвішча тыпова маскоўскае, запіс, напэўна, зроблены ўжо ў Маскоўскай дзяржаве. (Як яна, гэтая кніга, туды трапіла? Ці не ваенным трафеем?)

З другога надпісу даведваемся, што нейкі час кніга належала старцу «Живоначальная Троица Сергиева монастыря» Генадзію Елізараву, які памёр ажно ў 1613 годзе.

Звыш трох стагоддзяў рукапіс захоўваўся ў лаўры, а пасля рэвалюцыі разам з кніжнымі і рукапіснымі зборамі апошняй апынуўся ў маскоўскай Ленінцы.

На жаль, ніякіх звестак, дзе канкрэтна перапісана Мінея, няма. А гэта дало б магчымасць прывязаць Калантаева да пэўнай тэрыторыі. Не знайшоў я імя перапісчыка дыякана Цімафея ў пераліку беларускіх «кнігапісцаў», прыкладзеным да манаграфіі М. Нікалаева.

Тым не менш атрыманае сведчанне пра Калантаева-кніжніка радуе і нацэльвае на новыя пошукі.

Маскоўская Мінея, як і згаданая вышэй геральдычна-сфрагістычная знаходка А. Цітова, важкімі цаглінкамі кла-

дуцца ў даследаванне пытання аб магчымай сувязі Скарыны з Калантаямі.

Шукаем дадатковыя звесткі пра Калантаяў у старых крыніцах. Вялікае шчасце, што захаваўся старажытны беларуска-літоўскі дзяржаўны архіў, так званая Літоўская метрыка, наш агульны неацэнны культурны здабытак. Многія матэрыялы з яе пакрыху выдаваліся і працягваюць выдавацца цяпер, хоць, можа, і не так хутка, як хацелася б. Так або інакш, нават па апублікаваных матэрыялах у навуковых бібліятэках можна ўзнавіць многія старонкі далёкай мінуўшчыны.

Карцела неяк лакалізаваць пошук, высветліць, дзе ж было ў часы Скарыны галоўнае гняздо Калантаяў, у прыватнасці Фёдара Іванавіча. Якія ў нас ёсць тут арыенціры? Аўтарытэтны генеалог А. Банецкі і следам за ім «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» падаюць дзве геаграфічныя назвы: маёнтак Звонкавы і маёнтак Клевіцы. З апублікаванай урадавай перапіскі ВКЛ канца XV ст. відаць, што маёнтак Звонкавы знаходзіўся ў Бранскім павеце[385]. Але ў той час у ВКЛ былі два значныя паселішчы з назвай Бранск. Абодва з краю: адзін на захадзе, другі — на ўсходзе. Першы — у Падляшшы (цяпер невялікі гарадок у Бельскім павеце (Польшча)), другі якраз у 1500 годзе адышоў да Маскоўскай дзяржавы (сёння гэта абласны цэнтр у Расійскай Федэрацыі). Некаторыя акалічнасці дазвалялі думаць, што Калантаевы выйшлі з Падляшша і

[385] Апрача маёнтка Звонкавы, атрыманага ў свой час Васкам Калантаевым, у Калантаевых былі тут і іншыя землі: за Федкам Калантаевым у 1499 годзе кароль і вялікі князь Аляксандр пацвердзіў «на вечнасць» валоданне сялом Міткоўскае, а таксама селішчам у Бранску і іншымі землямі, набытымі ў бранскіх баяр Юшковічаў. Магчыма, «Федка» — ужо знаёмы нам Фёдар Іванавіч.

былі землякамі продкаў Кастуся Каліноўскага, уладальнікаў маёнтка Калінава ў Бранскай зямлі. У Бранскай (Бельскай) зямлі, як і па ўсім Падляшшы (Супрасль, Заблудаў), былі даўнія багатыя традыцыі беларускай праваслаўнай кніжнасці. Цікава, што ў Супрасльскім паменніку — памінальнай кнізе знакамітага Супрасльскага манастыра, якая вялася доўгі час з пачатку XVI ст., ёсць і прозвішча Калантаяў (апошнім часам пра гэта згадваў кнігазнавец М. Нікалаеў[386]). Гэта магло дадаткова сведчыць пра даўнюю сувязь Калантаяў з Падляшшам. Хаця, з іншага боку, вядома, што папулярнасць гэтага манастыра ў Беларусі была вельмі шырокая і Падляшшам зусім не абмяжоўвалася.

Мае сумненні канчаткова рассеяліся пасля азнаямлення з грунтоўнай кнігай дарэвалюцыйнага гісторыка М. Любаўскага пра абласны падзел і мясцовае кіраванне ў ВКЛ у скарынаўскую эпоху. Шматлікія згадкі Калантаевых у гэтай манаграфіі сведчаць пра іх сувязь з Бранскім паветам на сумежжы ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы (у прыватнасці, той жа маёнтак Звонкавы зусім пэўна лакалізуецца каля тамашняга паселішча П'янаў, пазначанага і на картах)[387]. Рускі геральдыст XIX ст. А. Лакіер (яго кніга перавыдадзена ў наш час) прыводзіць знаёмы нам герб Калантаяў і паведамляе: «У 1500 г. фамілія Калантаяў перасялілася са Смал. у Літву»[388]. Смаленская зямля суседнічала з Бранскай, якая перайшла пад уладу Масквы якраз у 1500 годзе. Вынікае,

---

[386] Гл.: Нікалаеў М. Палата кнігапісная. Мінск, 1993. С. 76.

[387] Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-русского государства ко времени издания первого Литовского статута: Ист. очерки. М., 1892. С. 558.

[388] Лакиер А. Б. Русская геральдика. М., 1990. С. 273.

Калантаі былі эгзулянтамі — так называлі ў ВКЛ і Польшчы выхадцаў са страчаных памежных земляў на ўсходзе дзяржавы. Улады ВКЛ імкнуліся ўсяляк апекавацца імі, прымалі на службу, надзялялі іх новымі маёнткамі.

Цікава прачытваецца ў святле новых крыніц гісторыя з падараваннем Фёдару Іванавічу маёнтка Клевіцы (так пададзена гэтая назва ў артыкуле ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» пра Калантаяў; як потым удакладнілася, гэта Клявіца, якая існуе і сёння).

Адпаведны «ліст» яго міласці караля і вялікага князя Жыгімонта напісаны 8 красавіка 1508 года ў Кракаве на чысцюткай старабеларускай мове. Адрасат — Рада ВКЛ («паны-рада»), якая і хадайнічала за Калантаева. Нагадаем, што ішла якраз вайна, дапоўненая мяцяжом Глінскага. Дакумент цікавы тым, што ў ім называюцца некаторыя акалічнасці, звязаныя з мяцяжом. Аказваецца, Фёдар падчас мяцяжу моцна пацярпеў і перажыў шмат нягод, яго сям'я была захоплена мяцежнікамі, ды і сам ён ледзь вырваўся з іх рук. Чытаем: «Што ваша милость писали до нас за дворянином нашым Федором Колонтаевым жодаючы нас, абыхмо его чым осмотрели (забяспечылі. — *Г. К.*), поведаючы его великие шкоды и впад (разарэнне. — *Г. К.*), иж он сам был в руках в того зрадцы нашого князя Михаила Глинского и оттоль въехал, а жону и дети там заставившы, ино мы, на жедане вашеи милости и теж впамятавши его верность, и для впаду и шкод его, з ласки нашое дали ему тот двор Клевицу, што княз Василеи Глинскии (не Міхал, як часам пішуць даследчыкі, напрыклад, той жа сістэматычны і дакладны ў іншых выпадках А. Банецкі. — *Г. К.*) держал, до нашого лепшого осмотрения, со всеми людми и бортьми, и с челядю неволною, и з землями пашными и борт-

ными, и с сеножатьми, и с тыми землями, што князь Василеи Глинскии ку тому двору прикупил, и со всим по тому, как княз Василеи держал. А ввязати (увесці ў валоданне. — *Г. К.*) его в тот двор и люди послали есмо дьяка нашого Федка»[389].

Вёска Клявіца і цяпер існуе ў Ашмянскім раёне, па дарозе з Ашмянаў у літоўскія Дзевянішкі. Невядома, ці паспеў той дзяк Федка выканаць усе фармальнасці па ўводзе ў валоданне, бо літаральна праз чатыры месяцы Жыгімонт памяняў рашэнне, перадаўшы гэты маёнтак вядомаму магнату віцебскаму ваяводу Юрыю Глябовічу. Кароль у сувязі з падзеямі вайны знаходзіўся тады на ўсходніх межах ВКЛ у Смаленску. Да яго і звярнуўся з гэтай нагоды Глябовіч, маёнткі якога моцна пацярпелі ад непрыяцеля. Вось адпаведны ліст Жыгімонта: «Бил нам чолом наместник витебскии пан Юрьи Глебович о том, штож именья его вси скажоны от неприятеля нашого великого князя московского и от поганства татар и не мает на чом поживити ся, и просил нас о именье того зрадцы нашого Василья Глинского на имя о Клевицу, которое именье дали были есмо дворянину нашому Федору Колантаеву на поживене до нашое воли.

И мы ему [Глябовічу] тое именье Клевицу дали со всим с тем, как держал зрадца наш Василеи Глинскии»[390]. Такім чынам, насуперак таму, што пішуць следам за А. Банецкім гісторыкі, Клявіца ўласнасцю Калантаевых не стала.

Магчыма, ускосна вінаваты ў гэтым сам Фёдар Іванавіч, які не ў пару зноў трапіўся на вочы Жыгімонту — у канцы чэрвеня таго самага 1508 года. Скарыстаўшы часовае знахо-

---

[389] Литовская метрика: Кн. 8 (1499–1514). Кн. зап. 8. Вильнюс, 1995.
[390] Тамсама.

джанне караля ў Мінску, ён звярнуўся да яго з новай просьбай — зацвердзіць-замацаваць за ім маёнтак у Наваградскім павеце, падараваны яшчэ нябожчыкам каралём Аляксандрам, братам Жыгімонта. Старабеларуская мова ў тэксце атрыманага ім з каралеўскай канцылярыі дакумента гучыць падзяржаўнаму ўрачыста, на поўны голас, не раўнуючы як тая пракаветная лаціна:

«Жикгимонт, Божю милостю корол и велики княз.

Чиним знаменито сим нашим листом, хто на него посмотрыт або чтучы его вслышит, нинешним и потым будучим, кому будет потреб того ведати. Бил нам чолом дворянин наш Федор Колонтаев и клал перед нами лист брата нашого щастное памяти Александра, короля и великого князя его милости, на то, штож его милость дал ему двор свои Новгородского повета на имя Полоную и теж села з людми того двора Полоное на имя Баратино а Милошево, а Стрелники, а Претеневичи, а Кодчычы... и слуги путныи, и люди тяглыи, и челяд невольную того двора Полонки, и садовники, и пшеничники стрельницкими и борятинскими, и з муралми (мулярамі. — *Г. К.*), которые живут в Стрелниках, и с конюхи полонскими и борятинскими, и перевоз на реце Немне в Турцы[391], и земли пашныи и сеножати, и гаи, и хмелищи на Сервичи, и з болоты, и ставы, и ставищи»[392].

---

[391] Ад сённяшняга Турца да Нёмана колькі кіламетраў. У часы Скарыны тут праходзіла гандлёвая дарога Гродна — Беліца — Наваградак — Турэц — Койданава і далей на Мінск. Гл. «Карту гандлёвых дарог XVI ст.», прыкладзеную да кнігі польскай даследчыцы А. Ваўжыньчык «Штудыі з гісторыі гандлю Польшчы з ВКЛ і Расіяй у XVI ст.» (1956). У Турцы, магчыма, бралася плата за перавоз праз Нёман.

[392] Литовская метрика: Кн. 8 (1499–1514). Кн. зап. 8.

А яшчэ, — гаварылася ў дакуменце, — Фёдар «поведил перед нами», што мы ўжо аддалі яму землі пустыя двара Паланая, што трымаў сакольнік Пантусаў, «которыи ж побег з зрадцою нашым Михаилом Глинским, и теж и тую землю зрадцы нашого Богдана Колонтаева», якую апошні набыў у Пантусава.

І мы, — пісаў кароль, — «для его верное службы тым его пожаловали: тот двор Полоную и тые земли отбежчины (землі ўцекачоў. — *Г. К.*) ему есмо дали, и потвержаем то сим нашим листом вечно ему и его жоне, и их детем и напотом будучым их счадкам». Зноў ідзе падрабязны пералік рэалій, які сведчыць пра высокую юрыдычную культуру тагачаснай Беларусі, а з другога боку, пра багацце і разнастайнасць прыродна-гаспадарчых аб'ектаў і формаў гаспадарання: «... и з реками, и з речками и их потоки, и з ставы, и ставищы, и з млыны и их вымелки, и з данми грошовыми, и з службами тых людеи, и з дяклы [аброкамі] ржаными и пшеничными, и овсяными, и з сеном подзяколным, и со всим с тым, как ся тот двор Полоная и села того двора вышеписаные, и тые земли Пантусова и Богдана Колонтаева з стародавна в себе маеть и как держано перед тым к замку нашому Новугородку, и волен то он отдати, продати, заменити, розшырити, к своему вжиточному и лепшому обернути, как ся ему и его справедливым наследком налепеи увидить.

А при том были Панове Рада наша ...» (сярод іншых называюцца гетман «княз Костянтин Иванович Острозски» і маршалак дворны Ян Янавіч Забярэзінскі, сын забітага Глінскім. — *Г. К.*).

«А на твердость того и печать нашу казали есмо привесити к сему нашому листу.

Писан в Менску, лета Божьего 1500 осмого, месеца июня 27 день, индикт 11».

Вось такую дарагую граматку з неацэнным каралеўскім роспісам і падвешанай паводле тагачаснага звычаю дзяржаўнай пячаткай прывёз з Мінска-Менска Калантаеў. У гэтым акце таксама бачым паралельнае датаванне па індыктах (апошні 15-ы індыкт прыходзіўся на 1512 год, з 1513-га пачынаўся новы цыкл індыктаў).

Як бачым, у ходзе задушэння мяцяжу Глінскага, як і заўсёды ў такіх выпадках, ішло пераразмеркаванне матэрыяльных даброт, зямельнай уласнасці. Адны гублялі, другія набывалі. Фёдар Калантаеў эканамічна выйграў, узмацніўся, а мяцежнікі, у тым ліку Багдан Калантаеў (ці не яго родны брат?), згубілі маёмасць.

Зрэшты, асечка выйшла і ў Фёдара, але другога кшталту. Думаецца, што ў працэсе азнаямлення з матэрыяламі па маёнтку Паланая і саспела ў Жыгімонта думка не замацоўваць за Калантаевым яшчэ і Клявіцу. Тым больш, што каля гэтага часу Жыгімонт зацвердзіў правы на маёнтак Валчкоўскі ў Ваўкавыскім павеце за Сямёнам Калантаевым (таксама, відаць, брат Фёдара).

І без Клявіцы Фёдару Калантаеву дастаўся даволі багаты феадальны маёнтак, які належаў некалі да Наваградскага замка. Вёска Паланая і цяпер ёсць у Карэліцкім раёне па дарозе з Карэлічаў на Наваградак. Гэта густа заселеная, абжытая старадаўняя беларуская зямля з надзвычай багатымі культурнымі традыцыямі. Зямля, дзе шмат будавалі і ведалі цану пабудоў з вечнага каменю і цэглы (нездарма Жыгімонтава грамата згадвала ў Стрэльніках муляраў). У Наваградку — першай сталіцы ВКЛ — пры цэрквах і мітрапаліцкай кафе-

дры здаўна існавалі скрыпторыі, перапісваліся кнігі. Яшчэ і цяпер пры раскопках археолагі дастаюць там з зямлі бронзавыя і сярэбраныя засцёжкі ад кніжных пераплётаў, сведчанні высокай духоўнай і мастацкай культуры. Наваградак — горад кніжны. Пры адной з наваградскіх цэркваў або ў недалёкім Лаўрышаве, мяркуючы па ўсім, перапісана і Мінея Ф. І. Калантаева, якая захоўваецца цяпер у Маскве.

Гэтую версію пацвярджае дакумент, апублікаваны яшчэ ў пазамінулым стагоддзі ў «Актах, якія тычацца гісторыі Паўднёвай і Заходняй Расіі» (т. 1). Размова пра купчы запіс, аформлены ў 1518 годзе ў Наваградку. Вельмі высокая персона, адна з першых асоб у дзяржаве, мітрапаліт кіеўскі, галіцкі і ўсяе Русі Іосіф II Солтан (сталая рэзідэнцыя якога, насуперак гучання тытула, была ў тыя часы ў Вільні, а фактычна — Наваградак[393]) набыў у пана Яна Завішыча палову маёнтка Прылепы (цяпер Смалявіцкі раён)[394]. Нас цікавіць спіс сведкаў, якія пацвердзілі гэты набытак. І вось што там вычытваем: «А при том были люди добрыи: плебан Новгородский князь Ян Подолит, а дворяне господаря короля его милости князь Иван Филипович Крошинский, а пан Федор Иванович Колонтаев, а пан Олексей Зеновичь...»[395] Так што, бачым, «пан Фёдар Іванавіч» трапіў у вельмі прыстойную кампанію. Несумненна, ён быў блізкі да мітрапаліта

---

[393] «Стольным горадам кіеўскіх мітрапалітаў была Вільня, хаця мітрапаліты рэдка мелі тут знаходжанне, жывучы ў большасці ў Навагрудку. У Вільні ж мелі намеснікаў» (Чистович И. Очерк истории западнорусской церкви. СПб., 1882. Ч. 1. С. 121).

[394] Першая палова маёнтка належала некалі князю Саламярэцкаму і перайшла ў рукі мітрапаліта яшчэ ў 1512 годзе.

[395] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 1. С. 58–59.

Іосіфа, які нямала садзейнічаў умацаванню праваслаўя ў ВКЛ, спрыяў духоўнай асвеце і працам па перапісцы кніг. «Іосіф Солтан быў адным з найважнейшых пастыраў заходнерускай царквы, які аб'ядноўваў руплівасць з адукацыяй і тонкім грамадскім тактам»[396], — піша гісторык царквы І. Чыстовіч. Вялікая роля мітрапаліта Іосіфа ў заснаванні і працвітанні Супрасльскага манастыра — знакамітага асяродка праваслаўнай кніжнасці на захадзе Беларусі. Іосіф таксама рупліва апекаваўся Лаўрышаўскім манастыром (пры ім устаноўлена свята прападобнага Елісея Лаўрышаўскага, заснавальніка абіцелі). Не без спрыяння мітрапаліта манастырскія валоданні раслі і множыліся. Цікава, што, як дашукаліся карэліцкія краязнаўцы, і сам маёнтак Паланая на пачатку XVII ст. лічыўся ўласнасцю Лаўрышаўскага манастыра[397].

Набожнасць, духоўнасць — відаць, фамільная рыса Калантаяў. Пра гэта сведчыць запіс пра іх ва ўжо згаданым Супрасльскім паменніку, тэкст якога ўдалося адшукаць у рэдкай кнізе «Рукапіснае аддзяленне Віленскай публічнай бібліятэкі» (1871). Адзін з самых старажытных запісаў у паменніку, зроблены, магчыма, клопатамі Фёдара Іванавіча[398], гучыць так: «Род пана Колонтаевъ: инока Иону, Саву, инокиню Агафию, Андрея, инока Саву, Симеона, Тимофея,

---

[396] Чистович И. Очерк истории западнорусской церкви. Ч. 1. С. 139.

[397] Памяць: Карэліцкі раён. Мінск, 2000. С. 609. Дададзім, што Паланая як уласнасць П. К. Абуховіча згадваецца ў вядомым сатырычным «Лісце да Абуховіча» 1655 года. Гл.: Анталогія даўняй беларускай літаратуры. С. 680, 983.

[398] Побач у памянніку запіс пра род князёў Крошынскіх, з якімі меў сувязі Фёдар Іванавіч.

Парфения, священноскимника Елевферия»[399]. П. Гільтэбрант, публікатар гэтага запісу, слушна заўважае: «Пра гэтыя імёны ў Нясецкага... глыбокае маўчанне». Таму і нам сёння так нялёгка разблытаць гэты клубок. І ўсё ж тое-сёе праясняецца, канкрэтызуецца, набывае бачныя абрысы.

Памеры маёнтка Фёдара Іванавіча, яго эканамічную вагу можна высветліць па вайсковых попісах XVI ст., выдадзеных яшчэ ў 1915 годзе ў серыі «Руская гістарычная бібліятэка» (т. 33). Гэта ёмісты том з прозвішчамі шляхты, якая ў залежнасці ад матэрыяльнага становішча выстаўляла ў войска пэўную колькасць ваяроў. Паказальніка імён у томе, на вялікі жаль, няма, шукаць патрэбнае імя сярод тысяч іншых ва ўмовах заўсёднага цэйтноту — безнадзейна, але попісы складаліся па паветах, па пэўных тэрыторыях, а цяпер я ўжо ведаў, дзе шукаць. На Наваградчыне, на свяшчэннай Наваградскай зямлі, якая побач з Полаччынай з'яўляецца галоўнай калыскай беларускай дзяржаўнасці і культуры.

Том пачынаецца з попісу 1526 года — «Ухвала на великом сойме Виленском в року 1528 месяца мая 1 дня учиненая з стороны обороны земское, колько хто с панов рад, врядников и всих обывателей Великого князства Литовского з ыменей своих ку службе военной коней ставити маеть». «Коней» — азначае «экіпіраваных вершнікаў», хаця, вядома ж, меліся на ўвазе і рэальныя коні як неабходны атрыбут вершніка. Знаходзім пералік пад назвай «Замок господарьский Новогородский» і там — сярод многіх іншых — паметку: «Федор Колонътай 7 коней»[400]. Гэта нямала. Ведаючы нор-

[399] Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки: Перечневая опись / Труд П. Гильтебрандта. Вильна, 1871. С. 145.

[400] Русская историческая библиотека. Т. 33.

му, па якой выстаўляліся конныя ваяры, не цяжка падлічыць, што ў маёнтку налічвалася да 200 сялянскіх двароў, залежных ад пана. І з кожнага двара пан меў нейкі прыбытак. Ды нават перавоз праз Нёман, зафіксаваны ў грамаце, прыносіў даход (між іншым, Калантаеў трымаў гэты прыбытковы перавоз разам з арыстакратам князем Фёдарам Чартарыскім).

Тады ў Беларусі якраз адбываліся кардынальныя сацыяльна-эканамічныя змены, завяршаўся працэс запрыгоньвання сялян, якія, вядома ж, як маглі ўпарціліся і супраціўляліся гэтаму. Як адзначае гісторык Міхаіл Фёдаравіч Спірыдонаў у грунтоўнай кнізе «Запрыгоньванне сялянства Беларусі» (1993), сяляне двара Паланая амаль дзесяць гадоў вялі барацьбу ў форме скаргаў супраць перадачы іх у прыватныя рукі. Скаргі свае яны матывавалі тым, што Калантаеў нібыта іх «забрал без данины», гэта значыць, без адпаведнага акта караля. Вядома ж, суд быў на баку пана. У рэшце рэшт у 1511 годзе адстаяць сваю свабоду ад пана ўдалося толькі тым сялянам, якія жылі на землях, набытых у гаспадарскіх новагародскіх людзей[401].

Ды і гэта быў не канец. Для кнігі «Памяць: Карэліцкі раён» (вядомая рэспубліканская серыя, якой не без падстаў ганарыцца Беларусь) Спірыдонаў адшукаў новыя дакументы, якія паказалі, што жорсткае супрацьстаянне пана і сялян у Паланой працягвалася і ў 1520 годзе. Наогул у карэліцкай «Памяці» ладная падборка дакументаў пра Фёдара Калантаева — уладальніка Паланой, энергічнага памешчыка, які, ведама ж, стараўся свайго не ўпусціць з рук і, нягледзя-

[401] Спиридонов М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.). Минск, 1993. С. 121.

чы на ўсю сваю асвечанасць і духоўнасць, зусім не збіраўся міндальнічаць з сялянамі, яшчэ ўчора гаспадарскімі[402]. У гэтым дачыненні ён не вылучаўся з масы астатніх паноў. Працэс быў агульным і, відаць, гістарычна непазбежным. У Беларусі надоўга ўсталёўваўся жорсткі прыгонны парадак.

У далейшым паланайскі маёнтак, трэба думаць, дзеліцца паміж дзецьмі Фёдара Іванавіча, затое набываюцца новыя землі, напрыклад, маёнтак Зарой у тым самым Наваградскім павеце (цяпер — у Дзятлаўскім раёне, на мяжы з Наваградскім). У вайсковым попісе 1567 года знаходзім сына Фёдара Герасіма. На месца агульнага збору войска (паблізу Маладзечна) Герасім Фёдаравіч не з'явіўся, прынамсі аб'явіў сябе хворым, прыслаў дарослага сына (гэта ўжо трэцяе пакаленне Калантаяў-Калантаевых). Увесь запіс такі: «Герасим Колонтай сам дома, поведають же захорал, выслал сына своего Миколая, з ыменья своего Полоное ставил коней 4 а з Зароя в том же повете Новогородском кони 2, то ест ставил всих коней 6...»[403] Далей пісар «скарагаворкай» — значкамі-скарачэннямі — адзначыў рыштунак і зброю выстаўленых вершнікаў: «пнцр. 4, каф., пр. 4, тр., др. во всих», што, відавочна, азначае: «панцыраў 4, кафтаны, прылбіцаў (шаломаў) 4, тарчы (шчыты), дрэўцы (дзіды) ва ўсіх». Даў нібы малюнак зборнага войска. Агнястрэльную зброю, пішуць даследчыкі, земская конніца выкарыстоўвала яшчэ рэдка. У канцы цытаванага фрагмента з попісу дабаўлена пра драбаў-пяхотнікаў, выстаўленых дадаткова Калантаем: «...он же ставил драби 3 з рогат[инами]». Вось так — з рагацінамі

---

[402] Памяць: Карэліцкі раён. С. 45–49.

[403] Русская историческая библиотека. Т. 33.

ды дзідамі — ішлі на вайну літвіны-беларусы. Думаецца, што і ў суседзяў (прынамсі ў Маскоўскай дзяржаве) было не лепш.

Такім чынам, удаецца высветліць, што сучаснік Скарыны, каралеўскі дваранін Фёдар Іванавіч Калантаеў (Калантай) меў немалы маёнтак паблізу Наваградка. Ён пакінуў свой след у дакументацыі і пісьмовых помніках рознага характару, што само па сабе гаворыць пра неардынарнасць, дынамічнасць асобы. Быў чалавекам асвечаным, кніжнікам, па яго распараджэнні перапісваліся царкоўныя, а магчыма, і не толькі царкоўныя, кнігі. Не будзе вялікай нацяжкай дапушчэнне, што ў Калантаева быў свой большы або меншы кнігазбор, дзе, магчыма, зберагаліся і скарынаўскія выданні, як меў кнігі Скарыны зямляк і сучаснік Калантаева каралеўскі канюшы Васіль Чыж[404] (маёнткі ў апошняга былі і на Наваградчыне; ён зяць Ф. Чартарыйскага, з якім Фёдар Іванавіч трымаў перавоз праз Нёман). Між іншым, паметка на Мінеі Калантаева «Списана бысть сия книга на имя Минея... замыслом и гаданием благоверного пана Федора Ивановича Калантаева...» па сваёй форме і рытміцы нагадвае скарынаўскія калафоны: «Доконана ест книга, рекомая Иудиф... повелением, працею и выкладом ученаго мужа... Франциска Скорины...»[405]

Шмат даюць даследчыку ўжо цытаваныя матэрыялы па даносе каралю Жыгімонту, нібыта Калантаеў з'явіўся адным

---

[404] На экзэмпляры скарынаўскай кнігі «Другі закон» 1519 года выдання ёсць уладальніцкі надпіс: «Сия книга, зовемая Бивлия, пана Василя Богдановича Чижа, коню[шег]а дворного осподоря короля...» (Францыск Скарына: Зб. дак. і матэрыялаў. С. 270).

[405] Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. С. 45.

з ініцыятараў мяцяжу Глінскага, заклікаў Глінскага выступіць у абарону праваслаўя.

Зазірнём яшчэ раз у добра вядомы даследчыкам дакумент, які ў першапублікацыі (1863) называецца «Распросныя речи Федора Колонтаева по извету на него князя Михайла Глинского», а ў арыгінале (Літоўская метрыка) меў загаловак «Выправованье се Фёдора Колонтаева с помовы на него от князя Михайла Глинского, яко бы он причиною до бунтов и зъеханья его был»[406]. Дата — 21 сакавіка 1508 года, праз нейкіх паўтара месяца пасля пачатку мяцяжу. Дзяржава ў смяротнай небяспецы. Нарабіўшы вялікага сполаху на Чорнай Русі ў Прынямонні (Наваградак, Гародня і г. д.), Глінскі перанёс дзеянні на Палессе, пагражаючы адтуль Мінску і Слуцку. Кароль прыбыў у ВКЛ, каб на месцы разабрацца ў акалічнасцях бунту, прыняць тэрміновыя захады, пакараць вінаватых. Яго прыдворны канюшы і лоўчы Марцін Храптовіч (гэта па тым часе высокі саноўнік) называе галоўным ініцыятарам мяцяжу Фёдара Калантаева, спасылаючыся на словы самога Глінскага: «... князь Міхайло, едучы з Новагородка, созвавшы многих людей а рек так: тот замяток, который жо есми вчинил, ни от кого стался, только от Федора Колонтаева; как дей есмо были на свадьбе в Белицы (старажытнае мястэчка на правым беразе Нёмана, цэнтр воласці ў Лідскім павеце, на мяжы з Наваградскім. — *Г. К.*), ино пришол ко мне Федор Колонтаев, а пал передо мною крыжом а рек так...»[407] Што менавіта «рек» Калантаеў, мы ўжо цытавалі вышэй, а тут важна адзначыць адну дадатковую акалічнасць:

---

[406] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 1. С. 36.

[407] Тамсама. С. 35.

мяркуючы па тоне дакумента, усе — і падступны каралеўскі канюшы, і «супермагнат» Глінскі, і слынны пісар Федка Святоша, які аформіў цытаваны акт ад 21 сакавіка 1508 года, і, нарэшце, сам яго міласць кароль — выдатна ведалі, хто такі Калантаеў, — ніякіх дадатковых тлумачэнняў не патрабавалася. Хоць у неардынарную хвіліну жыцця ён, калі верыць дакументу, і «пал крыжом» перад магутным магнатам Глінскім, але гэта настолькі самавіты чалавек, што на яго можна было ўзваліць віну за вялікае патрасенне дзяржавы — «то все сталося от Колонтаева». Для нас самае важнае — маштабы асобы Калантаева, як яны высвечваюцца дакументам. А потым ужо астатняе — апраўданні Фёдара Іванавіча: Глінскі паклёпнічаў, «вязнь (крыўду. — *Г. К.*) на мяне маючы за то, штож есми не ехал с ним а от него втек...» З другога дакумента ведаем, што ў руках мяцежнікаў засталася яго сям'я. Кароль яму паверыў. Ужо 8 красавіка 1508 года — мы пра гэта пісалі — Калантаеву дорыцца маёнтак Клявіца, які належаў аднаму з Глінскіх. А што ж канюшы Марцін, які данёс на Калантаева? Рэабілітацыя Фёдара Іванавіча пахіснула становішча даносчыка. Паступова высветлілася, што канюшы сам добра завяз у мяцяжы, знюхаўся са здраднікамі, за што на пачатку наступнага 1509 года разам з братам Федкам Храптовічам трапіў у астрог з пазбаўленнем усіх пасад.

Так выглядае справа з датычнасцю Калантаева да мяцяжу Глінскага. Няхай пры расследаванні, у якім удзельнічаў сам кароль, гэтае абвінавачванне не пацвердзілася, наадварот, высветлілася, што Фёдар Іванавіч пацярпеў ад мяцежнікаў, але сама магчымасць такога даносу і зацікаўлены ўдзел караля ў высвятленні ісціны з усёй відавочнасцю сведчаць, што Калантаеў быў досыць вядомай постаццю і не хаваў сваіх

патрыятычных настрояў, як і шчырай прыхільнасці да веры продкаў. Заўважым у дужках, што, мабыць, гэтае сур'ёзнае стаўленне да веры і дапамагло Калантаеву адчуць крывадушнасць і авантурызм Глінскага.

На гэтай аснове было магчымае збліжэнне Калантаева са Скарынам, хоць поўнай упэўненасці, што Т-знак, або «трохкутнік», у выданнях Скарыны з'яўляецца «Катвіцай» Калантаяў, у нас няма. Не выключаецца, што гэта нейкі іншы (напрыклад, мяшчанскі) знак, які ў працэсе эвалюцыі, відавочных мадыфікацый стаў «падрабляцца» пад шаноўную шляхецкую «Катвіцу».

Так або інакш, але далейшыя пошукі ў гэтым напрамку могуць быць карыснымі.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Такім чынам, намі пройдзена ўжо значная частка намечанай дарогі ў абраным кірунку па даследаванні сімволікі Скарыны.

Назапашаны, сістэматызаваны і прааналізаваны немалы матэрыял, які толькі часткова ўвайшоў у напісаныя раздзелы і параграфы.

З персаналій, магчыма, у будучым яшчэ дабавяцца параграфы-нарысы пра шляхецкі род Жабаў і віленскага купца Юрыя Адверніка, якія часам называюцца даследчыкамі ў якасці меркаваных партнёраў Скарыны па выданні Бібліі. Праўда, пра Адверніка верагодных дакументальных крыніц захавалася зусім няшмат, і нават у лепшым выпадку нам мімаволі давядзецца абмежавацца невялікай даведкай (у артыкульчыку пра яго ў энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час» літаральна некалькі радкоў). Побач з Адвернікам трэба ўгледзецца і ў постаць яго ўдавы Маргарыты, якая стала жонкай Скарыны.

Сабраны, але пакуль што не аформлены належным чынам матэрыял пра геральдычную трактоўку скарынаўскай «трапецыі», якая з'явілася толькі адзін раз на партрэце, а потым з выданняў Скарыны знікла. Як вядома, адны даследчыкі (ранні В. Шматаў, А. Лойка ў рамане) бачылі ў ёй схему друкарскага варштата, другія (А. Шатэрнік, У. Паўловіч) — схематычны малюнак кароны, трэція (К. Усовіч) — сімвал Галгофы, чацвёртыя (А. Цітоў, А. Шаланда) — мяшчанскі знак Скарынавай маці. Нарэшце, англійскі даследчык

Г. Пікарда выказаў думку, што мы маем тут справу з вядомым на нашых землях шляхецкім гербам «Магіла». Нам гэтая версія здаецца вельмі сур'ёзнай, хоць Пікарда і не канкрэтызаваў яе ў дастатковай ступені. Можна лічыць нават гэтую версію адной з самых верагодных.

Як удалося вызначыць, былі два галоўныя варыянты гэтага герба. У аснове абодвух — выява магільнага капца (або тумбы) з крыжам. У першым варыянце па баках з капца чамусьці вытыркаюцца дадатковыя крыжыкі, якія могуць адпавядаць касым рыскам скарынаўскай «трапецыі». У другім варыянце дадатковыя крыжыкі замяняюцца коп'ямі з вузкімі востраканцовымі сцяжкамі, што яшчэ больш збліжае гэты герб з «трапецыяй» Скарыны. Сярод носьбітаў герба першага варыянта вылучаюцца ўплывовыя жамойцкія нобілі Білевічы, якія першыя ў ВКЛ, яшчэ да Радзівілаў, сталі прыхільнікамі Рэфармацыі, падтрымлівалі цесныя сувязі з заўзятым лютэранінам герцагам Альбрэхтам (гл. артыкул «Білевічы» ў энцыклапедыі «Вялікае княства Літоўскае»)[408]. Як вядома, папярэднікам, прадвеснікам Рэфармацыі ў пэўным сэнсе быў і наш Скарына. Так што тут магла быць узаемная ідэйная цяга, узаемнае прыцягненне на светапогляднай аснове.

Герб у другім варыянце за гераічныя справы быў атрыманы ад «княжат літоўскіх» віцебскім рыцарскім родам Слепародаў. З імі ў Скарыны маглі быць зямляцкія сувязі.

---

[408] Прадстаўнік гэтага роду Тэадор Білевіч згадваецца ў гісторыі навукі і літаратуры Беларусі XVII ст. як аўтар філасофскага трактата і апісання замежнага падарожжа. Яго «Дзённік, пісаны ў Англіі...» апублікаваны А. Мельнікавым у «Кнізе жыцій і хаджэнняў» (1994). Мельнікаў адзначыў таксама, што род Білевічаў шырока і з вялікай сімпатыяй прадстаўлены Г. Сянкевічам у вядомым рамане «Патоп», дзе апісаны падзеі XVII ст.

Цяпер колькі слоў пра папярэднія высновы, да якіх мы ўрэшце прыйшлі ў выніку ўсяго нашага даследавання.

Па-першае, — і гэта галоўнае — мы яшчэ раз пераканаліся ў геральдычным характары скарынаўскай сімволікі (канкрэтна — «трохкутніка» і «трапецыі»). І ў гэтым дачыненні адшуканне ў старадаўніх гербоўніках прымальнага аналага скарынаўскай «трапецыі» мае асаблівае значэнне. Гэты факт стаўся быццам бы краевугольным каменем, які замацаваў усю пабудову доказаў прыярытэтнасці геральдычнага напрамку. З'яўляецца ўпэўненасць, што галоўныя поспехі ў раскрыцці тэмы нас чакаюць на геральдычным полі.

Па-другое, мы яшчэ больш умацаваліся ў думцы, што Скарына засведчыў гэтымі знакамі сваіх паплечнікаў па выданні Бібліі, што ў скарынаўскім партрэце наглядна выказана ідэя партнёрства.

Па-трэцяе, вымушаны прызнаць, што канчаткова, з поўнай адказнасцю, замацаваць гэтыя знакі за канкрэтнымі партнёрамі Скарыны мы пакуль што не можам. Не хапае матэрыялу.

Мы не можам нават зусім пэўна на ўсе сто працэнтаў сцвярджаць, ці маем мы справу са шляхецкімі гербамі або мяшчанскімі гербападобнымі знакамі. Хаця, зыходзячы з таго, што падтрымлівалі Скарыну найперш купцы-месцічы, больш шанцаў замацавацца ў навуцы ў меркавання, што гэта мяшчанскія, купецкія знакі.

Прыкінем канкрэтна, хто мог хавацца за гэтымі знакамі.

«Трохкутнік». Увасабляе самага вернага і надзейнага партнёра Скарыны. Паплечніка, які выступаў у самым цесным тандэме са Скарынам ад пачатку і да канца яго выдавецкай дзейнасці. Першым кандыдатам тут трэба лічыць брата

нашага асветніка — Івана Скарыну (улічваем выяўленую Г. Пікардам падказку самога Скарыны пра Ісахара і яго брата — купца Завулона). На другім месцы Бабіч. Але не выключаецца і каралеўскі дваранін Фёдар Калантаеў, «Катвіца» якога надта ж перагукаецца абрысамі з «трохкутнікам».

«Трапецыя». За гэтым знакам хаваецца партнёр, які спачатку энергічна падтрымліваў Скарыну, а ў 1518 годзе гэтую падтрымку спыніў. Калі гэта мяшчанскі знак, то найбольш верагодны кандыдат тут Багдан Онкаў, пра гэта можа сведчыць гісторыя з рукапіснымі прыпіскамі на першых кнігах, выдадзеных Скарынам у Празе. Калі ж прыняць «трапецыю» за шляхецкі герб «Магіла», то персанальна гэта мог быць хтосьці з асвечанай шляхты кшталту Білевічаў або Слепародаў. У такім выпадку Багдан Онкаў застаецца «на падазрэнні» ў далучанасці да «трохкутніка» (наступным кандыдатам пасля Бабіча).

З цягам часу наша папярэдняе размеркаванне «роляў» дзейных асоб у атачэнні Скарыны будзе ўдакладняцца як у выніку выяўлення новых геральдычных і біяграфічных крыніц, так і ў выніку больш глыбокага прачытання і асэнсавання ўжо вядомых матэрыялаў.

ЗМЕСТ

Адам Мальдзіс. Кніга першая — кніга апошняя 3

Сейбіты вечнага: Артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года. 17

Ад аўтара 19
Вялікі сын беларускага народа Кастусь Каліноўскі 20
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і паўстанне 1863 года . . . 127
Беларускі рэвалюцыянер Антон Трусаў 188
Гімназічныя і студэнцкія гады Францішка Багушэвіча . 249

Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі 295

Колькі ўступных слоў 297
Раздзел I. Сімволіку Скарыны чытаюць даследчыкі . . . 308
Раздзел II. Рэаліі скарынаўскай сімволікі і яе сувязяў з геральдыкай 362
1. Экскурс у геральдыку 362
2. Што азначаюць скарынаўскія сімвалы на ілюстрацыях? 388
3. Назіранні за «паводзінамі» трохкутніка 402
4. Геральдычная сюіта «Людие израилевы ... » 414
Раздзел III. Сацыяльная апора дзейнасці Скарыны і яго паплечнікі. 437
1. Магнаты не падтрымалі Скарыну. Яго апора — у гарадах 437

2. Багдан Онкаў, дзелавы чалавек скарынаўскай эпохі . . 456
3. Слядамі Якуба Бабіча 488
4. Брат 500
5. Каралеўскі дваранін Федка Калантаеў 511
Заключэнне 538

Навуковае выданне

Кісялёў Генадзь

Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года

Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі

Адказны за выпуск У. А. Сілянок
Рэдактары Л. Г. Кісялёва, Н. Г. Шчарбакова
Камп'ютэрны дызайн, вёрстка Ю. А. Андрэева
Дызайн вокладкі А. Я. Лінькова
Карэктары Л. Г. Кісялёва, Н. Г. Шчарбакова

Падпісана да друку 15.10.2009. Фармат 60x84 1/16.
Папера афсетная. Гарнітура Arno Pro. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 31,3. Улік.-выд. арк. 18,8.
Наклад 150 асоб. Замова 364.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
ЛВ № 02330/0548592 ад 09.07.2009.
ЛП № 02330/0150444 ад 19.12.2008.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, Мінск.

ISBN 978-985-6887-47-8

Генадзь Кісялёў

СЕЙБІТЫ ВЕЧНАГА
СКАРЫНАЎСКАЯ СІМВОЛІКА